# АЛЯКСЕЙ КУЛАКОЎСКІ

# АЛЯКСЕЙ КУЛАКОЎСКІ

## ЗБОР ТВОРАЎ У ЧАТЫРОХ ТАМАХ

Бел 2
К 90

7-3-3
94-70

# АЛЯКСЕЙ КУЛАКОЎСКІ

ТОМ

2

АПОВЕСЦІ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»
МІНСК 1970

# ДА ЎСХОДУ СОНЦА

Кожнаму сваё. Іншыя дзяўчаткі ў летнюю нядзелю выбіраліся ў недалёкі лясок, шукалі там ранніх грыбоў, рвалі кветкі. Іншыя не адступаліся ад сваіх старэйшых і наведвалі разам з імі парк, стадыён, звярынец ці яшчэ што-небудзь блізкае ад дому. А Святлана ледзь не кожную нядзельку бегала ў вайсковы гарадок. Там ёй было весела, там у яе былі свае сябры. Хто б ні стаяў вартавым ля прахадной будкі, усякі прапускаў Святлану ў вайсковы двор. Бывала часам і так, што амаль ля самых варот яе сустракаў лейтэнант Бандарэнка. Ішлі яны тады ўдваіх па брукаванай дарожцы, абсаджанай маладымі таполямі, і ўсе стрэчныя байцы віталі лейтэнанта з асаблівай павагай. Ішлі яны на канюшню, бо там іх чакаў Люты, самы лепшы скакун ва ўсім палку. Хоць гэтага гнядога, у белых панчошках каня звалі Лютым, аднак жа ён быў вельмі рахманы, любіў пяшчоты свайго гаспадара Бандарэнкі і яшчэ больш — Святланін цукар. Калі дзяўчынка падыходзіла бліжэй, ён туліўся да яе галавою, ласкава хмыліўся і лавіў мяккімі сухімі губамі яе рукі.

У тую нядзелю, з якой мы хочам пачаць наш расказ, Святлана прыйшла ў вайсковы гарадок ледзь не з самага ранку. Пачаставаўшы цукрам Лютага, дзяўчынка зайшла ў кабінет да свайго бацькі, бо ў гэты дзень яна яго яшчэ нават не бачыла. Хадзіў, здаралася, і раней бацька па выхадных днях у штаб, але сёння ён пайшоў чамусьці вельмі рана, Святлана ў гэты час яшчэ спала.

У пакоях штаба трохі папахвала конскім потам, але дзяўчынка нават і не заўважыла гэтага. У іх кватэры ў горадзе ўвесь час гэтак жа папахвае, як тата ні стараецца, як ні прасушвае сваю вопратку. У прыёмнай дробненька

стукала машынка. Святлана прыпынілася каля дзвярэй. Ёй не хацелася бачыць машыністкі, хоць для гэтага не было ніякіх прычын.

Святлана нерашуча пастукала ў дзверы, нібы ішла да свайго дырэктара школы. Ніхто не азваўся, бо машынка стукала мацней, як Святлана. Тады яна зайшла без стуку. Машыністка агляпулася, кіўнула ветліва, і зноў яе пальцы спрытна заскакалі па літарах. Яна заўсёды сустракала дзяўчынку ветліва. А бацька чамусьці нахмурыўся, калі ўбачыў дачку. Нахмурыўся і не надта ласкава сказаў, паказваючы на дзверы кабінета.

— Пабудзь там, Света, пакуль я вось... Пачытай штонебудзь.

Дзяўчынка пайшла ў кабінет і, хоць на стале ляжалі ўсялякія часопісы і кнігі, не ўзяла ў рукі нічога. Яна села ў кутку на мяккую канапку, падагнула загарэлыя каленкі і ледзь не заплакала ад крыўды. Ёй так хацелася пагуляць сёння з татам, схадзіць з ім на палігон, а можа і праехацца разам: ён на сваім Віхры, сівым, у яблыкі, а яна на Бандарэнкавым Лютым. І чаму тата сёння прыйшоў на работу, чаму ўсё нешта дыктуе і дыктуе машыністцы? Магла б яна, гэтая машыністка, і не прыходзіць сёння. Ніколі ў выхадныя дні яна не прыходзіла. Крыўда ўпала і на машыністку: нездарма ж так не хацелася яе тут бачыць. Каб яна не прыйшла, то напэўна можна было б пайсці з татам на палігон.

Святлана прыціхла, трошкі супакоіла сваю крыўду і пачала слухаць, што тата дыктуе. Дзверы былі прыадчынены; у перапынках, калі машынка не стукала, чутно было, як бацька ходзіць сюды-туды па пакоі, як хораша і звычна падзынькваюць яго шпоры. А слоў нельга было разабраць: бацька гаварыў вельмі ціха, і друкаванне заглушала яго голас. Ці хутка ён скончыць дыктаваць, ці хутка пойдзе адсюль гэтая зусім непатрэбная дзяўчына?

Марудна і сумна цягнуліся хвіліны. Вядома, у двары было б весялей: там зноў падышоў бы лейтэнант Бандарэнка, ён прыдумаў бы што-небудзь цікавае, вясёлае. Там можна было б пайсці да кулямётчыкаў і пакатацца ў тачанцы. Але не цягнула Святлану нікуды, нават Бандарэнкі не хацелася бачыць. Яна ўсё слухала, як стукае за дзвярыма машынка, як гучыць неразборлівы бацькаў голас. Слухала, чакала і сама не заўважыла, як у гэтым чаканні заснула. Можа душны дзень быў у гэтым вінаваты,

а можа і тое, што ноччу дзяўчынка сніла страшныя сны і часта прачыналася.

Колькі часу праспала тады Святлана, ніхто не ведае, як не памятае гэтага і яна сама. У памяці часта ўзнікае толькі тое, як яна прачнулася. Бацька аб нечым моцна крычаў па тэлефоне, машыністка, хапаючы нейкія паперы, перакуліла столік з машынкаю. На двары нешта страшэнна грымела, ляскала, у вокнах бліскаў агонь. Нельга было зразумець, сон гэта ці незвычайнае, жудаснае няшчасце. Нібы ў гэтым жа неадольным сне і спалоху перад самымі вачамі мільгнуў дарагі, страшэнна заклапочаны бацькаў твар, потым аднекуль, быццам з густога дыму, з полымя, выскачыў Бандарэнка. Святлана адчула пад сабою нечыя цвёрдыя рукі. Можа яго, а можа бацькавы. Усё загойдалася, затрэслася ў вачах, загуло над галавою. Дзяўчынка адчула, што яна некуды едзе, расплюшчыла на момант вочы і ўбачыла перад сабою шафёра з бледнай стрыжанай патыліцай, а поруч з ім — байца ў пілотцы, надзетай бліскучай зоркаю назад. Уціснулася галавою ў жорсткі куток машыны, прыжмурыла вочы, каб успомніць, уявіць, што адбылося, чаму так доўга не праходзіць гэты страшны сон? І зноў акунулася ў нейкую дзівосную кіпучую хвалю, зноў знікла ўсё з вачэй, патанула ў бездані...

Цяпер ужо вочы расплюшчыліся, мабыць, толькі ад таго, што неўзабаве выплыла з-за хмаркі жыватворнае летняе сонейка і начало пранізваць павекі. І калі дзяўчынка глянула на сонца, якое спускалася ўжо на захад, калі ўбачыла над сабою чыстае, спакойнае неба, тады паверыла, што цяпер ужо сапраўды мінуўся гэты жудасны сон. На хвіліну ёй нават уявілася, што яна недзе дома: нібы каля таго ляска за горадам, куды часта бегалі яе сяброўкі, нібы па мураўцы палігона, дзе ў вольную хвіліну любяць адпачываць і нюхаць мапады чабрэц коннікі. Вось і жаўранак падняўся над галавою, затрапятаў крыльцамі, зазвінеў. Калі гэта палігон, дык тут і рэчка недалёка. Хутка прыйдзе тата, і пабяжым тады разам на рэчку. Напіцца б халодненькай вады, намачыць бы свежым струменьчыкам галаву... Баліць нешта галава...

Непадалёку нехта застагнаў, і адразу ж знікла песня жаўранка. Святлана ўзнялася на локаць: перад ёю ляжаў коламі ўверх перадок газіка. У першы момант дзяўчынцы здалося, што гэтыя колы яшчэ круцяцца. Кроках у дзеся-

ці збоку намагалася ўстаць нейкая дзяўчына: узмахвала рукамі, упіралася ў зямлю.

— Пачакайце трошачкі! — сказала Святлана,— я вам памагу.

Яна ўскочыла на ногі, але мяккая трава нібы правалілася пад ёю, і дзяўчынка ўпала. На руках і каленках падпаўзла потым да той дзяўчыны, што адзін раз застагнала, і пачала пасабляць ёй сесці. Узяла яе за шыю, колькі было сілы пацягнула да сябе. Калі дзяўчына села і паправіла на галаве зблытаныя чарнявыя валасы, Святлана ўбачыла, што гэта — машыністка.

— Дзе гэта мы? — запытала дзяўчына. А Святлана глядзела на яе і не ведала, што адказаць. Ёй толькі хацелася хутчэй стаць карыснай у бядзе, памагчы машыністцы, памагчы ўсім, калі гэта трэба.

— Што з вамі? — хацела яна спытаць у машыністкі, але тая перахапіла яе словы і спытала сама:

— Табе не баліць, Светачка?

Дзяўчынка ўзялася рукою за галаву, і яе вочы наліліся слязамі.

А машыністка тым часам разарвала крэмавую блузку проста на сабе:

— Дай я цябе перавяжу, Светачка.

Пакуль перавязвала, прыйшла ў поўную свядомасць, зразумела, што сама не паранена, і трывога брала толькі за Святлану. У дзяўчынкі — крывяная пляма на галаве, вышэй ілба. Можа гэта толькі драпінка, а можа і горш. Ці няма яшчэ дзе ран?

У машыністкі калоціцца сэрца, калі яна саджае дзяўчынку сабе на калені, аднак яна гаворыць зусім спакойным голасам:

— Маленечкая ранка ў цябе, Света, амаль што і не відаць. Мабыць, валасамі за нешта зачапілася, калі ляцела з машыны.

— А што гэта здарылася? — абняўшы машыністку за шыю, спытала дзяўчынка. — Дзе мой тата, дзе Бандарэнка?

— Вайна, Светачка,— ледзь стрымліваючы слёзы, сказала машыністка.— Здарылася вайна.

Адсунуўшы з вачэй не надта ўмелую павязку, Святлана яшчэ раз глянула на газікаўскі перадок з вісячымі, нібы для забавы, коламі і ўбачыла там паблізу вялікую, круглую яму, акаймаваную свежым чарназёмам, і тую ні-

лотку, што нядаўна паблісквала пачышчанай зоркай. Больш не было пра што пытацца.

* * *

Першыя гадзіны яны беглі па гэтай дарозе амаль што адны. Зрэдку праходзіла машына, зрэдку пранасілася група коннікаў. Стрэчныя людзі часам нават і не ведалі, што заварылася там, на граніцы, і глядзелі на Святлану і машыністку здзіўлена, а то і падазрона. Выгляд жа гэтых дзяўчат сапраўды выклікаў здзіўленне. Святлана была ў крэмавай павязцы, як у чалме, а на плячах у машыністкі была толькі палавіна блузкі. Памяталася дзяўчыне, што брала яна з сабою касынку, калі выбягала са штаба, але знікла гэтая касынка, як знік шафёр, як знік той баец, што сядзеў у машыне поруч з шафёрам. Гарачае летняе сонца можа выпаліць прыгожыя, блізкія да кучаравасці валасы, зрабіць іх выцвілымі. Але бог з імі, з валасамі. Толькі для таго каб не самлець ад спёкі, дзяўчына падняла ў адной канаўцы парыжэлы, выдзьмуты ветрам газетны ліст, згарнула яго караблікам і надзела на галаву.

Перад адвячоркам паявіліся грузавыя машыны з раненымі. Многа ішло машын, ледзь не адна за адной. Байцы ў розных павязках, а некаторыя і без павязак, відаць, падабраныя па дарозе, сядзелі хто дзе мог, ля бартоў, на бартах, нават на кабіне. Цяжкараненыя ляжалі на саломе, хто ніцма, хто бокам, хто дагары, прыкрыўшы твар рукамі. Святлана, са згоды машыністкі, пачала «галасаваць»: яна ж таксама раненая, яе павінны ўзяць у машыну. Але шафёры нават вока не спынялі на гэтым «галасаванні» і ціснулі на газ што было сілы. Часам машыну падкідвала так, што траха не зляталі з бартоў раненыя; крычалі, стагналі, прасілі і з апошняга слова лаяліся тыя, каму ледзь не смерцю была такая язда. Нішто не праймала шафёраў. Яны глядзелі толькі на дарогу ды праз бакавыя вокны сачылі, ці чыстае неба, ці няма над хмаркамі таго жудаснага ліха, ад якога вось гэтыя людзі, што ў кузаве, сталі калекамі.

Аднак знайшоўся ўсё ж такі адзін шафёр, які затармазіў машыну перад паднятай маленькай рукой.

— Перавязваць умееце? — спытаў ён, высунуўшы запылены чуб праз выбітае бакавое акно.

— Умеем,— адказала Святлана.

Чубаты ўсміхнуўся і, зірнуўшы на машыністку, загадаў:

— Сядайце! Толькі хутка: раз-два! Вось вам бінты!

— Куды іх, па галовы? — заенчыў пехта з кузава, але тыя байцы, што ледзь не адзін на адным сядзелі па бартах, жвава заварушыліся, неяк цудам зрабілі шчыліну між сабою і памаглі дзяўчатам улезці. Машына зноў пайшла, ды так ірванула з месца, што Святлана сапраўды села аднаму байцу на галаву; аднак той не сказаў нічога, усміхнуўся, як толькі можна ўсміхнуцца, перамагаючы боль, і адхінуўся перавязаным плячом.

Сяк-так прымасціўшыся, Святлана пачала глядзець туды, дзе, па яе арыенціру, павінен быць іхні вайсковы гарадок. Можа, ён яшчэ відзён з машыны, можа, хоць якія прыкметы пашанцуе заўважыць. Не, не было ўжо ніякіх прыкмет. Нават густыя клубы дыму, якія яшчэ не так даўно ўзнімаліся недзе там, каля гарадка, і зліваліся з воблакамі, цяпер, відаць, рассеяліся ці сталі недасягальныя для вока. Скрозь па дарозе відны былі толькі машыны ды фурманкі.

Тады дзяўчынка пачала ўглядацца ў сваіх суседзяў. «Ці ёсць тут коннікі?» — перш-наперш цікавіла яе. Коннікаў яна магла адрозніць заўсёды, калі не па сініх пятлічках, дык па асабліваму паху. Ёй чамусьці здавалася, што тут, у кузаве, абавязкова павінен пехта быць з іхняга палка. Калі ж ёсць, то яна адразу пазнае яго.

Адзін баец ляжаў у кутку ля самай кабіны. Пятліцы на яго гімнасцёрцы былі ў крыві, таму нельга было пазнаць, якога яны колеру. У байца была перавязана галава. Трохі лепш перавязана, як у самой Святланы, але ў гэтым жа месцы. Валасы густа чарнелі на цемі, а каля самай раны не відно было ніводнага валаска.

— Ці добра ён перавязаны? — спытала дзяўчынка ў машыністкі і непрыкметна паказала вачамі на байца.

— Нядобра, — ціха адказала машыністка, — але на такой дарозе цяжка паправіць.

— Цётачка,— зноў неўзабаве загаварыла дзяўчынка і ўжо шэптам. У яе голасе чутны былі ноткі горнасці і шчырага давер'я.— А ў яго рана такая ж, як у мяне, праўда?

— Не, што ты? — здагадаўшыся, у чым рэч, пачала ўгаворваць дзяўчынку машыністка.— У цябе зусім не та-

кая, у цябе — малепечкая, драпінка проста. Твая хутка загоіцца, і знаку ніякага не будзе.

— А валасы? — нясмела прашаптала дзяўчынка.

— Усё ў цябе будзе добра, усё,— суцяшала машыністка.— Не думай нічога кепскага. Потым вось што, Светачка: не заві мяне цёткай, а проста па імю. Зінай мяне завуць.

Дзяўчынка змоўкла, усё яшчэ не спускаючы сумных вачэй з перавязанай галавы байца, а Зіне стала няёмка, што яна сказала падлетку няпраўду. Не цяжкая рана на галаве ў Святланы, але хто ведае, як яна будзе гаіцца. Скура над ілбом садрана, магчыма, і сапраўды не будуць расці валасы. Мабыць, дзяўчынка адчувае гэта і не верыць ніякім словам.

Баец ля кабіны раптам наварушыўся, застагнаў, і Святлана спалохана адвяла вочы.

— Вады-ы,— ледзь чутна папрасіў ён.

— Ёсць у каго вада? — спытала Зіна.

— Даўно няма,— адказаў адзін з тых, што сядзелі на кабіне.

— Хаця б глыточак, Зіначка,— раптам пачула дзяўчына зусім побач з сабою.— Усё нутро ссохлася.

Зіна азірнулася на гэты голас.

— Адкуль вы ведаеце маё імя? — спытала яна, яшчэ добра не разабраўшы, хто гэта гаварыў.

— Дык у мяне ж толькі вочы завязаны,— з жартаўлівай ноткай адказаў баец,— а вушы не. Падслухаў...

Святлана таксама паглядзела на гэтага байца і ледзь не ўсклікнула ад нечаканасці: у яго на гімнасцёрцы былі сінія пятліцы.

— Стукайце шафёру ў кабіну! — падала каманду Зіна, калі машына ўляцела ў вуліцу адной невялікай вёсачкі.

— Не спыніцца ён,— сказаў той баец, што сядзеў бліжэй да кабіны.

— Стукайце! — цвёрда паўтарыла дзяўчына.— Мы яго прымусім спыніцца.

Застукала адразу некалькі байцоў.

— Што такое? — крыкнуў шафёр, прытармазіўшы машыну.

— Вады трэба набраць,— сказала Зіна.

На дзіва ўсіх, шафёр адразу ж спыніўся і выключыў матор.

— І мне трэба вады,— сказаў ён, выцягваючы з-пад сядзення пагнутую бляшанку.— Толькі прашу — у момант: раз-два! А то немец прэ за намі.

Зіна з дапамогай Святланы сабрала ў байцоў біклажкі, праз якую хвіліну яны былі напоўнены ля калодзежа, шафёр заліў ваду ў радыятар, і машына памчалася далей.

Глытнуўшы свежай вады, байцы павесялелі, сталі глядзець на дзяўчат з большай павагай, а сусед з завязанымі вачамі мнагазначна сказаў:

— У нашым палку таксама была Зіна, машыністка. Харошая, кажуць, была дзяўчына, але загінула, напэўна, бо першыя бомбы ўпалі на штаб.

— Вы з таго палка? — рынулася да яго Святлана, але Зіна ўхапіла яе за плечы і прытуліла да сябе.

— Не трэба, Светачка,— зашаптала яна,— не трэба, родная. Лепш нічога не ведаць, чым распытваць цяпер. Людзей будзем трывожыць і сябе.

— Светачка ў нас таксама была, — нечакана сказаў баец. — Дачка камандзіра палка.

Дзяўчынка дрыжала ад хвалявання, ледзь не плакала, а Зіна ўсё туліла яе да сябе і ўгаворвала маўчаць.

— У вас вельмі тонкі слых,— сказала яна байцу, каб хоць як-небудзь пачаць іншую размову,— чуеце самы ціхі шэпт.

— Вушы ў мяне добрыя,— ніколькі не сумеўшыся, згадзіўся баец.— Вялікія. Бачыце? — Ён абедзвюма рукамі пацягнуў сябе за вушы.— Таму і ловяць усё.

«А як мой тата? — нястрымна хацелася спытаць Святлане.— Ці не чулі вы чаго пра майго тату?»

Баец, нібы адчуваючы жаданне дзяўчынкі, пачаў усё ж гаварыць пра свой полк, сказаў бы ён, напэўна, і пра камандзіра палка, але ў гэты час нечага зачмыхала машына і пачала сутаргава, са штуршкамі спыняцца.

— Прыехалі! — абвясціў нарэшце шафёр, вылезшы з кабіны.— З'елі ўсё гаручае!

Твары ў байцоў пазмрачнелі, а Зіна адчула быццам бы нейкую палёгку, бо каб не гэты выпадак, то сляпы баец напэўна сказаў бы пра пагібель Святланінага бацькі. Зіна была ўпэўнена, што камандзір загінуў.

— Гэта — номер! — сказаў баец з павязкай на вачах.

— Ну, нічога! — дадаў шафёр, паглядваючы з-пад чуба толькі на Зіну. — Вы тут крыху пабудзьце, а я збегаю

вунь у тую вёску, дастану хоць газы якой.— Ён зноў выцягнуў з кабіны сваю пагнутую бляшанку.— Я хутка, раз-два!

Шафёр пабег, пазвоньваючы бляшанкай, і ўсе тыя байцы, што сядзелі на бартах, праводзілі яго сумнымі і безнадзейнымі позіркамі.

— Цяпер будзем загараць,— прамовіў сляпы баец.

— Ціха вы! — загадала яму Зіна.— Трэба зрабіць усё, каб не стаяць тут доўга.

Яна рухава саскочыла з борта, выйшла на сярэдзіну дарогі і пачала настойліва спыняць грузавікі. Амаль усе шафёры спыняліся, аднак гаручага пакуль што ніхто не даваў.

— А што б мы рабілі з тым гаручым, — усё ж не стрымаўся сляпы баец,— калі б нам яго і далі? Хіба вы — шафёрка?

— Я шафёр,— раптам заявіў адзін з тых байцоў, што сядзелі на краю кабіны.

— Рукі і ногі ў цябе цэлыя? — спытаў сляпы баец.

— Рукі цэлыя, — адказаў той,— і нага адна здаровая. Зіна! — звярнуўся ён да дзяўчыны адразу па імю.— Паглядзі там, шафёр пакінуў ключы ці не?

— Пакінуў,— адказала дзяўчына, зірнуўшы ў кабіну.

— Значыць, паедзем.

І яны, канечне, паехалі б, дагналі б недзе свайго чубатага шафёра, каб у гэты час не з'явіліся над шашою варожыя самалёты. Усе байцы, хто хоць трохі мог варушыцца, пачалі саскокваць, а то проста звальвацца з машыны. У кузаве астаўся толькі той чарнявы юнак з перавязанай галавою ды яшчэ некалькі байцоў, вельмі цяжка параненых. Зіна паспрабавала высадзіць і іх, з усёй сілы памагала ёй Святлана, але дваім ім цяжка было спусціць на зямлю амаль што нерухомых байцоў. Тады падняўся з кювета і на адной назе прыскакаў да машыны той баец, што назваўся шафёрам. Спрытным рухам працавітых рук ён апусціў задні борт. Падбег яшчэ адзін вайскавік, з падвязанай рукой, з двума трохкутнікамі на пятліцах, і яны ўдвух пачалі прымаць на рукі тых параненых, якія самі нават паварушыцца не маглі.

Самалёты ўжо раўлі над самай шашою і над вёскаю, куды чубаты шафёр пайшоў шукаць бензіну. Вайсковыя машыны віхрам праносіліся міма заглохлага і быццам ужо нікому не патрэбнага грузавіка... Шафёры выціскалі з іх

апошняе, каб хутчэй ускочыць у вёску, а там дзе-небудзь прытуліцца, навесці маскіроўку.

Святлана з жудасцю паглядала, як некаторыя байцы на хаду выскоквалі з машыны, перакручваліся па некальпі разоў на адхоне, а потым знікалі ў быльніку ці прыдарожным жыце. Яе вельмі цягнула ўбачыць, ці астаюцца яны жывымі, таму пры набліжэнні кожнай машыны яна ўзнімала галаву з кювета, а Зіна моўчкі прыціскала дзяўчынку да зямлі.

Фашысцкія сцярвятнікі пачалі бамбіць шашу, спускаліся зусім нізка і страчылі па машынах з кулямётаў. Святлана прытулілася да свае старэйшае сяброўкі і пры кожным выбуху бомбы ўздрыгвала, закрывала рукамі галаву. Ёй здавалася, што ўсе самалёты віселі якраз над яе галавою і вельмі добра бачылі яе крэмавую павязку, яе святочную сукенку, таксама светлую, толькі ў малінавыя палоскі. Цяпер дзяўчынцы ўспаміналася, што калі яна спала ў штабе, на мяккай татавай канапцы, то ў сне чулася такая ж самая траскатня, гул і шум, але тады нават і не снілася, што гэта вайна. Хто яе ведаў, якая гэтая вайна, хоць бацька дома і многа гаварыў пра яе.

Вельмі ж боязна было, каб не выцяла што па галаве. Галава і так баліць, і на ёй ужо, мабыць, не будуць расці валасы. А ў таго чарнявага хлопца, што ляжаў ля кабіны, напэўна, яшчэ горш баліць галава. Дзе гэта ён цяпер? Там, дзе мы яго паклалі, у кювеце, ці можа адпоўз куды? Хоць бы на дарогу не выпаўз, шукаючы ратунку ад болю...

Святлана пачала думаць пра тых байцоў, якіх яны нядаўна знялі з машыны, пра тых, што пападалі тут яшчэ на хаду і недзе ляжаць цяпер ля дарогі, жывыя ці нежывыя. А колькі машын пайшло далей! Яны недзе ў вёсцы. Асталіся на іх вось такія, як наш чарнявы, бо наўрад ці памог ім хто-небудзь злезці з кузава...

Думкі пра іншых крыху супакоілі Святлану, у яе пачала з'яўляцца ўпэўненасць, што хутка ўсё скончыцца, што ніякі асколак яе не зачэпіць. Нават боль стаў нібыта меншы. Пройдзе яшчэ трохі часу і ўсё загоіцца, бо Зіна вельмі добра перавязала ранку.

Уявілася, як хутка пачнуць вылазіць з кювета і выпаўзаць з жыта пасажыры той машыны, што стаіць і чакае ўсіх на шашы. Два хлопцы, адзін аднарукі, а другі аднапогі, памогуць Зіне пакласці ў кузаў цяжка параненых,

прыбяжыць з вёскі чубаты шафёр, і паедуць яны ўжо без усякіх перашкод аж да самага шпіталя. Сляпы кавалерыст будзе жартаваць у дарозе, а Зіна, магчыма, дазволіць распытаць у яго пра вайсковы гарадок.

Такія былі Святланіны ўяўленні. А калі гул самалётаў аддаліўся і Зіна сказала, што ўжо можна выходзіць на шашу, усё паўстала зусім іначай. Машына была нібы і цэлая, але на ёй не было капота, радыятара і стаяла яна значна ніжэй, чым раней, бо скаты былі прастрэлены. Аднаногі шафёр выкульгікаў з жыта на дарогу, агледзеў грузавік і безнадзейна махнуў рукой.

Зіна ўсё яшчэ спадзявалася, што знойдзецца нейкая магчымасць паехаць далей. Яна чакала шафёра з гаручым, верыла, што гэты чалавек дапаможа: не здолее паставіць на ногі гэтую машыну, дык адшукае другую.

Але не прыйшоў шафёр у той дзень, не прыйшоў і ноччу. Хто ведае, што здарылася: можа раніла ці забіла, а можа не захацеў ён звязваць свой лёс з гэтымі бездапаможнымі людзьмі, сеў на другую машыну і паехаў.

На жаль, гэтак жа зрабілі і некаторыя іншыя з тых, каго вёз чубаты шафёр. З хадзячых хворых асталіся ў жыце пры цяжкараненых той аднарукі, што меў два трохкутнікі на пятліцах, ды шафёр, хоць ён нязкепска мог кульгікаць на адной назе. Астатнія неўзабаве падаліся на шашу і рушылі ў напрамку вёскі. Астаўся, праўда, яшчэ сляпы кавалерыст, але ж гэты без павадыра не здолеў бы і двух крокаў ступіць.

У той дзень жылі амаль што зусім пры дарозе. Зіна прынесла з вёскі рыдлёўку, выкапалі канаўку, каб хавацца ад налётаў. Прынесла яна таксама трохі самагону, што выпрасіла ў людзей. Удваіх са Святланай яны прамылі раны і налажылі новыя бінты ўсяму свайму шпіталю.

Сляпы кавалерыст, калі яму добра працерлі вочы, пазнаў Святлану. Выявілася, што пашкоджаны ў яго былі не самыя вочы, а ўсё надброўе і часткова павекі. Чалавек проста разануўся недзе, калі вылятаў з канюшні разам з коньмі, цаглінамі падмуркаў і раструшчанымі бэлькамі. Зразумеўшы, што сляпым ён не будзе, ды яшчэ пазнаўшы Святлану, кавалерыст так развесяліўся, што жартаваў нават і тады, калі ніякія жарты былі не да месца. Маленькі шпіталь весела прыняў яго хуткую папраўку, бо ў лагеры прыбаўляўся яшчэ адзін працаздольны і вельмі карыс-

ны чалавек. Баяліся, праўда, каб ён не даў маху з жыта, як зрабілі некаторыя яго суседзі па кузаву.

Увесь той дзень гурчалі на дарозе машыны, тарахцелі падводы, ішлі і беглі людзі. Зіна раз-поразу выходзіла на шашу, «галасавала», упрошвала шафёраў узяць раненых байцоў. Мала хто спыняўся, заўважыўшы яе паднятую руку, а калі спыняўся, то рабіў спачувальны выгляд, паказваў на свой кузаў і зноў паспешліва ўключаў хуткасць.

Пад вечар яны выйшлі на дарогу ўчацвярых: кавалерыст, якога ўжо ўсе ў лагеры звалі Грыцко або Грыцаем, часова аднарукі камандзір аддзялення, Зіна і Святлана. Яны амаль сілай пачалі спыняць машыны. Адзін чалавек у цывільнай вопратцы сам пачаў тарабаніць свайму шафёру, калі ўбачыў наперадзе такую грозную заставу. Ён стаяў у кузаве ля кабіны і прытрымліваў за вераўчаны залыгач карову.

— У чым справа, таварышы? — гучна спытаў чалавек. — Пад'ехаць хочаце? Дык недалёка еду, усяго якіх вярстоў пяць. Раненых? Не, раненых не магу. Вось дзевачак можна падвезці, калі хочуць.

Грыцко і камандзір аддзялення сталі на падножку каля шафёра:

— Калі толькі рушыш без майго дазволу — аглушу дурня. Бачыш, што гэта? — І Грыцко паказаў шафёру камень.

— Дык можа так рашым,— пайшоў гаспадар на хітрыкі, бачачы, што цяпер яму ўжо тут не выкруціцца.— Я даеду вось да гэтай вёскі, згружу там усё, а тады прыгазую да вас.

— Прыгазуеш,— недаверліва паўтарыў Грыцко.— Дурняў знайшоў.

— Ды што вы, таварышы, — пачаў абурацца гаспадар, — за каго вы мяне прымаеце. Сказаў, што падвязу, значыць падвязу. Недалёка, праўда, бо гаручага мала, але падкіну кіламетраў за дзесяць.

— Ну, паехалі! — раптам загадаў Грыцко.— Няма часу таргавацца. Я правяду вас да вёскі і разам вернемся. Паехалі!

Ён глянуў на шафёра, і той даў газ, не чакаючы каманды гаспадара.

Шчуплы ў постаці і вельмі сталы і вялы з твару камандзір аддзялення саступіў з падножкі. Ён, вядома, згадзіўся з рашэннем Грыцко, хоць у душы трошкі сум-

няваўся, што ўсё гэта пойдзе на карысць. Угаворыць гаспадар кавалерыста, і яны драпануць адсюль разам. Зіна чамусьці больш давярала Грыцко, але і яе крыху збянтэжыла гэтае яго раптоўнае рашэнне.

Вярталіся ў свой лагярок з нейкай надзеяй і з трывогай у душы. Усе трое разумелі, што гэта была апошняя спроба паехаць, дабрацца да шпіталю. Пачынала цямнець, ноччу машыны ідуць без фар і ніводная не спыніцца, хоць нават ляжаш на дарозе. А заўтра?.. Хто ведае, што будзе заўтра.

— Гэта Вальчын бацька паехаў,— задумліва сказала Святлана.— Валька з мамаю ў кабіне сядзела і калі хацела загаварыць са мною, дык мама прыкрыла ёй рот.

— Чаму ж ты сама не загаварыла? — крыху здзіўлена спытала Зіна.— Знаёмыя людзі. Яны ўзялі б цябе, і можа так было б лепш.

— Я не хацела з імі ехаць, — рашуча сказала дзяўчынка.

Прыдарожны лагярок чакаў сваіх пасланцоў цяпер з асаблівай нецярплівасцю. Усе параненыя, нават і тыя, каторыя адчувалі сябе вельмі дрэнна, разумелі, што нейкі ратунак павінен быць знойдзены толькі сёння. Кожны раз, калі Зіна адыходзіла на дарогу, яны праводзілі яе шчырымі, даверлівымі позіркамі, а потым чакалі з хвіліны на хвіліну. Апошні выхад чацвярых яшчэ больш абнадзеіў іх, і тут ужо кожная хвіліна здавалася гадзінай. Усе верылі Зіне, спадзяваліся на яе, бачылі ў ёй свайго збавіцеля ад пакут, а то можа і ад смерці. Калі сёння Зіна нічога не дамажацца, калі яе старанне не прынясе дабра, дык што будзе далей, што чакае ўсіх наперадзе? Харчоў амаль што няма — рэдка хто паспеў у трывозе падрыхтаваць рукзак. Вады таксама няма. А што ўжо гаварыць пра нейкае лячэнне, пра бінты, пра медыкаменты?

Даведаўшыся, што Грыцко паехаў на падпожцы грузавіка і павінен хутка прыехаць назад, лагер павесялеў, а кульгавы шафёр пачаў запэўніваць, што ён даедзе на гэтай машыне хоць да самай Масквы і кожнага давязе, куды трэба. Папрасілі Машкіна (такое прозвішча насіў шчуплы камандзір аддзялення) пайсці на дарогу падзяжурыць, каб адразу ж даць знаць, як толькі пад'едзе Грыцко.

Аднак праходзіла гадзіна, другая, а машыны ўсё не было. Ужо ўсё ў лагеры было падрыхтавана да хуткай нагрузкі, шафёр нават змайстраваў насілкі для пераноскі ляжачых хворых, а ад Машкіна — ніякага сігналу.

«Збег Грыцко,— пачалі падумваць некаторыя,— выкарыстаў зручны момант».

Ужо і Зіна пачала хвалявацца, ужо і ў яе сталі з'яўляцца трывожныя думкі наконт кавалерыста, але ў гэты час прыбег у лагер Машкін, сеў на снапку зялёнага жыта побач з Зінаю і, аддыхаўшыся, сказаў:

— Па-мойму, сябры, гэта немцы!

Усе, хто мог, паднялі галовы...

— Я доўга ляжаў у разоры,— гаварыў далей камандзір аддзялення,— хацеў упэўніцца. Спачатку праехалі матацыклісты. Цёмна, не разбярэш, — я яшчэ сумняваўся. А потым пайшлі бронемашыны, і я ўбачыў: тэхніка не наша, людзі не нашы. Значыцца, нас ужо абышлі.

— Будзем сядзець тут, пакуль цёпла і за шыю не лье, — паспрабаваў пусціць жарт шафёр. Але ніхто не падтрымаў яго жарту, ніхто нават не глянуў у яго бок. Многім успомнілася, што сапраўды з гадзіну назад быў нейкі злавесны перапынак на шашы: не чутно было гулу машын, людскога гоману, тарарахкання калёс. Мабыць, апошнія з нашых адышлі, а ворагі яшчэ не прыйшлі.

Зіна тут ужо не ведала, што і сказаць, за што брацца, якімі парадамі падтрымаць хворых. Ёй так цяжка стала на душы, што цямнела ў вачах, яна неяк аж спалохалася, уявіўшы ўсё тое, што адбылося. Пакуль за спінаю былі нашы часці, пакуль на граніцы — яна ведала — ішло гераічнае змаганне, пакуль той полк, у штабе якога яна служыла, быў яшчэ на сваім месцы і таксама вёў барацьбу з ворагам, жыла ў сэрцы нястрымная воля змагацца, перамагаць усялякія цяжкасці, смагнуць без вады, галадаць, стаяць пад кулямі і пад бомбамі, каб толькі хоць чым-небудзь памагчы фронту, тым байцам, якіх яна бачыла кожны дзень. А калі за спінаю — страшна падумаць! — ужо нічога няма, калі вораг ступіў на нашу зямлю, заняў той цудоўны лясок каля горада, які за апошнія гады стаў яе родным, зайшоў у зялёныя вуліцы, забрудзіў пэўна той маленькі, абвіты плюшчам домік, дзе асталася яе матуля, здалося цяпер, што быццам бы знік увесь сэнс змагання, што рукі пачынаюць апускацца і язык не варочаецца, каб суцешыць тых бездапаможных людзей, што

моўчкі ляжаць перад вачамі. Святлана таксама адчула нешта горшае, незвычайнае і пачала яшчэ цясней туліцца да Зіны.

Цяжка застагнаў чарнявы баец, і Зіна кінулася да яго. У супакойванні хворага быццам бы лягчэй бавіўся час, аднак на душы мацнела адчуванне нейкай безвыходнасці: не паможаш параненаму байцу, як не паможаш ужо цяпер свайму гораду, сваёй роднай маці. Не хопіць сілы ў цябе на гэта, не хопіць вытрымкі, бо цяжкасці перад табою жудасныя і неадольныя.

Шэптам Зіна спытала ў байца, што яму даць, як зрабіць палёгку. Па сутнасці ж, яна нічога не магла зрабіць, але шаптанне гэтае давала пэўную магчымасць абдумаць становішча, пакуль усе лічылі, што яна вельмі занята. Астатнія байцы таксама быццам бы ўсё забылі ад стогну чарнявага суседа. Адны трывожыліся, што гэтае стагнанне могуць пачуць немцы, другія проста спачувалі таварышу. І кожны ў гэтыя хвіліны думаў: што ж будзем рабіць, калі гэты хлопец перастане войкаць і перакочвацца з месца на месца, што скажа Зіна, ці знойдзе яна хоць якую-небудзь параду?

Толькі Зіна адышлася ад хворага, як у жыце нешта зашамацела. Гэта яна пачула адразу, але не паверыла сабе. У такім душэўным стане можа і ў галаве зашумець. Глянула на байцоў, ажно ж і тыя насцярожыліся. Машкін лёг, як ляжацца для страляння, і здаровай рукой выняў з кішэні нож. Пачалі варушыцца і шукаць нечага ў кішэнях і пазухах і некаторыя іншыя байцы. Шафёр выцягнуў з кірзавага галянішча ручную гранату.

— Што гэта, Зіначка? — пачала ціхенька плакаць Святлана. А Зіна і сама не магла нічога сказаць, толькі ў яе чамусьці зусім не было страху: няхай будзе, што будзе, абы хутчэй які канец.

Шалясценне ў жыце пачулася зусім блізка, і нехта да шэпту прыцішаным голасам спытаў:

— Дзе вы тут, братва?

Машкін усхапіўся на ногі.

— Ні д'ябла не бачу вас тут, — гаварыў далей той жа голас ужо крыху мацней.— Пахаваліся, пачлежнікі бісавы.

— Грыцко! — ледзь не крыкнуў ад радасці Машкін і, сагнуўшыся, шуснуў у жыта яму насустрач.

Кавалерыст выйшаў на прагалачак, дзе ляжалі хворыя, сеў на спапок побач з Зінай і выняў з кішэні свой бінт.

— Прашу прабачэння, доктар,— звярнуўся ён шэптам да дзяўчыны,— прымайструйце мне гэтую павязку зноў.

— А нашто ж вы яе знялі? — сапраўды як доктар спытала Зіна.

— Замінала яна мне, лоб гітлеру паказвала ў цемнаце.

Зіна ўзяла са свайго невялічкага запасу чысты бінт і, калі стала перавязваць Грыцко, заўважыла, што твар у яго вельмі змрочны і разгублены. «Чаму ж у голасе ніякай трывогі не чуваць? — міжвольна надумала яна.— Не хоча хлопец раздзіраць сваю душу перад хворымі людзьмі? Можа, гэта і правільна. Так, мабыць, і трэба рабіць моцнаму чалавеку».

— Чаму ж ты без машыны? — спытаў шафёр і, як здалося Зіне, спытаў занадта патрабавальна, нават грозна.

Тут трэба было спытаць, як хлопец дабраўся сюды, як не трапіў у рукі ворагу, а не патрабаваць машыны. Але ў шафёра была, відаць, свая праўда. У больш тонкія пачуцці ён не ўваходзіў, а ведаў адно: узяў баец даручэнне, дык павінен выканаць. Гэта, па сутнасці, быў загад. І не аднаго чалавека, скажам, камандзіра аддзялення, а вось і Зіны, і Святланы, і ўсіх тых, што ляжаць тут і маўкліва паглядаюць, як Зіна перавязвае Грыцко лоб.

— І вочы мне завяжыце, і вочы! — настойліва запатаў Грыцко замест таго, каб адказаць шафёру.

— Навошта ж гэта? — безуважна сказала Зіна, не перапыняючы свае справы.

— Каб не бачыць мне, што робіцца навакол,— зусім ціха прамовіў Грыцко. І Зіна адчула, што ні кропелькі жарту не было ў гэтых словах і што яны былі сказаны толькі для яе адной.

Затым хлопец пачаў гаварыць ужо для шафёра і іншых байцоў:

— Пакуль высадзіў я там з кузава гэтую карову, пакуль адбіў атаку гаспадара і асабліва гаспадыні, дык і немцы на вуліцы. Бачу — бяда. Гаспадар спужаўся, пачуўшы пра немцаў, а гаспадыня зусім звар'яцела: кры-

чыць немым голасам па ўсю вуліцу і гатова горла мне перагрызці за карову. Бачачы, што машыны цяпер ужо не ўзяць, я пачаў націскаць на шафёра, каб ён кінуў усё і пайшоў са мною. Ён чалавек мясцовы, падумаў я, ведае тут усё навакол. Спатрэбіцца такі чалавек. Хлопец вылез ужо з кабіны, а тут гаспадынька як кінецца з лямантам на мяне ды аберуч за мой бінт. Сцяміў я тут, што справы мае слізкія: кабетка гэтая хоча і карову сваю даіць, і мяне ўпячы гітлеру ў лапы. Давялося пайсці на грэх: тузануў я яе за куллы, ды так з тымі каўтунамі, што асталіся ў руцэ, і падаўся ў вішняк. Пакуль яна там галасіла, я ўжо на загуменнях быў. Праскочыў паўзком у жыта і іду сабе цішком паўз дарогу. Жыта добрае тут, мне, як чалавеку нізкаросламу, дык і прыгінацца асабліва не трэба было. Іду, а па шашы гітлер прэ. Ён, нечысць, туды, а я назад, насустрач яму. І добра мне на душы, што не ўцякаю ад яго, і страшнавата трохі.

Шафёр больш не задаваў Грыцко пытанняў, ды не было патрэбы яшчэ пра што пытацца. Вяртанне кавалерыста вельмі кранула ўсіх байцоў. Хоць ён нічым і не памог лагеру, хоць і цяпер яшчэ не было вядома, што рабіць, як ратавацца, але ў кожнага на душы з'явілася нейкае прасвятленне. Грыцко падтрымаў усіх ужо тым, што прыйшоў сам.

— Дарэмна, выходзіць, я насілкі майстраваў,— толькі і сказаў шафёр.

— Насілкі якраз спатрэбяцца, — задумліва прамовіў Машкін.— Баюся, што мала будзе адных.

Нейкую хвіліну ў лагеры панавала цішыня, быццам кожны абдумваў сваю важную прапанову. Ніхто пакуль што не мог сказаць нічога пэўнага, аднак усім было ясна, што перш за ўсё трэба адысці ад дарогі, бо да раніцы на гэтым месцы аставацца нельга.

— Пайсці нам са Святланай у вёску,— нібы сама з сабою пачала разважаць Зіна.— Паспрабаваць там знайсці людзей, каб пусцілі ў якую пуню ды памаглі перабрацца. Але ж дванаццаць чалавек... Хто гэта пусціць?

— І гітлер у вёсцы,— дадаў Грыцко.

— У вёску наўрад ці можна,— усумніўся Машкін, і яго падтрымалі амаль усе байцы.

— Тады трэба выбіраць месца пакуль што тут,— сказала Зіна і неяк асабліва ўважліва паглядзела на Грыцко. Ёй было няёмка перад гэтым байцом. Хлопец,

можа нават малодшы за яе, пізкарослы, несамавіты на выгляд, а вытрымка ў яго такая, што кожны можа пазайздросціць. Дзяўчыне падумалася, што яна ўжо больш ніколі не гляне на свет так, як паглядзела некалькі хвілін таму назад.

Машкін устаў.

— Пайшлі! — сказаў ён шафёру, мабыць не хочучы турбаваць Грыцко, як чалавека, напэўна, стомленага. Але Грыцко ўстаў хутчэй за шафёра, і ўтрох яны пайшлі выбіраць больш зручнае месца.

Над палеткам спусцілася ноч. Цёплая, кароткая, але густа-цёмная і крыху вільготная. Дзіўна было тое, што ноч прынесла і цішыню, хоць не надта ўтульную, ненадзейную, але ўсё ж такі цішыню. Нават на шашы стала спакойна.

Зіне не верылася ў гэтую цішыню, усё ёй здавалася, што гэта зман, што ў такі суровы час не можа быць цішыні ніколі, нават у самую глыбокую ноч. А Святлана нібы і чакала гэтага спакою: яна прыхінулася да Зіны, падагнула ледзь не да барады голыя каленкі і заснула. Адзін баец, паранены ў ногі, клапатліва заварушыўся, выцягнуў з-пад сябе шынель і накрыў ім дзяўчынку.

— Дзякуй вам,— сказала Зіна,— але ж можа вам самім будзе холадна.

— А я вось саломкі пад сябе, — сказаў баец і працягнуў руку, каб вырваць некалькі жмень зялёнага, але ўжо каласістага жыта.

— Я вам памагу,— сказала Зіна і асцярожна стала адхіляцца ад Святланы, каб пакласці яе галаву на снапок. Падаўшыся крыху ўбок, яна аберуч пачала рваць пругкае, але ласкавае, бо ўжо крыху роснае, жыта. Некаторае каліўе перагіналася ў яе пальцах і аставалася ў руцэ без кораня, большасць жа вырывалася з коранем. Ад карэнняў пахла свежай зямлёй (які прыемны і знаёмы з дзяцінства быў гэты пах!), а зламанае каліўе таксама пахла, ды так, што хацелася ўдыхаць яго водар, глытаць яго, як ваду ў вялікую смагу.

— Я вам дам ножык,— прапанаваў баец. І голас яго быў ласкавы, спагадлівы. Відаць, і да яго дайшоў гэты жыватворны пах, відаць, і яму прынёс ён успаміны пра ўсё лепшае, што было ў дзяцінстве, у раннім юнацтве.

Зіна пачала зрэзваць каліўе нажом, і выходзіла ў яе нейкае цудоўнае і зусім незвычайнае жніво. Ціхі шор-

гат ад гэтага жніва радаваў душу, падаваў, здавалася, яшчэ больш прыемны пах. Хоць і шкада было зялёнага жыта, але хацелася зжаць яго больш. Гэта, мабыць, для таго, каб падмякчыць пасцель не толькі вось гэтаму байцу, які сам праявіў чуласць і размаўляе так ласкава, а і ўсім астатнім. Вядома, для гэтага, але ж было тут і нешта іншае. Каму не па сэрцы ў цяжкую гадзіну хоць на момант забыцца аб усім тым, што бачыш навакол, што гняце тваю душу? Жніво для Зіны — ледзь не самае светлае, што асталося ў яе памяці з дзіцячых год, ледзь не самае чароўнае. Жніво для яе — гэта нават і не работа, а толькі асалода, не той абавязак, ад якога баліць і ные спіна, а суцэльнае хараство і ўцеха.

Дзяўчынцы мала даводзілася і нагінацца, калі яна вучылася жаць. Нават і на той неўрадлівай палосцы, якую меў тады Зінін бацька, жыта расло вышэй за яе. Яна жала заўсёды побач з матуляй. Бацька прыходзіў к поўдню, зносіў снапы і састаўляў іх у бабкі або ў мэндлікі і ішоў на іншую работу. Зіна ведала, што ішоў ён не на сваю работу, а на панскую, бо са свае палоскі нельга было пракарміцца. Ведала, што польскія паны маглі пакрыўдзіць тату, маглі замучыць яго на рабоце, і таму заўсёды з трывогай і ўцешнай надзеяй чакала вечара, калі бацька зноў прыйдзе на поле і зноў пачне насіць снапы. Любіла Зіна глядзець, як бацька зносіў снапы. Сама яна, калі і падыме, бывала, адзін сноп, дык ледзь цягне яго перад сабою,— каласы абіваюцца аб іржышча. А бацька адной рукой ускідае снапы на плечы так лёгка, нібы гэта якія лялькі, а не снапы, абкладзецца гузырамі, што і сам не відзён. Крочыць тады бацька, падобны на жытнюю капу, і здаецца Зіне, што няма на свеце чалавека больш дужага, больш здатнага да працы.

Калі б толькі ні прыходзіў бацька на поле, заўсёды дзяўчынцы рабілася надзвычай весела і радасць брала, калі ён хоць на хвіліну садзіўся на сноп, закурваў або палуднаваў разам з імі: еў спелыя вішні з хлебам. І гэтак усюды, і гэтак кожны раз было з бацькам весела і радасна.

Цяпер Зіне часта ўспамінаюцца тыя часы маленства і амаль заўсёды здаецца, што яны былі напоўнены чаканнем бацькі. Спачатку яна чакала яго на полі, а дома — з работы, з адыходных заработкаў. Пазней — з польскай дэфензівы і з турмы, куды забіралі яго піл-

судчыкі за падпольную рэвалюцыйную дзейнасць. Раз прычакала, другі раз прычакала, нават і трэці раз прычакала. А чацвёртым разам як узялі, дык гады прайшлі ў чаканні, маці згорбілася і пасівела, дачка за гэты час вырасла, а бацькі ўсё не было. Потым прыйшла на поште цыдулка, што арыштант Іван Пруднікаў памёр у турме.

Змрочным тады стала ўсё навокал: пямілай была свая хата, чужой і непатрэбнай выглядала палоска, якая да таго часу ўжо амаль зусім перастала радзіць. Узялі тады дачка і маці вялікія кії ў рукі, павесілі на плечы торбы з сякімі-такімі пажыткамі і пайшлі ў свет. Служылі потым у горадзе ў розных людзей, не цураліся самай чорнай работы. Зіна трохі вучылася пры людзях.

Пасля вялікага ўз'яднання яна скончыла курсы машыністак і неўзабаве наступіла на службу ў штаб кавалерыйскага палка.

Незвычайнае начное жніво ўзбудзіла ў Зінінай душы вось гэтыя ўспаміны. Чаму б не паўспамінаць у такую цішыню? Ці доўга яна будзе, ці не парушыць яе штонебудзь нават ужо ў наступную хвіліну?..

Раптам дзяўчыне здалося, што жне яна занадта смела, што складаны ножык, хоць ён і не серп, а рэжа неяк гучна, са скрыгатам. І Зіна спалохалася гэтага скрыгату: а што, калі пачуюць на дарозе, калі пачнуць сюды страляць?

— Хопіць вам ужо,— ціха сказаў ранены баец.

І тады дзяўчына зразумела, што сапраўды пара канчаць жніво. Выцерла палоскай марлі ножык, аддала яго байцу, а сама стала падбіраць сарванае і зжатае каліўе. Ці вялікі выйшаў бы сноп, калі б усё гэта звязаць?

Баец падклаў пад сябе трохі жыта, а з астатняга зрабіў нешта падобнае на пасцель для Зіны.

— Ляжце адпачніце, пакуль хлопцы прыйдуць,— спагадліва сказаў ён. — Ды вось мой рукзачок. Вазьміце яго пад галаву.

Калі Зіна прымасцілася зноў каля Святланы, баец, уздыхаючы, доўга наглядваў на яе, а потым стаў паспешліва і ўсхвалявана гаварыць, нібы баючыся, што дзяўчына хутка засне і не пачуе яго слоў.

— Там у мяне ў рукзаку — вязанка мяккая... З шоўку, мабыць, з аднаго, ці можа трохі шэрсць прымешана. Я збіраўся ўжо ехаць дадому, дык купіў мацеры. Вазьміце, калі ласка, гэтую кофту ды адзеньце.

— Ну, што вы? — здзівілася Зіна.— Гэта ж падарунак, вы яго абавязкова завязіце сваёй мацеры.

— Дык вам жа холадна,— з добрай ласкавасцю ў голасе гаварыў далей баец.— От ужо і цяпер усё расою прыпадае, а пад дзень можа і зусім прыстудзіць. Вы тады змерзнеце ў такой адзежы, як у вас. А ці адна цяпер такая ноч наперадзе?

— Нічога, не змерзну.— Зіна цясней прытулілася да Святланы.— Вось мы ўдваіх ваппым пынялём накрыемся, а там я што-небудзь дастану ў вёсках: свет не без добрых людзей.

— Я вас вельмі прашу,— ледзь не з крыўдай пачаў гаварыць баец.— Да мацеры цяпер ужо мне не даехаць, хоць і білет у кішэні і дакументы, што адслужыў свой тэрмін. Мне хочацца зрабіць вам гэты падарунак, усё роўна, як сваёй мацеры.

Зіна пакуль што нічога не адказала. Ёй здалося, што ўсе байцы слухаюць іхнюю гэтую, магчыма, залішне інтымную размову, а каму гэта трэба — да аднаго адносіцца лепш, як да ўсіх астатніх. Цяпер трэба было любіць і паважаць усіх аднолькава, быць для ўсіх шчырым таварышам, сястрой.

Аднак, калі Зіна прыслухалася, то заўважыла, што ўсе байцы, у тым ліку і цяжка хворыя, спяць. Ціхая летняя ноч, напоўненая пахам малочнага жыта, зняла з іх сэрцаў хваляванні і трывогі, зняла, мабыць, і боль з ран.

— А вам далёка трэба было ехаць? — спытала Зіна, калі ўпэўнілася, што ніхто лішні іх не слухае.— Адкуль вы родам?

— Ды яно і недалёка, калі ехаць,— з радасцю, што ўзнавілася размова, адказаў баец.— А калі ісці, то наўрад ці хопіць ног. З нашага Палесся я, з вёскі Забалоцце. Можа чулі пра такую?

— Не чула,— з павагай да шчырасці байца адказала Зіна,— але рада, што вы адтуль.

— Чаму? — у голасе байца адчулася здзіўленне.

— Зямляк мой,— задаволена сказала Зіна,— гэта — па-першае, а па-другое — блізка вам да родных мясцін. Усё ж такі гэта прыемна.

— Дык і вы адтуль?— баец ужо не толькі здзівіўся, а ўзрадаваўся.

— Я не адтуль,— нібы з жалем, што сапраўды не ад-

туль, сказала Зіна,— але ж і ў такіх выпадках байцы завуць адзін аднаго землякамі. Я з-пад Брэста.

— Дык вядома землякі! — ледзь не ўскрыкнуў баец.

— З адной рэспублікі, значыць, і землякі.

Ён памаўчаў з хвіліну, а потым яшчэ больш шчыра і па-сяброўску папрасіў:

— Дык вазьміце маю вязанку, зямлячка.

Вярнуліся хлопцы з свае першае разведкі. Грыцко сказаў Зіне, што тут непадалёку, за жытам, знайшлі хмызнячок. Расце там ядловец, маладая алешына, крушыннік. Ёсць месцамі мох. З боку ад дарогі — балотца, і ідзе яно далей, аж на той бок хмызнячку. Да ўсходу сонца трэба туды перабрацца.

Невялічкі лагярок адразу прачнуўся. Сталі вызначаць, каго несці на насілках, каму памагчы рухацца сваім ходам, а хто можа хоць як-небудзь і колькі-небудзь прапаўзці.

...Апошнім неслі чарнявага байца, параненага ў галаву. Недзе каля сярэдзіны дарогі ён раптам падняўся на насілках, закрычаў, замахаў рукамі. Святлана спужалася яго крыку і ледзь не выпусціла кончыка насілак, за які трымалася, ідучы побач з Грыцко. Трымалася яна, каб памагаць Грыцко, а Грыцко прымаў яе дапамогу толькі для таго, каб дзяўчынка не згубілася ў цемры. Чарнявы баец раптам змоўк, адкінуў на насілкі забінтаваную галаву і пачаў часта, роспачна ўздыхаць.

— Куды вы мяне несяце, браткі? — раптам жаласліва спытаў ён.

Зіна, ідучы з Машкіным наперадзе, прыпыніла крок, агледзелася. Яна ўпершыню пачула гаворку гэтага байца і ўзрадавалася, што, магчыма, яму стала лепш. Яна памкнулася загаварыць з хворым, але Грыцко апярэдзіў яе.

— У шпіталь едзем,— сказаў ён спакойным голасам,— у шпіталь, брацс.

— Не трэба мяне нікуды везці,— стаў прасіць хлопец,— не трэба мучыцца. Усё роўна ўжо...

І пасля гэтага ён зноў прыціх. Зіна чакала, што баец скажа яшчэ што-небудзь, але ён пачаў стагнаць цяжэй, як раней.

— Мабыць, не ачуньваюць людзі, калі іх параніла ў галаву? — задумліва прашаптала Святлана.

Грыцко адразу адказаў:

— Самая цяжкая рана, гэта ў жывот, а ў галаву нічога. Галава ў чалавека моцная.

— Калі і выжыве,— гаварыла далей Святлана,— то можа калекам астацца: здурнее або яшчэ што...

— Хто?

— Ну вось ён.

— Нічога кепскага з ім не будзе,— упэўнена сказаў Грыцко.— Бывала, мы на скачках колькі разоў пераляталі цераз галовы коней і чорт нас не браў: цэлымі аставаліся і мазгі варылі.

— Дык то на скачках,— не згаджалася дзяўчынка.

— А што на скачках? — пачынаў ужо ісці на спрэчку Грыцко.— Ты яшчэ не ведаеш, што часам бывае на скачках. Бывае там горш, як на фронце. Аднаго разу наш камандзір узвода Бандарэнка так грымнуўся разам з канём, што думалі — канец. А паляжаў крыху ў санчасці і ўстаў. Каня больш лячылі, чым яго.

— Лютага? — нясмела спытала дзяўчынка.

— Не, тады ён быў на другім кані. Люты, ого! Люты не спатыкнецца. У яго ногі, як у чорта. Хату пераскочыць і не пачуеш, седзячы на ім. Ты, нябось, часта ўспамінаеш Лютага, га?

Святлана маўчала. Грыцко адчуў, як пры яго пальцах задрыжала яе рука.

— Чаму ты нічога не кажаш?

Дзяўчынка ўздыхнула і прызналася, што Зіна просіць не распытваць пра вайсковы гарадок.

— Гэта яна баіцца,— сказаў Грыцко.— А чаго тут баяцца? Я вось таксама ўсё не мог з табой пагаварыць, хоць адчуваю, што ты чакаеш гэтага. Гарадка ўжо няма, вядома, а людзі ёсць. Людзей нашых не так лёгка знішчыць. Твой бацька, напрыклад, жыў і здароў. Сам бачыў, як ён лётаў на кані між казармаў і аддаваў розныя загады. Бачыў, пакуль не разанула мне па вачах, а потым чуў яго голас. Ты надта не бойся за свайго бацьку. Чалавек ён смелы, адважны, а смелых і кулі не бяруць. Помніш Чапаева?

— А Бандарэнка як? — ціха спытала дзяўчынка.— Ці не бачылі вы Бандарэнкі?

— Як жа не бачыў,— ахвотна пачаў расказваць Грыцко.— Разам былі... Ты толькі добра трымайся, а то тут ужо няроўна пад нагамі: жыта скончылася. Бярыся за маю руку, калі хочаш... Разам мы былі з камандзірам

узвода, і абодвух нас адным махам аглушыла. І абодвум нам павязло, трэба сказаць. Мне хлопцы памаглі выбрацца, а Бандарэнку — Люты. Калі загарэліся канюшні (гэта мне байцы потым расказалі), Люты сарваўся з прывязі і з дзікім гігатам пачаў насіцца па гарадку, шукаць свайго гаспадара. Байцы злавілі яго, падвялі да параненага Бандарэнкі. Люты ўбачыў ляжачага камандзіра, ціха заржаў і апусціўся перад ім на пярэднія калені. Памаглі камандзіру сесці, і Люты ўстаў, раздуў ноздры, выцягнуўся і плаўна, але віхрам, памчаў на выхад. Вынес камандзіра з агню, а там наша санітарная машына падабрала яго. Машына пайшла па шашы, а Люты з усёй сілы пусціўся за ёю. Памчаўся так, што толькі і бачылі яго. Так што ты не бойся і за Бандарэнку.

Святлана ішла моўчкі, стараючыся больш глядзець пад ногі, каб не спатыкацца і не штурхаць насілак. Твару яе не відно было, таму Грыцко не мог вызначыць, паверыла яна яго словам ці не. Яму вельмі хацелася, каб яна паверыла, хоць і цяжка было гаварыць дзяўчынцы няпраўду і шкада было яе за тое, што яна так уважліва слухае і ўся дрыжыць ад хвалявання.

— Дзе ж цяпер Люты? — нібы спытала, нібы так сабе сказала Святлана.

— Люты? — Грыцко быццам не адразу расслухаў пытанне.— Гэты конь не прападзе. Вярнуўся, пэўна, у часць, ваюе цяпер. Такіх коней мала.

Падышлі да балотца, паклалі насілкі на зямлю, таму што Зіне і Святлане трэба было скінуць абутак. Адпачылі хвілінку і пайшлі далей. Шлёпаў Грыцко мокрымі ботамі па балоце і ўсё думаў: добра ён зрабіў, што расказаў Святлане нешта падобнае на байку, ці нядобра? Сам ён быў упэўнены, што і камандзір палка і Бандарэнка загінулі.

* * *

Больш за месяц жылі байцы непадалёку ад дарогі. Спачатку ў тым хмызнячку, куды перабраліся ў першую ноч, а потым знайшлі яшчэ больш зручнае і ўтульнае месца.

Па дарозе сунулася, плыла фашысцкая зграя. Сунулася яна да таго самаўпэўнена, што амаль не азіралася на бакі. Удзень з-за тоі жытнёвай горкі, што аддзяляла хмызнячок ад дарогі, можна было наглядаць клубы пылу, калі машыны і ўсялякая іншая тэхніка кранала шынамі абочыну.

У лясок далятаў лязгат гусеніц і гул матораў. А начамі амаль заўсёды было ціха і быццам бы нават спакойна. Спакоі гэты непакоіў і хваляваў хлопцаў горш, як недалёкія стрэлы, як узрывы бомбаў. Людзі, адарваныя ад усяго свету, ледзь не пазбаўленыя слыху, зроку, руху, палохаліся гэтай цішыні. Нахлыналі цяжкія думкі, з'яўляліся жудасныя здагадкі. Калі ўсюды гэтак ціха, то, можа, няма і супраціўлення ворагу; можа, усе нашы байцы ляжаць вось так у розных месцах, хто паранены, а хто забіты; можа, уся наша тэхніка ляжыць вось гэтак жа па дарогах, як тая машына, на якой яны не так даўно ехалі. Дзе ж цяпер фронт, куды зайшоў вораг?

У гэтыя зманлівыя па сваёй цішыні ночы, а часам і ўдзень Зіна і Святлана выходзілі з лагера. Зіна завязвала тады чорную хустку, падарунак адной бабулі, каб на людзях выглядаць старэйшай, каб Святлану маглі прызнаваць за яе дачку. Хадзілі яны ў бліжэйшыя вёскі, а іншы раз наведваліся і ў далёкія. Перад некаторымі людзьмі яны былі проста бежанцамі, а перад некаторымі — самі сабой. Толькі яны маглі здабыць для раненых кавалак хлеба і сёе-тое да хлеба, толькі яны маглі знайсці такіх людзей, да якіх можна было потым наведацца Грыцко, Машкіну або шафёру. Праз гэтых людзей іншы раз удавалася ўлавіць якую-небудзь вестку з фронту. Цяжка было верыць ёй, аднак жа, калі гэта была прыемная вестка, то не трэба было ў той дзень для раненых лепшага лякарства.

У вялікай трывозе і напружанасці праходзілі дні. Тыя байцы, што трымаліся на нагах, і тыя, што павінны былі хутка стаць на ногі, трывожыліся за сяброў, раны якіх не гаіліся. Такога доктара, як машыністка Зіна, мала было для гэтых хворых. Трывога і боль за блізкіх сяброў зліваліся з трывогай і болем за сяброў далёкіх, за родныя хаты, за бацькоў і матуль, за ўсю Радзіму. А становішча ў лагеры ўсё горшала і горшала. Мала таго, што кожную гадзіну трэба было думаць, як хавацца, як здабываць харчы і самыя неабходныя медыкаменты, дык неўзабаве дайшло да таго, што трэба было думаць і аб пахаванні сваіх сяброў. А хто на свеце быў бліжэй за тых, з кім было пражыта хоць некалькі такіх суровых дзён?

Калі памёр чарнявы баец, ранены ў галаву, Святлана так прыняла гэта да сэрца, што за яе самую рабілася страшна. Спачатку дзяўчынка плакала, а потым стала скардзіцца на боль у галаве. Ёй не толькі шкада было

хлопца, якога яна больш за ўсіх даглядала, як магла і чым магла лячыла,— у яе знікла надзея на тое, што загоіцца свая рана, што не пакіне яна ніякага следу на галаве або нават і ў галаве. Колькі гора было Зіне ад гэтага, колькі гадзін адарваў ад неабходнага сну Грыцко, каб суцешыць дзяўчынку, каб вярнуць ёй хоць трохі спакою.

Што далей, то ўсё больш і больш лагер прымаў абжыты выгляд. Даволі ўтульнымі станавіліся нізкія, добра замаскіраваныя буданчыкі, мякчэлі ў іх пасцелі для раненых. Была зроблена ў зямлі такая печка, дзе на малым агні можна было грэць ваду, сёе-тое варыць, пячы. Быў нават выкапаны свой калодзеж. Але ж калі непадалёку з'явілася і свежая магілка, то некаторым пачало здавацца, што ўсе буданчыкі падобны на яе. Потым буданчыкаў станавілася ўсё менш, а магілак больш. Іх цяжка было абысці тым, хто нёс пэўную службу і выходзіў, скажам, па грыбы або па ягады. Адкуль бы ён ні падыходзіў, усё роўна нейкая сіла натыкала яго спачатку на магілкі, а потым на буданы. Яшчэ цяжэй было ляжаць тут людзям нерухомым, тым, якія яшчэ не ведалі, вылезуць яны калі-небудзь з будана самі ці можа іх вынесуць адтуль. Калі ж вынесуць, то ўжо вядома куды. Гэтыя людзі не бачылі магілак, але нібы адчувалі іх побач з сабою і па начах снілі або ўяўлялі ў трызненнях тых сваіх сяброў, якія яшчэ зусім нядаўна ляжалі побач з імі.

Сполахі смерці віталі над лагерам, аднак жыццё брала сваё. Як ні цяжка было часам да ўсходу сонца, а першы летні прамень весяліў вочы нават тых, якія мала глядзелі на свет, рассейваў пакутлівыя сны, праганяў галаўны боль у Святланы. І людзі папраўляліся. Магутны арганізм беларуса, Зінінага земляка, хутка пераадольваў вялікую знямогу ад ран. Ногі яго паступова выпростваліся, набывалі пруткасць. Грыцко ўжо даўно зрабіў яму мыліцы, але яны ляжалі пакуль што ля бока хлопца і чакалі свае пары.

— Ты, Міхал, лішне не залежвайся,— часта гаварыў байцу Грыцко. — Ты не думай аб тым, як ты дзе ляжаў і колькі ляжаў, а ўспамінай, як ты на вечарынках аджарваў гапака. Скакаў ты гапака?

— Яшчэ як,— усміхаўся Міхал.

Мабыць, ва ўсякім жыцці, нават самым цяжкім, бываюць свае прасвятленні, свае радасці. Для лагера было сапраўды незабыўнай радасцю тое, што Міхал нарэшце моцна абхапіў рукамі мыліцы Грыцко, устаў і хоць з вя-

лікай цяжкасцю, але ступіў некалькі крокаў па траве.

— Лявоніху! — у захапленні скамандаваў Грыцко і, усхапіўшыся, палез у кішэню свайго кавалерыйскага галіфэ па расчоску. Ён зайграў на расчосцы нешта дробнае, нястрымнае і так завіляў сваімі кароткімі, трохі выгнутымі з сярэдзіны нагамі, што нават нежывы не мог бы ўстаяць.

Міхал скалануў пажаўцелай ад доўгага ляжання ў цяньку галавой, затрос плячамі і паваліўся, як толькі падняў нагу, але смяяўся і лежачы, бо адчуваў, што будзе танец, калі не сёння, дык заўтра.

Шафёр ужо даўнавата перастаў скакаць на адной назе, бо пачала даставаць зямлю і другая. Машкін зняў з шыі павязку,— рука яго ўжо сама магла апускацца і падымацца. Ачуняла і яшчэ некалькі хлопцаў. У лагерным жыцці не было ўжо тых асабліва цяжкіх гадзін, калі Грыцко, Машкін і шафёр ішлі куды-небудзь па харчы, а Зіна са Святланай аставаліся адны. Усе былі ў той час кволыя, бездапаможныя. Калі б наткнуўся на лагер хоць які-небудзь прыблудны немец, дык і нічога з ім не зрабілі б, бо ні сілы амаль што ніякай не было, ні зброі. Цяпер, хоць нават і некалькі байцоў выходзілі на разведку ці на пошукі харчавання, зброі, усё роўна ў лагеры не было боязна: хлопцы ўжо мелі карабіны, самі неслі службу, маглі, калі б на гэта была патрэба, і пастаяць за сябе. З'явілася цвёрдая надзея. А гэта было якраз тое, чаго іншы раз не хапала лагернікам.

Набліжаўся канец шпітальнаму жыццю, набліжаўся паход, магчыма цяжкі, самаахвярны, але непазбежны. Набліжалася самая рашучая і бязлітасная барацьба. Усе былі прасякнуты гэтай думкай, гэтай рашучасцю. Падрыхтоўка вялася і днём і ноччу, бо работы было многа. Трэба было любымі намаганнямі стварыць невялікі запас харчавання, вады хаця на першы пераход, а галоўнае — найлепш узброіцца, мець дастаткова боепрыпасаў. Гэтым быў заняты кожны баец, і ўсім прыемна было ад таго, што маленькі лясны шпіталёк, без урача, без пэўных спадзяванняў на папраўку, паступова ператварыўся ў надзейную баявую групу.

Перад самым выхадам Зіна са Святланай пайшлі на досвітку ў далёкую дзённую разведку. Ім трэба было вы-

канаць цяпер складаную задачу ўжо зусім вайсковага характару. Неабходна было выведаць, дзе стаяць немцы і дзе іх няма, якімі дарожкамі і якімі сцежкамі трэба прабірацца, каб не наткнуцца на ворага.

Уся група чакала ў гэты дзень дзяўчат яшчэ з большай трывогай, як часта Зіна са Святланай чакалі Грыцко ці Машкіна, калі тыя доўга не вярталіся ў лагер. Вядома, што ад гэтай разведкі залежала вельмі многае. Калі пачало хіліцца к вечару, Грыцко ніводнай хвіліны не мог усядзець на месцы; ён усё выцягваўся на сваіх каржакаватых нагах і паверх кустаўя ўглядаўся ўдаль. Усе хлопцы больш трывожыліся за Святлану. Яна, яшчэ не зусім здаровая пасля ранення і кантузіі, ды наогул не звыклая да вялікіх пераходаў, магчыма, прыстала дзе-небудзь на дарозе.

— Не трэба было пускаць дзяўчынкі,— нібы сам сабе выказаў думку Грыцко.

— А яна — галоўная разведчыца, калі хочаш ведаць,— не згадзіўся Машкін.— Без яе Зіна ўсяго не выведае ды і засыпацца можа хутчэй. Малое пралезе ўсюды.

— А калі прыстане, то на руках нясі,— не згаджаўся Грыцко.

Шафёр бліснуў сваёй рэдказубай усмешкай.

— Трэба было табе самому пайсці,— сказаў ён Грыцко.— Зняў бы свае галіфэ, дык якраз за малога сышоў бы.

— Не балбачы! — агрызнуўся хлопец, а Машкін нездаволена глянуў на абодвух і загадаў:

— Праз гадзіну каб усё было гатова да выхаду! Давайце без лішніх размоў!

Шафёр сеў на пянёчук і стаў моўчкі завязваць свой паходны мяшок, а Грыцко з хвіліну яшчэ ўглядаўся, а потым, нібы хто падпёк яго знізу, падскочыў, на хаду перамахнуў высокі ядлоўцавы куст і памчаў у той бок, куды толькі што глядзеў. Неўзабаве ён вярнуўся з Зінай і Святланай. Разведка прайшла добра, не было нават якіх-небудзь надта складаных перашкод, толькі стомленасць скавала ногі, ісці далей разведчыцы не маглі б.

— Адпачніце,— сказаў ім Машкін.— З гадзіну можаце адпачыць, а як толькі змеркне, у дарогу.— Ён, нібы ўпотай, глянуў спачатку на Святлану, а потым на насілкі.

— Мы пойдзем! — упэўнена сказала Святлана, і Машкіну стала прыемна.

— Адпачывайце,— паўтарыў ён, а сам адышоў да буданчыка, дзе ляжалі сабраныя за час лагернага жыцця боепрыпасы.

Грыцко прынёс дзяўчатам па паўкацялка ячпага крупніку. У гэты дзень ён быў дзяжурным па лагеры і сам варыў гэты крупнік, сам потым падтрымліваў у пячурцы цяпло, каб страва не надта астыла. Усе хлопцы ўзяліся за апошняе, што было неабходным перад паходам — чысціць і мазаць зброю, а Грыцко печакана для ўсіх выцягнуў аднекуль вялікія, што авец стрыгуць, нажны, задрынкаў імі, заляскаў аб расчоску і, падышоўшы да пеньчука, падаў голас:

— Хто хоча не прыстаць у дарозе ад цяжасці на галаве і ад свербу, падыходзьце сюды! Пакуль нашы разведчыцы і праважатыя з'ядзяць крупнік, абгалю ўсіх не горш, як у гарадской цырульні.

Першы падышоў без пілоткі і сеў на пень шафёр. Грыцко загарнуў расчоскай проста ад ілба яго жорсткую рыжаватую чупрыну і лёгка, нібы толькі ўзмахнуўшы нажнамі, зняў яе. Праз некалькі хвілін шафёр трохі нагадваў стрыжанага барана, але быў задаволены, паціраў далонямі галаву і ўхмыляўся. Следам за ім сеў на пяньчук Міхал, потым адзін узбек падставіў сваю да бляску чорную галаву, за ім — яшчэ некалькі байцоў. Апошні падстрыгаўся Машкін, бо ён увесь гэты час быў заняты рознымі падрыхтоўчымі справамі.

— А хто ж цяпер мяне аголіць? — спытаў Грыцко і, запусціўшы тоўстыя пальцы ў свае злямчаныя валасы, адцягнуў на лоб пасму і адрэзаў.

— Давай я,— падручыўся Міхал.— Ты сам сабе яшчэ вуха адрэжаш.

Астрыгшы Грыцко, Міхал абцёр аб салдацкія штаны нажны, аддаў іх гаспадару, а сам пачаў збіраць у жменю валоссе, што рознакаляровым дыванам ляжала вакол пня.

— Каб не балелі ва ўсіх галовы,— нібы жартам, нібы ўсур'ёз гаварыў ён, укленчыўшы каля пня,— трэба зграбці ўсё гэта і закапаць. А то калі агледзіць якая птушка ды зацягне ўсё багацце ў сваё гняздо...

— Гэта ты ад свае бабкі чуў? — страсаючы з-за вушэй валасяную сечку, спытаў Грыцко. Галава яго пасля стрыжкі зрабілася круглай, як гарбуз, лоб стаў больш высокі, а рот — больш шырокі.

— І ад бабкі,— згадзіўся Міхал,— і ад дзеда.

Гэты хлопец паогул мала калі з кім спрачаўся. Натуры ён быў ціхай і памяркоўнай. Калі не падабаліся яму чые словы, дык ён толькі моўчкі круціў галавой, а ў сварку не лез. Пакуль ён ляжаў, заўсёды падагнуўшы ногі, усе думалі, што гэта кволы і маларослы хлопец, а цяпер ён так выпрастаўся, так увайшоў у сілу, што стаў ледзь не вылучацца сярод усіх. Ростам ён быў лічы што на дзве галавы вышэй за Грыцко, статны, спрытны ў рухах. За якую работу ні браўся, яна гарэла ў яго руках. Нават гэтыя валасы збіраў ён так акуратна і хораша, што Зіна міжвольна прытрымала ля вуснаў лыжку з крупнікам і зірнула на яго рукі.

Перад самым адыходам Машкін пастроіў свой атрад. Каманда яго прагучала няўпэўнена, крокі, калі ён праходжваўся ля строю і аглядаў кожнага байца, былі няцвёрдыя. Мала яшчэ камандаваў Машкін, бо толькі нядаўна скончыў палкавую школу. Аднак паколькі сярод раненых ён адзін меў камандзірскае званне, то неяк само сабою выйшла так, што ўсе прызналі яго старшым, і ён ужо даўно нёс на сабе гэты крыж.

З усходу, нібы наўмысля для таго, каб зазірнуць хлопцам у твары, каб потым асвятляць ім дарогу, выплыў амаль яшчэ зусім поўны месяц. Забялелі вяршынкі ядлоўцу пад яго святлом, у хлопцаў заблішчалі рулі вінтовак і карабінаў за плячамі, ручкі гранат на паясах. А буданчыкі, тыя буданчыкі, у якіх, як здавалася ўсім, пражыта самая важная частка жыцця, выглядалі пад месяцам адзінока і сіратліва. Уваходы ў іх былі адкрыты, адтуль віднелася свежае сена і, напэўна, пахла прывабна і зазыўна. «Пераначуйце яшчэ хоць ночку»,— быццам бы гаварылі буданы.

Зіна, стоячы збоку і трымаючы за руку Святлану, з жалем глядзела на свой нізенькі, на дзіва прыгожы і ўтульны буданчык. Колькі мазалёў нагнаў Грыцко, пакуль змайстраваў яго! Не давядзецца больш у ім начаваць, і можа ніколі ўжо не ўбачыш яго, як не ўбачыш свае роднае хаты, свае роднае сям'і. Такія думкі мільганулі ў дзяўчыны, але адразу і зніклі, бо стала думацца аб тым, што калі б нават і праз дзесятак год давялося пабываць у гэтых мясцінах, то ўсё роўна ў першую чаргу пацягнула б да гэтых незабыўных буданчыкаў.

— Развітаемся, сябры, са сваім лагерам,— сказаў Машкін з вайсковай халаднаватасцю, нібы ён не адчуваў у гэ-

ты момант таго, што адчувала Зіна і, бадай, усе хлопцы.— Развітаемся таксама з тымі, хто астаўся тут.

Дасюль глядзелі на буданчыкі, на ўсё тое блізкае, дамашняе, што з'явілася за гэты час у лагеры, а цяпер перад зрокам кожнага паўсталі магілы, хоць іх і не відно было адсюль.

— Шагам марш! — скамандаваў Машкін і сам пайшоў наперадзе.

Байцы строем падышлі да могілкаў. На некаторых магілах пачала прабівацца трава, на ёй блішчалі скупыя кроплі расы, а большасць насыпаў яшчэ жаўцела зверху глыбінным жвірам. Байцы знялі пілоткі, застылі ў жалобным страі. Машкін стаяў з аднаго боку магілы, Зіна і Святлана — з другога.

Машкін адчуваў, што трэба нешта сказаць, ды не знаходзіў слоў. Адчуваў ён таксама, што нельга тут доўга стаяць, бо толькі разжалобіш байцоў, аднак не ведаў, колькі часу адвесці на гэта. Стаяў моўчкі, як і ўсе.

Прайшла хвіліна, другая. Цішыня і спакой у ляску, цішыня і поўная нерухомасць у страі. Яшчэ праз хвіліну нехта з байцоў паварушыўся, у яго пад нагою трэснуў сучок. Машкіна гэта падштурхнула падаць каманду, а Зіна гатова была нават падысці да яго ды папрасіць, каб не спяшаўся. Ёй хацелася яшчэ хоць паўхвілінкі пабыць тут. Кожнага, хто тут ляжыць, яна лячыла, кожнага даглядала. Колькі прайшло цяжкіх, пакутлівых дзён, колькі бяссонных начэй. Дзіцячыя слёзы Святланы ліліся над галовамі гэтых байцоў. Ныла сэрца ад таго, што, каб было ўсё патрэбнае для лячэння, калі б была Зіна сапраўдным урачом, то, магчыма, многія з гэтых нежывых стаялі б цяпер у страі.

— Пайшлі,— раптам зусім ціха і зусім не па-вайсковаму сказаў Машкін.

Байцы самі павярнуліся і сталі адзін за адным. Зіна са Святланай выйшлі наперад. Машкін надзеў пілотку, прапусціў паўз сябе маўклівую калонку і з сумам падумаў: «Малая ў мяне каманда, вельмі малая. Ледзь не палова байцоў асталася тут, у магілах».

* * *

Ішлі доўга і прайшлі, здавалася, нямала. Лініі фронту ўсё яшчэ не адчувалася і ніхто пэўна не ведаў, дзе яна

была, гэтая лінія. Ішлі ў большасці выпадкаў начамі, да ўсходу сонца, а ўдзень адпачывалі ў жыце або ў лесе. Хада, такім чынам, была не вельмі спорная, і выходзіла, мабыць, так, што фронт ішоў хутчэй.

Зіне са Святланай было цяжэй у гэтым паходзе, як усім астатнім. Пасля начных маршаў па лясах, па балотах (добра, калі дарога ляжала праз жыта) дзяўчатам трэба было ўдзень праведаць дарогу на наступную ноч. Яны ж увесь час выручалі групу і ў самым галоўным, у харчаванні. Маладая бульба-скараспелка ўжо сям-там пракідалася на полі, але ж не заўсёды лёгка было яе напячы, ды не працягнеш доўга на адной такой бульбе. Зіна нейкім інстынктам адчувала, да каго трэба зайсці, каб распытаць дарогу, у каго папрасіць чаго-небудзь з харчоў або з адзення. Вясковыя людзі амаль заўсёды даверліва сустракалі яе і памагалі чым маглі. У Святланы была цяпер свая шэрая хустка і нават світка. Праўда, усё гэта хатняга гатунку, але ж Святлане цяпер і зручней было выглядаць тутэйшай дзяўчынкай.

Аднаго разу (гэта было ўжо больш як праз месяц пасля выхаду групы са свайго лагера) байцы спыніліся на адным грудку сярод балота і наважылі дні два адпачыць, агледзецца. На другі дзень пад вечар дзяўчаты пайшлі ў бліжэйшую вёску мяняць на прадукты сякія-такія салдацкія рэчы. Разведчыцы ўжо адзін раз наведваліся ў гэтую вёску, немцаў там не было, дык яны ішлі без асаблівай перасцярогі. Што там за рэчы ў іх былі? Вядома, не каштоўнасці якія-небудзь, а тое, што байцы з апошняга маглі адарваць ад сябе: некалькі парануч, некалькі ўціральнікаў. З пустымі рукамі цяжэй было хадзіць сярод белага дня, ды і выпрошваць у людзей не падта лёгка. Лепш ужо, вядома, прапанаваць мяну якую-небудзь.

Непадалёку ад тоіі вёскі, куды ішлі дзяўчаты, стаяў хутар, добра абгароджаны дзе высокім частаколам, а дзе пілаванымі плашкамі. Учора дзяўчаты прайшлі паўз гэты хутар не спыняючыся, а сёння спыніліся, бо ўбачылі на брамцы нейкую аб'яву. Не паспелі яны прачытаць і першага радка, як з двара выйшаў пажылы кіслагубы чалавек і, зняўшы кепку, прывітаўся з Зінай:

— Добры вечар, пані.

— Я не пані, — рэзка адказала дзяўчына.

— Дык гэта я...— чалавек лагодна засмяяўся, і кіслагубасць яго адразу знікла.— У нас, ведаеце, так было ня-

даўна, а можа яно так і будзе. Дык я гэта, ведаеце, па старой звычцы.

— Так ужо не будзе! — рашуча сказала Зіна і ў гэты ж момант падумала, што дарэмна ўступіла з гэтым чалавекам у спрэчку. Хто ведае, што гэта за чалавек. Ёй трэба было зусім не паказваць тут сябе, але інстынкт пратэсту міжвольна ўзяў верх. Зіна раптам адчула, што вось зараз яна яшчэ больш нагаворыць гэтаму шляхцюку, калі толькі ён пачне даказваць сваё. Але чалавек не палез глыбей у спрэчку і нават не пакрыўдзіўся на дзяўчыну за яе грозны тон.

— Усё ад бога, усё ад бога, пані,— дробна і абыякава загаварыў ён.— Можа так яно будзе, а можа іначай,— святы ведае. А мы пажывём, убачым. Я не пра гэта хачу ў вас спытаць. Можа вы, часам, прадаяце што ці мяняеце? Учора я таксама бачыў, праходзілі вы тут з клуначкам.

— Нічога ў нас няма,— недаверліва азвалася Зіна і ступіла крок ад брамкі.

— Ну, калі няма, дык няма,— адразу згадзіўся чалавек.— Я толькі думаў папытаць. Чым несці вам што-небудзь у вёску, то ці не лепш пакінуць тут. У мяне, дзякуй богу, ёсць і хлеб і да хлеба. Магу даць пляцёнку цыбулі або вясельца сушаных грыбоў. А ў вёсцы сёння і не спакойна, лічу сваім абавязкам вам сказаць. Зранку найшло туды многа немцаў.

Зіна глядзела чалавеку ў твар і не ведала, што яму сказаць. Твар гэты быў непрыгожы, аброслы чорна-сівым шчаціннем, аднак у ім не відно было прыхаванай хітрасці ці яшчэ чаго-небудзь пагрозлівага. Чалавек проста хацеў выменяць што-небудзь і больш нічога. Мабыць, не першы раз ён пераймаў тут бежанцаў.

На брамцы, за яго бронзавай ад загару шыяй, бялела аб'ява. Зіна перавяла на яе вочы, але чалавек стаў бліжэй да брамкі і закрыў аб'яву спінаю.

«Няўжо ён наўмысля? — падумала Зіна. — Што ж там такое напісана?» Але чалавек раптам адышоў ад брамкі, нібы гаворачы: «Чытай сабе, калі хочаш». Зіна паспрабавала прачытаць, не падыходзячы блізка, але было ўжо цемнавата, цяжка было разабраць не надта выразны рукапіс.

— Дык згаворымся? — спытаў чалавек і паказаў на Зінін клуначак.

— Ёсць у мяне дзве пары ануч,— нібы толькі для таго,

каб адчапіцца, сказала Зіна,— хочаце, магу вам і аддаць за хлеб.

— Дык мне вельмі трэба апучы! — задаволена прамовіў чалавек.— Давайце зойдзем у хату. У гаспадарцы, ведаеце, усё патрэбна. Зойдзем, паседзяце, адпачняце. Скажу старой, то малака па шклянцы налье, якраз карову падаіла. Малая, нябось, сасмагла. Гэта дачка ваша?

Зіна моўчкі кіўнула галавою.

У хаце было ўжо амаль зусім цёмна. Пахла сапраўды свежым малаком, хоць гаспадыня, дарэчы, зусім яшчэ маладая, дзябёлая жанчына, відаць, ужо даўно ўладкавалася з сырадоем, а цяпер толькі паласкала гарачай вадой дайніцу. За сталом сядзелі і аблізваліся, як сытыя кацяняты, двое малых дзяцей: хлопчык і дзяўчынка, гадоў па тры, па чатыры кожнаму. У абаіх у руках былі бязвухія бляшаныя кубкі, відаць, ужо зусім пустыя. Дзеці ўставіліся на незнаёмых круглымі, як у сыча, вачамі, і мурзатыя тварыкі іх застылі ў нейкім чаканні.

— Брысь на печ! — зыкнуў на іх бацька, падышоўшы да стала.

Дзеці спалохана пакідалі на стол кубкі, адно за адным шмыганулі з-за стала і ў той жа момант апынуліся каля запечку. Дзяўчынка, як большая, трохі лягчэй узабралася на даволі высокую, з роўнымі кантамі печ, а хлопчык, баязліва аглядваючыся на бацьку, сяк-так ускарабкаўся на мяшок са збажынаю, што стаяў па лаўцы ля печы, і павіс жывоцікам на гэтым мяшку. Нейкі час ён узбіраўся далей, старанна махаў пульхнымі ножкамі, а потым выбіўся з сілы і пачаў плакаць. Дзяўчынка падпаўзла на край печы і падала яму рукі.

Гаспадар выйшаў у сенцы, чутно было, як ён там заляскаў цяжкай завалай, потым шчыльна прычыніў за сабою хатнія дзверы і замкнуў іх на ўнутраны замок. Паклаўшы доўгі, як шворан, ключ у кішэню, сеў ля стала.

— Сядайце! — кінуў ён дзяўчатам і, зірнуўшы на дзверы, дадаў: — Гэта я для большай пэўнасці. Ходзяць тут усякія...

Зіна, не падаючы выгляду, што ў яе з'яўляецца падазронасць, села на лаўку каля мыцельніка і прыцягнула за руку да сябе Святлану. Дзяўчынка ўстрывожана глянула Зіне ў вочы, але, убачыўшы там спакой, падсела на лаўку ўпэўнена і вольна, нібы дома. Клуначак з рук Зіны яна паклала сабе на калені.

— Дык паглядзім, што там у вас,— пачаў гаспадар, і на твары яго ўжо не з'яўлялася ніякай усмешкі, а кіслагубасць набывала прыкметы варожасці.— Паглядзім ды пагаворым заадно. Тут нам ніхто не перашкодзіць. Калі праўду сказаць, то ніякія вашы анучы мне не трэба, сваіх жонка натчэ. Мне трэба ведаць, адкуль вы прыйшлі і хто вас сюды паслаў. Скажаце праўду, пойдзеце з богам сваёй дарогай, а не скажаце, то прыйдзецца пагаварыць з вамі іначай, а потым здаць абедзвюх нямецкім уладам.

— Мы здалёк ідзём,— стрымліваючы хваляванне, сказала Зіна.— З-пад самай польскай граніцы.

— Няпраўда,— ледзяным голасам, але быццам бы яшчэ без злосці сказаў чалавек.— Учора цэлы дзень сачыў за вамі. Не здалёку вы прыходзілі і не далёка назад пайшлі. Сёння зноў тут. Думаеце, усе дурныя, а толькі вы ўдзвюх разумныя. Або кажыце ўсё, або...— Чалавек па-зверску зыркнуў на гаспадыню, і тая паспешна адышлася да печы, к дзецям.

— Нам няма чаго больш гаварыць,— спакойна сказала Зіна і ўстала. — Вы вось будзьце чалавекам, адамкніце нам дзверы, і мы пойдзем.

— Не-э, галубка, — мякка засмяяўся гаспадар і зайшоў ад дзвярэй. — Гэтага не будзе, не на такога ты натрапіла. Калі б я нават і выпусціў цябе з хаты ці каб сама вырвалася, то ўсё роўна далёка не зайшла б. Пад кожным вуглом і пад вокнамі ў мяне пастаўлены свае людзі. Паглядзім-ткале, што ў гэтым клуначку.

Ён ступіў да Святланы, але раптам выгнуўся і схапіў Зіну за рукі.

— Лейцы! — крыкнуў ён гаспадыні.

Зіна моцным штуршком вырвала рукі, кінулася да акна і, мабыць, больш галавой, чым рукамі, выціснула раму.

— Святлана! — ледзь толькі паспела прамовіць яна, як нешта жорсткае і, здавалася, пякучае здавіла ёй шыю.

— Я некалі шалёных коней лавіў,— цадзіў гаспадар скрозь зубы, заціскаючы вяроўку на Зінінай шыі,— на дзікіх звяроў хадзіў...

Зіна павалілася на падлогу. Дзеці на печы заплакалі, гаспадыня адскочыла ўбок.

— Вяжы ёй ногі! — крыкнуў чалавек жонцы і адкінуў ад сябе доўгі канец лейцаў.

— Міканор, — жаласліва прамовіла жанчына, аднак падышла і пачала скручваць ляйчынай пасінелыя Зіні-

ны ногі. Другім канцом лейцаў чалавек звязаў дзяўчыне рукі і смяротнымі штуршкамі пад дыхавіцу паварочваў яе так, каб яна ляжала бокам. У гэты момант Святлана схапіла ў мыцельніку дайніцу, з усёй сілы выцяла ёю чалавека па галаве, а сама шмыганула ў акно.

— Дзяржы гэтую! — закрычаў чалавек жонцы, а сам, ухапіўшыся за галаву, кінуўся за Святланай. На двары было ўжо змрочна. Чалавек нешта згледзеў перад сабою, схапіў на бягу палена, папусціў у кусты і, здаецца, пацэліў. Падбег да таго месца,— нідзе нікога няма. Пачаў шнарыць па кустах, каля платоў: «Не павінна ж, шчанё, далёка забегчы». Але ўсюды было ціха, нішто нідзе не варушылася, не падавала ніякага голасу. Чалавек рашыў не траціць на гэтыя пошукі часу, а хутчэй бегчы ў вёску. Калі, на яго шчасце, там сапраўды спыніліся немцы, то далажыць ім, што злавіў бальшавіцкую разведчыцу, а калі няма немцаў, то прывесці ў хату хоць свайго браценіка, якога немцы нядаўна паставілі старастам, ды яшчэ каго-небудзь.

Пакуль гаспадар бегаў, жонка яго сцерагла ў хаце Зіну. Дзеці палахліва ўсхліпвалі, зашыўшыся ў куток печы, хлопчык раз-поразу зваў: «Мама, хадзі сюды». Але мама не адважвалася адысці ад мужавай ахвяры і стаяла каля выбітага акна, трымаючы ў руках канец вяроўкі. З акна патыхала свежым начным паветрам, і гэта памагло Зіне аддыхацца, прыйсці да свядомасці, калі гаспадыня зусім расслабіла вяроўку на яе шыі. У змроку, бо гаспадыня не запальвала агню, Зіна заўважыла, што кіслагубага блізка няма, сэрца адчула, што нешта здарылася са Святланай, і ціха паклікала яе.

— Гэта вы сваю дзяўчынку завяце? — ласкава спытала гаспадыня.

— А дзе яна? — Зіна паспрабавала паварушыцца, устаць з падлогі, але адчула востры боль у галаве, у баку, страшэнна нылі таксама рукі і ногі.

— Дзяўчынка ўцякла з хаты,— нібы нават з уцехай сказала гаспадыня.— Выскачыла вось сюды. Можа вам вады падаць?

Жанчына стала на падлогу каленямі і нахілілася над Зінай. Зусім блізка над сабою Зіна ўбачыла яе ўстрывожаны, але добры твар, чорныя, блішчастыя ў цемнаце вочы.

— Развяжыце мяне,— папрасіла дзяўчына. Яна ска-

зала гэта і сама не верыла, што так сказалася, што яе пачулі, што зноў яе пачнуць біць і душыць.

— Не магу я так, мілая,— азірнуўшыся на акно, ціха загаварыла жанчына. — Вернецца ён, то прыб'е і мяне і вас. Гэта ж ён за вашай дзяўчынкай пабег. Вы яшчэ і падняцца не паспееце, як ён можа вярнуцца. Я хіба вас сама папрашу: скажыце вы яму што-небудзь, каб адчапіцца. Можа якіх палонных дзе тут паблізу бачылі, можа якіх камуністаў? Гэта ж прыйшлі пазаўчора, сказалі, вунь і запіска на брамцы вісіць, што калі хто падкажа, дзе хаваюцца палонныя або камуністы, таму немцы дадуць дзялянку добрай зямлі ды яшчэ і грашамі прыплацяць. За гэтым мой так і стараецца і злуецца. Каму ж гэта не хочацца мець лішні загончык зямлі? А вы яму скажыце, ён вас і пусціць. І дзяўчынку вашу пусціць, калі толькі ён яе дагнаў.

Зіна насцярожліва глядзела на жанчыну і ў першую хвіліну не магла зразумець, як прымаць гэтыя словы. Няўжо гэта такая лісіная хітрасць? І гаспадар пачынаў з гэтакіх жа слоў.

Аднак вочы жанчыны быццам бы не хітравалі, у іх свяцілася жаллівасць, спачуванне, хоць спалох і разгубленасць засланялі ўсё гэта. Хлопчык усё мацней і настойлівей клікаў маму. Ён, відаць, падпоўз на самы край печы, бо плач яго чуўся бліжэй і яшчэ больш жалобіў душу.

— Іду, сыночак, іду-у,— прамовіла жанчына, і нават у цемры Зіна ўбачыла, што па смуглых шчоках гаспадыні пацяклі буйныя кроплі слёз, гэтакія ж блішчастыя, як і яе вочы.

— Зразумейце мяне,— паспешліва зашаптала Зіна.— Зразумейце, як жанчына з добрым сэрцам, як маці вось гэтых дзяцей... Я не магу сказаць яму нічога, ніводнага слова. Няхай нават загіну, а не скажу.

Зіна крыху прыўзняла галаву, каб быць яшчэ бліжэй да гэтай жанчыны, лепш бачыць яе твар, яе слёзы. Дзяўчына рада была б абняць яе за шыю, прытуліць да сябе, ды звязаны былі рукі, цяжка было паварушыцца...

Гаспадар прыбег амаль што праз паўгадзіны. Усунуў раскудлачаную галаву ў выбітае акно, чхнуў, як кот, з'еўшы чужое мяса, потым успёрся рукамі на падаконнік і палез у хату. Улезшы, адразу пабег адмыкаць дзверы. Следам за ім у хату ўвайшлі два плячыстыя мужчыны з дубальтоўкамі. У хаце было зусім ціха, не чутно было

ні стогну, ні плачу дзяцей. Гаспадар паклікаў жонку, але яна не азвалася. Тады ён запаліў запалку і ўбачыў ля сваіх ног зблытаныя лейцы...

Калі праз некаторы час разам са Святланай прыбегла на хутар уся група байцоў, у хаце ўжо не было ні гаспадара, ні тых плячыстых мужчын з дубальтоўкамі. На падлозе валяліся лейцы, толькі яны ўжо былі мокрыя і месцамі ў крыві. Побач з лейцамі ляжала і ціха, зняможана стагнала гаспадыня. Каля яе сядзелі заплаканыя і да смерці напалоханыя дзеці.

* * *

З першага дня вайны не было ў хлопцаў нетурботнай ночы, а гэтая выдалася самая трывожная, самая небяспечная. Усе разумелі, што хутаранец са сваімі дубальтоўшчыкамі знік з хаты не так сабе, што ён можа навесці сюды немцаў ці якую іншую ўзброеную погань. Можа нават і цяпер ён прытаіўся недзе тут у засадзе і чакае зручнага выпадку, каб нашкодзіць. Але трэба шукаць Зіну. Хіба можа нават мільгануць у каго думка, каб яе пакінуць? Што вядома хлопцам пра Зіну? Толькі тое, што на бягу расказала ім Святлана. Пра далейшае амаль нічога. Удалося выціснуць два словы ў знявечанай гаспадыні. Яна сказала, што развязала Зіне рукі і ногі, што памагла ёй вылезці праз акно, а больш нічога жанчына не ведае і шмат чаго не памятае. Можа гаспадар са сваімі падручнымі злавіў дзяўчыну каля хутара і пацягнуў у вёску, можа дзяўчына не мела сілы далёка ісці і звалілася недзе тут у кустах? Усё гэта магло быць, але што б ні было, што б ні здарылася, байцы павінны выратаваць свайго шчырага таварыша.

Не надта далёка было ўжо да летняга світання. На траве і на густых альховых кустах ляжала самая буйная раса, у далёкім беразняку ўжо разы два ціўкнула самая ранняя птушка. Машкін даў каманду агледзець усё ўсюды каля хутара, а потым сабрацца на паляначцы за кустамі. Святлану ён пакінуў пры сабе. Яна так стамілася, так перахвалявалася, што ледзь трымалася на нагах. Праз некалькі хвілін хлопцы былі на ўказаным месцы і кожны з іх далажыў, што нідзе нічога не знойдзена. Параіліся ўсе разам, і потым быў аддадзены загад асноўнай групе ісці фронтам паабапал дарогі аж да таго месца, дзе быў часовы

лагер. Ісці і аглядваць кожны куст, кожную імшаліну. Грыцко ж і Міхалу трэба было прабрацца ў вёску і выведаць, што чутно там.

Ішлі да лагера асцярожна, старанна прыглядаліся, прыслухоўваліся. Святлане спачатку здавалася, што пад кожным кустом яна некага бачыць: то страшнага хутаранца, то Зіну ў чорнай хустцы, у Міхалавай кофтачцы, з абрыўкамі вяроўкі на руках і нагах. Сэрца падказвала дзяўчынцы, што Зіна абавязкова павінна быць недзе тут, што яна не паддалася ў рукі ворагу. Калі хоць трохі ў яе аставалася сілы, то яна ўцякла ад нямецкіх наймітаў, і калі потым нават падкасіліся ногі, то недзе хоць паўзком, а ўсё ж дабіраецца да месца.

Аднак прайшлі байцы і агледзелі ля дарогі ўсё кустаўё, мінулі беразачок, пачалі ўжо набліжацца да свае стаянкі, а Зіны нідзе не было. Аставалася яшчэ надзея на лагер. Можа дзяўчына апярэдзіла іх і прыйшла на месца раней?

На світанні прыйшлі на сваю часовую стаянку. Грудок, зарослы маладымі дубкамі, крушынай і алешнікам, кішэў ужо жвавымі, клапатлівымі птушкамі, іх свіст і цілікание разносіліся адсюль на ўсё балота. Прасохлыя шкілеты леташніх касецкіх будак жаўцелі сярод свежай зелені. Вярхі іх былі наспех накрыты пачарнелым сенам, якое сабралі байцы на пракосах. Не шмат было тут пракосаў, ды і тыя ўжо зараслі атавай. Відаць, не давялося людзям у гэтае лета размахнуцца тут з касой.

У будках таксама ляжала сена, сухое, яшчэ нават пахучае. Так бы хацелася прылегчы на гэтым сене ды хоць трошкі паспаць, хоць да таго часу, пакуль узыдзе сонца ды зліжа расу, якая радуе вока, аднак вельмі мочыць і ацяжарвае абутак.

Але ж ці можна думаць пра сон, пра адпачынак? Машкін з шафёрам агледзелі будкі, узбек і яшчэ тры байцы аббеглі навакольны зараснік і вярнуліся мокрыя, нібы з ракі. Машкін пайшоў на рызыку і нягучна, аднак выразна паклікаў Зіну. Нідзе ніхто не азваўся.

Цень разгубленасці мільгануў на твары ў камандзіра. Ён адчуваў, што трэба прымаць неадкладнае рашэнне, і не ведаў, што сказаць. Аставацца тут і чакаць хлопцаў з вёскі вельмі рызыкоўна,— немцы, напэўна, ужо ведаюць пра іх стаянку. Адыходзіць жа адсюль таксама нельга.

Байцы заўважылі гэтую разгубленасць Машкіна і апусцілі вочы, ніхто з іх не мог нічога падказаць. Аднак вый-

сце ўсё-такі павінна быць. Як заўсёды ў надзвычай цяжкіх выпадках, падступілі байцы адзін к аднаму, і адразу стала крыху лягчэй. Каб не вельмі пакутаваць у маўчанні, шафёр пачаў аглядаць свой карабін, падсумак з абоймамі, гранаты. Нібы па яго прыкладу, нібы інстынктыўна адчуваючы такую неабходнасць, і астатнія байцы пачалі аглядаць сваю зброю.

У гэтую ж хвіліну Машкін аддаў загад: заняць абарону на ўскраіне грудка, наспех акапацца і чакаць, пакуль вернуцца Грыцко і Міхал. У Святланы задрыжалі павекі ад гэтага загаду, але яна нічога не сказала, ні аб чым не спытала, толькі цясней завязала вузельчык свае шэрае хусткі пад барадою ды на ўсе гузікі зашпіліла паношаную хлапчуковую світачку, падарунак адной добрай бабулі. Машкін ціха сказаў ёй:

— Не бойся, Света, ты будзеш са мною.

Бегчы на ўскраіну, выбіраць зручнае месца, акопвацца — усё гэта было не цяжка. А вось ляжаць нерухома пасля зморанасці, ды яшчэ перад узыходам сонца, ды яшчэ ў цяпле, гэта сапраўдныя пакуты. Тут можа задрамаць нават сам генерал, а не толькі радавы баец. І ўсё ж трэба вытрымаць. Машкін можа і не ведаць пра гэта, але сумленне загрызе, калі спусціш вочы.

На шчасце, ляжаць моўчкі доўга не давялося. Не паспелі хлопцы яшчэ добра ўгледзецца ў працілеглы лясок, што сінеў за балотам, як з-за недалёкіх кустоў вынырнулі і падскокам пусціліся па балоце два ўзброеныя чалавекі.

Па кароткіх нагах і шырокіх плячах байцы адразу пазналі Грыцко, а Міхал ужо сам сабою разумеўся. Машкін даў сігнал збору. Грыцко і Міхал паведамілі, што на світанні ў вёску найшло многа немцаў з танкамі і бронемашынамі, усюды ў ваколіцы выстаўлены пасты, таму прабрацца ў вёску не ўдалося. Гаварылі яны толькі з адным пастушком-падлеткам, які ішоў некуды з торбай і пугай, а ніякага статка пры ім не было. Пастушок сказаў, што бачыў хутараніна ў вёсцы, але чужой жанчыны пры ім не бачыў.

— Трэба ісці,— шэптам, каб не пачула Святлана, сказаў адзін з байцоў,— а то канец тут будзе ўсім.

Грыцко так глянуў на гэтага байца, што ён гатоў быў скрозь зямлю праваліцца.

Святлана па губах пазнала, што прапантаў той баец,

зірнула на Машкіна, і пад сэрцам у яе пахаладзела. У шэрых вачах камандзіра зноў мільганула разгубленасць. Тут і кожнаму было б нялёгка прыняць рашэнне, а Машкіну тым больш. Не было ў яго яшчэ звычкі хутка і самастойна ацэньваць усё, што здаралася.

— Я не пайду адсюль,— прыглушана сказала Святлана і заплакала.— Я астануся шукаць Зіну.

— І я астануся,— нібы падхапіў яе словы Грыцко.— Ціха, Святлана, не плач, ніхто без Зіны не пойдзе.

Было вырашана абшукаць увесь лес повідну. У выпадку варожай аблавы агню не адкрываць, а хавацца. Кожнаму байцу — пэўны ўчастак. Сігнал сувязі — такі, а сігнал збору — такі.

Грыцко выпала ісці самым левым флангам і далёка ад дарогі. З ім пайшла і Святлана. Не прайшлі яны і сотні крокаў, як дзяўчынка раптам спынілася і схапіла Грыцко за руку.

— Вунь, глядзіце! — прашаптала яна, паказваючы рукою яшчэ лявей ад сябе.

Грыцко прыставіў да лба далонь, стаў шпарыць вачамі па кустах вербалозніку, што рос ускрай балота. Большыя з гэтых кустоў стаялі яшчэ да палавіны ў сінявата-мутным прадусходнім тумане, а некаторыя з меншых танулі поўнасцю.

— Нічога не бачу,— з жалем сказаў Грыцко.

Святлана маўчала, відаць, і яна ў гэты момант нічога не бачыла. Вочы яе міжвольна напльвалі слязамі. Грыцко апусціўся рукамі на купіну, стаў глядзець паверх травы.

— А што там ты бачыла, Света? — даверліва спытаў ён.

Дзяўчынка напружана глядзела ў тое месца, якое хвіліну таму назад так узрадавала яе, і гатова была заплакаць ад роспачы, ад таго, што цяпер там нічога, акрамя кустоў, не відно.

— Мне здалося, што я там Зініну хустку ўбачыла.

Грыцко падняўся, моўчкі ўзяў Святлану за руку.

— Пойдзем, мілая,— спачувальна сказаў ён.— Так з многімі бывае. Мне вось таксама здавалася, што бачу Зіну, калі ішоў сюды з вёскі.

Прайшлі яшчэ некалькі крокаў, і Святлана зноў спынілася, рука яе задрыжала. На гэты раз і Грыцко пачуў, што з-за тых кустоў, на якія паказвала дзяўчынка, данёсся слабы, працяглы голас. Нехта клікаў Святлану. Грыцко

падаў знак хлопцам і што было сілы памчаўся да вербалозніку.

Зіна ляжала пад кустом у балотнай твані. Знямажанасць, пакутлівы боль у галаве і ва ўсім целе затрымалі яе ў дарозе. З апошняй сілы дзяўчына намагалася да світання прыйсці ў лагер, ды сама не заўважыла, як узяла ў лесе не той напрамак, заблудзілася. Калі пачало світаць, яна зразумела, што ідзе не ў той бок, але ўжо знікала і тая сіла, што была, ногі падкошваліся, перад вачамі ўсплывалі жоўтыя кругі. Нечакана трапіўшы ў балотную ржу, Зіна ўжо не магла выбрацца адтуль.

Да лагера байцы перанеслі Зіну на руках, а там шафёр адразу ж успомніў свае ранейшыя абавязкі. Ён збегаў да старога адонка, выцягнуў адтуль дзве сухія жардзіны і за некалькі хвілін зладзіў насілкі.

Выйшлі са свайго часовага лагера перад самым узыходам сонца. Першыя ласкава вясёлыя праменні засвяцілі байцам у вочы, як толькі яны перайшлі балота.

* * *

Зіна не магла сама ісці некалькі дзён, яе неслі байцы на насілках. Да знямажанасці, пасля той жудаснай ночы, падпала нейкая хвароба: не валодалі ў дзяўчыны рукі і ногі, страшэнна балела галава. Усе гэтыя дні байцы самі хадзілі ў разведку, а ў найбольш небяспечныя месцы, куды самім нельга было прабрацца, пасылалі Святлану. Дзяўчынка нібы пасталела за гэты час. Калі яна адчула, што вельмі патрэбна групе, што па-сапраўднаму памагае байцам, смялей і энергічней сталі свяціцца яе блакітныя вочы. Здавалася, што яна не адчувала ні стомленасці, ні страху, заўсёды была ўпэўнена, што ўсякая перашкода скарыцца перад ёю. Зіне радасна было глядзець на яе. У пагодлівыя дні Святлана нават развязвала сваю хустку, і яе светлыя валасы ззялі на сонцы залатым адлівам.

Цяпер Святлана не саромелася здымаць з галавы сваю хустку. Ранка яе зажыла, і хоць на тым месцы, дзе глыбей была садрана скура, пакуль што не раслі валасы, гэта ўжо не надта турбавала дзяўчынку. Калі зарасла рана, то, нябось, вырастуць і валасы.

Пасля таго як Грыцко з усім сваім стараннем пахадзіў каля Святланы з нажніцамі, прычоска яе стала нават пры-

гожай, з ёй можна было б жыць не толькі ў лясах ды ў балотах, а і ў самым вялікім горадзе.

— Няхай бы і вас Грыцко падстрыг,— сказала яна аднаго разу Зіне, гледзячыся ў маленькі аскабалачак люстэрка. Дзяўчынка падняла гэтае люстэрка ў адной вёсцы на вуліцы. Яно так ярка і прывабна блішчала на сонцы, што нельга было яго не падняць.

У Зіны валасы былі намнога цямнейшыя, як у Святланы, магчыма, што і не такія прыгожыя, але яна не хацела іх абрэзваць. Усё роўна ёй мала калі даводзілася хадзіць без хусткі, да таго ж цяпер не аб гэтым клопат. Душу грызла пакута ад таго, што занемагла ў такі суровы час, што робіць многа нёбыту хлопцам у гэтакім складаным паходзе. За Святлану таксама балела сэрца. Вельмі ж многа яна цяпер ходзіць усюды, многа рызыкуе. На гэтых днях прынесла байцам нават гладыш кіслага малака.

— І з гладышом табе аддалі? — спытала Зіна.

— Не, гладыш абавязкова трэба занесці,— адказала дзяўчынка. — Я сказала бабулі, што мая мама, гэта значыць вы,— усміхнулася Святлана,— асталася непадалёку на дарозе, бо захварэла і не можа ісці.

Калі, не тут кажучы, здарыцца што-небудзь з дзяўчынкай, загінем тады. І цяпер ужо хлопцы немаведама на каго падобны: учарнелыя ад непасільных пераходаў і ад голаду, абадраныя і абшарпаныя, некаторыя амаль зусім босыя. Ды з такой разведкай, якая вядзецца цяпер, далёка не скочыш. Хоць амаль цэлымі суткамі байцы ідуць, хоць адпачынак зведзены да самых неабходных хвілін, усё роўна спорнасці ў руху мала, бо трэба на хаду рабіць разведку, вызначаць маршрут. Трэба, нарэшце, і харчавацца чым-небудзь, піць чыстую ваду. Пасля таго як узбек папакурчыўся жыватом ад балотнай вады, Машкін забараніў набіраць у біклажкі ваду з розных лужын і канаў.

Зіна добра разумела, што калі так ісці ўвесь час, то могуць пасцігнуць асеннія халады, тады прапалі ўсе намеры. Па вачах, па асобных асцярожных рэпліках яна заўважыла, што і некаторыя хлопцы гэтага баяцца, толькі хаваюць свае думкі і ад сяброў, і ад саміх сябе. Таму самае важнае цяпер — папраўіцца, стаць на ногі, а астатняе ўяўлялася нібы нават няцяжкім, нескладаным. Тады і за сабою можна будзе лепш прыглядзець, і за байца-

мі, а разведку даць такую, што можна будзе ісці хутка і без асаблівых перашкод. Пасля цяжкага выпрабавання, якое давялося перажыць на тым шляхецкім хутары, усё цяпер уяўлялася нястрашным, расла ўпэўненасць, што больш ужо ніякаму д'яблу не ўдасца яе перахітрыць.

* * *

Прычакаўся нарэшце той дзень, калі Зіна ўпершыню пасля хваробы пайшла ў разведку. Радасны гэта быў дзень. Байцы сядзелі ў густым зарасніку і з хвіліны на хвіліну чакалі яе. У каго ногі былі пабітыя і абадраныя так, што глядзець на іх страшна, у каго плячук голы і спаласаваны сухім веццем.

Аднак цяпер усё гэта амаль не заўважалася. Усё наладзіцца, калі Зіна ўзялася за справу, усё пойдзе на самы лепшы лад.

Не відно было ніякай бадзёрасці толькі на твары Міхала. Ён сядзеў трошкі ў баку ад групы і моўчкі плёў з ядлоўцавай кары лапці. Не надта трывалыя былі лапці з гэтай кары, іх ледзь хапала на адзін добры пераход, але ж затое многа ўсюды было такога матэрыялу і здабываць яго было няцяжка: ядловец лупіцца ўсё лета. Чаго быў невясёлы Міхал, ніхто пэўна не ведаў, аднак заўважылі хлопцы, што ўжо з учарашняга дня яго даўгаваты сухі нос паглядваў усё больш пад ногі, вочы рабіліся хмурымі і невыразнымі.

Калі вярнулася Зіна, хлопец на нейкі час павесялеў, стаў прыслухоўвацца, пра што яна дакладвае Машкіну. Але хутка зноў задумаўся, і яго паходная падплётка пачала хадзіць у руках марудна і няўпэўнена.

— Хочаце, я і вам спляту вось такія лапцікі,— прапанаваў ён Зіне, калі група збіралася ўжо ісці далей.

Ён наўмысля не глянуў на Зінін абутак: здавалася яму, што дзяўчына можа засаромецца, пачырванець.

— Дзякую,— адказала Зіна і сапраўды пачырванела, калі зірнула на свае ногі.— У мяне яшчэ моцныя чаравікі, дарма што трохі падвязаныя знізу. Я ж колькі дзён не хадзіла.

— Спляту ў запас, — паабяцаў Міхал. — Вось няхай толькі яшчэ спынімся.

У дарозе ён увесь час трымаўся каля Зіны, усё нібы намыкаўся нешта сказаць, нечым падзяліцца з ёю, на-

рэшце няёмка закхекаў, быццам нешта засела ў яго ў горле, і нерашуча спытаў:

— Ці каля тоїі вёскі, што вы нядаўна назвалі Машкіну, калі дакладвалі... каля таго Забалоцця, мы недалёка будзем ісці?

Зіна прыпыніла крок, з цікаўнасцю глянула на хлопца.

— Зусім блізка,— адказала яна.— А што?

— Ды так,— сумеўшыся, прамовіў Міхал.

Хвілін колькі Зіна не задавала больш пытанняў, не спрабавала што-небудзь угадваць, толькі неўпрыкметку паглядвала на хлопца.

Калі Міхал заўважаў гэтыя позіркі, то, напэўна, вельмі хваляваўся, бо ў іх былі і жаль, і загадкавасць, і здзіўленне, і нават падазронасць. Хто яго ведае, можа і заўважаў ён усё гэта.

Нарэшце, калі яны крыху адсталі ад групы, Зіна сказала:

— Ваша вёска будзе, прыблізна, за кіламетр ад нас.

— Адкуль вы ведаеце, што мая? — уражаны нечаканасцю, спытаў Міхал.

— Адчуваю,— сказала Зіна,— ды і помню нашу размову ў першыя дні знаёмства.

— Так, гэта мая вёска,— шчыра загаварыў Міхал.— Маё Забалоцце! Двое сутак ужо аб гэтым думаю, чую пах сваіх лясоў, свайго балота, а не гавару хлопцам, баюся, каб не падумалі чаго дрэннага, каб не сталі кідаць на мяне падазроных позіркаў.

— Немцаў у Забалоцці няма,— яшчэ сама не ведаючы для чаго гэта трэба, паведаміла Зіна.

Міхал насцярожыўся, яго жывыя чорныя вочы ўсхвалявана заблішчалі.

— Ну дык што, калі няма? — узбуджана запытаў ён.— Ну дык што? Няўжо вы думаеце?..

Зіна ўзяла яго за руку і супакойліва націснула.

— Я нічога кепскага не думаю,— ціха сказала яна і міжвольна прыслухалася да свае душы: ёсць там гэтакае перакананне ці няма.

— У мяне толькі маці ўвесь час перад вачамі,— гаварыў далей Міхал. — Каб, здаецца, можна было хоць на адзін момант убачыць яе ці хоць даведацца, жывая яна ці не... Але я ўжо цвёрда рашыў, што не звярну з дарогі, не пайду. Няхай сэрца ные і баліць, а не пайду, не затрымаю хлопцаў.

— Праведаць то трэба было б,— разважліва сказала Зіна. — Хочаце, я сама скажу Машкіну. Ён напэўна дазволіць.

— Не трэба,— адмовіўся Міхал.— Пойдзем наперад калоны, вам жа трэба дарогу паказваць.

Доўга баец ішоў моўчкі, утупіўшы вочы сабе пад ногі. На вузкай лясной дарожцы ўжо сцямнела і цішыня западала такая, што, здавалася, самы асцярожны крок чуцён быў далёка. У такія часы і ўся група больш намагала на слых, чым на зрок. Міхалу ўяўлялася, што вось ужо зусім хутка, калі яны параўняюцца з яго вёскай, ён пачуе хоць якія-небудзь гукі, з маленства знаёмыя, незабыўныя. Магчыма, хто-небудзь з суседзяў захоча ў гэты час набраць у калодзежы вядро вады. Заскрыпіць пругло ад жураўля, і Міхал адразу скажа, чыё гэта пругло. А можа якраз матуля выйдзе па ваду, тады Міхал пазнае скрып свайго жураўля...

Чым бліжэй падыходзілі да вёскі, тым усё больш Міхал хваляваўся, усё больш насцярожваў слых. Аднак ад вёскі не даносілася нічога, быццам яе тут і не было. Змрочная цішыня навакол і маўчанне Міхала пачалі наганяць сум і на Зіну. Спачувальна глянуўшы па байца, яна зноў прапанавала:

— Давайце я ўсё-такі скажу Машкіну. Прыпынімся тут на якую гадзіну.

— Не трэба, я вас прашу,— запярэчыў Міхал.— Не хачу я, каб хоць адну хвіліну хлопцы трывожыліся за мяне. Хапае трывогі і без гэтага. Галоўнае ж, не хачу, каб вы трывожыліся.

— Я не буду трывожыцца, — ледзь чутна сказала Зіна, але ў голасе яе прагучала цяпер поўная шчырасць.

— Я вельмі хачу, каб верылі мне,— з удзячнасцю сказаў ён.— Тады мне будзе лягчэй.

Зіна спытала нібы толькі для таго, каб схіліць размову трохі ў другі бок.

— У вас толькі адна маці і асталася дома?

— Яшчэ сястра была,— адказаў Міхал.— Меншая за мяне.

— А больш нікога? — Тут у Зіны вырваўся чыста дзявочы смяшок, але ён не пакрыўдзіў Міхала. Наадварот, яму нават радасна стала, што за ўвесь час знаёмства яна ўпершыню так загаварыла з ім.

— Больш нікога,— шчыра прызнаўся Міхал.— Зусім нікога.

Зіна зноў усміхнулася:

— А вось гэтая кофтачка, што цяпер на мне, усё ж такі не для маццеры куплялася. Праўда? Вельмі ж яна вясёлая для старой жанчыны.

— Дальбог для мацеры,— запэўніў баец.— Гэта ў мяне такі густ неважнецкі.

— Ну, нічога,— прыпыніла Зіна няёмкую спрэчку.— Гэта я проста так, каб разагнаць ваш смутак. Скончыцца вайна, тады ўсё будзе проста і ясна. Знойдзем і мацярок сваіх, і знаёмых, і каханых. Усіх пазнаходзім.

— А ў вайну?

Міхал доўга чакаў адказу, але дзяўчына маўчала. Ён таксама ішоў моўчкі, і глыбокі роздум зноў пачынаў авалодваць ім.

Забрахаў за лесам сабака, і баец спыніўся, пачаў старанна прыслухоўвацца. Яму здалося, што гэта іхні Шарык падаў голас, і сэрца радасна, усхвалявана затрапяталася.

— Чаго ты? — спытаў Грыцко, ледзь не наступіўшы хлопцу на пяты.

— Нічога,— адказаў Міхал і цвёрдым крокам пайшоў далей.

* * *

Яшчэ тыдні праз два напружанай, амаль бесперапыннай хады байцы сталі заўважаць, што чым далей, тым усё больш і больш траплялася па дарозе немцаў, самалёты раўлі над лесам і ўдзень і ноччу. Часта проста над галовамі байцоў адбываліся паветраныя баі. Ісці ўжо нельга было так, як раней: разведку трэба было рабіць вельмі асцярожна і дасканала, падавацца ў глыбокія абходы, кожную ноч прабірацца праз густыя лясы, мясіць непралазныя балоты, пераплываць рэкі. Вельмі часта здаралася так, што тут ужо недастаткова было разведчыцкага вопыту Зіны і Святланы, трэба было браць праваднікоў.

На ўсё жыццё астануцца ў памяці байцоў гэтыя простыя, сумленныя людзі — праваднікі. Колькі вытрымкі і мужнасці даводзілася праяўляць групе ў час паходу, а іншы раз усё гэта выглядала малазначным у параўнанні з той самаахвярнасцю, на якую здольны былі пекато-

рыя правадпікі. Ідзе сабе чалавек наперадзе, і крок яго цвёрды, вочы гараць рашучасцю. Ён ведае, што кожную хвіліну можа наткнуцца на ворага, што першая куля пападзе яму, але ідзе без ніякіх хістанняў. Прапануй яму вярнуцца — не вернецца, пакуль не давядзе да належнага месца. А што гэта былі за людзі? Гэта звычайныя беларускія калгаснікі, у пераважнай большасці дзяды ды жанчыны, маткі малых дзетак.

Па ўсіх прыкметах на сцежках і дарогах байцы адчувалі, што фронт ужо недалёка. Аб гэтым гаварылі і праваднікі. Прыбаўлялася хвалявання, але і радасна было, што фронт прыпыніўся, што запаветная мэта, дзеля якой гэтулькі ўсяго пераярыта, была ўжо не за гарамі. Цяпер трэба было выкарыстоўваць кожны хоць крыху зручны момант, каб як мага бліжэй падысці да франтавой лініі, выведаць самае тонкае месца ў гэтай лініі і там прарвацца. Няхай дзе ні будзе гэтае месца: у лесе, на балоце ці хоць нават на суцэльным вадзяным плёсе. Усякую перашкоду група гатова была пераадолець і да ўсякага прарыву рыхтавала сябе. Можна будзе прабрацца цішком — прабірацца, паўзці, плысці, бегчы; трэба будзе брацца за зброю, дык прабівацца кулямі і гранатамі.

...Прыйшла нарэшце тая ноч, якая павінна была вырашыць усё. Гэта была яшчэ летняя ноч, хоць раса на траве і вада ў балоце былі ўжо халаднаватымі, хоць на плёсе ляснога лужка ці азярца можна было заўважыць пры месяцы шызы асінавы лісток або жоўты бярозавы. Байцы прабіраліся забалочанымі зараснікамі. Ціха было ўсюды, хоць некалькі гадзін таму назад з левага боку адсюль ішоў, відаць, вельмі жорсткі бой: чуліся частыя выбухі снарадаў, залпы нямецкіх гармат, далятала з ветрам і залівістае сакатанне кулямётаў. Цяпер толькі ракеты ўспыхвалі над лесам, і чорт ведае каму патрэбна было іх гэтае халоднае, трапяткое святло.

Па ўсіх вестках, якія былі ў групе, за гэтым непралазным зараснікам павінна пачынацца так званая нейтральная паласа, калі можна ўявіць такую паогул, а там далей, за глыбокім ярам,— пазіцыі нашых войск. Калі б зараснікі ішлі да самага яра, то больш зручнага месца для пераходу нельга было б і ўявіць, але там ёсць адна прагалінка, і абмінуць яе нельга: з левага боку нямец-

кія ўмацаванні, а з правага — вялікае возера. Пашукаць чаго-небудзь лепшага цяпер ужо не было калі, ды і сэнсу ў гэтым ніякага: тут хоць на вузкім прамежку, па ўсіх вестках, няма варожай заставы, а ўзяцца куды-небудзь правей, на другі бок возера, то там, магчыма, немец на немцы сядзіць.

Пакуль дабраліся да канца зараснікаў, стала набліжацца к світанню. Гэта і добра, бо ў такую пару акупанты любяць спаць, але гэта ж і дрэнна: калі цяпер выйдзе хоць невялічкая затрымка, то разрэдзіцца змрок і немцы могуць заўважыць пластуноў на прагаліне.

Дрыжучы за кожную хвіліну, за кожны момант, хлопцы выпаўзлі з густога кусцістага лазняку, наскрозь мокрыя, абшарпаныя, адсапліся крыху, агледзеліся і радком, крокі на тры адзін ад адпаго, паплылі па шчодрай перадсвітальнай расе далей. Зіна са Святланай паўзлі пасярэдзіне. Яны трымаліся бліжэй адна адпае.

Кожны локаць наперад болем і радасцю аддаваўся ў сэрцы. Набліжалася мэта, набліжалася і самая страшная небяспека можа за ўвесь час шляху. А світанне, як бы нічога не ведаючы пра такое становішча байцоў, не марудзіла, хутка падплывала з усходу, падбельвала і рассейвала туман, надавала снежны колер расе. Што б яму трохі пачакаць!

Палявая канюшынка, пырнік, нераспелае шчаўе і розная іншая пораслъ на прагаліне, якая, відаць, нядаўна засявалася, была густой, спорнай, але невысокай. Святлана, паўзучы, хапалася рукамі то за кусцік шчаўя, то за канюшыну, туліла ў зелень галаву, і перажывала дзяўчынка, што ўсе расліны разам не маглі схаваць не толькі ўсю яе, а нават адну галаву. Бадай-што ўпершыню паўзла яна па такім адкрытым месцы. Дзе ні даводзілася раней паўзці, усюды былі хоць якія-небудзь кусцікі, купіны, дрэўцы, хоць якое-небудзь прыкрыццё, а тут няма нічога. Здавалася Святлане, што калі вось-вось трэсне нешта збоку або ззаду, то абавязкова пацэліць ёй па галаве. З часу першага ранення ў дзяўчынкі кожны раз было такое адчуванне.

Узвілася непадалёку ракета, зрабіла высокую дугу над прагалінай і ўпала, ужо мала што асвяціўшы. Машкін нават пачуў стрэл ракеты. Стрэл гэты не толькі яшчэ больш насцярожыў яго, а з ледзяной жудасцю аддаўся ўнутры. Калі адсюль так добра чуцён слабы стрэл, зна-

чыць, немец зусім блізка, значыць, адно з двух: або іхнія весткі былі недакладныя, або панач падышла сюды новая застава. Шчасце, калі немец, дрэмлючы, пусціў гэтую ракету. А калі ён сочыць за прагалінай, то ў кожны момант можа ўзняць трывогу.

— Хутчэй наперад! — падаў Машкін каманду па сваім лапцужку.

Хоць да яра было яшчэ далёка, яму здавалася, што ён ужо нават бачыць яго, мільгала нават думка, што можа і не варта доўга паўзці, а лепш падняцца, узляцець і адным рыўком апынуцца ў яры. Што б ні здарылася, а група будзе ў яры! Такое рашэнне авалодала ўсёй яго істотай, і ніякая сіла не прымусіць адступіцца ад яго. Ці ад таго, што так пагрозліва навісла небяспека, ці проста ўжо так моцна зацялася сэрца, але ў гэтыя хвіліны Машкін не адчуваў якога-небудзь здранцвення, разгубленасці ці страху. Усімі сіламі ён намагаўся своечасова ўсё заўважыць, правільна ацэньваць і быў гатовы пры неабходнасці аддаваць такія загады, якія павінны абавязкова ўратаваць групу.

Яшчэ адзін ракетны стрэл даляцеў да яго вушэй. На пластунскім хаду Машкін павярнуў галаву, паглядзеў на сінявата ўжо неба. Проста над ім, нібы злашчасная зорка, стаяла ракета. Машкін яшчэ больш намогся, каб паўзці хутчэй, бо яму здалося, што калі хоць крыху прамарудзіць, то ракета ўпадзе проста яму на плечы. Гэта, мабыць, ужо апошняя ракета; дрэмле немец перад золакам і пускае. А як толькі расплюшчыць бельмы, то ўбачыць, ліха яму, што ракеты цяпер ужо мала памагаюць, што, добра вылупіўшыся, ужо можна агледзець прагаліну і без ракет.

Гэтыя думкі Машкіна перабіў яшчэ адзін стрэл, але больш гучны, чым з ракетніцы. Следам за ім другі і трэці, і нават пачулася Машкіну, што нехта дзіка закрычаў ззаду.

— За мною! — падаў Машкін каманду, ускочыў і, прыгнуўшыся, пабег у напрамку яра. Ён не бачыў, а адчуваў, што за ім пабеглі ўсе. Яшчэ момант, яшчэ. Не чутно пад сабою ног, не чутно, як шуміць рэзкаваты ветрык праз мокрыя ад расы вушы. Першая кулямётная чарга. Яе таксама быццам бы не чутно, толькі сам сабою паскараецца рывок, вочы шукаюць наперадзе яра.

Пасля другой, вельмі доўгай, чаргі Машкін глянуў

управа ад сябе і спачатку адчуў, а потым ужо ўбачыў, што бягуць не ўсе.

— Лажыся! — скамандаваў ён, зразумеўшы, што рывок не ўдаўся.

Байцы пападалі і ўжо без каманды, а проста па прыкладу камандзіра пачалі хутка выбіраць хоць трошкі зручнейшыя месцы для абароны. На шчасце іх, мясціна была ўжо крыху ніжэй той, дзе яны былі хвіліну назад. Як толькі глянулі на поле, перш чым націснуць на спускавыя кручкі вінтовак, убачылі на прагаліне перад сабою Зіну і Святлану. Яны ляжалі нерухома на самай высокай мясціне гэтай прагаліны. Таксама без каманды Міхал і Грыцко папаўзлі туды. Нямецкі кулямёт біў цяпер кароткімі чэргамі, але прыцэльна то па адным байцу, то па другім. На той узгорак, дзе ляжалі Зіна і Святлана, цяпер кулі не ляцелі, відаць, немцы рашылі, што гэтыя ахвяры ўжо нікуды не дзенуцца. Аднак як толькі туды сталі падпаўзаць байцы, агонь па ўзгорку аднавіўся. Вінтовачныя залпы ў адказ крыху насцярожылі ворага, але вельмі хутка туды, відаць, прыйшло падмацаванне, бо пачалі страляць ужо некалькі кулямётаў. Галоўнае ж — з флангаў, з намерам акружыць групу.

· ·

· ·

Калі Грыцко і Міхал падпаўзлі бліжэй да ўзгорка, то адразу заўважылі, што Зіна і Святлана жывыя, толькі варушыцца ім нельга, бо тут яны проста на прыцэле. У час кароткага прамежку паміж кулямётнымі чэргамі Грыцко пачуў, што Святлана цярпліва, сціснуўшы зубы, плача,— і сэрца яго заныла.

— Што ў вас,— крыкнуў ён Зіне, каб тая пачула і ў шуме.

— Святлана паранена ў нагі,— адказала Зіна.

— А вы?

— Я не, але трэба ратаваць Святлану.

— Паўзіце ўніз! — як толькі мог сурова загадаў Грыцко.

Ён стаў асцярожна, нібы ўціскаючыся ў зямлю, падпаўзаць да Святланы, а Зіна ўсё ляжала і не варушылася.

— Я вам памагу,— устрывожана сказаў ёй Міхал. Яму падумалася, што Зіна таксама раненая, ды не гаворыць аб гэтым пакуль што. Аднак, калі ён, глытаючы зямлю

ад блізкіх куль, падпоўз да дзяўчыны, яна раптам узяла рэзка ўбок і заслапіла сабою Святлану, якую ў гэты час Грыцко цягнуў за сабою. Зіна паўзла за акрываўленымі нагамі дзяўчынкі. Яна чула, як пры кожным намаганні Грыцко Святлана глуха, жаласліва ўсхліпвала, бачыла, як змешваліся з роснай травою яе светлыя, адросшыя за гэтыя тыдні валасы (хустка недзе згубілася ў трывозе), а больш нічога не бачыла і не чула. Перапаўзла яна так узгорак, яшчэ трохі прапаўзла, а потым што далей, то ўсё больш і больш квола сталі перасоўвацца яе локці. Міхал кінуўся на дапамогу...

У яры Машкін працёр мокрым і, здавалася, горкім ад парахавога дыму рукавом вочы, глыбока ўздыхнуў і паклікаў да сябе байцоў. Таму, хто хутка падбег, загадаў:

— Зараз жа выступаць, бо адкрыюць агонь з мінамётаў.

Падбеглі далёка не ўсе. Машкін заўважыў гэта, але ў душы дараваў тым, хто не выканаў яго загаду. Ён разумеў, што калі Грыцко і Міхал не падбеглі, значыць, яны не маглі гэтага зрабіць. Нядобрае нешта і з дзяўчатамі, калі яны не з'явіліся.

Ідучы, прыгнуўшыся, па цвілым ад вільгаці яры, камандзір паглядзеў у твар шафёру, узбеку, яшчэ тром байцам і па іх вачах зразумеў, што яны выйшлі з бою цэлымі. Міхал з Грыцко былі трохі ўбаку. Грыцко паспешліва круціў з лазы жгуты і перавязваў імі Святлане ногі вышэй калеп, а Міхал стаяў, нахіліўшыся над Зінай.

На каго яны цяпер падобны? Мокрыя і брудныя, па многу разоў прастрэленыя лахманы звісалі з плячэй, з рукавоў, ад Міхалавых ядлоўцавых лапцей не асталося і звання. У Грыцко нават паясны рэмень быў скрозь пабіты асколкамі ад разрыўных куль.

З глыбокай трывогай і болем у сэрцы падыходзіў Машкін да гэтых людзей. Падышоўшы, моўчкі стаў каля Зіны на калені, спалохана глянуў Міхалу ў вочы. Баец плакаў...

...Выходзілі з яра перад самым узыходам сонца. Міхал нёс на руках Зіну, а Грыцко Святлану. Дзяўчынка трымалася за шыю Грыцко, а Зініна правая рука, праця-

тая кулямі, як і ўсё яе цела, бездапаможна звісала і амяр-цвела матлялася.

За Міхалам і Грыцко ішоў Машкін, шафёр і астатнія байцы. Яны ішлі ўсутыч адзін каля аднаго, каб пры неабходнасці засланіць сваімі спінамі тых, што былі наперадзе...

Яшчэ хвіліна, і павінен заззяць першы сонечны прамень. Яшчэ хвіліна, і павінны паказацца свае пазіцыі.

1956 г.

# НЯВЕСТКА

Даніла нахіліўся над трухлявым падаконнікам і праз адталы ражок шыбы ўбачыў Ларысу. Ішла яна па вуліцы ў белым кароткім кажушку — аўчынкі мясцовага, крушнікоўскага вырабу. Невялічкі каўнерык і манжэты — шэрыя. У вузкім ражку шыбы яна, здавалася, толькі мільгнула, а потым зноў вока ўпала на тое, што можна было ўбачыць адсюль кожны божы дзень: нізкі, пакрыўлены ад вуліцы агародчык, ледзь не да самай верхняй жэрдкі занесены снегам, каструбаватую рабіну пад левым вуглом хаты, калі глядзець на вуліцу.

Стары з натугай разагнуў паясніцу і падышоў да печы. Лезці на чарэн не хацелася, бо і ён сёння халодны. Прысеў на чачоткавую калодку, здзёўбаную з усіх бакоў сякерай.

У хаце была яшчэ шырокая лава бог ведае з якога дрэва. Для таго каб гэта вызначыць, трэба было б дні два скрэбці яе. Стаяла яна на сваіх нагах толькі таму, што рубам прыхінулася да сцяны. Быў таксама стол і пры ім — невялікі ўслончык, а ложка ў Даніла не было. Ужо некалькі год ложкам для Даніла служыць печ. Начуе ён тут і зімой і ўлетку, і не трэба яму там амаль што ніякага ні засцілання, ні падсцілання. Таму ў мінулую зіму, калі ўзырыў холад, а дроў зусім не было, Даніла пасек ложак і, можа, з тыдзень прапальваў ім у печы.

Холадна і ў гэтую зіму. Дроў таксама няма, і ўжо секчы каля дому няма чаго. Хіба ўзяць ды ссекчы вось гэтую рабіну пад акном?

Даніла падумаў так, і яму стала яшчэ горш сумна. Насадзіў ён гэтую рабіну, калі быў яшчэ маладым, у тої год толькі ажаніўся. Састарэлі яны цяпер: і ён, і рабіна.

Дык як жа рука паднімецца? Возьмеш для гэтага сякеру, дык усё роўна, што на душу самому сабе наступіш. Лепш ужо ўзяць заўтра сапачкі ды з'ездзіць саматугам у лес. Або там застанешся, або ўсё ж такі прывязеш што-небудзь.

Нібы ў пошуках чаго на падпалку, Даніла абвёў позіркам хату. Нідзе нічога не было. Пад лавай ляжала крыху рыжага пасконня — гэта Даніла прынёс пад крысом з калгаснай адрыны, дзе ён учора спускаў вяроўкі. Каля мыцельніка валялася некалькі маткоў сухой лазы, бо ўлетку Даніла, калі трохі здаравілася, плёў кашы. На прыпечку — сямейная міска з абабітымі берагамі і толькі адна лыжка. Смецце на гліняпай падлозе, ужо колькі год не мазанай.

Старому ўспомнілася, што ён толькі што бачыў Ларысу. Прыйшла ўжо, мабыць, дзяўчына дадому, там у яе ў хаце цёпленька, утульна і, напэўна, смачнай стравай пахне. Бацькі яе нестарыя, яшчэ ходзяць на калгасную работу, але ж каб і не хадзілі, то гэтая дзяўчына ўтрымала б гаспадарку. Дае бог людзям шчасце!

Некалі яны разам бегалі ў школу: Ларыса, яе брат Павел і Віцька, Данілаў сын. Дзяўчынка была кволенькая, і гаварылі тады, што вучылася тугавата. Са школы яна бегла заўсёды першай і ледзь не кожны дзень забягала ў Данілаў двор, скардзілася на Віцьку. То ён, гэты нягожы хлапчук, калючага дзядоўніку назапускаў дзяўчынцы ў валасы, то шыпшынавых зярнятак насыпаў за шыю, то намаляваў што-небудзь непатрэбнае ў яе сшытку. Даніла кожны раз абяцаў, што пакруціць за гэта Віцьку вушы, падчас адчуваў, што і сапраўды трэба было б так зрабіць, але калі ружовашчокі свавольнік прыбягаў дадому, у бацькі знікала ўсялякая злосць. Бацьку хацелася толькі аднаго: хутчэй бы даць папалуднаваць сыну ды наклапаціцца, каб яму не было сумна.

Цяпер і Віктар і Павел служаць у арміі на звыштэрміновай службе. Крыніцкія, бацькі Ларысы, ад гэтага вельмі не гаруюць, бо Ларыса іх дагледзіць. Яны нават ганарацца, што іхні сын астаўся яшчэ служыць. Ганарыцца, вядома, сваім сынам і Даніла, але ж яму цяжка жыць аднаму, ды вось ужо колькі год. Да службы Віця таксама мала быў дома.

Ноч Даніла пракаратаў, нацягнуўшы на сябе ўсё, што было ў хаце з вопраткі і рознага рыззя. На досвітку ссу-

нуўся з печы, пачаў хадзіць з кута ў кут па хаце, размінаць ногі.

Захацелася глынуць крыху вады. Узяў цяжкі кубак, зроблены з гарматнай гільзы, апусціў у вядро, а ён стукнуўся там звонка, як аб тонкае шкло. Вада ў вядры замерзла. Даніла сумна паківаў галавой і пачаў тужэй падпяразвацца, папраўляць на нагах валёнкі з жоўтымі бахіламі. Трэба было ўсё-такі ехаць у лес, шукаць якога-такога ламачча.

Снегу за ноч памяло многа, Даніла пракладаў па крушнікоўскай вуліцы першы след. Ішоў стары сагнуўшыся, цяжка сапучы, хоць санкі паўзлі за ім лёгка. На двары яшчэ толькі ледзь світала, але пад нагамі ўжо відно было, куды ступаць.

На момант спыніўшыся, Даніла пачуў, што перад ім таксама нехта сапе і нават нібы стогне, нібы мармыча. Прыгледзеўся на снег,— няма, не відаць ніякіх слядоў. Значыць, насустрач чалавек ідзе. Праз некалькі крокаў убачыў, што сустрэчны не ідзе, а ляжыць у снезе. «Што ж гэта такое? — затрывожыўся стары. — Можа, чалавек вязе што на сабе ды знясілеў, паваліўся, а можа, няшчасце якое здарылася?»

Але вось гэты чалавек заварушыўся, злосна кракатнуўшы, узняўся, сяк-так выпрастаўся. Закрочыў наўскос, ледзь выцягваючы са снегу ногі і трымаючы рукі так, каб зберагчы твар пры чарговым акунанні ў снег. Неўзабаве заўважыў Данілу.

— Хто тут такі? — спытаў гучна і ўладарна.— Каго чорт носіць?

Па голасу Даніла здагадаўся, што гэта брыгадзір Крушнікоўскай брыгады Шандыбовіч.

— Што, не пазнаеш? — азваўся стары.

— Куды едзеш сярод ночы? Красці што-небудзь?

— Дурань ты барадаты! — не сцярпеў Даніла.— Сам ты піў усю ноч, глядзі што за крадзенае, а на людзей брэшаш. У лес еду, бо траха не адубеў сёння праз тваю ласку.

— А-а, у лес? — Шандыбовіч растапырыў ногі і падняў на Данілу выкачаную ў снезе бараду.— Гэта ты? Бірук? Ну, едзь, едзь! Газуй!

Данілу яшчэ больш цяжка стала ісці, зашчымела ў грудзях. Мала таго, што дома гэтак пакутна жывецца, дык яшчэ ж і ў брыгадзе, страшна падумаць, які непарадак.

Пакуль дабраўся да лесу, дык ужо добра развіднела. Сеў на пні, адпачыў,— зацішней у лесе, здалося, што і мароз паменшаў. Стаў потым прыкідваць з месца, што тут можна ўзяць на скорую руку, каб доўга не затрымлівацца. І з трывогай убачыў, што хоць і сапраўдны тут лес, але дроў спадручных няма. Калі што і было сухое на зямлі, дык пакрылася цяпер снегам, а сухастой, які быў, даўно людзі выбралі. Давядзецца ездзіць з санкамі па лесе і збіваць з дрэў сучкі.

Пад паўдня Даніла адчуў, што калі яшчэ трохі пахадзіць, дык ногі не захочуць слухацца. Усё часцей і часцей ён пачаў садзіцца на пні, сядзеў падоўгу, але ранейшая сіла не прыходзіла. Калі выехаў, нарэшце, у поле і ўзяў напрамак на Крушнікі, ісці стала лягчэй, вецер падганяў у спіну. Але старэчая лёгкасць ненадзейная. Праз якія гоні ці двое ў Данілы пачала з'яўляцца неадчэпная думка, што да Крушнікоў яму не дацягнуць. Намагаўся адганяць ён гэтую думку, уяўна клікаў на дапамогу сына, свайго Віцю, які ўсё ж такі павінен прыехаць дадому, павінен уступіць няспынным бацькоўскім просьбам. І як ні змагаўся з сабою, жудасная думка не знікала, а што далей, то ўсё глыбей і глыбей забіралася ў душу, выклікала нязведаны дагэтуль страх.

Бірук спыніўся, працёр вочы, нібы пасля сну, і, ступіўшы крок назад, сеў на санкі. Яшчэ была вера, што, крыху адпачыўшы, можна будзе ўстаць, прайсці некалькі гоняў, а там павінна быць дарога, нейкі след, і ісці будзе лягчэй. Вецер падняўся большы, зашумеў лес, і Данілу быццам бы шкада стала, што ён выехаў з гэтага лесу. Зацішней там было, цяплей і не так самотна паміж дрэвамі. Гукні — рэха далёка пойдзе і нават людзі могуць пачуць. А тут — гало, ні сцежкі, ні следу, вецер гуляе і пачынае круціць з усіх бакоў. На дапамогу паклічаш, дык і голас твой загасне на месцы.

«Нічога, Даніла, нічога... — падбадзёрваў сябе стары. — Адпачнём і паедзем... Яшчэ так паедзем, што аж палазы будуць шумець. А дома напалім печ, наварым бульбы... От яшчэ трошкі пасядзім... Каб толькі калені не памерзлі...»

Прайшла хвіліна, другая. Даніла разумеў, што пара б ужо і ўставаць, але не хацелася ні кратацца, ні нават паварушыць нагой ці рукой. Яшчэ хоць хвілінку... У калені ўжо не вельмі холадна і ў вушы менш дзьмуць ста-

ла... Вецярок зусім не марозны... Каб хоць на волас задрамаць, адагнаць сон...

Укалола пад сэрцам гэтая думка. То ж бяда, калі забірае дрымота! Але адразу ж і супакаенне: якая ж тут бяда? Цэлую ноч амаль не спаў, паехаў не снедаўшы... Стамілася цела, і ўся ў гэтым прычына.

...Прачнуўся Даніла толькі тады, калі адчуў, што нехта моцна ўзяў яго за плечы і скалануў. Спужаўся ад гэтага, ледзь не крыкнуў, а вочы расплюшчыць не мог.

— Што, стары, адпачываем? — нібы здалёк данёсся да яго голас.

Нешта цвёрдае і не надта гладкае пачало жвава хадзіць па яго вушах, па носе, па ўціснутаму ў каўнер старога кажуха падбародку, потым учапілася ў сасулькі на вусах, брывах, на вейках. Тады стары адчуў, што гэта чыя рукі і нават без рукавіц. З болем у надброўі паварушыў павекамі, і вочы збольшага расплюшчыліся. Перад Данілам стаяў высокі немалады чалавек у бурцы з капюшонам, у новых белых валёнках.

— Так можна і заначаваць тут,— з папрокам, а больш з трывогай загаварыў ён.— Што, устаць можаце? Не? Ногі не адмерзлі? Давайце, бярыцеся за мае плечы!

Чалавек давёў старога да свайго вазка, пасадзіў, ухутаў ногі сенам, потым вярнуўся па санкі з дровамі і прывязаў іх ззаду да вазка.

— Наце, хутчэй глыніце! — загадаў ён і паднёс да губ Даніле адвінчанае рыльца салдацкай пляшкі.

Бірука вельмі мучыла смага, і ён выпіў бы што б там ні трапілася, аднак металічная пляшка на момант насцярожыла яго.

— Хутчэй, хутчэй! — падганяў чалавек.

Даніла павольна падняў руку да таго добразычлівага рукава, адкуль тырчала пляшка, злёгку штурхнуў яго і глынуў на поўны рот. Адчуў, што добра запякло ўсярэдзіне, а ў нос аддало хмяльком.

— Бярыце яшчэ, бярыце!

Даніла пацягнуў яшчэ разы два.

— Ну, як сябе адчуваеце? — пачаў распытваць чалавек, калі яны выехалі на дарогу.— Дзе-небудзь баліць, шчыпае? Дайце, я вам яшчэ патру шчокі.

— Нідзе так асабліва і не баліць,— удзячна адказаў Даніла,— калені толькі нібы мурашкі пакусваюць, але дарма, адыдуць, калі я вось іх яшчэ патру сваімі рукамі.

— Добра, што ў пару мы з вамі сустрэліся,— сцебануўшы лейцамі каня, сказаў чалавек,— а то такі мароз і вецер на дварэ... Адкуль вы самі?

— З Крушнікоў,— адказаў Даніла.

— А, дык мы з вамі амаль што суседзі. Я з Паддубаўскай МТС, інструктар па зоне. Які ж гэта ў вас там калгас, дайце ўспомніць!

— «Свабода»,— нагадаў Даніла.

— Ага! «Свабода»! Хачу раблю, хачу не! Вядомы калгас, вядомы! Толькі не дабром, на жаль. Ну, што ж зробіш! Усё ў свой час. Дык як жа вы гэта? Саматугам па дровы? Ды ў такі мароз?

— Мароз і выгнаў з хаты,— сказаў Бірук.

Першачок на пусты жывот прыдаў старому цеплаты, абудзіў думкі ў галаве і пачаў нават хіліць па якую-небудзь жартаўлівую гаворку, чаго ўжо даўно з Данілам не здаралася.

— Ці дровы мае хоць едуць за намі? — спытаў ён.

— Едуць,— агляпуўшыся, сказаў інструктар.— Аж падскокваюць.

— Цяпер некалькі дзён буду жыць, як пан,— сказаў Даніла і засмяяўся.

— А потым зноў у лес?

— А потым зноў паеду. Можа, зноў які-небудзь начальнік падбярэ на дарозе і дасць першаку на абагрэў.

— Не, вы ўжо не рызыкуйце гэтак,— параіў інструктар.— Папрасіце брыгадзіра, няхай дасць каня, вазьміце яшчэ каго-небудзь сабе на дапамогу і павазіце дроў на ўсю зіму.

— Дапросішся ў нашага брыгадзіра. Спадзявайся! Цяпер хоць санкі, а летам я на сабе насіў дровы. Дык колькі на спіне наносіш!

— Са старшынёй пагаварыце,— не адступаў інструктар.

— Са старшынёй? — Даніла наўкос глянуў на інструктара і расшырыў ва ўсмешцы белыя ад намаразі вусы.— А я ўжо, мабыць, з год не бачыў нашых старшыняў. Ні старых, ні новых. Кажуць, што цяпер там яшчэ нейкага прывезлі. Без нас становяць, без нас здымаюць. Мы далёка ад праўлення, мо за паўсотню кіламетраў, калі па летняй дарозе ехаць. Камчаткай нас завуць.

— Так, так,— сумна паківаў інструктар галавою.— Тут, здаецца, сепажаць калгаса «Свабода».

— Ды якая там сенажаць? — не згадзіўся Даніла.— Балота дзесятак гектараў. Яго калгас і не касіў з таго часу, як узбуйніліся.

— Шкада, што вы не ў нашай зоне,— заўважыў, уздыхнуўшы, інструктар,— а то трэба было б пацікавіцца, што там у вас за парадкі. Ну, нічога, я ў раёне пагавару. Хто ў вас яшчэ ў сям'і? — дадаў ён праз некаторы час.

— Сын яшчэ ў мяне,— з гонарам сказаў Даніла.

— Дык чаму ж ён? Няхай бы сын ехаў у лес.

— Ён у мяне ў арміі, камандзірам!

— Ага. І старой няма?

— Няма і старой.— Даніла журботна апусціў галаву.

Калі да Крушнікоў асталося не больш якога паўкіламетра, Даніла падзякаваў інструктару, злез з вазка і адчапіў свае санкі.

— Я заеду як-небудзь да вас,— паабяцаў інструктар.— Не прагоніце?

— Рады вам будзем,— гасцінна адказаў Даніла.

Дома ён заехаў з санкамі проста ў хату, насек там ламачча на сваёй калодцы і распаліў печ. Потым праламаў лёд у вядры і ў той вадзе намыў бульбы. Вячэра выйшла смачная, такой даўно не было. Спаў Даніла ў гэтую ноч таксама добра і сасніў сваю жонку Ульяну, маладую, белатварую, з шэрымі ласкавымі вачыма. Калі прачнуўся, дык нават шкада было, што так хутка мінуўся сон. Не хацелася злазіць з печы.

* * *

Пад вясну Даніла атрымаў пісьмо, што Віктар хутка дэмабілізуецца і прыедзе дадому. Старога апанавала такая радасць, што ў гэты дзень ён не мог уседзець у сваёй хаце. Паклаўшы пісьмо за пазуху, ён накіраваўся ў адрыну да свайго «вераўчанага камбайна», як тут жартавалі, хоць гэты «камбайн» быў яму сёння непатрэбны, бо не было нянькі. Данілу проста хацелася прайсціся па вуліцы, каб хоць каго-небудзь сустрэць ды падзяліцца з ім сваёй радасцю. Сустрэўся конюх Мяфодзій, глуханямы. Даніла спыніў яго за рукаў, паказаў знакамі, што яго сын — во, во, зорка на шапцы і з пагонамі — прыязджае адтуль, паказаў рукою на поўнач,— дадому. Зусім прыязджае. І выняў з-за пазухі сіні канверт са штэмпелямі.

Мяфодзій з поўным разуменнем справы радасна выціснуў тоі адзіны гук, які быў у яго на ўсе выпадкі жыцця, паківаў старому галавой і пайшоў далей.

Дома Бірук аж да болю ў спіне гнуўся, усё прыбіраў, падхарошваў у хаце. Павыносіў некуды ў клець рыжае насконне, што валялася пад лаваю, сухую лазу і ўсялякую іншую непатрэбіцу. Дні два мазоліў далоні рыдлёўкай — раўняў гліняны дол.

Непакоіла толькі тое, што зноў у хаце не было дроў. Гэта цяжэй за ўсё. На санках не паедзеш, дарога ўжо не самавітая, ды і колькі там прывязеш на санках. Падысці да брыгадзіра? Дык як да яго падыдзеш? Прагоніць, барадаты, гаварыць не дасца.

І надумаўся тут Даніла пайсці на хітрасць, хоць, можа, потым і вомегам вылезе гэтая хітрасць. Аднак жа — сын прыедзе, не страшна!

Усім было вядома, што Шандыбовічыха, жонка брыгадзіра, больш за ўсіх у Крушніках гоніць самагонку. І гандлюе яна самагонкай, але за што ж купіць? Паспрабаваць, хіба, угаварыць, каб уступіла пляшку на павер? Паабяцаць ёй хоць усю сваю маёмасць, рухомую і нерухомую.

Доўга Бірук улучаў такую часіну, каб брыгадзірыха была адна дома. Нарэшце дачакаўся — барадатага паклікалі некуды на вячэру. Лепшага выпадку і не прыдумаеш. Падышоў да Шандыбовічавай хаты, ціхенька пастукаў у акно (ён чуў, што калі ідуць людзі сюды па самагонку, то гэтак вось стукаюць).

Гаспадыня без маруднасці адчыніла дзверы і развяла рукі ад здзіўлення.

— Што гэта? Няйначай воўк недзе здох, дый годзе! Ніколі ж вы да нас не заходзілі! Праходзьце ў хату, садзіцеся. Калі вы да майго старога, то няма, ведаеце, яго дома, але я перадам, калі што трэба.

— Не, я да вас,— спыніўшыся ля парога, сказаў Даніла.— Сын мой дадому прыязджае, дык, самі разумееце... Трэба было б сустрэць па-людску, ды няма, як той казаў...— Бірук правёў вачамі па шарэнзе пустых бутэлек, што стаялі на паліцы.

— Прыязджае Віктар? — здзіўлена перапытала гаспадыня.— Вось гэта навіна! Чуеш там? Віктар Бірукоў прыязджае!

— У мяне нават пісьмо ў запазусе,— дадаў стары.

— Няхай сабе прыязджае,— данёсся абыякавы голас з бакоўкі, якая служыла брыгадзіру і канторай.

Даніла ведаў, што гэта, канешне, Вольга сказала, брыгадзірава дачка. Яна ж — не то ўчотчыца, не то рахункавод у брыгадзе,— ніхто гэтага не мог разабраць.

— Не вельмі багаты мы на тое, што вы просіце,— мякка загаварыла гаспадыня,— але ж для такой радасці трэба падзяліцца.

— Дзякуй вам, дзякуй! — пачаў паўтараць раз-пораз Даніла і ледзь не кланяцца гаспадыні.— Мы заплацім, як прыедзе сын, а то я адраблю вам, кашоў напляту ці што іншае...

— Ды ўжо ж неяк памірымся,— добразычліва сказала гаспадыня.

Здабыўшы пляшку ў брыгадзірыхі, Даніла стаў цяпер падпільноўваць на вуліцы самога брыгадзіра. Падпільнаваць яго наогул было няцяжка, ён часта праходжваў сюды-туды па вуліцы, але злавіць начальства цвярозым,— гэта было амаль што немагчыма. Гаварыць жа з Шандыбовічам п'яным — марная справа, нарвешся на лаянку і толькі.

Усё ж Данілу пашанцавала і на гэты раз. Выйшаў ён назаўтра ледзь золак на вуліцу, бачыць — Шандыбовіч ідзе з нейкай папкай у руках. Галоўнае ж — ідзе роўна і крок цвёрды, значыць яшчэ не паспеў нідзе клюнуць. Даніла яму напярэсцікі:

— Памажы, Адам, старому, дай каня ў лес з'ездзіць. У хаце ні трэскі няма.

— Нікому не даю цяпер коней! — пачаў адмахвацца брыгадзір.— Паставіў на адпачынак перад пасяўной!

— Сын у мяне прыязджае, Адам!

— Прыедзе, то і сходзіце ўдвух, прынясеце ламачча.

— Дык я ж не так сабе... Слухай! — Даніла выняў з-за пазухі пляшку.

Шандыбовіч спыніўся, хоць зрабіў выгляд, што на пляшку не звяртае ніякай увагі.

— Дык, кажаш, сын прыязджае? Тэ-эк, тэ-эк. Ладна! Знай маю дабрату! — Ён трапным рухам згроб пляшку і паклаў сабе ў кішэню.— Ідзі скажы конюху!

— Як жа яму скажаш?

— Пакажы на бараду, ён і зразумее. Здаецца, тут я адзін барадаты, ты ж сваю выскубваеш.

— Якая ў мяне цяпер барада,— засмяяўся стары,—

тры валасінкі. Слухай, Адам, а можа, запіску якую напішаш?

— Не трэба ніякай запіскі! — раздражнёна махнуў рукою брыгадзір.— Мяфодзій усё роўна чытаць не ўмее. Скубанеш рэшткі свайго шчацініння два разы. Вось так,— Шандыбовіч пацягнуў сябе за раскладзістую рыжую бараду, спачатку за адну палавіну, потым за другую.— Вось тады ён табе ўжо не адмовіць.

Калі ехаў стары ў лес, дык заўважыў, што з хаты Крыніцкіх выбегла Ларыса з пэндзлем у руках, а хвартух яе быў густа закроплены пабелкай.

«Беліць хату, — падумаў Бірук. — А перад чым жа гэта? Каляды даўно мінуліся, вялікдзень і першы май далёка. Значыцца, Павел прыязджае».

І неяк непрыемна стала Данілу ад гэтай думкі. Крыніцкія заўсёды лепш жылі, чым ён, ім шанцавала ў сям'і, у гаспадарцы. Таму Бірук у душы ледзь не ўсё жыццё ўпотай зайздросціў ім. Цяпер уяўлялася, што калі Павел і Віктар прыйдуць дадому адначасова, то радасці для Данілы будзе менш. Павел, напэўна, будзе і лепш адзеты, і, можа, камандзір ён большы, і падарункаў бацькам больш навязе. Побач з ім Віктар будзе выглядаць горш. А ці ж горшы Данілаў Віця за каго б там сабе ні было?

І вось хлопцы прыехалі. Адзін трошкі раней, другі трошкі пазней, але здарылася так, што на вуліцу выйшлі разам. На радасць Данілу, усе ўбачылі, што Віктар выглядаў лепш і страйней за Паўла. У Віктара боты былі хромавыя і бліпічалі так, што хоць ты глядзіся ў іх. У Паўла ж былі боты звычайныя, шчыгрынавыя, і хоць таксама блішчалі, але ўжо зусім іншым бляскам. У Віці шынель быў новенькі, з падагнанай спінкай, у Паўла ж, наадварот, шынель быў не новы, з дзвюма складкамі на плячах і са старанна падчышчанымі, але ўсё ж прыкметнымі плямамі на рукавах. Што ж датычыць воінскіх званняў, то абодва былі старшымі сяржантамі, толькі ў Паўла пагоны танкісцкія, а ў Віктара агульнавайсковыя, з белымі лычкамі. Праўда, у гэтым мала хто ў Крушніках разбіраўся, а сам Даніла дык і зусім нічога не разумеў.

Калі ж у брыгадзе даведаліся яшчэ і пра тое, што Віктар прывёз бацьку новыя кірзавыя боты і ватоўку,

дык некаторыя гатовы былі аж на руках насіць такога хлопца.

На другі дзень Павел зняў пагоны і пайшоў у суседнюю МТС наймацца на работу, а Віктар яшчэ доўга хадзіў у пагонах. Здаралася, што ён заклапочана раіўся з бацькам, як жыць,— аставацца дома ці паспрабаваць пашукаць якой-небудзь работы ў раённым цэнтры або ў Мінску. У бацькі слёзы свяціліся на вачах, калі ён уяўляў, што зноў будзе нудзець у адзіноце, але, каб не замінаць яго шчасцю, згаджаўся на ўсё. Жыць засталося не многа, пражывецца як-небудзь. А сыну добра было б мець чыстую службу. Усё ж такі ён сямігодку скончыў ды ў арміі, мабыць, вучыўся.

І Віктар хадзіў пакуль што па вуліцы вольным казаком. Форма на ім заўсёды была чысценькая, боты блішчалі. Па вечарах у клубе дзяўчаты заглядаліся на яго.

Мабыць, прыглянуўся хлапец і Вольцы Шандыбовічавай, бо ў адзін з вечароў брыгадзір запрасіў яго да сябе пасядзець, пагаманіць.

На стале, вядома, з'явілася пляшка ды і закуска не абы-якая. Побач з гаспадаром на лаве сядзела гаспадыня, яшчэ ружовая ад завіхання каля чалеснікаў і надзвычай ахвочая да гаворкі, а насупроць — дачка Волька, трошкі рыжаваценькая, з дробным тварам. У яе жывых іскрыстых вачах, у хітраватай, але прыемнай усмешцы было нешта нават прывабнае, сімпатычнае.

Гаспадыня падсоўвала і падстаўляла Віктару па чарзе ўсё, што было на стале. І кожны раз прыгаворвала так, што хлапец не ведаў, як прымаць яе словы.

— Паспрабуйце,— прасіла яна, паказваючы на свежае колца смажанай кілбасы,— вы ж яшчэ, мабыць, не калолі? Вазьміце больш,— падсоўвала яна скавараду з яечняй,— у вас жа яшчэ куры не нясуцца?

Віктар разумеў, што ўсё гэта не ад душы гаварылася, але рашыў не звяртаць увагі. Ведае Шандыбовічыха, што ў яго бацькі няма ні свіней, ні курэй,— толькі і клопату, няхай сабе ведае.

Пакуль выпівалі і закусвалі, ішла звычайная размова аб хатніх справах, а калі пляшка стала пустой і гаспадар, адваліўшыся спіною да падаконніка, пачаў выкалупваць з зубоў, гаспадыня адразу ж успомніла, што ў яе ёсць яшчэ адзін вельмі неадкладны клопат. Услед за ёю выйшла з-за стала і Вольга. Паміж мужчынамі па-

чалася гаворка ўжо не пра хатнія інтарэсы, хоць Віктар не надта чакаў гэтага.

— Дык як яно, таварыш старшы сержант? — пачаў брыгадзір, трымаючы ў зубах зламаную запалку.— Пара, мабыць, ужо і здымаць пагоны?

Пры гэтых словах Шандыбовіч спачатку неяк прыціснуў к зубам свае прамоклыя ў тлустасці вусны, а потым усміхнуўся і пагладзіў бараду. Ён не быў цяпер п'яны, магчыма, таму, што збіраўся сур'ёзна пагаварыць з чалавекам. Некаторыя ж гаварылі, што дома Шандыбовіч наогул не напіваўся.

— Хто яго ведае,— нерашуча адказаў Віктар.— Можа, і яшчэ з які год ці больш давядзецца панасіць форму.

— Чаму ж гэта?

— Пайду ў часць у якую-небудзь недалёкую адсюль, папрашуся, каб узялі.

— А тут не знойдзецца работы?

— Ды вось, не бачу пакуль што. Самі спраўляецеся.

Брыгадзір выняў з рота запалку, падціснуў зубамі ніжнюю губу. Барада яго пры гэтым нібы падскочыла і стала ледзь не старчма.

— Ну, спраўляемся мы ці не спраўляемся,— заўважыў ён, крыху памаўчаўшы,— пра гэта начальства скажа. А я толькі кажу тое, што і ў нас для цябе работа знойдзецца. Кім ты ў арміі быў? Кладаўшчыком? Ну, і ў нас склад ёсць. Праўда, там пакуль што сядзіць адзін чалавек, але ж для дэмабілізаванага гэта можна паправіць.

— Я загадчыкам склада быў, — апусціўшы галаву, сказаў Віктар.

— Ну і ў нас будзеш загадчыкам. Гэта ўсё роўна.

Шандыбовіч падсунуўся бліжэй да госця і прыцішыў голас:

— Я гэта з павагі да цябе. Быў я тут старшынёй. Ты ж ведаеш, да ўзбуйнення... Бацьку твайго падтрымліваў. То да капцоў яго, бывала, прыстаўлю вартаваць, то да малатарні...

— А цяпер мой бацька на сабе дровы возіць,— не стрымаўся Віктар, і яго ніжняя губа непрыемна здрыганулася.

— Ну, цяпер што ж ты раўняеш? — брыгадзір скрывіўся, барада ад гэтага паехала ўбок.— Хіба можна раўняць, што цяпер і што было раней. Усё лепшае пайшло

ад нас у адсталыя брыгады. Падстрыглі, падраўнялі ўсіх. Але ж і стары твой цаца добрая. Што, цяжка было прыйсці, сказаць. Папрасіў пядаўна, і я без слова дазволіў.

Віктар ціха ўсміхнуўся.

— Прымеш склад,— гаварыў далей брыгадзір,— і лепшага месца табе не трэба. Калі да чаго там не дойдзеш сам у першыя дні, дык вось,— ён паказаў вачыма на бакоўку,— Волька дапаможа. Яна, брат, у нас усё ўмее.

— Калі трэба, то і замеціць іншы раз,— уставіла гаспадыня.

Брыгадзір сурова глянуў на яе, і жанчына змоўкла, пачала старанна перабіраць дровы, якія толькі што прынесла.

— Я толькі з павагі,— зноў паўтарыў ён Віктару.— Мы маглі б жыць па-суседску, як і жылі з тваім бацькам. А там...— гаспадар хітра зморшчыўся, і дзве палавіны яго барады нібы адвярнуліся адна ад другой.— А там, хто ведае? Калі бог дасць усё добра, то, можа, і сваякамі станем.

Віктар ніякавата маргнуў вачыма і без патрэбы паправіў рукою сваю кароткую светлую прычоску.

— Можа, яшчэ пакрысе возьмем?— спытаў брыгадзір і ўжо ласкавей глянуў на гаспадыню.

Віктар пакруціў галавой.

— Дык ты, маці, ідзі, ідзі! — загадаў Шандыбовіч, і вочы яго адразу змяніліся, у іх бліснула нервовая суровасць.— Заўтра прыязджае да нас высокі госць,— перайшоў брыгадзір на другую гаворку,— дык трэба падрыхтавацца, курчо якое звесці са свету ды парасё.

— А што за госць? — пацікавіўся Віктар.

— Старшыня калгаса нашага.

Віктар так гучна зарагатаў, што брыгадзір аж адхіснуўся ад яго:

— Вось знайшлі госця! Ён павінен кожны дзень бываць у брыгадзе. Гэта яго абавязак!

— Ну, не вельмі скочыш кожны дзень за пяцьдзесят кіламетраў,— стрымана заўважыў брыгадзір. Легкавой машыны ў яго яшчэ няма, а на грузавой бакі растрасеш на карчах ды па калдобінах. Павінен табе сказаць, сусед, што не надта шанцуе нам гэтыя гады на старшынь. Мяняюцца, як карты. Не паспееш прывыкнуць да чалавека, разгледзець яго добра, як прысылаюць паперку, што ўжо знялі. Пасля пленума пхнулі на ферму нашага даў-

няга старшыню, прыслалі з раёна загадчыка чайной, жанчыну. Ну, чайная, дык чайная. Нам што? Асабліва тут, у Крушніках. Дапамогі вялікай мы не чакалі і не чакаем. Нам важна, каб не вельмі перашкаджаў чалавек. Ну, гэтая чайная толькі адзін раз і пабыла тут. Выспалася, схадзіла ў ягады, і пасля гэтага мы яе ўжо больш не бачылі. Кажуць, паслалі кабету на нейкі маслазавод.

Прывезлі новага старшыню ўжо з вобласці. Стары чалавек, год пад шэсцьдзесят пяць. Быў начальнікам турмы ў абласным горадзе, ну, ды, мабыць, па старасці звольніўся. Гэты прыязджаў да нас часта. І от, скажы ты,— начальнік турмы, а чалавек быў добры, ціхі. Бывала, паснедаем з ім разам, тады я запрагаю жарабка і вязу старшыню на рэчку. Высаджваю яго там на беразе, стаўлю побач бутлю першаку, кладу кусок сала, паўбуханкі хлеба і еду па сваіх справах. А ён цэлы дзень сядзіць на беразе з вудай. Увечары прывожу яго дадому. Па тыдню, а то і больш ён так у нас жыў.

Перавялі некуды і гэтага чалавека, кажуць, што, быццам бы, дырэктарам дзіцячага дома паставілі. І вось цяпер, месяцы два таму назад, прыехаў гэты самы высокі госць, як я сказаў, а ты засмяяўся.— Брыгадзір горка скрывіўся і махнуў рукой.— Чорт яго ведае, што гэта за чалавек! Быў пядаўна я там, у яго. На дзвярах бакоўкі шыльдачка вісіць: «Без спраў не заходзіць! Прыём ад такіх-та гадзін да такіх». Папрасіў я бухгалтара, каб далажыў пра мяне. Той схадзіў у бакоўку і вярнуўся нешта закапыліўшы нос. «Пазней, кажа, зайдзі, старшыня заняты».

Заходжу праз паўгадзіны. Сядзіць за вялізным сталом мужчына, так, прыкладна, майго ўзросту, толькі без барады. Чысты, гладкі; міністэрскі касцюм на ім. Побач, за меншым сталом, сядзіць дзяўчына і піша пад яго дыктоўку. Пакуль не скончыў дыктаваць, не загаварыў са мною. А што, ты думаеш, дыктаваў? Нарад на заўтрашні дзень, звычайны нарад. Я такія нарады на памяці раздаю.

Распытваў я потым у сваіх людзей, што гэта за птушка. Кажуць, што сапраўды не з простых гатункаў. Быў ён у Мінску такім начальнікам, у якіх звычайна ёсць і прыёмныя, і сакратаршы, і персанальныя машыны, адна для сябе, другая для жонкі. Потым пайшлі нелады ў яго ўстанове: быццам бы сакратаршы на яго

скаргу напісалі ці яшчэ там нешта. Адным словам, начальніку прыйшлося крута, маглі шыю намыліць і сапсаваць асабістую картку. Тады ён — бах заяву, што хоча добраахвотна ехаць у калгас. Усё адразу ўціхла, усе скаргі на яго паклалі пад сукно, а яго такую асабістую заяву апублікавалі ва ўсіх газетах.

Убачыўшы такі паварот справы, начальнік рызыкнуў зрабіць так, каб і козы былі сытыя, і сена цэлае: выпараў у сябе нейкую старую, даўно залечаную хваробу, падгадзіў дактароў і лёг у бальніцу. Праляжаў там з месяц, думаў, ужо ўсё ператрэслася, перацёрлася за гэты час. Аднак калі выйшаў, яго ўсё ж такі паслалі. Вось заўтра прыедзе сюды, паглядзіш, што за ён. Адчуваю, што голас будзе падаваць, дык мы ўжо, Віця, давай будзем разам рэагаваць на крытыку. Добра?

* * *

Назаўтра ледзь не з самага ранку брыгадзір шлындаўся ў канцы вуліцы, усё пазіраў на дарогу. Калі з-за горкі паказалася грузавая машына, ён пабег насустрач, замахаў рукамі. Старшыня не спыніўся на дарозе, а паехаў у вуліцу. Тут дачакаўся брыгадзіра, які бег да яго так шпарка, што аж барада падгіналася да кадыка. Ніякіх прывітальных слоў, ні намяканняў на адпачынак пасля дарогі не захацеў і слухаць, а адразу ж засыпаў брыгадзіра пытаннямі. Адказаў патрабаваў дакладных, з лічбамі на руках. Шандыбовічу прыйшлося паклікаць і дачку. Пра што ўдалося добра адказаць, тым ужо больш старшыня і не цікавіўся, а дзе брыгадзір мармытаў замест адказу і не прыводзіў лічбаў, тое старшыня браў пад асабістую праверку.

Увечары быў сход. Новы старшыня выдаў вельмі доўгую прамову, але ўсе праслухалі яе ўважліва, бо, як прызналі потым крушнікоўцы, ніхто дагэтуль так гладка не гаварыў і ніхто так прывабна не размахваў рукамі. Калі прыйшла чарга выступаць з месцаў, усе маўчалі, а потым з кутκоў пачало выплываць звычайнае і да гаркаты шаблоннае: Усё ясна!

Шандыбовіч пачынаў ужо ў думках іграць марш усяму гэтаму сходу, з асалодай уяўляў, як ён зараз вып'е з новым старшынёй і закусіць смачнай парасяцінай з брыгаднага пагалоўя. Ды нечакана для яго, а магчыма

і для ўсіх, у паўзмрочнай зале былога калгаснага, а цяпер брыгаднага клуба паднялася рука ў манжэце з бліншчастымі вайсковымі гузікамі.

— Калі ласка! — бадзёра, нібы нават узрадавана сказаў старшыня.— Як ваша прозвішча, таварыш?

— Бірук,— ціха адказаў Віктар і стаў праціскацца да стала.

Пачаў хлопец гаварыць, і амаль ва ўсіх твары пасвятлелі, толькі Шандыбовічава барада пусцілася ў нейкія шалёныя скокі. Людзям было прыемна, што і Віктар умее гаварыць гладка і нават рукамі махае глядзі што не горш за старшыню. А галоўнае — праўду хлопец гаворыць пра брыгадзіра і пра ўсе тутэйшыя парадкі.

Ідучы са сходу, Віктар нагнаў дзяўчат, бо яны ішлі чамусьці вельмі ж памаленьку. Ледзь не шаргануўшыся аб рукаў Віктаравага шыняля, прайшоў са старшынёй Шандыбовіч. Глядзець не трэба: вядома, што завернуць у брыгадзіраў двор.

Дзяўчаты маўчалі, таму што сярод іх была Волька. Нікому не хацелася крыўдзіць сяброўку, успамінаючы пра такі няўдалы для Вольчынага бацькі сход. Дзяўчына зразумела гэта і, шчыра ці не шчыра, але пачала гаварыць сама.

— Ты правільна выступіў, Віця,— сказала яна быццам бы зусім спакойным голасам.— У нас тут вельмі мала крытыкі і самакрытыкі. Праўда, Ларыса?

Ларыса не запярэчыла, аднак услых не сказала нічога. Толькі калі яны з Віктарам засталіся ўдваіх, лёгенька кранула хлопца за локаць.

— Я проста зайздросціла табе сёння,— з затоенай радасцю загаварыла яна.— Устаеш сабе спакойна, упэўнена, нібы ў сваёй хаце, і пачынаеш гаварыць. Кожнае слова на месцы, і жэст, і ўсё... А вось я не магу выступіць на сходзе. І ведаю, аб чым трэба сказаць, словы на памяць набягаюць, хвалююся, бурліць усё ўнутры, а як падумаю, што трэба падняцца ды стаць перад людзьмі, жаўцее ў вачах і выскаквае ўсё з галавы. У нас і Павел такі.

— Ну, табе і па штату палажана выступаць як сакратару камсамольскай арганізацыі.

— Палажана, а не магу,— нібы апраўдваючыся, адказала Ларыса.

Вечар быў нехалодны, хоць і вясны яшчэ сапраўднай

не было. На вуліцы падшэрхла панач, і калі хто ішоў, то боты месцамі грукалі па голай зямлі, а месцамі скрыгацелі на рэдкім прымарожаным снезе. На палях яшчэ ва ўсіх нізінах ляжаў снег, і дарога яшчэ трымалася зімняя.

Віктар і Ларыса стаялі ў той вечар каля двара Крыніцкіх аж да таго часу, пакуль ногі ў іх не намерзлі, а на досвітку хлопец пайшоў з вёскі, нічога не сказаўшы пра гэта ні Ларысе, ні бацьку.

Даніла прачнуўся толькі тады, калі Віктар з прыціскам зачыніў сенечныя дзверы. Стары злез з печы, абуўся і пачаў гатаваць снеданне. Зварыўшы бульбы і падсмажыўшы трохі той нейкай шкуркі, што аднекуль прынёс Віктар, ён засланіў печ і стаў чакаць сына. Аднак прайшла гадзіна і ўжо ледзь не другая, а Віктара ўсё не было. Даніла рашыў праісціся па вуліцы, пацікавацца, можа, зайшоў сын куды, можа, яго якая справа затрымала? Прыцішыў крок насупраць хаты Шандыбовіча. Стары не быў учора на сходзе і не ведаў, што Віктар цяпер ужо, мабыць, доўга не пойдзе да Шандыбовічаў. Прайшоўся да брыгаднага двара, завітаў на свінаферму, нідзе сына не было. Ідучы назад, сустрэў Ларысу. Дзяўчына вельмі ласкава і весела прывіталася з ім. Стары азірнуўся і з хвіліну глядзеў ёй услед, мяркуючы, што, можа, тут хаваецца якая здагадка наконт яго сына. Аднак гукнуць Ларысу і спытаць не адважыўся.

Дома стары сеў у адзіноце адубелую бульбу і ўсё думаў, куды ж мог так раптоўна знікнуць яго сын? Хаця б слова сказаў! Хіба ж так можна?

Віктар не прыйшоў увесь той дзень, не было яго назаўтра і на паслязаўтра. Ужо ўсе Крушнікі ведалі, што Данілаў сын цішком пайшоў некуды з дому. Ларыса часта прабягала паўз Данілаў двор, бледная, устрывожаная, і ўсё паглядвала на вокны хаты. Нібы неўпрыкметку прайшлася разы два каля агародчыка і Волька. Мабыць, і ў яе не зусім было спакойна на сэрцы.

А к Данілу зноў вярнуліся сумотныя думы, ды яшчэ цяжэйшыя як раней. Здавалася, што ён ніколі так не перажываў. Не было да гэтага сына дома,— што ж ты зробіш? Прывыклася неяк і жылося. Ведаў чалавек, што хоць праз некалькі год, але ж вернецца хлопец дадому, калі жыў будзе.

А тут зусім нічога невядома. Можа, кінуў бацьку на-

заўсёды. Кінуў і пайшоў, не сказаў ні слова. І за што? У чым бацька вінаваты?

Даніла намагаўся ўспомніць усе дні, пражытыя цяпер з сынам, усю гаворку ледзь не да кожнага слова. І не мог зразумець, чым ён пакрыўдзіў Віктара. Ужо нязімнія, з вясновым подыхам, вечары здаваліся даўжэйшымі, як у Пілінаўку, ноччу не браў сон. І што толькі не прыходзіла ў галаву ў гэтыя ночы. Трывожныя і крыўдлівыя думкі пра сына змяняліся далёкімі, зацяжнымі ўспамінамі. Бацька глядзеў з печы на шырокую старую лаву, і яму здавалася, што ў негустым змроку ён бачыць сваю нябожчыцу жонку, сваю Ульяну. Сядзіць яна на лаве з малым Віцем на руках і прыгожа і трошкі сумна ўсміхаецца...

Як бы ні жыў Даніла, які б ні быў боль у яго на душы, яму заўсёды было радасна ўспомніць пра сваю жонку. Нават калі і цяжкія былі гэтыя ўспаміны.

Ажаніўся Даніла позна, тады было яму ўжо больш за трыццаць год. Ульяна была дзяўчына маладая, па прыгажосці мала каторай тут, у Крушніках, уступала, і кахала Данілу шчыра, самааддана. Першыя гады сямейнага жыцця прайшлі ў Данілы так светла, нібы ў тыя часы сонца над Крушнікамі не заходзіла ні на адну хвіліну. Кожны дзень прыносіў радасць, прыемнай здавалася самая цяжкая работа, не наганялі суму і змроку ні беднасць, ні нястача. Уперадзе чакала яшчэ большае шчасце — дзеткі, свая сапраўдная сямейка.

І вось праходзілі гады, а дзетак у Данілы не было. Старэў пакрысе Даніла, уваходзіла ў жаночую сталасць, хоць і не траціла ад гэтага свае прывабнасці, Ульяна. Сніліся ім дзеці, а шчасце паступова пакідала хату. Цэлымі гадзінамі, здаралася, хадзіў у задуменні Даніла, патухалі ад незвычайнай загадкі карыя вочы Ульяны. У душы яна праклінала сябе за тое, што зрабіла няшчасным Данілу, хоць зусім не мела за сабою ніякай віны. Даніла ж лічыў, што бог пакараў толькі яго, а праз гэта пакутуе і жонка. Хаваючыся адно ад другога, яны ўсё больш заглядваліся на чужых дзяцей, калі трапляўся выпадак, песцілі іх і плакалі ад няззведанай радасці і ад свайго гора. У Данілы з'явілася неадольнае жаданне насіць у кішэнях што-небудзь цікавае або смачнае для дзяцей. Суседская дзетвара яго любіла і часта сустракала больш весела і шчыра, як сваіх бацькоў.

Так была пражыта лепшая пара чалавечай сталасці, і толькі праз добры дзесятак год пасля жаніцьбы ў Даніла нарадзіўся сын. Прыйшло такое шчасце ў хату, што Даніла аж баяўся за яго, бо за мінулыя гады страціў веру ў свой добры лёс. Не было той ночы, каб ён некалькі разоў не падышоў да калыскі, не паслухаў, як маленькі спіць, ці роўненька дыша. А выпраўляўся ўдзень на работу, дык не ведаў, як развітацца з сынам. Жонку не пускаў нікуды, сам цягнуў за дваіх. І хоць прыбавілася ў хаце клопату і гады ішлі сваім парадкам, маладзеў Даніла проста на людскіх вачах, у рабоце не адчуваў стомленасці, пры хадзе ног пад сабою не чуў.

Мала хто мог зраўняцца ў Крушніках і з Ульянаю. Стала яна такой весялухай і глядзела людзям у вочы так шчыра і светла, што, здавалася, яна ўвесь час цешыцца, любуецца жыццём і налюбавацца ім не можа.

Віцю было ўжо больш за два гады, калі Даніла, аднаго разу носячы яго па хаце, заўважыў у дзіцячай усмешцы быццам бы не зусім знаёмую рыску. Закалола ў бацькі пад сэрцам, некалькі начэй ён не спаў, але ўсё ж прыдушыў у сабе змрочную думку, не даў ёй волі. Доўга не браў сына на рукі, баяўся грэшных думак пра жонку. А цягнула да малога страшэнна, часамі месца сабе не знаходзіў. І шкада было дзіцяці, так шкада, што аж слёзы іншы раз цяжка было стрымаць. У чым яно вінавата, беднае? Бяжыць насустрач, працягвае ручкі і не ведае, што бацька можа падумаць пра яго гэтак крыўдна і няхораша.

Час — вялікі лекар, як усім вядома. Прайшоў месяц, другі, і Даніла пачынаў ужо зусім вылечвацца ад сваёй незвычайнай хваробы. Ульяна не магла нарадавацца, што муж зноў спыняў на ёй вясёлы, закаханы пагляд, хоць зусім не ведала, чаму Даніла так доўга быў хмуры і задумлівы. Але вось аднойчы стары Шандыбовіч, калом яму зямля, бацька цяперашняга брыгадзіра (Даніла ўсё жыццё праклінае яго) сказаў сп'яна, што, па яго меркаваннях, у яго ёсць ужо ўнук, хоць і не ў сваёй хаце.

Даніла дачуўся пра гэта і ў цяжкім замарачэнні не стрымаў сябе, упікнуў Ульяну. Тая плакала некалькі начэй узапар, потым стала чарнець, сохнуць і праз нейкі час памерла.

І больш ужо ніколі не з'ўлялася для Данілы незна-

ёмая рыска на светлым і бясконца дарагім тварыку сына. Нібы ў пошуках нейкага спакою для свайго сумлення, нібы замольваючы віну перад нябожчыцай Ульянай, нібы ад такога бацькоўскага пачуцця, якога яшчэ свет не ведаў, Даніла стаў жыць толькі для сына, іншай мэты для яго не існавала. На Шандыбовіча-малодшага не сердаваў, бо не мог абражаць гэтым нябожчыцу. Толькі зрэдку ўскіпала на яго міжвольная, але лютая злосць і то, мабыць, усё-такі з-за яго бацькі, за тое, што пусціў той па свету такую жудасную, пагібельную плётку...

* * *

Віктар вярнуўся дадому гэтак жа нечакана, як і пайшоў з дому. Ён прынёс выпіску з пратакола калгаснага праўлення аб прызначэнні яго брыгадзірам Крушнікоўскай брыгады. На выпісцы стаяла пячатка і быў каляровы, расчыркнуты і раскручаны ледзь не па ўсю паперку подпіс старшыні.

Шандыбовіч доўга ўглядаўся ў гэтую паперку і вырабляў немаведама якія рухі барадой. Хоць усё ў выпісцы выглядала правільным і даволі ўнушальным, брыгадзір не паверыў ёй і сам накіраваўся ў праўленне. Шандыбовіча не было некалькі дзён, і ўсе гэтыя дні Крушнікі заставаліся без калгаснага кіраўніцтва, ад чаго, вядома, нішто тут ні пагоршылася, ні палепшылася.

У той дзень, калі Віктар прыняў брыгаду, Даніла надзеў падараваныя сынам кірзавыя боты, ватоўку і, не спяшаючыся, прайшоўся па вуліцы. Было якраз самае разводдзе, гразь усюды па калена. На гэтыя дні яго старыя дэмісезонныя бахілы якраз былі б дарэчы, але Бірук не пашкадаваў і ботаў. Няхай хоць раз убачаць людзі, што і ён можа быць шчаслівы, няхай хто і пазайздросціць, калі вельмі ўжо зайздросны.

Старому нешта падказвала, і гэтаму ён быў асабліва рады, што жыццё ў яго цяпер пойдзе вельмі гладка. Праўда, пакуль што ён быў дома больш за гаспадыню, чым за гаспадара: гатаваў сыну снеданні, варыў капусту і тушыў бульбу на абеды. Але гатоў быў рабіць для сына што б там ні давялося, каб толькі Віця не пакідаў яго, жыў дома. І думкі ішлі, вядома, далей. Прыйдзе час, калі напаццуе, што і гаспадыніць яму не трэба будзе: з'явіцца ў хаце маладая гаспадыня, дагледзіць і сына і

бацьку. А там і канца не было думкам. Уяўляўся ўнучак, круглатвары, беленькі, якраз такі, якім быў некалі Віця.

Падчас, снедаючы разам ці абедаючы, Даніла намякаў сыну пра жаніцьбу. Той, лагодна ўсміхаючыся, круціў галавой і гаварыў, што цяпер яму няма калі нават і думаць пра гэта,— трэба наводзіць парадкі ў брыгадзе.

І сапраўды, Віктар цэлыя дні быў заняты работай. Зняўшы пагоны, ён, здавалася, залішне ўжо актыўна мераў гразь на вуліцы, кожную гадзіну знаходзіў сабе справу, магчыма, яшчэ нават добра і не разбіраючы, карысная яна ці не. Ледзь не кожны дзень з праўлення прыходзілі паперкі з доўгім каляровым подпісам. Новы брыгадзір стараўся дакладна выканаць усё, аб чым там было напісана, і пасылаў справаздачу ў праўленне.

Калі сын прыходзіў дадому вельмі позна, Даніла жвава злазіў з печы, каб адчыніць яму, а потым, пакуль зноў не агортваў старэчы сон, думаў, з каторай жа гэта хлапец сёння бавіўся? Стары ківаў пакуль што толькі на Вольку і Ларысу. І вось, калі б сын раптам спытаў у яго: да каторай сватацца, каторая нам лепш падыходзіць? Хто яго ведае, што можна было б і сказаць. Волька багацейшая, вядома. У гэтай усякага дабра многа ды бацька вялікі пасаг дасць. Затое Ларыса з твару прыгажэйшая і ласкавая, ніколі нікога не пакрыўдзіць.

Наконт Волькі былі і яшчэ некаторыя думкі. Не вінавата, праўда, дзяўчо, але вельмі ж ужо, калі ўдумацца, бацька яе несамавіты чалавек. Не любяць яго людзі. І не таму Даніла так глядзеў на суседа, што той ледзь не кожны раз пры сустрэчы нагадваў старому даўняе мінулае. Пражытыя гады многае сцёрлі з ранейшага. Былы брыгадзір не падабаўся яму проста як чалавек, з-за свайго характару. Але ўсё ж бывалі іншы раз і цяжкія моманты пры такіх начных разважаннях, і тут у бацькі не хапала сілы змагацца з імі. Раптам стукне ў галаву, што Волька, магчыма, сястра Віктарава, і адразу цёмна становіцца ў вачах, не хочацца жыць на свеце.

Калі Даніла гаварыў дома пра Вольку, сын абыякава ўсміхаўся і часцей за ўсё зводзіў гаворку на жарт. Тады бацька і радаваўся ў душы і як быццам бы нечага шкадаваў. Ну, шкадоўля была, усё-такі, вядомая. Ці ж не радасна было б адразу наставіць у хлеў добрую ка-

рову, увагнаць у свінух, які ўжо многа год пустуе, гладкага вепрука?

Калі ж хоць адным словам упаміналася Ларыса, вочы ў Віктара загараліся, ён глядзеў на бацьку з радасным хваляваннем.

* * *

Ларыса стаяла на невялічкім мастку з нізкімі парэнчамі і глядзела адсюль на шырокі палетак. Пад мастком спакойна, з ціхім гаманком, цякла рэчка. Якой ласкавай і прыгожай стала цяпер гэтая рэчка! Берагі зялёныя, мяккія, так і вабяць да сябе. Вада чысценькая, празрыстая, на дне відны каменьчыкі.

А здаецца, што яшчэ зусім нядаўна рэчка была бурнай і магутнай. Хвалі шумелі пад самым насцілам мастка і неслі з сабою дробныя крыгі і пачарнелыя камы снегу. Боязна было падумаць, што будзе, калі вада падымецца яшчэ хоць на некалькі сантыметраў. Нястрымныя хвалі зрушаць тады масток і панясуць яго ў другую вялікую раку, а адтуль — у самае мора.

Боязна тады было стаяць на гэтым мастку. Адна б Ларыса і не асмелілася, а з Віктарам нічога, не думалася ў тыя хвіліны пра якую-небудзь небяспеку.

Перад гэтым яны ўдваіх аглядалі ўчастак пад лён. Не ўсюды яшчэ можна было прайсці, так што ўсяго поля не агледзіш, аднак збольшага межы ўчастка былі вызначаны. Пасля вады і гразкасці пад нагамі на мастку адчувалася такая легката, нібы яны стаялі на клубнай сцэне. Ларыса абаперлася далонямі на сухія і, здавалася, нават падагрэтыя ўдзень парэнчы. Кароткі кажушок з шэрай барашкавай абшыўкай быў расшпілены. Кубаначка з такога ж самага барашку трымалася, мабыць, толькі на пляцёнцы шатэнавых валасоў. Увесь лоб у дзяўчыны быў адкрыты, шчокі ружавелі ад нялёгкай хады і вясенняга ветру.

Віктар быў у прыгожа скроеным бушлаціку, у летняй шапцы з ледзь прыкметнай адзнакай на тым месцы аколышка, дзе нядаўна была чырвоная зорка. Ён нахіліўся над парэнчамі, спрабуючы дастаць рукою ваду, і Ларыса войкнула, нечакана для сябе схапіла хлопца за плечы. Віктар выпрастаўся, з радасным здзіўленнем паглядзеў на дзяўчыну.

— Мне здалося,— сарамліва ўсміхаючыся, сказала яна,— што парэнчы захісталіся.

Віктар ласкава ўзяў яе за рукі.

— Усё тут моцна зроблена,— спагадліва загаварыў ён.— Але ты не глядзі доўга на хвалі, можа замарачыцца ў галаве, тады ўсё загойдаецца пад нагамі. Глядзі лепш на мяне, Лара.

— А ты на мяне глядзіш?

— Гляджу, Ларыска, з малых год я на цябе гляджу, калі хочаш ведаць.

— Не ўспамінай ты лепш пра малыя гады,— усё яшчэ не адыходзячы ад жарту, сказала Ларыса.— Жыць ты мне тады не даваў!

— Бо кахаў,— моцна сціснуўшы яе рукі, сказаў Віктар,— толькі і сам пра гэта не ведаў. Ларыса, мілая! Цяпер то я ведаю! Днём і ноччу думаю пра цябе.— Ён ціхенька, нясмела пацягнуў яе за рукі.

Дзяўчына не вырывала рук і не прыхінялася, а толькі глядзела на Віктара неяк зусім-зусім па-асабліваму. Маўчала і глядзела, нават не ўсміхалася. Вочы яе блішчалі, і здавалася ў вясеннім паўзмроку, што гэтыя імклівыя, неўгамонныя хвалі адбіваліся ў іх.

Рантам яна моцным рыўком вызваліла свае рукі. Віктар здрыгануўся. Але не паспеў ён апамятацца, як дзяўчына гэтак жа імгненна і парывіста абхапіла яго шыю і ўпала тварам на грудзі...

...Няхай бы нават і сарваўся ў гэты момант крушнікоўскі масток! Няхай бы імчаў іх разам з бурнымі хвалямі ў самае сіняе мора! Нішто не было б страшным! Паплыла б тады Ларыса хоць на край свету, абы толькі з Віцем, каб толькі заўсёды трымаць яго вось так у першых сваіх дзявочых абдымках і адчуваць радасны, нястрымны стукат яго сэрца...

У той вечар Ларыса не магла доўга быць у сваёй хаце. Ёй здавалася, што маці паглядае на яе з нейкім дакорам і падазронасцю, што Павел быццам бы ўвесь час хоча сказаць нешта смешнае ды падбірае зручны выпадак. Дзяўчына ледзь не на хаду павячэрала і выбегла на вуліцу. Тут зноў жа не ў кампанію яе пацягнула, не да сябровак. На сэрцы ляжалі такія адчуванні, пра якія не здолееш расказаць нікому: ні маці, ні самай дара-

гой сяброўцы. Нават Віктару Ларыса не змагла б цяпер сказаць ніводнага слова. Хацелася пабыць адной, толькі адной. Ісці некуды і ісці, думаць, успамінаць. І каб ішла так суткі ў адзіноце і ў цішыні, дык усё не перашкала б свежасць тых адчуванняў, якія прыходзяць, бадай-што, адзін раз у жыцці. А як бы хацелася захаваць іх на самы доўгі час! Таму — адзіноцтва і маўчанне. Скажаш каму-небудзь слова, і ўжо не будзе таго нязведанага трапятання ў грудзях, таго чароўнага святла на душы.

Сама не заўважаючы, Ларыса выйшла ў поле і апынулася на той самай дарозе, па якой зусім нядаўна ішла з Віктарам дадому. Прайсці яшчэ кіламетры два і — масток. Але не! Чаго ж цяпер ісці на масток? Хіба для таго, каб паўтарылася ўсё тое, што было? Не трэба туды ісці, таму што і масток і Віктар увесь час перад вачыма: у вушах гучыць ціхі, усхваляваны Віктараў голас, на шчоках і на вуснах палымнеюць яго пацалункі.

Ларыса вярнулася назад. Ішла ўжо цішэй. Не хацелася адразу ўваходзіць у вуліцу, каб там каго не сустрэць. Вечар быў ціхі і зусім не халодны, першы сапраўды вясенні вечар...

Прайшло з таго часу многа вясенніх дзён і вечароў. Кожны дзень Ларыса з радаснай урачыстасцю сустракала на полі першы сонечны прамень, а ўвечары, як бы позна ні прыйшла з работы, якую б стомленасць ні адчувала, усё роўна перад сном думала пра Віцю. Думкі гэтыя былі такімі светлымі і прывабнымі, што часта адганялі сон. І ўсё ж назаўтра Ларыса зноў апярэджвала сонца і ніколі не адчувала ніякай стомленасці.

На прадвесні, калі яе прызначылі звеннявой па ільну, яна доўга трывожылася, перажывала, як давядзецца працаваць, ці хопіць сілы, ведаў, умельства? Бывала, толькі ў думках ёй хацелася многае направіць у брыгадзе. Бачыць, што тая ці іншая справа ідзе не так, як трэба, а ўзяцца направіць не можа. Не хапала рашучасці, самастойнасці ў дзеяннях.

Цяпер жа Ларыса не нацешыцца сваёй работай. Пакуль што ўсё выходзіць не горш як у людзей. Часам нават здаецца, што малавата цяжкасцей сустракаецца на дарозе.

Магчыма, яшчэ будуць цяжкасці, але яны не нaганяюць страху. На ўчастку ўжо вунь які лён.

Ларыса стаіць на мастку і любуецца сваім ільном. А лён ужо зацвіў. Глянь на неба і глянь на зямлю, — не заўважыш розніцы. Колькі разоў у сваім жыцці Ларыса бачыла, як цвіце лён! З малых год знаёма ёй гэтае цвіценне. І ніколі яна яшчэ не бачыла такога хараства, не адчувала такой асалоды, гледзячы на мора блакітна-сініх кветачак. Зусім асаблівымі, незвычайнымі здаваліся ёй цяпер гэтыя кветачкі. Ад іх цяжка было адарваць зрок. Адчувалася тут нешта сваё, роднае, бясконца дарагое. Нібы вочкі дзіцячыя пасылалі Ларысе сваю свежую ласку і цеплыню, нібы песні тых дзяўчат, што тут працавалі, і запеўкі самой Ларысы ператварыліся ў чароўнае сіне-блакітнае мроіва.

* * *

Калі Даніла ўпэўніўся, што сын збіраецца ажаніцца з Ларысаю, дні два хадзіў, насунуўшы на бровы старую аўчынную вушанку. Шкада было ўсё ж такі Шандыбовічавага пасагу. Потым яму сказалі, што дачка Крыніцкага можа стаць у гэтым годзе багацейшай за Вольку.

— Як гэта яна стане?

— А заробіць на льне.

Даніла верыў гэтаму і не верыў. За яго памяць яшчэ не было такога выпадку, каб хто-небудзь у іхнім калгасе вельмі многа зарабляў. Але ж даходзілі чуткі з іншых калгасаў,— зарабляюць людзі, дык, магчыма, што і Ларыса заробіць. Няхай зарабляе на здароўе.

Пры сустрэчах з Ларысай Даніла неяк па-асабліваму, з павольным нахілам галавы, здароўкаўся, а спаткаўшыся аднойчы са старым Крыніцкім, яны, мабыць, каля паўгадзіны гаманілі аб надвор'і, аб ураджаях, аб тым, што Шандыбовіч пачаў выраблядь дома аўчыны. Пра вяселле, а значыцца, і пра хуткае сваяцтва ніводзін з іх нават і не намякнуў.

А між тым запаветны дзень набліжаўся. Самыя большыя клопаты па падрыхтоўцы да вяселля ляжалі на Ларысінай мацеры, бо ў хаце жаніха, як вядома, не было гаспадыні. У Крыніцкіх дні два валіў з коміна дым, а ўжо на трэці сталы гнуліся ад усяго варанага, смажанага, печанага. Па старанню Шандыбовічыхі ледзь не адна ка-

ля адной стаялі на вышываных абрусах пляшкі, заткнутыя сапраўднымі коркамі, піўнымі каўпачкамі, істужкамі розных колераў, кукурузнымі пачаткамі і проста скруткамі паперы. Гасцей найшло столькі, што сядзець ім давялося шчыльна і на чым папала: на розных зэдліках і ўслончыках, сабраных ледзь не з усёй вёскі, на дошках, пакладзеных на калодкі. Сядзелі таксама на ложку, засланым даматканай капай. Шырокія маліпавыя палосы гэтай капы відаць былі толькі каля самай сцяны. Стол быў прыстаўлены і да прыпечнага палка. Тут сядзелі адна пры адной некалькі бабулек, відаць, не надта блізкіх па радству.

Маладым было адведзена месца на покуці. Маладога і маладую звычайна ў вочы ўсе хваляць, а за вочы бывае так перамыюць костачкі, што каб маладажоны даведаліся пра гэта, то, напэўна, уцяклі б з вяселля. Віктар жа і Ларыса, сказаць праўду, усім падабаліся, нават самы бязлітасны язык не здолеў бы павярнуцца, каб што-небудзь ляпнуць на іх. Абое яны былі прывабнымі ад прыроды, а калі на вяселле надзелі самае лепшае, што ў іх было: Віктар новенькую гімнасцёрку з белым, як снег, падкаўнерчыкам, Ларыса — белае прыгожае плацце; калі яшчэ кветак папрыколвалі: Віктар — да верхняй левай кішэні, Ларыса — да валасоў, то ўсім стала відавочным, што такой пары ўжо даўно не было ў Крушніках.

Даніла сядзеў поруч з маладой. Ён мала бываў на розных вяселлях, радзінах, хрысцінах, таму адчуваў сябе так, нібы ўсе гэтыя людзі, што тут сабраліся, нечага патрабавалі ад яго. Аднак, калі глядзеў на сваю нявестку, яму рабілася радасна, ўяўлялася нават, што яна ўвесь час будзе хадзіць вось у гэтым белым плацці і з кветкамі ў валасах.

Бацька Ларысы, сівавалосы, але з твару яшчэ не стары, сядзеў недалёка ад жаніха. У процілегласць Даніле гэты чалавек трымаўся на людскіх вачах хоць і не ганарліва, але зусім вольна і незалежна, нібы спраўляў такія вяселлі кожны тыдзень.

Чарка за здароўе маладых выпілася ўсімі з пэўнай урачыстасцю, але ціха, спаважліва, без лішніх рухаў і слоў. Закуска пасля чаркі таксама бралася быццам не па ахвоце і пераважна якімі-небудзь прыладамі: відэльцамі, лыжкамі, нажамі. Калі ж прайшла другая чарка, трэцяя,— да маладых пасыпалася столькі жартаўлівых

слоў, што аж Ларысін бацька стаў адчуваць сябе ніякавата. Відэльцы, лыжкі, нажы ў большасці выпадкаў недзеназасоўваліся, а то нападалі пад стол, і пальцы часцей замільгалі над талеркамі, міскамі, скавародамі.

Больш за ўсё сустракаліся людскія пальцы над тымі пасудзінамі, у якіх была смажаная парасяціна. Ларыса заўважыла нейк міжволі, што адна жанчына, даглядчыца па свінаферме, узяўшы ў бліпчастыя ад тлушчу пальцы кусок парасяціны, нешта шапнула суседцы і ледзь прыкметна павяла вокам на Віктара. Ларыса таксама трымала на відэльцы парасяціну з чыстай жоўтай скуркай. Відэлец у яе руцэ затрымцеў. Потым такое ж трымценне адчулася пад сэрцам. Рука з відэльцам квола апусцілася. Цягнула хутчэй глянуць на Віктара і не хапала рашучасці. А што, калі пра нешта дрэннае шапнула даглядчыца?..

Нехта з крайняга стала сіпаватым, але пранізлівым голасам пракрычаў тост за маладую, яго дружна падтрымалі. Ларыса ледзь не праз слёзы ўсміхнулася, узяла ў рукі чарку. Трошкі надпіўшы, яна глянула на свой відэлец з парасяцінай, і ў роце ў яе стала горка і непрыемна. Раптам апанавала здзіўленне, як яна магла есці гэтую парасяціну? З прыглушаным адчаем глянула на Віктара. Той пакручваў у пальцах чарку і, стоячы, абменьваўся з некім прывітальнымі жэстамі. У яго ўсмешцы, у прыгожых вясёлых вачах было столькі шчырасці і чалавечай прастаты, што Ларысе стала сорамна за свае думкі. Яна ўжо сабралася крыху адкусіць са свайго відэльца, як убачыла, што ў дзвярах паказаўся Шандыбовіч і ўрачыста зняў кепку. Гэта развеяла яе цяжкія думкі, але прынесла іншую трывогу. Ведаючы натуру былога брыгадзіра і яго адносіны да Віктара, Ларыса падумала, што чалавек прыйшоў не з добрым намерам. Вочы яе сустрэліся з позіркам Волькі, якая сядзела недалёка ад Паўла. Дзяўчына таксама здзіўлена і недаверліва глядзела на бацьку.

Аднак Шандыбовіч і не думаў учыняць якія-небудзь непрыемнасці. Праціснуўшыся ледзь не да покуці, ён разгладзіў бараду і, не шкадуючы слоў, павіншаваў маладых. Затым адхінуў правае крысо пінжака і дастаў з кішэні штаноў адну бутэльку, адхінуў левае крысо і дастаў другую.

— Хоць я асабіста і не званы сюды,— на паноўскі манер загаварыў ён, ставячы гарэлку на стол,— але рашыў,

што не магу, не маю права не раздзяліць з вамі хлеб-соль у гэты радасны дзень, а тако ж і вось гэта,— ён паказаў на бутэлькі.— Сусед усё-такі жэніцца, а не хто-небудзь! Ну, і ты, Кузьма,— падняў ён бараду на Ларысінага бацьку, нічога дрэннага мне не зрабіў, тако ж, як і я табе.

— Сядай, Адам! — сказаў Крыніцкі і пасіснуўся бліжэй да жаніха.

Шандыбовіч абагнуў стол і ўмясціўся побач з гаспадаром хаты.

Праз некаторы час, добра глынуўшы, ён за спінаю Крыніцкага ўжо гаварыў Віктару:

— Ты думаеш, што я злую на цябе за гэтае самае брыгадзірства? Думаеш, канешне. А я нават рады, што так выйшла. Ты маладзейшы, табе і карты ў рукі. Энергія, ініцыятыва! А я адпачну тым часам.

— Адпачываць яшчэ рана,— мірным тонам заўважыў Віктар.— У нас для ўсіх многа работы.

— А хіба я супраць? — падхапіў Шандыбовіч.— Я асабіста ніколі не быў супраць работы. А табе я нават хацеў бы дапамагчы. Не сталі мы сваякамі,— ну, што ж? Тут справа такая... Але ж мы ўсё-такі суседзі...

Калі на двары загаманіў на ўсе лады гармонік і загрымеў бубен, Ларыса выскачыла з-за стала, як птушка з клеткі, хацела падбегчы да сваіх сябровак і ў віхрыстай польцы забыцца на ўсе рытуальныя фармальнасці, стаць такой жа вольнай, шчаслівай дзяўчынай, якой яна была яшчэ нават учора.

Аднак, сустрэўшы ў сенцах стомленую клопатамі маці, вінавата ўзняла на яе цёмна-карыя вочы, спынілася. Адразу ўспомніла, што няма ўжо таго, што было, мінулася. З заўтрашняга дня на яе рукі ўзваліцца чужая хата, гаспадарка і трэба будзе вось гэтак жа, як мацеры, і днём і ноччу рупіцца аб усім і аб усіх. Блізкасць Віктара цешыла, а стары Даніла палохаў Ларысу. Яна паважала яго ўвесь час, з самых малых год, а вось як давядзецца називаць яго другім бацькам, жыць з ім у адной хаце, есці з адной міскі?..

— Можа, што памагчы вам? — звярнулася маладая да мацеры.

— А што ж ты мне цяпер будзеш памагаць? — з жалем і нібы з папрокам сказала маці.— Ёсць табе цяпер каму памагаць.— Яна хацела засмяяцца і звесці ўсё гэта на жарт, ды толькі ледзь стрымалася ад слёз. Жанчына

замаргала пачырванелымі ад стомленасці вачамі і нагнулася, каб узяць у рукі хвартух. Ларыса абняла яе.

— Не трэба, мамачка, не трэба так!

Потым, калі старая супакоілася, спытала:

— Мама, вось гэтыя самыя парасяты, што вы смажылі... Адкуль яны ў нас?

— Віктар прынёс,— раптам насцеражыўшыся, адказала маці.— А што?

— Нічога, мама. Вельмі смачныя, таму я і спытала.

— Дык я ж з імі... Ты ведаеш?..

Тут маці гатова была б цэлую гадзіну расказваць, што яна рабіла з гэтымі парасятамі, але падышлі развясёлыя ад гарэлкі жанкі, сталі наперабой хваліць закуску і асабліва выпіўку.

— Ідзі, дачушка, пагуляй,— сказала Ларысе маці, а сама пайшла з гасцямі.

На двары, ужо добра ўтаптаным нагамі, маладую абкружылі дзяўчаты. Волька пацягнула яе на кракавяк, але танец выходзіў у іх трошкі халаднаватым, не было ў ім той асаблівай жывінкі, якая вабіць вока, натхняе і адрознівае адну пару ад другой. Абедзве былі вінаватыя ў гэтым: і Волька, і Ларыса. Вольцы стала сумна ад таго, што яна ўявіла, гледзячы на Ларысу, як Віктар будзе цалаваць вось гэтыя чарнявыя вочы, якія чамусьці сёння не надта весела глядзяць на яе, вось гэтыя свежыя вусны, шчокі ды валасы, на якіх ужо не будзе кветак. І міжвольна падумалася дзяўчыне, што вельмі ж шчаслівая Ларыса. Гэтае шчасце не раз уяўлялася Вольцы самой, але не судзіў лёс. Яна зусім-зусім не крыўдуе на сваю сяброўку. Няхай здарова жыве. Можа, калі-небудзь шчасце прыйдзе і да яе, да Волькі, дачкі Шандыбовіча, якога ў Крушніках ніхто не любіць. Дачка Шандыбовіча, дачка Крыніцкага... Там дачка і тут дачка, а розніца, мабыць, вялікая. І мацеркі ў некаторых дачок не такія, як трэба: людзі працуюць у калгасе, а яны гоняць самагонку. І гандлююць гэтай самагонкай. А некаторыя дочкі ведаюць пра гэта і маўчаць. Не асмельваюцца пярэчыць бацькам, баяцца, каб не звяліся на стале смачныя бліны з мачаннем, ды каб, часам, не здолеў хто-небудзь у вёсцы лепш і прыгажэй адзецца...

Волька павяла вокам па кругу і ўбачыла Паўла. Хлопец танцаваў з адной дзяўчынай з Ларысінага звяна. Твар яго палаў радасцю і натхненнем, а ногі хадзілі так лёгка, што, здавалася, зусім не датыкаліся зямлі. Ён узбуджана

глядзеў на сваю партнёршу, а тая гатова была ўвесь свет здзівіць сваёй спрытнасцю.

«І гэты мяне пакіне,— з болем падумала Волька.— Няхай пакідае! Усе няхай пакідаюць, бо за што мяне любіць?! І Ларыса, і гэтая, што з Паўлам, Варка,— абедзве лепшыя за мяне. Ім і за бацькоў не сорамна, і самі яны на сапраўднай рабоце. А я?.. Што я раблю? Падлічваю працадні ды пішу ў праўленне паперкі пад Віктараву дыктоўку. Кіну ўсё к чорту! Няхай сам падлічвае тое, што іншы раз і на пальцах можна паказаць, няхай сам піша свае паперкі. Папрашу Ларысу, каб узяла ў звяно».

А Ларыса паглядала на дзверы сянец і чакала, што павінен хутка выйсці малады. Хацелася яшчэ раз глянуць яму ў вочы тым жа самым паглядам, якім глядзела за сталом. А можа, спытаць пра гэтыя парасяты ў Волькі? Яна ж там усё выпісвае і запісвае.

Рука ў Волькі чамусьці халодная, хоць гэтак цёпла на дварэ. І ні кропелькі поту на твары дзяўчыны, толькі рэдкія вяснушкі каля маленькага носа і пад вачамі сталі больш прыкметнымі. А вочы сумныя, засмучоныя. Не, не трэба цяпер у яе пра гэта пытацца...

Віктар з'явіўся, на здзіўленне ўсім, ледзь не ў абдымках Шандыбовіча. Ларыса адчула, як задрыжала Вольчына рука. Ногі абедзвюх узышлі на траву каля плота, і, нібы па нечаму загаду, іх танец стаў затухаць. Гарманіст заўважыў, што маладая стамілася, і перастаў іграць, але добра захмялелы барабаншчык не звярнуў на гэта ўвагі. Ён лупіў у ручны бубен яшчэ з большым імпэтам. Паколькі ўсе танцоры былі на тым жа вясельным узроўні, што і барабаншчык, то і яны не заўважалі, што гарманіст ужо даўно сядзіць, успёршыся падбародкам на складзены гармонік. Жарылі пад барабан так, што аж пыл курэў з-пад ног.

Волька моўчкі пакінула Ларысу і пайшла да тых дзяўчат, якія ўжо таксама скончылі танцаваць і, стоячы пад развесістым галлём ігрушы, абмахваліся хусцачкамі. Ларыса наблізілася да Віктара. Жаніх быў не п'яны, хоць размаўляў з усімі гучна, раскацiста смяяўся і ахвотна прымаў залішнія знакі павагі ад Шандыбовіча. Убачыўшы маладую, ён памкнуўся да яе, але Шандыбовіч утрымаў яго за плячо.

— Пачакай, Бі-бірук, — ужо слабавата валодаючы языком, прамовіў ён,— з ёй ты яшчэ пацешышся...

Ларыса ўзяла Віктара пад руку.

— Ты, суседачка,— звярнуўся да яе Шандыбовіч,— націскай на лён, націскай! Я асабіста думаю, што ты можаш праславіць і бры-брыгадзіра і ўсіх нас грэшных, разам тут узятых.

— Заўтра аб гэтым пагаворым,— стараючыся адарвацца ад неадчэпнага суседа, сказаў Віктар.— Пойдзем цяпер прытупнем, каб аж падэшвам горача стала.

Гарманіст урэзаў польку. Ларыса радавалася, што Віктар не п'яны, бо яна вельмі баялася п'яных, і наважыла адразу распачаць з ім тую гаворку, якая не давала ёй спакою.

— Віця, ты на ферме ўзяў гэтых парасят? — нясмела і ціха спытала яна.

— Якіх?

— Што мама засмажыла на вяселле.

— А-а! Гэтых? На ферме. Дык што?

Голас у Ларысы задрыжаў.

— Віця, дык як жа гэта?.. Як ты мог?..

— Я іх выпісаў,— спакойна і ўпэўнена сказаў Віктар.— Па ўсіх правілах! От якая ты! Хочаш, дакументы пакажу. Няўжо на вяселле брыгадзіра не могуць адпусціць парачку весенчукоў?

Ларыса супакоілася, на сэрцы ў яе адлягло.

* * *

У Данілавай хаце адразу пасвятлела. Змянілі свой выгляд сцены, столь, печ, комін. Выветрыліся той застаялы пракіслы пах, які трымаўся ў хаце на працягу многіх год. Глянеш — і вока радуецца: ля сцяны — вялікі ложак з гарой падушак, ляжыць падушка нават і на палку ля печы. Гэта для Данілы.

А Даніла ўжо даўно адвык ад мяккай пасцелі. Калі ў першы раз ён уступіў Ларысінай просьбе і падклаў пад галаву падушку, то доўга не мог заснуць. Усё яму здавалася, што нешта варушыцца, шамаціць пад вухам.

Завялася і сякая-такая гаспадарка. У хлеўшку хоць і не было каровы, аб чым Даніла, канешне, доўга марыў, але стаяла цяпер вельмі ласкавая белалобая цялушка. Калі стары заходзіў у хлеў, яна выцягвала шыю і праз парканчык лізала шурпатым языком яго руку. У катуху побач здаволена рохкаў вепручок. Бывалі выпадкі, што начу

Даніла прачынаўся і ішоў праведваць, ці не здарылася што з яго худобкай.

З'явіліся, такім чынам, у Данілы пад старасць прыемныя і якраз яму па сіле клопаты. З самага ранку ён хадзіў каля хаты, даглядаў цялушку, непручка. Двор цяпер быў не пусты, значыць, і адносіны да яго змяніліся. Хацелася то плот паправіць, то катушок перагарадзіць, то страху ў хляве залапіць. Нават сваёй старой рабіне Даніла ўдзяліў патрэбную ўвагу і быў вельмі задаволены, што ў мінулую зіму не спілаваў яе. Дрэва пахарашэла, калі з яго было знята сухое галлё, а зямля каля ствала ачышчана ад крапівы, лопуху і дзядоўніку. Найбольш ураджайныя і надломленыя ветрам галіны былі падпёрты дручкамі. Дзеля гэтых падпорак і колляў на платы Даніла яшчэ не адзін раз хадзіў пехатой у лес, хоць конюх Мяфодзій дакараў яго за гэта і паказваў на пальцах, што ў любы час бацька брыгадзіра можа ўзяць каня.

Памаладзеў Даніла, падужэў, стала лягчэй яму хадзіцца, лягчэй дыхацца, і думкі ў галаве з'яўляліся часцей за ўсё светлыя, вясёлыя. Паспрабаваў адпусціць бараду і здзівіўся: барада стала расці больш густой і жорсткай. Учапіўся пальцамі за валасіну, пацягнуў,— куды там! Не вырвеш, як раней. Мусіў ісці да свата і прасіць, каб той яго пагаліў.

Наведваўся Бірук і ў калгасную адрыну, калі было з чаго віць вяроўкі. І там яго рукі хадзілі спраўней, «вераўчаны камбайн» лепш слухаўся. Больш яму брыгадзір нічога і не загадваў.

І ўсё ж, як ні завіхаўся стары, усцешаны сваім новым жыццём, у многіх справах ён не мог зраўняцца са сваёй нявесткай. Устане сам, здаецца, так рана, што птушкі яшчэ дрэмлюць, глядзіць — а Ларыса ўжо на нагах. Не паспее глянуць у вядро, ці ёсць там вада, а нявестка ўжо схапіла гэтае вядро і пабегла да калодзежа. Не паспее дайсці да павеці ўзяць дроў, як Ларыса ўжо там:

— Не трэба, тата, я сама набяру.

Накарміць і напаіць цялушку, паглядзець там яшчэ што-небудзь каля хаты,— колькі там на гэта часу трэба? Пройдзе, здаецца, якая-небудзь паўгадзіна, не больш, і ўжо чуе Даніла звонкі і ласкавы голас з парога сянец:

— Тата, ідзіце снедаць!

Снедаюць яны ўсмак, бо ўсё на стале свежае, гарачае і прыгатавана ўмелымі рукамі. Пасля снедання Ларыса

збіраецца на работу. Хуценька, паваротліва збіраецца і на хаду гаворыць бацьку, што трэба зрабіць у хаце і каля хаты ўдзень. Барані божа,— не загадвае, не камандуе, а просіць, ды такі голас у яе ў гэты час, такія словы падбіраюцца, што Даніла на неба палез бы, каб толькі выканаць нявестчыны даручэнні.

— Вось гэта Віцю я зварыла,— паказвала Ларыса на гаршчок у печы.— Як устане, дасце яму. А гэта — вепручку. Як будзеце замешваць цеста, крыху пасоліце. Глядзіце ж тут, самі не галадайце. Калі мы спознімся на абед ці зусім нельга будзе нам прыйсці, то вунь у кутку — капуста ў накрытым скавародой гаршку.

Уставаў Віктар, і для Данілы пачыналася самая складаная частка работы. Трэба было, па-першае, дзейнічаць віламі так, каб не паабварочваць гаршкоў у печы, а падругое,— разабрацца і не пераблытаць, дзе стаяла прыгатаванае для Віктара, дзе для вепручка, а дзе для самога Данілы.

Паснедаўшы, Віктар ішоў спачатку да Шандыбовічаў і дыктаваў там Вольцы розныя данясенні і распараджэнні. Вольга моршчылася і крывілася ад гэтых дыктаванняў, але ўсё-такі пісала. Гадзінам к дзесяці перад вокнамі Шандыбовічавай хаты з'яўляўся Мяфодзій з асядланым жарабком. Віктар выязджаў на поле, а Вольга часта ламала сабе галаву, каб прыдумаць якую-небудзь работу на дзень, і не магла прыдумаць.

Даніла, выправіўшы сына, выконваў астатнія даручэнні нявесткі і знаходзіў сабе безліч усялякай іншай работы. Каля паўдня ён чакаў Ларысу і што б ні рабіў каля хаты, то міжвольна прыслухоўваўся, ці не чуцён нявестчын адметны, заўсёды ласкавы голас, ці не кліча яна: «Тата, ідзіце абедаць!»

Калі ж не прыходзіла нявестка (а сын амаль кожны дзень не прыязджаў на абед), то і стары не даставаў з печы запаветны гаршчок. Кране страву, памяшай,— і страціць яна смак, знікне той свежы, прывабны пах, які прымушае чалавека браць лыжку нават і тады, калі ён зусім не галодны.

Раз нявестка заставалася галоднай, то і Даніла нічога не еў да вечара. Прыцемкам вярталася дахаты Ларыса, даставала з печы гаршчок, і яны разам елі ўпрэлую за дзень капусту. Потым яна падпальвала ў печы, каб згатаваць чаго-небудзь свежага для Віктара, а пасля вячэры

налівала ў начоўкі цёплай вады, ставіла на падлогу каля палка і гаварыла свёкру:

— Тата, папарце ногі перад сном. Вельмі ж добра спіцца пасля гэтага.

І Даніла пакорліва разуваўся, садзіўся на палок і апускаў у ваду падапрэлыя ад руплівага тупання пальцы. Часта ён задрэмваў так над начоўкамі, а да таго пакуль задрэмваў, дык аб чым толькі не думаў у гэтыя лагодныя хвіліны, пра што толькі не ўспамінаў? Прыемнае цяпло ў нагах іншы раз нагадвала аб адным выпадку з часоў акупацыі, калі Даніла, хоць і вельмі баяўся, але рызыкнуў украсці ў немцаў вось такое ж цяпло.

Ідучы неяк перад змярканнем агародамі, ён убачыў, што немцы падвезлі да крушнікоўскай лазнічкі ледзь не шурку сухіх дроў. Заскрабло ў Данілы на сэрцы: дома ў яго ні сучка, ні трэсачкі. Віця сядзіць на печы, ухутаны коўдрай. Намерзся за дзень да таго, што пасінеў увесь і зубы пачалі ляскаць. «Ухапіць бы паленцаў са тры,— падумаў Даніла,— вось бы шчасце!» Але каля дроў стаяў вартавы,— не падыдзеш.

Доўга патупваў Бірук непадалёку ад лазні, усё цікаваў, ці не адвернецца куды вартавы. Потым стала відавочным, што немцы будуць напальваць лазню сёння, значыць, нікуды адсюль не поідуць. Даніла схадзіў праведаць сына, але ўседзець дома не мог. Цягнула яго да лазні: гэта ж уявіць сабе, колькі там сухіх дроў! Дзяжурыў у зацішку з гадзіну, потым заўважыў, што на яго шчасце немцы раптам шмыганулі з лазні і падаліся на вуліцу. Няйначай, нешта ўстрывожыла іх. Пачакаў Даніла з хвіліну, каб упэўніцца, што ніводнага злыдня ў лазні не асталося, і давай цягаць гэтыя дровы. Ледзь не падарваўся, пакуль перанасіў. Заскочыў на апошнім рэйсе ў лазню, а там такая пара, што аж дух заняло. І вады гарачай многа. Гэта ж усё астыне і прападзе!

Выпускаць у паветра такое дабро? Хуценька раздзеўся ды на гарачую полку. Як наддаў яшчэ пары, дык, здавалася, касцям горача стала. Як хвасцянуў венікам,— здавалася, скура злазіць.

І толькі саскочыў з полкі, узяўся за вопратку, чуе — немцы гергочуць непадалёку. Ён згроб усё сваё дабро ў бярэмя і — дай божа ногі!

Хоць давялося бегчы дадому без нагавіц, але ж затое папарыўся ў ахвоту.

Розныя ўспаміны прыходзілі Данілу на памяць, пакуль ён не задрэмваў, спусціўшы ногі ў цёплую ваду. А калі задрэмваў, падыходзіла да ложка Ларыса, папраўляла падушку, і стары клаўся адпачываць. Засынаў ён у тую ж хвіліну і толькі, калі прачынаўся пасля поўначы і ўпадаў у непазбежную старэчую бяссонніцу, узнаўляў у памяці ўсё, што было ўчора. З'яўлялася тое ж самае слодычна-млявае адчуванне, што авалодвала ім, калі грэў у вадзе ногі, тое ж самае пачуццё ўдзячнасці, якое ўчора мільганула перад сном, калі Ларыса папраўляла падушку і накрывала старому ногі. У такія бяссонныя гадзіны іншы раз нават сумленне пачынала непакоіць. Ну, за што яму такая павага ад нявесткі, чым ён яе заслужыў? І прыходзіў да думкі, што, мабыць, проста шчасце напаткала чалавека пад старасць, не ўсё ж жыццё быць яму нешчаслівым. А калі больш паглыбляўся ў свае развагі, то меркаваў, што пэўная заслуга ў яго ўсё-такі ёсць. Выгадаваў сына — вось табе і галоўная заслуга. Не было б сына, не было б і нявесткі.

Віктар па-ранейшаму ўяўляўся бацьку хлапцом незвычайным і да таго своеасаблівым, што раўняць яго з кім-небудзь іншым было б проста грахом. Таму, мабыць, і жонка яму трапілася такая незвычайная. Ларыса ведала, за каго ішла.

Праўда, у апошнія часы Даніла ўжо не раз падумваў аб тым, што трэба было б сёе-тое сказаць сыну для яго ж карысці. Чаго варта, напрыклад, тое, што Мяфодзій кожную раніцу круціцца з канём перад вокнамі? Нават пры Шандыбовічу гэтага не было. Затым, можна ж было б крыху раней уставаць і дапамагаць каля дому жонцы, пакуль ісці на работу. А ён спіць сабе і ні аб чым не думае. Як пры бацьку жыў без ніякіх хатніх клопатаў, так цяпер і пры жонцы.

Думаў стары пра гэта сказаць, ды не асмельваўся. Цяпер Віктар самастойны чалавек, жанаты. Няхай яму жонка скажа. Параяцца між сабою, пашэпчуцца і ўсё ўладзяць. Людзі разумныя.

Бацькоўскі гонар за сына не змяншаўся з-за гэтага. Што ёсць, тое ёсць. Без маці, без чыёй там ні было б дапамогі выхаваў чалавека, адукаваў. А цяпер і бацькава старасць будзе шчаслівай. Асталася толькі старасць, усё

лепшае пражыта, і яно было падаравана сыну. Не шкадаваў Даніла аб тым, што не мог цяпер прыгадаць такую хвіліну, калі б ён не клапаціўся аб сыне, не дрыжаў за яго лёс. Не шкадаваў і аб тым, што для таго, каб сын еў смачней за іншых, насіў лепшую вопратку, бацька не толькі днём, але і ноччу не меў упынку ў рабоце. Не мог Даніла ў чым-небудзь адмовіць сыну-сірацe, пазбавіць яго той або іншай радасці. Гадаваўся Віця ў дастатку. Усё для яго было. Каб навучыць малога біць у барабан, Даніла некалькі разоў хадзіў у суседнюю вёску Гдзень, выторгоўваў там у аднаго прыдуркаватага музыкі набітую на жончынай галаве скрыпку. Склеіў потым гэтую скрыпку і месяцы два пілікаў па вечарах, пакуль не ўзнавіў у пальцах і ў памяці завучаны некалі ў ранняй маладосці кадрыльны галоп. Тады па святах бацька іграў, а падлетак-сын лупіў у барабан, таксама зроблены Даніла. Людзі ішлі па вуліцы і супыняліся ля Данілавай хаты: «Весела жывуць Бірукі».

Паступова ўвайшло ў жыццёвае правіла — толькі тое мела пэўны сэнс для бацькі, што было карысным і цікавым сыну.

* * *

Малады брыгадзір сядзеў за сталом у сваёй хаце і разбіраў пошту. Пошта прыходзіла ў Крушнікі не часта, затое ўжо калі прыходзіла, то вялікім пакункам, за некалькі дзён адразу. Віктар абрэзваў канверты нажніцамі, як сапраўдны канцылярыст, і чытаў кожную паперку доўга і ўважліва, нібы вывучваў яе на памяць.

Некалькі дырэктыў было ад калгаснага праўлення з адметным подпісам старшыні. Усе яны пачыналіся словамі «пад вашу асабістую адказнасць», якіх брыгадзір, звычайна, не прачытваў. Дзве дырэктывы былі ад сельсавета і адна з раённай пажарнай каманды. У іх таксама пісалася: «Пад вашу асабістую адказнасць прапануецца...»
Віктар разгладзіў далонямі ўсе лісткі, акуратна праставіў дату атрымання і склаў іх у папку.

Вярнулася з поля Ларыса, ля парога развязала пад барадою клятчастую хустачку, радасна ўсміхнулася мужу.

— Чаго ты такая ружовая? — беручыся за газеты, спытаў Віктар.

— Мне сказалі, што ты паехаў дадому. Спяшалася, каб хоць раз паабедаць разам.

— Ну, як там лён? — тонам гаспадара спытаў Віктар.— Увесь разаслалі?

— Увесь! — адказала Ларыса, і яе твар стаў яшчэ больш ружовым і ўзбуджаным.— Каб толькі цяпер росы цёплыя!.. Шоўк быў бы, а не лён!

— Тут табе пісьмы,— з ноткай абыякавасці сказаў Віктар і на момант спыніў позірк на двух сініх канвертах.

Ларыса ўзяла адзін канверт, глянула праз яго на святло ў акне і адарвала палоску. «Пад вашу асабістую адказнасць,— ціха чытала яна,— прапануецца тэрмінова прыслаць звесткі аб зборы членскіх узносаў...»

— Ад каго гэта? — улавіўшы знаёмы стыль, спытаў Віктар.

— Ад нашага сакратара камітэта,— раптам здзівіўшыся, адказала жонка, — але я ўжо даўно паслала такія звесткі!

Гэта крыху напсавала яе настрої, і, мабыць, для таго, каб зусім не раззлавацца, Ларыса адклала другое пісьмо ўбок і стала папраўляць за вушамі крыху ўзварушаную за час работы пляцёнку валасоў.

— Можа, будзем ужо абедаць? — прапанавала яна, і ў голасе, відаць міжвольна, прагучала насцярожаная просьба і нейкая боязь, што Віктар можа раптам адмовіцца ад абеду, устаць і выйсці з хаты.— Я выбегу тату пазаву,— працягвала Ларыса.— Паабедаем, тады і прачытаем усё: і пісьмы, і газеты.

Пакуль яна шукала на двары бацьку, а потым вымала з печы страву, Віктар усё-такі паспеў прагледзець газеты. У абласной быў вялікі артыкул пра Крушнікоўскую брыгаду, а ў раённай — цэлая паласа. Самым падрабязным чынам апісвалася, як у брыгадзе дамагаліся высокага ўраджаю льну і ледзь не ў кожным абзацы называлася прозвішча брыгадзіра.

— Тут усё аб табе! — сказаў Віктар жонцы, калі тая ставіла страву на стол. Паклаў на падаконнік газеты, а сам надумаў: «Не так і многа пра яе. Гэта ўсё Шандыбовічава работа. Умее чалавек і людзям сказаць, калі трэба, і паперку скласці».

— Ну, што ж гэта іх няма? — запыталася Ларыса.

— Каго? — гучна спытаў Віктар.— Бацькі?

— Сказалі, што ідуць, і вось няма.

— Прыйдзе, нідзе не дзенецца!

Ларыса ўсё ж такі пабегла зноў клікаць Данілу, а Віктар без асаблівага апетыту пачаў сёрбаць гарачую капусту.

«Усе справаздачы піша Шандыбовіч,— вярнуўся ён к таму, аб чым нядаўна думаў.— Волька нешта артачыцца цяпер, злуецца. Усё з Паўлам аб нечым шэпчацца. Той мне ўпікаў, што я Шандыбовіча кладаўшчыком паставіў. А што тут такога, што паставіў? Я адказваю за ўсё! У мяне асабліва не разгонішся. А чалавек практычны. Такія людзі патрэбны».

— Што цябе чакаць, як пана? — сустрэў ён бацьку не зусім стрыманым пытаннем.

Ларыса глянула на яго здзіўлена, а бацька прамаўчаў, толькі, калі ўжо сеў за стол, ціха сказаў:

— Я там катух ладзіў, вяпрук падкапаў лычом колле.

— Дык мог бы даўно наладзіць.

— З ранку аж да самага поўдня вяроўкі віў.

Невялікая сямейка збіралася ўжо вылазіць з-за стала, як у хату нясмела ўвайшла нізенькая ды яшчэ прыгорбленая ад старасці калгасніца, падобная па вопратцы на манахіню.

— Хлеб-соль вам, суседзі добрыя,— прыгнуўшыся яшчэ ніжэй, сказала яна.— Не дзівіцеся, што не ў пару зайшла, вельмі ж патрэба такая скорая.

— Да нас заўсёды просім,— сказала Ларыса і падышла да яе. — Сядайце ў нас, калі ласка!

— Няма калі і сядзець, сказаць вам праўду.— Бабулька ступіла крокі два к сталу.— Гэта ж я да вас, Віктарко.

— Каня? — устаючы з-за стала, спытаў Віктар.

— Ага. Каня. У бальніцу заўтра з ранку трэба паехаць. Нешта мой стары, не пры вас кажучы...

— Можна, — перабіў яе брыгадзір. — Скажыце Мяфодзію, няхай дасць.

— Дзякуй вам, Віктарко,— ледзь не кланяючыся, загаварыла з націскам на «ко» бабулька,— дзякуй. Мы ўжо як-небудзь гэтае самае...— Яна чамусьці паказала рукою на сенцы, але, бадай, ніхто не зразумеў яе жэсту.

— Дык што там у твайго старога? — спытаў Даніла.— Учора ж мы разам вяроўкі спускалі.

— Я і не ведаю, Данілко,— адступаючы бокам да парога, прамовіла бабуля.— Стогне. Цэлую ноч стагнаў і цяпер усё стогне і стогне.

Ларыса ўдзячна глянула на мужа і выйшла за бабуль-

кай у сенцы. Там яна па нейкіх справах затрымалася хвіліны на тры, а потым увайшла ў хату з бутэлькай у руках. Яна ледзь не плакала ад абурэння.

— Што гэта такое? — звярнулася да Віктара і, гледзячы на яго здзіўленымі вачамі, падала бутэльку.

Той узяў пасудзіну ў рукі, па закупарцы пазнаў, што яна Шандыбовічава, і абыякава засмяяўся.

— Ну, чаго ж ты яшчэ пытаеш, што гэта? — Ён аддаў бутэльку і лёгка абняў жонку за плечы.— Гарэлка, вядома! Панюхала б і пытацца не трэба.

— Ведаю, што гарэлка,— з крыўдай за такі тон сказала Ларыса і адступіла ад мужа.— Мяне цікавіць, як яна трапіла сюды? Стала я падмятаць падлогу ў сенцах, бачу — пляшка на лаўцы. А дагэтуль не было. Адкуль гэтая пляшка? Вось пра што я ў цябе пытаюся.

— Адкуль, адкуль? — Віктар нахмурыў бровы, і яго светлыя, у апошнія часы ўжо не надта гладкія валасы пад'ехалі бліжэй да пераносіцы.— Мабыць, гэтая самая бабка Дзічыха пакінула. Можа, нават забыла тут сваё дабро па старэчай памяці.

Даніла крактануў разы два, пацёр тылам вялікага пальца запушчаны падбародак і выйшаў з хаты. Яму, напэўна, успомнілася, як ён пекалі насіў гарэлку Шандыбовічу.

— Як табе не сорамна, Віця? — дакорліва ківаючы галавой, загаварыла Ларыса.— Няхай Шандыбовіч на ўвесь раён праславіўся як п'яніца і хабарнік. А ты? Ты ж камсамолец. Ды наогул... Як жа так можна?

Віктар салдацкім крокам падышоў да стала, выцягнуўся, запpавіў гімнасцёрку і, коса пaглядаючы на жонку, стаў гаварыць, нібы дыктаваць суровы загад.

— Вось што! — Ён пастукаў пальцамі па стале.— Ніякіх натацый я слухаць не хачу! Ясна? Наслухаўся за чатыры гады! А хочаш ведаць праўду? Скажу. Ніякім Дзічыхам я не загадваў прыносіць мне гарэлку. А прынесла — назад не панясу. Я на іх усіх працую. За маёй спіною жывуць!

— Ты не панясеш, дык я занясу, — цвёрда сказала Ларыса.— І стукаеш надарма! Даўно мне трэба было табе сказаць, ды ўсё маўчала, думала, сам зразумееш.

— Гэта я ведаю, што даўно злосць носіш,— мякчэй сказаў Віктар, аднак зноў пастукаў пальцамі па стале.— Па вачах бачу.

— Учора пад'ехаў да нашага поля,— не пераставала жонка,— і, не злазячы з каня, дзяўчат падзываеш. Размаўляеш з людзьмі цераз плячо, вось, як са мной сёння. І п'яны ты быў учора, Віця. Вось яшчэ бяда! Прызнайся сам, што быў п'яны і, мабыць, не першы раз.

— Гэта я з нашымі «вышкаўцамі» выпіў,— панура адказаў Віктар і сеў ля стала на лаўку.— З-за іх, чарцей, кроплі нідзе не зноїдзеш, каб і хацеў. Усё асушваюць. Эмтээсаўская крама...

— Ты не зварочвай у другі бок,— перапыніла яго Ларыса.— Вышкаўцы — гэта іншая справа.

— Я хацеў сказаць, што з-за іх эмтээсаўская крама заўсёды пустая і, разумееш...

— Наўрад ці патрэбна табе гэтая крама. Вось ты адкуль бярэш гарэлку! Вось! — Ларыса выставіла Шандыбовічаву пляшку.— Мабыць, з-за гэтага і на абед цябе не дачакацца, а калі і прыйдзеш, то ясі ўсё роўна як чужым ротам. Што ты толькі робіш, Віця!

Яна ўзяла з падаконніка газету, абгарнула ёю пляшку і, непрыкметна выцершы рукой вочы, выбегла з хаты.

Віктар некалькі хвілін сядзеў моўчкі, упарта глядзеў на дзверы і барабаніў пальцамі па стале. Барабаніў што далей, то ўсё мацней і драбней. Хутка злавіў сябе на тым, што выстуквае польку-весялуху. Тую самую польку, што ігралі ўчора ў клубе. У руках у яго была тады балабешка, гладкая да слізгаты і чарнаватая ад чужых рук. Ён барабаніў так, што гарманіст баяўся за свой барабан, а тыя, што скакалі, спыняліся, каб паглядзець на Бірусовы цуды. Балабешка лётала, нібы цапы ў малатарні, і барабан таксама лётаў і біўся то аб локаць, то аб калена, то аб галаву. Потым Віктар грымнуў барабан вобзямлю і пайшоў гуляць па кругу з балабешкай. Некага выцяў і цяпер не ведае, каго. Лётаў страшэнна, усіх параз ганяў вакол сябе. А галава закружылася, не ўстаяў на нагах і паваліўся. Не памятае, хто падняў яго, хто прывёў дадому.

Прачнуўся позняй раніцаю, Ларысы ўжо не было дома. Ведае яна пра гэта ці не? Мабыць, не ведае. Нахадзілася за дзень, спала ноччу моцна,— стары адчыняў дзверы. А на досвітку яна зноў пабегла на работу.

...Віктар усё жвавей барабаніў пальцамі па стале.

Ларыса вярнулася на змярканні. У хаце нікога не было. Запаліла лямпу, стала ўходжвацца. Не мала клопату

каля дома. Хапалася маладая гаспадыня за некалькі работ адразу, рукі аж млелі часамі, а ў галаве — усё тыя ж неадчэпныя думкі. Крыўдна было за Віктара, што ён не астаўся дома, не пачакаў яе. Не хоча слухаць, што яму гаворыш. А паслухаць было б чаго.

Старая Дзічыха не хацела забіраць назад самагонку. Яна вельмі здзівілася, калі ўбачыла ў сябе ў хаце Ларысу з пляшкаю ў руках.

— Хіба мы горшыя за людзей? — крыўдліва скардзілася яна.— Усім можна, а нам дык і не. Вунь Перагудзіха, слухайце, два разы ўзяла каня за аднаго паўлітра, а нам дык ужо і адзін раз нельга. У бальніцу з'ездзіць. Вунь жа хворы чалавек. Думаеце, хлушу?

— Дык вы бярыце каня, бярыце! — з запалам даводзіла Ларыса. — Але без гарэлкі. Разумееце? Без пляшкі!

— Без пляшкі? — Бабулька так паглядзела на Ларысу, нібы тая хацела пакрыўдзіць яе на ўсё жыццё.— Дык гэта больш ужо нам ніколі і не заікацца пра каня?

«От да чаго давялі людзей спачатку Шандыбовіч, а цяпер і Віця,— думала, завіхаючыся то каля мыцельніка, то каля печы, Ларыса.— Што за чалавек гэты Шандыбовіч? Чаго ён так прывязаўся да Віктара?»

Да болю ў душы было крыўдна, што нельга пагаварыць з мужам. Хацелася б пра ўсё гэта расказаць яму, параіцца. Няўжо з ім нельга параіцца? Гаварылі ж раней, дзяліліся ўсялякімі думкамі. З кім жа тут пагаварыць аб тым, што непакоіць душу? Павел — брат. Ён будзе слухаць і ўсміхацца. Скажа: «Гаварыў я табе, каб не спяшалася выходзіць за яго замуж». Волька? Дык і зразумець нельга гэтую Вольку. То яна гатова ўцякаць з сваёй хаты, то сядзіць спакойна ў бакоўцы і піша над дыктоўку Віці. Хіба да сваіх дзяўчат пайсці? Варка — кемлівая, разумная, але сама, здаецца, пакутуе ад няскладнага кахання. Гэты наш Павел усё нешта вагаецца ды хістаецца: то ён на Вольку глядзіць так, што, здаецца, жыць без яе не можа, то Варцы ласкава ўсміхаецца.

Успаміналіся шчаслівыя вечары, калі Віктар рады быў кожнаму Ларысінаму слову і сам многа расказваў пра вайсковую службу. Калі б можна было так пагаварыць і цяпер, Ларыса папракнула б не толькі яго. Вельмі сурова і ўслых яна папракнула б сама сябе за тое, што, занятыся толькі сваім звяном, яна выпусціла з-пад увагі мно-

гія іншыя справы, мала цікавілася, што робіцца ў брыгадзе наогул.

Але не прыйшоў дадому Віктар, і не было з кім Ларысе пагаварыць. Увесь гэты вечар і аж за поўнач ён прасядзеў у Шандыбовіча за бутэлькай адмысловага першаку. Ахмялеў да таго, што і начаваў там.

* * *

Пакуль Ларыса прыехала з Усесаюзнай выстаўкі, якраз настала пара падымаць з насцілу лён. З дарогі звеннявая трошкі прымарудзіла з хатнімі зборамі і прыйшла на поле на якое паўгадзіны пазней за сваіх дзяўчат. Ларыса здзівілася, што ў звяне была і Волька. Дзяўчына старанна працавала, яе твар і адкрытая шыя былі ўжо крыху ўспацелымі, а ў вачах свяцілася радасць.

— А хто ж цяпер у бакоўцы? — яшчэ не зусім верачы Вольчынаму энтузіязму, спытала звеннявая.

— Бацька там...— апусціўшы вочы, сказала Волька.— Абыдуцца і без мяне.

У абедзенны перапынак Ларыса расказвала дзяўчатам пра выстаўку. Прызналася, што ледзь не замучыла яе нейкая трасучка, калі людзі папрасілі выступіць у калгасным лекторыі. А як сказала першае слова, дык і нічога, усё адышло.

— Пыталіся многія, як вырошчваем лён на нашым Палессі. Расказала. А потым сказала і пра Крушнікоўскую брыгаду. Дзівіліся многія і смяяліся, калі пачулі, што Крушнікоўская брыгада знаходзіцца за паўсотні кіламетраў ад калгаснага цэнтра і што старшыня калгаса бывае ў гэтай брыгадзе, мо, які адзін раз у год. А некаторыя пры гэтых словах вымалі з кішэняў блакноты і нешта запісвалі.

— От добра! — здаволена сказала Волька.

— Што добра? — не зусім зразумела звеннявая.

— Што запісвалі! — удакладніла Волька.— Можа, у газету пададуць!

Увечары, калі ішлі дадому, яна прыадстала ад дзяўчат і падала знак Ларысе. Яны пайшлі ціша[й]. Дзяўчаты ім не перашкаджалі, бо ведалі, што ў Волькі і Ларысы могуць быць свае сакрэты.

— Будзе на Паўла скардзіцца,— хмыкнуўшы, сказала Варка і з цікаўнасцю азірнулася назад.

Аднак Волька і не думала скардзіцца на Паўла, на душы ў яе было зусім іншае гора.

— Я ўцякла з гэтай бакоўкі,— задумена сказала яна.— Калі можна, то вазьмі мяне ў сваё звяно. Больш я так не магу. Павер, Ларыска! Не магу!

— Я табе яшчэ вясной аб гэтым казала. Памятаеш?

— Памятаю, але тады...— Волька зусім прыцішыла голас.— Я думала, што, можа, чаго не разумею, можа, няправільна гляджу на некаторыя з'явы... У роднай сям'і жыву, а не дзе-небудзь. Як і ўсім дзецям, хацелася мне любіць сваіх бацькоў, верыць ім, ганарыцца імі. Падумай, як бы ты асмелілася хаця б сказаць што-небудзь супроць бацькоў, а не тое што зрабіць?

— Мне здаецца...— няўпэўнена пачала Ларыса.— Я думаю, што смеласці ў мяне хапіла б, калі б была для гэтага патрэба.

Яна разгублена глянула на сяброўку і раптам задумалася. Некалькі Вольчыных слоў прайшлі міма слыху: «А што, калі давядзецца супроць мужа выступаць? Гаварыць адкрыта, перад людзьмі. Ці хопіць смеласці, рашучасці, ці вытрымаюць нервы? Гэта не па выстаўцы пра лён свой расказваць».

Ларыса аж спалохалася гэтай думкі, ёй стала сумна і чамусьці адпала жаданне хутчэй прыйсці дадому.

— Колькі разоў я збіралася! — гаварыла тым часам Волька.— Колькі разоў прысягала сабе!.. Кіну ўсё! Кіну не толькі бакоўку, а і самую хату! Каб вочы мае не бачылі і вушы не чулі, што каля мяне робіцца. Пайду раскажу якому-небудзь добраму чалавеку пра ўсё па свеце, або напішу ў райком. І кожны раз што-небудзь стрымлівала мяне. Хапала за руку, за язык. То бацькоў мне шкада было, то самой сябе, то цябе, Ларыска.

— Чаму гэта мяне? Волька!

— Таму, што вельмі хутка і Віктар пачаў наведвацца ў нашу бакоўку. Маўчала, бо ведала, што ты будзеш перажываць, калі я ўмяшаюся, і, можа, нават кепска падумаеш пра мяне. Разам жа некалі гулялі, і — не буду таіцца — Віктар падабаўся тады і мне.

— Я ведаю, што падабаўся,— Ларыса з ціхай шчырасцю глянула на сяброўку.— Але я дрэнна не падумала б пра цябе.

Узышлі на масток. Сухія дошкі непрыкметна скрыпнулі пад нагамі, і ў Ларысы кальнула пад сэрцам. Першы раз яна не спынілася тут, не паглядзела на прыгожую, заўсёды гаманлівую раку.

— Вясною я рада была,— гаварыла далей Волька.— Віктар прыняў брыгаду. Думала я, што будзе і ў нас парадак, як у людзей. Ажно ж, куды там! Новы брыгадзір пайшоў па сцежцы старога, ды яшчэ, бадай, апярэдзіў яго. ў некаторых справах. Ты ўжо ведаеш пра яго танец з балабешкаю? — дзяўчына мімавольна ўсміхнулася.

— Ведаю,— адказала Ларыса.

— Усе гэтыя дні, як ты была на выстаўцы, ён піў без просыпу. Не крыўдуй на мяне за гэтыя словы. Даў падпіску майму бацьку, што выдасць яму палавіну свае прэміі за лён, і піў, дзівачыўся. У нядзелю ўвечары мы гулялі ў клубе. Глядзім, адчыняюцца раптам дзверы і высоўваецца з-за вушака конская галава. Вочы блішчаць, як у д'ябла. Мы папалохаліся, нарабілі крыку. Думалі, што, можа, хто наўмысля які цуд падладзіў. Ажно ж уязджае ў залу Віктар на кані. «Іграй! — крычыць гарманісту.— Іграй, як на маім вяселлі іграў! Калі мой жарабок навучыцца скакаць польку, прэмірую цябе жывым парасём!»

Ледзь выбавілі яго хлопцы адтуль. Лётаў па вуліцы потым аж да таго часу, пакуль Мяфодзій не адабраў жарабка. Бацьку, кажуць, выганяў з дому... Ты пагавары са свёкрам, Ларысачка, мілая! — раптам з роспаччу ўсклікнула Волька і спыніла сяброўку, уткнуўшыся тварам у яе плячо. Рукі яе дрыжалі на Ларысіных грудзях.— Каб ты ведала, як мне цяжка пра гэта гаварыць! Я проста не ведаю, што раблю, мабыць, забываю, што ён твой муж!

— Нічога, Волька, — суцяшала дзяўчыну Ларыса, абнімаючы яе. — Я разумею, што ты не толькі пра яго гаворыш. Табе гэтак жа цяжка, як і мне. Пойдзем паціху!

Яны ішлі некаторы час моўчкі, ішлі абняўшыся. Волька ўсхвалявана камячыла ў адной руцэ ражок свайго мяккага шарфіка, якім злёгку прыкрывала патыліцу, плечы і вастраватыя дзявочыя грудзі. Вечар быў цёплы, хоць восень адчувалася і ў паветры, і ў колеры неба, і ў розных палявых пахах. Яна прыкметна была і на той дарожцы, па якой дзяўчаты ішлі. Час ад часу пад ногі трапляліся то жмачкі саломы, якія засталіся пры сціртаванні ці перавозцы, то каліўі спелага траскучага лубіну, а то і буль-

біна, на якой можна было лёгка пакаўзнуцца. Ларыса раптам наступіла басаножкамі на нешта сухое, жорсткае і аж прысела. Яе клятчастая хустачка спаўзла на шыю. Ларыса падняла некалькі каліўяў насеннай канюшыны і пачала церці ў руках падсохлыя галоўкі. На далоні адчуліся дробненькія жвавенькія зярняткі.

«Золата,— падумала звенявая,— сапраўднае золата, а прападае з-за нашага брыгадзіра». Яна глянула на адзін бок дарогі, на другі. Вялікая плошча насеннай канюшыны толькі пры самай дарозе была месцамі скошана, а так уся стаяла пад сухімі вятрамі, асыпалася.

«Трэба выратаваць гэтае багацце,— пачалі неспакоіць Ларысу думкі.— Сабраць дзяўчат, хто ўмее касіць...» І раптам — боль у сэрцы: «А ці здолею я заўтра гаварыць з дзяўчатамі, ці здолею ўзяцца за касу сама?»

Мільгануў перад вачамі твар Віці. Спачатку мілы, дарагі, светлы, а потым — з патухлым, сярдзітым паглядам, з запаслівымі складачкамі над пераноссем. А свёкар уявіўся худым і зарослым. «Дзе ён начаваў, бедны маўчун? Мабыць, хадзіў цэлымі начамі па загуменнях, каб людзі не бачылі, і думаў пра сваю цяжкую долю...»

Дзяўчаты, што пайшлі ўпярод, ужо, мабыць, даўно разышліся па хатах, а Ларыса з Волькай гатовы б былі хоць звярнуць куды-небудзь, каб толькі не заходзіць у вуліцу. Волька непрыкметна павяла шарфікам па вачах і зноў палажыла сваю руку Ларысе на плечы. Яна была крыху вышэйшая за Ларысу, і ёй было зручна так ісці. Ларыса ж абняла дзяўчыну за гібкую талію, падклаўшы руку пад мяккі шарфік.

— Горш за ўсё, Ларыска,— зноў пачала гаварыць Волька,— што я знайшла ў свайго бацькі цэлую кіпу розных актаў: на сена, на салому, на збожжа, на прапажу парасят на ферме. Усё копіі, вядома. Там і за мінулыя гады і за цяперашні. Баюся, што гэта не сапраўдныя акты. Бацька трымаў копіі пры сабе, мабыць, на ўсякі выпадак, каб ведаць, як апраўдвацца. Калі, не дай божа, і Віця там замешаны?..

Яна сказала так мякка «Віця» таму, што адчула рукой, як нахаладзелі пры гэтых словах Ларысіны плечы, як задрыжалі пальцы яе рукі, калі яна хацела нацягнуць на галаву касынку.

— Божа мой! — глуха, з унутраным надрывам прамовіла Ларыса і прыпынілася.— Чаму ж ты маўчыш!

— Я не маўчу! — з крыўдай і адчаем усклікнула Волька.— Я іх толькі ўчора знайшла. А да гэтага толькі мучылася, пакутавала ад прадчуванняў, ад падазронасці, а цвёрда нічога сказаць не магла. Толькі п'янка была перад вачыма. Разумееш? — Яна падняла рог шарфіка к вуснам і моцна, неяк вельмі ж па-жаночаму, заплакала. Відно было, што сапраўды нагаравалася гэтая дзяўчына, мабыць, цэлымі гадамі жыла без радасці, без весялосці, заўсёды імкнучыся заглушыць унутры пакутлівыя супярэчнасці, барацьбу думак.

— Волька! — Ларыса стала насупраць і са спалохам глядзела дзяўчыне ў твар.— Волька! — паўтарыла яна і ўзяла сяброўку за руку.— Ты ведаеш, аб чым ты гаворыш? Ведаеш?

Незвычайнае мільганне ў Ларысіных вачах насцярожыла Вольку. Слёзы на шчоках у Ларысы былі відны нават і ўпоцемках.

— Ведаю! — рашуча сказала Волька і ўжо на ўсю руку, бо, напэўна, у апошні раз, выцерла шарфам вочы і твар.

— Позна? Так? Позна ўжо, Волька? — усё дапытвалася Ларыса, да болю сціскаючы Вольчыны рукі.

— Мабыць, позна,— няўпэўнена згадзілася Волька.— Толькі не ведаю, як для Віці.

— Эх, чаму ж гэта мы раней не пагаварылі?! — нібы хочучы прапізаць сябе за гэта, крыкнула звенлявая і ў адчаі ўпала на прыдарожны ахапак канюшыны.— Нас трэба спачатку судзіць. Нас! Павыганяць з камсамола! Сядзелі ў бакоўках, хандрылі!... Я за ракой усё лета праседзела! А тут!.. Дзе ж былі нашы вочы? Балела ў мяне сэрца. Не адзін раз балела... Але няхай бы ты мне хоць паўсловам намякнула. Я не думала, што ў такі бок усё хіліцца. Не думала! І ведаеш што! — Ларыса раптам падхапілася і ледзь не тварам у твар стала каля Волькі.— І цяпер не думаю! Не веру! Чуеш? І не гавары мне больш пра гэта. Не гавары. Не веру! Асабліва пра Віктара!

— Я і не гавару пра Віктара, — ціха, не то вінаватым, не то спалоханым голасам сказала Волька.

Але Ларыса была ўжо далёка ад яе і гэтых слоў, бадай-што, не чула.

Ларыса ішла ўперадзе шпаркім крокам, а Волька не ведала, што і рабіць, даганяць яе ці ісці ўжо да вёскі адной. Балюча разанула па сэрцы думка аб тым, што няма

куды ёй сёння зайсці і больш ужо не будзе з кім так шчыра, як сёння, пагаварыць.

Раптам Ларыса павярнулася і гэтак жа шпарка пайшла Вольцы насустрач.

— Ну, вось што! — надзвычай цвёрда і, здавалася, ужо без крыўды прамовіла яна.— Што будзе, тое і будзе, а копіі гэтыя заўтра ж аддасі мне! У нас тут няма камуністаў, дык за ўсё павінны адказваць мы, камсамольская арганізацыя. Разбяромся, праверым!

— А пра што ж, ты лічыш, я думала? — Цяпер ужо ў голасе Волькі гучала крыўда.— Я прыйшла сёння да цябе не толькі таму, што ты мая сяброўка.

...Яны ўвайшлі ў вуліцу і крочылі павольна, нібы на прагулцы. Амаль ва ўсіх хатах ужо гарэлі агні, у дварах было ціха. Людзі прыйшлі з работы, упыніліся, а цяпер сядзяць за сталамі, вячэраюць.

Ларыса параўнялася са сваім дваром. У хаце гарэла лямпа. Спелая гронка рабіны, нібы раскошная кветка ружы, заглядвала ў шыбу вулічнага акна. У жоўтым святле яна здавалася чорнай. Ларыса прыпынілася на момант, з ёй прыпынілася і Волька. Потым Ларыса, нібы пад уплывам нейкай цяжкай сілы, ступіла крок далей. Ступіла і аглядвалася на чорную рабінавую гронку.

Волька таксама мінула свой двор, яна нават і не прыпынілася насупраць хаты.

Хто ведае, да якой пары яны хадзілі ў гэтую ноч па вуліцы?..

* * *

Праз некалькі дзён Варка спыніла Віктара на дарозе ў поле.

— Віця, знаеш што? Сёння ўвечары сход камсамольскі. Прыходзь у клуб.

— Няма мне часу,— скрывіўся брыгадзір. Пацягнуў на лоб выгаралую за лета шапку і таркануў абцасамі жарабка.

— Не, ты пачакай, Віця! — Дзяўчына ўчапілася за надбароднік аброці.— Пачакай, паслухай! Прыязджае з райкома нейкі прадстаўнік.

— З райкома? —Віктар пацягнуў павады.— А чаму ж наш сакратар мне нічога пра гэта не сказала? — а сам падумаў: «Пабегла на канюшню яшчэ прыцемкам, калі ёй было гаварыць».

— Яна мне даручыла сабраць сход,— гулліва, але з сур'ёзнасцю ў тоне, сказала Варка.— Паспрабуй толькі не з'явіся, як у мінулы раз! На вяроўцы прывалаку!

Віктар засмяяўся і, нічога не сказаўшы, паехаў далей. Яму падабалася гэтая свавольная, заўсёды вясёлая і беленькая, як падлетак-казачка, дзяўчына. У горадзе ён бачыў, як многія модніцы рознымі прыпаркамі ды электрычнымі токамі прымушаюць свае валасы віцца, а тут, у Варкі, ад прыроды заўсёды свеціцца бела-залацісты вянчык вакол ілба і ніжэй скроняў. Нават пад дажджом ён не расходзіцца і не змяняе колеру. Амаль з усімі людзьмі Віктар быў сухаваты, быццам бы афіцыйны, нават з моладдзю не надта ўдаваўся ў жарты і не дазваляў якога-небудзь панібрацтва ў адносінах да сябе. Гэтай жа дзяўчыне ён прабачаў усё, нават тое, што яна падчас не слухала яго, як брыгадзіра, падсмейвалася з яго, калі не было блізка Ларысы.

Увечары Віктар прыехаў з поля, аддаў каня Мяфодзію і, не заходзячы дадому, пайшоў у клуб. Там была яшчэ толькі Вара, яна паладжвала вісячую лямпу, якая нешта дрэнна гарэла, страляла іскрамі і дымілася.

— Солі нейкі дурань у газу насыпаў,— сказала яна, убачыўшы брыгадзіра.

— Дык вазьмі ў Шандыбовіча, налі свежай газы,— параіў Віктар.

Ён гаспадарскім крокам прайшоўся па зале, спыніўся каля свежага кукурузнага плаката на сцяне, у вялікім кружку святла на падлозе заўважыў глыбокія ўмяціны і ніякавата адвёў вочы.

— Што, непрыемна глядзець? — насмешліва сказала Вара.— Гэта ж твая работа! Толькі адзін нейкі дурны цар, недзе я чытала, рабіў так, як ты,— заводзіў каня ў палацы.

— Кінь ты! — змрочна, аднак не злосна агрызнуўся Віктар. Паспрабаваў затым уявіць, як гэта ён заязджаў вярхом у клуб? І не здолеў успомніць. Толькі нешта невыразнае, як праз густы туман, мільганула ў памяці.— А якое пытанне сёння? — звярнуўся ён да Вары і сеў на самую нізкую лаўку каля стала.

— Я добра не ведаю,— не збаўляючы сваёй гарэзлівасці, адказала дзяўчына.— Мабыць, пра тваю верхавую польку будуць гаварыць.

Віктара нібы снегам абдало. Ён неяк сціснуўся, пацёр

рукі і, бліснуўшы на Вару нясвежымі вачамі, ціха прамовіў:

— Ты ўжо хоць на сходзе язык свой не распускай. Падпялі шуміху! Падумаеш, выпіў чалавек!

Увайшла Волька з Паўлам. Павел падаў Віктару руку, бо дні два не бачыў яго, а Волька толькі глянула на брыгадзіра з нейкай разгубленасцю і села непадалёку на другую лаўку.

«Усё сваякі,— падумаў Віктар, пaглядаючы на Паўла і Вольку.— Родзічы. Яшчэ Ларыса прыйдзе. Калі і прабяруць тут, дык не вельмі пякуча. У сваёй сям'і ўсё можа быць».

Прыйшлі яшчэ дзве камсамолкі, і ўся арганізацыя была ў зборы. Не хапала толькі самога сакратара. Віктар моўчкі кідаў позірк на дзверы: вось прыйдзе Ларыса, а з ёю — прадстаўнік. Напэўна ж, так яно і ёсць: калі Ларыса затрымалася, значыць,— там у яе людзі. Параяцца, падрыхтуюць павестку і прыйдуць разам.

Аднак Ларыса прыйшла адна. Віктар яшчэ некалькі хвілін пачакаў, а потым сурова, з крыўдай паглядзеў на Варку. Тая страсянула сваімі кудзеркамі і ледзь прыкметна ўсміхнулася.

— Усе нашы? — спытала Ларыса і села таксама каля стала, амаль што насупраць Віктара. Вара адказала ёй, што ўсе, хоць гэта відно было і так. Але Ларыса чамусьці не спяшалася адкрываць сход. Яна нешта запісвала на лістку ў касую лінейку, аб нечым думала. Усе насцярожана маўчалі, бо ведалі, што сход будзе незвычайны, а Віктар усё яшчэ не верыў, што гаворка можа пайсці пра яго, што вось гэтыя людзі, яго падначаленыя ды неправажна сваякі, хутка пачнуць яго прабіраць. Ён утаропіўся ў твар Ларысы, жадаючы па яе вачах зразумець, што тут падрыхтавана. Але Ларыса ў гэты момант не глядзела на яго, і толькі па яе прыморшчаным надброўі, неспакойных вейках і залішне хуткаму, нібы нервоваму руху яе рукі з каранданшом Віктар адчуў, што набліжаецца нешта сур'ёзнае. І раптам ім пачаў авалодваць страх. Намагаючыся пераадолець яго, брыгадзір паспрабаваў успомніць, ці быў ён калі-небудзь раней у такім становішчы? Успылі ў памяці два-тры выпадкі з часоў службы на вайсковым складзе, але яны ўявіліся нязначнымі ў параўнанні з тым, што можа адбыцца сёння. Тады затрывожыла пытанне, што ж тут можна будзе сказаць,

як апраўдвацца, калі раптам пачнуць выкладваць усё начыстату?

І не знаходзілася што сказаць. З горыччу Віктар успомніў, што ніколі раней не думаў аб апраўданнях, бо не лічыў сябе вінаватым. Прызнацца цяпер у памылках, пастукаць сябе ў грудзі? Не, гэта зусім не тое. Перад гэтымі Волькай ды Варкай ён ніколі не стане на калені. А страх і разгубленасць міжвольна апаноўваюць усё больш і больш...

Ларыса ўстала. Лісток у касую лінейку задрыжаў у яе руках. У зале стала так ціха, што яна пачула дыханне Віктара. Вельмі знаёмае, блізкае дыханне. Баязліва глянула на мужа. Іх вочы сустрэліся. Віктар глядзеў на яе мякка, даверліва і з такім спалохам, які выклікаў жаласлівасць. Твар яго быў бледны і бездапаможны. Здавалася, што наўрад ці знойдзецца цяпер такі чалавек, які здолее кінуць у гэты твар папрок. Сашчэпленыя ў пальцах рукі ляжалі на рагу стала. Ларыса падумала, што гэтыя рукі, мабыць, таксама дрыжаць, хоць і сашчэпленыя.

— Сход нашай камсамольскай арганізацыі,— сказала Ларыса натужна-бадзёрым голасам,— лічу адкрытым. На павестцы дня... — Голас яе раптам сцішыўся, затрымцеў, нібы захлынаючыся ў грудной клетцы.— На павестцы дня адно пытанне,— вымавіла яна з вялікім напружаннем волі, аднак ужо ледзь чутна. Ёй стала жудасна. Вось ужо і трэба гаварыць... Ужо? Цяпер?.. Праз якую хвіліну?.. Гаварыць перад усімі, што яе муж — вельмі дрэнны чалавек? Яе Віктар?.. І потым застацца без яго?.. Без такога, якім ён быў яшчэ так нядаўна. Адной, зусім адной!.. Толькі з горам сваім і каханнем. Такім каханнем, якога, можа, яшчэ ніхто на свеце не ведаў. І, мабыць...— У яе пажаўцела ў вачах.— І, мабыць, з сынком ці дачкою... З яго дзіцяткам.

— ...Адно пытанне,— паўтарыла жанчына і, схапіўшыся рукамі за твар, стала зняможана хіліцца над сталом.

Варка хуценька падставіла ёй лаўку.

Віктар працягнуў рукі да жонкі, але ў гэты ж момант падняўся з месца Павел.

— Хоць я цяпер і не ў гэтай арганізацыі,— пачаў ён,— але папрашу слова наконт павесткі дня.

— Гавары, Паўлуша! — скрозь слёзы сказала сястра.

* * *

Даніла позна для свайго распарадку не лажыўся спаць. З вечара тупаў каля хаты, сёе-тое рабіў, а потым запаліўшы лямпу, шукаў сабе якой-небудзь работы і ў хаце, ды мала знаходзіў. Хіба знойдзеш за гэтаю нявесткаю? Ён чуў ад Ларысы, што сёння будзе камсамольскі сход, і па яе выгляду здагадваўся, што будуць гаварыць пра Віктара. Даўно ўжо Даніла не быў ні на якіх сходах, а на гэты, каб пусцілі, то пайшоў бы. І паколькі, значыцца, не пусцілі (Ларыса сказала, што сход закрыты, то, мабыць жа, замкнуць дзверы), Даніла намерыўся дачакацца сваіх і хоць па вачах даведацца, чым там усё скончылася.

Ён сядзеў на лаўку каля печы і крыху падрэмваў, але ж калі вырашыў не глядзець на падушку, то дрымоты часта параціналіся, як павуціна. Для таго каб у тую ж хвіліну, як толькі пастукаюць, выйсці і адчыніць сваім дзверы, стары надта не распранаўся; і на нагах у яго былі валёнкі з бахіламі. З самай вясны Даніла збіраўся перайсці на які-небудзь больш лёгкі абутак, ды так амаль усё лета і пратупаў у бахілах. Лапцей няма з чаго плесці, а ядлоўцавыя вельмі нямоцныя, ды аборы муляюць старэчыя ногі, асабліва, калі намокнуць.

Прымарнеў Даніла за гэтыя часы: шчокі ўпалі, падбародак стапчаў, і з-пад яго выступае тонкі худы кадык. Рэдка цяпер Даніла і галіўся, хоць сват амаль пры кожнай сустрэчы пагадваў яму пра гэта. Маўчаў пры такіх сустрэчах стары. Цяжка яму было прызнацца, што не ўладзілася яго жыццё з сынам. Нікому не сказаў і аб тым, што некалькі начэй пракаратаў у хляве, побач з цялушкаю...

Віктар пастукаў першы. У хаце шпурнуў шапку на ложак, абедзвюма рукамі прыгладзіў валасы, ад чаго яны сталі яшчэ больш ускудлачанымі, і пачаў хадзіць з кута ў кут расхваляваны.

— Можа, вячэраць будзеш? — нясмела спытаў Даніла, стоячы каля прыпечка, і намкнуў адставіць заслонку.

— Адчапіся з вячэраю! — крыкнуў Віктар і стаў яшчэ шпарчэй хадзіць па хаце.

Як толькі ўвайшла Ларыса, ён адразу замахаў рукамі на яе, нібы працягваючы размову на сходзе.

— Ну, чаго, чаго дурніца рыжая лезе ка мне з гэтымі парасятамі? Чаго? Злодзея знайшла? І Павел яшчэ пад-

таквае. Піў я? Няхай піў. Гуляў, буяніў. Няхай сабе! Але не краў! Ніхто гэтага не дакажа. Ясна? Бацька яе ўсё сваё жыццё крадзе, а яна маўчыць!

— Яна не маўчыць,— упэўнена сказала Ларыса, расшпільваючы жакетку.— Больш Шандыбовіч не пажывіцца калгасным дабром! А ты, Віця, незаконна ўзяў парасят з фермы. Я сама праверыла. І мяне ты ашукаў. Я ў цябе некалі пыталася пра гэта. Памятаеш?

— Незако-онна! — крыкліва перагаварыў Віктар. — Што тут незаконнага? Не аформіў, як належана? Дык аформлю! Мне падпішуць! Паўфермы забяру, дык падпішуць!

Ён, відаць, хацеў адгаварыцца за сход, дзе больш глытаў словы, чым гаварыў, і спагнаць усю злосць на сваіх хатніх.

— Не афармляць цяпер трэба,— сурова запярэчыла Ларыса,— а вярнуць ферме парасят і прасіць праўленне, каб не перадавала справу ў суд.

— Дакапаліся! — з агідай і злосцю гаварыў брыгадзір, ходзячы па хаце.— Назбіралі!.. Выключылі з камсамола. Напляваць мне на гэтае ваша выключэнне! Ясна? Мяне ўся вобласць ведае! Не закрэсліць усё райком, дык абком возьмецца за вас! А на крайняе, дык і без камсамола пражыву! Усё роўна перарастак.

— Звязаўся ты з гэтым барадатым д'яблам,— падыходзячы да свайго палка, дзе Ларыса падбівала падушку, сказаў Даніла.— Адсюль усё і пайшло.

— Што? — крыкнуў Віктар так, што аж агонь у лямпе задрыжаў.— Чаго ты яшчэ?! Кладзіся вось і дрыхні, калі табе сцелюць! А то зноў поїдзеш у хлеў к чортавай мацеры!

— Віктар! — Ларыса з адчаем кінулася да яго, узняла далоні, нібы хочучы адгарадзіць ад сына ні ў чым не вінаватага бацьку.— Апамятайся, што ты гаворыш?!

— А чаго ён лезе ў вочы ўсе гэтыя дні, жыць мне не дае? Чаго ён ходзіць па маіх пятах?

— Ён жа твой бацька! — ледзь не задыхаючыся ад абурэння, гаварыла далей Ларыса.— Сэрца ў яго баліць за цябе! Што ты думаеш?

— А ён мне не бацька! Ясна?! — Віктар раптам прыглушыў голас, і твар яго зрабіўся чужым і страшным.— Няма ў мяне бацькі! І не было! І жонкі ў мяне цяпер няма! Так, няма! Адзін буду! Жыў без вас, дык ніхто мне

ямы не капаў.— Ён схапіў з ложка шапку і выйшаў, моцна стукнуўшы дзвярыма хаты і яшчэ мацней дзвярыма сянец.

Нейкі момант Ларыса стаяла, як непрытомная. Збялелыя вусны сутаргава ўздрыгвалі, а вочы былі сухімі, толькі спалох, разгубленасць і бязмежная крыўда адбіваліся ў іх. Потым яна квола, нібы баючыся, што не ўстаіць на нагах, павярнулася і ўбачыла Данілу. Седзячы на палку, стары надзяваў той валёнак з бахілам, які да гэтага пасцеў ужо зняць. Высока падбітая падушка некранутай ляжала на пасцелі.

На вуліцы было цёмна, а на твар і рукі падала густая імгла. Ларыса ведала, памятала, што неўзабаве пасля Віктара пайшоў некуды і Даніла. Пайшоў і нічога не сказаў. Надзеў толькі світку сваю старую ды ўзяў у рукі аўчынную вушанку. Пайшлі абодва. Але Ларыса не магла цяпер думаць аб тым, каб іх шукаць. Ні аб чым яна не магла цяпер думаць. Пайшла па вуліцы толькі з-за таго, каб не стаяць на месцы. Некуды цягнула, у хадзе быццам бы лягчэй было. Добра, што хоць жакетка на плячах. Не памятае Ларыса, калі яе надзела, мабыць, проста па звычцы. А хусткі няма на галаве і не холадна, і імгла не чутна на валасах...

Колькі той крушнікоўскай вуліцы... Па ветры Ларыса адчула, што выйшла ўжо ў канец вёскі. Імгла стала асядаць толькі на адной шчацэ ды на той частцы вуха, якая не прыкрыта завіткамі. Па нейкай міжвольнай прыкмеце ўгадала, што ідзе па той самай дарозе, па якой хадзіла некалі вясной. Не такая позняя тады была пара сутак і не было тады вось гэтай надакучлівай імглы. У той вечар не хацелася ісці далёка, бо самае радаснае і дарагое было тады дома, у Крушніках. А цяпер цяжка будзе вяртацца дадому...

...Уявілася ёй — непадалёку загаманіла рака. Што ж, значыць, скора масток. Тут усе дарогі вядуць на масток.

...Масціны былі мокрымі. Яны не скрыпелі пад нагамі, як у нагодлівы дзень. Можна было прайсці масток і не заўважыць, каб пад ім не гаманіла, не шумела рака. Ларыса працягнула руку. Парэнча была мокрая і слізкая. Правяла рукой па гэтай слізі і спынілася. Хвалі з-пад мастка імчалі хутка, даганяючы адна адну. І вады было

больш, чым з тыдзень таму назад. Мабыць, недзе ў другім месцы былі вялікія дажджы. «Глыбока цяпер тут»,— чамусьці падумала Ларыса. А страшна ёй не стала. Раней яна баялася глядзець у глыбокі калодзеж, не магла без жудасці падумаць аб вірах, аб бурных хвалях.

Слізкая парэнча... Калі на яе легчы грудзьмі, то можна лёгка сплысці ў гэтыя хвалі, яшчэ цёплыя і зусім-зусім не страшныя... Нешта нават вабіла да іх. І цяжка зразумець, што. Магчыма, гэты імклівы, нарывісты шум, магчыма, глыбіня, дзе можна схавацца ад усяго і пра ўсё забыцца...

Ларыса адхіпулася. Што за думкі, адкуль яны? Адразу вярнуўся страх. «Не прызнавацца, не гаварыць пра гэта нікому, нават самой сабе. Забыцца аб гэтай хвіліне на ўсё жыццё! Як не сорамна! Ці гэта яшчэ людзі перажываюць?! Маці мая чацвярых дзяцей пахавала, пры немцах цэлымі месяцамі ў балоце з намі сядзела, а, напэўна, ні разу не думала аб смерці...»

На шыі пачаў адчувацца халадок. Падумалася аб тым, што можна прастудзіцца без хусткі ў такую пагоду. А каму гэта трэба? Віктару? Віктар не пашкадуе, калі не любіць. Калі ж яшчэ любіць, то пашкадуе і вось такую, якая ёсць. Забаліць у яго сэрца ад яе пакут, ад яе цяжкіх і супярэчлівых перажыванняў.

«Няўжо не кахае? Няўжо ўсё гэта было страшэнным ашуканствам? І нават тыя, навек незабыўныя хвіліны, праведзеныя, здаецца, так нядаўна вось на гэтым мастку? Ці такім дробненькім і маленькім было яго пачуццё, што адразу астудзіў сустрэчны вецер? Калі так кахаць, то лепш не радзіцца!»

Саступаючы з мосціка, Ларыса пакаўзнулася і ледзь не ўпала. Дарожка макрэла і рабілася яшчэ больш цёмнай, яе ўжо нельга было адрозніць ад свежай раллі па баках. Густая цемень была і павокал. У вёсцы ўжо даўно не гарэлі агні. Калі хоць трошачкі замарочыцца ў галаве, то можна збіцца з дарогі або трапіць на другую і пайсці не ў той бок. Ларыса закрочыла хутчэй.

...Над хатай Біруковых шумела рабіна, бо вецер пабольшаў і восеньская імгла пачынала пераходзіць у дробны дождж. Па гэтаму шуму Ларыса і пазнала свой двор. Памкнулася зайсці, паглядзець, хто ёсць дома, але на двары была такая цемра і пустата, вокны выглядалі такімі чорнымі і непрыветнымі, што яна пабаялася заходзіць у

хату. Вярнулася і пастукала ў мыцельнікавае акно сваёй матулі.

Матчына сэрца адчула, што ў дачкі вялікая бяда. Яна ўлажыла сваю Ларысу ў цёплую пасцель па палку каля печы (якраз жа на такім палку спаў дома Даніла), і сама цэлую ноч не адыходзіла ад пасцелі.

* * *

Назаўтра Ларыса яшчэ досвіткам пайшла да свайго двара. Пасля начнога шаптання з маткай і шчырай сямейнай гаворкі з бацькам і братам ёй трошкі лягчэй стала на сэрцы.

Вароты ў двор былі зачынены, але не так, як заўсёды. На стаячок не быў ускінуты абруч са скручанай лазы, што рабілася заўсёды; паміж слупком агародчыка і стаяком варот была недазволеная ў гэтым двары шчыліна. Гэта адразу здзівіла Ларысу. Учора, у такім хваляванні і разгубленасці, яна магла не зачыніць як след вароты. Мог, вядома, не прыйсці або не звярнуць на гэта ўвагі Віктар. Але ж свёкар? У старога ніколі, як яна памятае, не было такога выпадку, каб ён не праверыў, як зачынены напач вароты, як замкнуты хлеў.

Увайшла ў двор. Мокрыя дзверы сянец паціху матляліся на завесах. Усю ноч, відаць, так матляліся, ці ёсць хто-небудзь дома?

У хаце нікога не было. Пасцель была не разабрана, а на Данілавым палку, гэтак жа, як і ўчора, ляжала высока надбітая падушка. Ларыса з трывогай выбегла з хаты. Падумала, можа, зноў бацька начуе ў хляве.

Пачуўшы на двары крокі, падала свой голас цялушка. Відаць, не кармілі яе сёння.

На дзвярах хлява вісеў замок. Ларыса не ведала, што рабіць, дзе шукаць Данілу. Да суседзяў ці так да каго ў вёсцы ён не пойдзе, век не хадзіў. Заставалася толькі паглядзець яшчэ ў адрыну, дзе быў Данілӑў «вераўчаны камбайн».

Кінулася Ларыса да варот і ледзь не спалохалася ад нечаканасці: насупраць двара стаяў Мяфодзій і ласкава ківаў ёй галавою. Ён паказаў знакамі, што сам бачыў, як стары Даніла ноччу пайшоў у напрамку вёскі Гдзень.

Ларыса аддала яму ключы ад хлява і хаты, а сама хуценька сабралася і пабегла наўздагон.

Толькі на чацвёрты дзень ёй пашанцавала даведацца, дзе быў Даніла. Шукала яна яго ўсюды, распытвала па вёсках, бліжэйшых да шляхавай дарогі (а прасёлкавымі ўвосень тут не надта пройдзеш — балота ўсюды), не мінала амаль ніводнага сустрэчнага чалавека; дзе пехатою ішла, дзе пад'язджала на машынах. І ўжо ў адчаі хацела вяртацца назад, як у кузаве адной машыны, на якой ехала, пачула незвычайную гаворку.

— А ўчора нашы хлопцы,— сказала адна кабета, дзелячыся сваімі навінамі,— чалавека ў балоце знайшлі. Выйшлі атаву касіць, а ён падаў голас, яшчэ жывы быў.

Ларыса з усёй сілы застукала па кабіне.

Шафёр спыніўся.

— Дзе гэты чалавек, дзе? — затармасіла яна кабету.— Стары ён ужо?

— Ды стары,— сказала кабета.— Выбіўся з сілы, вылазячы з багны, каб яшчэ трохі, то і канцы, не тут кажучы. А ляжыць ён у нашай бальніцы, дык вам не трэба злазіць, бо гэта ў Вялічкавічах. Я сама туды еду.

У сельскім медпункце Даніла ляжаў адзін на ўсю невялічкую палату, больш тут хворых не было. Калі ўрач увяла да яго Ларысу, ён спаў.

— Цэлую ноч стагнаў і кашляў,— прашаптала ўрач.— Вельмі знясіліўся і прастыў, бо, мабыць, доўга сядзеў у балоце. Але небяспечнага, можа, нічога і не будзе,— я зрабіла ўсё, што магла.

Ларыса села на белы зэдлік каля ног бацькі і стала чакаць, пакуль ён прачнецца. А які старэчы сон нават і пры добрым здароўі? Праз якую хвіліну ці дзве Даніла зноў цяжка застагнаў і закашляў. З натугай і пакутай павярнуўся на бок, да Ларысы, і расплюшчыў вочы. Спачатку здзіўленне і спалох мільганулі ў яго вачах, а потым бледныя вусны крануліся ў ласкавую ўсмешку.

Ларыса прытулілася шчакою да яго рукі і заплакала.

— Што ж ты зробіш, дачка? — з уздыхам сказаў Даніла і паклаў другую руку нявесткі на галаву.— Так яно прыйшлося.— Голас яго быў глухі і скрыпучы, у ім не чулася ніякай надзеі на што-небудзь лепшае ў жыцці.

— Чаму вы пайшлі? — спытала Ларыса, узняўшы на бацьку поўныя смутку вочы.

— А што ж мне было рабіць? — часта перадыхваючы, загаварыў стары.— Калі ў мяне няма сына, то і нічога няма. Усё я аддаў для яго. Ты, можа, не ведаеш пра гэта, а

бацькі твае ведаюць. Ён у мяне адзін быў, і маці рана намерла,— царства ёй нябеснае. Усё я перанёс бы, бо і пераносіў не мала. Усё сцярпеў бы, а тое, што ён сказаў...

Стары ўдушліва закашляўся, зморшчыўся ад болю і потым ужо не ўпічыпаў гаворкі, а толькі, часта дыхаючы, варушыў сівымі, апушчанымі ўніз вусамі.

Ларыса нейкі час не турбавала яго. Яна таксама пачала думаць аб тым, што, відаць, ляжала цяпер на бацькавым сэрцы. Сапраўды, як гэта перажыць? Выгадаваў чалавек сына, а цяпер... Уяўляўся позірк Віктара, калі ён выкрыкваў гэтыя словы, якія так цяжка ранілі бацьку. Ніколі не думала Ларыса, што такія мяккія, шэрыя вочы могуць гэтак жорстка і калюча глядзець. Каб сама не чула, каб сама не бачыла, то ніколі б не паверыла. І адкуль ён узяў гэтыя словы? Разам гадаваліся, а Ларыса ні разу не чула пра гэта. Ні ад Віктара, ні ад сваіх бацькоў, ні ад каго-небудзь іншага.

Глыбока, трывожна ўздыхнуўшы, Даніла заплюшчыў вочы, і Ларыса збаялася ў гэтую хвіліну глядзець на яго твар. Ёй здалося, што павекі ў старога задрыжалі, і калі, не дай божа, з-пад іх выплывуць слёзы, то і самой ёй цяжка будзе вытрымаць, каб не расплакацца. А Даніла зноў думаў пра самае цяжкае і непераадольнае, што магло быць у яго жыцці. І каторы ўжо раз ён пра гэта думаў? Калі Віктар, значыцца, не яго сын, то чый жа ён тады? Чый? Няўжо Шандыбовічаў? І Ульяна памерла з-за гэтага, і самому вось жыцця няма. Што ж гэта за доля такая, што за няшчасце?..

— А дзе ў вас баліць? — спытала Ларыса, адчуваючы, што лепш было б перабіць яго надакучлівыя думкі.

— У баку коле,— ціха сказаў Даніла і расплюшчыў вочы,— і ногі вельмі ж ныюць, а так можна было б уставаць. Натрудзіў вельмі ногі. Каб яшчэ ў лапцях быў, а то гэтыя валёнкі... Здавалася, што і сцежка відаць была, думаў,— напрасцяк прайду. А тут — сцямнела, куды ні падамся, еду ўніз, хоць ты хрысціся ды прымай смерць...

— Дык вы б ужо на машыну якую папрасіліся, калі так далёка трэба было.

— А хто ж мяне возьме на машыну? — адказаў Даніла.— Каб ільняшка з сабою была або грошы?.. Ды і дарогі мае не надта машынныя. Я хачу вунь у Забалоцце дабрацца, гэта, мабыць, і не нашага раёна. Туды яшчэ, як для маіх ног, то на добрыя два дні хады. Там у мяне На-

раска, стрыечная сястра, павінна яшчэ быць жывая. Да вайны то пэўна жыла, пераказвалі людзі, а цяпер, можа, і няма яе ўжо, хто ведае.

— Паедзем, тата, дадому,— з просьбай і настойлівым патрабаваннем сказала Ларыса.— Я вас нікуды не пушчу. Дастану машыну і паедзем!

Стары квола, але рашуча пакруціў галавой.

— Не, дачухна,— хрыпла прамовіў ён.— Няма чаго мне ўжо туды ехаць. Хоць і нікада мне цябе, але, мабыць, не прасі. Я дажыву сваё і там, хоць у чужых людзей. Не многа засталося. Скарынкі хлеба і кубка халоднай вады не пашкадуюць, а больш мне нічога і не трэба.

— Я не пакіну вас тут,— з трывогай і з глыбокай шчырасцю загаварыла Ларыса.— Не выйду адсюль адна. А ўстанеце, пойдзеце ў Забалоцце, дык і я пайду з вамі. Мне таксама няма чаго вяртацца дадому адной.

Даніла спыніў на нявестцы свой доўгі, сумотны на гляд, і твар яго падабрэў.

— Што я там буду рабіць адна? — працягвала Ларыса.— У сваю хату, да бацькоў, я не вярнуся. Ужо калі прыйшла да вас, то буду жыць, што б там ні было. Буду вас глядзець, як роднага бацьку.

— Дзякую табе,— сказаў Даніла.— Я ведаю, што ты такая. Глядзела мяне, як дачка, і за гэта дзякую. Але ж я думаю, што Віктар дома будзе. Дзе ж ён дзенецца?

— Віктар можа і не быць дома,— ледзь чутна прамовіла Ларыса, і вочы ў яе напоўніліся яшчэ большай трывогай і смуткам.— Ён вельмі ж ганарысты па натуры і самалюбівы,— дадала яна ўжо больш выразна.— Яму цяжка будзе абдумацца і зразумець, што мы з вамі не хацелі яму бяды.

— Ганары-ысты,— згадзіўся Даніла.— Такі ўжо ганарысты, што аж дурным стаў. Не ведаю, у каго ён і ўдаўся такі. Маці была ціхая, і сябе і людзей паважала. Ну і я, здаецца, таксама...

Тут Даніла зноў змоўк быццам ад таго, што яго пачаў душыць кашаль. На самай жа справе язык у яго не павярнуўся сказаць, што ён увесь час быў лепшым прыкладам для сына. Міжвольна падумалася, што часта было і зусім не так. Занадта ўжо хацелася, каб Віця быў лепшы за ўсіх: лепш еў, лепш апранаўся. Занадта ўжо чулымі былі бацькоўскія вушы і вочы да ўсялякага хлапчуковага жадання.

— Але я ўсё ж такі буду чакаць яго, — сказала нявестка, — доўга буду чакаць. Усё жыццё буду адна, са сваім...

«Горам»,— падумаў Даніла, услухаўшыся ў словы нявесткі. «Вядома ж, з горам, а з чым жа? Гора, мабыць, нікога не мінае».

«Са сваім маленькім»,— падумала нявестка і потым ціхім шэптам, нібы толькі самой сабе, сказала:

— З вашым унучкам, калі ўсё будзе добра...

Даніла залішне жвава для яго здароўя падняў галаву.

— Што ты, дачка?

Ларыса не паўтарыла таго, што сказала, а толькі яшчэ ніжэй апусціла галаву.

— Ага,— прамовіў Даніла і дакрануўся рукою да яе пляча.— Калі так, то я разумею...— Ён на хвіліну задумаўся.— Разумею, дачка... Што ж гэта я раней?.. Га? Вязі мяне дадому, калі так. Застануся жывы, нянькай табе буду, памагу гадаваць унука.

Яны хацелі ехаць у той жа дзень, але ўрач не пусціла іх. Давялося старому паляжаць, а Ларысе падзяжурыць каля яго яшчэ трое сутак. Тады Ларыса выпрасіла ў Вялічкаўскім калгасе машыну, і яны выехалі.

Калі Ларыса са сваім бацькам дапамагалі Біруку злезці з кузава машыны, да іх нечакана падышоў зусім незнаёмы Ларысе чалавек, прывітаўся і моўчкі ўзяў старога пад руку. На вуліцы было ўжо цёмна. Пры святле лямпы ў хаце чалавек сеў каля палка насупраць Данілы і спытаў:

— Што, не пазнаеце мяне?

Даніла ўгледзеўся ў яго твар і няўпэўнена сказаў:

— Быццам бы нехта знаёмы, але не пазнаю, памяць кепская стала, старэчая.

— Мы сустракаліся з вамі зімою, памятаеце? Дровы разам везлі.

— А-а, памятаю, памятаю,— Даніла працягнуў чалавеку абедзве рукі.— Гэта вы з зоны гэтай самай эмтээскай? Дзіва што памятаю. Каб не вы, замяло б мяне тады. Чаму ж не прыязджалі? Абяцалі ж заехаць.

— Ды ўсё неяк часу не было,— трошкі сумеўшыся, адказаў чалавек.— Але цяпер ужо я часта буду тут у вас.

— Гэта наш цяперашні старшыня,— сказаў Ларысін бацька.— Пакуль вас не было, тут і сход у нас прайшоў. Далучыліся мы цяпер да суседняга, Гдзеньскага калгаса,

а там старшынёй — вось яны.— Крыніцкі паказаў вачамі на былога інструктара.

— Чакалі мы вас,— сказаў новы старшыня.— Я ўжо хацеў пасылаць машыну на пошукі. Адпачывайце, папраўляйцеся. А вас папрашу, — ён звярнуўся да Ларысы, — зайсці заўтра ў праўленне. Нам з вамі ёсць аб чым пагаварыць, ды і сакратар нашага камсамольскага камітэта даўно вас чакае.

* * *

Віктар не хадзіў самотна па вуліцы пасля таго, як балюча пакрыўдзіў бацьку і жонку, не шукаў такога прытулку, дзе можна было б спакойна абдумацца, зазірнуць самому сабе ў душу. Не было ў чалавека схільнасці да адзіноцтва нават у такія незвычайныя гадзіны. Шандыбовіч спачатку не хацеў адгукацца на стук,— было ўжо не надта рана, але, пачуўшы голас Віктара, устаў, запаліў лямпу і ўпусціў у хату позняга наведвальніка.

— Нешта вас сёння сон не бярэ,— сярдзіта сказаў Віктару, зачыняючы за ім дзверы. — І маёй да гэтага часу няма, і ты сярод ночы сноўдаешся па дварах.

— А дзе ж Волька? — панура спытаў Віктар.

— А чорт яе ведае! — з прыціскам сказаў Шандыбовіч.— Мабыць, недзе з тваёй балбатухай, а то, можа, нават з тваім, са швагрыкам засталася.

— Сёння ваша балбатала горш за ўсіх,— з папрокам сказаў Віктар.— Не паважала нікога, нават родных бацькоў.

Шандыбовіч насцеражыўся.

— А што гэта ў вас там было, камсамольскі сход?

Віктар кіўнуў галавой.

— І што ж яна там?.. На мяне што-небудзь?

— Усе вашы копіі расклала на стале,— сказаў Віктар і развёў над сталом рукамі, нібы хочучы паказаць, як усё гэта рабілася.

Шандыбовіч спалохана вытарашчыў вочы, заківаў сюды-туды барадой, потым схапіў стаячую лямпу і пабег у сенцы. Там ён доўга недзе пароўся, нешта пераварочваў, а Віктар увесь гэты час сядзеў у цемнаце і слухаў, як ля печы на палку трывожна дыхала гаспадыня. Вярнуўся Шандыбовіч з пабялелым тварам і чырвонымі злоснымі вачамі.

— Гэта ўсё твая! — крыкнуў ён так, што аж гаспадыня надняла галаву.— Не думаў я, што ты такі слабы і нікчэмны блазнюк! Нават жонцы сваёй не стукнуў пры патрэбе кулаком пад бараду, каб прыкусіла язык, а не то што яшчэ каму-небудзь. На мой парог цябе, дурня, не трэба было пускаць!

— А вы сваёй дачцэ стукнулі пад бараду? — ужо таксама пачынаючы злавацца, спытаў Віктар.

— Пры мне гэтага не было, што цяпер пры табе! — закрычаў Шандыбовіч і пачаў трэсці перад сабою кулакамі.— Але я стукну! Так стукну, што аж іскры пасыплюцца. Я выплыву, за мяне не бойся! Мяне голымі рукамі не возьмуць. Калі мяне возьмуць, дык палавіну праўлення за сабою пацягну. А вось цябе, аболтуса, скінуць з брыгадзірства к чортавай мацеры, ды яшчэ і пад суд аддадуць. І жоначка твая камсамольская ні ў чым не дапаможа!

— Я пайду пашукаю Вольку,— прыўзняўшыся, папрасіла гаспадыня.

— Ляжы! — сурова загадаў ёй Шандыбовіч і з яхіднай усмешкай нагнуў галаву да Віктара, які сядзеў ля стала.

— Там у некаторых дакуменціках і твой ганаравейшы подпіс пастаўлены: кароткі, з даўжэзным хвастом.

— Я нічога такога не падпісваў,— абурана сказаў Віктар і ўстаў.

— Падпісваў, хлопча, ды толькі памяць у цябе курыная, вельмі хутка забываешся.

— Не падпісваў я!

— Падпісваў,— з агіднай ліслівасцю працягваў Шандыбовіч.— Пасля чаркі ты нават смертны прыгавор на сваю жонку можаш падпісаць. Вось глядзі! — Ён выняў з кішэні чысты лісток паперы, разгарнуў яго і паднёс да лямпы. Унізе лістка стаяў Віктараў подпіс: літара «Б», падобная на сядзячую мыш, і ад яе доўгі накручасты хвост.

— Ну і сволач жа ты! — нечакана вырвалася ў Віктара.— Не ведаў я!

— Гэта ты сволач-ч! — зашыпеў гаспадар, як змяя, і, выставіўшы ўпярод бараду, наблізіўся да Віктара.— Думаў,— толькі на мне выедзеш?! Вон з мае хаты, байструк, каб мае вочы не бачылі больш такога нягодніка!

На вуліцы, якраз насупраць Віктару, дзьмуў ужо не надта цёплы вецер, густая імгла лезла ў вочы. Ісці не было

куды, хіба толькі ў канюшню, да Мяфодзія, або ў клуб. Рашыў брыгадзір пайсці ў клуб. Сеў на тое месца, дзе сядзеў у часе камсамольскага сходу, апусціў галаву на рукі, пакладзеныя на стол. Шкада было, што не даў Шапрыдыбовічу ў морду,— гэта непакоіла больш за ўсё. Аж рука сашчэпілівалася ў кулак, калі думаў аб тым, як гэтая паганая барада абражала яго. Злосці і крыўды на самога сябе чамусьці не было.

...Прачнуўся Віктар позна, нават пазней свайго звычайнага часу. Адчуў пад спінаю голую лаўку, успомніў пра ўсё ўчарашняе. «Мабыць, некаторыя рады, што са мною так здарылася,— падумаў ён.— Выглядаюць у вокны, шэпчуцца. Вось я зараз ім пакажу!»

Ён прыйшоў на канюшню і загадаў Мяфодзію сядлаць жарабка. Рашыў праехацца па вуліцы, з усёй сваёй выпраўкай і бадзёрасцю, з усмешкай на твары, каб усе ўбачылі, што жыве брыгадзір і ўладу ранейшую мае, нягледзячы ні на што.

Але Мяфодзій выйшаў з канюшні чамусьці без жарабка.

— Што? — узняў брыгадзір на яго вочы.

Мяфодзій развёў рукі і пакруціў галавой. Гэта, як Віктар зразумеў, азначала, што няма ў канюшні жарабка.

Тады Віктар памкнуўся зайсці ў канюшню сам, але Мяфодзій раптам заступіў яму дарогу. Падняў брыгадзір руку, каб адштурхнуць конюха, але той моўчкі, ды залішне выразна ўзяўся за сахор.

Давялося адступіць. Зразумеў Віктар, што стары конюх ужо ведае пра ўсё і не лічыць больш яго брыгадзірам. Значыцца, і ўсе не лічаць.

Страшэнна захацелася выпіць гарэлкі ды закусіць чымнебудзь горкім або кіслым. У Крупніках ужо не зручна было шукаць гэтага, таму Віктар пайшоў да «вышкаўцаў». Піў там сутак трое і начаваў у палатках каля геалагічнай вышкі.

Потым і «вышкаўцы» даведаліся, што ён ужо, па сутнасці, не брыгадзір, перасталі запрашаць на выпіўку. Начальнік геалагічнага атрада прапанаваў Віктару ўзяцца за работу, калі хоча: падносіць прылады і інструменты, капаць пробныя варонкі. Але такая работа, па-першае, ніколі і не снілася Віктару, а, па-другое,— блізка ад дому ён цяпер не прыняў бы хоць і самай ганаровай работы. Узяўшы дома шынель ды яшчэ тыя боты, што некалі па-

дараваў бацьку, ён рушыў у напрамку раённага цэнтра. Ад хады пасвяжэла галава, сталі нават з'яўляцца розныя думкі: спачатку апанавала здзіўленне ад таго, што хату яму адмыкаў Мяфодзій. Дзе ж тады бацька, дзе Ларыса? Дарма не спытаў аб гэтым у Мяфодзія...

Паспрабаваў успомніць, што было з ім па працягу трох мінулых сутак. Мільгалі некаторыя эпізоды, гучалі некаторыя словы, а ўсё мінулае заплывала туманам. Ці гаварыў хто-небудзь у гэтыя дні пра бацьку, пра Ларысу? Хто яго ведае, можа, і гаварыў, але ў памяці нічога не засталося. Зусім нічога.

«Куды ісці? У раён? А там што? Можа, у вобласць падацца адтуль? Можа, у Мінск?.. Каб толькі не бачыць гэтых... Каго? Няўжо бацьку і жонку? Не, гэта не тое. Дарэмна пакрыўдзіў старога. Усё ж такі ён бацька мне. Родны бацька. І гэтак любіў ён і песціў мяне... Усё барада рыжая вінавата. Прайдзісвет! Нездарма людзі кажуць, што паклёпы на суседзяў пісаў. Колькі ён нагаварыў мне агіднага пра людзей, колькі разоў падпускаў непрыстойныя жартачкі пра бацьку?»

Агідным уяўляўся цяпер Шандыбовіч, незразумелымі і няшчаснымі бацька з Ларысай, скрабло і шчымела на душы ў самога. Сваё становішча аж цяжка было ўявіць. Спытаў бы хто, куды вядзе дарога, і не здолеў бы адказаць. Можа, у райком, можа, у абком, а можа, проста ў праўленне свайго калгаса. І гонар, і сорам, і яшчэ многа ўсялякіх адчуванняў, якім у гэты момант нават нельга было знайсці вызначэння, выганялі яго з свае хаты, з свае вёскі.

«А калі давядзецца ў горадзе цягаць мяшкі з мукой, грузіць вугаль?»

Халадком пацягнула па целу, а ў памяці прамільгнулі асядланы жарабок перад акном Шандыбовіча і конюх Мяфодзій з павадамі ў руках...

* * *

У наступным годзе вясна была не такой ласкавай, як у папярэднім, але Ларысін лён рос вельмі прыгожа. Цвіў ён потым таксама не горш, як у мінулым годзе, а сінеблакітнае мора выглядала яшчэ больш шырокім і неабсяжным.

На льняным палетку ў Ларысы вельмі хутка праходзілі

летнія дні. Здавалася, толькі-толькі ўзыходзіла сонца, іскрылася даўжэзнымі праменнямі ў расе, а вось глядзі — і ўжо абедзенны перапынак, пара бегчы дадому, карміць маленькага Даньку. Здавалася, яшчэ толькі гадзіну таму назад сонца стаяла ледзь не над самай галавой, дзяўчаты са звяна старанна закрываліся касынкамі, а вось, глядзі,— ужо і захад блізка, чарада авец падаецца бліжэй да вёскі. Лёгка дыхалася на палетках, нават і ўздыханні, калі яны здараліся, праходзілі без асаблівага болю ў душы.

А дома з дзіцем заставаўся Даніла. Унук мала калі і плакаў на руках у дзеда, цягнуў пакрысе соску, калі не спаў, а то вучыўся смяяцца і вылузваць з пялёнак ногі. Маці яны абодва сустракалі з нястрымнай радасцю.

...Сядзеў аднаго разу Даніла на сваім палку, трымаў на руках малога і думаў: «Даў бы бог яшчэ хаця б дзесятак год пражыць, падгадаваць вось гэтага чалавека».

Гадаваў бы ён свайго ўнука зусім не так, як некалі гадаваў сына. І сам цяпер жыў бы не так.

Нечакана вельмі паціху адчыніліся дзверы ў хату. Даніла павярнуў галаву. Ля парога стаяў Віктар у стаптаных кірзавых ботах, з размахрачаным унізе шынялём на руцэ.

— Дзень добры,— глуха сказаў ён і не крануўся з месца.

Даніла без радасці і, здавалася, без здзіўлення кіўнуў галавой, адвярнуўся, а потым нізка нахіліўся над унукам.

— Дзе Ларыса? — спытаў Віктар.

Стары не сказаў ні слова, толькі ўнук чамусьці жвава заварушыў пульхнымі ручкамі і засмяяўся. Ён, мабыць, падумаў, што прыйшла з работы мама.

1957 г.

# ТУТ Я ЖЫВУ...

## ТРОШКІ З ДАЎНЯГА

Хлопчыку — каля васьмі год, а дзяўчынцы яшчэ няма і шасці. У мінулую восень, калі ўсё іх крыху старэйшае таварыства ўпершыню надалося ў школу, гэтыя дзеці таксама не хацелі адставаць. З заіздрасцю паглядаючы на чужыя ранцы, яны дайшлі да самай Чырвонамакаўскай школы. Хацелася ім хоць трохі пасядзець там у класе, паглядзець на вялікую чорную дошку, на настаўніцу. Але Росцік Шыпулька, не ў меру худзенькі і вельмі ўжо жвавенькі першакласнік, падказаў тэхнічцы, што гэтыя малыя яшчэ не вучні, і тая не пусціла дзяцей у клас. Вяртаючыся дадому, дзяўчынка ледзь не плакала ад крыўды, а хлопчык усю дарогу маўчаў, толькі перад самымі Дабрасельцамі з папрокам сказаў сястры:

— А чаго ты ўчора слязу пусціла, калі Росцік адабраў у цябе спелую ігрушу, ды яшчэ хацела маме на яго наскардзіцца?

Цяпер гэтыя дзеткі па некалькі разоў на дзень ходзяць да Чырвонамакаўскай школы, але пра вучобу ўжо і не думаюць, бо цяпер — вайна. Неўзабаве перад тым днём, калі ўсе гады пачыналася вучоба, нахлынулі ў Чырвоныя Макі акупанты і занялі школу пад нейкі свой штаб. У іншых вёсках яны ўжо з самага лета, а тут не было. У Дабрасельцах і цяпер няма, толькі клышаногі Пятрэся (так звалі тут аднаго недарэку — Петруся) сяды-тады праходжваецца са стрэльбаю па вуліцы. Каля школы ж заўсёды стаіць ці патупвае ад холаду вартавы з аўтаматам. Ён не падпускае да школы нават малых. Хоць не падпускае, а хлопчык з дзяўчынкаю ходзяць. Спыняюцца каля паркана і пачынаюць угледацца ў шырокае акно, закратаванае цяпер калючым дротам. Там, за гэтым акном,— іх мама.

Аднаго разу дзецям неяк удалося ўпрасіць вартавога, каб ён дазволіў падысці да акна. Не страшны быў гэты вартавы, хоць і з вялікімі рыжымі вусамі. Спачатку ён грозна натапырваў вусы, памахваў руляю аўтамата. А потым памякчэў. Стаўшы на прызбу, дзеці ўбачылі сваю матулю. Яна сядзела на падлозе, падкурчыўшы ногі і апусціўшы галаву. Хлопчык прасадзіў руку між дротам і шкрабануў па шыбе. Маці здрыганулася, глянула на акно. Пазнаўшы дзяцей, неяк сутаргава замітусілася на месцы, стала намагацца ўстаць, ды не магла. Заківала малым галавой, заварушыла плячамі, відаць, хочучы наказаць нешта рукой, ды рукі былі звязаны. Жанчына паднаўзла да сцяны і, сабраўшы апошнія сілы, устала. Твар яе апынуўся зусім блізка ад дзяцей. Яна старалася ўсміхнуцца сваім дзеткам, падбадзёрыць іх вачамі і знакамі галавы, а слёзы залівалі пахуднелы, з чорнымі паддзёкамі ля вачэй, твар. Дзяўчынка пачала моцна плакаць, і вартавы ссадзіў яе з прызбы. Пацягнуў ён за світку і хлопчыка, але той доўга не паддаваўся. Ухапіўшыся за калючы дрот, ён нібы прырос да акна. Не адчуваў болю ў далонях, не чуў пагроз вартавога...

Ідучы дадому, дзяўчынка яшчэ доўга плакала, а хлопчык пагядаў на свае акрываўленыя далоні і маўчаў. Панура ступаючы па свежым, яшчэ не рыпучым снезе, ён думаў, за што гэта фашысты арыштавалі маму. Наколькі яму было вядома, дык матуля нікуды далёка не хадзіла, ні з кім з чужых людзей не зналася. Яна толькі сяды-тады насіла ў млын торбу жыта, таго, што ў мінулым годзе атрымалі на працадні. Млын, праўда, стаяў далекавата, каля самага лесу, але ж не толькі яна адна хадзіла ў млын.

Хлопчыку думалася, што немцы павінны выпусціць маму. Уяўлялася нават, што гэта адбудзецца якраз тады, калі ён з сястрой будзе стаяць каля школы. Адчыніць вартавы школьныя дзверы, і адтуль выйдзе матуля з развязанымі рукамі, нават з торбаю жыта за плячыма, якую яна, мабыць, не данесла да млына. Каб ёй не цяжка было ісці, хлопчык забярэ ў яе гэтую торбу і панясе сам. Няхай хоць цэлы пуд яна заважыць. Зойдуць яны спачатку ў млын, аддадуць змалоць гэтае жыта, бо трэба пячы хлеб, а тады пойдуць дадому. Маці больш не будзе насіць жыта ў млын і муку з млына, а ўсё гэта будзе рабіць ён сам — аж да таго часу, пакуль скончыцца вайна і не прыйдзе з фронту бацька.

З такімі спадзяваннямі і ходзяць малыя да Чырвонамакаўскай школы, стаяць ля паркана, пакуль ногі не пачынаюць дубянець. Усё ім здаецца, што вось-вось надыдзе да акна мама, нешта скажа, усміхнецца або хоць кіўне галавою.

Іншы раз даносіўся сюды адчайны матчын голас. Дзеці кідаліся на пералазнік, каб быць бліжэй да акна, але вартавы махаў на іх чорнаю руляю. Цяжка было зразумець, што гэта быў за голас: ці плакала маці ў горы і роспачы, ці стагнала ад катаванняў, ці, можа, клікала да сябе іх, сваіх дзетак?..

Прайшло многа зімовых дзён. Вось ужо каля тыдня дзеці не чуюць матчынага голасу. Ледзь не кожны дзень з самай шчырай ласкавасцю просяць яны вартавога, каб пусціў паглядзець у акно, але той усё махае руляю. Сталі тады малыя дзяжурыць ля школы ледзь не па цэламу дню. Хацелася ім дачакацца, калі выйдзе на варту той вусаты, што аднаго разу пусціў іх да акна. Дачакаліся, вусаты выйшаў, хоць не на варту, а так некуды, бо ў руках у яго быў пакет. Дзеці да яго: скажыце, дзе наша мама?

Былы вартавы пазнаў малых і зразумеў іх пытанне. Адвёўшы дзяцей ад школы, ён дзе словамі, а дзе знакамі растлумачыў, што ўжо некалькі дзён таму назад іхнюю маму пасадзілі ў вялізную машыну і павезлі.

— Куды яе павезлі? — пытаўся хлопчык.— У які бок?

Вартавы махнуў рукою, а што ён гэтым хацеў сказаць, нельга было зразумець.

Чакалі дзеці сваю матулю доўга. Чакалі і суседзі, якія дапамагалі малым сяк-так пракарміцца. Хлопчык яшчэ многа разоў хадзіў у Чырвоныя Макі, стараўся распытаць, што-небудзь выведаць. Нічога так і не дазнаўся. Пажыўшы яшчэ нейкі час дома, ён падаўся ў бліжэйшыя вёскі шукаць сваіх родзічаў, а дзяўчынку забрала да сябе дваюрадная цётка, што жыла на Палессі.

## ЯКАЎ МОЙ, ЯКАЎ!..

Пра ўсё гэта я даведаўся толькі пасля вайны, калі вярнуўся з арміі. Стала мне вядома і тое, пра што не ведалі тады ні хлопчык, ні дзяўчынка. Цяпер, праўда, усе мае аднавяскоўцы пра гэта ведалі, ды і не толькі аднавяскоўцы. Вельмі многім было вядома, што маці гэтых дзяцей

была падпольшчыца, у торбе з жытам яна разносіла лістоўкі і загінула ў фашысцкіх засценках смерцю гераіні.

Бацька малых таксама не вярнуўся з фронту, і нікога з гэтай вельмі блізкай мне сям'і ў вёсцы не было. Хацелася даведацца пра дзяцей. Пытаўся я ў сваіх хатніх, у суседзяў — ніхто пэўна не мог сказаць, як і дзе цяпер жывуць малыя Семігоны (такое было іх прозвішча). Гаварылі, што дзяўчынка так і асталася на Палессі, што яна цяпер вучыцца ў школе, а пра хлопчыка нічога не гаварылі, нават не ведаў ніхто, жывы ён ці не.

Нямала людзей з маёй вёскі не вярнулася з вайны, нямала дзяцей і дарослых загінула ў часы пякельнага рэжыму фашысцкай акупацыі. Сама вёска цяпер толькі што звалася вёскай: сям-там тырчалі абгарэлыя калодзежныя жураўлі, у некаторых дварах (цяпер іх толькі ўмоўна можна было назваць дварамі) стаялі голыя печы з высокімі комінамі. Амаль усе печы былі ўжо старанна выбеленыя — у нас такі звычай, што гаспадыня не падыдзе да непабеленай печы.

Вельмі многіх не было цяпер з маіх блізкіх і знаёмых. Аднак лёс Семігонаў чамусьці асабліва хваляваў і непакоіў мяне. Пра дзяўчынку хоць трошкі было вядома, а наконт хлопчыка ўзнікалі розныя думкі і вельмі няпэўныя, падчас змрочныя меркаванні. Можа, пайшоў ён у свет, ды так і не знайшоў сваіх родзічаў, не напаткаў харошага чалавека, які б мог даць яму прытулак? Можа, вельмі доўгая і цяжкая дарога выпала малому і ён загінуў у гэтай дарозе ад голаду і холаду?

Аднаго разу падышоў я да таго месца, дзе некалі быў Семігонаў сядас. Хата калісьці стаяла ў канцы вёскі і трохі на водшыбе. Вокны яе, прыгожа абшаляваныя і пацягнутыя бялілам, весела ўсміхаліся кожнаму, хто ехаў па дарозе з раённага цэнтра або ішоў з прырэчнага лесу. Глядзеў я на хацішча, на рэшткі саду, на халоднае, прыхаванае маладой пораслю вуголле, і ўсе жудасці вайны ўяўляліся мне больш востра, чым на фронце. Вось недалёка ад хацішча тырчыць абвуглены камель старой грушыфунтоўкі з тоўстай адвеснай галінай.

Некалі гэтая фунтоўка раскошна і маляўніча развівалася над хатай, яе лісце было да таго густое, што пры невялікім дожджыку ўвесь ценявы бок страхі аставаўся сухі. Распускалася фунтоўка вясною — дык і хата набывала радасны вясенні выгляд; адцвітала — дык хата пакрыва-

лася белай квецепню, нібы першым сняжком. А калі высявалі грушы, дык хто б ні ехаў, хто б ні ішоў паўз хату, абавязкова прыпыняўся, здзіўлена круціў галавой.

Улетку, як мне расказвалі, малы Яшка (цяпер я ўспомніў і імя хлопчыка) спаў з бацькам на вышках. Ноччу спелая грушка, сапраўды з фунт вагою, падала на гонту, і хлопчык прачынаўся, спалохана туліўся да бацькі.

— Не бойся,— шаптаў яму бацька,— гэта фунтоўка. Спі, мой сынок, спі.

А раніцай малы не крыўдаваў на падалкі за тое, што яны яго ноччу пужалі. Ён заўзята бегаў па расе і каторую з іх не заўважаў, то намацваў босымі нагамі. Адвесная раліна таксама мела некалі сваю прыгажосць і найлепшую зручнасць. Сваім ласкавым голлем яна нахілялася ледзь не да самай травы і нібы падавала малым спелыя фунтоўкі. На ёй жа была прыладжана гушкалка. Лётаў, бывала, Яшка на гэтай гушкалцы, галінкі калыхаліся, і найбольш жоўтыя грушы падалі ад лёгкага калыхання...

Той раз мне не давялося доўга набыць у сваёй вёсцы, а прыехаў я зноў сюды ўжо больш як праз дзесяць год. Стаяла позняя восень. Выйшаў раннем за ваколіцу, і пацягнула мяне ў недалёкі лясок, пад раку, у тыя мясціны, дзе некалі праходзіла маё пастушынае маленства. Ведаў, што наўрад ці асталося навекі памятнае ў тым выглядзе, у якім яно было раней. Аднак вельмі хацелася пайсці туды, агледзець усё і пастарацца знайсці хоць адзін штрышок з таго, што заўсёды хвалюе душу пры ўспамінах, што часта бачыш у неспакойных снах. Лёгкі, відаць, першы ў гэтых месцах, марозік трошкі падбяліў платы на агародах, надаў пругкасць траве на ўзмежках і на выгане. Наступаючы на такую траву, адчуваеш, як яна, нібы жывая, паскрыгвае пад нагамі, сціскаецца, а потым устае. І ступаеш тады ціха, асцярожна. Калі трапляецца маленькая, нават непрыкметная ў траве лужынка, яна хрусне над абуткам, нібы тонкае шкло. І здрыганешся ад гэтага.

Помнілася мне з малых год, што недзе ў гэтым баку павінен быць вялікаваты і глыбокі лужок, нібы азярцо. Ён ніколі не высыхаў, ніколі не зацягваўся ржой і тванню. Мы вадзілі сюды пасвіць коней. Калі ўзышло сонца, перада мною бліснуў нейкі лужок, але я не мог зразумець,

той гэта ці не той. Вельмі ж хутка я дайшоў да яго, а некалі мы ехалі сюды вярхамі на конях і хоць не паспявалі добра намуляцца, усё ж гопкаліся нямала. Відаць, дарога тады ішла кругам. Вада ў лужку прыстыла так ціха і пакорліва, што, здавалася,— заснула. Усё на плёсе было нерухомае: кволы кусток пашкадаванага вясковымі хлапчукамі аеру, ражэнчык, што не паспеў даплысці да берага, нават самае тонкае каліва асакі, нахіленае над вадой. Вербалозніку раней тут было многа, а цяпер толькі адзін нізкі куст, пацягнуты тонкім нетрывалым інеем, быў відзён на супрацьлеглым беразе. Углядаючыся ў далёкі шызы куст, я адчуў, што гэта ўсё ж той самы лужок, толькі змяніўся ён за гэтыя гады, як і ўсё навакол.

Непадалёку ад лужка пасвілася вялікая чарада авечак, а пры самай дарозе сядзела смуглявая дзяўчына. Яна сядзела на ўзмежку і нешта вышывала. Рукі чырвоныя, ледзь не да локцяў аголеныя.

— Вам не холадна? — спытаў я, падышоўшы.

— Не,— адказала дзяўчына і на момант узняла на мяне ўважлівыя цёмна-карыя вочы.

— І рукі не мерзнуць?

— А чаго ім? Пры рабоце не мерзнуць.

Мне няёмка было адрываць дзяўчыну ад работы, таму я намерыўся ісці далей, аднак яна сама раптам паклала на калені сваю вышыўку і, усміхаючыся, нібы знаёмаму, спытала:

— Вы, мабыць, у горад хочаце праісці?

— Не,— стараючыся асабліва не здзіўляцца пытанню, адказаў я.— Хачу вось у лясок, да ракі. А што за горад вы маеце на ўвазе?

— Ды вунь,— дзяўчына паказала рукою ў той бок, дзе хадзілі яе авечкі,— там будуюць у нас. Выйдзеце на гару, дык убачыце.

Спыніўшыся на гары, якую тут спрадвеку завуць Вялікай, а цяпер яна здалася мне зусім малой, я агледзеў пакрытае лёгкім туманчыкам наваколле. Убачыў сваю вёску ўжо не такой, якою пакінуў яе дзесяць год таму назад. Не нагадвала яна і тую, што помнілася з маленства. Мне здалося, што і стаіць яна не на сваім месцы. Збольшага ўбачыў тое, што дзяўчына назвала горадам: высокі частакол абноскі, насыпы над катлаванамі, вялізныя клеткі цэглы, белай і жоўтай, слупы з манцёрамі наверсе, самазвалы, бульдозеры, аўталаўку на горцы... Я чуў раней, што ў гэ-

тых месцах павінны будаваць вялікі хімічны камбінат і горад, аднак што работы ўжо ідуць, не ведаў. Скасаваўся адразу мой намер пайсці да ракі — я павярнуў на будаўніцтва і прабыў там ледзь не да паўдня.

Калі вяртаўся назад, ужо ні авечак, ні маладой пастушкі не было на ранейшым месцы. Палянка ля лужка нібы асела пасля таго, як з яе апаў іней, а сам плёс пачаў ледзь прыкметна варушыцца, утвараючы нешта падобнае на лёгкія хвалі. На Вялікай гары стаяў самазвал, і маладыя дзяўчаты рыдлёўкамі насыпалі на яго чысты жоўты пясок.

«Усё тут неўзабаве пераменіцца»,— падумалася мне. Уяўляліся тыя планы вялікага будаўніцтва, пра якія толькі што расказвалі мне інжынеры. Цяпер дзяўчаты бяруць з гары пясок для фундаментаў тых дамоў, у якіх яны будуць жыць, а потым з нетраў зямлі яны дастануць такое багацце, што заквітнеюць не толькі пяскі гэтых месц, а і многіх іншых. Здавалася, не так даўно я стаяў каля Семігонавага сэдаса і глядзеў на халоднае вуголле, на той абгарэлы сук, дзе некалі вісела Яшава гушкалка. А цяпер на гэтым месцы проста на вачах узнімаецца з зямлі фундамент вялікага шматпавярховага дома.

Эх, Яша, Якаў мой, Якаў! Дзе ты цяпер, як жывеш, што робіш?..

Дарожка цераз палянку ішла пакуль што малаезджаная, але і па ёй было ўжо слізкавата. На вялікай жа дарозе, якая вяла на будаўніцтва, машыны гулі натужна, нават з нейкай жалобай. Шкада было матораў гэтых машын, шкада было шафёраў, рукі якіх дранцвелі ад напружання. Чым бліжэй падыходзіў я да дарогі, тым больш надрыўным здаваўся мне гул машыны.

Яшчэ зводдаль можна было заўважыць, што адзін грузавік ляжыць наўзбоч у адхоне. Каля яго снуецца і часта нахіляецца над маторам нейкі чалавек у чорнай курткі і, як здалося мне, залішне цыбаты. Убачыўшы, што я бяру напрамак да машыны, ён яшчэ стараннеі замітусіўся, а потым уголас пачаў лаяць шафёра:

— Хіба гэта вадзіцель! Партач, а не вадзіцель! На вадавознай клячы яму ездзіць, а не на машыне! Мала таго, што тэхніку паламаў, матэрыял пакрышыў, дык яшчэ і кінуў усё тут: няхай бярэ хто што хоча, няхай расцягвае!

У адхоне сапраўды ляжала нейкая частка таго шыферу, што быў у кузаве; можна было меркаваць, што некаторыя лісты і патрэскаліся. Што ж да самой машыны, то

ўсякаму было відно, што яна цэлая, бо спусцілася ў адхон, мабыць, павольна.

— А дзе ж ён, вадзіцель? — з трывогай спытаў я.— Можа, з ім што здарылася?

— Што б ні здарылася,— упэўнена адказаў чалавек,— ён не меў права пакідаць машыну з каштоўным грузам. За гэта судзяць. От мне трэба ісці ў трэст,— дадаў ён, паказаўшы рукой на вёску,— а тут стой, пільнуй. Гэта ж добра, што ішоў якраз, убачыў.

— Дык вы ідзіце,— прапанаваў я чалавеку,— а я пабуду каля машыны, папільную.

— А вы адкуль, з Саўнаргаса?

— Не бойцеся,— запэўніў я,— усё тут будзе добра. Я не адыду ад машыны да таго часу, пакуль не з'явіцца шафёр або хто-небудзь іншы.

— Хутка прышлю людзей,— сказаў цыбаты і шырокімі крокамі накіраваўся ў вёску. Ён ні разу не азірнуўся на месца аварыі, але мне здавалася, што я ўвесь час бачыў яго твар, белы, даўгаваты і да таго маладжавы, што з першага пагляду не зразумееш, за каго прымаць такога чалавека — за дзецюка ці за дарослага.

Першы грузавік адразу спыніўся, калі я паказаў шафёру на машыну, што ляжала ў адхоне, а астатнім і нялёмка было не спыніцца, і не вельмі лёгка абмінуць. Праз некаторы час цэлая калона сабралася каля месца аварыі. Гуртам мы паставілі грузавік на калёсы, выцягнулі яго буксірам; тады я, падзякаваўшы хлопцам за дапамогу, стаў пакрысе падносіць бліжэй да машыны раскіданы ў адхоне шыфер.

Работа мая падыходзіла ўжо к канцу, калі да машыны падбег хлопец у сіняй спяцоўцы і вайсковым бушлаце нараспашку. Шапка на ім была яшчэ летняя і таксама вайсковая, хоць па ёй ужо нельга было вызначыць былога роду войск. Хлопец паказаўся мне вельмі прыгожым, нават падумалася, што кожнаму ён можа кінуцца ў вочы. Нягледзячы на вялікую зморанасць — а гэта заўважалася ў паходцы, у апушчаных руках з кволымі пальцамі, на потным ілбе з чорным валікам бліскучых валасоў пад казырком,— яго адкрытыя, здавалася для ўсіх на свеце, вочы глядзелі весела і даверліва, вусны раз-пораз збіваліся на добрую ўсмешку, паказваючы роўныя прыгожыя зубы. Убачыўшы мяне з лістом шыферу ў руках, ён быццам бы і не здзівіўся, і не намерваўся распытваць пра што-не-

будзь. Падышоўшы зусім блізка, павітаўся і працягнуў да мяне рукі, каб узяць мой ліст. Я панёс сваё бярэмца да машыны, тады ён нагрузіўся шыферам асобна. Потым хлопец складваў у кузаве лісты ў штабялькі, а я падаваў. Інстынкт падказваў мне, што юнак збольшага ведае мяне, а сам я ніяк не мог успомніць, бачыў я недзе яго, ці гэта толькі здаецца, што ў ім ёсць нешта знаёмае. Часта бывае так, што зусім незнаёмы чалавек нагадвае некага блізкага.

— Што ж вы так пакінулі на дарозе машыну? — без папроку спытаў я.— Тут быў нейкі малады чалавек, крычаў, абураўся.

— Ногі, як хадулі? — весела перапытаў хлопец.

Я прамаўчаў.

— Гэта Росцік Шыпулька,— упэўнена сказаў хлопец.— Нічога, ён пакрычыць, пакрычыць ды супакоіцца.

— Шыпулька?..

Пры сустрэчы з ім мне нават і ў галаву не прыйшло, што гэта мой аднавясковец, хоць Росцю я трохі ведаў у часы яго маленства. У яго ніводнай рыскі не асталося з дзіцячых год.

— Са мной вялікае няшчасце здарылася,— спакойна пачаў гаварыць шафёр, складваючы шыферныя лісты.— Добра, што ўсё так абышлося. Еду, трымаю скорасць, бо тут сесці можна, калі не ўзяць разгону, бачу — гусі пераходзяць дарогу. Я разлічыў, што яны павінны праклыпаць, пакуль я даеду, але адно гадавалае гусяня, мабыць з перабітымі нагамі, перавальваецца з боку на бок і якраз меціць пад колы. Я ўсю ўвагу на яго, а ў гэты момант, як з-пад зямлі,— хлопчык з дубчыкам у руках. Адкуль ён вынырнуў, зусім не помню, не іначай у адхоне сядзеў. Я тармазнуў, але машына ўжо выскачыла з твані і са слізкага ўзгорачку пасунулася ўперад. Сам ужо не ведаю, як рулянуў у адхон. Заплюшчыў вочы, учапіўся з усёй сілы за руль. Павяло мяне некуды, потым штурхком быццам апусціла ў вельмі глыбокую яму. Нешта затрашчала, загрохала, і адразу ўсё сціхла. Расплюшчыў вочы, патрос галавою — чую боль каля вуха, але нічога — хлопчык у мяне на памяці. Неяк у першы момант і не зразумеў, што ляжу, а не сяджу. Бяруся за бліжэйшую ад сябе ручку дзверцаў, спрабую адкрыць. Куды там — мокрую траву бачу над шклом. Падаюся да верхніх дзверцаў, сяк-так вылажу. Хлопчык ляжыць тут жа, ля адхону, рукі і світачка

ў гразі. Побач — шапка і лазовы дубчык. Я ўпаў перад малым, прытуліўся вухам да грудзей. Чую — дыша, толькі вельмі часта, нерарывіста, нібы плач яго давіць недзе там, унутры. Падняў на рукі, адзеў яму шапачку і пабег, не чакаючы нікога. Бег аж да Чырвоных Макаў, да медпункта, наўпрост цераз палеткі, цераз агароды. У дарозе хлопчык задыхаў мацней, а потым пачаў плакаць. «Дзе табе баліць, братка? — спытаў я,— што баліць?» — «Нага,— кажа.— Куды вы мяне несяце?» — «Да доктара, сынок, от ужо хутка дабяжым».— «А што ён будзе рабіць са мною, той доктар? Уколы даваць?» — «Не, не будзе,— суцяшаю малога.— Ён так паглядзіць, што там у цябе на ножцы, ды калі трэба, то нераўняжка. Чаго ж ты лез пад машыну, хіба не ведаеш, што нельга выбягаць на дарогу, калі машына ідзе?» — «Я хацеў нашу гуску адагнаць».

Бягу так і радуюся, што хлопчык пры памяці, і сэрца шчыміць ад думкі, што, магчыма, ён скалечаны, што, можа, не ўдасца нічым памагчы яму. На шчасце, урач быў на месцы.

Мы раздзелі малога, урач агледзеў яго, аслухаў. Ножка была цэлая, толькі, відаць, трохі зачапіла яе колам, калі машына сунулася ў адхон. На галёнцы быў сіняк. Калі я расказаў усё, урач выказаў меркаванне, што хлопчык вельмі спужаўся, апынуўшыся ля буфера, магчыма, што яго трохі і задзела буферам. Паслізнуўшыся, упаў і ад спалоху страціў прытомнасць.

Я зноў узяў малога на рукі, і мне раптам уявілася, што ўжо ніколі не пакіну яго і нікому не аддам.

«Чый жа гэта?» — пацікавіўся ўрач. І тады я зразумеў, што трэба несці яго дадому, шукаць матку, бацьку, выслухаць ад іх страшэнную лаянку і праклёны.

«Каторая ж твая хата, ведаеш?» — спытаў я, уваходзячы ў дабрасельскую вуліцу. «Ведаю,— адказаў хлопчык.— Вунь там, з таго канца».

Маці якраз ішла да калодзежа. Угледзела нас, кінула на зямлю вядро, стала і стаіць, як укапаная. Я пазнаў, што гэта Шымецiха, жонка кладаўшчыка з першай пляцоўкі.

«Не бойцеся,— кажу,— ваш Віця (я ўжо ведаў, як завуць малога) зусім хутка паправіцца, у яго толькі на ножцы...»

Жанчына кінулася насустрач, не даўшы мне дагаварыць, выхапіла хлопчыка з маіх рук, а ён абняў яе за шыю

і просіць: «Мамка, схадзі гусак прыгані дадому. Яны недзе там, ля дарогі».

Маці засмяялася, а на вачах слёзы. Распытала ў мяне, як усё было, а сама і радуецца, што сынок выратаваны, і скардзіцца на яго. «Гэта ж вось пастух гусячы. Гусачкі для яго даражэй за ўсё. Не адыходзіць ад іх, гатоў бы і спаць разам. Хацела зарэзаць пару, вунь бацьку на полудзень насіць няма чаго, дык не дае. Я, кажа, гэтых гусачак люблю так, як і вас... А як жа вы самі? — пачала непакоіцца жанчына.— Вас хоць нічога, не пашкодзіла?» «Ды нічога»,— адказваю ёй, а сам думаю, што яшчэ ж я не разабраўся ў гарачцы, можа, і ў самога што ёсць.

— Машына хоць у парадку мая, як вы думаеце?

— Здаецца, у парадку,— адказаў я.— Тут глядзелі шафёры.

Пакуль я слухаў хлопца, сачыў за яго тварам, у мяне ўсё больш расло перакананне, што гэта — дабрасельскі чалавек і, відаць, нехта з тых, каго я некалі ведаў.

— Вы не Івана Семігона сын? — спытаўся я, калі мы ўжо ехалі на будаўніцтва.

Хлопец павярнуў да мяне твар, усміхнуўся.

— Я думаў, што вы адразу мяне пазналі, бо я то вас ведаю: угледзеў учора і распытаў.

— Значыць, Яша, Якаў Іванавіч?

— Ён самы. Кружыў, блукаў па свеце, ды вось вярнуўся на радзіму.

— І даўно тут?

— З лета. Далі вось машыну, езджу. Можа, адбяруць пасля сённяшняга выпадку.

— У цябе ж яшчэ сястра была? — з асцярогай, якая часта бывае, калі пытаешся пра што вельмі даўняе, прамовіў я.

— Надзя? А яна тут,— весела паведаміў Якаў.— Вунь, авечкі сёння пасе. У іхняй брыгадзе збег авечы пастух, дык яны па чарзе выганяюць.

Я ўспомніў, што нейкая знаёмая рыска мільганула ў гэтай дзяўчыны, калі я размаўляў з ёй, але лавіў сябе на тым, што тут у кожным сустрэчным мне хочацца бачыць знаёмага.

— Надзя ўжо гады два тут,— гаварыў далей Якаў.— Жыла ў цёткі, пакуль жылося, потым цётка памерла, а яе пацягнула сюды, як і мяне. Мы пакуль што ў Антосіхі жывём. Помніце Антосіху?

Цётку Настулю я помніў добра, вельмі паважаў некалі яе мужа, сябраваў з сынамі. Нікога не асталося цяпер у жанчыны, загінулі на вайне і муж і сыны. Мне чамусьці адразу падумалася, што калі ў каго і жыць Якаву ў Дабрасельцах, дык толькі ў Антосіхі.

— Заходзьце вечарком да нас,— папрасіў Якаў.— Пасядзім разам, паўспамінаем. І цётка Настуля будзе рада, і мы.

Увечары таго ж дня зайшоў у хату Антосіхі і доўга размаўляў з Якавам і яго сястрою.

## ЗОНЯ

Па сваёй службе мне часта даводзілася бываць на будаўніцтве, сустракацца з Якавам і яго сябрамі. Што далей, то ўсё больш і больш блізкімі станавіліся мы адзін аднаму. Якаў нічога не хаваў ад мяне, гэтак жа, як і я ад яго. Ён расказаў мне пра ўсё сваё мінулае, а тое сучаснае, пра што будзе ісці гаворка далей, адбывалася, як кажуць, на маіх вачах.

Пайшоўшы некалі са сваёй вёскі, Яша з дапамогай людзей адшукаў сякіх-такіх родзічаў, але жыў у іх толькі да канца зімы. У сваёй роднай хаце яму было цяжка пасля таго, як не вярнулася маці, а ў чужой дык і зусім не хапала сілы жыць. Асвойтаўшыся з тамашнімі хлапчукамі, ён праведаў, што да аднаго дзядзькі завітваюць партызаны. Падпільноўваў іх некалькі дзён, нарэшце дачакаўся і рушыў неўпрыкметку за імі, калі тыя вярталіся ў лагер. Ішоў да самага лесу, а там употай пацікаваў, куды яны павярнулі. Назаўтра ўзяў акрайчык хлеба за пазуху, насыпаў у кішэні патронаў, тых, што назнаходзіў у розных мясцінах, і з самага ранку падаўся ў лес. Ледзь не цэлы дзень хадзіў, блукаў і ўсё ж натрапіў на адну заставу. Два пажылыя дзядзькі адагрэлі яго ў зацішку каля маленькага агеньчыку, потым адзін астаўся ля кулямёта, а другі ўзяў малога за руку, вывеў на дарогу і сказаў:

— Вось, сынок, бяжы так проста па дарозе і прыбяжыш дадому, пакуль яшчэ не сцямнела. А партызанаў гэт-та ніякіх няма, мы гэт-та лес каравулім.

— Дзядзечка,— пачаў прасіцца Яша,— не праганяйце мяне дадому, бо я ўсё роўна не пайду. Няма мне куды ісці.

— Як жа гэта няма? — запярэчыў дзядзька. Адкуль прыйшоў, туды і ідзі. Хто там у цябе дома?

— Нікога няма,— стараўся хуценька расказаць хлопчык.— Я не з гэтай вёскі, з якой прыйшоў. Я з Дабрасельцаў. А там у мяне няма нікога: бацька на фронце, а матку немцы арыштавалі, і цяпер няма.

Дзядзька раптам памякчэў:

— А як жа звалі тваю матку, ведаеш?

— Чаму ж гэта не ведаю? — ледзь не пакрыўдзіўся хлопчык.— Аксеня. Як гэта можна не ведаць?

— Ну, ёсць такія ў тваім узросце, што і не ведаюць,— заўважыў дзядзька. Затым ён зноў узяў хлопчыка за руку...

Камандзір атрада, былы інструктар райкома партыі, добра ведаў Яшавых бацькоў, па яго заданнях Аксеня і працавала ў падполлі. Хоць і не надта зручна было пакідаць малога ў атрадзе, але камандзір разумеў, што інакшай зрабіць нельга. Куды ж сірата пойдзе, у каго гэта хопіць сумлення яго адправіць? Да таго ж, і шкада стала хлопчыка. У самога камандзіра недзе ёсць такі. Ёсць, а можа цяпер ужо і няма. Жонка з дзецьмі паспела выехаць з раёна, а як там далей, невядома. Можа, не здолела апярэдзіць фронт і трапіла ў лапы фашысцкай пачвары.

Камандзір сам потым наглядваў за хлопчыкам, сам даваў яму некаторыя даручэнні, калі малы партызан ужо добра прызвычаіўся да баявога жыцця і мог нават памагаць атраду. Трэба было, дык Яша хадзіў і ў разведку, быў нават у Дабрасельцах. Аднаго разу клышаногі Пятрэся ледзь не злавіў яго, каб не цемрадзь, то можа і не ўдалося б уцячы. Затое самога Пятрэсю хутка партызаны схапілі, бо Яша высачыў, што ў пэўныя дні і нават гадзіны паліцай ходзіць па нейкіх справах у суседнюю вёску.

Пасля таго як Беларусь была вызвалена і атрад, тады ўжо брыгада, з'яднаўся з Савецкай Арміяй, Яшу перадалі ў дзіцячы дом. Тут ён стаў вучыцца, але пачынаць прыйшлося з другога класа, бо як ні стараўся хлопец паказаць сваю партызанскую адукаванасць, на большае не выцягнуў.

Здаваў ён ужо апошнія экзамены за сёмы клас, як аднойчы, зусім нечакана для сябе пачуў з'едлівую насмешку адной выхавацельніцы:

— Прывезлі вось гэтакага... А цяпер куды з ім? Жаніць хіба?.. Ды яшчэ і падленьваецца, кажуць настаўнікі...

Праз некалькі дзён Яша сабраў свае манаткі і развітаўся з дзіцячым домам. Выйшаў на шашу, падняў руку першаму ж грузавіку. Шафёр, малады, плячысты хлопец, пасадзіў дзетдомаўца ў кабіну, побач з сабою, спытаў, ці ёсць курыва. Яша курыў пішкам яшчэ ў партызанах, але камандзір не раз прабіраў яго за гэта. Нямала было папрокаў і ў дзетдоме, таму хлопец адмоўна пакруціў галавой, хоць махорка ў яго ў кішэні трохі вялася.

Шафёр насмешліва сказаў:

— Што гэта за дзетдомавец, калі не курыць!

Потым уважліва пагледзеў на свайго пасажыра, змераў яго вачамі з ног да галавы і спытаў:

— Куды едзеш, начальнік?

— Сам не ведаю,— ціха адказаў Яша і вінавата ўсміхнуўся.

— Не ведаеш? — весела перапытаў шафёр.— От гэта номер. Значыцца, махнуў з дзетдома і не ведаеш, у які бок падацца?

— Так,— кіўнуў галавою Яша.

Шафёр пасмяяўся, паздзіўляўся з хвіліну, потым рашуча прапанаваў:

— А ведаеш што, начальнік! Хлопец ты, бачу, дзябёлы, рукі, хоць і белыя, але здаровыя. Давай к нам на лесараспрацоўкі! Там прымаюць такую рабочую сілу. А не будзеш дурнем, дык на сваю машыну стажорам вазьму.

Так Яша і апынуўся на лесараспрацоўках. Плячысты шафёр сапраўды ўзяў яго на сваю машыну з прычэпам, але не так стажорам, як памочнікам па ўсялякіх нялёгкіх справах. Яша запраўляў грузавік, сачыў за спраўнасцю прычэпа, напампоўваў скаты пасля таго, як не заўсёды цвярозы шафёр наязджаў на які-небудзь цвік або калючы дрот, па вечарах насіў вёдрамі ваду і мыў машыну.

Мыць амаль заўсёды даводзілася непадалёку ад леспрамгасаўскай канторы. Іншы раз на ганак выходзіла Глафіра, мажная белашчокая прыбіральшчыца і кур'ерша леспрамгаса. Яна садзілася на лаўку і не то са спачуваннем, не то з насмешкай сачыла за Яшавай работай. Яна сачыла і спакойна жавала што-небудзь, а ў Яшы рукі становіліся як чужыя і ногі ступалі квола, быццам волавам налітыя. Гнаў ён ад сябе няпрошаную думку, але ўсё ж варушылася ў галаве, што вось у гэтай Глафіры рукі бе-

лыя, чыстыя і не пахнуць бензінам, як у яго. Нічога не робіць жанчына, толькі прабяжыцца туды-сюды з паперамі і атрымлівае такую ж самую зарплату, як і ён. У партызанах было цяжка, праўда. Але ж то была вайна...

Дацягнуўшы сяк-так да чарговага авансу, Яша зноў сабраў свае, цяпер ужо наскрозь прапахлыя бензінам, манаткі і зноў выйшаў на дарогу. Ехаў цяпер ён доўга, у некаторых месцах прыпыняўся, перасядаў, і сам таго не заўважыў, як апынуўся ў вялікім горадзе. Пачаў хадзіць па вуліцах, прыглядацца, дзе ж тут можа быць тая хоць трохі лягчэйшая работа?

Да змроку, здавалася, увесь горад абышоў, выбіўся на нейкую ўскраіну, а далей ужо і ногі не ідуць. Сеў на лаўку ў якімсьці зарослым скверы, адчуў у целе прыемную палёгку, а ў галаве шумела, перад заплюшчанымі вачамі мільгалі розныя аб'явы, то на слупах, то на дошках. Якіх толькі аб'яў не начытаўся за дзень! Слова «патрабуецца» аж скакала ў вачах. Але ж хто патрабуецца? Машыністкі, рахункаводы, грузчыкі, качагары. Аднаго ён не ўмее, а другое — залішне цяжкае. Пайсці хоць у якую лазню пакуль што?

Разважаў так сам з сабою, думаў і неўпрыкметку заснуў. Прачнуўся ад сыраватай прахалоды і ламоты ў шыі. Кароткая летняя ноч, аднак карак паспеў памуляцца, пакуль пачало днець. Прыляцела нейкая птушачка, маленькая, нібы толькі з яйца, заціліўкала над самай галавою. Хлопец расплюшчыў вочы. Над ім — раскошны калінавы куст, на шырокіх, яшчэ свежых лісцях паблісквае раса. У гусцяжы, асабліва з сонечнага боку, ужо вісяць цяжкія, круглыя гронкі, але яшчэ зялёныя. Угледзеўся Яша ў спакойную засень каліны, і сон у яго адразу знік. Вельмі прыгожая каліна. Некалі расла ў іхнім агародзе, ды не такая, значна меншая. Якой бы яна была цяпер, каб не вайна?..

Цішыня ў скверы, акрамя птушыных галасоў, нічога не чуваць. Пасядзець бы тут, пакуль усё ўсюды закрыта. А паадкрываецца, тады зноў у горад, чытаць аб'явы...

Раптам пачуліся людскія галасы. Нейкія мужчыны гаманілі далекавата, але на золку амаль усё было чутно. Хлопец прыслухаўся.

— Я сам дапамог бы вам,— гаварыў чалавек.— Але ж вы ведаеце, што часу ў мяне няма. Такое няшчасце!..

Яша ўстаў і пайшоў на галасы. Тут ён убачыў, што

начаваў не ў скверы, а на могілках, густа зарослых арэшнікам і калінай.

— Вось хіба ён паможа мне,— лагодна засмяяўшыся, сказаў дзядуля, у шырокай навыпуск кашулі і з рыдлёўкай у руках.— Начаваў тут, відаць, пасля добрага кілішка, то няхай і папрацуе за дарэмны начлег. А сам я гэтак хутка не магу.

— Я вас прашу,— звярнуўся чалавек да хлопца.— Такое няшчасце ў мяне...

Якаў паклаў пад арэхавы куст свой клуначак, узяў рыдлёўку і па ўказцы дзеда пачаў капаць...

Пражыў хлапец у гэтага дзеда, вартаўніка могілак, аж да позняй восені. Дапамагаў яму ў рабоце, а стары карміў яго, пускаў на начоўку ды яшчэ і прыплачваў нядрэнна.

Пайшоў шукаць іншую работу толькі тады, калі замерзла зямля. Уладкаваўся ў пякарні, далі яму там белы фартух і белы каўпак. Насіў муку, чорны хлеб, а потым і на булкі быў пераведзены. Адсюль прызвалі ў армію.

Адыходзіў вясною і вярнуўся вясною, толькі не наступнаю, а трэцяю. Некаторыя вуліцы горада аж цяжка было пазнаць, так яны змяніліся за гэтыя гады. Той невялічкай, амаль што загараднай хаткі, дзе ён некалі кватараваў, працуючы ў пякарні, цяпер зусім не было. На гэтым месцы стаяў вялікі двухпавярховы дом, і завулак ад яго ішоў гладкі, асфальтаваны. Спачатку Якаў хацеў зайсці ў гэты дом, пашукаць там сваіх ранейшых гаспадароў, але перадумаў: навошта заходзіць, калі няма яшчэ ніякай работы?

Зноў замільгалі перад яго вачамі розныя аб'явы, як прыкры ўспамін мінулага, аднак цяпер яны ўжо не асабліва хвалявалі. У кішэні шафёрскія правы, атрыманыя ў арміі. Хоць трэцяга класа, хоць па цягачы вымучаныя, але ж правы.

Павярнуў у завулачак, якім некалі хадзіў у пякарню, і закрочыў лёгка, вольна. Ні грязі цяпер тут, ні ранейшых выбоін. Трымаў намер такі: якая трапіцца першая аб'ява па шафёра, туды і пайсці.

Насустрач ішлі людзі, відаць, жыхары гэтага дома, але Якаў стараўся не надта пераймаць іх вачыма. Яму ўяўлялася, што ўсё гэта пекары, а з імі хлопцу не хацелася сустракацца, цяпер неяк сорамна было за сваю ранейшую работу.

Раптам нечы голас зводдаль паклікаў яго. Хлопец азір-

нуўся,— насустрач няўпэўнена ішла жанчына са свежымі букетамі радыскі ў руках.

— А я ду-умаю, ду-умаю: ён гэта ці не ён? — нявуча загаварыла яна.— Прайшоў, ледзь аб рука-аў не шарганууся, а не глянуў. Паклічу, думаю, ці агляпецца?

— Я не заўважыў вас, Марыя Нілаўна,— пачаў апраўдвацца Якаў.— Ішоў вось, задумаўся.

— Ды нічо-ога,— без крыўды сказала жанчына.— Чаго мяне заўважаць, старую? Ты ж куды гэта?

— Ды вось, у горад, шукаць работы.

— І з клу-упкам? Хіба ў нас там закрыта? Я ж хлопца дома пакідала.

— Ды я не заходзіў, не шукаў,— ужо нават пачырванеўшы ад няёмкасці, гаварыў Якаў.— Хаткі вашай няма...

— Хаткі няма,— падхапіла жанчына,— а мы ёсць. Пайшлі! Адпачнеш, паспедаеш,— вось радыскі са смятанай прыгатую. Тады і ў горад. У нас цяпер калі не хатка, дык кватэра з двух пакояў і кухняй. А мы ўтраіх, як і раней.

Ледзь не за руку ведучы хлопца дадому, Марыя Нілаўна, былая кватэрная гаспадыня Якава, усё збоку пазірала на яго, усё з захапленнем гаварыла:

— Ой, які ж ты стаў прыго-ожы, зграбны. І камандзі-ір жа нават нейкі. Што б так армія змяніла чалавека!.. Проста пазна-аць цябе нельга.

У горадзе першай трапілася на вочы аб'ява з канторы лесабудгандлю. «Кантора дык кантора»,— падумаў Якаў, запісаў адрас і пайшоў. Там пасядзеў трохі ў цемнаватым калідоры, у якім пахла півам, бо непадалёку быў буфет, дачакаўся, пакуль з кабінета выйшлі людзі, і пастукаў. Кіраўнік канторы, добра паголены, але даўно не стрыжаны, сіваваты чалавек, абвёў Якава марудным паглядам, нібы рэч для куплі-продажу, памаўчаў з хвіліну, потым запрасіў сесці. Відно было па яго вачах і па малапрыкметных рухах галавы, што дэмабілізаваны малодшы сяржант спадабаўся кіраўніку канторы. Уважліва разглядваючы затым дакументы Якава, ён з поўным даверам у голасе пытаў:

— На грузавых працаваў? Так? Праўда?

І сам жа адказваў:

— Бачу, што на грузавых, на цягачах пераважна. Ну, а ў мяне, брат, легкавая, нават зусім лёгкая — «Масквіч».

Можна, вось як нам з табой, падняць яе пры неабходнасці і напесці. Камсамолец?! Не?

— Камсамолец,— адказаў Яша.— У арміі ўступіў.

— Так, так...

Вярнуўшы дакументы, кіраўнік канторы ўсім целам нахіліўся да тэлефоннага століка, той жа рукой, што трымаў трубку, набраў нумар і коратка паведаміў:

— Гэта я. Машына будзе праз гадзіну. Трэба? Не? Ну, вось так!

Адарваў з настольнага календара ўчарашні лісток, напісаў там нешта і падаў Якаву.

— Паедзеш потым вось па гэтаму адрасу, а гараж табе пакажуць. Загад аддам зараз жа.

Падышоў Якаў да той машыны, якую яму паказалі ў гаражы, з усіх бакоў агледзеў яе. У параўнанні з тымі маркамі, на якіх ён ездзіў у арміі, яна здалася маленькай і слабенькай, як дзіцячая каляска. Не ўяўлялася нават, як можна залезці ў такую маленькую кабіну.

Загадчык гаража заўважыў яго разгубленасць і, нібыта хочучы дапамагчы, падшпіліў:

— А завесці хоць умееш?

Якаў асцярожна, нібы ў шчыліну, палез бокам у кабіну. Стараўся на вачах загадчыка гаража зрабіць гэта зграбна, быццам маючы ўжо немалую звычку, аднак зачапіў галавою за верхні край кабіны, і новая, хораша абкантаваная шапка зляцела.

Загадчык гаража павольна падышоў і падаў хлопцу шапку.

— Давай старцёр,— абыякава сказаў ён.

Якаў наском бота націснуў на старцёр, а потым пяткай так лэпнуў на газ, што загадчык гаража замахаў на яго рукамі і закрычаў самым адчайным голасам, не шкадуючы, вядома, адборных слоў. Ад страшэннага гулу матора Якаў не чуў гэтых слоў.

— Вылазь к чортавай матары! — закрычаў загадчык, адчыніўшы дзверцы.— Ты што, машыну спаліць хочаш?

Якаў разгублена ўхапіўся за ключык замка, але ён, ужо трохі прыпсаваны, не круціўся. Машына раўла, аж дрыжала, бо ступня ўсё яшчэ нейкім чынам ціснула на газ.

— Вон з гаража! — яшчэ з большым абурэннем крыкнуў загадчык, а сам, здавалася, толькі дакрануўся пальцам да ключыка, і машына заглохла. Якаў, зачырванеўшы-

ся ад няёмкасці, пачаў вылазіць з кабіны і, хоць на гэты раз помніў пра верхні кант, усё ж зноў выцяўся аб яго галавой, і шапка асталася ўжо ў кабіне.

— Ты што? — з самай адкрытай непрыязнасцю пасядаў на яго загадчык гаража.— Ты хоць трохі ездзіў калі-небудзь на машынах ці проста па блату атрымаў правы?

— Ездзіў на грузавых,— адказаў Якаў.

Ён стаяў перад загадчыкам без шапкі, апусціўшы ўніз рукі. Тут, вядома, вайсковая звычка мела значэнне, але і загадчык здаўся яму чалавекам, вартым павагі: ужо немалады, грузны, нават лысаваты, як прафесар. Праўда, лаяўся ён не як прафесар, але ж у арміі здаралася, што старшына роты лаяўся яшчэ горш.

— Тут можна падумаць,— ужо трошкі мякчэй працягваў загадчык,— што ты зусім не ездзіў, можа, хіба толькі панюхаў бензіну. Глядзі, як усё гэта робіцца.

Нягледзячы на сваю грузнасць і, здавалася, непаваротлівасць, ён так спрытна і ладна сеў у машыну, што збоку магло ўявіцца, быццам сама кабіна падсунулася і ласкава прыняла яго постаць. Спачатку загадчык шпурнуў з кабіны вайсковую шапку, якую хлопец падхапіў на ляту, а потым лёгенька пстрыкнуў замком, лёгенька націснуў на старцёр, і машына весела і паслухмяна загаманіла.

— Разумееш, у чым тут фокус? — спытаў ён у Якава, падаўшы яму знак падысці да кабіны.— Не трэба ступнішчамі навальвацца, а браць легкатой і ласкай. Машына гэтая далікатная, яна не любіць, калі дакранаецца да яе які-небудзь таптун, а не сапраўдны вадзіцель.

Загадчык раптам засмяяўся, і Якаў адчуў, што гэта не такі ўжо дрэнны чалавек.

— Вось, давай садзіся! — прапанаваў ён хлопцу, а сам проста лібы выскачыў з кабіны.— Садзіся і давай! Скідай боты, калі праз надэшву ты ўсёй гэтай далікатнасці не адчуваеш.

Выехаўшы пасля добрай трэніроўкі з гаража, Якаў прыпыніўся на ражку адной ціхай вуліцы, выцер пот з твару і палез у кішэню па каляндарны лісток. Чорт яе ведае, дзе тая вуліца, што тут запісана?.. Потым жа і правілы гэтыя. На вайсковых машынах усё больш па лесе ды на полі даводзілася ездзіць. Хто там вельмі цікавіўся вулічным рухам? За ўсю службу толькі разы са два трапілася праехаць горадам, дык і то ў калоне.

У запісцы значылася такая вуліца, якой хлопец ніколі

і не чуў. «Тут не праз гадзіну прыедзеш, — падумаў ён, — а хоць бы праз дзве. Начальніку, пэўна, ужо званілі».

— Вы не ведаеце, дзе гэтая вуліца? — адчыніўшы дзверцы, звярнуўся ён да чалавека, які ішоў паблізу. Хлопец, усё роўна як непісьменны, падаў чалавеку каляндарны лісток.

Той узяў лісток, дастаў з верхняй кішэні акуляры, прачытаў спачатку адрас, потым перавярнуў паперку і стаў чытаць даты нараджэння і смерці гістарычных асоб. Прачытаўшы, зноў зірнуў на адрас і абыякава сказаў:

— Не ведаю, дзе такая вуліца. Едзьце на праспект, а там спытаеце ў паставога.

Больш ужо Якаў нікому не даваў у рукі лістка, а пытаўся яшчэ некалькі разоў. Пазбягаў толькі сустрэч з міліцыянерамі. Машына ішла лёгка, але ўжо да таго лёгка, што невядома было, як і дакранацца да газу.

Даблудзіўся хлопец да патрэбнага месца ўжо ў другой палове дня. За час пошукаў так прамільгаліся яму назвы вуліц і нумары дамоў, што гэты зялёны дамок, зацenены невялічкім садком, Якаў праехаў бы, каб не заўважыў у садку самога кіраўніка канторы.

— А-а, нарэшце! — голасна ўсклікнуў той, пазнаўшы хутчэй машыну, чым шафёра.— Я, відаць, шпарчэй хаджу, чым ты ездзіш.

— Шукаў доўга на першы раз,— вінавата прамовіў Якаў.— Ды і машына чамусьці глохла ў дарозе. Паедзем куды?

— Не, я ўжо, відаць, не паеду сёння,— адказаў начальнік.— Пазваніў намесніку. А вось... Вярушка! Чуеш? — раптам загукаў ён, ступіўшы бліжэй да акна.— Вось яна збіралася некуды ехаць.

Вярушка хутка выйшла, і новы шафёр, як толькі глянуў на яе, падумаў: «Як жа яна ўлезе ў гэтакую машыну?» Непрыкметна забраў з задняга сядзення заваднную ручку, якую трымаў напагатове, і ў чаканні першага пасажыра стаў прыкідваць, як ён тут развернецца, як будзе выязджаць на праспект. Мала яму даводзілася ездзіць з пасажырамі, а з жанчынамі, дык і ніколі не даводзілася. Трэба ж так здарыцца: першы пасажыр на новай рабоце, і жанчына. Ды яшчэ каб побач сядзела, а то ззаду. Будзе ўглядацца ў патыліцу, крытыкаваць вушы, валасы...

— А куды мне цяпер ужо ехаць? — грозна спытала жанчына, звяртаючыся да мужа.— Што там ужо ёсць?

Голас яе быў тонкі, але прарэзлівы, з мужчынскімі нотками. Гаспадар не сказаў ні слова, і Якаву стала сумна ад прадчування, што з сённяшняга дня начальнікам яго будзе не капітан, іхні камандзір аўтароты, нават не кіраўнік канторы лесабудгандлю, а вось гэтая жанчына. Ён ужо гатоў быў прыняць рэзкае слова і ў свой адрас, аднак жанчына, падышоўшы бліжэй, чамусьці падабрэла.

— Як вас мы будзем велічаць? — спытала яна, лагодна ўхмыльнуўшыся і не спускаючы вачэй з новага шафёра.

— Якавам,— адказаў хлапец.

— О, добра. Яшам, значыць. А мяне будзеце зваць Верай Пятроўнай. Ёсць у нас яшчэ дачка, яна зараз паедзе з вамі. Яе завуць, як і ўсіх тут, Наташа.

Дзяўчына неўзабаве подбегам падляцела да машыны, асцярожна, каб не памяць сваіх складачак, уселася на пярэднім сядзенні і тады стрымана павіталася.

— У педінстытут,— ціха сказала яна, калі Якаў развярнуў машыну.

Ён трохі ведаў, дзе гэты інстытут,— дарога тут яго менш непакоіла. Газ таксама цяпер ужо не так сваволіў, а вось рукі нібы падмяніў хто. Увесь час здавалася, што дзяўчына глядзіць на яго рукі, сочыць за кожным рухам. Цягнула павярнуць галаву і праверыць, ці так гэта, можа, яна зусім у другі бок глядзіць. І не хапала адвагі. Здавалася, што калі хоць на момант адвядзеш вока, то машына абавязкова наскочыць на што-небудзь. А вельмі ж хацелася давезці гэтую дзяўчыну без ніякіх прыгод.

— Чакайце тут,— сказала Наташа, калі Якаў затармазіў каля інстытуцкага пад'езду. Сказала і знікла.

«Каго чакаць? — неяк міжвольна адзначыў у думках хлопец.— Яе ці каго іншага? Чаму б не сказаць: чакайце мяне тут».

Аднак жа стаяць усё роўна трэба. Некалькі хвілін прыемна было адпачыць, а потым наступова находзіла нейкая непераадольная сумота і нават крыўдна рабілася за сваё такое становішча. У арміі рэдка калі даводзілася стаяць на месцы і чакаць. Калі ж даводзілася, то вядома было, каго чакаць і да якога часу.

...На рагу вялікага дома на другі бок вуліцы вісіць гадзіннік. Стрэлкі яго добра відны з таго месца, дзе стаіць машына. Якаў стараецца не глядзець на гадзіннік, адварочваецца ад яго, пачынае ўглядацца ў што-небудзь далё-

кае. Глядзіць доўга, увесь час яму хочацца павярнуць галаву і хоць адным вокам зірнуць на стрэлкі. Але ён стрымлівае сябе, намагаецца знайсці яшчэ што-небудзь цікавае, хоча нават забыць пра гадзіннік. Нарэшце хлопцу здаецца, што прайшло ўжо вельмі многа часу, ён паварочваецца, з надзеяй глядзіць на гадзіннік і расчаравана апускае галаву: прайшло ўсяго дзесяць хвілін.

І ўсё ж зноў нехаця сочыць за кволымі, лянымі стрэлкамі...

У ціхай вулачцы ўжо гарэлі рэдкія ліхтары, калі Якаў вяртаўся дадому. Адчувалася такая стомленасць, якой ніколі не было ў арміі. Адчуваўся таксама голад. Толькі цяпер хлопец успомніў, што ён з самага ранку нічога не еў. Міжвольна ўзнікала думка, што каб зайсці цяпер у пякарню, то не было б лепшай асалоды. Не толькі здоба, гарадскія булачкі, а і чорны хлеб быў бы найлепшым пачастункам.

Марыя Нілаўна сустрэла свайго кватаранта з трывогай і нават з папрокамі.

— Як жа гэта так по-позна? Мы ўжо думалі, што зусім не прыйдзеш, пакінуў нас. Ваня чакаў-чакаў ды заснуў, бедны.

Ваня — гэта сынок Марыі Нілаўны, вучань сёмага класа. Ён вельмі ўзрадаваўся, калі маці сказала раніцою, што Якаў будзе жыць разам з ім, у адным пакоі. Яшчэ да арміі яны неяк па-свойму, трохі прыхоўваючыся, сябравалі. Можа, таму, што жыў без бацькі, Ваня вельмі любіў Якава, ва ўсім верыў яму і, бадай, вышэй за ўсё на свеце ставіў яго аўтарытэт.

У Ванявым пакоі, ва ўтульным месцы, стаяў акуратны і вузкі, як аднаму спаць, ложак. Пасцель на ім была клапатліва разабрана: высока ўзбітая падушка бялела ў паўзмроку, ражок мяккай коўдры, падшытай прасцінай, быў прывабна адкінуты і, здавалася, чакаў, калі яго з асалодай возьмуць у пальцы і пацягнуць да сябе. Глянуў Якаў на гэты ложак і душою адчуў, што ўсё прыгатавана для яго. Можа, нават гэта той самы ложак, на якім спаў ён да адыходу ў армію.

— Дык ты ўжо ста-аў на работу ці не? — спагадліва пыталася гаспадыня.— Можа, цяжка знайсці, то ідзі да нас, у пяка-рню. Там месца заўсёды будзе.

— Знайшоў,— пявесела адказаў Якаў.— Ужо рабіў нават.

І пры ўспамінах, як ён сёння рабіў, пачынала ныць у сэрцы.

У дзверы нехта ціхенька пастукаў,— званка тут яшчэ не было.

— Зо-оня,— радасна сказала Марыя Нілаўна і пабегла адчыняць.

Якаву раптам стала няёмка: сапраўды, была ж тут ранейі яшчэ і Зоня, дзяўчынка-сямікласніца, вось як цяпер Ваня. Бегала з кароткімі коскамі і часта скардзілася маці на Ваню, таму што той, хоць і меншы, а ледзь не кожны дзень крыўдзіў яе. Харошая ж дзяўчынка, а Якаў нават ні разу не спытаў пра яе. То гэтыя пошукі работы былі вельмі ўжо ў галаве, то вось цяпер сама работа. Магчыма, што і Марыі Нілаўне гэта непрыемна?

У пакой увайшла Зоня, у рабочай спяцоўцы, старанна ачышчанай ад гліны і вапнянкі, у маленькай касынцы-трыкутнічку. Якаў устаў, яна падышла, падала руку і павіншавала са зваротам з арміі.

— Ой, як я стамілася, — пачала яна скардзіцца маццеры, — ледзь не адна ўвесь комін вывела. Анька з Лінкай толькі падавалі мне.

— Дзіва, што стамілася, — паспачувала маці. — Ці твая гэта работа — печы класці? Няхай бы хлопцы вашы...

— А яны — хто куды: хто курыць, хто ваду піць, а мы працуем. Я ўсё хачу ўмець. І печы класці таксама.

— Гэта ж рамантуюць нейкі яшчэ даваенны інтэрнат, — пачала гаварыць маці Якаву, пакуль Зоня недзе там, у ванне, мылася і пераадзявалася. — Ёй-то і не жыць у гэтым інтэрнаце, але ж вось ужо каторы дзень: зранку вучацца, а потым дацямна працуюць.

— А дзе Зоня вучыцца? — не ўтрымаўся, каб не спытаць, Якаў. У першыя хвіліны ён падумаў, што яна недзе працуе.

— У будаўні-ічым тэхнікуме, — не надта задаволена адказала Марыя Нілаўна. — Пасля васьмі класаў туды пайшла. А кім адтуль выйдзе, то я, сказаць табе папраўдзе, і не ведаю.

— Будаўніком і выйду, — весела сказала Зоня, раптам паказаўшыся ў дзвярах ужо ў сукенцы і з прыгожа распушчанымі валасамі.— А што, хіба гэта дрэнна? Будаваць будзем, цяпер многа трэба будаваць!

«Гэта зусім не дрэнна», — гледзячы па загарэлы твар дзяўчыны, падумаў Якаў. Унутры трошкі кальнула ад

усведамлення, што і самому трэба было вучыцца. Зоня будзе мураваць дамы, а ён — вазіць Наташу.

— Садзіся вячэраць, будаўнік! — з бадзёрай ласкай у галасе сказала дзяўчыне маці. — Колькі ўжо часу я суп гарачым трымаю! Садзіся і ты, Якаў!

Зоня збегала на кухню, прынесла адтуль талеркі, спрытна расставіла іх на ўжо засланым круглым століку. Потым села перад адной талеркай і неяк зусім проста, нібы гэта быў Ваня, а не Якаў, сказала:

— Ну, садзіся ж.

А Якаву ў гэты момант здалося, што яму ўжо зусім не хочацца есці. Ён бачыў за сталом Зоню і адчуваў, што не можа так проста сесці побач з ёю і ўзяць у руку лыжку. Перад ім нібы тая ж самая дзяўчынка-сямікласніца. Яна такая ж простая, вясёлая і да яго адносіцца, як раней, па-сямейнаму, па-сяброўску. Але ўсё ж ёсць і нешта іншае. Яно прымушае апускаць вочы, калі хочацца нешта сказаць, сачыць за сваімі рукамі, якія, чамусьці, увесь час не ведаюць, куды дзецца.

Падышла, нарэшце, Марыя Нілаўна, паставіла на стол каструлю з супам і ледзь не сілаю зацягнула хлопца вячэраць. Зоня гаварыла пра сваю работу і за вячэрай. Яна адразу папрасіла маці пабудзіць яе ў шэсць гадзін раніцы, бо іхнія дзяўчаты вырашылі папрацаваць заўтра на будаўніцтве да пачатку заняткаў. Потым у яе ішлі розныя планы на летнюю і зімнюю практыку. Планы гэтыя аздабляліся далёкімі паездкамі, цікавымі падарожжамі. Якаў моўчкі слухаў яе і ў душы здзіўляўся: вось жа стамілася дзяўчына, прыйшла ўся ў пыле, здавалася, вочы патухлі ад знемагаемасці, а настрой вясёлы, гуллівы. Як ні было цяжка сёння, а ёй хочацца ісці на гэтую работу заўтра, і паслязаўтра, і кожны дзень. Пойдзе яна заўтра ранепька, а прыйдзе зноў прыцемкам і будзе гаварыць з матуляй звонкім, зусім не стомленым голасам. Маці будзе толькі ўсміхацца і не зводзіць з яе вачэй...

А Якаву не хацелася ісці заўтра на работу. Непрыемна было ўяўляць сустрэчу з загадчыкам гаража, з Верай Пятроўнай, нават з кіраўніком канторы. Прыкра гучаў у вушах гэты катэгарычны, нібы вайсковы загад Наташы: «Заўтра ў восем!» Хлопец намагаўся ўспомніць, ці выпадаў калі ў яго такі дзень, каб яму вельмі хацелася пайсці на работу? Ці была такая раніца, каб ён прачнуўся і адчуў душэўную цеплыню ад таго, што ўжо трэба ісці прымац-

ца за справу? Бадай-што не было яшчэ такога дня, не было такой раніцы...

Хоць і вялікую змораиасць адчуваў Якаў, аднак спаў ноччу неспакойна. Увесь час сніласяі яму вельмі няўдалая язда на «Масквічу» па разбітай, каляіністай дарозе.

## ГОЛАС МАРЫІ НІЛАЎНЫ

«Масквічок» быў ужо не новы, ды і ездзіў Якаў не з асаблівай асцярогай, таму даводзілася часта палежваць над рысорамі. На гэты ж раз лёгчы-то ён лёг, нават ключы разлажыў побач, а рамантаваць ужо зусім не хацелася. З-пад пярэдняй восі была відна спусцістая паласа асфальтаванай дарогі, знаёмай, нібы свая вуліца. Ледзь не кожны дзень выпадала праязджаць тут. Машына на тормазе, а там, па спуску, — недароблены мост цераз рэчку. Колькі год ужо людзі аб'язджаюць гэты мост! Едзеш — і цяжка стрымаць машыну, здаецца, што нейкая нячыстая сіла цягне яе проста ў рэчку.

«От, даць бы ёй цяпер волю, — мільгае ў Якава спакуслівая думка. — Вылезці, адпусціць тармазы ды яшчэ папхнуць з горкі. Няхай хоць раз пракоціцца так, як ёй заўсёды хацелася каціцца ў гэтым месцы».

У нейкія моманты Якаву здавалася, што калі ён убачыць аскабалкі свае машыны ў рэчцы, яму самому стане лягчэй, што быццам бы вось гэтая скрыпучая і лескатучая антылопа вінавата ва ўсіх яго цяперашніх непрыемнасцях.

А яшчэ зусім нядаўна ўсё выглядала інакш.

Пастунова Якаў прывык да сваёй машыны, стаў не кепска ездзіць на ёй, толькі даглядаць не надта любіў. Кватэра Марыі Нілаўны стала для яго нібы родным кутком, і сям'я кіраўніка канторы ўжо быццам бы не выклікала асаблівай прыкрасці. Перад адыходам дадому амаль кожны раз з'яўлялася прыемнае, радаснае цяпло на душы. І яшчэ больш яно ўзрастала, калі, прыйшоўшы, хлопец заўважаў, што яго тут чакалі, без яго нават не вячэралі. Былі такія дні, калі Марыя Нілаўна працавала ў начную змену. Тады Зоня чакала яго адна, бо Ваня лажыўся рана. Пакуль Якаў умываўся, яна падавала ўсё на стол, і яны разам вячэралі.

Потым прыйшоў такі адвячорак, калі яго, бадай, не чакалі. Доўга сядзеў хлопец на сваім неразабраным лож-

ку, не разуваўся, не раздзяваўся. Душою адчуваў, якая тут магла быць прычына, толькі не верылася, што Зоня і Марыя Нілаўна могуць зазлавацца на яго, перастаць паважаць,— вельмі ж цяжка было ўяўляць іхнюю крыўду.

Калі ў кватэры ўсё ўціхла і Марыя Нілаўна заснула недзе там каля кухні, Якаў падышоў да Зоні і прысеў на краёк яе ложка. Дзяўчына не адштурхнула яго. Яна толькі прыняла руку, калі Якаў дакрануўся да локця, і неяк баязліва пацягнула на сябе коўдру. Потым чамусьці расплакалася. Якаў сядзеў доўга, як ні прасіў, Зоня нічога не гаварыла і ні ў чым яго не папракала. Толькі ўжо калі ўстаў, ціха прамовіла:

— Няхай бы ты сам сказаў мне, што ты з гэтаю самаю...

Той дзень, што надыходзіў, быў выхадны — у Якава не было Наташынага загаду выязджаць, таму ён устаў позна. У кватэры панавала нейкая жалобная маўклівасць. Нават Ваня і той сядзеў, апусціўшы над кніжкай галаву, і на Якава стараўся не глядзець.

Гаспадыня холадна, як закіпутага ўсімі родзіча, запрасіла Якава за стол, і калі ён сяк-так, амаль што прымушаючы сябе, паснедаў, сказала:

— У нас, Якаў, больш, мабыць, нельга табе быць. У нас з таго часу, як пакінуў бацька, не было ніякага ашуканства.

Якаў глянуў на Зоню. Яна сядзела на зэдліку, каля свайго ложка і не ўзняла вачэй, нават не варухнула павекамі. Маленькія рукі бязвольна ляжалі на каленях.

Ваня закрыў кніжку, устаў.

— Чаму вы гэтак, мама?

Якаў шырока ступіў да таго месца ў сваім пакоі, дзе вісеў на цвіку яго вайсковы рукзак, ні з кім не развітаўшыся, выйшаў. За ім выбег устрывожаны Ваня:

— Ты яшчэ прыйдзеш, Якаў? Прыходзь! Гэта нічога! Прыходзь!..

Ніводным словам не адказаў яму былы кватарант. Ён нават мала чуў гэтую шчырую просьбу. У яго вушах гучаў спакойны, але поўны душэўнага абурэння голас Марыі Нілаўны: «Мы паверылі табе, а ты...»

Голас балюча свідраваў нутро, ад яго неяк драцвелі рукі, ногі. Пачынала марачыць у галаве, цямнець у вачах.

«Што ж гэта здарылася? — намагаўся ўсвядоміць Якаў. — Іду, нават бягу з кватэры?.. З той кватэры, якую лічыў амаль што роднай?.. І куды бягу, да каго?..»

Успомніліся словы Зоні: «Чаму ты не сказаў, што ў цябе ёсць другая?»

А хто ж гэта сказаў? Няўжо Марыя Нілаўна штосьці заўважыла ды пусціла ў ход сваю балючую падазронасць некалі пакінутай жанчыны? Якая ж гэта другая, хто яна? У гэты час здавалася, што не існавала ніякай другой. Была толькі Зоня: яна перад вачыма, яна і ў сэрцы.

Потым паступова пачало ўзнікаць у памяці, што, мабыць, усё-такі была і другая, калі ёю папракаюць. Гэта, мабыць, Наташа, дачка кіраўніка канторы. З ёй даводзілася часта ездзіць. Яна амаль заўсёды маўчала ў дарозе, а яе кароткія загады накопт чакання ці падачы машыны абражалі Якава, выклікалі раздражненне. І падачы, і чаканні, і самыя паездкі былі пакутай для хлопца, ён ужо не раз падумваў аб тым, што вельмі пешчаслівая была першая аб'ява на дошцы, што трэба ўсё ж такі перамяніць службу.

І неяк выйшла аднаго разу, што Наташа, вылазячы з машыны, быццам бы зусім знячэўку, прыхінулася да шафёра. Якаў адчуў над сваім вухам яе дыханне, мяккія венчыкі валасоў казытнулі шчаку.

Дзяўчына не аддала на гэты раз ніякага загаду, а толькі глянула на Якава і хараша ўсміхнулася. І хлопец зразумеў, што будзе чакаць яе хоць цэлы дзень.

Па другі бок вуліцы і цяпер відзён быў электрычны гадзіннік. Ён быў нават бліжэй, як раней. Здавалася, што калі прыслухацца, то можна пачуць, як пераскокваюць з адной рыскі на другую стрэлкі. Але час зусім не цягнуўся, і шаферскі сум, які часта апаноўвае на стаянках, як рукой зняло. Над вухам таямніча лунала Наташына дыханне. Яно было цёплае, нязведана прывабнае. Ад успамінаў пра мяккія венчыкі загараліся шчокі...

Калі ехаў хлопец з Натаю дадому, яму часамі ўяўлялася, што не едзе ён, а быццам плыве па небе. «Масквіч» быў, як ніколі, паслухмяны, матор яго ўвесь час шаптаў нешта прыемнае і ласкавае...

У той вечар Якаву не хацелася ехаць у гараж, хоць Наташа яго не затрымлівала. Назаўтра ён яшчэ на світанні імчаў на работу, каб хутчэй выехаць з гаража ды пад'ехаць да зялёнага доміка...

Наташа ўсё часцей выдумляла ўсялякія прычыны для наездак удваіх. Цяпер ужо Якаў ведаў, што тая першая прыгода ў машыне не была выпадковай. Наташа нахілялася да яго ўжо не раз і нават шапнула аднойчы нешта чароўнае і быццам бы ніколі раней не чуванае. За гарачынёй яе вуснаў Якаў не разабраў слоў.

...Так, гэта тая самая другая. Была яна, ці ёсць і цяпер? Мабыць, ёсць. Якаў сам не заўважыў, як узяў напрамак у той бок, дзе стаяў зялёны домік, не адчуў, як жвавей пайшлі яго ногі...

Дзверы ў прыхожую былі адчынены — домработніца выпускала дым з кухні. Якаў зайшоў без стуку, сеў на канапку, бліжэй да жылых пакояў, і стаў чакаць, пакуль выйдзе хто-небудзь з гаспадароў. Тут сядзеў ён ужо не раз, чакаючы распараджэнняў. У зале ішла бойкая размова. Не любіў Якаў прыслухоўвацца, пра што гаварылі там, у пакоях. Нават калі чуцён быў Наташын голас, дык і то не стараўся разбіраць слоў. А тут галасы проста аж глушылі — гаворка ішла зусім блізка і на поўнай ноце.

— Я ўжо ўсюды была! — з папрокам гаварыла Вера Пятроўна. — Ніхто і слухаць не хоча. Многа цяпер такіх, як я. Вось бацьку прасі, няхай ён сходзіць ці хоць пазвоніць, куды трэба.

— Нікуды я не пайду і званіць не буду! — рашуча заявіў бацька. — Пасылаюць у вёску, і едзь, куды пасылаюць!

— Нікуды я не паеду! — у тон бацьку ледзь не закрычала Наташа.— Не хочаце дапамагчы, сама знайду выхад, а ўсё роўна мяне пакінуць тут!

— Хіба замуж выйдзеш? — без здзіўлення спытала маці.

— І выйду, думаеце не?

— За каго ж ты, хіба за гэтага Якава?

— Хопіць у мяне і без Якава!

— Чаго ж, ён хлопец рахманы, з ім можна, калі ўжо гэтак, і зладзіцца... Потым разыдзецеся, калі застанешся ў горадзе. Скажы яму, што я і на гарнітур не пашкадую, калі будзе такая згода.

— Ты, Вярушка, з глузду з'ехала, — з абурэннем, аднак стрымана сказаў гаспадар, — як гэта можна так гаварыць? Пры Наташы?

А Наташа раптам пачала смяяцца. Яе траскучы, пра-

рэзлівы смех заглушаў бацькаў голас, біў па сценах, па ўсіх кутках дома...

Гэты нечуваны раней смех звінеў у вушах Якава нават і тады, калі хлапец быў ужо далёка ад зялёнага доміка.

Некалькі дзён Якаў нікуды не выязджаў з гаража, тут дняваў і начаваў. Калі даходзіў выклік з зялёнага доміка, прасіў каго-небудзь перадаць, што ў машыне адказалі тармазы.

«Масквіча» сапраўды трэба было рамантаваць, але да яго прыкра было падысці. Таму вось і цяпер, калі, абклаўшыся інструментамі, хлопец ляжыць пад машынай, яму хочацца раптам устаць, шыбануць машыну нагой па спуск, а самому пайсці і век больш не варочацца ў гэты горад, век не сустракацца з тымі людзьмі, якія так бессардэчна абразілі, ашукалі яго, з-за якіх ён сам стаў ашуканцам.

Дзе тое шчасце, якое так прывабна ўсміхалася, чаму яно так імгненна знікла, нібы з'яўлялася толькі ў сне? Над Якавам — разбітая кабрыялецціна. У вушах — вісклівы Наташын смех, а ў душы — сумны голас Марыі Нілаўны. Доўга, мабыць, не змоўкне гэты голас...

Хацелася жыць без натугі, без асаблівых клопатаў, мець белыя рукі і заўсёды насіць чыстую гімнасцёрку, каб Наташы не прыкра было сядзець побач, каб яна не адварочвала свой пераборлівы носік ад бензінавага паху. Гэта здавалася сапраўдным жыццём, нават шчасцем...

Прыпудраны кірпаты носік не быў пакрыўджаны, а вось наконт сапраўднага жыцця трэба яшчэ многа думаць...

Па дарозе снавалі машыны, у адзін бок і ў другі. Якаў часта міжвольна падкурчваў ногі. Ад трохтонак і самазвалаў дрыжаў пад спінаю асфальт. Адзін шафёр на «газіку» праехаў вельмі блізка і траха не зачапіў колам абцас. «Мабыць, вочы сабе заліў», — падумаў Якаў. І, успомніўшы шафёрскую павадку, ледзь не вылаяўся на ўвесь голас.

Шафёр абмінуў «Масквіча», узяў яшчэ больш к адхону і затармазіў.

— Што там у цябе здарылася? — гучна спытаўся ён, вылезшы з кабіны. — Можа, дапамагчы?

— Ды не трэба, — адказаў Якаў, а сам міжвольна здрыгануўся, зняў з гайкі ключ. Голас нагадаў яму некага вельмі знаёмага.

Шафёр з «газіка» надышоў бліжэй, апусціўся на карачкі і зазірнуў пад машыну.

— У мяне інструмент добры ёсць, — ужо цішэй сказаў ён.

Якаў маўчаў. Ён углядаўся ў твар гэтага чалавека і не мог паверыць сваім вачам. Чалавек таксама трошкі сумеўся, заўважыўшы здзіўленне і разгубленасць Якава.

— Чаго маўчыш? — не зусім задаволена спытаў ён, і сам пачаў аглядваць былога вайскавіка.

— Павел Іванавіч?! — яшчэ няўпэўнена, яшчэ толькі для праверкі сваіх прадчуванняў, прамовіў Якаў.

Шафёр з «газіка» не надта здзівіўся, відаць, такія нечаканыя сустрэчы былі ў яго і раней, аднак руку працягнуў нерашуча і крыху разгублена.

— Давай, вылазь, салдат, — па-сяброўску сказаў ён. — Зараз высветлім, што тут да чаго.

Якаў жвава, нібы па вайсковаму загаду, устаў, паправіў гімнасцёрку, выцягнуўся.

— Пачакай, пачакай,— стаў нешта прыпамінаць шафёр з «газіка».— Няўжо гэта Яша, наш маленькі партызан?

— Гэта я, таварыш камандзір атрада.

— Якаў, дружа ты мой!

Цяпер ужо здзівіўся камандзір, бо сустрэча была сапраўды незвычайнай. З таго часу, як хлопчык-партызан быў накіраваны ў дзіцячы дом, Павел Іванавіч аб ім нічога не ведаў. Амаль што ніякіх вестак не меў пра свайго былога камандзіра і Якаў. У кожнага з іх жыццё склалася па-свойму. Як пражыў усе гэтыя гады былы партызан, мы ўжо збольшага ведаем, а калі хоць трошкі сказаць пра былога камандзіра, то трэба ўспомніць, што Павел Іванавіч канчаў вайну ў Берліне, потым доўга служыў у паліторганах Савецкай Арміі і толькі з год таму назад выйшаў у афіцэрскі запас.

Былы камандзір і былы партызан паспускалі ногі ў адхон і ўсчалі, седзячы, такую гаворку, што каб не трэба было абодвум ехаць, то прагаварылі б, пэўна, да вечара.

— Дык цяпер, значыць, на гэтай машыны? — спытаў Павел Іванавіч, даведаўшыся пра ўсё ранейшае Яшава жыццё.

— На гэтай,— сумна адказаў хлопец. Ён хацеў і яшчэ сёе-тое сказаць пра сваю гарадскую работу, але Павел Іванавіч і так зразумеў, што Якаву нельга больш там аставацца.

— А дома ты ўжо быў? — цікавіўся далей Павел Іванавіч. — Там жа цяпер сястра твая. Ведаеш?

— Ведаю, што сястра, — адказаў Якаў. — Даўно ведаю. Але ўсё ж такі гэта не дом. Які гэта дом: ні кала, ні двара, нікога нават са сваякоў.

— А што там вялікае будаўніцтва пачынаецца, чуў?

— Трохі чуў.

— Дык вось, Якаў, — цвёрда сказаў Павел Іванавіч і ўстаў. — Давай, разлічвайся са сваёй канторай і пагазуем заўтра да нас. Хочаш, магу нават заехаць па цябе.

— А вы таксама па гэтым будаўніцтве?

— На гэтым.

— Дык я сам прыйду, куды скажаце.

Назаўтра адвячоркам Якаў ледзь заўважыў, як праляцеў на «газіку» тое месца, дзе ўчора ляжаў пад самім «Масквічом». На душы адчувалася палёгка, а ў памяці ўсё яшчэ гучаў голас Марыі Нілаўны...

За рулём сядзеў Павел Іванавіч, вясёлы, падцягнуты, у зграбным кіцелі.

— Гэта вы ў арміі навучыліся вадзіць машыну? — спытаў Якаў.

— У арміі, — адказаў Павел Іванавіч.

— Я таксама ў арміі...

## СМЯЛЕЙШЫ БУДЗЬ!

Калі пасля нашай першай сустрэчы Якаў прыехаў у трэстаўскі гараж, Росцік Шыпулька доўга прабіраў яго:

— Хіба сапраўдны вадзіцель можа пакінуць на дарозе машыну? Хіба сапраўдны вадзіцель можа забыць, які груз знаходзіцца ў кузаве? Вадзіцель павінен здалёк бачыць, калі якое гусяня ці што іншае хоча сунуцца пад колы.

Гэтае «іншае» было чалавекам. Маленькім яшчэ, пяцігадовым, але чалавекам. Спачатку Якаву хацелася неяк растлумачыць гэта загадчыку гаража. Калі б хоць на момант забыцца, што гэта Шыпулька, то можна было б і паспрабаваць апраўдвацца. Але як жа забудзеш? Росціка Якаў ведаў даўно. Па-свойму заггар праўду гаворыць,

а што да якіх там адчуванняў, перажыванняў, то аб гэтым лепш памаўчаць, бо ўсё роўна ён не зразумее. І Якаў маўчаў. Шыпулька пакрычаўся, намахаўся рукамі і праз нейкі час таксама змоўк.

Калі назаўтра Якаў выязджаў з гаража, той ужо разважна крочыў ля кабіны і бубніў, нібы сам сабе пад нос.

— Ты не крыўдуй, Яша. Знаеш — служба. З мяне, знаеш, яшчэ больш патрабуюць. Прыходзь сёння ўвечары сюды, пад клуб, то мо пайграю трохі.

«Што на яго крыўдаваць? — падумаў Якаў. — Сёння вярнуся, можа, без ніякіх здарэнняў, а ўсё роўна пакрычыць. Ён на ўсіх шафёраў крычыць, мо таму і лічыцца добрым загадчыкам гаража».

Было яшчэ цемнавата. Каля майстэрні машынапракатнай базы, непадалёку ад гэтага, пакуль што невялічкага гаража, гарэў вялікі ліхтар. Ён быў прыладжаны на такім высокім слупе і меў такі вальтаж, што ноччу нават здалёк на яго цяжка было глядзець. Ліхтар залівае святлом не толькі майстэрню і частку двара, а і трэстаўскую кузню, што стаіць па другі бок дарогі. У майстэрні яшчэ няма нікога, а ў кузні ўжо звініць адно маленькае кавадла. Да чаго ж знаёмы звон! Пачуўшы яго ўпершыню, Якаў аднаго разу доўга стаяў ля машыны, слухаў. Некалі ў маленстве ён кожны дзень чуў такі ж самы звон. Потым загадка прасвятлілася: у трэстаўскай кузні працаваў той жа самы дзядзька Алесь, які быў некалі калгасным кавалём. Ён перайшоў сюды са сваім уласным кавадлам.

На першай будаўнічай пляцоўцы Якаў павінен быў знайсці прараба і ўзяць у яго нарады на сённяшнія перавозкі. Уключыўшы фары, калі святло ліхтара ўжо не дапамагала, ён на малой хуткасці паехаў туды. Дарога невялікая, тут бы якраз пехатою прайсціся, але ў гэтым, можа, і бяда шафёра, што яму рэдка калі даводзіцца хадзіць пешшу. Каторы ўжо раз тут праязджае Якаў, і заўсёды хочацца спыніць машыну. Калі не пахадзіць тут, не паглядзець на ўсё, дык хоць так пастаяць хвіліну, успомніць гады маленства. Хоць і змянілася тут вельмі многае, але некаторыя рыскі асталіся. Гэтыя рыскі, мабыць, для кожнага чалавека свае, асобныя.

Сёе-тое з даўняга асталося вось і на гэтай дарозе, па якой цяпер зручна ездзіць на будаўніцтва. Масток, магчыма, і падноўлены, але выглядае так, як і раней. Быльнік

па краях адхону, слабенькі, узорысты іней на ім, канаўка побач на поплаве, ледзь-ледзь толькі застыглая. Бывала, ніякага свята так не чакалі, як таго дня, калі замерзне гэтая канаўка. Яна вяла аж да Чырвоных Макаў, да самай школы. Якое шчасце было некалі — выйсці на гэтую канаўку з канькамі або хоць з адным самаробным канько́м. Па дарозе ідзеш-ідзеш, а па канаўцы не паспееш агля-нуцца, як ужо і школа.

Потым жа каля гэтай канаўкі была пратаптана сцежка, калі гестапаўцы ператварылі школу ў турму. Гэтую сця-жынку пратапталі яны ўдваіх з Надзяй, ходзячы да мату-лі. Канаўка тады толькі яшчэ пачынала замярзаць, але каб і замерзла, то не ў галаве былі тыя канькі...

На пляцоўцы таксама гарэлі ліхтары, але не такія, як каля майстэрні. Тут яны толькі блішчалі, злёгку асвят-ляючы найбольш важныя будаўнічыя аб'екты. Якаў яшчэ больш прыцішае ход машыны, перад святлом фараў ма-рудна, але паслухмяна расступаецца ранішні наземны ту-ман. Даўно тут усё змянілася, бадай-што і рыскі не аста-лося ад мінулага, а Якаву раптам уяўляецца, што недзе тут збоку, куды не даходзіць святло фараў, стаіць іхняя хата, з белымі вокнамі, з пеўнікам на лабку. Пярэдняе кола ўпіраецца ў нешта цвёрдае і моцнае. Якаў націскае на тормаз і адчыняе дзверцы кабіны. Яму здаецца, што наехаў на пень грушы-фунтоўкі, якая некалі тут расла...

Не, не груша гэта, а проста вялікі камень, трохі ўмёрзлы ў гразь. Ад грушы і пня цяпер не асталося, ён даўно выкарчаваны.

На пляцоўцы пачыналася ранішняе жыццё, шумлівае, гаманлівае. З Дабрасельцаў і навакольных вёсак прыхо-дзілі будаўнікі, усё больш маладыя, усё з тых, што пры-ехалі сюды па камсамольскіх пуцёўках. Кожнаму ха-целася паздароўкацца з таварышам, а то і слоўцам перакінуцца хоць на хаду — расказаць што-небудзь смеш-нае ды вясёлае. Якаву цяжка было праехаць за буль-дозерамі і самазваламі. Іх матory часамі глушылі не толькі гаворку, а і самыя гучныя выклікі будаўнікоў самыя высокія ноты ў песнях.

Сярод дзяўчат і хлопцаў рупліва патупваў стары Ва-сіль Туман, з бліскучай сякерай за поясам. Гэта дабра-сельскі жыхар, і ў яго, відома, камсамольскай пуцёўкі няма. Ён сам прыйшоў на будаўніцтва. Калі горад быў яшчэ толькі закладзены, стары ледзь не штодня выходзіў

за агароды, прыкладваў да лба неравітую маршчынамі далонь і глядзеў у той бок, дзе пачыналася гэтае незвычайнае будаўніцтва. Многа ён будаваў на сваім вяку, але ўсё на вёсках, у вялікім горадзе нават не быў ні разу. А тут побач гэтакі горад! Паваструыў аднаго разу сякеру і пайшоў. Як узлез упершыню на высокія рыштаванні, здалося, што паўсвету адкрылася перад ім. Не мог выняць з-за пояса сякеру, пакуль не агледзеў усё навакол. Вёска адна, другая, трэцяя... Там — знаёмыя хаты... Некаторыя будаваў ён даўно, яшчэ да вайны, некаторыя пасля вайны. Старому цесляру здаецца, што ён пазнае іх па высаце стрэх, па прыгажосці лабкоў. Хто ж гэта не пазнае сваю работу?

Прараба не відно было паблізу, а кладаўшчык Вінцэсь Шымет падбег да Якава, як толькі ўбачыў яго грузавік.

— Ты ўчора прывёз шыфер? — патрабавальна спытаў ён.

— Я, — адказаў Семігон. — А што?

— Пастаў машыну, пойдзем са мною!

Якаў заглушыў матор, хоць мог і не паслухаць кладаўшчыка. Для загадаў хапае іншых начальнікаў. Шымет у гумавых ботах, хоць гразь ужо ўсюды падмерзла, у шэрым лёгкім палітцы, хоць цяпер не пашкодзіла б і штонебудзь цяплейшае, паспешна крочыў па пляцоўцы, разпоразу пераступаючы цераз цэментавыя пліты, дошкі, лёгка пераскокваючы цераз неглыбокія катлаваны. Якаў ледзь паспяваў за ім.

Падышоўшы да таго месца, дзе ўчора быў згружаны шыфер, кладаўшчык пачакаў, пакуль Якаў параўняецца з ім, і паказаў на некалькі патрэсканых лістоў.

— Што гэта такое? — з абурэннем спытаў ён. — Як ты мог прывезці гэтакі матэрыял.

— А як здароўе вашага хлопчыка? — пацікавіўся Якаў.

— Хлопчык хлопчыкам! — падхапіў кладаўшчык. — Я, канешне, дзякую табе за тое, што прынёс малога, але ж гэта — дзяржаўная маёмасць. Разумееш? Учора мяне якраз не было, ты згрузіў. Тут, можа, і лістоў не хапае?

— Можна пералічыць лісты, — заўважыў Якаў. — Сам я перакладваў іх пасля аварыі і бачыў, што ўсе штабялькі былі поўныя.

— Ну, пералічваць ужо не будзем, — крыху падабрэўшы, сказаў кладаўшчык. — Я веру табе. Але ж сам паду-

май, што такое шыфер для нашага будаўніцтва? Не будзе шыферу — не будзе нічога. А вось сёння ты прывёз некалькі бракаваных лістоў, заўтра, будзем казаць, другі шафёр, паслязаўтра — трэці... Разумееш?

— Ды разумею, — сумна прамовіў Якаў і пайшоў да свае машыны.

Рэйс выпаў далёкі, потым яшчэ пагрузка па месцы зацягнулася, дык вярнуўся дадому ўжо зусім позна. Каля гаража патупваў вартаўнік, стары Талімон, і саступіў з дарогі толькі тады, калі святло фараў апярэдзіла яго. Добра бачыў гэты чалавек, мог яшчэ доўга стаяць на нагах, а слыху добрага не меў. У дабрасельскіх хатах ужо не відаць было святла, цёмнымі плямамі выглядалі і вокны трэстаўскага, а ў недалёкім мінулым эмтээсаўскага клуба.

Якаў ішоў падмарожанай вуліцай, і яму здавалася, што яго салдацкія боты грукаюць вельмі моцна. У хаце Антосіхі свяціліся вокны, але вельмі цьмяна. Можа, гэта ў параўнанні з трэстаўскім ліхтаром так здавалася? Якаву падумалася, што яго чакаюць. Нехта, пэўна, не спіць: ці Надзя, ці сама гаспадыня. А можа, абедзве паснулі, а лямпачку забылі выключыць?

Лёгенька пастукаў у акно, і за фіранкай адразу мільгануў цень. Значыць, чакалі. Пацяплела на душы ад гэтага, на нейкі момант паўстала перад вачыма Зоня, шчырая, вясёлая. Ступіў на ганак, і раптам пазмрачнелі ўспаміны: ці з гэтакай радасцю ступаў некалі на парог таго доміка ў завулку? Ці такая пяшчота была на сэрцы? Мабыць, ужо ніколі не вернеш той радасці!..

Дзверы адчыніла Надзя.

— Чаму ты так позна? — з трывогай спытала яна. — Хіба зноў што здарылася?

— Не, нічога, — шэптам адказаў Якаў, заўважыўшы, што гаспадыня спіць. — Няхай бы ты святло выключыла, а то, бачыш?..

— Я лямпачку хусткай абгарнула, — прашаптала Надзя. — А цётка Настуля казала, што нічога не трэба, ёй святло не замінае.

— Ты што рабіла, чытала?

— Трохі чытала, а потым узялася вышываць.

— І не заснула за гэтым сваім вышываннем?

— Я за вышываннем магу двое сутак сядзець і не засну. Вось мне трэба ўжо да зімовай сесіі рыхтавацца, а я як вазьму ў рукі сурвэтку, дык пра ўсё забываю.

Пакуль Якаў вячэраў, Надзя расказвала пра сягоння шні вечар у клубе. Расказвала ўвесь час шэптам, каб не прачнулася цётка Настуля, але ад такога шэпту цяжка было не прачнуцца. Калі Антосіха ўсё ж такі не чула гамонкі, то, пэўна, ад таго, што ўставала вельмі рана, ды і на ферме тупанкі было нямала.

Надзя не магла стрымаць смеху, калі ўспамінала, як Росцік Шыпулька прыйшоў на змярканні да клуба, пачаў граць на гармоніку, а дзяўчаты праходзілі міма і ніводная не захацела танцаваць. Граў седзячы на ганку, пад ліхтаром, аж пакуль рукі не сталі качанець.

— А з шахтбуда хіба ніхто не прыходзіў? — спытаў Якаў. — Валянціна не было?

— Ён прыйшоў пазней, — адказала Надзя. Тут яна знізіла свой шэпт сапраўды да ціхасці, дробненька замаргала густымі чорнымі вейкамі, нібы крыльцамі.— Гэты як заіграе, дык ніхто не ўстаіць. Але не было калі граць — сёння з дэпутаткай сустракаліся.

— З кім гэта?

— Ды вось з нашай суседкай, старшынёй сельсавета. Цікава расказвала. Людзей прыйшло многа, не было дзе сесці.

— Вось хутка пабудуем свой клуб, — заўважыў Якаў. — Гарадскі. А гэта — што за клуб! Для адной МТС некалі будаваўся.

— Пра нашу маму яна ўспамінала, — нахіліўшыся ніжэй над сталом, сказала Надзя. — Я ледзь не заплакала.

— Павел Іванавіч выступаў? — пацікавіўся Якаў.

— Выступаў, — зноў так зашаптала Надзя, што лепш ужо голасам гаманіць, чым гэтак шаптаць. — Таксама ўспамінаў пра вайну, а потым доўга расказваў, які будзе наш горад і як тут усё зменіцца, калі хімічны камбінат пачне даваць мінералы. Сапраўды — пясок усюды, а пад ім — скарбы цэлыя.

Якаў устаў з-за стала, ціха ступаючы па даматканаму палавічку, прайшоўся да парога, потым назад. Позна ўжо было, пара б і спаць класціся, але нейкая трывога на душы не давала спакою, адганяла сон. Цэлы дзень сёння чамусьці ўспамінаўся канторскі «Масквічок», і падчас находзілі моманты, калі цяперашняя трохтонка крыху нагадвала яго. Увесь час вынырала аднекуль глухая, падсвядомая нездаволенасць то работай, то сустрэчай з кладаўшчыком, то яшчэ чым-небудзь.

— Шкадую, што спазніўся, — ціха пачаў Якаў, калі Надзя стала рыхтаваць яму пасцель на шырокай дашчанай канапе. — Паслухаў бы, што там гаварылі. Люблю слухаць пра мінулае, успамінасцца тады ўсё партызанскае, кожную гадзіну смерць на пяты наступала, а было неяк весела, настрою ніколі не псаваўся.

— Ну, а цяпер чаго ты? — уважліва паглядзеўшы на брата, спытала Надзя. — У цябе ёсць работа, цябе тут паважаюць. Чаго ж яшчэ хацець, не так даўно прыехаўшы?

— Сам не ведаю, чаго хачу, — працягваў Якаў, — але адчуваю, быццам нешта гняце мяне, не дае парадавацца той работай, што зрабіў, або той, што яшчэ буду рабіць. Часта мне здаецца, што раблю не тое, што трэба, або не гэтак, як трэба. І жыву быццам бы не гэтак...

— Сумуеш ты, Яша, — спагадліва прамовіла Надзя, сеўшы на краёк той канапы, на якой толькі што паслала пасцель. — Па ёй сумуеш, і сам, магчыма, не разумееш гэтага.

Якаў змоўк. Ён сапраўды не мог бы ад душы сказаць, сумуе па Зоні ці не. Успамінаецца яна часта, бывае, што доўга стаіць перад вачыма. Але ж амаль заўсёды побач з ёю з'яўляецца Марыя Нілаўна са сваім цяжкім апошнім словам, сямікласнік Ванька з даверлівымі трывожнымі вачыма і нарэшце — зялёны Наташын домік з усім тым, што там было. Іншы раз гэты домік паўстае не ў зеляніне, не ў квецені паўзучага гарошку, а ў полымі. Домік гарыць, а Якаў уяўляе сябе непадалёку і пачынае думаць: трэба тушыць гэтае полымя ці не трэба?..

— Не, не ў гэтым прычына! — быццам бы і зусім рашуча гаворыць Якаў, а Надзя шчыра глядзіць на яго, і на яе свежых таўставаценькіх вуснах зайчыкам бегае ўсмешка. — Не толькі ў гэтым! — папраўляецца Якаў, заўважыўшы недавер'е сястры. — У мяне вось і з работай усё неяк неўпапад. Хочаш як найлепш, робіш, як тваё сумленне падказвае, а радасці мала, таму што ўсё роўна каму-небудзь не дагодзіш. Учора з гэтым хлопчыкам...

— Шымеціха проста не ведае, як аддзякаваць табе за Віцьку, — з запалам прамовіла Надзя. — Кажа, колькі жыцьме, то ўсё будзе памятаць цябе, і сыну накажа, каб памятаў.

— Яна вось так, — Якаў спыніўся каля сястры і таксама прысеў на канапу. — А муж яе, кладаўшчык з першай пляцоўкі?!. Пытаюся сёння, як здароўе яго сына, а ён

як сыпане мне цэлую кучу абвінавачанняў! Быццам я наўмысля ўзяў ды грымнуўся ў адхон, каб накрышыць лісты!

— Я вельмі мала ведаю гэтага чалавека, — разважліва сказала Надзя. — Чула ад цёткі Настулі, што раней ён працаваў тут, у МТС, таксама кладаўшчыком і лічыўся вельмі добрым работнікам. Гавораць таксама пра яго і тое, што некалі нейкі п'янчуга адкусіў яму кончык носа. Бачыў? У яго і цяпер відзён гэты рубчык.

— Чорт яго бачыў! — махнуў рукою Якаў. — Не вельмі я прыглядаўся да яго носа.

— Дык вось,— працягвала Надзя.— На гэтага п'яніцу Шымет падаў у суд. А потым п'яніца прыйшоў да яго на кватэру, прынёс чатырыста рублёў, і кладаўшчык усё дараваў яму, скасаваў справу ў судзе.

— Прадаў, значыцца, свой нос!

— Ну, вось так гавораць.

— Тут цяжка мне, новаму чалавеку, разабрацца,— яшчэ з большай задумлівасцю сказаў Якаў.— Можа потым, як пажыву, больш спазнаю людзей...

— А ты смялейшы будзь! — са шчырай непасрэднасцю перабіла яго Надзя.— От і ў нас у калгасе ёсць такі брыгадзір — Кашкін. Як нап'ецца, дык прыходзіць на поле ў звяно і крычыць, лаецца, па чым свет стаіць. Усё яму не гэтак, усё хочацца пераіначыць, перарабіць па-свойму. А мы на яго як рынемся гуртам, дык ён назад-назад, а потым — дай божа ногі! Толькі і бачылі яго на полі!.. Табе проста стражэйшым трэба быць і, можа, трохі больш верыць у самога сябе, у сваю работу. Ты не гневайся, што я, маладшая, ды вось надумалася раіць табе.

— Чаго ж тут гневацца? — згадзіўся Якаў.— Ты лепш ведаеш тут усё, і добра, што шчыра гаворыш. От яшчэ Павел Іванавіч у мяне... Каб не вы ўдваіх, то, можа, і наогул цяжка было б мне тут прыжыцца.

## НАДЗЯ, КАГО ТЫ ЛЮБІШ?..

Прыгожая цяпер дабрасельская вуліца. А ўвосень было гразкавата, бо не прывыкла вуліца да такіх цяжкіх гумавых колаў, да шырокіх уедлівых гусеніц. Выйдзеш часам увечары з двара, абапрэшся на вароты і думаеш, як жа тут пераісці на другі бок у чаравіках, як дабрацца хаця б да клуба? Некаторыя жанкі дык цэлую восень і не

пераходзілі вуліцы. Стаіць адна ў сваім двары, другая, насупраць, у сваім, і перакідваюцца слоўцамі так, што аж на будаўніцтве чуваць.

Толькі моладзь, як мясцовая, так і прыезджая, не зважала ні на што. Веласіпеды лёталі па вечарах сюды-туды адзін за адным. І без ліхтароў падчас, і без асаблівага выбару дарогі. На сядле — веласіпедыст, а на раме яшчэ веласіпедыстка. Ніхто ні разу ў гразь не пляснуўся, ніхто не пераносіў свой самакат цераз лужыну ў руках.

Цяпер, пры марозіку, усё тут сцвярдзела, зраўнялася, затым яшчэ сняжку нядаўна падсыпала, дык ужо, ідучы, можаш падумаць, што сапраўдны брук у цябе пад нагамі або нават асфальт. Той самы ліхтар каля майстэрні, хоць і далекавата стаіць, хоць толькі адзін пакуль што, але многа хараства падае вуліцы. А ў вокнах жа таксама электрычны бляск. Іней на платах і на дрэвах так і пераліваецца, так і іскрыцца ад гэтага бляску.

Але ж хіба дагодзіш кожнаму? Якаў аднаго разу стаяў каля свайго двара, калі вяртаўся з работы Васіль Тумаш. Было ўжо нярана, а стары бурчаў некаму, што яму цёмна, як у мяшку, не відно, куды ступаць. І ведаў Якаў, што каму-каму, а Паўлу Іванавічу, які часова кватаруе ў Тумаша, наўрад ці давядзецца сёння спакойна адпачываць. Стары паддасць яму крытыкі, выкладзе нямала сваіх патрабаванняў.

А ці даўно гэты ж самы «крытык» спакойна і звычна мераў гразь на сваёй вуліцы, ды яшчэ, часам, у лапцях, бо хоць і былі ў яго сякія-такія боты, але добрым, з парапага клёну лапцям часта аддавалася перавага.

Пасля Тумашовага гаманку Якаў пачуў у канцы вуліцы спачатку дзявочы смех, а потым і хлапечы стрыманы голас. Здалёку нельга было разабраць, чый гэта голас, тым больш, што ён перабіваўся і іншымі галасамі, аднак Якаў здагадваўся, што гэта Валянцін Палянскі са сваімі шахтбудаўцамі ідзе ў клуб.

Апошнія некалькі дзён Якаў абслугоўваў участак шахтбуда: падвозіў туды цэглу, некаторыя дэталі пад'ёмнай тэхнікі, цэмент. Пакуль згружалася машына, пазіраў за работай. Каля буравых вышак стаялі спецыялісты высокай рукі, і Якаў не вельмі прылягаў да іх. А тыя дзяўчаты і хлопцы, з якімі быў Валянцін, рабілі пакуль што зусім простую справу — бетаніравалі фундаменты пад халодныя ўстаноўкі. Пры дапамозе гэтых установак наз-

ней будзе замарожвацца грунт для праходкі ствалоў. І вось, як толькі падыдзе Валянцін да якой-небудзь купкі дзяўчат або хлопцаў, адразу там узнімаецца вясёлы смех. Здаецца, нічога і не кажа хлопец, проста возьме часам рыдлёўку і капае, а ва ўсіх адразу мяняецца настрой, кожнаму хочацца засмяяцца або сказаць што-небудзь пацешнае. Скажа хто трапнае слова — Валянцін прыложыць, і пайшоў гуляць вясёлы жарцік па ўсёй брыгадзе. Дакочваецца падчас і да Якава. Раз дакаціўся, другі — Якаў толькі вачамі трошкі ўсміхаўся. А потым пацягнула і яго да гэтых прывабных рознарабочых з вясёлымі характарамі. Стаў ён цікавіцца, што гэта за людзі. Былі там некаторыя з тутэйшых, нават з Дабрасельцаў было некалькі дзяўчат. Але Якаў спачатку нікога не пазнаваў, бо не пазнавалі і яго.

Тут не так важна было тое, адкуль гэтыя людзі, як многае іншае. Працавала моладзь і на іншых участках, добра працавала — Якаў бачыў гэта. Але там не адчувалася таго, што адчуваецца тут. Не ўсё можна выказаць словамі. Ніхто не здолеў бы, вядома, сфармуляваць гэта ў загадзе або ў якім-небудзь цыркуляры. Тут неяк інакш рабілі, як у іншых месцах, інакш спявалі, інакш смяяліся. Магчыма, што ўсё гэта толькі здавалася, а можа, каларыт гэты быў проста мясцовы? Бывае ж так, што дзве вёскі стаяць побач, а людзі жывуць не аднолькава і нават гавораць па-рознаму, хоць і на адной мове.

Цяжка было ўсё гэта вызначыць Якаву, але адна акалічнасць вельмі кранула яго і здзівіла, калі даведаўся пра яе. У абедзвюх брыгадах, што працавалі пад началам Валянціна, толькі адна ці дзве дзяўчыны былі пасля сямігодак і вучыліся цяпер у вячэрняй школе. Астатнія ж усе: і дзяўчаты і хлопцы — мелі сярэднюю адукацыю. Большасць з іх былі завочнікамі вышэйшых навучальных устаноў. Што ж датычыць самога Валянціна, то ён прыехаў на будаўніцтва пасля заканчэння політэхнічнага інстытута. Дыплом у яго з адзнакай выдатніка — па адукацыі ён мог заняць на будаўніцтве немалую інжынерскую пасаду. Яму і прапаноўвалася такая пасада, але хлопец адмовіўся ад яе і пайшоў на пляцоўку майстрам. Тут далі яму дзве брыгады рознарабочых. Што ні дзень, то ўсё іншую работу даводзіцца выконваць: то капаць, то цэментаваць, то цэглаю катлаваны выкладваць. Валянцін і сам робіць разам з усімі, не пахаджвае, за-

клаўшы рукі за спіну, як часам некаторыя здаравілы-дзесятнікі на рамонце шашы.

У першыя дні Якаў нават не ведаў, што Валянцін тут за старшага. Ён прыкмячаў яго толькі па смеху сярод дзяўчат. А потым, калі аб усім даведаўся, стаў лавіць сябе на тым, што крыху зайздросціць гэтаму хлопцу. Інжынер, а бярэ ў рукі рыдлёўку і капае разам з усімі. Ад таго, што накапае з месяц ці больш, паходзіць, як кажуць, у радавых, годнасць яго не ўпадзе, затое кіраўнік з яго будзе потым сапраўдны. Міжвольна ўспомнілася, што некалі вось гэтак жа, як цяпер за Валянцінам, ён наглядаў за лесапрамгасаўскай прыбіральшчыцай і думаў зусім іначай. Нават ужо і не так даўно, у горадзе пасля арміі, узнікалі думкі зусім не падобныя на цяперашнія. Валянцін, пэўна, шчаслівы і задаволены сваім жыццём, хоць і на работу, і на вечарынку прыходзіць у тым жа паношаным плашчы з паддзёўкай.

І вось цяпер шахтбудаўцы ішлі па дабрасельскай вуліцы. Што бліжэй яны падыходзілі да Настулінага двара, дзе стаяў Якаў, то ўсё выразней чуўся іх бадзёры гоман. Якаў чакаў іх. Сам ён не меў пэўных планаў на сённяшні вечар, а гэтых маладых будаўнікоў, асабліва Валянціна, чаму б не пабачыць, чаму б не прайсціся з імі?

Яшчэ не дайшоўшы да Якава і, можа, нават не заўважыўшы яго, Валянцін прыцішыў крок. Відаць, ён прыпыніўся б тут, калі б і не ўбачыў нікога. А ўгледзеўшы хлопца, нібы нават узрадаваўся, спыніў каля Настулінага двара ўсіх сваіх шахцёраў.

— Пойдзем з намі ў клуб,— звярнуўся ён да Якава.— Там мы табе на рэпетыцыі адну цікавую ролю дамо.

— Якую ж гэта? — усміхнуўся Якаў.

— Калгаснага пастуха. Возьмеш?

Усе гучна засмяяліся.

Не паспеў Якаў прайсці з шахцёрамі і трох двароў, як яго дагнала Надзя.

— Табе ж трэба было да сесіі рыхтавацца,— з дабрадушным смяшком сказаў брат. — Твае падручнікі не заплачуць?

— Вытрымаюць,— без крыўды адказала дзяўчына.— Я хачу іхнюю рэпетыцыю паглядзець.

У клубе ўжо быў Росцік Шыпулька і яшчэ некалькі хлопцаў і дзяўчат з горада. «Гарадскія», як часам тут звалі будаўнікоў з першай пляцоўкі, чакалі шахцёраў. Усе

грамадскія мерапрыемствы былі тут сумесныя, таму што будаўнічыя работы праводзіў усюды адзін і той жа трэст. Вакол Шыпулькі згрудзіліся хлопцы, і там раз-пораз ўспыхваў смех. Скрозь гэты смех чуўся і Росцікаў голас, але чамусьці занадта ўзнёслы, са смяшлівымі хрыпінкамі.

— Ну, што гэта за спектаклі цяпер? — пытаў Шыпулька, паглядваючы цераз галовы хлопцаў на Валянціна, які толькі што ўвайшоў.— Усё пра кароў ды пра надоі. Спектакль павінен быць вясёлы, смешны, і каб там артысты былі смешныя, вось, скажам, як я. Праўда?

— Вядома, праўда! — падтаквалі хлопцы.— Ты — добры артыст. Асабліва калі пад чаркаю...

— Я і пад чаркаю і без чаркі магу! — падхапіў Шыпулька.— Некалі ў школе я папа іграў. Хочаце, зараз прадстаўлю вам сапраўднага бацюшку.

— Цікава,— падхапіў нехта з хлопцаў.— Ніколі я не бачыў такога даўгавязага папа.

— Ну, вось зараз пабачыш.

Шырока развёўшы не зусім паслухмяныя ад хмелю рукі, загадчык гаража выйшаў з хлапцоўскага круга і шыбануў проста на заслону. Каля сцэны трохі хістануўся, ставячы доўгую нагу на падмостак, але зноў памаглі рукі: імі ён прыдаваў сабе раўнавагу, як падбітая птушка крыламі. У заслоне трохі заблытаўся, спароў з галавы вушанку, разблытваючыся, потым наступіў на яе і ледзь не бразнуўся са сцэны.

— Зараз я пакажу вам, як папы хрысцяць дзяцей! — урачыста абвясціў Шыпулька.— Наўрад ці вы калі бачылі гэта. Надзя, ідзі сюды! Будзеш у мяне за куму! А ты, Якаў,— за кума! Падайце мне вось гэтую чырвоную трыбуну — будзе служыць амвонам. Заслона-а! — расцяжна закрычаў няпрошаны артыст і на ўсю шырыню расставіў ногі і развёў рукі.

Даўгалэпага хрысціцеля, з прычыны яго залішняй ахмялеласці, хлопцы звялі са сцэны. Пакуль яны там рыхталіся да рэпетыцыі, а потым рэпетыравалі, Шыпулька супакоена сядзеў у кутку побач з Надзяй і крыўдліва бубніў:

— Ну, чаму ты не пайшла да мяне на сцэну? Чаму? Ці табе цяжка было пабыць некалькі хвілін кумою? Ты ж вясёлая, сама любіш жарты і пацехі.

— Таму, што з п'яным папом дзяцей не хрысцяць,— смеючыся, адказала Надзя.— А ты сёння п'яны.

— Які ж я п'яны? — не згаджаўся Шыпулька. Выпіў адзін сучок, дык што? Зарабляю, то магу і выпіць. Хіба аблаяў каго ці зрабіў што дрэннае? Я, можа, гэтую настаноўку для таго і выдумаў, каб ты падышла да мяне.

— Я не артыстка,— стрымана заўважыла Надзя.— На сцэне выступаць не ўмею.

— Ага, не ўмееш,— вёў сваё загадчык гаража.— Скажы проста, што не хочаш са мною сустракацца, туляешся ад мяне. Даўно бачу. Няхай вось ён толькі пальцам кіўне, дык і пабяжыш.

— Хто гэта ён?

— Ды вунь! — Шыпулька паказаў на сцэну, дзе Валянцін расстаўляў артыстаў.— Ты дзеля яго і сюды прыйшла. Я ж прасіў цябе ўчора пабыць сёння вечар са мною, напрошваўся прыйсці. Дык ты сказала, што нейкі рэферат будзеш пісаць. А вось жа...

— Напісала і прыйшла,— ціха сказала дзяўчына.— А што, можа, мне трэба было ў цябе папытацца, ісці ў клуб ці не ісці?

— Не, ты мне ўсё-такі скажы,— намагаўся Шыпулька.— Прызнайся, а то я збягу з гэтага будаўніцтва: каго ты любіш?

— Нікога,— яшчэ цішэй сказала Надзя.

— Не, я папраўдзе, слухай!

— І я папраўдзе. Якава свайго люблю, а больш нікога.

Якаў тым часам наглядаў за рэпетыцыяй, і ў асобныя момманты яму здавалася, што перад ім сапраўдныя артысты, а не шахтбудаўцы, вельмі цікавы спектакль, а не рэпетыцыя. Ва ўсіх удзельнікаў былі ў руках сшыткі з адпаведным тэкстам, але яны мала і заглядвалі ў гэтыя сшыткі. Калі дзе хто крыху запінаўся, Валянцін адразу падказваў. Сваю ж ролю ён вёў зусім па памяці.

«Калі ён усё гэта вызубрыў?» — падумаў Якаў, а праз некаторы час задаў гэтае ж пытанне аднаму шахтбудаўцу, што сядзеў побач.

— А ён і не зубрыў,— з павагаї да свайго майстра адказаў той.— Памяць у яго такая, што два разы прачытае і помніць. От бачыш жа: ён тут і суфлёр, і рэжысёр, і галоўны артыст. Зубрачы, гэтага не зробіш.

«А як бы я іграў таго самага пастуха, што ён мне прапаноўваў?» — нечакана ўзнікла ў Якава пытанне. Ён паспрабаваў уявіць сябе на сцэне, побач з гэтымі артыстамі ды артысткамі перад вачыма многіх людзей. Ці

здолеў бы ён што-небудзь сказаць у такіх умовах, ці трымалася б у памяці тое, што трэба? Наўрад. Хутчэй за ўсё — павыскоквалі б з галавы патрэбныя словы і лыпаў бы тады вачыма, намагаючыся ўлавіць Валянцінаву падказку.

— А пастух тут ёсць, у гэтым спектаклі? — зноў звярнуўся Якаў да свайго суседа.

— Ёсць,— адказаў хлопец.— Хутка наявіцца.

— Хто ж яго тут іграе?

— Ды ўсё ён пакуль што, Валянцін. Сумяшчае.

Якаў нічога не сказаў на гэта, хоць неяк падсвядома адзначыў для сябе гэтае быццам бы недарэчнае тут слова «сумяшчае». У спектаклі, мабыць, усё можна сумяшчаць.

«А слоў многа там?» — хацеў яшчэ спытаць у суседа, але, падумаўшы, вырашыў, што не варта больш пытацца пра спектакль, бо ўсё роўна гэтая ношка не на яго плячах.

Пасядзеўшы яшчэ з паўгадзіны, ён выйшаў з клуба, каб не раздражняць сваю душу. Пайшоў ціха па вуліцы. Надзя асталася, ну, няхай сабе астаецца. Сядзіць з Росцікам, а выскачыла на голас Валянціна.

Каторы ж ёй бліжэйшы?..

## «НОЧКА ЦЁМНА ДЫ НЯВІДНАЯ...»

Не, зусім не гэтая ночка. Гэтая ноч, ці, лепш сказаць, позні вечар, быў нават залішне светлы. Можа дзе там у лесе, каля рэчкі, было і цямней, а тут, проста над самымі Дабрасельцамі, з лагоднай усмешкай плыў вясёлы поўнік, высозныя ліхтары шахтбуда гарэлі неяк асабліва ярка, і гарадок ззяў нібы перад якой урачыстасцю. Пад нагамі ў Якава прыемна і свежа парыпваў снег, нязлосны, без ветру марозік гулліва пашчыпваў вушы, трошкі сціскаў шчокі. Для чыіх шчок і вушэй гэта, можа, і немалы марозік, а для Якава — амаль зусім непрыкметны, бо ў апошнія часы рэдка выпадаў той дзень, каб не быць у наездцы, ды яшчэ ў далёкай, з познім вяртаннем.

Якаў радаваўся свайму вольнаму вечару, было жаданне як мага лепш выкарыстаць яго. І, можа, таму вечар мог прайсці якраз не надта добра. На рэпетыцыі не ўсядзелася, і тут доўга не находзіш адзін: вуліца хоць і светлая, але бадай-што пустая ў гэты час.

...Нечыя крокі зашуршалі непадалёку. Якаў заўважыў постаць, але не на вуліцы, а на той палавіне агародаў, што ледзь не даходзілі да гарадка. Нехта ішоў з будаўнічай пляцоўкі агародамі дадому. «Няхай сабе ідзе: ці мала рабочых жыве ў Дабрасельцах?» Падышоўшы бліжэй, пазнаў Вінцэся Шымета, і яшчэ менш надаў гэтаму значэння: кладаўшчыку найбольш работы на пляцоўцы, ён можа вяртацца і зусім позна.

...У канцы вёскі, там, дзе не так даўно раскатваўся вясёлы смех шахтбудаўцаў, пачуліся таксама галасы, але стрыманыя і з перапынкамі. Відаць, людзі спяшаліся дадому і на хаду перакідваліся толькі найбольш неабходнымі словамі. Ці не паглядзець, што гэта за людзі?..

Сярод іх быў Павел Іванавіч. Убачыўшы Якава, ён прыадстаў ад сваіх спадарожнікаў, павітаўся з хлопцам за руку.

— Куды ты, на ноч гледзячы? — добразычліва спытаў і пачаў даставаць з кішэні папяросы.

— Нікуды,— адказаў Якаў.— Так сабе праходжваюся. Толькі што на рэпетыцыі быў у клубе.

— Ну і як там у іх? Выходзіць трохі?

— Па-мойму, добра выходзіць,— пахваліў Якаў.— Гэты самы Валянцін — проста артыст. Усё ў яго так гладка...

— Ён не толькі артыст,— падхапіў Павел Іванавіч,— ён наогул добры культработнік. Але шкада адрываць хлопца ад спецыяльнасці.

— Справіцца па сумяшчэнню,— заўважыў Якаў і ўспомніў, што нядаўна чуў гэтае слова.— Што гэта за людзі былі з вамі? — пацікавіўся Якаў, калі яны, не спяшаючыся, пайшлі ўздоўж вуліцы.

— А гэта вячэрнікі,— неяк залішне хутка, нібы здзівіўшыся пытанню, адказаў Павел Іванавіч.— Тут частка з калгаса, а большасць нашы, будаўнікі. Хіба ты нікога не пазнаў?

— Я неяк не звярнуў увагі,— прызнаўся Якаў.— Ішоў, думаў пра сёе-тое, пасля ўбачыў вас.

— Гэта нашы вячэрнікі,— паўтарыў Павел Іванавіч,— народ, варты таго, каб іх заўважаць і паважаць. От яны цэлы дзень працавалі, а ўвечары — на занятках. Гэта сёння яшчэ рана пайшлі дадому — аднаго ўрока не было. А то кожны раз — амаль да дзвюх гадзін ночы. Ды не які-не-

будзь вечар у тыдзень, а чатыры вечары. Некаторым яшчэ ісці кіламетраў за пяць. І ходзяць. Тут розныя людзі і па ўзросту, і па рабоце. Некаторыя брыгадзіры вучацца, а то — работнікі райкома партыі. Ён некалі скончыў партыйную школу, а дакументаў за дзесяцігодку не мае.

— З шафёраў, мабыць, ніхто не вучыцца? — спытаў Якаў і чамусьці ўздыхнуў, быццам даўно быў упэўнены, што інакай і быць не можа.

— Вучыцца адзін,— нечакана адказаў Павел Іванавіч.— Праўда, ён на машынапракатнай станцыі, там трохі лягчэй планавацца з часам. Але ходзіць хлопец у дзевяты клас. Ды што я кажу: хлопец. Сямейны чалавек ужо: жонка і двое дзяцей. Вучыцца найлепш і, наколькі мне вядома, не прапусціў яшчэ ніводных заняткаў.

— А восьмага класа там, мабыць, няма?

— Ёсць восьмы.— Павел Іванавіч збавіў крок і павярнуўся да Якава.— Але давай будзем бліжэй да справы. Я адчуваю, што цябе непакоіць, не адзін раз і сам пра гэта думаў. Ты хочаш вучыцца, праўда?

— Мне вельмі трэба вучыцца,— пацвердзіў Якаў,— але як гэта зрабіць, як спланавацца пры маёй рабоце? Пачытаць што-небудзь я мог бы іншы раз і ў дарозе: бывае, што сядзіш некалькі гадзін ля машыны, пакуль прыйдзе чарга грузіцца. А вось як хадзіць на заняткі? Прыязджаю амаль кожны дзень позна. Наогул, графік маёй работы нейкі не ўладжаны.

— Гэта трэба ўладзіць,— упэўнена сказаў Павел Іванавіч.— Я пагавару з начальнікам работ. Вымеркуем так, што ў дні заняткаў у цябе будуць меншыя рэйсы. Пагавару таксама з дырэктарам школы. Няхай прымуць цябе хоць вольным слухачом пакуль што. Ты ж спазніўся. Канешне, на першых часах нялёгка будзе, але пачнеш вучыцца, уцягнешся, і ўсё стане на сваё месца. А школа тут добрая, настаўніцкі калектыў харошы. Я сам іншы раз заходжу на ўрок, саджуся і слухаю. Нядаўна быў на занятках па гісторыі: вёў урок наш тутэйшы настаўнік, з Дабрасельцаў. Павінен сказаць табе, што ні аднэй лекцыі ў вышэйшай школе я не слухаў з такой цікавасцю.

Якаў ішоў моўчкі, нават ступаць намагаўся ціха. На яго нахлынулі далёкія ўспаміны. Колькі думак было некалі ў малецтве пра школу, пра таго чароўнага настаўніка, які будзе паказваць, як пісаць палачкі. Здавалася, што на свеце няма лепшага і прыгажэйшага чалавека. Нябожчыца

маці кожную восень гаварыла: «Яшчэ годзік пачакай. Яшчэ... А там і пойдзеш ужо, будзеш вучыцца...»

А потым, пасля вядомага ўжо страшнага выпадку, Якаў думаў, што, можа, на працягу ўсяго свайго жыцця не здолее падысці да гэтай школы. Вельмі доўга стаялі ў памяці вокны, пераплеценыя калючым дротам, звілістая сцежка каля акон, па якой і днём і ноччу тупаў узброены вартавы. Нарэшце — вочы матулі ў акне, апошні яе пагляд...

І вось цяпер давядзецца ісці ў гэтую школу, магчыма, нават у той клас, у якім некалі фашысты катавалі маці. І цяжка падумаць пра гэта, і не вучыцца нельга...

— Як жа там умяшчаюцца людзі? — адчуўшы, што Паўла Іванавіча занепакоіла такая задумлівасць, спытаў Якаў.— Класы маленькія, ды і колькі іх там.

— Цеснавата,— згадзіўся парторг.— Гэтая школа для нас — толькі часовы прыпынак.

— І святла няма,— уставіў Якаў.

— Няма і святла,— Павел Іванавіч сказаў гэта з выразнай ноткай абурэння.— Гэта сапраўды чорт ведае што! Куды ні глянь, усё навокал электрычнасцю заліта, а ў школе вячэрнія заняткі праводзяцца пры закураных лямпах. Заўтра думаю ў раёне пагаварыць наконт гэтага.

— Многа яшчэ ўсякіх непаладак у гэтым калгасе,— нібы ўспомніўшы тое, пра што даўно хацелася сказаць, пачаў Якаў.— Вось і Надзя і Антосіха, гаспадыня мая, часта гавораць. Вельмі ж адсталы ён быў раней. Землі тут пясчаныя, неўрадлівыя, ды са старшынямі не шанцавала. Спадчына асталася такая, што цяпер, хоць і стараюцца людзі, а ўсё роўна ёсць промахі і недагляды...

— Рукі яшчэ да ўсяго не даходзяць,— заўважыў Павел Іванавіч.— Я, калі пачынаю думаць пра гэта, дык, па праўдзе сказаць, перш за ўсё віню самога сябе. Няма ў нас добрага суседства з мясцовымі камуністамі, актывам, інтэлігенцыяй. І вы, камсамольцы, трымаеце сябе падчас неяк ганарыста, адасоблена ад вясковай моладзі. Помню, на саракагоддзе камсамола: сабраліся ў клуб, паставілі кантралёраў пры ўваходзе, а тутэйшым камсамольцам, нават настаўнікам, ніводнага білета не паслалі.

— Я таксама не трапіў на той вечар,— сказаў Якаў.— Тады чамусьці толькі адзін актыў пускалі.

— Ну вось. Тады актыў, другі раз — пасіў, а то проста збяруцца, танцуюць, а вясковыя хлопцы і дзяўчаты па

надвокашно тулянюцца... Да чаго я гэта гавару,— працягваў Павел Іванавіч.— Нам трэба працаваць у большым кантакце: калгаснікам з намі, а нам з імі. Тады лягчэй будзе пераадольваць усё цяжкае. Вось пра школу мы гаварылі. Пакуль што, вядома, трэба зрабіць усё для таго, каб тут і будаўнікі вучыліся. А потым адкрыецца ў нас свая сярэдняя школа. І не толькі школа. Будзе ў нас столькі розных курсаў і вучылішчаў, што і тутэйшыя і самыя далёкія прыйдуць сюды вучыцца. Мне заўсёды радасна за вас, маладых, і падчас робіцца крыху сумна, калі надумаю аб сабе, аб маім пакаленні. Мы і ў маладосці і ў сталасці, на жаль, не мелі такіх шырокіх магчымасцей для вучобы, для росту. То войны, то цяжкасці ўзнаўлення. Іншы раз так хочацца скінуць з сябе хоць гадкоў дваццаць ды ўліцца ў вашу бурлівую шарэнгу...

Параўняўшыся з Настуліным дваром, Павел Іванавіч па-сяброўску развітаўся з Якавам і трошкі больш жвавым крокам пайшоў у напрамку свае кватэры. Якаў ведаў, што ён яшчэ не пойдзе на кватэру, а спачатку завітае ў клуб, пацікавіцца, як прайшла рэпетыцыя, што камсамольцы плануюць на заўтра. Там, у клубе, можа трапіцца пад руку яшчэ якая-небудзь важная справа, і Павел Іванавіч забудзе, што яму таксама трэба адпачыць. Можа, якія хлопцы прыехалі на работу і ім няма дзе пераначаваць? Павел Іванавіч пойдзе па хатах, самымі ласкавымі словамі будзе ўпрошваць гаспадынь прытуліць будаўнікоў. Не ўпросіць, дык аддасць сваю маленькую бакоўку, а сам зноў пойдзе да каго-небудзь у падсуседзі. Ёсць дзеці ў чалавека, ёсць жонка. Сумуе Павел Іванавіч па іх, часам пакутуе ў адзіноце, але нікога сюды пакуль што не бярэ — кожны метр жылплошчы вельмі патрэбны будаўнікам...

Надзі яшчэ не было дома, Якаў паслаўся на сваёй канапцы і лёг. Заўтра яму трэба было рана ўставаць, аднак сон чамусьці не адольваў. Быў бы час у Паўла Іванавіча, дык пагаварыць бы з ім яшчэ. Неяк адразу святлей усюды робіцца, калі пагаворыш з гэтым чалавекам, меней потым апаноўваюць розныя супярэчлівыя думкі. Ходзіць чалавек — гаспадар па сваёй зямлі, і поступ яго такі прываблівы, што хочацца, узмахваючы рукамі, крочыць за ім. І, пэўна, успамінаецца гэтаму чалавеку, як па гэтай жа зямлі, вось тут, каля Дабрасельцаў, была праліта яго кроў у цяжкай барацьбе з фашысцкімі паганцамі. Тады Якаву

ўдалося першаму падпаўзці да яго, жгутом са свае кашулі пераціснуць нагу вышэй раны...

Якая ўчора была відная ноч, такая сёння цёмная. Снег валіць такі, што фарамі прабіць нельга. Якаў адчувае, што машына ідзе ўсё цяжэй і цяжэй. Мякка і слізка робіцца пад коламі, ды ў кузаў, мабыць, навалiла цэлыя тоны. А ў кузаве, пад брызентам — аконнае шкло ў цалёвачных скрынках. Пры вялікім ціску зверху ды пры хуткай неасцярожнай яздзе можна толькі аскабалкі прывезці на будаўніцтва.

Якаў трымае зусім малую хуткасць. Матор раздражнёна бурчыць, зрываецца на скрыгаценне, а шафёр не можа даць яму палёгкі нават і з горкі, бо вельмі мала бачыць перад сабою, усяго толькі на якія два-тры крокі.

«Ночка цёмна ды нявідная...» Даўно-даўно была пачута гэтая песня, яшчэ, мабыць, ад маці, а можа, ад бабулькі. А цяпер чамусьці ўспомнілася яна. Можа, гэта сумны і часамі нават жалобны гул матора нагнаў яе? А можа, цемра і непагадзь такая, што за ўсё жыццё падобнай не прыпомніш? Ехаць яшчэ далёка, і час не ранні. Трэба збіраць у адно ўсе свае сілы, каб не падвялі вочы, не самлелі рукі, а даўняя невясёлая песенька лезе ў галаву, і ніякай рады не дасі. Няхай бы які-небудзь марш, якая-небудзь «Лявоніха», а то старасвецкая сумная песня...

...Наперадзе мост, той самы недароблены мост, у які аднаго разу хацелася сапхнуць «Масквіча». Цяжка нават вызначыць, хутка будзе гэты мост ці яшчэ няхутка? Асцярожнасць патрэбна яшчэ большая. Калі ж гэта прыедзеш дадому? Вось табе і першы палёгачны рэйс, вось табе і першы дзень вячэрніх заняткаў...

Як ні рана Якаў сёння ўстаў, Павел Іванавіч усё роўна апярэдзіў яго. Ля гаража ён сеў побач у кабіну і, пакуль яны ехалі да канторы начальніка работ, паведаміў, што пабываў ужо на кватэры дырэктара школы і дамовіўся наконт вучобы. Сёння Якаў павінен быў вярнуцца дадому да васьмі гадзін вечара і пайсці ў школу. Рэйс далі нецяжкі, усё належным чынам спланавалі. Толькі бюракратаў не ўлічылі, якія затрымалі Якава на базе, ды не прадбачылі страшэннага снегападу. Выязджаючы з горада, Якаў думаў, што хоць гадзін у дзесяць прыедзе дадому і паспее яшчэ на якія два-тры ўрокі, а цяпер усё паказвала на тое, што і да поўначы не прыграбецца да месца.

Хаця б груз завезці цэлым...

Змрочная і нават дзіўная пустата на шашы. Няма стрэчных машын, ніхто не нагапяе, не абганяе. Няўжо сённяшнія шафёры былі такія разумныя, што не паехалі ў гэтакую непагадзь, пяўжо ўсім можна было не ехаць? Хаця б лягкач які паказаўся: газік з двайною цягаю ці дарожная цыбатая «Пабеда». Ёсць жа такія начальнікі, што не захочуць начаваць не дома.

Вось, пэўна, ужо і масток. Якаў спыніў машыну, каб лепш прыглядзецца, узяць правільную арыентацыю. Масток замошчаны для праезду толькі напалавіну, гэтая палавіна вузкая. Калі трохі збочыш, то трапіш на занесеныя снегам брусы і можаш саслізнуцца ў рэчку. Магутныя фары новай трохтонкі крыху варушылі густую снежную завесу толькі спераду, а па баках нічога нельга было ўбачыць, нічога нельга было разабраць. Якаў выйшаў з кабіны, паспрабаваў прайсці некалькі крокаў уперад, выявіць знаёмыя прыкметы перад мастком на адхонах. Тут ужо даўно валяліся цэментавыя слупы, каменне. Цяпер усё гэта было занесена снегам, але ўсё ж такі Якаў намацаў іх нагою. Вярнуўшыся, убачыў, што на кузаве такі велізарны каптур, нібы цэлую снежную гару нехта ўзваліў на машыну. Было відно, што калі яшчэ так праехаць, то не толькі шкло не вытрымае, а і рысоры наўрад ці астануцца цэлыя.

Якаў дастаў з-пад сядзення рыдлёўку і, стаўшы на падножку, пачаў скідаць з кузава снег, а мокрыя снежныя камы зверху проста асядалі на яго шыі, прыкрытай сёння стракатым шалікам (Надзя прымусіла ўзяць гэты шалік), на плячах, на ўсё яшчэ летняй вайсковай шапцы. Цёплая сцёганка, таксама яшчэ з вайсковага камплекту, была ўжо ўся белая, канцы рукавоў пачыналі макрэць.

«Ці памятае хто, каб валіў тут, у нас, гэтакі снег?!» — думаў Якаў, старанна ўзмахваючы рыдлёўкай.

Выбраўшы ў снежнай гары яму, ён залез у кузаў і стаў спіхваць снег цэлымі глыбамі. Хутка ўбачыў на дарозе далёкія водбліскі фараў — нехта ехаў з горада. Адразу стала весялей: шафёр у цяжкай дарозе — брат родны. Святло набліжалася і ярчэла даволі хутка, але раптам згасла. Якаў крыкнуў і замахаў рыдлёўкай. Ён нават забыўся, што цяпер нікому нічога не відно.

Святло не паяўлялася. «Можа, што здарылася з чалавекам ці з машынай?» — падумаў хлопец, але потым рашыў,

што ў такім выпадку шафёр падаў бы голас. Тут ужо можна пачуць голас, адлегласць невялікая. Значыць, не хоча вадзіцель над'язджаць бліжэй — убачыў чырвоны сігнал і спыніўся. Ну, калі так, то няхай стаіць, ёлуп.

Якаў згроб з кузава снежны каптур, абтросся збольшага сам і сеў за руль. Памаленьку пераехаў масток, потым крыху больш націснуў на газ. Здалося, што машына пайшла трошкі лягчэй: некалькі кіламетраў можна праехаць, а там зноў прыйдзецца ваявань са снегам.

За сабою Якаў нічога не бачыў. Люстра яго ўвесь час залеплівалася снегам, а высоўвацца з кабіны было і нязручна і рызыкоўна. Машына ж за мостам не выходзіла з памяці. Праехаўшы яшчэ крыху, ён усё ж такі ўзяўся трохі ўбок і затармазіў. Вылазіць не хацелася, бо і так былі мокрыя каўнер, шапка, рукавы. Заглушыўшы матор, адкрыў кабіну і пачаў прыслухоўвацца, ці не чутно на дарозе гулу. Не пачуўшы, высунуўся, паглядзеў назад: святла таксама не відно было. І толькі працягнуў руку да ключыка замка, як ля вуха быццам хлестануўся нейкі абрывак не то крыку, не то моцнага стогну. Зноў прыслухаўся, ужо насцярожана, трывожна. Крык паўтарыўся, але вельмі ўжо глуха. Якаў хутка выскачыў з кабіны і пабег да мастка. У занесенай снегам рачулцы ляжала дагары коламі грузавая аўтамашына. Яна яшчэ чарнела, снег не наспеў абяліць яе і згладзіць контуры. Калі Якаў скочыў на раму, пярэдняе кола яшчэ нават круцілася. Па стогну чалавека зразумеў, што той у кабіне. Учапіўшыся рукамі за кола, шуснуўся ў снег. На пічасце, лёд, падмацаваны снегам, трымаў. Захлыпуцца тут нельга было, хоць і праваліўся б лёд, аднак накупацца давялося б і яму, і таму, хто ў кабіне.

— Трымайся, брат! — гукнуў Якаў, пастукаўшы кулаком у зачыненыя дзверцы кабіны.

Потым і рукамі, і нагамі пачаў разграбаць снег, які быў яму ледзь не па вушы.

— Пацярпі, брат, крыху, пацярпі! Ты там адзін?

У кабіне стала зусім ціха: ні адказу, ні стогну. Яшчэ стараннеей узяўся хлопец разграбаць, пашкадаваў, што не прыхапіў з сабою рыдлёўку. Але цяпер ужо не было калі мчацца па яе: дарагой была кожная хвіліна. Можа, займоўся чалавек ад кантузіі і перапалоху, а можа, ён там прыціснуты чым-небудзь і не можа паварушыцца, вымавіць слова?

Снежная яма ля кабіны хутка глыбела і расшыралася. Нарэшце Якаў з усёй сілы налёг на ручку і пацягнуў дзверцы на сябе. Праз шчыліну, якая ўтварылася пасля першага штуршка, дыхнула на яго спіртным перагарам, а потым з кабіны пачала высоўвацца ўскудлачаная галава. Якаў пацягнуў дзверцы яшчэ, схапіў мокрымі, скачанелымі рукамі кудлатую галаву і раптам адхіснуўся, прыняў рукі: галава здалася яму вельмі гарачай і слізкай. Памогшы чалавеку выбрацца з пасткі, Якаў ныркуў у перавернутую кабіну і пачаў шукаць яго шапку, каб накрыць магчыма пашкоджаную галаву. Абмацаў раскіданы інструмент, дамкрат, ледзь не парэзаў рукі аб патрушчаныя пляшкі, а шапкі не знайшоў. Калі зноў павярнуўся да чалавека, той сядзеў ужо ў снезе, як у пярыне. Галава яго адразу стала белая ад верхняга спору. Якаў надзеў яму сваю шапку і ўзяў пад пахі.

— Стаяць можаш? — спытаў ён, прымяркоўваючы, як падсадзіць чалавека на кузаў машыны, а адтуль на мост.

Чалавек не адказаў, аднак крыху выпрастаўся ў нагах і прытуліўся плячом да пярэдняга ската.

Калі яны ішлі ўжо да Яшавай машыны, чалавек раптам выціснуў з сябе хрыпучае і спалоханае:

— Якаў, гэта ты?

Семігон у здзіўленні спыніўся, крыху адхіліў ад сябе чалавека, якога ледзь не валок на плячах, і стаў углядацца ў яго твар. Нічога нельга было разабраць у страшэннай цемры: нейкія вельмі невыразныя абрысы трохі вылучаліся, бо на твары снег раставаў, але нікога знаёмага яны не нагадвалі. Голас таксама нічога не падказваў, таму што наогул ён мала быў падобны на чалавечы.

— Хто ты? — затармашыў Якаў шафёра.— Адкуль ты мяне ведаеш?

Чалавек зноў не адказаў нічога, толькі засоп больш трывожна і цяжэй узваліўся на Яшава плячо. У кабіне ён бездапаможна ўткнуўся тварам у куток між дзверцамі і спінкаю сядзення, сціснуў далонямі заснежаныя скроні і пачаў скуголіць, нібы пакрыўджанае шчанё:

— А масы-ы-на? Дзе мая масы-ына?..

— Машыну тваю заўтра выцягнем,— сказаў Якаў і раптам насцеражыўся. Такое сэканне было яму трохі знаёмае: адзін чалавек заўсёды сэкаў, калі добра напіваўся. Але, можа, тут проста супадзенне нейкае, бо таго чалавека лёгка было б пазнаць.

Якаў уключыў святло. Чалавек яшчэ больш уціснуўся ў куток, хоць у гэтым цяпер ужо не было ніякага сэнсу; відаць, толькі інстынкт самааховы ці сорам прымушалі яго туліцца.

— Ты, Росцік?

Якаў узяў яго за плечы, лёгенька адцягнуў ад дзверцаў.

— Як жа гэта здарылася? Што ў цябе баліць? Можа, перавязаць дзе трэба? Пакажы галаву.

Ён зняў з Шыпулькі сваю шапку і пачаў аглядаць яго кудлы, шыю, вушы. Сінія гузакі відны былі на лбе, падцёкі — ля скроняў, а на самой галаве нічога небяспечнага не заўважалася. Магчыма, валасы закрываюць, у Шыпулькі густыя канапельныя валасы.

Якаў стаў пацiху абмацваць галаву, але Росцік маўчаў, толькі соп, як кавальскі мех, і нібы ўсхліпваў.

— Не баліць тут, тут?

Росцік квола пакруціў галавой.

— А што ў цябе, скажы?

— Плечы вельмі баляць,— ледзь вымавіў Шыпулька,— і ногі.

— Гэта ты выцяўся, як ляцеў з моста. А пералому няма? Дай паглядзім! Сагні нагу, разагні! Цяпер гэтую!

Шыпулька паслухмяна выконваў усё, што загадваў Якаў.

— Хутчэй дадому,— рашуча сказаў Семігон і націснуў на старцёр.— Цябе трэба ў бальніцу.

— А як жа мая машына? — зноў спытаў Шыпулька.— Давай паспрабуем выцягнуць ды возьмем на буксір.

— Ты не бачыш, што на двары? — ужо крыху з раздражненнем спытаў Якаў.— Тут самі можам не даграбціся, а не то што яшчэ з адным грузавіком. Яго і не выцягнеш нашымі сіламі — трактар патрэбен. Што там у цябе ў машыне?

— Ды нічога,— ціха адказаў Шыпулька.— Гэта я ў горад да родзічаў ездзіў. Пазванілі, што там цётка пры смерці, матчына сястра.

— Ну, і як жа яна?

— Ды выжыве, чорт яе не возьме, а вось самому што цяпер рабіць? Гэта ўсё маці мая: паедзь ды паедзь, праведай. Выперла проста.

— А чаму ж і не паехаць? — насцярожана сочачы за дарогай, заўважыў Якаў.— Мог нават сесці са мною.

Пакуль я там чакаў гэтага шкла, ты дваццаць цётак абышоў бы.

— Я спачатку не думаў ехаць, а потым...

— Чаму ты спыніўся перад мостам, калі заўважыў сігналы маёй машыны?

— Бо не хацеў, каб ты мяне бачыў.

— Чаму гэта?

— Транспарт узяў без дазволу,— з пакаяннем у голасе загаварыў Шыпулька.— Не было якраз начальніка. Ды хто б гэта дазволіў браць грузавік для асабістых спраў. Цяпер, вядома, мне не апраўдацца.

— Дык трэба было хоць ужо не ціць,— рэзка папракнуў Якаў.

## БЫВАЕ, ШТО І ГЛУХІ ПАЧУЕ

Пакуль Росцік Шыпулька падлечваў свае бакі і ногі, Якаў нешта каля месяца выконваў абавязкі загадчыка гаража. За гэты час ён уладкаваўся са сваімі вячэрнімі занятками і блізка пазнаёміўся яшчэ з двума харошымі чалавекамі: кавалём дзядзькам Алесем і вартаўніком гаража Талімонам.

Я таксама добра ведаў гэтых людзей, памятаў іх яшчэ са свайго маленства. Талімон шмат год быў у Дабрасельцах пастухом, пасвіў каровы. Слава аб ім ішла далёка, і перш за ўсё — за дзівосны голас. Калі гукне, бывала, на світанні: «Каровы выганяй!», дык не толькі кожная гаспадыня ў Дабрасельцах пачуе, а ў добрую пагодлівую раніцу нават пастухі суседніх пасёлкаў усхопяцца, на бягу працірають вочы. І пачыналася ў іх тады своеасаблівае спаборніцтва, хто мацней гукне. Талімон браў першае слова спаважна і па сярэдняй ноце, а калі пераходзіў на другое, дык падымаўся ўсё вышэй, вышэй і даваў такі прастор свайму голасу, што ён гучным водгуллем разліваўся па ўсёй ваколіцы. Гэта была сапраўдная песня, яна мела нават сваю мелодыю, хоць усе варыяцыі грунтаваліся на адным слове «выганяй». Склады «выы-гаа» гучалі ўраччыста, але спаважна. Яны служылі нібы ўступам да асноўнай мелодыі. А тая патрабавала ўжо толькі апошняга складу «няй», які спачатку пераходзіў у «аа-аа, аа-аа...», а потым — у «го-го, го-го...» і нарэшце завяршалася моцным акордам на складзе «гу». За гэта вясковыя хлапчукі некаторы час звалі дзядзьку Талімона «гусь», але неўзабаве

адступіліся ад гэтай мянушкі. Пастухова песня на золаку была такая прыгожая і так ім падабалася, што ўсе яны стараліся ўставаць як мага раней, каб не прапусціць гэтай песні. Да таго ж яшчэ вялікай радасцю было пабыць у дзядзькі Талімона чарговым надпаскам.

Талімонава мелодыя шанавалася ў Дабрасельцах, яна ж служыла і пэўнай прыкметай дня. Калі пастух спяваў вельмі хораша і голас яго гучаў чыста і звонка, то гэта перш за ўсё азначала, што пачынаўся ясны, пагодлівы дзень. Калі ж голас крыху здаваў і чуліся ў ім хоць маленькія хрыпінкі, то людзі і надвор'я чакалі нядобрага і адразу высвятлялі, у каго Талімон сталаваўся (пастух у Дабрасельцах начаваў і сталаваўся па чарзе ў кожнага, хто меў карову). Кепска Талімон спяваў, значыць, гаспадыня была кепская, дрэнна пакарміла.

Потым сталі людзі заўважаць, што пастух асабліва хораша і весела спявае, калі кватаруе ў светлавокай удавіцы — Тэклі. Гадоў у сорак прыстаў Талімон у прымы, стаў хоць бедным, але гаспадаром, уступіў неўзабаве ў калгас і вось пагадаваў з Тэкляй дзяцей, памог кожнаму з іх выйсці на сваю дарогу.

Калі ж гаварыць пра дзядзьку Алеся, то ён запомніўся мне па іншых цікавых асаблівасцях. Бывала, калі мы, яшчэ падлеткі, вадзілі пасвіць у лес коней, дзядзька Алесь таксама іншы раз адрываўся ад свае кавальскае справы і далучаўся да нас. Пасвіў ён толькі па ранках, бо ўдзень яго ўжо не пускала кузня. І вось дзядзька каваль заўсёды здзіўляў нас тым, што за адну толькі раніцу мог сплесці вялікі кош і пару лапцей. І не то што з гатовага матэрыялу ці з чыёй дапамогай! За гэтую ж раніцу ён упраўляўся надраць з-пад маладога сасняку карэння, абчысціць яго, падрыхтаваць для работы, затым выразаць з ядлоўцу дужкі і спіцы, абстругаць і адпаведна пагнуць іх.

Мы абсядалі дзядзьку Алеся з усіх бакоў і сачылі за спрытам яго рук, уменнем не траціць дарэмна ніводнага руху. У нашых вачах ён быў нейкім чарадзеем. Кожны з нас, для таго каб сплесці невялічкі кошык, па ранках драў і чысціў карэнне, затым, на другіх ранках ці ўдзень, калі выпадала павесці коні, лазіў па ядлоўцавых кустах і шукаў дужак, потым парпарваў іх на агні і гнуў. Часам удавалася добра сагнуць, часам не ўдавалася, але калі за дзве раніцы кош быў пачаты, то гэта лічылася пэўным поспехам. Такі канапас, абвешаны маткамі карэння, спаважна

ехаў праз усю вёску і з гопарам паглядаў на нукатыя рэбры свайго новага каша. Зусім жа гатовы кош ён вёз не раней, як праз два-тры дні. «Што ні тыдзень, то кош»,— казалі пра самых старанных і спрытных канапасаў.

А дзядзька Алесь спраўляўся з усім гэтым менш чым за адну раніцу. Зацягнуўшы зубамі апошні карэньчык ля верхняй спіцы, каваль з усмешкай адкідаў ад сябе гатовы, здавалася, яшчэ гарачы, прыгажун-кош. Мы падхоплівалі яго ледзь не на ляту і аглядвалі, абмацвалі, ці правільна ўсё зроблена, ці няма тут якога тандэту. І яшчэ больш здзіўляліся, калі бачылі, што і змайстравана ўсё найлепш, і па форме дзядзькаў кош не ўступіць ніводнаму нашаму.

Пакуль мы аглядалі навінку, руплівы каваль вастрыў аб гладкі камень свой складаны нож. Гэты нож быў у яго вялікі, з тоўстым драўляным тронкам, каб трымаць было добра, і блішчаў лязом на сонцы, як свежаадбітая каса. Мы і на гэты нож з зайздрасцю паглядвалі, бо кожны з нас ведаў, што дзядзька каваль зрабіў яго сам. А калі сам зрабіў, то, пэўна, няма на свеце больш вострага нажа. Можа, таму і стружа ён так хутка і гладка.

Падвастрыўшы гэты свой цясак, дзядзька Алесь адыходзіў на нейкі час ад гурту і вяртаўся з цэлым бярэмем светла-жоўтай, яшчэ вільготнай ядлоўцавай кары. Тут жа хуценька раўняў яе, абкантоўваў, і пакуль хто-небудзь з нас абвяшчаў: «Коні браць, коні браць!», у яго ўжо была гатова пара лапцей.

Я рад быў, калі даведаўся, што Якаў блізка сышоўся з дзядзькам Алесем і Талімонам. Пра іх у Дабрасельцах ніхто не мог сказаць кепскага слова. Талімон адступіў ад цяжкай работы, таму што наслабеў здароўем, а дзядзька Алесь і цяпер кожны дзень на досвецці прыходзіць у трэстаўскую кузню і пачынае дробненька і рупліва званіць у свае кавадла. Горан у яго ўжо даўно электрычны, механізаваны, а кавадла старое, купленае некалі за ўласныя сродкі.

Вядома, цяпер ужо няма ў дзядзькі Алеся такога незвычайнага спрыту ў рабоце, які быў раней, аднак жа рукі яго ходзяць яшчэ спраўна і ўпэўнена: адчуваецца тая ж дакладнасць, жвавасць у рухах, прафесійны ўклад. Якаў часта заходзіў у кузню ранічкаю, калі дзядзька Алесь быў там яшчэ адзін, садзіўся дзе-небудзь збоку, каб не замі-

нацць, і сачыў за кавальскай работай. За дзядзькавым майстэрствам цікава было паназіраць. Стары каваль браў якую-небудзь новую і даволі складаную работу, перш чым пачаць яе, глядзеў нават у чарцяжы. А потым усё ішло так лёгка, нібы ён, гуляючы, паўтараў даўно вядомае. Не верылася, што пад яго малатком — жалеза, а ўвесь час хацелася думаць, што чалавек мае справу з воскам.

Іншы раз Якаў прыносіў што-небудзь з машыны. Сам ён там мала што мог разабраць, хоць апошнія месяцы многа займаўся тэхнікай: і чытаў, і ў матарах штодня пароўся. А стары каваль браў гэта ў рукі і, хоць ніколі раней у вочы яго не бачыў, адразу прасіў падаць адвёртку. Праз хвіліну ён ужо тлумачыў, што тут не на месцы і як яго трэба направіць. Тлумачыў і паказваў чорным ад вугалю пальцам. За гэтым працавітым пальцам уважліва сачылі яго вучні, у большасці дабрасельскія хлопцы, сачыў і Якаў. Несучы потым наладжаную частку ў гараж, Семіган не мог надзівіцца ўмельству звычайнага каваля, такога здатнага самавучкі. «Даць бы такому чалавеку навуку,— з захапленнем думаў ён,— самалёты сам выдумляў бы, незвычайныя машыны».

І трошкі зайздрасць брала да тых хлопцаў, што працуюць разам з кавалём. Каб была такая магчымасць, чаму б і самому не павучыцца ў гэтага чалавека? Можа, не так рабоце, як уменню любіць сваю справу. Ужо даўнавата ў Якава пачало выспяваць перакананне, што тэхніка — яго суджаная дарожка. Часам здавалася, каб ён стаў побач з дзядзькам ля горна, то любіў бы сваю работу, можа, яшчэ больш, як сам каваль.

У гаражы хапала ўсялякай вазні, таму падоўгу бываць у кузні было не лёгка. І ўсё ж, што дзень далей, то ўсё больш цягнула Якава да старога майстра. Прачынаўся хлопец яшчэ прыцемкам і пачынаў услухоўвацца: дзынкае ўжо старэнькае кавадла ці не. Калі да слыху далятала гэтае, здавалася, сапраўды музычнае дзынканне (хата Антасіхі стаяла недалёка ад кузні), Якаў больш не мог заснуць, хоць на сваёй рабоце можна было ўстаць і крыху пазней. Хутка адзяваўся, снедаў і бег у кузню. Тут, пакуль збіраліся ў гараж шафёры, пакуль разагравалі машыны, Якаў стараўся чым-небудзь памагчы дзядзьку Алесю. І той ахвотна прымаў яго дапамогу, нават ахвотней, чым ад сваіх штатных памочнікаў. Пэўна, адчуваў каваль, што гэты малады шафёр бліжэй душою да ўсяго тэхнічнага,

чым прыстаўленыя да яго хлопцы. Да таго ж, ён ужо меў нешта ў руках — добра вадзіў машыну. У гэтым дзядзька Алесь трохі нават падзайздрошчваў Якаву. Бывалі такія часіны, што кавалю самому хацелася навучыцца ездзіць. Ды каб не абы-як, а па-сапраўднаму. Абы-як ён не любіць рабіць нічога.

Неяк яшчэ ўлетку, ідучы з абеду, каваль убачыў, як чырванамакаўскі поп ехаў па вуліцы на матацыкле. Імчаўся так, што аж кудлы развяваліся ззаду.

«Калі поп авалодаў гэтай хітрасцю,— падумаў дзядзька Алесь,— то чаму ж не паспрабаваць мне?» І, прыйшоўшы ў гараж, угаварыў Шыпульку, каб той дазволіў яму хоць раз сесці за руль. Росцік сеў побач, паказаў, як заводзіць, пераключаць скорасці, і чалавек адразу ўсё ўцяміў. Яшчэ Шыпулька не скончыў сваю лекцыю, як каваль завёў грузавік і рушыў з месца. Хоць са штуршком на першы раз, але рушыў. Ледзь не грудзьмі ўзлёгшы на руль, выехаў з гаража, узяўся на дарогу і тут адчуў, што і рукі млеюць, і вочы слаба свецяць. Вылез з кабіны потны і засмучаны. Цяжка было прызнацца сабе, што прайшлі ўжо тыя гады, калі ўсё, што задумваў, мог зрабіць адразу. Каля горна, на звычнай рабоце — яшчэ нішто, а за рулём бадай-што і рукі мацнейшыя трэба, і ногі, і вочы больш вострыя.

І ўсё ж, калі выдаваўся такі дзень, што Якаў даўжэй затрымліваўся ў кузні, стары распытваў у яго пра розныя складанасці язды: што там за натура, скажам, у легкавой аўтамашыне, што яна любіць пры рабоце і чаго не любіць? Разглядаў потым знойдзены недзе чарцёж хадавой часці «Масквіча» і таксама цікавіўся кожнай дэталлю.

— Вось гэтую я мог бы зрабіць,— гаварыў ён.— І гэтую, і яшчэ, бадай, некаторыя. На астатнія ж інструменту не хопіць пакуль што.

— А каб быў патрэбны інструмент, то ўсё зрабілі б? — з цікавасцю пытаўся Якаў.

— Матора, канешне, не зраблю,— задумліва адказваў дзядзька Алесь,— колаў не зраблю, а астатняе, каб гэта крыху раней, як вочы лепш бачылі, то зрабіў бы ўсё.

Часта ў кузні адбываліся і больш працяглыя гутаркі і з большай колькасцю ўдзельнікаў. На двары сцямнее, усе разыдуцца з гаража, з рамонтнай майстэрні, а стары Талімон у гэты час прыходзіць на варту. Зойдзе ў гараж, агледзіць, які транспарт на месцы, якога яшчэ няма, тады

кідае позірк на дзверы кузні. Бывае, што бліпчаць шчылінкі ў дзвярах, таму што там гарыць святло, а бывае, што і не бліпчаць. І ўсё роўна Талімон падыдзе да дзвярэй. Чалавек ён начной работы, а па характару свайму — лагодны, кампанейскі, любіць сустрэцца з людзьмі, пагаманіць. А дзе іх сустрэнеш ноччу? Вось і ідзе стары ў кузню. Тут яго і клубы, тут яго і сходы, тут усё. Калі свецяцца шчыліны, значыцца, там некалькі чалавек, калі ж не свецяцца, то сядзіць адзін каваль ды, пэўна, Якаў, калі ў яго не вучэбны вечар.

Сапраўды, рэдка быў той вечар, каб у кузні не збіраліся пасля работы людзі. Тут, мабыць, дзейнічаў даўні вясковы звычай. У Дабрасельцах ужо не тая кузня, што была раней, не тыя і кавалі, аднак жа сабрацца ў кузні ды ў ахвоту папасмяяцца, пажартаваць, падзяліцца навінамі любяць вяскоўцы і цяпер. І не толькі вяскоўцы. Бывае, што сёй-той і з шафёраў, і з рабочых майстэрні, нават з будаўнікоў раптам возьме ды і не пойдзе ў клуб, а прыйдзе ў кузню і сядзіць. Хіба ў клубе пачуеш тое, што можна пачуць тут? У кузні гавары колькі хочаш, каб толькі смешна было і цікава. На любую тэму могуць узнікнуць тут самыя незвычайныя ўспаміны, самыя вострыя параўнанні і, вядома, самыя смешныя анекдатычныя навіны.

Зайшла гутарка, скажам, пра мінулае — і калі ласка: Талімон можа расказаць пра Тумашову пярэстую кабылу, якая, пры ўсёй сваёй нікчэмнасці на выгляд, мела надзвычайную хітрасць, і каб ускорасці не здохла, то дайшла б, мабыць, да разумення чалавечай мовы. Васіль Тумаш некалі цягнуў воз гною на гэтай кабылцы цэлага паўдня, бо, выйшаўшы з возам з двара, кляча адразу ж спынялася і чакала, пакуль падыдзе на дапамогу гаспадар. Васіль падыходзіў, браўся за гуж (канешне, у літаральным сэнсе), і так клыпалі яны ўпрыпрэжку аж да вялікай гары. Там пярэстая зноў спынялася.

— Ну, чаго ўжо? — злосна пытаў гаспадар.

Кабылка паварушвала хвастом.

— Но-о! — тузаў Васіль за повад, а сам аж слізгаўся босымі нагамі ў пяску, цягнучы за гуж.

Пярэстая і не крапалася з месца.

— От, каб цябе ваўкі зарэзалі, каб ты была выдахла, падла натурыстая! — зганяў чалавек у лаянцы злосць. А потым кідаў воз і ішоў шукаць дзе-небудзь якой травіцы ці хоць руні каліва, каб падкарміць жывёліну. Ведаў

Тумаш, што не поїдзе клячына без гэтага, хоць бі яе, рэж, хоць забі на месцы.

Можа, пра бывалешнія лякарствы вам цікава што пачуць ці пра дактароў? Талімон крыху папорацца ў сваёй памяці і знойдзе сёе-тое і наконт гэтага. Ён можа расказаць пра сваю нейкую сваццю, якая гадоў сорак таму назад лячылася ў Кіеве. Лячылі яе там і ўсялякімі мікстурамі, і парашкамі, і чаем, а яна ўсё крактала, усё кволілася. А потым прыехала дадому, зачэрпала са свайго калодзежа вядро халоднай вады, напілася і адчула, што ёй адразу стала лягчэй. Жыла потым гадоў да сотні і больш, ні разу не ездзіла па дактарах.

Часцей за ўсё, вядома, узнікае гаворка аб тым, што кожнаму бліжэй,— аб новым будаўніцтве. Тут ужо ўсе прымаюць удзел. Калі няма ў кузні самога дзеда Тумаша (а ён таксама часам наведваецца сюды), то могуць праехацца і па яго адрасу. Шырока расплыўся па Дабрасельцах лагодны смяшок аб тым, як стары Тумаш зашалёўваў на пляцоўцы першы лабок аднои гаспадарчай будыніны. Скончыў работу, злез з рыштаванняў і пакрочыў ад будыніны, не азіраючыся. Прайшоўшы пэўную адлегласць, стаў, павярнуўся тварам да лабка і пачаў уважліва аглядаць яго. То ў правы бок падасца, паглядзіць, прыставіўшы далонь к брывам, то ў левы. А другой рукой усё чухае патыліцу. Чухаў ён гэтак, чухаў, а назаўтра прыйшоў і зноў палез на рыштаванні. Тры разы перарабляў дзед Васіль свой лабок, пакуль не вымайстраваў, не адшліфаваў яго так, што не толькі ўдзень, па сонцы, а і ноччу, пры месяцы, ён свеціцца.

Вясёлы рогат узнімаецца ў кузні, калі хто-небудзь умела раскажа пра кладаўшчыка Шымета, які аднаго разу забыўся, што ў кішэні яго штаноў было гвоздзе. Прыйшоўшы дадому позна, ён лёг спаць у гэтых штанах і пракалоў сабе сцягно.

Усе пакручваюць галовамі і пачмыхваюць ад смеху, калі пачынаецца гаворка пра некаторых навічкоў-будаўнічкоў, якія сваю, пакуль што яшчэ не надта вагавітую, палучку растрачваюць за некалькі дзён, а потым просяць у гаспадынь пазычыць траячку і жывуць на адным маргарыне. Аднойчы гэтакі навічок да таго наеўся маргарыну, што потым не мог і гадзіны ўседзець на рыштаваннях.

Калі вядзецца такая гамонка, стары Талімон з асаблівым стараннем наставуляе свае тугаватыя вушы. Два яго

сыны таксама працуюць на будаўніцтве і таксама не надта добра ўладжваюцца са сваімі заробкамі. Тут неяк трэба было б памагаць гэтаму, яшчэ зялёнаму рабочаму класу вучыцца жыць па-гаспадарску.

Адзін зімні вечар у кузні асабліва запомніўся Якаву. Асталіся яны пасля работы ўдвух з дзядзькам Алесем, а потым прыйшоў і Талімон. Святла не ўключалі, бо вельмі хораша і ўтульна свяцілі вугалі ў горне. Яны трохі і грэлі, таму ўвесь маленькі сход размясціўся паблізу ад гэтага, амаль хатняга, цяпла.

Гаворка пачалася з Шыпулькавай мыліцы. Некалькі дзён таму назад Росцік выйшаў з бальніцы, але на адну нагу яшчэ не мог добра наступаць. Разам з бюлетэнем далі яму напракат мыліцу. Спачатку хлопец не мог і кроку ступіць на мыліцы, а потым успомніў, як хадзіў некалі на капдыбах, і зашпацыраваў на трох нагах лепш, як на дзвюх. Вельмі ж да густу яму прыйшлося хадзіць на мыліцы па гарадскім пасёлку, нашым раённым цэнтры. У які магазін ні зойдзе, усе расступаюцца перад ім. Патрабуе самы дэфіцытны тавар, і прадаўцы падаюць. Аднойчы заўпарціўся нейкі заўмаг, дык Шыпулька як падняў над прылаўкам мыліцу, як закрычаў, што інвалідаў Айчыннай вайны не паважаюць, то адразу з'явілася ўсё неабходнае.

Праз нейкі час яму ўжо і не патрэбна была мыліца, мог хадзіць з кійком, але расставацца з такой аўтарытэтнай прыладай вельмі не хацелася. Дактары прысылалі паведамленні, патрабавалі вярнуць бальнічную ўласнасць, бо яна патрэбна іншым, а Шыпулька ўсё адцягваў, усё выдумляў розныя прычыны, каб пакульгіцаць трохі яшчэ. Нарэшце, калі ўжо выкруціцца ніяк нельга было, ён ушчапіўся на Яшаву машыну, калі той ехаў у Мінск. Там абхадзіў з мыліцай усе галоўныя магазіны і пасля гэтага аддаў яе.

Гаварылі так утрох, пасмейваліся, а потым неяк прымоўклі, і дзядзька Алесь, можа, дзеля таго, каб парушыць цішыню ці каб усё-такі высветліць тое, што яго непакоіла, звярнуўся да Талімона з такімі словамі:

— От ты вазьмі ды цяпер скажы яму пра Шыпульку тое, што мне казаў.— Дзядзька кіўнуў худзенькім падбародкам у бок Якава.— Ён хлопец свой, ды і сакратаром нядаўна выбраны тут у гаражы. Паможа нам разабрацца.

— Ды што гаварыць,— быццам з крыўдай азваўся Талімон.— Больш я табе і казаць нічога не буду. Што яму

ні кажы,— Талімон павярнуўся ўжо да Якава,— усё не верыць. Яму здаецца, што ўсе людзі такія, як ён: усё жыццё насіў толькі ў кузню, а з кузні і ламанага цвіка не вынес.

— Ты кажы, кажы! — падахвочваў дзядзька Алесь.

— Што? — Талімон падняў да вуха руку, пальцы якой ледзь паказваліся з доўгага аўчыннага рукава.

— Ты расказвай! — паўтарыў каваль.

— Ды што расказваць? От я яму і кажу, — зноў павярнуўся дзед да Якава, — кажу, што калі б гэта, на ліхі канец, у нашым калгасе?.. Асабліва калі ўзяць некалькі год назад. А гэта ж такая святая справа пачынаецца, і вось душа мая чуе... Я хоць глухаваты, але чую, дзе трэба, і вочы маю...

— Ну, гавары ты ўжо! — не мог сцярпець дзядзька Алесь.

— От я і гавару...

— Расказвай, што бачыў!

— Дык я і расказваю...

Нарэшце каваль сам расказаў, што, вартуючы па начах гараж, Талімон некалькі разоў заўважаў, як Шыпулька апоўначы або пад дзень выязджаў некуды на грузавой машыне. Росцік біў на тое, што вартаўнік глухі, будзе моцна спаць і нічога не пачуе са свае будкі. А Талімон усё чуў і бачыў.

## ЯКІ Ў НАС ЗІМОЮ ЛЕС?..

Пакуль не наступіла прадвесне і не пачало ўсё навакол чарнець і шарэць, мне хочацца расказаць, які ў нас зімою лес, як ён выглядае ў прыгожы пагодлівы дзень. Харошы ў Дабрасельцах лес. У гэтую зіму, калі снег ідзе ледзь не кожны дзень, ён іншы раз падобны на казку. Можна прывесці сюды малых дзяцей і расказваць ім пра розныя цуды на зямлі. Дзеці павераць, бо гэтыя казачныя цуды будуць перад іхнімі вачамі. Можа, хто з іх захоча ўбачыць чарадзейныя вароты ў нейкі ляены палац? Калі ласка. Вось адна маладая, але вынасістая хваінка не вытрымала першага шчодрага снегу, нахілілася. Паглядзела на яе гэтакая ж маладая ялінка і таксама нахілілася, бо ёй яшчэ цяжэй было ўстаяць — яе галінкі больш пушыстыя. Сустрэліся хваінка з ялінкаю, абняліся. Тады на іх яшчэ пайшоў снег і яшчэ. Выгнуліся гэ-

тыя два дрэўцы, утварылі арку, а тады ўжо чаго толькі не намудрылі на гэтай арцы снег з марозам! Тут і розныя ўзоры, і скульптурныя фокусы, такія, што свет не бачыў, і арнаменты невядома якіх вякоў і народаў.

А можа, каму цікава паслухаць, як звоняць лясныя званочкі? Спыніцеся, не ідзіце далей у лес і ўслухайцеся. Па верхавінах хвойніку праплыве невялічкі ветрык, і да вашага слыху даляціць лёгенькае, мілагучнае дзінькапне. Вы пачняце ўглядацца ў густую зеляніну, шарыць вачыма па неабсяжнай выстаўцы снежнага мастацтва і з першага разу можаце нічога не заўважыць. Потым, калі яшчэ раз наведаецца ветрык і зноў задзінькаюць званкі, ваш слых ужо больш навострыцца, вока звыкнецца з кантрастам вельмі белага і цёмна-зялёнага. Тады можа паказацца, што па адной заснежанай галінцы сядзяць вавёркі і лёгенька паварушваюць хвастамі. Але не верце сваім вачам, падыдзіце бліжэй. Смела ідзіце — гэтыя вавёркі не ўцякуць. Падыдзеце бліжэй і ўбачыце, што гэта не вавёркі, а вымытае снегам і загартаванае марозам лісце маладога дубка. Яно вісіць на тонкіх, але моцных ніточках і пры кожным дотыку ветру звоніць.

Можна паказаць дзецям і больш ім знаёмае — сапраўдныя зайчыкавыя хаткі. Вось недалёка да дарогі стаяць разгалістыя, але яшчэ няраслыя ялінкі. На іх кволыя верхавіны і на ніжнія лапкі столькі наваліла снегу, што з ялінак атрымаліся белыя копчыкі. Але гэта здалёк — копчыкі. А калі падысці бліжэй, то адразу можна заўважыць, што гэта хаткі. Не з таго боку, дык з другога, але абавязкова ў кожнай хатцы ёсць хоць адно акенца: дзе круглае, дзе кантовае. Ёсць таксама дзверцы каля самай зямлі. І калі зазірнуць у гэтую хатку, то можна ўбачыць, што ў ёй зусім няма снегу. Там суха, утульна, дол высланы жоўтымі шыпулькамі.

Хіба не можа тут пераначаваць зайчык?

А вось доўгая лясная прасека, і канца ёй не відаць. Яна роўная, як алея ў парку. Па ёй толькі што нехта праехаў на санях. Відаць, дзядзька ляснік, бо толькі яго конь прывучаны хадзіць на глыбокім снезе. Адным полазам саней нагнула і працёрла ялінку. Яна хутка ўстане, а пакуль што так прываблівa пахне смалой, што ад гэтай праеханай ялінкі не хочацца адыходзіць.

Аднаго разу ў выхадны пагодлівы дзень шахтбудаўцы ўгаварылі Якава заправіць сваю трохтонку і паехаць у

Дабрасельскі лес. Чаму ж сапраўды не паехаць? Гэта ў хуткім часе — гарадскі парк. Сюды не толькі ездзіць, а і пехатою ўсе будуць хадзіць.

Росцік Шынулька насоп трохі, адвярнуўшыся ад Валянціна, які быў ініцыятарам паездкі, пакруціў у паветры качарэжкай, што замяняла цяпер мыліцу, і падпісаў пуцявы ліст. Сам, аднак, не паехаў, хоць Валянцін і запрашаў яго. Схапіўшы вымову за сваю таямнічую камандзіроўку, а цяпер яшчэ адчуўшы, што некаторыя камсамольцы не вельмі прыязна адносяцца да яго, Росцік не адважыўся ехаць. Многа ахвотнікаў, вядома, не паехала, бо каб пасадзіць усіх, то і дзвюх машын не хапіла б.

Непадалёку ад рэчкі выбралі найбольш прыгожае і ўтульнае месца з меншым заносам, і Якаў паставіў там машыну. Дзень быў адлiжны, цёплы. Як выскачылі ўсе з кузава, тупанулі па разу, дык у адну хвіліну цэлая палянка стала цвёрдай і абжытай. Хутка нанасілі лам'я, расклалі вялізны агонь. Ён страшэнна дымеў, не паспяваючы пранізваць усё новыя і новыя бярэмы галля. Кожнаму хацелася прынесці як мага больш дроў, і найлепшых. І хлопцы і дзяўчаты разбягаліся ва ўсе бакі, іншы раз па пояс правальваліся ў снег. Хто далей забяжыць, хто хутчэй назнаходзіць і назбірае такога лам'я, каб дым ад яго быў відзён аж у Дабрасельцах? Не страшна, калі разам з дровамі прынясеш і поўную халяву снегу, калі змакрэе вопратка, пакачанеюць, а то і зойдуцца з пары рукі. На агні ўсё прасушыцца, адагрэецца.

Пабег неўзабаве і Якаў. Ён трошкі прамёрз, пакуль, лежачы пад машынай, правяраў рулявую цягу. У апошнія часы ў яго часта так бывала: здасца што-небудзь у час язды, і тады ён ужо не будзе спакойны, пакуль сам усё не агледзіць, не абмацае сваімі рукамі. Часцей за ўсё — гэта дробязь якая-небудзь, а ўсё роўна яму хочацца зазірнуць у матор або падлезці пад раму. І, як возьме ў рукі ключ, можа забыцца, што не снедаў ці не абедаў, можа нават не заўважыць, як узыдзе або зойдзе сонца.

Сёння ў машыне не было да чаго прычапіцца, таму ён адчуў, як пачало халадзіць у спіну, і хутка вылез.

— Пачакай, Якаў,— пачуў ён голас Валянціна, калі ўжо трохі адбегся ад агню.— У цябе сякера, давай пабяжым разам.

Брызентавы Валянцінаў плашч быў ужо макраваты, бо гэта не першы раз хлопец ішоў па дровы, гумавыя бо-

ты блішчалі ад вільгаці, як лакіраваныя. А твар палаў свежай чырванню. Шэрая кепка сядзела на самым цемі і ледзь прытрымлівала зачэсаныя назад густыя, з цёмным адлівам валасы.

Маючы сякеру, хлопцам не цяжка было ўзяць над іншымі перавагу. Яны ссеклі дзве шырокія, пругкія галіны, якія маглі служыць ім санямі, нагрузілі на гэтыя імправізаваныя розвальні ўсялякага сухога і сырога лам'я, збуцвелых пянчукоў, ядлоўцавых карчоў, выцягнутых з-пад снегу, і лёгка сабе, без асаблівай натугі павезлі ўсё гэта на агонь.

— Ну, як там у цябе ў гаражы? — спытаў па дарозе Валянцін. І, заўважыўшы, што Якаў не зусім ведае, што адказаць, дадаў: — Я маю на ўвазе ранейшую нашу з табой размову наконт Шыпулькі.

— Нічога пакуль што не магу сказаць,— вяла пачаў Якаў.— Наглядаў некалькі начэй... Росцік жа цяпер і ездзіць не можа. Куды яму з гэтакай нагой, не гнецца ў суставе. Тут, мабыць, стары Талімон прыснiў трохі, а я дарэмна ўзяў гэта на веру і табе пераказаў.

— Не думаю, што дарэмна,— заўважыў Валянцін.— Ты ж сам выцягваў яго ноччу з-пад моста.

— Выцягваў, ну дык і што?

— А тое, што ездзіў жа некуды чалавек.

— Ездзіў па няшчаснаму выпадку, гэта можа здарыцца з кожным.

— Схлусіў ён табе!

— Што? — Якаў спыніўся са сваімі розвальнямі і здзіўлена паглядзеў на Валянціна.

— Збрахаў ён,— паўтарыў Валянцін.— І не толькі табе. Цётка ў Мінску, праўда, у яго ёсць, але яна ніколі і не думала пра якую-небудзь занямогу. Наадварот, нядаўна чацвёртым наваратам замуж выйшла і, мабыць, на гэтым яшчэ не спыніцца. Шыпулька тады нават не заязджаў да яе.

— Няўжо? А дзе ж ён быў?

— Вось гэта нам пакуль што невядома. Давай, паехалі!

Якаў зрушыў з месца свае розвальні, аднак вёз іх павольна, ледзь пераступаючы з нагі на нагу. Яму не хацелася набліжацца да агню, пакуль не выпытана ўсё, што Валянцін ведае. Таму, ідучы, хлопец не пакідаў здзіўляцца:

— Ну як жа гэта, проста ўцяміць не магу. Чалавек бярэ самавольна машыну, едзе немаведама куды, затым гробіць гэтую машыну, і яму толькі вымова. Ды калі б так зрабіў я ці іншы з нашых шафёраў, з гаража прагналі б, пад суд аддалі б.

— Заступіліся, відаць, за яго,— з пяпэўнасцю прамовіў Валянцін.— Там у яго цётка, а тут знайшоўся дзядзька.

— Раскажы ты ўсё адразу,— папрасіў Якаў,— не цягні. Ты ж ведаеш, што я не пабочны тут.

— К таму і размова, што не пабочны,— згадзіўся Валянцін.— Ты павінен памагчы нам разабрацца ў гэтай справе. Калі мы на пабудкоме прыціснулі Шыпульку (ты якраз быў у камандзіроўцы), ён пачаў прызнавацца, што ездзіў не да цёткі, магчыма, сказаў бы і яшчэ што-небудзь, але ў гэты момант уляцеў у пакой кладаўшчык першай пляцоўкі Шымет і ўзяў усю віну на сябе. Ён заявіў, што ў яго на складзе быў выяўлены недахоп дэфіцытных матэрыялаў, таму неабходна было тэрмінова праверыць накладныя некаторых вадзіцеляў. Шыпулька нібыта для гэтага і ездзіў у горад, на базу. Вядома ж, што перш чым заявіць нам, ён, пэўна, дваццаць разоў заявіў аб гэтым кіраўніцтву. Цяперашні мой аб'ект якраз непадалёку ад упраўлення начальніка работ. Мне відно, як Шымет амаль кожны дзень раніцай або пад вечар бяжыць у кантору. Гаварыў я там. Не ведаю, як Павел Іванавіч, а начальнік работ верыць гэтаму чалавеку.

— Дык чаму не паверыць? — сумна заўважыў Якаў. А сам раптам успомніў пра хлопчыка пад машынай, пра казённыя, але прынцыповыя словы Шымета на будаўнічай пляцоўцы.— Чалавек ён, мабыць, вельмі адданы справе.

— Начальнік работ так і сказаў, між іншым,— стаў гаварыць Валянцін далей.— Прывёў нават адзін прыклад. Калі пачыналася будаўніцтва і ў часовай сталоўцы неабходна было тэрмінова наладзіць пліту, Шымет аддаў трэсту сваю ўласную цэглу, прыгатаваную на рамонт печы. Жонка яго крычала, плакала, а ён сваімі рукамі пагрузіў цэглу на машыну і завёз. Печ у яго хаце і цяпер дыміць.

— Значыцца, няма чаго тут больш і думаць,— хацеў заключыць гаворку Якаў.— Усё стала ясна, і давай не будзем мы лішне насцярожвацца. Шыпулька няхай аста-

сцца Шыпулькам, Шымет — Шыметам, а мы — самі сабой. Хапае ў нас работы і без усялякіх паглядацняў.

— Не, гэта не так,— цвёрда сказаў Валянцін.— Ты тут памыляешся, таму што не ўсё ведаеш. Цяпер ідзе праверка аховы і выкарыстання матэрыялаў па ўсіх будаўнічых пляцоўках. Учора Шымет сказаў у канторы, што ў яго ўсё ж такі можа выявіцца некаторы недахоп матэрыялаў, але толькі па віне несумленных шафёраў. І тут, між іншым, ён кіўнуў на цябе.

— Што ты?! — Якаў зноў спыніўся. Яго здзіўленне спалучылася з самым глыбокім абурэннем.— Няўжо гэта так? Валянцін?!

— Так, Якаў,— абціраючы рукавом успацелы лоб, нацвердзіў хлопец.— Але ты не думай, што я веру. Ніхто ў камітэце не паверыць. Аднак гэта азначае, што складваць рукі мы не павінны. Ты сакратар камсамольскай арганізацыі ў гаражы, маеш сур'ёзнае даручэнне і старайся яго выканаць. Камсамольцы з гаража і з кузні памогуць табе. А мы ад камітэта пусцім сваю лёгкую кавалерыю па ўсіх пляцоўках. Чаму Шымет выбраў такі ход? Тут нельга не задумацца.

— Я зараз жа еду дадому! — з суровай катэгарычнасцю заявіў Якаў.— Дай сюды маю сякеру!

Валянцін слухмяна працягнуў яму мокрае ад снегу тапарышча, аднак тут жа сказаў:

— Не раю табе цяпер ехаць. Чуеш? За гэтыя некалькі гадзін ты нічога не выйграеш, а людзей спалохаеш, насцярожыш. Глядзі, як весела ўсім, які харошы дзень! Шкада яго псаваць. Мне здаецца, што тут трэба дзейнічаць спакойна, прадумана, без гарачкі. Гэта таксама барацьба. Думаеш, не? Толькі скрытая. Адкрыта, можа, нават лягчэй было б змагацца.

Убачыўшы такі дзівосны транспарт з дровамі, хлопцы кінуліся яму насустрач, з шумам і рогатам адціснулі з вупражы Якава і Валянціна, пацягнулі галлё на агонь. Валянцін паспеў усё ж выхапіць для сябе хоць пару ламачын, а Якаў вярнуўся да вогнішча толькі з сякерай.

— Дзе ж твае дровы? — весела спытала Надзя. — Глядзі, прыйдзе ляснік, дык і сякеру адбярэ!

З вялікім задымленым дручком у руках яна скакала каля агню, як дзяўчынка, то з аднаго боку, то з другога папраўляла, падпіхвала на сярэдзіну галлё. Рукавы яе выхаднога паліта з чорным коцікавым каўняром былі

трохі закасаны, вязаны вішнёвы шалік, што служыў ёй хусткай, ледзь не зусім з'ехаў на патыліцу. Яна ўвесь час смяялася і жартавала, наколькі магла дазволіць яе дзявочая сціпласць. Узбуджаныя весялосцю вочы шукалі падтрымкі ў іншых. Падай хто-небудзь прыклад — і яна пайшла б каля агню ў скокі, падхапіла б самую развясёлую песню, самыя вострыя прыпеўкі.

Па другі бок вогнішча раптам грымнуў рогат. Надзя наставіла каля сваіх ног дручок, узнялася на дыбачкі. Здавалася, што яна хоча, як спартсменка, падскочыць на гэтым дручку, каб цераз высокія клубы дыму ўбачыць, хто там смяецца. Канешне ж, гэта Валянцін там прыткнуўся. Дзяўчына сапраўды робіць скачок, у момант абягае вогнішча. Хлопцы прыціхаюць, убачыўшы Надзю, а Валянцін ніякавата апускае вочы: значыць, не для дзявочага вуха нешта было сказана.

— Ну і чэрці! — кідае ім дзяўчына, а сама падбягае да купкі сваіх равесніц. Каля іх прабіваюцца ўжо скрозь галлё белыя і, здаецца, зусім не гарачыя языкі агню. Дзяўчаты працягваюць рукі, некаторыя ледзь не загортваюць агонь прыгаршчамі і раптам ускрыкваюць: пячэцца ўсё-такі!

Агонь пачынае прабівацца і тут і там. Ён хутка ўзрастае, падымаецца, жвавее. У суладнасці з ім узнікаюць і гучаць усё мацней і мацней звонкія маладыя песні. А вось ужо чубаты хлопец сабраў вакол сябе кружок. Пажаўцелы ад дыму снег разлятаецца пад яго нагамі. І не трэба яму ніякая музыка, няхай толькі мацней пакрыкваюць у такт тыя, што сабраліся навакол, ды з усёй сілы пляскаюць у далоні. Хлопец на момант прыпыніўся, страсянуў светлым чубам (шапка яго даўно ўжо ў нечых руках) і падляцеў да гурту дзяўчат. Адтуль у гэты ж момант выскачыла адна, невялічкая, стройная, як балерына, у маленькіх юфтавых ботах і зграбнай фуфайцы. Яна нават забылася, што ў яе хлапечая шапка ў руках, пусцілася на кругу з такой хуткасцю і лёгкасцю, затупацела і закружылася так жвава і імкліва, што нельга было згледзець яе ног. Хлопец усміхнуўся ёй шырока і радасна, на хаду змахнуў са сваіх плеч паддзёўку. Гімнасцёрка яго (відаць, таксама нядаўна дэмабілізаваны) ужо трошкі цямнела на плячах, але што гэта значыць для такога танца?..

Галля ў агонь больш не падкладалі, бо кожнаму было зразумела, што не толькі ў пошуках дроў і не толькі ў

густым дыме ўсе прыгажосці сённяшняй прагулкі. Наперадзе яшчэ многа цікавага.

Калі пасярэдзіне вогнішча полымя пачало асядаць, а з бакоў сталі ўтварацца прывабныя, адасобленыя адзін ад аднаго агеньчыкі, некаторыя з хлопцаў зафукалі на вынятыя з кішэнь складанчыкі. Якраз жа надыходзіла пара для запаветных ражэнчыкаў пад сала, а дзе іх узяць? Трэба, каб ражэнчык быў гладкі, прыгожы, не вельмі гнуўся і не пах смалой. Сюды падыходзіць бярозавая галінка або арэшнік, ракіта. Але нічога гэтага тут, паблізу, няма. Прыйдзецца бегчы пад самую рэчку.

І пабеглі. Хутка ва ўсіх у руках былі ражэнчыкі, хараша абцярэбленыя, завостраныя. Хто з кузава машыны, хто з унутраных кішэнь сталі даставаць клуначкі, пакункі з паперы. Надзя вынесла свой клуначак з недалёкага ядлоўцавага куста, кіўнула Якаву. Той падышоў з расшчэпленым пожыкам у руках. Трошкі ў баку ад агню яны прыселі, Надзя паклала на снег, нібы летам на траву, свой клуначак і пачала разгортваць. З белай, злёгку аздобленай вышыўкай сурвэткі (у Надзі ўсё было з вышыўкай) яна дастала спачатку добры акраец хлеба і падала яго брату. Затым пашамацела ў паперы і выняла кусок белага як снег, прыцвярдзелага ад холаду сала. Узяла з Яшавых рук пожык і маўкліва паглядзела брату ў вочы. Той адразу ўлавіў яе думкі, згодліва кіўнуў галавой. Надзя хараша і спрытна перарэзала кусок на тры роўныя часткі і зноў узняла на брата свае прыгожыя карыя вочы. Якаў устаў і, убачыўшы сярод хлопцаў Валянціна з ражэнчыкам у руках, падаў яму знак падысці.

— Давай будзем перакусваць разам,— сказаў ён, калі Валянцін наблізіўся.— Вазьмі вось, наніжы на ражэнчык сала.

— Дзякую, — прыязна адказаў Валянцін, дастаючы з кішэні вялікі газетны пакунак.— У мае гаспадыні сала няма, дык я купіў цэлы абадок кілбасы. Хіба падзелімся?

— Давайце вашы ражны! — загадала Надзя.— А то вы ўжо, мабыць, забыліся, як трэба нанізваць.

Яна ўсміхалася маўкліва і стрымана, а ў вачах так і іскрылася шчырая радасць. Пракалоўшы пожыкам скуру, дзяўчына хуценька нанізала кусочкі, аддала пруткі хлопцам, а сама бежкам пусцілася да агню.

Там ужо ледзь не над кожнай галавешкай вісеў пруток з салам. Некаторыя падвэнджвалі і кілбасу, але гэта

ў адступленне ад правілаў. Цікавей за ўсё было падсмажыць на агні кусок сала. Ды не абы-як, а каб яно зрабілася жоўценькае і пахучае ды каб ніводная кропля тлушчу не ўпала ў агонь, а ўвабралася ў скібку хлеба. Тады гэтую скібку можна з'есці і так, нават без сала, а смажанінай падзяліцца з тым, у каго на прутку кілбаса.

Безліч агеньчыкаў стала па краях прыгаслага шырачэзнага вогнішча. Як ні стараліся ўсе збіраць тлушч на хлеб, усё ж ён капаў на вуголле і з прыемным шыпеннем гарэў.

— Глядзі-глядзі, тваё сала ўцякае! — гукаў хто-небудзь няўважліваму суседу, а ў самога ў гэты час скварка пачынала чарнець ад нечаканага ўзнікшага дымку. Іншы аматар жартаў намагаўся падставіць сваю скібку пад чужое сала, але пад агульны смех прагадваў, бо жвавы і хітры агеньчык раптам ускокваў на яго пруток, і каб яшчэ трошкі, то сала апынулася б у попеле.

Той чубаты хлопец, што нядаўна да сямі патоў адбіваў казачка, толькі каля самага агню ўзяў з рук у дзяўчыны сваю падношаную вушанку і надзеў на галаву. Надзеў, відаць, не ад холаду, а каб валасы часам не прысмаліла. Танец трохі нагнаў голаду, а тут гэты дзівосны пах са скібкі. Хлопец не вытрымлівае і выкусвае ледзь не ўвесь прапітаны гарачым тлушчам мякіш. Задзірае галаву і з асалодай жуе.

— Сашка-а! — крычыць яму тая дзяўчына, што нядаўна трымала яго шапку.— Дзе ж твая прыкуска?

Хлопец рыўком вымае з агню ражэнчык, смяшліва, аднак ужо з насцярогай глядзіць: сала няма. Нахіляецца над вуголлем, другім канцом прутка пачынае разграбаць лёгкі шыпулькавы попел. Усе, хто бачыць гэта, упрысед рагочуць. Хлопец памахвае ў паветры ражэнчыкам, тужыцца сказаць нешта пагражальнае, але яго рот повен мякішу — ніводнага слова не вымавіш. Нарэшце, ледзь не падавіўшыся, ён заяўляе, што такога «здзеку» нікому не даруе, што лепш аддасць каму хочаш апошнія штаны, чым гэтую, так хораша падсмажаную, скварку.

Сашаву смажаніну, спрытна знятую з ражэнчыка ў той час, калі хлопец жаваў хлеб, падаюць яму на запасной лусце хлеба. Саша здаволена смяецца.

Пасля вясёлага і смачнага полудня амаль усе збіраюцца пакінуць ласкавае лясное вогнішча. Каму хочацца прайсціся па роўненькіх прасеках лесу, каму і ўпоперак

прасекаў не страшна было б прагуляцца. Некалькі хлопцаў узялі ў Якава сякеру і хочуць паспрабаваць шчасця на рэчцы: можа, якраз рыбка пакажацца ў палонцы. Аднак жа і вогнішча пакідаць неяк шкада. Здаецца, яму крыўдна аставацца тут аднаму і паступова астываць, тухнуць. Амаль кожны падкідае ў агонь што-небудзь з рэштак паліва: то сухую галінку, што непрыкметна ляжала пад кустом, то шышку, то недагарак. І каб зусім не было крыўдна тут агню, хлопцы хаваюць непадалёку свае ражэнчыкі. Гэта азначае, што кожны наведаецца яшчэ сюды. Яшчэ не раз ажыве і весела зашугае гэты лясны касцёр, тут можна будзе смажыць сала аж да таго часу, пакуль усюды не з'явяцца пафарбаваныя лавачкі, а цяперашнія прасекі не стануць алейкамі.

Надзя занесла ў кусты і асобна схавала тры ражэнчыкі: Валянцінаў, Яшаў і свой. Ні Валянцін, ні Якаў не бачылі, дзе яна іх схавала. Няхай паспрабуе каторы прыедзе ці прыйдзе сюды без яе, няхай паспрабуе знайсці ражэнчык!

Вішнёвы шалік прыгожа мільгаў сярод маладых ялінак, калі дзяўчына бегла назад. Потым ён замільгаў далёка, а Якаў астаўся ля машыны. Да яго падбегла круглашчокая дзяўчына ў хлапечай вушанцы і сінім ватнічку.

— А вы чаго ж тут адзін? — бліснуўшы белымі зубамі, спытала яна. — Хадзем з намі!

— Я не магу пакінуць машыну,— з адценнем жалю сказаў хлопец.

Гэтую, невялічкую па росту, але вельмі жвавую і спрытную ў рабоце дзяўчыну Якаў заўважаў і раней — яна працавала на будаўніцтве горада. Відаць, заўважала і яна яго. Чаму б не прайсціся з ёю хоць тут, непадалёку? Хіба з машынай што здарыцца, ваўкі ў яе залезуць? Уся бяда ў тым, што няма ўжо ранейшай весялосці... І што задумаў гэты Шымет, нашто яму спатрэбілася такая хлусня? Увесь час у душы толькі і боль аб тым, каб непашкоджаным прывезці матэрыял, каб крупінка з машыны не ўпала. Спіш дома — і ў сне бачыш гэты шыфер, гонту, шкло, бляшаныя лісты, скрынкі з цвікамі і фарбамі. А тут знаходзіцца чалавек і пускае ў душу чарнату...

Якаў падымаецца на падножку машыны і з гэтай сваёй вышыні аглядае лес. Нікога паблізу ўжо няма, і вішнёвы шалік зусім знік. То ў адным, то ў другім месцы чу-

юцца дзявочыя галасы, але яны ўсё больш і больш аддаляюцца.

— «А я тут за вартаўніка»,— з адчуваннем нейкай крыўды думае Якаў і садзіцца ў кабіну, каб прагрэць матор.

...Рухавік гурчыць роўна, аднатонна і яшчэ больш наганяе сум. Якаў цярпліва паглядае на ручку перадач, на баранку. Іх халодная гладкасць адчуваецца на далонях, нястрымна вабіць, хоць рукі спакойна ляжаць на каленях. Хочацца пусціць машыну ў ход, паехаць і неадкладна знайсці недзе Паўла Іванавіча, нагаварыць з ім. Няўжо ён больш паверыць Шымету, чым свайму быломy партызану?

Толькі дзе шукаць яго? Дома ён рэдка бывае, ды хто ведае, дзе сёння яго дом?..

Сустрэцца б цяпер з кладаўшчыком і ўзяць яго за горла! «Кажы, злыдзень, у чым віна, пакажы! Не скажаш, не адступішся ад сваіх слоў, дык праклянуць цябе ўсе сумленныя людзі, праклянe твой сын, якога я выратаваў ад смерці!..»

...На малых абаротах матор непазоўліва падае свой голас, злёгку падтрэсвае кабіну. Потым, нібы пакрыўдзіўшыся, што яму не даюць сапраўднай работы, глухне. Якаў выключае замок. У кабіне раптам становіцца да таго ціха і ўтульна, што аж боязна паварушыцца. З'явілася адчуванне, што гэта нейкая наўмысная цішыня, што калі крапешся з месца ці падымеш руку, то пешта вельмі моцна трэсне ці загрыміць. Ніколі раней не адчувалася гэтага ў кабіне, бо яна не для ціхага адпачынку.

Няўжо нічога не чуваць і ў лесе, няўжо ўсе так прыціхлі ці далёка зайшлі? Якаў адчыняе дзверцы. Сапраўды, павакол нічога не чутно, толькі лёгкі ветрык ледзь прыкметна пакалыхвае вольныя ад снегу верхавіны дрэў ды прымушае ледзь-ледзь пабліскваць найбольш трывалыя вугалі на вогнішчы.

«Мабыць, няскора ўсе вернуцца,— самотна думае хлопец.— Прыйдзецца доўга чакаць...»

Ну што ж! Ён згодзен пачакаць, нават і пасумаваць тут дзеля гэтых харошых людзей. Няхай пагуляюць, павесяляцца. Колькі гарачых слоў сёння будзе сказана, колькі маладых сэрцаў раскрыецца адно перад адным!

Няхай памагае гэтым шчырым сэрцам наш Дабрасельскі лес!

Трошкі сцятваецца час. Хочацца Якаву пагаманіць з кім-небудзь, падзяліцца думкамі. Можа, усе забыліся, што шафёру, які прывёз іх, таксама хочацца перакінуцца словам, павесяліцца? Дзяўчына ў вушаначцы падышла, але не асталася, не адстала дзеля яго ад свае кампаніі. Нават сястра — і тая не асталася. Ці варта крыўдаваць? У іх свая дружба, свае інтарэсы. Каб была тут Зоня, то, можа, і не пакінула б аднаго...

Але цяжка цяпер пра гэта думаць, адчуваць, што ты вінаваты. Не кожнаму пад сілу зберагчы сапраўдную дружбу, не кожны можа нават спазнаць яе...

Надзя не забылася пра Якава, хоць і не ведала, што ён тут зусім адзін: чорная вушаначка якраз падляцела да машыны, калі дзяўчына адбягала ад вогнішча. Калі ўжо і варта было на каго кіўнуць, то хутчэй на Валянціна. Надзя колькі разоў гаварыла яму, што трэба ісці, што ўжо наогул пара збірацца дадому, а Валянцін выпрошваў яшчэ хвілінку, усё адкладваў, запэўняючы, што Якаў не пакрыўдзіцца.

— Мы апошні раз у гэтым лесе,— не то з жалем, не то з радасцю гаварыў ён.— Ды ўдваіх з табою...

— Чаму гэта апошні? — насцярожана пыталася дзяўчына.— Хіба цябе пасылаюць куды?

— Не, не пасылаюць, але пакуль мы збяромся пабываць яшчэ раз, будзе вясна, а вясной гэты лес ужо стане паркам.

— Дык мы прыйдзем у парк, — весела паабяцала Надзя.

— У парк, ды не ў лес.

Маленькімі крокамі яны ідуць па вузкай сцежцы, відаць, самай першай ад рэчкі. Сцежка просценькая, як стрэлка, і зімою нават цяжка разабраць, праседка гэта, пракладзеная ўмелай рукой, ці такая роўная прагалінка, захаваная прыродай з часоў пасадкі. Снег на ёй не вельмі глыбокі, можна б ісці нават і ў чаравіках, калі асцярожна ступаць. Надзя і Валянцін у ботах, дык ім не трэба вельмі ўжо глядзець пад ногі. Што крок далей, то ўсё больш цікавае і прывабнае адкрываецца перад імі. Вось звычайны ядлоўцавы куст. Хто на яго звяртае ўвагу ў любую пару года? Ён калючы, чорныя горкія ягады растуць на ім. А Валянцін спыняецца каля гэтага куста і з захапленнем гаворыць:

— Глядзі, Надзя, які прыгажун!

Дзяўчына глядзіць на вострыя верхавінкі, толькі ў некаторых мясцінах прыцярушаныя снегам (на іх і снег не хоча трымацца), потым узнімае вочы на хлопца. Пагляд яе даверлівы, але крышку смяшлівы: ну якая ж тут прыгажосць? Ей успамінаецца, што калі пад такім кустом схаваешся ўлетку ад дажджу, то за шыю насыплецца шыпулек, калі захочаш выламаць з яго дубчык, то наколеш рукі, калі пакаштуеш ягадку, то будзеш гадзіну плявацца.

— Паглядзі лепш, што вунь за ялінка! Якраз як у нашым клубе на Новы год!

Надзя выцягвае перад сабою абедзве рукі, подскакам набліжаецца да дрэўца. Пальцы яе трошкі пачырванелі, але дзяўчына не надзявае сваіх вышываных рукавічак і прыгаршчамі здымае з яловых лапак мяккі, падатлівы снег.

— З па́ры зойдуцца! — крычыць, падбягаючы, Валянцін. Ён траха не на ляту ловіць яе рукі, грэе іх у сваіх жорсткіх, але цёплых далонях. Затым прыкладае да шчок. Надзя адчувае, што шчокі яго зусім гарачыя, і хоча прыняць рукі. Ад такой гарачыні пальцы сапраўды могуць зайсціся з пары.

— Мая ты любачка,— ледзь чутна шэпча Валянцін.— Зорка ты мая...

Надзя амаль не чуе, пра што ён шэпча. Яна светла глядзіць на яго і па выразных, усхваляваных вуснах здагадваецца, што словы гэтыя вельмі харошыя. Рукі яе гарачэюць. Яна ведае, што іх трэба прыняць, апусціць уніз ці схаваць у кішэні, але не можа саўладаць з жаданнем скрануць іх трошкі ўперад і абняць Валянціна за шыю. Шыя ў хлопца трохі зарослая, прыкрытая не надта свежым шалікам, але Надзі здаецца, што калі абхапіць яе, то ўжо не знойдзецца сілы расшчапіць рукі.

— Хадзем ужо, Валя,— настойліва, але ласкава просіць дзяўчына.— Шахцёры твае загуляюцца, на рэпетыцыю не прыйдуць.

— Яшчэ як прыйдуць! — з усмешкай гаворыць Валянцін.— Сашка ўсіх збярэ.

— Гэта каторы Сашка? Што танцаваў?

— Той самы. Ён брыгадзірам у мяне, а другі брыгадзір — слабаваты. Можа б, ты пайшла на яго месца?

— Я ад зямлі не пайду, аграномам буду!

Над лесам пачуўся раскацісты гул самалёта. Валянцін задняў галаву, і Надзя ўбачыла яго падбародак: чыс-

ты, ружаваты і, мабыць, да пяшчотнасці мяккі. Яна, нібы ў спалоху, вырвала свае рукі.

— Дзе гэта самалёт? — ціха спытала дзяўчына. Яна не падымала галавы, каб не сустрэцца з хлапечым позіркам. Яна адчувала, што гэты позірк незвычайны.

Гул усё больш і больш нарастаў, відаць, самалёт ішоў нізка.

— Вунь ён,— паказаў рукою Валянцін. Якраз над нашымі галовамі. Гэта паштовы.

— І што ён павёз, як ты думаеш?

Цяпер ужо і Надзя пачала сачыць за крылатым паштальёнам.

— Пісьмы людзям,— усё роўна як малой дзяўчынцы, пачаў тлумачыць Валянцін.— Газеты і часопісы, усялякія новыя паведамленні: аб палёце на Месяц, аб тым, што твае льнаводчае звяно хутка стане камуністычным.

— Ты жартуеш, Валя,— без крыўды сказала дзяўчына.— А я, калі ўгледжу паштальёна, то заўсёды думаю, што ён нясе некаму вялікае шчасце. Можа, не ў гэтую хвіліну і не ў гэтую гадзіну. Не сёння, дык заўтра, але абавязкова прынясе. І мне радасна глядзець на паштальёна...

## ЧАЛАВЕК НА ГОРЦЫ

Якаў не схапіў Шымета за горла, як яму хацелася ўчора ў лесе, але перш чым накіравацца ў далёкі рэйс, усё ж заехаў на пляцоўку. Кладаўшчык быў ужо там. Замятаючы то адным, то другім рукавом снег з клеткі цэглы, ён усё пра нешта гаварыў маладжаваму прарабу, хоць той кожную хвіліну намыкаўся адысці.

— Нашто вы псуеце паліто? — не сцярпеў нарэшце прараб.— Сняжок ідзе, дык усё роўна прысыпле клеткі.

— Не магу я, знаеце,— яшчэ стараннёй зашоргаўшы рукавом, прамовіў Шымет.— Не магу глядзець, калі вось... Здаецца, зняў бы з сябе ўсё ды накрыў бы, каб не мокла. Снег ужо не зімні.

— Цэгла не баіцца снегу,— заўважыў прараб.— Тым больш, што не доўга ёй тут ляжаць — пойдзе ў работу.

— А ўсё ж не магу я,— паўтарыў Шымет.— Навесаў у нас мала, трэба больш навесаў.

— Пабудуем,— упэўнена сказаў прараб і ўжо рашуча ступіў убок, паказваючы гэтым, што яму вельмі трэба ісці.

— Адну хвіліначку,— працягнуў Шымет да яго рыжыя ад цэглы рукавы.— Я вось яшчэ адно... Там у мяне дрывоценька каля хаты... Дровы мае, колькі іх там ёсць, могуць і на двары паляжаць, а што-небудзь з такога важнага матэрыялу...

— Тады жонка зноў скандал закоціць,— ужо раздражнёна сказаў прараб.— Будзем уладжвацца тут!

— Ды што жонка! — пакрыўдзіўся кладаўшчык.— Хіба аб гэтым варта гаварыць? Пакрычыць ды і сціхне.— Убачыўшы Якава, загаварыў мацней: — Тут сэрца баліць, дзень і ноч думаеш, як уберагчы тое дзяржаўнае, якое табе даверылі. Як усачыць за ўсім? Я тут адзін, а людзей...

— За кім гэта сачыць? — ледзь стрымліваючы абурэнне, спытаў Якаў.

Ён стаў насупраць кладаўшчыка і паглядзеў на яго так, што той міжвольна падаўся назад. Прараб выкарыстаў гэты момант і рухава пашыбаваў да бліжэйшага аб'екта.

— Не за табою, вядома, — крыху разгублена прамовіў Шымет, прытуліўшыся спінаю да штабеля. — Аднак сачыць трэба. Тут жа не толькі свае шафёры, а і з аўтакалоны, і з іншых трэстаў.

— Чаму вы сказалі ў канторы, што я краду шыфер? Кладаўшчык ледзь не ўссеў на клетку, каб аддаліцца ад Якава, але хлопец падступаў бліжэй.

— Я так не сказаў,— з асцярогай адводзячы вочы, прамовіў Шымет.— Гэта няправільная інфармацыя.

— Вы так не сказалі,— згадзіўся Якаў.— Вы капнулі танчэй, далікатней. Вы толькі намякнулі — у вас ёсць вялікая здольнасць намякаць. Але ж сутнасць справы тая самая. Хто вам даў права ўзводзіць на мяне паклёп? Дзе вашы падставы?

— Я нічога не гаварыў,— яшчэ раз запэўніў кладаўшчык і шаргануўся спінаю аб цэглу, падаючыся ўбок.

— Не, пачакайце,— спакойна, але рашуча сказаў Семігон і зноў стаў насупраць кладаўшчыка.— Нікуды вы адсюль не пойдзеце, пакуль не скажаце, у чым справа. Гэта вам не жарты!

— Едзь, куды цябе пасылаюць!— агрызнуўся Шымет, аднак вылузвацца з сваіх ціскоў не адважыўся.— Прыедзеш, будзе больш часу, тады і разбяромся.

— Гаварыце, у чым справа! — грозна паўтарыў Якаў.— Мне разбірацца няма чаго, душа мая чыстая. Вы

можаце зразумець, што гэта азначае? Наўрад ці вы зразумееце. Калі я зараз жа не пачую адказу, то сілаю пасаджу вас у кабіну і навязу да начальніка будаўніцтва або да Паўла Іванавіча. Іх не знайду — у раён паедзем, да сакратара райкома.

— Выходзіць, што гэта мая душа нячыстая,— крыва ўсміхнуўшыся, прамовіў Шымет.— Але май на ўвазе, што калі ты яшчэ ракам пад стол поўзаў, то я ўжо займаў адказныя пасады. Не такія каштоўнасці, як гэтыя, былі на маіх руках. Мне давяралі, давяраюць і будуць давяраць! Мяне тут ведаюць!

— Значыць, каго не ведаюць, па таго можна...

— Я гэтага не сказаў! — узняўшы на шафёра жоўтыя, як у ката, вочы, крыкнуў Шымет.— Я хачу сказаць!..

— Што вы хочаце сказаць?

— Тое, што матэрыялаў не хапае ў нас: камісія быццам бы робіць такое заключэнне. А калі так, то, значыцца, нехта вінаваты, у некага, будзем казаць, усё ж нячыстая душа. Калі ні ў каго з вашай брацii, тады, выходзіць, у мяне. А можа, ты скажаш, што праараб вінаваты ці сам начальнік будаўніцтва?

— Я ніколі не скажу, чаго не ведаю,— з цяжкай крыўдай прамовіў Семігон.— Але не дазволю, каб і на мяне кляпалі. Вы пажылы чалавек, вас усюды хваляць, і мне хацелася вас паважаць. Цяжка мне было гэта, але я прымушаў сябе. Цяпер вы пакрывілі душой, замахнуліся на маё сумленне, каб лягчэй было выкруціцца самому. Як вас можна назваць чалавекам? Некалі ў партызанах мне гаварылі, што маю маці выдаў фашыстам адзін нягоднік, ратуючы сваю шкуру. Я не верыў гэтаму, я не мог уявіць, што ў нас мог знайсціся такі чалавек. Цяпер мне здаецца, што гэта, быццам, вы! Не крывіцеся, не лыпайце вачыма! Калі вы маглі сказаць на мяне такую няпраўду, дык маглі і прадаць чалавека. Я не супакоюся да таго часу, пакуль не дакажу ўсім людзям, што вы нягоднік!

Якаў крута павярнуўся і пайшоў да машыны. Кладаўшчык нейкі час стаяў ля цэглы нерухома, нібы атаропела, а потым раптам сарваўся з месца і пабег услед за Якавам.

— Чаго ты так ужо расхадзіўся? — пачаў ён, калі Семігон падымаўся ў кабіну.— Нагаварыў тут нямавядома чаго. Не бойся ўжо гэтак! Калі што, будзем казаць, і здарыцца, то я ж без глузду не ўсяду на цябе. Апошнюю капшулю прадам, сям'ю на хлеб і ваду пасаджу, а вярну дзяр-

жаве ўсё, што трэба. Для мяне дзяржаўнае — гэта больш, чым святое, бліжэй, чым дзіця роднае. Таму я часам і бываю такі строгі, можа, нават і залішне патрабую, будзем казаць, прыдзіраюся да вас, шафёраў. Натура ў мяне такая. Нам з табою не сварыцца трэба, а жыць у згодзе, пасуседску... Тады ўсё будзе... Тады нам нішто не будзе...

Якаў завёў машыну, і гул матора заглушыў Шыметавы словы. Кладаўшчык бег побач з кабінай, але Семігон не глядзеў на яго і не слухаў, што ён гаворыць. Едучы па сваіму маршруту, ён толькі раз-пораз вяртаўся ў думках да няяснага, заблытанага пытання: чаму гэта Шымет якраз па яго пускае цень, чаму на іншых шафёраў не гаворыць нічога? Няўжо тут ёсць які-небудзь пачварны намер?

Калі б здарылася так, што Якаў зрабіў што-небудзь дрэннае кладаўшчыку, хаця б палаяў яго ці абразіў. А то ж ніколі слова кепскага не сказаў, нават у думках не трымаў чаго нядобрага.

Што наогул выйшла нядобрае за гэтыя часы работы па будаўніцтве? Хіба тое, што малога Віцьку ратаваў, што Шыпульку выцягнуў з-пад маста, што пасябраваў з Валянцінам ды з дабрасельскімі старажыламі? А можа, не падабаецца кладаўшчыку, што Яшава трохтонка не ведае стомы, што бегае яна ў самыя далёкія і цяжкія рэйсы, што заўсёды дастаўляе самыя каштоўныя і тэрміновыя грузы?

Калі ўспомніў Якаў пра Шыпульку, думкі яшчэ больш згусціліся. Сапраўды, падобна на тое, што Шымет задумаў нешта нядобрае якраз пасля недарэчнага выпадку ля мастка. Ці няма тут якой сувязі паміж гэтымі з'явамі? Цяжка паверыць. Магчыма, гэта проста выпадковае супадзенне, а падумалася так ад балючай крыўды?

З таго часу, калі выбег Якаў з зялёнага доміка колішняга начальніка канторы, яму не траплялася на дарозе гэтакая людская несумленнасць. Яна не зацямняла зрок, не блыталася пад нагамі. Часта ўзнікала радасць ад уяўлення, што цяпер ужо і не будзе такіх з'яў. Няхай дзенебудзь у гнілым куточку, у якімсьці зялёным доміку. А тут, сярод рабочых людзей?..

Лепш не думаць пра гэта, не трывожыць душу лішнімі асцярогамі.

Калі пачыналі дакучаць такія разважанні, Якаў перш за ўсё аглядаўся на сябе. Ці зрабіў ён у сваім жыцці што-

небудзь дрэннае людзям? Магчыма, і зрабіў, але не наўмысля. Ці здолеў бы ён нашкодзіць чалавеку дзеля сваёй выгады, свядома і абдумана?

Тут прыходзіла на памяць тое, аб чым некалі ішла гаворка з Паўлам Іванавічам.

...Партызанскі разведчык, хоць ён і падлетак, павінен быць гатовы да ўсяго. Могуць быць няўдачы, памылкі. Партызанскі разведчык можа трапіць у рукі фашыстаў. Яму паабяцаюць залатыя горы, калі раскажа ўсё, што ведае аб партызанах. Яго падвесяць жывым на тонкай бярозе і будуць выколваць вочы і драць скуру палосамі, калі не загаворыць...

Бярозка гнецца, а хлопчык вісіць...

Як павінен трымаць сябе партызанскі разведчык? Вядома як: выцерпець усё, а не паддацца, памерці, але не сказаць ніводнага слова!

Нялёгка ўявіць сябе падвешаным на бярозе. Якаву ўспамінаецца, што некалі ён не раз уяўляў гэта і задаваў сабе пытанне: хопіць сілы вытрымаць ці не хопіць? Правяраў у душы кожную сваю жылку. І адчуваў, што хопіць.

Паўставалі часам такія пытанні і цяпер, уяўлялася тое, што і некалі раней.

Ці хапіла б сілы?..

Бралася на праверку душа, прасвечваліся ў ёй усе закуткі. І ўзнікала яснае пераканапне: хапіла б!..

Перад вачыма ўсплывала светлае і радаснае. Не трэба далёка і хадзіць. Усяго толькі з тыдзень назад Якаў прывёз на першую пляцоўку цэглу. З ім прыйшло і яшчэ з дзесятак машын з аўтакалоны. Дарога была кепская і па грузцы затрымліваліся, дык прыехалі зусім позна. Каб выехаць на досвітку зноў, трэба было хутка разгрузіцца, а на пляцоўцы засталі толькі вартаўніка.

— Пачакайце трошкі,— сказаў Якаў шафёрам, большасць з якіх былі нетутэйшыя.— Я збегаю ў вёску, пазаву хоць кладаўшчыка.

Бегучы па цёмнай вуліцы (святла ўжо ў вокнах не было), ён сустрэў Сашку, брыгадзіра шахтбудаўнікоў. Відаць, той праводзіў з клуба сваю зграбненькую танцорку і цяпер вяртаўся дадому.

— Калона машын на пляцоўцы,— сказаў яму на хаду.— А разгружаць няма каму.

— На нашай пляцоўцы? — спытаў Сашка.

— Не, у горадзе!

Сашка пабег, нічога не сказаўшы, а праз некалькі хвілін на пляцоўку ўжо імчаліся Валянцін ледзь не з усімі шахцёрамі, хлопцы-будаўнікі і хлопцы-калгаснікі. Хто спаў, хто яшчэ не спаў — усе падняліся па сігналу. Як гулялі разам у клубе, так і рушылі на выгрузку. Пакуль з'явіўся заспаны кладаўшчык, пляцоўка напоўнілася вясёлымі галасамі. Ад Шымета патрабавалі толькі ўказваць месцы для новых клетак. Работа ішла ўперамешку з жартамі, запеўкамі і прыпеўкамі. Не прайшло і гадзіны, як усе трохтонкі былі разгружаны.

Якаў трохі раней паехаў і ўжо з гаража чуў, як хлопцы дружна спявалі, ідучы дадому. Не вельмі сціпла было гарланіць у такую познюю пару, можна нарвацца і на праклёны якой-небудзь бабулькі. Але, відаць, песня ўзнікала сама сабою, не пытаючыся ні ў кога дазволу. Хлопцам спявалася таму, што добра папрацавалі, і таму, што іх песню, вядома ж, чулі ў вёсцы. Спіць ужо Сашкава танцорка, спіць Надзя і іншыя дзяўчаты. Але каторая з іх не прачнецца ад звонкай хлапечай песні, каторая не прыслухаецца, каб улавіць найбольш знаёмы голас, а можа, і мілы сэрцу, незабыўны...

Слухаючы гэтую песню, Якаву самому хацелася заспяваць. Вось так бы ўсё жыццё ісці побач з гэтымі людзьмі, усё жыццё мець права адкрыта і шчыра глядзець ім у вочы...

Шкада толькі, што не ўсё гэтакае ж яснае сярод людзей. Вінцэсь Шымет не пайшоў разам з хлопцамі дадому і, вядома ж, не падхапіў вясёлую песню. Ён яшчэ некалькі гадзін мітусіўся каля згружанай цэглы, папраўляў клеткі, нешта пералічваў, перамерваў. На світанні пераняў на дарозе абліпялы «газік» і далажыў начальніку работ, што асноўны будматэрыял прыбыў, што ён увесь згружаны і складзены ў клеткі. Начальнік паціснуў кладаўшчыку руку, а пасля міжвольна абцёр сваю. У Шымета былі ў пяску і гліне не толькі рукі, а і рукавы, і крыссі паліто. Нават цыгейкавая вушанка парудзела ад густога гліннага пылу.

У такім жа рудым колеры Шымет сустрэў на пляцоўцы галоўнага інжынера і прараба, а тады зняў шапку і выцяў ёю на крыссях паліто. Калі жонка прынесла снеданне, нагнуўся каля фундамента аднаго з дамоў і намыў у адлежным снезе рукі. Еў потым, седзячы на ніжняй пры-

ступцы ганка, і, хто ні праходзіў блізка, скардзіўся кожнаму:

— От, найго ліха, служба! Паспедаць няма калі схадзіць дадому. І ўсю ноч тут тарчыш, і ўвесь дзень.

Будаўнікі спачувальна ківалі галовамі.

Здараецца часам, што ідзеш уранні па гладкай зімняй дарозе, перад табою горка, стрэчны чалавек спускаецца з гэтай горкі. З-за ляска выглянула сонца, хоць і халоднае, але вясёлае, з іскрыстымі праменнямі. Дарога перад чалавекам выглядае залатой, а сам чалавек на горцы — такім прывабным, велічным. Вопратка на ім здаецца самай лепшай, постаць высокая, зграбная, паходка прыгожая. Калі гэта жанчына, то падумаеш, што сама каралева ідзе табе насустрач, калі мужчына — то прымеш яго сама мала за Крываносава, а то нават і за Паддубнага.

А наблізіцца гэты чалавек — і адразу знікае ранейшае ўяўленне. Дзівішся, бачачы, што і невялічкі ён, і ногі ў яго крывыя, і вопратка старая, неахайная. Усё сплыло з чалавека, як толькі ён спусціўся з горкі і як сышлі з яго сонечныя праменні...

Бываюць, вядома, з'явы і адваротныя. Бачыш сустрэчнага па той бок горкі. Сонца на дарозе няма, туманчык плыве з лесу. І здаецца табе гэты чалавек маленькім і крывенькім, думаеш, што нейкі карлік узбіраецца на горку.

Потым, што больш ён узыходзіць, што бліжэй становіцца да цябе, то ўсё вырастае і выпростваецца. Нарэшце ты бачыш, што гэта вельмі прыгожы чалавек: постаць стройная і высокая, паходка камандзірская. Усё ў яго прывабнае: і твар, і вопратка, і нават валасы, што трошкі паказваюцца з-пад шапкі. Каля такога чалавека хочацца прыпыніцца, сказаць яму ласкавае слова або хоць спытаць, куды ён ідзе і адкуль.

Не зусім проста пазнаць чалавека і на горцы, і за горкай. Трэба ўглядацца зблізку.

## ГОСЦІ НЕЧАКАНЫЯ...

Доўга мучыла і непакоіла Якава размова з Шыметам. Яна прыходзіла на памяць у дарозе, на нагрузках і разгрузках, нават у школе, у час вячэрніх заняткаў. Потым

пастаў момант, калі ўскладнілася ўсё яшчэ горш. Памятаючы наказ Валянціна, ды і па сваёй трывозе, Якаў штодня наглядаў за гаражом, ды нічога падазронага не заўважыў. Але вось аднаго разу ноччу нехта пастукаў яму ў акно.

Якаў толькі што прыйшоў са школы, яшчэ не раздзеўся. Адхінуў фіранку і пазнаў кажух гаражнага вартаўніка. Паспешна выйшаў на ганак.

— Што здарылася, дзядзька Талімон?

— Яно, можа, і нічога,— не паказваючы хвалявання, адказаў стары,— але нехта паехаў на тваёй машыне.

— Даўно?

— От толькі што. Я, прызнацца, быў трохі задрамаў у будцы — позна ўжо. Дык не пазнаў, хто паехаў.

Якаў на бягу схапіў бушлат і памчаўся ў гараж. Талімон прыклыпаў ужо тады, калі ён на другой машыне выязджаў з варот.

— У які бок паехаў? — больш знакамі, як голасам, спытаў шафёр.

— Туды, на будаўніцтва!

Узяў напрамак на першую пляцоўку. Пад'ехаў да клубнага будынка, паклікаў вартаўніка.

— Ці быў тут хто на машыне?

Вартаўнік адказаў, што не было, але неяк разгублена залыпаў вачыма.

Якаў вылез з кабіны і, стоячы на прыступцы, акінуў позіркам усё наваколле. Каля самага далёкага пасёлка нешта бліснула. Фары гэта ці не? Вельмі падобна на фары, бо так які бляск наўрад ці быў бы відзён на такой адлегласці.

Усе дарогі тут Якаў ведаў добра, таму паехаў у пасёлак, не ўключаючы святла. На малой хуткасці ўехаў у невялічкую вуліцу. Адразу заўважыў каля аднаго двара шырокі кузаў машыны. Бліснуў фарамі, пазнаў свой нумар, але ў гэты момант машына рэзка рванула з месца і пагрукацела ў цемру. Якаў уключыў дальняе святло і таксама даў газ. Маркі машын былі аднолькавыя, але Якаў адчуваў, што яму цяжка паспяваць за ўцекачом. Тая машына спраўная, дагледжаная, а гэтая марудна набірае хуткасць. Можа, таму гэты лайдак, што ўцякае, і схапіў тую машыну?

«Цяпер усё будзе залежаць ад спрыту,— падумаў Якаў.— Калі там сядзіць біты ліхач, то не дагоню яго,

уцячэ, а потым цяжэй будзе даказваць. Калі ж гэта Шыпулька, то нідзе не дзенецца, бо шафёр з яго такі ж самы, як і загадчык гаража. Каб толькі хапіла гаручага».

Узяўшы добры разгон, Якаў неўзабаве пачаў даганяць уцекача. Яшчэ праз некалькі хвілін фары яго трохтонкі ледзь не прапізвалі кузаў пярэдняй, але абагнаць не хапала сілы. І хуткасці такой не дасі, каб раптам заскочыць наперад, і ўцякач старанна сочыць за намерамі. Возьмеш трошкі ўбок, і ён бярэцца туды ж. Заставалася толькі выбраць зручны выпадак і перахітрыць працаўніка, як на вайне.

Але тут дарогі палявыя. Калі б нават і ўдалося выйсці на паралель, дык ён можа рэзка павярнуць убок і выскачыць на другую дарогу. Можа павярнуць і назад. Значыць, трэба як-небудзь вызначыць, куды ён паверне. Калі на раённы цэнтр, тады мець на ўвазе адну спробу, калі на горад — другую.

Якаў сцішыў ход і толькі фарамі трымаў пярэднюю машыну на прыцэле. Няхай чалавек супакоіцца, абдумае, куды яму ўзяць курс, тады і пагоня рыме адпаведную тактыку. Яшчэ ж не позна павярнуць і ў гараж.

Аднак не павярнуў чалавек ні дадому, ні ў раённы цэнтр, а выправіўся проста на горад. Тут Якаў адчуў, што можа не справіцца з задачай, бо гаручага ў яго мала, а ў пярэдняй машыне поўны бак. Збіраючыся на досвітку выязджаць, Якаў падрыхтаваў сваю машыну яшчэ з вечара. Відаць, злыдзень і ўлічыў гэта. Будзе газаваць да горада, а там схаваецца дзе-небудзь.

Такім чынам, надзея адна. Праз дзесятак кіламетраў невялічкі аб'езд, там рамантавалі дарогу. Калі ўцякач не ведае, што там на крайні выпадак можна праскочыць, дык возьме на аб'езд, калі ж ведае, то прыйдзецца самому апошні дух выняць з машыны, а перасцігнуць лайдака. Тут зноў жа — хто ў машыне. Калі Шыпулька, то ён не паедзе на шлагбаум. Ён, пэўна, і не ведае, што там наперадзе, і вельмі баіцца ўсялякіх масткоў, грэбляў, насыпаў. Асабліва пасля апошняга ныраня ў раку.

Наближаўся самы рашучы момант. Заўважыўшы далёчаты шлагбаум, пярэдні шафёр прытармазіў машыну: відаць, не адразу сцяміў, кудою лепш праехаць. Якаў выкарыстаў гэта і пад'ехаў зусім блізка. Пярэдні звярнуў на аб'езд, а Якаў даў поўны газ, збіў на хаду шлагбаум і на

кучах мёрзлага гравію выскачыў наперад. Уцякач паспрабаваў даць задні ход, але забуксаваў, трапіўшы ў слізкую калдобіну. Пакуль ён валтузіўся са скарасцямі, Якаў рыўком адкрыў яго кабіну і з-пад носа выхапіў ключы. Машына заглохла.

— Вылазь, зладзюга! — са злосцю крыкнуў Семігон, яшчэ не ведаючы, каму крычыць, з кім збіраецца ўступаць у бойку. У руках у яго быў развадны ключ, і намер высняваў цвёрды: хто б тут ні быў, хоць два чалавекі, хоць тры, а не выпусціць адсюль нікога і не паддацца.

— Вылазь, а то як агрэю па шкле, зубоў не пазбіраеш! — Якаў адвёў руку з ключом.

— Ну, чаго ты так ужо?! — раптам пачуўся зусім лагодны голас.— Чаго ты прывязаўся да мяне?

— Вылазь! — сурова паўтарыў Якаў, хоць ужо і ведаў, што гэта Шыпулька.

— Ну і вылезу,— згадзіўся Росцік,— няўжо ты думаеш, што я тут начаваць буду?

— Лезь у кузаў!

— Ну і палезу. Ныпрыш ты за мною, проста кроку ступіць нельга.

— Сядзі там і не варушыся, а то звяжу, як вепрука.

— Ну і сядзецьму.

Якаў хуценька адагнаў пярэднюю машыну, потым завёў сваю і выехаў на дарогу. Тут, умела манеўруючы, развярнуўся.

— Падай з кузава буксір! — загадаў ён Шыпульку, вылезшы з кабіны.

Той падаў і пахукаў сабе ў далоні, ссутуліўся.

— Нікуды я вельмі і не пабягу з маёй нагою,— загаварыў ён, хоць Якаў нічога ў яго не пытаў.— Хіба толькі змерзну тут, бо адзяваўся не ў вялікую дарогу.

Семігон узяў заднюю машыну на цвёрды буксір і, наглядваючы назад, паспрабаваў скрануцца. Цягнуць можна, толькі пасадзіць бы каго за руль. Няўжо ніхто не нагоніць?

Прыслухаўся, што там робіцца ў кузаве, але нічога не пачуў. Не прасіўся Шыпулька, не стукацеў, не грукацеў. Сядзеў, відаць, спакойна і пакорліва, можа, нават скурчыўшыся, апусціўшы галаву. І Якаву неяк шкада стала хлопца. Прыглушыў машыну і, адчыніўшы дзверцы, сказаў:

— Лезь у тую кабіну, калі хочаш! Будзеш руляваць.

Шыпулька паслухмяна выбраўся з кузава і, кульгікнуўшы да Якава, жаласліва папрасіў:

— Дасі хоць у гараж мне самому ўехаць. Га? Брыдка ж мне, разумееш?

— Рабі, што загадваюць! — сказаў Семігон і, як толькі Шыпулька сеў у кабіну, рушыў з месца.

Ехаў і ў думках дакараў сам сябе. Вось жа злавіў чалавека, кожнаму цяпер зразумела, што вінаваты ён, магчыма, нават злачынец, а верыць у гэта чамусьці не хочацца. Каб, можа, хто іншы, а то Шыпулька. Ён і вялікага дабра не зробіць, і на злачынства наўрад ці пойдзе.

Стары Талімон не спаў, калі дзве трохтонкі ўязджалі ў гараж, і ўхвальна кіўнуў Якаву.

«Што ж цяпер рабіць? — падумаў Якаў.— Дагэтуль было ясна: лавіць, даганяць. А далей? На двары ноч, ды позняя ўжо. Акрамя Талімона, нікога паблізу няма».

— Пойдзем са мною! — сказаў ён Шыпульку, калі той вылез з кабіны і разгублена ўтаропіўся яму ў твар.

Росцік моўчкі пайшоў. Каля вартаўнічай будкі ён падаў знак Талімону зачыніць вароты, а калі трохі адышліся, загаварыў пакрыўджана і ўсхвалявана:

— Ну, куды мы пойдзем? Куды? Да начальніка будаўніцтва, да Паўла Іванавіча? Па-першае, іх нікога няма дома, усе на нарадзе ў Мінску. А па-другое, каму гэта трэба. Няўжо ты сапраўды думаеш, што я такі, як ты назваў мяне там, на аб'ездзе?

— А які? — Семігон спыніўся, пранікліва паглядзеў Шыпульку ў вочы.

— Дурнаваты трохі,— моцным шэптам прамовіў загадчык гаража,— а больш ніякі. Калі сказаць табе чыстую праўду, то вялікага праступку я і сёння не зрабіў. Толькі, прашу цябе, Надзі нічога не кажы: у адной кабеціны на пасёлку хацеў пабываць. Вось і ўсё. Пехатою дайсці не магу, а начальства якраз няма...

— Брэшаш ты! — абурана заявіў Якаў.— Не веру! Ты і мінулы раз нахлусіў мне. І што тут Надзя? Чаго ты яе прыплятаеш?

— Не прыплятаю, а не хачу, каб яна пра гэта ведала. Каб хлусіў, то не баяўся б.— Шыпулька апусціў галаву і загаварыў ледзь не скрозь слёзы. — Усё-такі я кахаў яе і цяпер кахаю. З малых год яна была мне блізкая. Хіба вінаваты я, што яна мяне не любіць, цяпер нават адварочваецца, калі дзе сустрэнемся?

— Чаго ж ты ўцякаў, калі гэтак?

— Таму і ўцякаў. Не хацеў, каб мяне тут бачылі. Кабетка гэтая не ў вялікай славе. Акрамя таго, адчуваў, што толькі ты можаш за мной пагнацца. Я сам не памятаю, як уключыў матор, як рвануўся з месца. А ўжо калі рвануўся...

— Слухай! — перапыніў яго Семігон. — Не буду я тут забаўляцца тваімі байкамі, не буду і пытацца больш ні пра што. Поедзем у Чырвоныя Макі, здам цябе ўчастковаму, і няхай робіць з табою, што хоча.

— Дык яго таксама няма дома,— нібы нават шкадуючы, што так усё не клеіцца, паведаміў Шыпулька.— У іх нейкі злёт у вобласці, дык ён яшчэ ўчора паляцеў туды па сваім матацыкле.

— Выходзіць, што ты ўсё гэта ведаў, калі выязджаў,— заўважыў Якаў.— Пайшлі да Валянціна Палянскага, ён цяпер тут у канцы вёскі кватаруе.

— Яша! — вінаватым голасам прамовіў Шыпулька.— Ну, нашто нам турбаваць ноччу людзей, нашто падымаць трывогу? Толькі смяяцца будуць і з мяне, і з цябе. Хіба ты думаеш, што я ўцяку куды за гэтыя некалькі гадзін да раніцы? Неўзабаве пачне днець, табе сёння не трэба вельмі рана выязджаць, вось раніцаю і раскажам усё Валянціну. У чым я вінаваты, няхай з мяне за тое і спаганяць. Я не буду віляць, ухіляцца ад адказу. А каб ты спакойна спаў, вось на вазьмі сам мае шафёрскія правы і ўсе дакументы.

Паспаць Якаву ў гэтую ноч так і не давялося. Толькі ён лёг і, можа, на якую гадзіну забыўся першым сном, як нехта зноў пастукаў у акно. Стукат быў моцны і патрабавальны. Якаў усхапіўся, адразу стаў адзявацца. Ля акна стаяла быццам бы незнаёмая постаць, пэўна ж не Талімон і не Шыпулька. Хто ж мог грукацца так позна?

Семігон у адной гімнасцёрцы і без шапкі адчыніў дзверы ў сенцах. На ганку стаяў Шымет, у шэрым паліто з настаўленым каўняром і ў цыгейкавай шапцы з распушчанымі вушамі. Якаву здалося, што ён дрыжыць не то ад холаду, не то ад хвалявання.

— Гаворка наша гаворкаю,— ціха пачаў ён, каб нікога не разбудзіць,— а справа справаю. Ехалі нядаўна хлопцы паўз пляцоўку дарогаю. Сказалі вартаўніку, што адзін шафёр з аўтакалоны пацярпеў аварыю кіламетраў за дваццаць адсюль. Матэрыял у яго наш. Каштоўны ма-

тэрыял, важны, але справа, вядома, не ў матэрыяле. Чалавек нам перш за ўсё, ты ж разумееш. Тут, на месцы, якраз сёння няма нікога — я ўжо збегаў на пасёлак, да прараба. Хочам прасіць цябе праехаць, паглядзець, што там такое. Калі сам не здолееш памагчы, то адразу варочайся, падумаем тут разам.

Якаў хутка сабраўся і праз некалькі хвілін выехаў...

## ПАЛАТКА-АДЗІНОЧКА

Яго прывезлі ў раённую бальніцу амаль зусім без памяці. Дактары паклалі яго ў тую ж самую палату, дзе не вельмі даўно ляжаў Росцік Шыпулька. Далі знаць у Дабрасельцы, хутка прыехала Надзя і ўжо не адыходзіла ад яго ўвесь крытычны час. Нічога ён не гаварыў сам, нічога не адказваў, калі ў яго пыталіся, бо пры аварыі моцна выцяўся галавою.

К поўдню прыехалі Павел Іванавіч і Валянцін. Доўга сядзелі моўчкі каля Якавага ложка. Ад дактароў яны ведалі, што Якаў цяпер не загаворыць, паўрад ці нават расплюшчыць вочы, але сядзелі і чакалі. Можа, усё ж такі глянe, можа, хоць трошкі лягчэй яму стане, калі ўбачыць, што ён тут не адзін. Потым яны раіліся з дактарамі, як лепш лячыць хворага, можа, трэба выклікаць спецыяліста з цэнтра? А перад ад'ездам запрасілі Надзю ў асобны пакой і расказалі ёй жудасную гісторыю.

Праз некалькі хвілін пасля таго, як ноччу Семігон выехаў на дапамогу таварышу, прымчаўся ў гараж Шыпулька і стаў паспешна заводзіць машыну. Хоць Талімон глядзеў на яго падазрона і нават хацеў зачыніць вароты, каб не выпусціць, Шыпулька вырваўся з гаража і на самай вялікай хуткасці пагазаваў услед за Якавам. Дагнаць Якава ён не паспеў, аварыя здарылася раней. Калі Росцік пад'ехаў да гэтага няшчаснага месца, Якава ўжо ўкладвалі ў сваю машыну нейкія незнаёмыя хлопцы.

Вярнуўшыся, Шыпулька прагнаў дадому Талімона, зачыніўся ў вартаўнічай будцы і сядзеў там, пакуль добра развіднела. Людзям трэба было пуцёўкі выпісваць, а яго ніхто не мог знайсці. Потым ён праз маленькае акенца ўбачыў трэстаўскі «газік», выскачыў, кінуўся да шафёра:

— Хто прыехаў?

— Павел Іванавіч,— адказаў шафёр,— а начальніка яшчэ няма. Заўтра паеду па яго.

Усім вымахам сваіх цыбатых ног Шыпулька памчаўся да Паўла Іванавіча. Там ён прызнаўся, што пасля таго, як аддаў дакументы Якаву, не пайшоў дадому, а пабег на пляцоўку, дзе яго чакаў Шымст. Да гэтага між імі было ўгаворана прывезці з пасёлка схаваны там шыфер і такім чынам выкруціцца, схітрыць у час праверкі.

Кладаўшчык ужо ведаў пра няўдачу і адразу спытаў:

— Можна так зрабіць, каб Семігонава машына ехала і не ехала?

— Як гэта? — здзівіўся Шыпулька.

Хрыпучы шэпт кладаўшчыка быў злавесны і настойлівы. Відаць, Шымст абдумаў усё яшчэ да прыходу загадчыка гаража.

— А так! — рашуча паўтарыў ён.— Шафёр павінен выехаць з гаража і нічога не заўважыць пры выездзе, а там далей трохі пакруціцца ў адхоне або чокнуцца з сустрэчнай машынай.

— Нельга так, нельга! — спалохана загаварыў Шыпулька.

— Брэшаш, можна! Я раіўся з трохі большымі спецыялістамі, як ты.

— Дык гэта ж!..

— Рабі, што загадваю! — кладаўшчык ледзь не ўткнуўся сваім жоўтым і вострым, як цясак, падбародкам у Шыпулькавы грудзі, зыркнуў на хлопца шалёнымі бельмамі.— Я адзін не пайду за краты, май гэта на ўвазе! А гэты твой жаданы швагрык увесь час сачыў за табою і напаў на след. Ён ведае, куды ты ездзіў... Пакуль з ім там будуць вазіцца на дарозе, мы тут што-небудзь прыдумаем.

Выкарыстаўшы Талімонаву глухату, Шыпулька паздзейску прабраўся ў гараж і прыпсаваў у Семігонавай машыне рулявую цягу.

Дома ён не мог заснуць ад страшэннай пакуты. Валяўся на пасцелі адзеты, уставаў, хадзіў з кута ў кут, пазіраў чагосьці ў акно. Прачнулася маці, пачала на яго крычаць. Тады ён выйшаў з хаты. Снуючыся сюды-туды па двары, усё намагаўся ўявіць, што ён не зрабіў такога нечуванага злачынства свайму таварышу, што гэта быў толькі сон. Якаву не пагражае катастрофа, Якаў будзе жыць, раніцою яны сустрэнуцца і пойдуць разам да каго-небудзь з кіраўнікоў будаўніцтва. Якаў не будзе

гаварыць там злосных слоў... Ён добры... Хоць і замахваўся нядаўна жалезам, але не выцяў бы... Не можа ён выцяць невінаватага чалавека... Верыць. Хлусіў яму, а ён верыць. Ні ў цёткі не быў, ні ў кабеты... Усё гэта Шымет, пракляты вырадак. Абкруціў, аблытаў...

І раптам здалося, што Шымет наскрозь праколвае яго сваім жоўтым падбародкам-цесаком. Адчуваецца рэзкі боль у грудзях... Шымет тут, перад вачыма. Значыць, праўда, даваў ён загад... На пальцах халодная мазута, на далоні шчыміць чырванаваты рубчык ад ключа... А што, калі Якаў зараз паедзе? Што, калі ён ужо ў машыне?..

Шыпулька рынуўся ў гараж, паехаў следам, але спазніўся.

На радасць усім добрым людзям Якаў папраўляўся хутка. Малады здаровы арганізм браў сваё: галаўныя болі паступова сцішаліся, менш непакоілі цяжкія ўшыбы.

За гэты час рэдка хто з шахтбудаўцаў не пабываў у яго. Наведаўся нават аднаго разу Талімон, як чалавек найбольш вольны ўдзень. Перадаў паклон ад сваіх неспакойных аднадумцаў — старога Тумаша і каваля. Седзячы потым на табурэтцы і хаваючы пад яе свае вялізныя жоўтыя бахілы, стары скоса паглядаў на нязвычны для яго белы халат, што накінулі яму на плечы, і маўчаў. Ведаў, што калі пачаць добрую гаворку, то пры вушной тугаватасці трэба крычаць. А ці можна крычаць тут, у бальніцы? Можа, і хвораму гэта шкодна? Толькі перад адыходам паківаў галавой, патужыў, што вось каб не ён, стары пень, то, можа, і ўсё добра было б. Трэба было яму тады бегчы поччу, стукаць у акно!..

Адказ на гэта ён не так пачуў, як зразумеў па знаках Якава і па выразу яго твару. Якаў дзякаваў старому вартаўніку за помач. Цяпер хоць прасвятлілася многае і не будзе сядзець чорным жмуткам на душы.

У руплівыя прадвясеннія дні ў Надзі вельмі многа было работы, але яна прыходзіла да Якава амаль кожны дзень. Ведаючы, што брату найбольш цікава слухаць пра дабрасельскія справы, яна цэлымі гадзінамі расказвала аб сваім звяне.

— Усё ў нас будзе цяпер не так, як летась, — радуючыся за сваіх дзяўчат, гаварыла яна. — Усё зменіцца.

— А што, замуж павыскокваеце? — усміхаўся Якаў. — Жаніхоў цяпер хапае.

— Можа, хто і выскачыць, — згаджалася Надзя, — але галоўнае не ў гэтым. Будзем працаваць па-новаму і жыць зусім не так, як раней. Вось гэтымі днямі абедзве брыгады Палянскага сабраліся, пастанавілі змагацца за права стаць брыгадамі камуністычнай працы. А мы таксама сабраліся. Чым мы горшыя за іх? Там гэтакія ж самыя дзяўчаты, як і ў нас. Многія нават вучыліся разам з нашымі. Яны будуць на шахтах, а мы — на льне. Яны са сваёй тэхнікай, а мы са сваёй.

Пры такіх размовах Якаў заўсёды прыкмячаў, што пра шахтбудаўцаў Надзя гаворыць не менш, як пра сваё звяно. І вельмі добра ведае аб усім, што там робіцца. Гэта трошкі забаўляла яго і радавала, бо ў душы ён ухваляў, што сястра неяк сама, без яго ўплыву, выбрала для свае ўвагі такі калектыў, які падабаецца і яму. У калектыве, вядома, не без адметнай асобы. Але і гэтая асоба па душы. Колькі разоў здаралася: стамляўся, пачынаў сумаваць у дарозе, уяўляліся нават адзінота, адарванасць ад людзей. А прыходзіла на памяць, што сёння яго чакаюць хлопцы, што Валянцін, пэўна, ужо сядзіць у Антосішынай хаце, каб потым разам ісці ў клуб або ў школу на палітзаняткі, — і адразу рабілася весялей.

Прыбегла аднаго разу Надзя ў палату і яшчэ не паспела перадаць хлапечыя і дзявочыя падарункі, паклоны ад Антосіхі, як паведаміла навіну:

— Табе, Яша, пакой у новым доме намецілі. Ачуньвай хутчэй, будзем спраўляць наваселле!

У голасе, у вачах столькі радасці, што гатова б пусціцца ў скокі, каб не бальніца.

— Чаму гэта мне аднаму? — быццам бы не падзяляючы радасці, спытаў Якаў. — Павел Іванавіч абяцаў нам з табой дваім.

Надзя неяк адразу асеклася, пачырванела.

— Хіба ты не пойдзеш разам са мною ў новую кватэру?

— Ведаеш, — ніякавата загаварыла дзяўчына, — табе лепш аднаму перасяліцца. Усё ж такі, ведаеш?..

І Якаў зразумеў, што ў яе іншыя планы, што радуецца дзяўчына не толькі ад таго, што брату паабяцалі пакой.

— Значыцца, і тваё наваселле? — праніклёна глянуўшы на сястру, спытаў Якаў. — Асобнае, больш урачыстае?

— Ды не,— запярэчыла Надзя, аднак апусціла вочы. — Усё ж такі, разумееш?.. Трэба тут глядзець трохі і наперад. Не будзеш жа ты ўвесь час адзін.

— А, вось куды ты! — без здзіўлення, але і без радасці прамовіў Якаў. — Аб гэтым я цяпер не думаю.

— Чаму? — зусім сур'ёзна спытала Надзя. — Хіба ты горшы за людзей? І мне будзе радасна, калі ў цябе будзе свая сям'я.

Якаў маўчаў, адвярнуўшыся да акна. Яму цяжка было ўшчыпаць гэтую гаворку, бо толькі ўстрывожыцца сэрца, а да ніякага ладу тут не прыйдзеш.

— Хіба ты ўжо цяпер і не пішаш ёй? — не пакідала дапытвацца Надзя. — І нічога не ведаеш пра яе?

— Яна не адказала мне ні на адно пісьмо, — азваўся нарэшце Якаў. — Як жа мне пісаць? Там нават забылі, што ёсць на свеце нейкі шафёр.

— Ты дарэмна так, — з усёй дзявочай ласкавасцю запярэчыла Надзя. — Я ніколі не бачыла яе, ведаю толькі па тваіх расказах. Але чамусьці мне здаецца, што яна вельмі кахае цябе. Кахае, мучыцца, а не піша. І гэта ад гордасці, разумееш? Я шкадую цябе — ты не крыўдуй за гэтае слова. Мне цяжка, калі бачу, душой адчуваю, што ты пакутуеш, перажываеш. Але я паважаю яе за такую гордасць! Я сама такая. Не дай божа, хто са мною гэтак абыдзецца, як у цябе выйшла з ёю! Памру, а не дарую! Вырву з сэрца маё каханне, заглушу нават памяць аб ім! Няхай адна навек астануся, няхай палохае і сніцца самотная, пакутніцкая старасць, усё роўна не адступлюся ад свайго закону, не звярну са свае сцежкі.

— Ты вельмі ўжо суровая, — ціха сказаў Якаў пасля доўгага маўклівага роздуму. — Бывае, што іншаму чалавеку і трэба дараваць. У кожнага жыццё ідзе пасвойму.

— Да цябе я, можа, і не была б такая суровая, — трошкі змякчылася Надзя. — Тут гаворка пра наўмысныя ўчынкі, а ты, вядома ж, не такі, каб наўмысля рабіць каму шкоду. Зоня мала ведае пра гэта. Тваю выпадковую памылку яна прыняла, мабыць, за праяву характару. Мне здаецца, Яша, што як толькі ўстанеш і зноў возьмешся за работу, адразу з'ездзі на сваю былую кватэру. Раскажы там усё. І табе лягчэй будзе і... нам.

Якаў здзіўлена ўзняў вочы.

— Мне, я хацела сказаць, — папpавілася Надзя. —

Не думай, што мне лёгка глядзець, як ты часам апускаеш галаву.

«Ужо і Валянцін пра гэта ведае, — мільгнула ў Якава думка. — Прагаварылася дзяўчына».

У першы момант неяк трохі няёмка стала і крыўдна на сястру, што яна не ўхавала яго таіны. А потым, удумаўшыся, Якаў зразумеў, што здзіўляцца і крыўдаваць тут няма чаго. Валянціну ён і сам мог усё расказаць, а Надзя яшчэ больш верыць гэтаму чалавеку. У іх, мабыць, ужо такія ўзаемаадносіны, што сакрэтаў не можа быць. За гэта нельга Надзю папракаць. Яна шчаслівая, гордая і шчырая ў сваёй сапраўднай дружбе, у сваім першым і светлым каханні. Так і павінна быць у харошых людзей.

Якаву хацелася яшчэ раз зазірнуць сабе ў душу, яшчэ раз перабраць у памяці ўсё, аб чым нагадала сёння сястра. Але неўзабаве дзверы ў палату ціха адчыніліся, і на парозе паказалася жанчына, якую ў белым халаце Якаў ледзь пазнаў.

— Ці можна да вас? — нясмела спытала яна і ўсё трымалася за дзвярную ручку, не адважваючыся ступіць далей.

— Заходзьце, заходзьце, — першай запрасіла Надзя. — Сядайце вось тут, — яна ўступіла месца на белай табурэтцы, а сама прысела на ложак.

Жанчына падышла, сарамліва паглядваючы на сляды на падлозе ад сваіх мокрых валёнак, асцярожненька, спакваля села і раптам утуліла твар у адварот халата, ціха заплакала.

Гэта была Анэта, Шыметава жонка. Якаў не то што здзівіўся яе прыходу, хоць, вядома, не чакаў такога наведвання, але ўсё ж адчуў сябе даволі ніякавата, бо не мог прадбачыць, што яна будзе гаварыць, і не ведаў, як пачаць гаворку самому.

Загаварыла першая Анэта. Голас яе быў шчыры, зжалоблены слязамі.

— Вы, Якаў, мабыць, думаеце, што і я ў гэтым вінавата, што я ўсё ведала. Пакляпуся вам усім, што ёсць у мяне самае дарагое — сваім дзіцём, якога вы ўратавалі ад смерці, што я нічога не ведала. Ён вельмі скрытны быў ад мяне і, мабыць, ад усіх. Ніколі я не чула, каб ён што гаварыў ці пра матэрыялы, ці пра якія грошы. Ды ў нас жа нічога і няма! З чым прыехалі сюды яшчэ ў

МТС, з тым і цяпер жывём. Які быў пусты дворык са старой хаткай, такі ён і цяпер. Гусей толькі чародку развяла...

Жанчына крыху падняла бледны заплаканы твар, паглядзела спачатку на Надзю, потым на Якава і, трохі ўцёршыся ражком халата, пачала гаварыць далей:

— Праўда, неяк аднаго разу, павячэраўшы, кажа ён мне: «Паедзем, Анэта, на той год у Алупку (там у яго нейкія родзічы ёсць), купім там пляц з вінаградам, пабудуем уласны домік і будзем жыць з адных кватарантаў».

Я, вядома, прыняла гэта за смех. Мала пра што можа падумацца чалавек, добра павячэраўшы? На чорта мне, кажу, гэтая твая Алупка. Мне і тут добра. Давай лепш падладзім крыху гэтую хату, што нам далі, а то разваліцца.

— Дык за што ж яе падладзіш?

— А за што пляц з вінаградам?

Засмяяўся і маўчыць. Больш я ніколі ад яго слова пра гэта не чула. Хто яго ведае, ці ён збіраўся кідаць нас з Віцькам, ці спадзяваўся, што мы ўсё-такі паедзем, калі прыйдзе на гэта пара. Ні пра Шыпульку ні разу не чула, ні пра вартаўніка. Там жа яшчэ нейкі майстар замешаны — Шыпулька пра ўсё расказаў. Каб ведала, то жыцця не пашкадавала б, а не дапусціла б да таго, што цяпер выйшла. Верыце вы ці не?

Жанчына зноў абвяла позіркам Якава і Надзю і прытуліла да ўстрывожаных вуснаў ражок халата.

— Мы ведаем, што вы не вінаваты, — зноў за абаіх адказала Надзя.

Якаў толькі злёгку кіўнуў галавой.

— Ну, а як ваша здароўе? — крыху супакоіўшыся, спытала жанчына. — Гэта ж трэба так зрабіць, трэба так надумацца!..

— Ужо лепш цяпер, — даверліва адказаў Якаў. — Неўзабаве думаю выпісвацца.

— То і дзякуй богу, — з палёгкай прамовіла Анэта. — Я, мабыць, і пайду ўжо, не буду вам замінаць ды трывожыць вас сваімі слязьмі. Гэта ж мне так цяжка было на сэрцы... Хацелася праведаць ды пагаварыць... Дзякуй вам за ўсё: і за Віцьку і за тое, што сёння не прагналі...

— Пачакайце трошкі, цётка Анэта, — сказала Надзя. — Пойдзем дадому разам.

Праз некаторы час Якаў астаўся ў палаце адзін. Невялічкая палатка-адзіночка. Сюды перавялі яго ў свой час, як вельмі цяжка хварэў. Цяпер Якаў і не цяжка хворы, але яго не чапаюць, не загадваюць пераходзіць. Можа, таму, што ў бальніцы няма больш цяжка хворых, а хутчэй за ўсё — Павел Іванавіч закінуў слоўца. Кожны дзень звоніць, пытаецца ў медыкаў пра здароўе, перадае вітанні. Забараняе крапацца, пакуль сам не прыедзе, не забярэ дадому.

А так бы хацелася ўстаць, выбрацца націху з гэтай палаткі і галаснуць на вуліцы першаму сустрэчнаму шафёру!

Хоць бы побач пасядзець з ім, калі ўжо нельга ўзяцца за баранку. А то як задрыжаць у акне шыбы ад зісаўскага матора, як зашоргае дарожны гравій пад шынамі, дык аж сэрца пачынае калаціцца. Здаецца, што толькі ў сне быў той час, калі сам сядзеў за рулём, калі паслухмяная трохтонка магла мчаць дзень і ноч і замчаць хоць на край свету.

Можа, цяпер і зусім нельга будзе сесці на машыну? Можа, дактары знойдуць што-небудзь такое ў вачах ці ў вушах?..

Ад такой думкі камянее сэрца. За гэтыя часы бальнічнага жыцця вельмі многа перадумана. Ніколі так ясна не паўставаў свой шлях. Не роўны ён, не гладкі, але прасветлены наскрозь. Не толькі трохтонка павінна быць ласкавай у руках Якава, а ўсялякая аўтатэхніка. Няхай доўгія месяцы на гэта спатрэбяцца, няхай гады!.. Можа, не ўдасца ўсяго дамагчыся тут на месцы, як гэта робяць Надзя і яе дзяўчаты, як хлопцы з брыгады Валянціна. Можа, не заўсёды давядзецца крочыць побач з гэтымі брыгадамі — шафёру цяжка быць у брыгадах,— але душою і сэрцам ён заўсёды будзе з імі.

Глянуць бы хоць адным вокам, як яны цяпер працуюць. На шахтбудзе, пэўна, ужо глыбакавата пройдзены ствалы, у гарадку ўзняліся новыя карпусы. Не так і многа часу прайшло, а ўяўляецца, што вельмі вялікія змены адбыліся на ўсіх будаўнічых пляцоўках. Прыйдзеш — не пазнаеш.

Каб толькі не шкодзіў больш ніхто, каб не з'яўляліся больш шэльмы...

У верхнюю шыбу адзінага, закругленага пад столлю акна весела паглядвае сонечны прамень. Ён ужо даўпа-

вата паглядвае, толькі спачатку ў адзін краёк шыбы, потым у сярэдзіну, а цяпер у процілеглы краёк. Якаў ведае, што гэта ўжо развітальны позбліск сонца. Хутка настане вечар — самая сумная для хворага пара. А там яшчэ ноч. Можа, будзе трохі спацца, а можа, і не...

Невядома адкуль зноў пачуўся голас Анэты, уявіліся нават яе бліскучастыя ад слёз вочы:

«Не думайце, што і я вінавата...»

Не думаў гэтак Якаў, але добра, што яна прыйшла. Каб не прыйшла, то як было б успомніць пра яе? Хто гэта сказаў бы, што муж вінаваты, а жонка не? Тады яшчэ горш было б на душы. Няхай Шымета не адразу мог раскусіць, а то магло выйсці, што і гэтая жанчына, такая ласкавая, шчырая, выглядала б немаведама як.

Цяпер усё стала на свае месца. Канешне, Шымет не мог давярацца сваёй жонцы. Відаць, ён і Шыпульку не зусім давяраў, толькі выкарыстоўваў яго як слабавольнага і схільнага да градусаў чалавека. Але памыліўся. Нават Шыпулька — і той не пайшоў без аглядкі за ім. З кожным днём усё цяжэй і цяжэй розным шыметам сярод нашых людзей...

Якавам раптам авалодаў прыкры неспакой: можа, таму яшчэ і сустракаюцца шыметы, што вось такія людзі, як ён сам, бываюць часам залішне даверлівыя. Калі яны самі не могуць зрабіць нічога дрэннага, дык ім здаецца, што і ніхто іншы на гэта не здатны. Можна было раней вывесці на чыстую ваду гэтага лайдака Шыпульку: кожны дзень сустракаліся, кожны дзень абменьваліся нібыта сяброўскімі словамі. А калі ўжо трапіўся ў рукі, то трэба было залыгаць моцна, не раздумваць, не вагацца.

Шымет і раней непакоіў, стаяў у думках. Але ж гэта — не Шыпулька. Той гэтак умеў прыкідвацца і маскіравацца, што нават блізкія да яго людзі нічога не заўважалі. Два процілеглыя чалавекі жылі ў адным...

Наступны бальнічны дзень пачаўся гэтак жа, як і мінулы. Якаў яшчэ спаў, калі ў палату зайшла медсястра. Зайшла яна ціха, а градуснік паставіла так, што Якаў прачнуўся. Было яшчэ зусім рана, у акне толькі ледзьледзь пачынала шарэць. Спаць больш не хацелася — градуснік адагнаў сон. І ад ляжання набольваюць бакі. Як сёння пройдзе дзень? Ніхто не абяцаў прыйсці, і Надзя вельмі занята. Можа, пазвоніць Павел Іванавіч. Адкуль? З будаўніцтва ці з Мінска? Каб можна было самому на-

дысці да тэлефона. Паслухаць бы ды распытаць аб усім. А то зойдзе ў палату медсястра і суха скажа: «Вам званілі». І цэлы дзень у адзіноце, у нейкім трывожным чаканні: што пакажа градуснік, што скажуць урачы? Хто здагадаецца хоць вестку перадаць аб тым, што робіцца за бальнічнымі сценамі? Тут, што больш ляжыш, то ўсё мацней падакучае думка, быццам усе людзі хворыя, у кожнага што-небудзь баліць і ён лечыцца або павінен лячыцца...

Так цягнуўся ў Якава час ледзь не да самага паўдня. Потым, неяк задумаўшыся, ён квола звёў вочы, супакоіўся і заснуў. Сон гэты быў рэдзенькі, слабенькі, як позняя павуцінка. Скрозь яго ўсё чулася і амаль што бачылася, толькі што не хацелася варушыцца, расплюшчваць вочы. Можа, заўтрашні дзень будзе весялейшы ці гэтак жа сцягнецца. Магчыма, прыйдзе хто-небудзь... А калі гэтак усе дні, то лепш уцячы адсюль, не чакаць ні выпісвання, ні якіх іншых фармальнасцей.

...Калі ў дзверы ціха пастукалі, Якаў здрыгануўся, але не паверыў, што гэта стукаюць, падумаў — здалося. Праз нейкі час зноў пастукалі, ужо трошкі мацней. Якаў нібы і прачнуўся, але голасу не падаў — усё яму думалася, што гэта нейкі зман, бо не надта хто стукае, калі заходзіць да яго. Падцягнуў да падбародка прасціну, адхіліўся трохі ад акна, каб не вельмі жаўцела ад святла ў заплюшчаных вачах. Зноў супакоіўся і зноў вярнуўся да яго той жа самы рэдзенькі сон. Колькі ён ліпеў, гэты сон, невядома, але прачнуўся Якаў ад лёгкага скрыпу табурэткі. Прачнуўся, расплюшчыў вочы, здзіўлена, з недаверам замаргаў. На табурэтцы сядзела дзяўчына і з нясмелым чаканнем глядзела на яго.

Якаў ухапіўся рукамі за твар, з радасцю, якая можа быць толькі ў сне, працёр вочы. Глянуў і раптам устаў:

— Зоня?!

— Ляжы, Яша, ляжы, — ціха сказала дзяўчына. — Урачы табе яшчэ не дазваляюць уставаць.

— Няўжо гэта?.. — не верачы шчасцю, усхвалявана загаварыў Якаў. У голасе і бязмежная радасць і трывога. — Няўжо гэта ты, Зонечка? — Ён з парывам узяў яе руку, цёплую, трошкі дрыжачую, стаў, як малы, гладзіць цвердаватыя костачкі, а потым, сам не ведаючы як, паднёс да вуснаў.

Зоня мякка, але настойліва адняла сваю руку.

— Ты лажыся, — патрабавальна сказала яна. — Раскажы, як сябе адчуваеш, што ў цябе баліць. Гэта ж трэба — такі выпадак. Я толькі ўчора дачулася, проста аж у сэрцы забалела.

Якаву не хацелася лажыцца. Ён першы раз устаў за ўсё сваё лячэнне і не адчуваў, што гэта яму цяжка. Трошкі марачыла, пастуквала ў галаве, але, можа, гэта ад хваляваппя, ад такой нечаканасці, што нялёгка вытрымаць.

— Я пасяджу з табою, — нібы просячыся, загаварыў Якаў. — Мне добра. А калі ты прыехала? Надоўга ці так?..

Ён не дагаварыў і стаў намагацца паправіць за спінаю падушкі, каб узлегчы на іх.

Зоня хуценька ўстала, спрытна, здавалася, зусім нячутна памагла яму і, захінуўшы спераду белы халацік, зноў села на ранейшае месца.

— Я толькі ўчора і прыехала, — з прыкметным стараннем быць зусім спакойнай сказала яна. — На практыку наш курс разаслалі. На месяц.

— От добра, — не спускаючы з дзяўчыны радасных вачэй, сказаў Якаў. — А я... Ой, як тут выйшла!.. Каб дома быў, то хоць памог бы табе. Дзе ты жывеш, у каго? Няхай бы напісала хоць перад выездам.

— Уладзілі мяне, — з ноткай абыякавасці сказала Зоня. — На нейкім пасёлачку. Дзяўчаты ўзялі да сябе.

— А што ты, кім ты, як?.. — не ведаў хлопец як і пытацца.

— Проста рабочай, — адказала Зоня. — На шахтбудзе, разам з усімі дзяўчатамі.

— Хто там майстрам, Валянцін?

— Не ведаю, як яго завуць, але малады такі хлопец, у плашчы.

— Гэта Палянскі, — пацвердзіў Якаў сваю здагадку і прымоўк. — Між іншым, дружок мой цяперашні, — дадаў потым і зноў прымоўк.

Хацелася гаварыць не пра гэта, але цяжка было пачаць тую гаворку, якая так многа разоў гучала ў снах і ўяўленнях. Што скажа Зоня, як яна будзе глядзець на яго ў час такой размовы. Загарыцца яе свежы, чысты твар ці пазмрачнее? Засвеціцца нейкім дзівосным, пяўлоўным святлом яе высокі лобік пад ружовым берэтам ці прыморшчыцца, як гэта часта бывала, калі ёй што не па-

дабалася? А можа, раптам устане і пойдзе, ля парога пажадае для ветлівасці хутчэйшай папраўкі...

Няёмкае, напружанае маўчанне стала ўжо гнясці Якава, ён адчуваў, што і Зоня разгублена адводзіць вочы, намагаецца знайсці што-небудзь прыкметнае ў палаце ці за акном. Няхай бы яна смялей гаварыла, няхай бы пыталася, пра што толькі хацела! Ён рад быў бы яе пытанням і адказаў бы на ўсякае, якое яно ні было б.

Але дзяўчына маўчала. Тады Якаў, глыбока ўдыхнуўшы паветра, каб вымавіць адразу ўсё, што хацеў, запытаўся:

— Чаму ты, Зонечка, не пісала мне, не адказала ні на адно маё пісьмо?

Дзяўчына спыніла на Якаве доўгі ўважлівы пагляд, нібы хочучы ўбачыць яго сэрца, душу, потым сумна апусціла вочы і не сказала ні слова.

— Зоня!.. — быццам напомніў Якаў.

— Не будзем пра гэта, — ледзь чутна сказала дзяўчына. — Усё даўно ўжо мінулася.

— Мне было вельмі цяжка, — прызнаўся Якаў. Вельмі! Каб я мог табе ўсё расказаць!..

— Не трэба, — ціха паўтарыла Зоня.

Чаму яна так сказала? Якаву аж балюча стала. Няўжо нельга заўважыць, адчуць, што ён гаворыць шчыра, ад усёй душы, што яму лягчэй было б працізаць самога сябе, чым сказаць ёй няпраўду.

Зоня, мабыць, адчувала гэта, бо праз некаторы час дадала:

— Я доўга ляжала пасля таго, як ты пайшоў ад нас... Аж у бальніцы...

Сказала гэта і раптам закрыла твар рукамі. Плечы яе пачалі ўздрыгваць.

— Зонечка, — ласкава і чулліва пачаў суцяшаць Якаў. — Зонечка, мілая. — Ён асцярожна дакрануўся да яе берэта.

— А потым мама была хворая, — скрозь плач дадала дзяўчына і разам з табурэткай адсунулася ад ложка.— Ты ж ведаеш, што ў нас дома... Бацька нас некалі ашукаў, пакінуў... Мама і цяпер не можа гэтага забыць. Як толькі што, дык цяжка перажывае, пакутуе.

Якаў у роспачы нахіліўся бліжэй, працягнуў да Зоні рукі, але ў гэты момант у галаве моцна зашумела, і ён з цяжкім стогнам адкінуўся на падушкі.

— Памаленьку! — спалохана выкрыкнула Зоня і ўсхапілася, каб памагчы. — Што з табой, што? Можа, паэваць каго?

— Не, не, — глуха прамовіў Якаў. — Не трэба.

— Устрывожыла я цябе сваімі слязамі. Паляжы спакойна, забудзь пра ўсё. А я пайду ўжо, там аўтобус трэстаўскі... Чакаюць мяне.

— Пабудзь яшчэ хоць трошкі, — папрасіў Якаў. — Сядзь, пасядзі.

— Я прыйду яшчэ, можа, вырвуся...

Праз некаторы час яна, ціха і роўненька ступаючы, пайшла да дзвярэй, а Якаў праводзіў яе журботным і ласкавым паглядам. Потым яму вельмі хацелася зноў устаць, каб паглядзець у акно, развітальна паківаць галавой, усміхнуцца, але сілы яшчэ было мала.

## ВЯСНА

Больш трох тыдняў прайшло, пакуль Якаву дазволілі выпісацца з бальніцы. Надзеў ён сваю, прапахлую бензінам, вопратку, глянуў на раскіданую пасцель і да спалоху здзівіўся: як можна было вылежаць столькі часу? Выйшаў на ганак. На намостку гуляў вясёлы сонечны зайчык, а прыступкі былі сухія і, мабыць, ужо цёплыя. Ступіць бы на іх босымі нагамі, як некалі ў маленстве дома!

Следам выйшла Надзя, а Павел Іванавіч нечага затрымліваўся ў бальніцы, мабыць, размаўляў з урачамі.

— Дзе машына? — нецярпліва спытаў Якаў.

— Там, — паказала Надзя за вугал, — у бальнічным двары.

Якаў ледзь не пераскочыў цераз прыступкі і шпарка рушыў да «газіка».

— Памаленьку ты, — непакоілася Надзя, бегучы за ім. — Чаго так спяшаешся?

Якаў з ходу адчыніў дзверцы і ў момант апынуўся за рулём. Узяўся абедзвюма рукамі за баранку, паставіў ногі на педалі, і здалося яму, што машына вось-вось загудзе, зрушыцца з месца і віхрам пранясе яго праз гэты двор, праз мястэчка...

Успомніў, што ў шафёрскіх кішэнях павінны знайсціся запасныя ключы. Запусціў туды абедзве рукі, на-

шарыў сярод розных шрубак, болцікаў і падчапіў пальцам драцяны абручык. Прымераў адзін ключ, другі...

— Садзіся! — крыкнуў ён Надзі і спрытна завёў машыну. Калі дзяўчына, здзіўлена ўсміхаючыся, умясцілася на заднім сядзенні, Якаў зрабіў майстэрскі круг па двары і плаўна затармазіў каля самага ганка.

— Што гэта такое? — пачуўся з калідора голас Паўла Іванавіча. Ён выйшаў на сонечны ганак у шынялі нааашкі і шапку яшчэ трымаў у руцэ. — Ты што гэта, Якаў?

— Дазвольце, Павел Іванавіч!

— А ключы дзе ўзяў? — Павел Іванавіч хапіўся за сваю кішэню: няўжо забыў? От шафёр!

— У кожнага вадзіцеля знойдзецца сёе-тое ў запасе, — лагодна, каб не прагнявіць чалавека, сказаў Якаў. — Я хоць з мястэчка выеду.

— Не, Якаў, — запярэчыў Павел Іванавіч. — Табе яшчэ рана садзіцца за руль. Толькі што гаварыў з урачамі. Раяць дзён некалькі пагуляць, адпачыць на вясковым сонцы, а тады ўжо...

— Каб вы ведалі, Павел Іванавіч!..

Рукі Якава хораша ляжалі на баранцы, вочы глядзелі ў ветравое шкло. І нейкая незвычайная прагнасць і замілаванне адчувалася ў гэтым ясным, маладым паглядзе. Матор гурчаў ціха і роўна. Здавалася, не дрыжаў ён, не даваў абаротаў, а задуменна спяваў нейкую доўгую старэчую песню.

Павел Іванавіч моўчкі сеў побач з Якавам.

Лёгка, хутка і быццам без ніводнага штуршка праехалі самую доўгую і самую выбітую местачковую вуліцу. Якаў нібы нічога не рабіў машыне: не муштраваў яе нагамі, не вывярочваў рукамі. Кожны сказаў бы, гледзячы з боку, што яна сама ведала, што рабіць: павольна сцішала ход, калі трэба было пераехаць лужыну ці канаўку, ахвотна набірала скорасць, дзе дарога была гладчэйшая. Дзе бачком, дзе сярэдзінкаю, але заўсёды выскоквала на сухое, роўнае месца і, нібы гуляючы, рвалася наперад.

«Куды ж ён паедзе? — думаў Павел Іванавіч, непрыкметку любуючыся Якавам. — Няхай едзе, куды хоча».

Паступова адыходзіў намер забраць у хлопца руль, як толькі выедуць за гарадскі пасёлак. Ці можна з такіх рук што-небудзь забіраць? Такімі рукамі можна толькі

захапляцца. Колькі часу спатрэбілася б Паўлу Іванавічу, каб навучыцца так ездзіць? Ды яшчэ на незнаёмай машыне.

«На ўсё патрэбна здатнасць»,— гавораць мудрыя людзі.

А для Якава вельмі кароткай здавалася дарога. Неяк вельмі ж хутка мінулася палянка за раённым цэнтрам, на ёй ужо відзён быў жоўты пясок.

Непрыкметна сплыла пад колы лясная дарога з шырокімі пачарнелымі каляінамі. Закружыліся потым калгасныя палеткі, нібы выхваляючыся, што яны ўжо вольныя ад снегу, што над імі наперабой адзін перад адным выспеўваюць жаваранкі. Закружыліся і нібы толькі прамільгнулі каля машыны. Вось ужо і тое скрыжаванне дарог, якое прымушае спыняцца ледзь не кожнага шафёра. Яно яшчэ не мае дарожных стрэлак. Адна дарога вядзе ў новы горад, адна — у Дабрасельцы, адна — у Чырвоныя Макі.

Павел Іванавіч нічога не сказаў, калі Семігон павярнуў на горад. Не падала голасу і Надзя, хоць ёй вельмі трэба было наведацца ў сваё льнаводчае звяно. Хочацца Якаву пабываць на будаўніцтве, як жа яго мінуць? Але і шкада яму, што так хутка праляцела дарога і быццам нечакана скончылася тое, аб чым так соладка марылася ў бальнічнай палаце. Няхай бы гэтая дарога была бясконцая, каб можна было ехаць і ехаць, нібы ляцець у паветры; каб можна было за адзін дзень праехаць усю тую адлегласць, што не праехаў з-за хваробы, зрабіць усе тыя справы, што асталіся нязробленыя...

Гарадок прыветна ўсміхаўся новымі вокнамі. Няўжо так многа стала вокан? Здаецца, і не вельмі многа часу прайшло, а як напрыгажэў і пасталеў гарадок! Клуб ужо амаль гатовы. А колькі вокан і шыбак у адным гэтым клубе!

Павел Іванавіч паказвае рукою:

— Вунь, Якаў, твой дом!

Якаў маўчыць, бо ён яшчэ не спыніў машыну, а Надзя зацікаўлена пытае:

— Каторы ён, каторы?

Павел Іванавіч зноў паказвае рукою, але адчувае, што здалёк Надзя можа і не ўгадаць гэтага дома. Многа там стаіць будынкаў, ледзь не цэлы квартал. Усе яны з гэтага боку зіхацяць вокнамі, усе фанабэрацца высокімі

дахамі і крутымі лабкамі, усе нібы паварочваюцца да цябе і з гонарам паказваюць прыгожыя, з белай цэглы, фасады.

Якаў таксама не ўгадвае свайго дома, толькі прыкладна адчувае, дзе ён павінен быць, але ўязджае ў горад з такой радасцю, якой раней не адчуваў. Усе гэтыя шкляныя лісты, што так хараша ажылі цяпер у вялікіх і малых шыбах, прывёз сюды ён. Значная частка шыферу і цэглы таксама дастаўлена яго працавітым грузавіком. Мала яшчэ зроблена, от і гэты прыкры выпадак перашкодзіў, але радасна, што не адчуваеш сябе тут пабочным. Вунь з кузава трохтонкі сочыць за «газікам» круглашчокая дзяўчына, усё яшчэ ў чорнай вушанцы, хоць на дварэ ўжо і не холадна. Яна рухава перадае сваім напарніцам цэглу і раз-пораз пазірае на машыну. Не «газік», вядома, яе цікавіць, а той, хто ў «газіку». Калі Якаў нарэшце спыняецца і выходзіць з кабіны, круглашчокая аб нечым дробненька гаворыць дзяўчатам, і ўвесь іхні ланцужок на хвіліну прыпыняе работу. Дзяўчаты, хоць і не ўсе знаёмыя, але ўсе ветліва ўсміхаюцца Якаву і памахваюць брызентавымі рукавіцамі.

Непадалёку — корпус гарадской бальніцы. Сцены ўжо вымураваны, а на сценах — хлопцы. Вышэй за ўсіх стаіць і прабуе рукой моц кроквы стары Васіль Тумаш, цяперашні майстар над усімі гэтымі бязвусымі цеслярамі. Ён без шапкі, вялікая лысіна блішчыць на свежым сонцы. Стары нешта гаворыць хлопцам, але яны не чуюць яго слоў, бо навокал узнімаецца вясёлы гаманок, у канцы корпуса чуюцца сяброўскія ўсклікі. Майстар спачатку не разумее, у чым справа, прыкладае да лба далонь і неахвотна ўглядаецца ў тое месца, куды глядзяць усе. Затым пазнае Якава і таксама пачынае махаць рукою. Твар яго дабрэе, сівая барада шырыцца ад усмешкі і лёгкага ветру.

Да Паўла Іванавіча пад'ехалі на матацыкле адразу два чалавекі: адзін старэйшы, у добрым паліто, шыя абгорнута рабенькім шалікам, другі малодшы, у рабочай спяцоўцы. Старэйшы — гэта прараб, мы з ім ужо сустракаліся, а малодшы — новы кладаўшчык гэтай пляцоўкі. Абодва падышлі і да Якава. У поціску іх рук чулася не толькі прывітанне, але і ўдзячнасць, якую цяжка выказаць словамі.

Не ўзяўся б і сам Якаў расказаць, як ён тут працаваў, як пакутаваў ад трывожных думак, калі сустракаўся з

Шыметам. Не заўсёды і трэба расказваць, няхай толькі будзе ў душы адчуванне, што ты не лішні сярод добрых людзей.

З першай пляцоўкі заехалі ў Дабрасельцы. Каля Антосішынага двара вылезла з машыны толькі Надзя, а Якаў трымаў рукі на баранцы. Тут Павел Іванавіч і паўслова не сказаў, бо пэўна ведаў: высадзі Якава, дык пехатою пойдзе, а ўсё роўна пабывае на шахтбудзе. Калі гарадок не мінуў, дык як ён міне шахтбуд? Вядома ж, у снах бачыў шахтбудаўцаў, асабліва некаторае новае папаўненне... І Надзя і Павел Іванавіч ужо ведалі пра гэтае папаўненне і разумелі, што яно азначае для Якава.

На самым верхнім мастку адной з буравых вышак стаяў чалавек і падаваў нейкія знакі ўніз. Якаў здалёк заўважыў яго, але пазнаць не мог, хоць ведаў тут амаль усіх. Чалавек быў расхрануты, у адной толькі спяцоўцы, і шапка насунута на вочы, каб не замінала сонца.

Рухі яго былі рэзкія і энергічныя. Відаць, ён і гаварыў нешта сваім памочнікам, але за шумам «газіка» слоў нельга было пачуць.

— Палянскі штосьці нервуецца, — разважна сказаў Павел Іванавіч. — Мабыць, нешта не ладзіцца з трэцяй вышкай.

— Хіба гэта Валянцін? — здзіўлена спытаў Якаў і прыбавіў газу.

— Ён, — коратка адказаў Павел Іванавіч. — Замяшчае цяпер буравога майстра, захварэў той.

Якаў яшчэ больш здзівіўся, а Павел Іванавіч, заўважыўшы гэта, дадаў:

— Палянскі вельмі здольны інжынер, а такому ўсё даецца ў рукі.

Як ні быў Валянцін заняты, усё ж убачыў Семігона, калі той вылез з кабіны. Твар у Валянціна памякчэў, засвяціўся радасцю.

— Проста з бальніцы? — гучна спытаў ён, гледзячы і на Якава і на Паўла Іванавіча.

— Без перасадкі, — жартаўліва адказаў парторг.

— Шкада, што не магу злезці, — паскардзіўся Валянцін. — Тут у нас заела. Увечары будзеш дома?

— Буду, — адказаў Якаў, — прыходзь!

— Прыйду, абавязкова.

— А дзе твае брыгады?

Валянцін паказаў рукою на палетак, але тлумачэння ўжо не мог даць, бо ў гэтую хвіліну ў механізмах нешта зашумела, заскрыгатала, і ён абедзвюма рукамі ўхапіўся за нейкі рычажок. Больш дакладна адказаў Павел Іванавіч:

— Там у нас няўпраўка на заводзе жалезабетонных вырабаў, дык яго брыгада накіравана туды.

Якаў глянуў на «газік».

— Едзь, — сказаў Павел Іванавіч, — а я застануся тут, пагляджу, у чым нелады. Заедзеш потым.

— Я, можа, праўдуся, — няўпэўнена адказаў Якаў. — Тут жа не надта далёка.

— Ты яшчэ слабы хадок, — усміхнуўшыся, сказаў Павел Іванавіч. — Калі ёсць машына, то садзіся і газуй.

Ні да адной пляцоўкі не пад'язджаў Якаў з такім хваляваннем, як да гэтай. Прыпыніў машыну на ўзгорку, пачаў углядацца, не вылазячы з кабіны. Людзей працуе многа: адны бліжэй, другія далей, хто на рыштаваннях, хто на зямлі, а чые толькі галовы зрэдку паказваюцца з траншэі. Тут нават Валянцінавых брыгад адразу не заўважыш, не тое што аднаго чалавека.

І ўсё ж такі здаецца, што Зоню можна ўбачыць, адрозніць ад усіх, калі яна толькі тут. Няхай хоць на зямлі яна працуе, хоць пад зямлёй. Гэта нічога, што пэўна ж не ў ружовым берэціку. У што б ні адзелася, усё роўна не будзе падобна на іншых, нават здалёк. Зусім лёгка пазнаць яе рукі, калі яна трымае ў іх цэглу ці рыдлёўку, скажаш адразу, што гэта яе паходка, калі ўбачыш, што яна на пару з кім-небудзь нясе цэментны раствор ці іншы матэрыял, здрыганешся ад адчування знаёмага, калі яе галава хоць трошкі пакажацца з траншэі.

Сёй-той з будаўнікоў ужо звярнуў увагу на дзіўнага начальніка, які прыехаў на пляцоўку, а вылазіць з машыны не хоча. Якаў заўважаў, што людзі паглядваюць на «газік» і, пэўна, смяюцца: «От так яны і кіруюць, некаторыя». Аднак працягваў перабіраць вачамі ўсіх, хто хоць крышачку нагадваў Зоню.

Сярод бліжэйшых дзяўчат не відно было падобнай. Якаў намерваўся пераехаць на другое зручнае месца і адтуль яшчэ паглядзець, але хутка ўбачыў, што да яго ідзе нейкі чалавек, відаць, прараб.

«Раззлуецца, калі ўбачыць, што тут не начальнік», — падумаў Якаў і, вылезшы з кабіны, пайшоў насустрач.

Чалавек наблізіўся; прыветна ўсміхаючыся, працягнуў шырокую, як лешч, руку і спытаў:

— Чым вы тут у нас цікавіцеся?

— Ды тут брыгады з шахтбуда, — крыху разгублена загаварыў Якаў. — Хацеў пабачыць, як яны там?..

— А, дык калі ласка! — ахвотна падхапіў чалавек. — Магу вас правесці. А хто вы будзеце, прашу прабачэння? Я тут чалавек новы, мала каго ведаю.

— Я шафёр, — проста сказаў Семігон. — У бальніцы доўга ляжаў, а сёння выпісаўся, дык вось захацелася пабачыцца са сваімі.

— Ну што ж, давай! — сказаў чалавек і паспешна закрочыў убок.— Давай! Яны недзе там!

Якаў амаль што і не чуў слоў гэтага чалавека, не адразу заўважыў, як ён адышоў. Сэрца ягонае трапяталася ад чакання, ад той радасці, якая вось-вось можа напаткаць яго. Раптам выйдзе дзяўчына з-за якога насыпу ці штабеля цэглы... Што тады сказаць ёй, як сустрэць?.. Можа, пры людзях яна і не захоча прызнавацца ў іхнім знаёмстве?.. Але ж ці толькі знаёмства было? І цяпер для Якава яна не проста знаёмая...

Аддзяліўся ад купкі дзяўчат і падышоў да Якава Саша.

— Здароў,— па-простаму, але шчыра павітаўся ён.— Устаў ужо? Ну, віншую! Чаго ты не падыходзіш? Усе нашы здалёк пазналі цябе.

— Ты тут Валянціна замяняеш? — без асаблівай цікавасці да гэтага спытаў Якаў.

— Замяняю пакуль што.

— А што гэта за чалавек падыходзіў да мяне? Вунь ён.

— Майстар нейкі, — безуважна адказаў хлопец.— Ходзіць тут, пакрыквае.

— Слухай, Саша! — Якаў узяў яго пад руку і адвёў яшчэ далей ад брыгады. — Толькі гэта між намі. Разумееш? Тут павінна быць адна навенькая, з будаўнічага тэхнікума. Чаму яе сёння не відно?

— Зоня? — тонам сапраўднай таварыскасці спытаў Саша.

— Так, яна.

— Сёння чамусьці не выйшла на работу. Я і сам не ведаю, чаму. А ўчора і ўсе дні была. Тут яе на брыгадзіра ставілі часова, яна ж на практыцы. Дык адмовілася. Разам з нашымі дзяўчатамі раствор насіць, а трэба, дык і

муляра можа замяніць. Вельмі спрытная дзяўчына. І прыгожая, павінен сказаць табе папраўдзе.

Відаць, у падзяку за давер, Саша хацеў расказаць пра дзяўчыну як можна больш харошага і прыемнага.

— А дзе яна кватаруе, ты, часам, не ведаеш? — зніжаным голасам спытаў Якаў.

— Добра не ведаю, не скажу, у якім доме, але чуў, што ў пасёлку, каля першай пляцоўкі.

Хлопец гаварыў аб гэтым з такой ахвотай, з такой гатоўнасцю памагчы Якаву, што, здавалася, вось-вось ён сарвецца з месца і сам пабяжыць шукаць дзяўчыну.

— Дзякую табе, — шчыра сказаў Якаў.

Увечары гэтага дня толькі Антосіха ў сваёй хаце не страчвала звычайнага настрою. Хвілінамі яна радавалася, што вярнуўся з бальніцы Якаў, і не па мыліцы, як некалі Шыпулька, і нават без ніякіх павязак. Хвілінамі сумавала, што кватаранты хутка пакінуць яе хату і зноў давядзецца жыць адной.

Гаспадыня намагалася больш і цікавей гаварыць, каб адарваць ад нейкіх зацяжных і, бадай, невясёлых думак сваіх кватарантаў. Яшчэ прыйшоўшы з фермы яна заўважыла, што Якаў чамусьці задумлівы, хоць яму якраз дарэчы было б сёння весяліцца: вылечыўся, у добры час сказаць, папрыгажэў нават там, у бальніцы. Надзя спачатку ўсё аб нечым шаптала брату, відаць, старалася развеяць яго цяжкія думкі, а потым ні з сяго ні з таго сама пачала задумвацца, раз-пораз паглядваць у акно.

Чаго засумавала Надзя? Калі вярнуўся з будаўнічых пляцовак Якаў, ён сказаў сястры, што бачыў Валянціна на вышцы, што хлопец паабяцаў увечары прыйсці. Яны чакалі яго абое. Надзя па вядомай прычыне, а Якаў хацеў з ім пагаварыць наконт Зоні. Валянцін мог ведаць і чаму яе не было сёння на рабоце, і больш пэўна сказаць, дзе яе можна знайсці.

Пакуль добра змеркла, Надзя і Якаву не давала сумаваць. Затым усё перамянілася. Якаў думаў аб сваім, яна — аб сваім. Якаву хацелася кінуць тут усё і пайсці самому на пасёлак, перабраць усе хаты... Надзю таксама нешта падбівала кінуць тут усё і пабегчы на шахтбуд, паглядзець на тую злашчасную вышку, на якой сёння быў

Валянцін. Можа, ён і цяпер там, можа, нават без абеду, без вячэры?..

Якаў, хоць і пакутуе, раздумвае, як тут лепш зрабіць, але знешне стараецца быць спакойным. Надзя ж месца не знаходзіць. Якаў глядзіць на яе і нават трохі злуецца ад думкі, што, мабыць, з-за роднага брата дзяўчына б так не хваляваласяя, не перажывала б. Нарэшце, ён устае, пахвалявалася, не перажывала б. Нарэшце, ён устае, паспешна накідвае на плечы сцёганку, надзяе шапку і выходзіць з хаты.

— Куды ты, Яша? — крычыць наўздагон сястра.

Але Якаў нічога не адказвае. У двары ён нейкі час вагаецца ў сваіх намерах: добра было б і ў гараж схадзіць, паглядзець сваю машыну, пагаманіць з Талімонам ды з дзядзькам Алесем, калі ён яшчэ не пайшоў куды. Можа, там ужо самаробны аўтамабільчык стаіць дзе-небудзь у кутку? Стары каваль не адступіцца, калі што надумаў зрабіць.

Бярэ верх больш неадкладнае, і хлопец ідзе ў пасёлак. Калі б можна было спадзявацца, што ўсюды падсохла, Якаў рушыў бы напрост, цераз агароды і палеткі. Але гэта трохі рызыкоўна, бо можна ўгразнуць дзе-небудзь цёмначы, вывазіцца так, што і ў пасёлак брыдка будзе паказацца. Лепш трымацца дарогі.

У пасёлку амаль ва ўсіх хатах ярка гараць агні. На невялічкай, ужо зарослай вішняком вуліцы не цёмна, бо святло і з вокан падае і крыху даходзіць ад ліхтароў гарадка.

Хочацца ўспомніць, між іншым, што жыхары гэтага пасёлка падчас лічаць сябе не надта шчаслівымі. Яны перасяліліся сюды за некалькі год да вайны. Месца зручнае: і жыць добра, і да калгасных палеткаў блізка. За вайну не асталося ад гэтага пасёлка нават гарэлага кала. Зноў пабудаваліся, пасадзілі сады. Цяпер пайшлі чуткі, што пасёлак перапясуць, паколькі яго тэрыторыя ўваходзіць у гарадскую. Адны гавораць, што перапясуць, а другія — што ён застанецца на месцы, толькі будзе трохі падладжаны пад гарадскую архітэктуру. Ідуць пакуль што спрэчкі, а людзі хвалююцца.

Каля першай хаты Якаў спыняецца, пачынае думаць, як жа тут шукаць таго, хто трэба? На будоўлі і то не лёгка было разабрацца, а тут усе людзі ў хатах. Як на тое, нават ніякага падпывальца на вуліцы няма. Хоць ты стукай у шыбы ды пытай.

Ідзе паціху, паглядвае на вокны. Спадзяванне ў душы такое: можа, мільгане хто ў акне, можа, якраз хто і знаёмы пакажацца.

Мінае адзін двор, другі... Раптам з недалёкага дворыка выскачыла дзяўчына і так хутка знікла ў суседнім, што Якаў нават постаць не паспеў разгледзець. Падыходзіць да той хаты, прытульваецца да слупка брамкі. Ад слупка ўправа ідзе невялічкі агародчык і туды выходзяць вокны: адно толькі трошкі асветленае, а другое больш. Відаць, лямпачка ўключана за перагародкай.

Углядаецца ў цьмянае з адшморгнутай фіранкай акно, і яму здаецца, што ў хаце стаіць перад сценным люстэркам і папраўляе пышную прычоску Зоня. Аж горача стала ў грудзях: няўжо такі шчаслівы выпадак? Рэдка ў жыцці бывала, каб ішлі ў рукі ўдачы, а тут, можа, і сапраўды збудзецца жаданае. Дзяўчына трошкі паварочваецца да акна, у паўзмроку Якаў бачыць профіль яе твару. Вось яна падыходзіць да стала, перакладвае з аднаго месца на другое нейкія часопісы, потым яшчэ больш набліжаецца да акна. Якаву здаецца, што яна бачыць яго, і ён у нейкай разгубленасці апускае вочы. Няма сілы ўзняць іх, хоць трэба абавязкова глянуць, падаць знак, каб Зоня выйшла.

Але дзяўчына, відаць, сама здагадваецца, што яе чакаюць. Праз якую хвіліну Якаў чуе лязгат дзвярной клямкі і, нібы ў спалоху, адрываецца ад слупка. Смела, ледзь не рыўком, адчыняецца штакетная брамка, і дзяўчына весела пытае:

— Вы, можа, да нас?

Якаў глядзіць на дзяўчыну і ў першы момант не ведае, што адказаць. Гэта не Зоня перад ім, гэта тая самая круглатварая, з першай пляцоўкі, толькі без вушаначкі. Валасы яе сапраўды падобныя на Зоніны, а твар не падобны. Як жа магло здацца?

— Не, — ледзь чутна гаворыць Якаў. — Прабачце. Мне тут даручана...

— Ах, вы па даручэнню? — смяецца дзяўчына. — Што ж вам такое даручана?

— Не то што даручана, — папраўляецца Якаў, — а так, трэба было адну практыкантку пабачыць.

— Ах, практыкантку? — зноў смяецца і яўна кпіць дзяўчына. — З горада? Дык пераблыталі адрасок. Яна вунь... У трэцім доме адсюль.

— Дзякую вам, — разгублена гаворыць Якаў і адразу шырокім крокам адступае, каб зараз жа падацца далей.

— Няма за што! — усё гэтак жа з'едліва адказвае дзяўчына.

Калі Якаў крыху адышоў, за яго спіной пачуўся перш моцны стук брамкі, а ўслед за гэтым кплівы голас дзяўчыны:

— Эй ты, адпалюб! Практыкантачка твая махапула адсюль сёння раніцою! І клупачак з ружовым берэцікам забрала!

От якая востраязыкая гэтая дзяўчына! А Якаў думаў, што яна добрая, такі тварык у яе мяккі і лагодны. Можа, наўмысля так гаворыць, каб укалоць?

Але дзе там наўмысля! Для пэўнасці Якаў праверыў яе калючку — і выйшла, што праўду круглатварая сказала. Не было Зоні там, дзе яна спынілася на кватэры. Паехала дадому, і ніхто з дзяўчат-суседак не ведаў, вернецца яшчэ яна сюды ці не.

Хлопцу да таго сумна стала, што нават у бальніцы так не было. Ішоў ён назад, ледзь перастаўляючы ногі. Што цяпер можна падумаць, што згадаць? У бальніцу Зоня другі раз не прыйшла, хоць абяцала наведацца. Ну, тут маглі быць розныя прычыны. Можа, работу нельга было пакінуць, можа, сама не вельмі была здарова. А вось паехаць і нічога не сказаць, нават запіскі ніякай не пакінуць! Гэта ўсякаму цяжка было б зразумець. Тут можа быць толькі балючая непавага, нежаданне знацца, падтрымліваць не толькі дружбу, а нават і знаёмства. А хіба гэта можна цяпер!..

Якаву ўяўляецца, што гэта зусім немагчыма, што гэта было б такім няшчасцем, якое чалавек не здолеў бы перанесці. Зоня стала такой блізкай і каханай, што без яе не знойдзеш цяпер сілы жыць. Яна ў думках, яна ў марах. Рукі не падымуцца для работы, калі не будзе яе. Чароўныя вясеннія досвіткі ператворацца ў туманныя, слотныя вечары.

Як яна перамянілася, як напрыгажэла за гэты час!..

Так, гэта будзе вялікае няшчасце, калі Зоня не вернецца. Няшчасце для яго, для Якава. А для яе?..

Тут паплылі думкі ўразнабой. Калі асталося каханне, калі яно яшчэ больш паглыбела за час разлукі, як у яго самога, тады гэта будзе няшчасцем і для яе. Можа, і яна вельмі многа перажывала, многа пакутавала.

Але магло быць і не гэтак. Вялікая крыўда магла вытруціць з душы ўсё, пакінуць толькі сумныя ўспаміны. Цяжка нават уявіць, якой вострай і балючай магла быць гэтая крыўда!

Зоня заплакала тады ў бальніцы пры ўспамінах аб сваёй хваробе. Якаў многа думаў аб прычыне гэтых слёз. Яна не сказала, як і на што хварэла. Што ж тут можна ўявіць?..

Каб надзейнае здароўе, каб не розныя іншыя перашкоды, сесці б досвіткам на машыну ды ў горад. Можа, з ёй што здарылася, можа, які цяжкі выпадак прымусіў яе датэрмінова выехаць? Яна ж наведвалася ў бальніцу. Чаму б не паведацца да яе?

Думкі перабіліся толькі ўжо ў дабрасельскай вуліцы, бо тут нечакана яго нагнала Надзя.

— Адкуль ты ідзеш? — часта дыхаючы, спытала яна.

— А ты адкуль?

— Можаш не гаварыць, — весела бліснуўшы вачамі, сказала дзяўчына. — Я і сама здагадваюся, куды ты хадзіў. А вось я прывітанне нясу табе ад Валянціна. І яшчэ нешта.

— А што ж гэта такое «нешта»? — без асаблівай цікавасці спытаў Якаў.

— Ты падумай! — нібыта і абурана, але з пэўным гонарам прадаўжала Надзя. — З самага світання не адыходзіць ад гэтай вышкі і цяпер там. Прыйшоў ужо туды Сашка і яшчэ некалькі хлопцаў з іхніх брыгад. Нешта там сапсавалася, дык цэлую ноч збіраюцца ладзіць. За дзень не ўправіліся.

— Дык што ён яшчэ перадаў? — паўтарыў Якаў сваё пытанне.

Цікавасць усё ж такі разбірала яго. З'явілася нават прадчуванне, што Валянцін мог ведаць нешта вельмі важнае.

— Ён хацеў яшчэ ўдзень табе гэта сказаць, — гаварыла далей Надзя, — ды нельга было спусціцца з вышкі. І ўвечары не здолеў прыйсці. Зоня паехала дадому, таму што брат яе, Ваня, прыслаў тэлеграму. Нешта маці занядужала. Зоня абяцала прыехаць. Прывітанне табе перадавала.

— Праўда? — Якаў спыніўся, парывіста схапіў сястру за плечы. — Ты не выдумала?

— Ну што ты?

— Я пайду туды! — рашуча заявіў ён. — Я таксама трохі разбіраюся ў механізмах. Дапамагу!

— На ўсю ноч? Як жа ты? — пачала адгаворваць Надзя. — Ты ж яшчэ не акрыяў пасля бальніцы, ды не вячэраў нават.

— Нічога!

Якаў ласкава адхіліў ад сябе сястру і размашыста пакрочыў на агеньчыкі шахтбуда.

Назаўтра была нядзеля, выхадны дзень. Дабрасельцам-то не вельмі і выпадала святкаваць, бо вясна стаяла на двары і надвор'е выдалася такое, што хоць усім на поле ідзі. Але тут ужо так звykліся: калі ў будаўнікоў выхадны, то і калгаснікі ў большасці выпадкаў не працуюць.

Праўда, дзень сёння асаблівы, сапраўды святочны. Людзі чакалі гэтага дня і, як маглі, стараліся, каб ён настаў хутчэй. На гэты дзень было намечана перасяленне многіх будаўнікоў з прыватных кватэр у гарадскія дамы.

Пачалося яно з самага ранку. Ледзь не ўсе дабрасельскія кватаранты выйшлі на вуліцу са сваімі клункамі, чамаданамі і куфэркамі. З песнямі і музыкай рушылі на дарогу, а там у гэтую незвычайную калону ўліліся яшчэ хлопцы і дзяўчаты з Чырвоных Макаў і з пасёлкаў. Ледзь не кожнага кватаранта ці кватарантку праводзіў хто-небудзь з былых гаспадароў, а то і цэлымі сем'ямі выйшлі некаторыя, каб памагчы сваім былым жыльцам у такой важнай, урачыстай справе. Пешаходаў абганялі нагружаныя машыны. Не толькі дарога, а і ўсе прасохлыя абочыны былі заняты людзьмі — сапраўды, вялікае перасяленне.

Якаў ішоў побач з Валянцінам — меліся быць агледзіны. Увесь спадручны багажык Якава змяшчаўся ў тым жа вайсковым рукзаку, і толькі каб не ісці з пустымі рукамі, Антосіха і Надзя неслі сёе-тое з пасцелі, пасуды і іншых прыладак першай неабходнасці. Надзя пакуль што была праважатай, як і Антосіха, але мала хто тут не ведаў, што хутка і яна пераселіцца ў новы дом.

— Мы з табой будзем насупраць, — гаворыць Якаву Валянцін. — Цераз калідор.

Гаворыць ён ціха і пазірае на Надзю, ці чуе яна.

Чуе не толькі Надзя, а і Антосіха. Яна глядзіць на сваіх кватарантаў, і вочы яе туманяць слёзы. Гэта і ад

радасці за шчасце людское, і ад жалю, што ў яе, можа, ужо не будзе такіх харошых жыльцоў.

...Учацвярых яны заходзяць у калідор самага блізшага ад Дабрасельцаў дома.

— Вось гэтая твая, — гаворыць Валянцін і паказвае Якаву на філёнкавыя, пацягнутыя бялiламі, дзверы. — А гэта... — і ён спыняецца насупраць.

Якаў, Надзя і Антосіха заходзяць у першы пакой. Тут яшчэ пахне свежай фарбай і пакостам. На падлозе — кавалкі шпалераў, гэта азначае, што ступаць яшчэ не ўсюды можна. Па гэтых шпалерах Якаў ідзе да акна, глядзіць, куды яно выходзіць. І здаецца яму, што гэтае акно якраз такое ж самае, як і было некалі ў роднай бацькавай хаце. І сонца гэтак жа ветліва свеціць у яго, і дабрасельскія агароды відны, і вялікая груша-фунтоўка павінна быць недзе тут, за вуглом...

Аглядае ўвесь пакой, маленькую кухню. Нічога няма лішняга, усё тут зроблена сціпла і ўтульна. Тут ложак, там столік... Можна і яшчэ што-небудзь паставіць, павесіць на сцяне, разаслаць на падлозе...

Нічога нідзе лішняга, якраз усё як трэба. А новаму гаспадару здаецца, што быццам бы нечага не хапае, вельмі істотнага...

Ён задумліва глядзіць у адзін пусты куток, а Надзя пераймае яго погляд.

— Тут маленькі столік будзе стаяць, — упэўнена гаворыць яна. — З люстэркам.

Сапраўды, там яму месца. Ад яго яшчэ больш утульна стане ў пакоі.

1959 г.

# РАСЦЕ МЯТА ПАД АКНОМ

## I

Дождж, проста лівень. Ніхто не супроць цёплых вясенніх дажджоў, але ж не надта прыемна, калі яны размываюць дарогі, робяць столькі гразі, што ні прайсці ні праехаць.

Высоцкаму давялося спыніць машыну. На ветравым шкле — імклівыя хвалькі, з бакоў таксама ўсё пацямнела. Нібы праз густы туман, відны пры дарозе дзве бярозкі. Яны ўжо зялёныя, свежыя да яркасці, а пад ліўнем здаюцца цемнаватымі. Высоцкі памятае гэтыя бярозкі з пазалеташняй восені. Калі прыязджаў сюды, яны былі жоўтыя, і навакол усё жаўцела. Часткова ад апалых лісцяў, а больш — ад незаворанага жытнішча. Тут не аралі, бо і гэты палетак адводзіўся пад новабудоўлю.

...Косы дождж перакатамі наплываў спераду, а задняе шкло было не заліта, і Высоцкі ўбачыў у люстэрку, што па дарозе нехта ідзе. Пазнаць нельга — зялёны плашч закрываў постаць, а капюшончык — твар. Высоцкі прачыніў пярэднія дзверцы. Дождж з ветрам шугануў праз шчыліну, стаў больш чуцён шквальны шум, але вуха ўлавіла і тое, як густыя кроплі барабанілі па плашчы.

— Хутчэй сюды!

Плашч залапатаў каля дзверцаў, і перш-наперш з-пад яго паказалася мокрая рука, маленькая, ружовая і нібы так вымытая, што можа прасвечвацца наскрозь.

— От дзякуй вам! — пачуўся зусім спакойны жаночы голас. — Гэта ж трэба — такі дождж!

Сеўшы побач, яна зняла з галавы капюшончык, і на шыю пічодра сыпануліся пышныя каштанавыя локаны, трошкі макраватыя, але непадатлівыя нават і вільгаці. Высоцкі ўбачыў на дзіва выразныя і прыгожыя вочы — бадай, ніхто не здолеў бы ўтрымацца, каб не зазірнуць

у іх. Наўрад ці можна было адразу сказаць, якога яны колеру, ды такое пытанне не ўзнікала: прывабныя і ўсё.

— А што ў вас?.. На маё шчасце, машына сапсавалася? — спытала нечаканая пасажырка. Спытала і засмяялася, прыязна паглядзела на суседа.

— Не, не сапсавалася, — адказаў Высоцкі. — Спыніўся, каб перачакаць дождж.

— А мне вось выпала, што ні сюды ні туды: ні на работу вяртацца, ні дадому бегчы.

— Дзе жывяце, кватаруеце?

— Там у адных... на астраўку.

Высоцкі ўсміхнуўся: ён добра ведаў, што гэта за астравок, і чаму людзі празвалі так вялікую вёску Галубоўка, з клубам, з добрым памяшканнем сельсавета і сярэдняй школай. Трохі смешная недарэчнасць была ў тым, што толькі ў гэтай вёсцы ўсё яшчэ не было святла, і яна выглядала як цёмны астравок сярод агнёў новабудоўлі і суседніх вёсак.

— Дык я вас і завязу ў Галубоўку, якраз тут па дарозе.

— Куды ні едзь, то яна па дарозе, — сказала пасажырка, — але туды не даедзеце.

— Чаму?

— Гразі па калена. Калі і даедзеце, то ў вуліцы машына сядзе.

Супроць гэтага не было чаго сказаць — Высоцкі ведаў, якая тут у некаторых мясцінах калатушка ранняй вясною і ўвосень. Непадалёку адсюль, дзе будуюцца першыя кварталы новага горада, спрадвеку была нізіна, мясцовыя людзі празвалі яе калясішчам.

Каб неяк згладзіць няёмкае маўчанне, ён пачаў праціраць далонню запацелае бакавое шкло і ўглядацца ў мутнаваты ад дажджу прастор за бярозкамі. Там было ўжо не так гола і пуста, як у мінулую восень. Нават скрозь густыя кроплі прасвечваліся белыя карпусы першых жылых дамоў. Заўважыў тым часам, што дождж пачаў крыху радзець, і сказаў, не паварочваючыся да пасажыркі:

— Перагонім, вада збяжыць, тады паглядзім, даедзем ці не.

І між тым падумаў: «Як да яе звяртацца? Маладая яна зусім, дзяўчынка яшчэ, ці проста гэтакая маладжавая?»

— Дзякую, — пачуў ён вясёлы голас. — Перастане ліць, то я сама дабягу, хіба толькі да павароткі даедзем.

Высоцкі глянуў на суседку больш уважліва. Яна сустрэла яго пагляд кароткім, цікаўным позіркам і добрай усмешкай. Гэты позірк быў звычайны для першага знаёмства, але не такі, каб яго можна было не запомніць. Пры ўсмешцы шчокі быццам яшчэ больш насвяжэлі і з-пад вуснаў заблішчалі белыя, прыгожыя роўныя зубы з невялічкім свішчыкам зверху.

«Не, — падумаў Высоцкі, — гэта не маладжавасць, гэта сапраўдная маладосць, вельмі натуральная і шчырая».

— Мне здаецца, што я вас недзе бачыў, — сказаў ён, трохі сароме́ючыся сваіх занадта ўжо звычайных слоў. Чакаў, што дзяўчына засмяецца ад іх, але яна зноў паглядзела на яго і з даверам паведаміла:

— Я ўжо даўно тут, з першых дзён будаўніцтва.

— А цяпер дзе працуеце, прабачце?

— У бібліятэцы пабудкома. Здорава гучыць! Праўда?

— Гучыць, — згадзіўся Высоцкі. — Чаму ж не? А дзе гэта ваша бібліятэка? Нешта я не ведаю.

— У часовай прарабскай, — ахвотна адказала дзяўчына. — Заходзьце, паглядзіце. Хоць і ў будцы жывём, але кніг маем многа. I газеты ёсць, часопісы.

— Дзякую, — адказаў Высоцкі. — Зайду.

Каля павароткі дзяўчына паспешліва вылезла з машыны і хуценька пайшла ў Галубоўку, спрытна абмінаючы на дарозе лужыны. Высоцкі паехаў далей, відаць, меў на ўвазе падабрацца як мага бліжэй да тутэйшай будаўнічай пляцоўкі. Ехаць таксама было нялёгка пасля такога ліўня. Выбіраючы цупчэйшыя мясціны, ён час ад часу намагаўся ўспомніць, дзе здаралася яму бачыць гэтую дзяўчыну. I нарэшце ўспомніў.

Амаль два гады назад, пад восень тут заснўвалі новы горад. На запусцелым калгасным палетку збілі трыбуну, наставілі наабапал высокія жэрдкі са сцягам і, пасля адпаведных такім урачыстасцям прамоў, пачалі ўкопваць цэментавы слуп з гранітнай шыльдай. Укопвалі пераважна дзяўчаты з новага набору, а мужчыны стаялі. Адна з іх была вось гэтая самая.

У той дзень Высоцкі прыязджаў сюды з Мінска, прадстаўніком ад трэста, якому даручалася будаваць усё тое, што павінна стаяць тут на зямлі: горад, прамысловыя

аб'екты камбіната — аднаго, другога, трэцяга. А ўсе надземныя работы ўзяла на сябе такая арганізацыя, якую ў той час не кожны тут мог вымавіць: Шахтспецбуд.

Гэтая дзяўчына капанула разы два каля слупка, а потым стаяла з рыдлёўкай у руках і ўглядалася ў пазалочаны надпіс. Было каму тут капаць і без яе.

— Чаму яны гэтак назвалі новы горад? — спытала яна ў нейкага вельмі ж даўганосага хлапца. Спытала смела, без аглядкі, так што і Высоцкі пачуў.

— Хто гэта яны? — не надта задаволена спытаў хлопец.

— Хто б ні былі, а недарэкі! — ужо трохі цішэй сказала дзяўчына. — Ці гэтак павінен называцца наш малады горад?

Высоцкі не прымаў удзелу ў так званым «хрышчэнні» горада, але і яму стала няёмка ад такіх непасрэдных і, відаць, праўдзівых слоў. Ён падышоў бліжэй да слупка і яшчэ раз стаў чытаць надпіс: «Здесь заложен город Новостаробин...» «Сапраўды няўдалая назва, — падумаў ён. — Навастарая!»

Меркавалася ў тыя часы, што яму і даручаць будаваць новы горад. А потым, як часта бывае, планы перамяніліся, і давялося ледзь не цэлыя два гады кіраваць будаўнічым упраўленнем у суседнім раёне. І вось толькі нядаўна перавялі сюды.

«Дык гэта яна», — чамусьці зноў падумаў Высоцкі.

Спраў было многа: і ў той дзень і ў наступныя ён не меў амаль ні адной вольнай хвіліны. Аднак выпадковая пасажырка ўспаміналася, і ён рашыў усё ж такі як-небудзь знайсці час і заехаць у бібліятэку.

Дашчаны барачак (сапраўды, так наспех збівалі толькі часовыя прарабскія) быў пастаўлены на невялічкім узгорку, а вакол яго чарнела голае і нізкаватае поле, аднак жа не забытае вадзіцелямі цягачоў і самазвалаў. Гэтыя хлопцы цяпер ездзілі тут усюды. Шукаючы больш сухое месца, забіраліся на цаліну, на пасеяныя палеткі, а часам нават пад самыя вокны вясковых хат і новых гарадскіх дамоў. Каля гэтага прарабскага будыначка яны разам нарабілі нямала каляін, месцамі так глыбока размясілі гразь, што, здавалася, яна ўжо ніколі не высахне.

Прабрацца да бібліятэкі было пакуль што цяжка, калі чалавек не ў гумавых ботах. Высоцкі быў у туфлях, яшчэ трохі жоўтых, пад колер ужо летняму касцюму: усё ж та-

кі вясна на двара, хоць і часта праходзяць халаднаватыя дажджы ды прыкрываюць сонца цягучыя туманы. Сяк-так абмінаючы выбоіны і тванныя мясціны, ён паволі набліжаўся да барака і з сумам думаў пра таго культдзеяча, які выбраў гэтае месца і гэты будынак пад масавую бібліятэку. «Хто сюды пойдзе, хто знойдзе закінутую прарабскую?»

У мокрым цемнаватым калідорчыку Высоцкі ўбачыў на дзвярах лісток паперы, беражкі якога былі жоўтыя ад клею. Ступіўшы бліжэй, прачытаў, што бібліятэка пачынае работу з дзевяці гадзін раніцы, а калі спыняе — не было напісана. Паведамлялася толькі, што перапынак удзень бывае з першай гадзіны да чацвёртай.

«Хто пра гэта ведае? — зноў падумаў Высоцкі. — Хто прачытае гэтую шыльдачку, напісаную ад рукі?»

Аднак, калі ён адчыніў дзверы, дык ледзь не падаўся назад ад нечаканасці: невялічкі зальчык з двума вокнамі быў амаль увесь запоўнены людзьмі. Некалькі чалавек стаяла (сесці тут не было дзе) вакол двух столікаў з падшыўкамі газет і часопісаў, а цэлая чарга, як іншы раз у магазіне, выстраілася каля перагародкі, якая аддзяляла стэлажы ад чытальнага зальчыка. За перагародкай то паказвалася, то знікала між стэлажоў тая самая дзяўчына. Яна не заўважыла Высоцкага, а той не надта і хацеў, каб яго адразу заўважылі, — праціснуўся між людзей і стаў крайнім каля перагародкі.

Бібліятэкарка то паказвала людзям кніжкі з тых, што ляжалі ў яе пад рукою, то жвава паварочвалася і бегла шукаць іншыя. Твар яе быў вясёлы, нібы бесклапотны, але Высоцкі заўважыў, што калі яна гаварыла з тым ці іншым чытачом, то ў вачах з'яўлялася нешта падобнае на разгубленасць і трывогу. Чаго ёй трывожыцца? — можна было б падумаць, стоячы збоку. Але паспрабуй пабыць на яе месцы! Чытачы тут розныя: і старыя, і малыя, пісьменныя і малапісьменныя, а то часам ужо пават і залішне адукаваныя. Трэба кожнаму дагадзіць, кожнаму знайсці тое, што яму больш па густу. Некаторыя прасілі такую кніжку, якой не было, — тады дзяўчына старалася падабраць нешта блізкае ўзамен. Некаторыя нічога пэўнага не прасілі, але неахвотна бралі і тое, што ім давалі. Яны перабіралі і разглядвалі кніжкі, як часам які тавар у прадаўца.

Цярплівасці і такту ў дзяўчыны было многа — Высоц-

кі аж дзівіўся такой вытрымцы. Як ні даймаў яе хто-небудзь сваімі патрабаваннямі, усё роўна яна глядзела на яго так, нібы адчувала поўную сімпатыю і павагу. Некаторых гэта магло прывесці часам і ў зман, асабліва хлопцаў і маладых мужчын.

Такі ж доўгі і ўважлівы пагляд яна спыніла на Высоцкім, калі ён падышоў бліжэй.

— Добры дзень, — павітаўся ён як са знаёмай і зірнуў на стосік кніг на маленькім століку. Яму не хацелася, каб дзеля яго дзяўчына бегала, шукала чаго на стэлажах.

Яна кіўнула галавой і ўсміхнулася:

— Вам што-небудзь па аўтаспраѐве?

— Не, чаму ж, — спакойна запярэчыў Высоцкі. — Я хацеў бы ўзяць нешта цікавае з мастацкай літаратуры.

— Прабачце, — сказала дзяўчына, — вы ў нас повенькі, дык я яшчэ не ведаю, што вы чытаеце, што любіце.

— Вось мне з гэтых, — сказаў Высоцкі і ўзяў са століка «Рускі лес». Некалі ён ужо чытаў раман, ды не дацягнуў да канца.

— Калі ласка, гэта цікавая! — ухваліла выбар дзяўчына і быццам зарадавалася, што так лёгка знайшлося патрэбнае. — Я вам запішу... Тут у нас некаторыя формы... Як ваша прозвішча, імя і па бацьку?

Высоцкі назваўся.

— Цяпер буду ведаць, — пішучы вучнёўскай ручкай, ціха прамовіла дзяўчына. — Леанід Аляксандравіч... Заходзьце да нас.

— Дзякую, — сказаў Высоцкі. Адступіў ад перагародкі і, паколькі за ім ужо людзей не было, прыпыніўся, павёў вачыма па сыраватых, сяк-так атынкаваных сценах.

— А што, лепшага памяшкання пад бібліятэку не знайшлося? — спытаў са шчырай заклапочанасцю.

Дзяўчына без асаблівай цікавасці паглядзела на яго: відаць, не ад першага чула такое пытанне. Заўважыўшы, што чалавек не пасміхаецца, пачала гаварыць хоць і пошапкам, каб не перашкаджаць іншым, але ўсхвалявана, з абурэннем і глыбокай крыўдай.

— Чаму б гэта не! Чаму б не знайшлося, каб тыя, каму трэба, думалі пра гэта! Колькі ўжо гаварылася, колькі пісалася! Я сама ў каго толькі не была: і ў Жамчужнага, і ў Крываныпа, і ў галоўнага інжынера трэста. А свайму гэтаму пабудкому, дык праходу не даю.

— Ну і што яны? — націкавіўся Высоцкі. — Абяцаюць?

— Хто абяцае, а хто і проста адмахваецца. Асабліва гэты наш галоўны, Іступкін. З месяц назад у яго была. «А што вам, харомы там патрэбны? — пытае. — Кнігі ўмясціліся, і ладна!» А сам ні разу не завітаў у бібліятэку, не паглядзеў, як яны тут умясціліся. — Дзяўчына паказала рукой на стэлажы. — Толькі палавіна тут сяк-так уціснута, і то ў два рады. А колькі яшчэ ляжыць у стопках і ў пакунках! Літаратуру нам даюць як новабудоўлі, а яе нават складваць няма дзе, не то што раскладваць.

Высоцкі зноў падышоў да перагародкі і, трошкі перахіліўшыся, заглянуў у цемнаватыя шчыліны між стэлажоў. Каля процілеглай сцяны сапраўды ляжала многа кніг, магчыма, нават не разабраных. Тут жа былі складзены старыя падшыўкі газет, розныя часопісы і брашуры.

— Больш нічога ў вас і няма? — адчуўшы сапраўдную крыўду за такое становішча, спытаў ён. — Ні бакоўкі якой, нічога?

— Няма! — адказала дзяўчына. І голас яе нібы сарваўся, прагучаў так абурана, што амаль усе чытачы каля столікаў азірнуліся. — Мне так набалела ўсё гэта, што не магу гаварыць спакойна. Прыйду да каго ў кабінет, дык і там, бывае, пачынаю крычаць, хвалявацца.

— Часам гэтак і трэба, — сказаў Высоцкі.

— Не ведаю. — Дзяўчына ўсміхнулася неяк вінавата, разгублена. — Тут я сябе не хвалю. Аднаго разу так раскрычалася ў галоўнага інжынера, што аж успомніць сорамна. Праўда, і ён вінаваты: «Паляжаць твае кнігі і там, глядзі толькі, каб мышы не завяліся. Мне перш за ўсё людзей трэба забяспечваць». А як на свой катэдж, дык знайшоў і матэрыялы, і час, і рабочыя рукі!

Высоцкі заківаў галавой нібы ў знак згоды, нібы ў знак сумнення, потым сказаў нешта аб цяжкасцях першых часоў і развітаўся.

— Дык заходзьце! — зноў запрасіла дзяўчына і неяк адразу спахмурнела, быццам патухла. Відаць, ёй непрыемна стала ад таго, што амаль кожнаму стрэчнаму і папярэчнаму скардзіцца на свае цяжкасці, а карысці ад гэтага ніякай. Пайшла за стэлаж і не выходзіла адтуль да таго часу, пакуль каля перагародкі зноў не сабралася чарга.

А новы чытач таксама не ў вясёлым настроі выйшаў з бібліятэкі. «Дзеля чаго пачаў такую размову? — неяк

само сабою ўзнікла пытанне. — Каб памагчы гэтаму чалавеку, ці толькі каб пагаварыць? Канечне, трэба было б памагчы. Але ці выйдзе гэта? Людзей на будоўлі многа, большасць з іх кватаруе ў вёсках. А колькі яшчэ прыедзе шахцёраў, хімікаў!..»

Перад вачыма стаяла жвавая і, мабыць, вельмі энергічная загадчыца першай тут бібліятэкі. Чамусьці зноў, як і тады ў машыне, запомнілася яе маленькая, нібы вучнёўская, рука... Нават плямка ад чарніла на пальцы. І здалося, што задрыжаў гэты палец, калі яна запісвала новае прозвішча... Пэўна ж, ад холаду, бо нават і цяпер у памяшканні вільготна. А як тут было зімой?..

## II

У кабінеце галоўнага інжынера — амаль уся будаўнічая брыгада, а самая прыгожая ў трэсце сакратарка засталася ў прыёмнай адна. Пад валікам машынкі — два лісткі паперы, перакладзеныя капіркай, аднак дзяўчына быццам бы і не збіраецца друкаваць — крыўдуе. Ніколі раней таго не было, што здарылася некалькі хвілін назад.

...Уся гэтая маладзёжная брыгада раптам увалілася ў прыёмную.

— Чаго вы такім гамузам? — Пачакайце ў калідоры!

— Нам трэба да галоўнага!

— Ён заняты!

— Далажыце, што ў нас вельмі важная справа!

— Пачакайце там!..

І толькі дзяўчына выставіла руку ў бок калідора, як у дзвярах кабінета паказаўся галоўны інжынер.

— Што тут такое? — ціха, але незадаволена спытаў ён у сакратаркі.

— Ды вось прунца!

— Не прунца, а прыйшлі да мяне. Заходзьце, таварышы! А вы, калі ласка, не ўчыняйце асаблівых кардонаў тым, хто хоча сюды зайсці.

«Кардонаў?..» — паўтарыла сама сабе дзяўчына, калі дзверы ў кабінет зачыніліся і больш дзесятка хлопцаў было ўжо там. — Якіх гэта кардонаў? І што гэта за слова такое?.. Чуш сабачая!..»

Узяўшыся потым падхарошваць манікюр, дзяўчына думала пра сваю добрую сяброўку — сакратарку Жамчужнага, якая не так даўно выйшла замуж, але ўжо збіраецца

ў дэкрэт. От каб заняць яе месца, хоць часова! Там і аклад на дзесяць рублёў большы, і работы менш, і спакойная будзеш заўсёды. Жамчужны чалавек мяккі, ветлівы, іншы раз, калі нікога няма, спявае ў кабінеце. І голас у яго такі прыемны, мілагучны. Майка толькі сядзіць ды слухае...

У гэты час зайшла ў прыёмную загадчыца бібліятэкі. Сакратарка ўкінула нажнічкі ў шуфлядку століка і па звычцы напусціла на сябе нейтральна-бесклапотны выгляд.

— Вам што?

— Мне б на хвілінку да галоўнага інжынера.

— Заняты! — спачатку адрэзала дзяўчына, а потым, відаць, перадумала і абыякава махнула рукой. — Заходзьце! — сказала ледзь чутна. — Усё роўна там...

Сама зноў дастала нажнічкі, пацiснула вузкімі плячыма пад клятчастым шалікам і сумна паглядзела ў туманнае акно.

— Холад сабачы...

А загадчыца бібліятэкі ў думках падзякавала дзяўчыне за тое, што так хутка прапусціла, але, адчыніўшы дзверы, разгубілася і міжвольна падалася назад.

— Прабачце! — сказала яна, не здолеўшы схаваць свайго здзіўлення. — Я...

— Калі ласка, заходзьце! — запрасіў галоўны інжынер і прыўзняўся з месца. — Пасядзіце хвіліну, пакуль мы тут... — І ён паказаў на крэсла ля краю бакавога прадаўгаватага стала.

Дзяўчына села і чамусьці перш-наперш стала непрыкметна аглядваць тых людзей, што былі цяпер у кабінеце: ці няма сярод іх абанентаў бібліятэкі? Гэта было самае зручнае для такога моманту, бо іначай яна проста не ведала б, што ёй у гэтыя хвіліны рабіць, куды скіроўваць свае позіркі. На інжынера ёй хацелася б глядзець, нават разглядваць яго і слухаць роўную спакойную гаворку з маладымі будаўнікамі. Аднак жа гэта было няёмка, бо з яе думак і вачэй не сходзіла здзіўленне: за сталом сядзеў Высоцкі, той новы абанент, якому яна прапаноўвала кніжкі па аўтасправе.

«Значыцца, не шафёр, — дакараючы і трохі падсмейваючыся з сябе, думала дзяўчына. — І як гэта адразу было не здагадацца, яшчэ тады, калі хавалася ў яго маныне ад дажджу? Падумалася, што калі за рулём, то і шафёр, то і возіць некага. А з выгляду хіба цяпер на-

знаеш! Прыходзяць у бібліятэку хлопцы з аўтакалоны — часам духамі ад іх пахне».

Будаўнікі, што сядзелі тут, таксама амаль усе былі ў чыстых і добрых касцюмах. Пасадзі каторага за начальніцкі стол, і ніхто не скажа, што ён не на сваім месцы.

Высоцкі гаварыў па тэлефоне спачатку з дырэктарам завода бетонных вырабаў, а потым з будаўнічым упраўленнем. Бадай, нічога няма больш непрыемнага, як слухаць тэлефонныя размовы чалавека, да якога прыйшоў пагаварыць. Але цяпер загадчыца бібліятэкі магла б слухаць іх нават і доўга. Не кожнага, вядома, а вось гэтага чалавека, які сядзеў за шырокім сталом, на большую палавіну закладзеным рознымі папкамі ды скруткамі ватману.

Голас Высоцкага быў спакойны і неяк асабліва ўнушальны. Ён нікому на загадваў, не даваў суровых даручэнняў. Ён прасіў, але адчувалася, што ўсе гэтыя просьбы павінны быць выкананы. Адчувалася і тое, што калі падначалены або і не падначалены забудзе пра якую-небудзь просьбу, то Высоцкі нагадае аб ёй, і тады ўжо наўрад ці будзе гэтакі абыходлівы.

— Мы спачатку хацелі напісаць вам пра ўсё, — загаварыў адзін з хлопцаў, відаць, брыгадзір. — А потым — вось... — Ён абвёў вачыма астатніх. — Рашылі зайсці.

— І правільна зрабілі, — падтрымаў Высоцкі. — Пішуць цяпер многа і без вас. Лягчэй напісаць, чым самому прыкласці, дзе трэба, рукі.

— Нам каб толькі не стаяць, — занепакоіўся ўсё той жа хлопец. — Замучылі гэтыя прастоі не па нашай віне. А ў канцы месяца — вінаваты ўсё-такі мы.

— Пабываю ў вас,— паабяцаў Высоцкі.— Хутка пабываю! Можа нават сёння!

Хлопцы ўсталі, брыгадзір цераз стол працягнуў Высоцкаму руку і следам за ўсімі пайшоў да дзвярэй. Ля парога глянуў на бібліятэкарку і пачціва кіўнуў галавой, залішне светлай для яго ўзросту, а тады надзеў падношаную з маленькім казырочкам кепку.

Сын Бранаўца, Віктар, — кіўнуўшы яму ўслед, сказаў Высоцкі. — Знаёмы вам?

— Трохі ведаю, — адказала дзяўчына. — А пра бацьку яго, то і больш ведаю... Ад людзей, ды і сама, можна сказаць, тутэйшая.

— Адкуль?

— З суседняга раёна, але вёска наша недалёка адсюль.

— Я таксама мясцовы, — устаючы з-за стала, паведаміў Высоцкі. — І Бранаўца ведаю добра. Глянуў на сына, дык пазнаў адразу: вельмі падобны на бацьку...

Леанід Аляксандравіч уздыхнуў і на момант задумаўся. Потым, нібы спахапіўшыся, ступіў да бакавога стала, гасцінна паказаў рукой на пярэднія крэслы.

— Сядайце, калі ласка, бліжэй, а то ў мяне тут тэлефон, можа званіць людзі будуць. Вы, пэўна, наконт бібліятэкі?

— Вядома, — сумеўшыся, сказала дзяўчына і ўстала. — Толькі, прабачце, я зусім не ведала, што іду да вас. Пра Істужкіна чула, што яго перавялі, а хто на яго месцы, не ведала. І зусім не чакала...

— Што я тут? — падхапіў Высоцкі.

Дзяўчына пачырванела, і вочы яе заблішчалі гарэзліва і вінавата.

— Па сваёй наіўнасці я думала, што вы шафёр.

— І правільна думалі, — падтрымаў Высоцкі. — Я сапраўды шафёр, нават трэцяга класа, і адпаведныя правы маю.

— Мне здалося, што возіце некага.

— Не, не важу і не вазіў, а сам езджу. І скажу вам — люблю ездзіць, вельмі люблю! Калі ўсё ладзіцца ў машыне і дарога харошая, дык адпачываю за рулём. Рызыкую часам толькі тым, што задумваюся едучы, пачынаю абрахоўваць розныя свае справы. Аднаго разу ледзь не зваліўся ў канаву на абочыне.

Ужо больш заспакоеным рухам дзяўчына паправіла пышныя і доўгія локаны, смялей паглядзела на свайго неспадзяванага субяседніка.

— Дык памагайце, Леанід Аляксандравіч! — папрасіла проста, даверліва.

— Хочаце лепшае памяшканне?

— Ну, перш за ўсё. Вы ж самі бачылі. Гэта цяпер... А каб зайшлі зімою! Холад, мароз — чарніла замярзала.

— І вы былі там? Кожны дзень?

— Была. А як жа. Людзі прыходзілі... Стаяць, бывала, каля перагародкі, стукацяць нагамі ад холаду, а ўсё роўна просяць кніжак.

— Там і вясною холадна, — спагадліва сказаў Высоцкі. — Не магу нават уявіць, як вы трывалі зімой.

Ён зноў крыху памаўчаў, потым падсунуў да сябе газету і апусціў вочы на ніжнюю калонку. Відно было, што ён ужо чытаў тут нешта, ды не дачытаў да канца — хтосьці перашкодзіў.

— Гэта вы пісалі? — спытаў у дзяўчыны, узняўшы на яе добрыя шэрыя вочы.

Яна глянула на стол, заўважыла мясцовую шматтыражку і кіўнула галавой.

— Псеўданімам падпісаліся ці тут ваша прозвішча?

— Маё гэтакае! — засмяяўшыся, сказала дзяўчына.— Неважнецкае ў мяне прозвішча, але я нідзе яго не хаваю. Пішу, дык падпісваюся, выступаю дзе, дык усім гавару, хто я такая.

— Ева Дым, — разборліва і з ласкавасцю ў голасе прачытаў Высоцкі. — Чым жа кепскае прозвішча? Ды хіба гэта важна? А па бацьку, як вас? Скажыце ўжо ўсё.

— Кузьма яго звалі, — ахвотна паведаміла дзяўчына. — Але я — проста Ева. Так мяне ўсе завуць.

— Папала тут нам! — яшчэ раз глянуўшы на невялікую падвёрстку ў паласе, прамовіў Высоцкі. — І правільна, зусім правільна!

— Вам самім не папала, — неяк захваляваўшыся, прамовіла дзяўчына. — Я мела на ўвазе Істужкіна... Вы, мабыць, ведаеце, што гэта за чалавек?.. Для яго існавала толькі тое, што на карысць самому...

Высоцкі слухаў гэтыя шчырыя апраўданні і ўжо больш па памяці перачытваў некаторыя абзацы з артыкульчыка. Яны былі вельмі непасрэдныя і прамыя, часам рэзкія, але цвёрдыя па логіцы. Словы і выразы падабраны трапна: хто прачытае, то наўрад ці хутка забудзе. Непрыкметна глянуў на яе руку: той раз у бібліятэцы яна дрыжала ад холаду. Уявілася, як гэтай рукой, у перапынку паміж выдачамі кніг, пісалася вось і сённяшняя заметка. Почырк круглы і выразны. Такім почыркам выведзены той надпіс, што вісіць на дзвярах бібліятэкі. На заметку, вядома, ускладаліся надзеі, а вось ці прачыталі яе тыя, каму яна адрасавана?..

— Што ж, будзем старацца... — паабяцаў Высоцкі. І адразу заўважыў, што Ева апусціла вочы. Адчуў, як яна падумала ў гэты момант пра яго, і папраўіўся.— Я разумею, што вы ўжо, мабыць, чулі такія словы ад іншых, але я сапраўды хачу памагчы. Тут і вам асабіста і агульнай справе. Праўда, не ўсё ад мяне...

— От гэтага не гаварыце! — перапыніла яго дзяўчына. — Сапраўды надакучыла! Да таго ўжо модныя сталі гэтыя словы, што слухаць прыкра. Асабліва ад вас. Скажыце проста: можаце што зрабіць ці нічога не можаце?

— Добра, — лагодна ўсміхнуўшыся, прамовіў Леанід Аляксандравіч. — Скажу проста, што зраблю, але не адразу.

— Ну, гэта ўжо больш канкрэтна. Дзякую! Хоць там у мяне і вельмі цесна, нязручна, аднак летнія месяцы сяк-так пражывём. Я вельмі баюся аставацца там на восень ды яшчэ на адну зіму. Ужо сілы маёй не хопіць.

— Не. Да восені перасялім, — пацвердзіў Высоцкі. — Думаю, што і раней.

Ева адхіліла вузкі рукаўчык жакеткі і глянула на гадзіннік.

— Што, у вас абед? — спытаў Леанід Аляксандравіч, і зноў перад яго вачыма мільганула шыльдачка на бібліятэчных дзвярах.

— Наогул-то перапынак, — адказала Ева, — але наўрад ці я паспею ўжо збегаць дадому.

— А як жа?.. Хіба... Дзе вы абедаеце?

— Нідзе. — Ева раптам пачырванела і, засмяяўшыся, вінавата глянула на Высоцкага. — Ото, бывае, на хаду з'ем што-небудзь, а бывае, што забегаюся, дык і забуду пра абед. Да самага вечара не хочацца есці.

— Маладая вы, трывалая,— тут ужо як старэйшы пачаў гаварыць Высоцкі. — Арганізм усё пераносіць, аднак не злоўжывайце сваім здароўем.

— Дык я не такая і здаровая, — нібы даўняму знаёмаму, прызналася Ева. — Нядаўна ляжала дзён некалькі. Паехалі ў калгас выступаць, а дождж як лінуў... На мне толькі гэтая жакетка была.

— Вось бачыце! — Высоцкі дакорліва паківаў галавой. — Значыць, трэба нам хоць трохі, але і пра сябе думаць. А з чым вы там выступалі?.. З дакладам, лекцыяй?

— Ды не, што вы! З самадзейнасцю.

— О, гэта цікава! А ёсць ужо ў нас што-небудзь?

— Ёсць. Пры клубе.

— Вы, мабыць, спяваеце?

— Усяк бывае. Трохі спяваю, трохі танцую, а больш — чытаю. Байкі вельмі люблю чытаць.

— «Вороне где-то бог послал...» — працяжна, пад тон некаторым цяперашнім паэтам, прадэкламаваў Высоцкі і

засмяяўся.— Сто гадоў жыве гэтая варона, а новых такіх баек я нешта і не чуў.

— Чаму, ёсць у нас не толькі Крылоў,— удакладніла Ева.— Крапіву чытаем, Міхалкова. А частушкі ды эпіграмы свае. —Дзяўчына зноў глянула на гадзіннічак. Ой, загаварылася я ў вас... Пабягу!

— Дык куды вы, дадому?

— Ну, калі вы гэтак напалохалі мяне, то прыйдзецца збегаць паабедаць.

— Я падвязу, якраз еду ў той бок.

Машына стаяла з тылавога боку часовага барака, у якім размясціўся будаўнічы трэст. Тут ужо былі пасаджаны дрэўцы. Не толькі пасаджаны, а і адгароджаны нізкім парканчыкам. А парканчык гэты пафарбаваны пад колер той зеляніны, якая неўзабаве павінна тут зашумець. Але пакуль што малавата тут зялёнага: увесь палетак заняты будаўнічымі матэрыяламі, фундаментамі і карпусамі. Тут пачне што-небудзь расці толькі ўжо ў наступную вясну.

Каля парканчыка — уезджаная дарога, яшчэ не асфальтаваная. На абочыне Высоцкі і пакідае сваю машыну пад нагляд трэстаўскага вартаўніка.

Усюды ўжо добра падсохла, дні два не было дажджу. Высоцкі адкрыў пярэднія дзверцы і знакам рукі запрасіў Еву сесці. Яна села адразу, неяк вольна і спрытна, нібы ездзіла ў гэтай машыне кожны дзень.

— Не ведаю, ці прызнавацца вам у адной маёй бядзе,— загаварыла проста і даверліва.— Вельмі люблю ездзіць на машыне. Неяк усё хутка змяняецца перад вачыма і бяжыць-бяжыць табе насустрач...

— Тут мы з вамі — пара,— з усмешкай сказаў Леанід Аляксандравіч.— От каб вы яшчэ за рулём пасядзелі!

— Гэтага пакуль што не ўяўляю,— прызналася Ева.— Нічога не разумею ў гэтых самых старцёрах, тармазах. А галоўнае — наўрад ці здолею глядзець увесь час толькі перад сабою. Мне хочацца бачыць, едучы, усё-ўсё навакол...

— Шкада, што ў нас так мала часу,— сказаў Высоцкі.— А то праехалі б нават сёння туды, пад хлебазавод. І да самай рэчкі лесам. Па нашаму генпраекту — гэта,

як вы ведаеце, парк культуры і адпачынку. І будзе тут парк, вялікі, прыгожы. Аднак гэта для тых людзей, што прыехалі сюды і яшчэ прыедуць, для тых дзяцей, што нарадзіліся тут і яшчэ народзяцца. Для мяне ж гэта — памяць маленства, месца лепшых забаў вясковых капапасаў.

— А хіба што-небудзь можна пазнаць з тых далёкіх часоў?

— Можна! — з захапленнем прамовіў Высоцкі.— Уявіце — сапраўды можна! Лес, вядома, не той цяпер: у вайну яго месцамі спалілі, месцамі высеклі — вырас новы. Але асталіся некаторыя лужкі, горкі з густым ядлоўцам, сям-там свежыя крыніцы. Іх я пазнаю. Канечне, патрэбна фантазія, каб уявіць, як тут было каля трыццаці гадоў назад. Але яна лёгка прыходзіць.

— Як-небудзь другім разам праедзем, калі ў вас і ў мяне выпадзе хвіліна.— Ева збоку, нібы неўпрыкметку, паглядзела на Высоцкага.— Цікава пабачыць, дзе гэта вы некалі пасвілі коней.

— А ведаеце што? — неяк вельмі шчыра ажывіўся Высоцкі.— Давайце надта і не адкладваць! А то вясна хутка праляціць, і не заўважым. У мяне ўжо некалькі год так: восень трохі памятаю, а вясну не. У вас калі наступны выхадны?

Ева хвілінку падумала і сказала:

— Па правілу ў аўторак, але я ўсё роўна хаджу на работу.

— А вы не ідзіце хоць адзін раз, — параіў Высоцкі.— У мяне больш складана з выхаднымі, і то стараюся хоць трохі вырываць іх. Аўторак... — задумліва паўтарыў ён.— Далекавата трохі... Што ў нас сёння? Серада? Ці няма там якога пасяджэння? Ладна! У другой палове дня... Які час вам больш спадручны?

— Гадзіны ў чатыры, — сказала Ева і раптам густа пачырванела. — Не ведаю... — дадала ціха і разгублена. — Можа абаненты затрымаюць... А можа...

— Што? — насцярожана спытаў Высоцкі.

— Мы яшчэ ўсё-такі мала знаёмыя.

— А мне здаецца, што я вас ведаю даўно. Сапраўды, бачыў гады два назад.

— Дзе?

— От і пагаворым пра ўсё. Пад'еду я вось сюды.— Ён паказаў на крайнія хаты Галубоўкі.

## III

Назаўтра брыгада Віктара Бранаўца павінна была выйсці на работу ў восем гадзін раніцы, і ў гэты ж час прыехаў туды Высоцкі. Вуліца, на якой хлопцы працавалі, не лічылася самай цэнтральнай, але мела тую асаблівасць, што па ёй рассяляліся сямейныя шахцёры і спецыялісты па хіміі. Дамы будаваліся па некалькі кватэр у кожным, але пакуль што аднапавярховыя і падобныя адзін на адзін, як дзве кроплі вады. Яшчэ здалёк Высоцкі ўбачыў высокую арку ў пачатку вуліцы і трохі здзівіўся: чаго яна тут. Некалькі дзён назад заязджаў сюды, дык яе не было.

Сэнс новага збудавання прасвятліўся, калі Леанід Аляксандравіч пад'ехаў бліжэй. На верхняй папярочніцы аркі віссла шырокае чырвонае палотнішча, а на ім белымі літарамі паведамлялася, што гэты будаўнічы ўчастак ударны, што камсамол узяў над ім баявое шэфства. Ні адной хвіліны тут не павінна быць прастою, ніводнага выпадку невыканання нормы! Літары былі вялікія і перапісаны з тэксту, відаць, мастаком. Пасля кожнага сказа стаялі клічнікі, ды такія даўжэзныя, што калі б яны былі з дрэва, то можна было б скарыстаць на жэрдкі.

Пад гэтай аркай стаялі хлопцы з Віктаравай брыгады, курылі, злосна сплёўвалі і, нецярпліва пераступаючы з нагі на нагу, паглядвалі па трэстаўскі «газік». (На гэты раз Высоцкі прыехаў на службовай машыне.)

— Добрай раніцы, сябры! — прывітаўся Леанід Аляксандравіч, падышоўшы бліжэй. Ён пазнаў тут некаторых з тых, што ўчора былі ў яго ў кабінеце.

Хлопцы прыязна адказалі і сталі менш дыміць папяросамі.

— Што, вымушаны перакур ці проста размінка перад пачаткам работы?

— Размінка, — зласнавата адказаў адзін з хлопцаў, відаць, не зразумеўшы жарту ў пытанні. — Так амаль кожны дзень размінаемся.

— А Бранавец дзе?

— Пабег шукаць прараба.

— Чаго няма? Раствору?

— І цэглы толькі на адзін заход.

Высоцкі ступіў да машыны і, ужо адкрыўшы дзверцы, затрымаўся, зноў глянуў на арку.

— А гэта чыё тварэнне? Не ваша?

— Ды не! Гэта Шчабятун!.. Генька прыдумаў. Шчабятунчык!

Хлопцы дружна засмяяліся, і пад гэты смяшок нехта так моцна і салёна вылаяўся, што нават шафёр Высоцкага, такі ж забіяка, як і тыя, балюча скрывіўся і зацмокаў языком.

Леанід Аляксандравіч паехаў у тое будаўнічае ўпраўленне, якое вяло гэтую вуліцу, але па дарозе сустрэў самога начальніка ўпраўлення Каробкіна. «Газікі» спыніліся ледзь не буфер у буфер, і першыя паздароўкаліся між сабою шафёры. Потым спусціўся з сядзення кароценькі, паўнацелы чалавек у вайсковай шапцы, відаць, не так даўно з арміі. Найбольш папулярнае з яго тутэйшай біяграфіі было тое, што ён самаўладна, без ніякай чаргі даў асобны пакойчык у новым доме адной прыгожай дзяўчыне з рознарабочых. Жонка даведалася пра гэта, падагрэла мясцком, некаторых іншых зацікаўленых, і рашучаму начальніку давялося перасяліць красуню зноў у інтэрнат.

— Ведаю, ведаю! — умела прыхоўваючы няёмкасць, загаварыў Каробкін, падыходзячы да Высоцкага і працягваючы кароткую, але дзябёлую руку. — Раствору няма, цэглы не хапае? Усё ведаю! Вось і еду, каб паправіць!

— Дык можа не сюды вам?.. — усумніўся Высоцкі.— З заводам трэба наконт раствору, а цэгла ваша, мабыць, на станцыі.

— Звязаўся ўжо з заводам! — энергічна заявіў Каробкін. — Паразганяць бы іх там усіх, каб гэта па сапраўднай воінскай дысцыпліне. Нагаварылі, наабяцалі, мы паверылі ды свой палігон прыкрылі... А цяпер не забяспечваюць растворам...

— Зрабіце, калі ласка, усё, каб тут хлопцы не прастойвалі, — папрасіў Высоцкі. — А я хутка буду на заводзе. А то — бачыце? — Ён паказаў на арку.

— Шумім, браткі, шумім! — падхапіў Каробкін. — Ну, гэта не мы, я асабіста вельмі не люблю шуму. Камсамол агіціруе — што ж ты тут скажаш?

— Я вярнуся сюды да абеду, — сказаў Леанід Аляксандравіч і сеў у машыну. Папрасіў шафёра ехаць проста на завод жалезабетонных вырабаў, аднак праз некаторы час мякка дакрануўся да яго рукі. Той ужо ведаў, што гэта азначае, спыніў машыну. Непадалёк ад дарогі буда-

валіся прамысловыя і службовыя карпусы каліінага камбіната, і ўвагу галоўнага інжынера прыцягнула адна даволі характэрная для тых часоў з'ява. Паабапал рыжых ад цэглы насілак сядзелі дзве ўжо добра загарэлыя дзяўчыны і, раз-пораз заліваючыся вясёлым смехам, нагружалі насілкі. Тое, як яны нагружалі, і ўразіла Высоцкага. Цэгла ляжала з аднаго боку насілак і з другога; адна дзяўчына працягвала руку ў свой бок, а другая — у свой. Кожная павольна брала па цагліне і клала на насілкі. Дзяўчаты не ўсталі і нават не змянілі сваіх рухаў, калі падышоў галоўны інжынер.

— Так, значыцца, стараемся, — прамовіў Леанід Аляксандравіч, і голас яго ледзь не заскрыпеў ад абурэння.

Дзяўчаты нібы і не заўважылі гэтага, трошкі павярнуліся да яго і са спакойнай абыякавасцю запыталі:

— А што, хіба кепска?

— І не сорамна вам?

— А чаго саромецца? Як умеем, так і працуем.

— Што ж вы заробіце, так працуючы? — спытаў Высоцкі ўжо мякчэй, бо зразумеў, што строгасцямі гэтых дзяўчат не праймеш. Адна з іх, шыракатварая, мажная і, відаць, байчэйшая за першую, узняла на інжынера вялікія, як слівы, вочы і ўпэўнена сказала:

— Мінімум усё роўна заплацяць, а больш не заробіш, як ні старайся.

— Ну і як жа вы пражывяце на гэты мінімум?

— А што нам, — прамовіла ўсё тая ж дзяўчына, расплыўшыся ў шырокай усмешцы і заблішчаўшы белымі, як часнок, зубамі. — Бульба ёсць, вада — радам. Дроў прыпром — і парадак!

Высоцкі нехаця засмяяўся і, мабыць, не знайшоўшы, што адказаць, марудна павярнуўся і пайшоў да машыны.

— А можа вы гэта карэспандэнт які? — пачуў ён за сабою голас. — То напішыце пра нас у газету, як мы тут працуем!..

«От і пагавары з імі, — думаў, ідучы, Высоцкі. — Паспрабуй пераканаць, што трэба працаваць лепш. Уцяклі з калгаса, атрымалі пашпарты, а цяпер ядзяць тую ж калгасную бульбу і грэюцца на сонцы. Трыццаць рублёў у месяц ім усё-такі заплацяць, а каб выпрацаваць больш на цяперашніх нормах, то трэба сапраўды рукі сарваць насілкамі».

Яму ўспомнілася, як на днях прыходзіў у кабінет інжынер з аддзела працы і зарплаты. Скардзіўся, што некаторыя падсобныя рабочыя і па дзесяць рублёў у месяц не зарабляюць, калі налічваць ім паводле правілаў. Але ж як гэта можна плаціць чалавеку толькі дзесяць рублёў? І вось прыходзіцца ісці на розныя прыпіскі, каб дацягнуць да мінімуму. Падносілі дзяўчаты цэглу на дзесяць крокаў, а пішацца, што на цэлую сотню. Перанеслі за месяц які дзесятак кубаметраў, а пішацца ўтрая больш.

Па вуліцы ехала калясачка з блакітным верхам. Ехаць было яшчэ цяжкавата: месцамі не зраўняліся каляіны, месцамі не зусім высахлі лужыны. Яе везла перад сабою маладая жанчына ў шэрай паношанай спяцоўцы, а каляска была новенькая, уся блішчала нікелем, нават здавалася, што яна ехала сама.

Высоцкі спыніўся каля гэтай каляскі. У ёй ляжаў яшчэ спавіты гаспадар такой раскошы, спакойна пасмоктваў соску і лупата паглядваў на маці. Побач з ім ляжала баханка хлеба.

— Ваш? — спытаў Высоцкі, неяк адчуўшы, што гэта павінен быць сын.

— Мой, — адказала жанчына. Яна таксама спынілася, сарамліва апусціла вочы.

— Няхай вялікі расце.

— Дзякуй вам. — Яна, мабыць, пазнала галоўнага інжынера. — Вось едзем дадому, з магазіна, бабка нас пасылала. А хутка зноў на работу.

— Не буду затрымліваць, прабачце, — вінавата сказаў Леанід Аляксандравіч, а сам так і не мог адарваць вачэй ад здараўчанага, вясёлага немаўлёнка. І, каб неяк апраўдаць сваю гэтую ўвагу, ён спытаў:

— Бранаўца часам не бачылі?

— А ён толькі што быў дома, абедаў. Мабыць, пайшоў ужо на аб'ект.

— Дык вы, мабыць...

— Я Ірына, яго жонка.

Брыгадзір комплекснай брыгады Віктар Бранавец быў на рыштаваннях, калі Высоцкі падышоў да перацятага вялікімі праёмамі вокнаў корпуса. Убачыўшы галоўнага інжынера, Віктар памкнуўся спусціцца ўніз, але Высоцкі падаў яму знак рукой і палез на рыштаванні сам.

— Дай на хвілінку, — звярнуўся ён да брыгадзіра, любоўна глянуўшы на кельму. І адразу зняў пінжак, стаў нецярпліва закасваць рукавы сарочкі.

Потым яны стаялі на рыштаваннях побач, абодва русагаловыя і, калі здалёк глядзець, дык і абодва маладыя. Толькі зблізку можна было заўважыць, што Леанід Аляксандравіч намнога старэйшы, хоць гэтак жа, як і Віктар, статны, падцягнуты, нічога лішняга няма ні ў постаці, ні ў твары. З рыштаванняў добра відна была ўся новая вуліца і наваколле.

— Аднастайна усё-такі, — заўважыў Высоцкі. — Нешта падобнае на вайсковы гарадок.

Віктара гэта здзівіла, ён паглядзеў на галоўнага інжынера не зусім даверліва і не згадзіўся.

— А мне здавалася, — апусціўшы вочы, загаварыў ён, — што наша вуліца будзе самая прыгожая ў горадзе.

— Гэта добра, што вы так лічыце, — ухваліў Высоцкі. — А то адпала б ахвота будаваць. Аднак жа вуліцы гэтай усё-такі нечага не хапае, аднатыпнасць быццам аказёньвае яе.

— Будуць прысады, — гаварыў далей Віктар, — тратуары, асфальт — можа і выгляд зменіцца.

— Сюды магазінаў хаця б два-тры, — прыкідваў у думках Высоцкі. — Ды з прыгожымі фасадамі, з вітрынамі. Потым, і ў праектах дамоў можна палепшыць некаторыя дэталі. Не толькі знешнія. Нам трэба будзе разам падумаць аб гэтым.

...Новая вуліца... Ужо не першая яна ў новым горадзе, бадай, самым маладым у краіне. Растуць вуліцы на былых калгасных выганах і палетках, а гэтая — амаль на агародах невялічкай вёсачкі. Некалі была шматдваровая гэтая вёска, але ў вайну не адзін раз гарэла ад баёў і ад рук карнікаў. Потым ужо мала хто і будаваўся тут, усё роўна як ведалі, што ўся плошча зоймецца горадам. Некалі стаяла тут і хата Бранаўцоў, Віктар ледзь толькі памятае пра гэта.

Высоцкі прайшоў па рыштаваннях да вугла дома і стаў задумліва глядзець на палетак, які цягнуўся адсюль аж да самага лесу.

— Мой бацька, — сумотна прамовіў Віктар, паказаўшы рукою на недалёкі помнік.

— Ведаю, дружа! Сам хараніў!

— Праўда? Як гэта?!

— Мы былі тут разам... Нямецкая граната разарвалася перад намі, мы абодва ўпалі. Потым я ўстаў, а камандзір...

Не першы раз чуў Віктар расказы пра тутэйшы бой, але не ад саміх удзельнікаў. Кароткі штрышок Высоцкага ўзнавіў у памяці блізкі сэрцу воблік бацькі, пра мужнасць і геройства якога ведалі тут усе.

...Некалі завітаў ён у той лясны лагерок, дзе яны ўсёй сям'ёй хаваліся ад немцаў. Узяў яго, самага меншага, на рукі, прытуліў да няголенай шчакі, спытаўся:

— Ну як ты, мой ваяка?..

Маці плакала ад радасці, чацвёра большых хлапчукоў разглядвалі бацькаву зброю, і хто як мог стараліся пакратаць аўтамат ці гранату...

— Вось з таго лесу мы і выйшлі, — гаварыў далей Высоцкі, паказаўшы вачыма на цяперашні гарадскі парк. — Прыйшоў у брыгаду загад аб разгроме фашысцкага логава, і твой бацька ўзяў гэта на сябе. Ён заўсёды не абмінаў самага цяжкага. Гарнізон быў моцны, немцы лічылі яго нават непрыступным. Аднак нічога там не ўцалела...

Леанід Аляксандравіч пабываў яшчэ на другіх вузлах корпуса і потым спусціўся з рыштаванняў. Ішоў па вуліцы і зусім не спяшаўся, нібы вымерваў нешта крокамі. Побач ціха ступаў і Віктар.

— Быў я сёння на заводзе, — нібы дзяліўся інжынер сваімі думкамі. — І ў ваша будаўнічае ўпраўленне заязджаў. Зробім усё, каб больш не было прастояў. А вы старайцеся, каб людзі потым не клялі вас, а ўспаміналі добрым словам. Ведаеш, як будзе называцца гэтая вуліца?

— Вішнёўкай завуць, — сказаў брыгадзір. — Як і вёску.

— Гэта старая назва, выпадковая, проста людзі так назвалі па звычцы. А я сёння пастанову чытаў: вуліца імем бацькі твайго пазвана. Маці жывая ў цябе? Браты?

— Нікога няма. Усе загінулі ў блакадзе.

— Ну, значыцца, і ў іхнюю памяць.

У свой кабінет Высоцкі прыйшоў толькі пад вечар. Сакратаркі ў прыёмнай ужо не было, ды ва ўсім трэсце наўрад ці туліўся дзе хоць адзін чалавек.

Каля тылавога пад'езду ўжо сядзеў на лавачцы начны вартаўнік Архіп у зімовай шапцы і высокіх гумавых ботах. На плечы ў яго было накінута нешта парусінавае, а што гэта, дык, мабыць, ніхто б не мог разабраць.

— Вы зноў гэтак позна? — звярнуўся ён да галоўнага інжынера і, бадай, хацеў нагаманіцца па вольнаму чаму, аднак Высоцкі толькі павітаўся і пайшоў у калідор.

Гэта сёння ён не спыніўся каля старога Архіпа, бо вельмі стаміўся і ад хады і ад рознай гаворкі: хацелася пабыць аднаму ў цішыні і спакоі, сабрацца з думкамі і ўражаннямі. А тыя разы часта спыняўся тут і, бадай, кожны раз чуў амаль адно і тое ж:

— Дык вы, значыцца, тутэйшы будзеце, Аляксандараў сын? Ведаю я Аляксандара. Ведаю! Харошы быў чалавек!.. Тытунь у калгасе саджаў... Ага... тытунь... А маці яшчэ жывая? Колькі гэта ёй ужо?..

І пачынаў вылічваць, колькі можа быць цяпер мацеры гадоў. Успамінаў безліч усялякіх даўніх падзей і потым, відаць мімволька, пераходзіў на самога сябе. Тады ўжо толькі не перашкаджай, слухай!.. Хоць цэлыя суткі стары мог расказваць пра ўсякія свае ўдачы і няўдачы, шчасці і няшчасці, заслугі і павагі.

Калі было хоць трохі часу, то Высоцкі сядзеў побач на лавачцы, слухаў і сумна паглядваў на яго паношаныя гумавыя боты:

«Усяго было ў жыцці чалавека: і ваяваў, і калгас арганізоўваў, і кіраваў калгасам, а цяпер вось сядзіць тут вартаўніком».

У кабінеце Высоцкі зноў успомніў пра гэтыя гумавыя боты і пазначыў у настольным календары: «Выдаць дзеду спяцоўку». Потым пачаў перагортваць лісткі, каб даведацца, што не зроблена за мінулыя дні, і нечакана натрапіўся на такі ж запіс: «Выдаць дзеду спяцоўку». Усміхнуўся і з дакорам самому сабе паківаў галавой: «Мала таго, што не паспяваю ўсяго зрабіць, дык яшчэ і забываю. А гэта ўжо горш за ўсё. Стамляюся, мабыць, залішне, не ўмею выбіраць галоўнае з безлічы ўсялякіх спраў».

Адкінуўся ў крэсле, прыплюшчыў вочы. Задрамаць на хвіліну была б, відаць, найлепшая асалода, але неяк сорамна зрабілася ад думкі пра гэта: заснi за рабочым сталом, тады яшчэ больш адалее непавага да самога сябе

і можа нават пахіснецца ўпэўненасць, што такое вялікае будаўніцтва па сіле інжынеру з невялікай практыкай.

Стомленасць паступова ўляглася, калі Высоцкі пачынаў абдумваць свае планы на бліжэйшы час. Было, вядома ж, нямала такіх спраў, якіх на хаду не вырашыш, з абы-якога боку не падыдзеш. Яны прыносілі клопат, турботы, выклікалі хваляванне, калі не паддаваліся. Але ж яны і радавалі, асвятлялі думку натхненнем, калі, хоць і пасля доўгіх пошукаў, пачыналі выглядаць рэальнымі і падавалі добрую надзею.

Цішыня і спакой рабілі кабінет вельмі ўтульным і свойскім — удзень ён такі не быў. Думалася і ўспаміналася лёгка, быццам усё тут памагала гэтаму.

...Пісьмовы стол з белым лістком пад прэсам. Ні лісток, ні прэс не крапуты, хоць пыл усюды выцерты, паліроўка па краях блішчыць. Гэта добра, што ніхто нічога не чапае на стале.

...На працілеглым краі ўчора ляжала Евіна рука. Учора, а здаецца, што зусім нядаўна, можа яшчэ і гадзіны не прайшло. Дзяўчына сядзела тут, зусім блізка. Чутны былі яе самыя ціхія словы, нават дыханне, калі яна нічога не гаварыла. Здавалася, што і цяпер вось-вось прагучыць яе голас і павернецца да яго твар з харошай чыстай усмешкай, з поўнымі шчырасці вачыма...

...Каляндарны лісток мінулага дня не зусім прылёг пасля перагортвання. Праз паперу прасвечвалася серада, якраз пачатак чэрвеня. Няхай будзе памятны гэты лісток, хоць на ім і няма ніякіх адзнак. На ўсіх астатніх ёсць і будуць далей.

Высоцкі да канца пералажыў учарашні ліст, адгарнуў сённяшні і стаў рабіць паметкі на наступных. А вось і аўторак...

Думкі пра той яшчэ не блізкі дзень паплылі вольна і асалодліва. Магчыма, гэта і будзе першы адпачынак за ўсе мінулыя месяцы ў годзе. Дажджоў цяпер мала, можа і чаканы аўторак будзе пагодлівы. Шкада, што нельга адключыцца на ўвесь дзень...

...У калідоры раптам пачуўся скрып палавіц. «І новая ж яшчэ падлога»,— перш за ўсё падумаў Высоцкі.

Скрып павольны, прыцішаны, у звычайныя рабочыя гадзіны яго не пачуў бы.

«Хто ж там можа быць у такі час? Хіба толькі вартаўнік надумаў прайсціся па калідоры?..»

Каля прыёмнай скрыпенне зусім сціхла, і не чутно было яго некалькі хвілін.

«Стары, мабыць, хоча пра нешта спытаць, ды не адважваецца. А спытае, тады ўжо і не сунімецца ў гаворцы...»

Аднак, калі праз некаторы час пачуўся асцярожны, нібы баязлівы, стук у дзверы кабінета, Высоцкі стрымана прамовіў:

— Заходзьце!

І зусім нечакана, зусім неспадзявана зайшла жанчына. Леанід Аляксандравіч устаў з крэсла, чамусьці адразу падумаў, што трэба быць спакойным і вытрыманым, ды ўсё ж не здолеў схаваць здзіўлення і разгубленасці.

— Ты як гэта?.. Як знайшла? — вырвалася ў яго быццам бы і не да месца. — Праходзь, сядай!

— Здрастуй! — між тым даволі абыякава сказала жанчына і з посным, незалежным выглядам падышла да таго крэсла, дзе ўчора сядзела Ева. Тут вызваліла правую руку ад вялізнай квяцістай сумкі і цераз стол павіталася. Была яна ў лёгкім светлым пыльнічку, наглуха зашпіленым з правага боку каля шыі. Тут жа блішчала доўгая, як вусень, брошка. На галаве ледзь вісела лёгкая газавая касынка: здавалася, фукні — дык і паляціць. Яна прыкрывала шчокі да самага носа і амаль увесь падбародак, а звышмодная прычоска добра відна была і з-пад касынкі: над ілбом тапырыліся пышныя валасы, над патыліцай вісеў вянок. І ўсё гэта, відаць, зусім нядаўна было прахімізавана і вымучана ў яркі барвовы колер.

«Гімалайскі заяц», — успомнілася Высоцкаму рэпліка наконт адной жанчыны, якая амаль кожны тыдзень пераінашвала колер валасоў.

— Я ўжо заходзіла сюды, — пачала гаварыць жанчына, сеўшы ў крэсла. — Сакратарка сказала, што калі і будзеш сёння, то толькі пад самы вечар. А цяпер у старога нейкага спытала — сядзіць там на лаўцы...

Высоцкі не стрымаў усмешкі, і гэта насцярожыла жанчыну.

— Чаго ты смяешся? — крыху збянтэжана спытала яна. — Я што-небудзь смешнае гавару?

— Ды не, гавары, гавары! — заспакоіў ён сваю госцю, бо няёмка было прызнацца, што смешна стала з гімалайскага зайца. — З кім ты прыехала сюды? Адна?

Жанчына пакруціла галавой, і Высоцкаму здалося,

што ён пачуў, як пацёрся аб каўнер барвовы венік яе валасоў.

— З ім тут? Дзе спыніліся?

— Ён паехаў нечага ў раён, там, мабыць, і заначуе. А ў мяне тут знаёмая.

— Ну, як жывяце, расказвай. Што робіць цяпер гэты твой... Як ты яго завеш?..

— На птушкафабрыцы, у Мінску.

— Кім?

— Замдзірам.

Высоцкі зноў ледзь не засмяяўся, але своечасова паднёс да вуснаў насавую хустачку і нібы сцёр ёю ўсмешку.

— А якім замдзірам? Там жа, мабыць, не адзін.

— Я не ведаю, — прастадушна прызналася жанчына. — Замдзір дык замдзір. А што ён там робіць?..

«Гэта на цябе падобна, — падумаў Леанід Аляксандравіч. — Добра, што хоць не фінціш, не прыкідваешся, а гаворыш, што думаеш...»

Высоцкі ведаў, што калі ў гэтай жанчыны ёсць нешта і прывабнае акрамя знешняй прыгажосці, дык гэта перш за ўсё непасрэднасць ці можа нават шчырасць у адносінах да самой сябе. Усё гэта часам выглядала паіўным або зусім непатрэбным, аднак праяўлялася часта і ў асобных выпадках надавала характару нейкую своеасаблівую абаяльнасць. Яна любіла паказаць усё лепшае на сабе і ў сабе, але магла адразу ж прызнацца кожнаму стрэчнаму і папярэчнаму, што ў яе раптам сапсаваўся страўнік, або цэлую гадзіну расказваць пра свой колішні апендыцыт. Калі траплялася на вочы што не даспадобы, яна шчыра абуралася, аднак жа і радавалася шчыра, калі ўдавалася раней за іншых купіць модную шапачку або безразмерныя панчохі. Асцерагалася мужчын, нікому быццам не давярала, аднак паўднёўку магла прашаптацца з сяброўкамі аб тым, як хто за ёю ўвіваўся, якія дамаганні праяўляў. Замужжа праклінала, смяялася з сямейных людзей, але не саромелася пазахапляцца і пазайздросціць, калі бачыла якую даму з сабачкам ды яшчэ ў машыне.

«Калі ўжо ісці, дык ведаць за каго; калі так сабе мець знаёмага, то не ніжэй як міністра».

Даўно гэта было сказана, тады яна была яшчэ зусім маладая дзяўчына. Доўга смяялася сказаўшы, можна было падумаць, што і пажартавала. Але часта здаралася

так, што нельга было зразумець, дзе яна жартуе, а дзе гаворыць праўду.

Многа спісвалася ў тыя часы на маладосць ды яшчэ на тое, што расла без бацькоў, амаль увесь час жыла пры не вельмі высокасвядомай цётцы. Леанід таксама быў тады малады. Цяпер успомніліся гэтыя словы і ўразілі, абурылі, а тады толькі прымусілі крыху папераживаць.

Праз некалькі дзён пасля таго яна раптам сказала, што рашыла выйсці за яго замуж. І ўсё ранейшае не толькі згладзілася, а быццам зусім знікла: лягчэй было скрозь зямлю праваліцца, чым успомніць пра гэта. Наконт жаніцьбы Леанід тады яшчэ не думаў, бо толькі што скончыў інстытут, не меў яшчэ ні кватэры, ні нават выхадных штаноў. І наогул сам ніколі не адважыўся б сказаць ёй пра гэта, каб не збянтэжыць, не адпужнуць ад сябе такой дзіўнай нечаканасцю. Якое ж тут замужжа, калі яна толькі на першым курсе мединстытута, калі і ўхажорства таго сапраўднага было яшчэ зусім мала.

— Ты праўду сказала? — спытаў тады Леанід дрыготкім ад хвалявання голасам. — Ты не жартуеш, Люда?

Дзяўчына пакруціла галавой.

— Ты яшчэ ні разу не сказала, што кахаеш мяне. Праўда ж?

— Ну вось цяпер і кажу. Што, не верыш?

І Леанід змаўчаў. Як ён мог папракаць яе, а тым больш дапытвацца аб нечым, калі сам кахаў моцна і ўжо часта лавіў сябе на думцы, што лічыў бы за шчасце выканаць кожнае яе жаданне, нават і зусім свавольнае і недарэчнае. А тут жа хіба свавольства?..

— Калі не хочаш ці баішся, то ў мяне ёсць за каго... — нібы нажом разанула тады Люда.

Як гэтыя словы гучаць у памяці цяпер? Ад іх аж мароз па целе ідзе, сорам забірае за сваю чалавечую годнасць! А тады падумалася, што гэта са злосці дзяўчына сказала, бо, мабыць, заўважыла яго нерашучасць.

І тая рашучасць была праяўлена — назаўтра яны запісаліся.

«...Вось яна, Люда... — думаў цяпер Высоцкі, употай пазіраючы на сваю нечаканую наведвальніцу. — Неяк ужо і не стасуецца да яе гэтае пяшчотнае імя».

— Людміла! — раптам сказаў ён уголас, ды так рэзка, што жанчына аж здрыганулася. — Ты ж добра ведаеш, што нашы цяперашнія сустрэчы зусім не радас-

ныя... Асабліва мне. Чаму ты не шануеш мяне як чалавека? Вось і раней колькі ўжо разоў наведвалася без ніякай патрэбы.

Людміла маўчала, відаць, пытанне гэтае было вельмі нечаканае для яе. Аднак ні на твары, ні ў шэрых, быццам вадзяных, вачах нельга было заўважыць ніякіх змен ці адчуванняў. Яна, мабыць, не зазлавала за такія словы і не пакрыўдзілася. А неўзабаве проста засмяялася і нават збянтэжыла Высоцкага.

Гэтую рыску ў яе характары Леанід Аляксандравіч заўважаў і раней, асабліва ў часе мінулых сустрэч. Іншы раз гаварыў ёй такое, што, здавалася, заплакаць трэба было ад крыўды ці ад усведамлення сваёй віны. А яна і тады смяялася. Няўжо гэта вытрымка, прыкмета цвёрдасці нерваў? А можа проста абыякавасць?

Смеючыся, Людміла і загаварыла:

— А чаму ўжо табе гэтак непрыемна? Я ж аліментаў не патрабую, няма за што. І сям'ю тваю не разбіваю, бо ў цябе яе няма, наколькі мне вядома. А можа хто ўжо запусціў у душу кіпцюры? Ты ўлюбчывы — я ведаю.

— Не было калі табе пра гэта даведвацца, — стрымана заўважыў Леанід Аляксандравіч.

— Чаму не было? У мяне дык вельмі хутка ўлюбіўся.

— Было такое няшчасце, мабыць ад маладосці.

— Чаму няшчасце? — крыху ўзвысіўшы голас, спытала Людміла. — А можа якраз шчасце для цябе?.. Яшчэ і цяпер рады былі б некаторыя...

— Ну, хопіць! — перабіў Высоцкі. — Я ўжо ведаю, пра што ты будзеш гаварыць.

— Зусім і не пра гэта, — запярэчыла жанчына. Вочы яе гарэзліва зыркнулі. — Канечне, ёсць там сякія-такія... Калі б мець час ды ахвоту...

— Гэтага ў цябе хапае. Нідзе ж не робіш?

— Пакуль што нідзе, але ж... Ну, чаму ты мяне перабіваеш, не хочаш паслухаць?

— Гавары, слухаю!

— Я хацела сказаць, што каб не той цяжкі выпадак, то мы і цяпер жылі б разам. Можа і шчасце было б.

Высоцкі цяжка ўздыхнуў і ўстаў. Калі абагнуў скругленыя на вуглах край стала, быццам пад нейкім прымусам глянуў на стройныя ногі ў надзвычай модных і зграбных туфлях. Людміла заўважыла гэта і не змяніла сваёй позы, нават не памкнулася прыкрыць плашчыкам калені.

«Глядзі на мяне, — гаварылі яе крышачку смяшлівыя, але ўжо з адценнем суму вочы. — Глядзі і любуйся, колькі хочаш, бо я не саромеюся цябе. Успамінай мінулае і ведай, што невыпадкова некалі закахаўся. Яшчэ не было такога мужчыны, каб не заглядваўся на мяне».

— На каторы дзень пасля мяне ты выйшла за другога? — прыглушана спытаў Высоцкі. Спытаў і чамусьці пайшоў да дзвярэй, хоць наўрад ці была ў гэтым патрэба. Дайшоў, адчыніў для нечага, паглядзеў у прыёмную і зноў вярнуўся да стала, а жанчына ўсё маўчала. З натугай хаваючы хваляванне ад далёкіх і цяжкіх успамінаў, спыніўся каля крэсла, у якім учора сядзела Ева. На нейкі момант уявіў яе твар, малады, адухоўлены, з вясёлымі і ў той жа час вельмі ўважлівымі вачыма.

Цяпер тут — Людміла. Каб неяк адарвацца зрокам і думкамі ад яе крыклівай моднасці і прыгажосці, ён чамусьці агледзеў свой касцюм вельмі звычайнага гатунку, шэры ды ўжо не новы. Зірнуў потым на свае туфлі, нібы жоўтыя, нібы ўжо чорныя, на тоўстай мікрапоры. Якімі бахіламі яны выглядалі побач з навенькімі лакіроўкамі на цвічках-абцасіках! Высоцкі нібы спалохаўся гэтага параўнання і адышоў.

— На каторы дзень, пытаеш? — загаварыла ў гэты час Людміла. — Не памятаю ўжо, на каторы, але каб не твой аднакашнік, то можа б і ні за каго не выйшла. Як прычапіўся, як прывязаўся!.. Прыліп, як смала... Уверыў мяне, што ты... не вернешся.

— Няхай бы ты мне паверыла, маёй праўдзе. Я ад цябе нічога не хаваў.

— Ён можа плакаў і па табе, але і без мяне жыць не мог.

— І колькі ж вы пабылі разам?

— Каля года. Не ўспамінай лепш пра гэта!..

— Малавата для шчаслівых, — ледзь не са здзекам сказаў Высоцкі. — Я ж не перашкаджаў вам.

— У кожнай жанчыны ёсць свой ідэал, — нібы завучана прамовіла Людміла і ўтуліла акруглены падбародак у каўнер плашча. Ёй вельмі не хацелася гаварыць пра такія складаныя рэчы, і Высоцкі адчуваў гэта. Колькі разоў заўважаў і раней, што Людміла старанна пазбягала якога б там ні было самааналізу, яе вочы і твар пачыналі іграць толькі тады, калі яна хвалілася сама або яе хвалілі.

І ўсё ж Леанід Аляксандравіч спытаў пра цяперашняга мужа, замдзіра, — ідэал ён ці не ідэал?

Людміла павярнулася да яго, калі ён зноў сеў за стол, шаўковы плашчык ад гэтага зашумеў. Уставіла ў твар вочы, нібы і шчырыя, але глядзець у іх не хацелася. Сказала рашуча, быццам ішла на вялікі подзвіг:

— Не, не ідэал! Мабыць, толькі аднаго цябе і любіла.

Памаўчала з хвіліну, апусціўшы вочы, потым ледзь чутна дадала:

— І цяпер люблю.

У гэтых словах сапраўды была шчырасць, і калі б сказала іх не Людміла, то напэўна можна было б паверыць. Але гэтай жанчыне Высоцкі не мог больш верыць, хоць часам лавіў сябе на тым, што іншы раз нешта прачыналася ў душы, калі які-небудзь выпадак нагадваў пра яе. Асабліва хвалявала і падчас доўга аставалася ў памяці далёкае мінулае, чаго ўжо ніякім цудам нельга цяпер вярнуць. Можа таму і хвалявала і хіліла яно на глыбокі сум, што было незваротнае і непаўторнае. Відаць, і ўспаміналася Высоцкаму толькі тая далёкая і цяпер ужо нібы казачная дзяўчына, крыху наіўная, ветраватая, але бясконца прывабная. За яе незвычайную прыгажосць і неспадзяваную пяшчотнасць можна было дараваць усё. У тыя часы хацелася верыць ёй, бо яна ўмела быць і шчырай.

Дык гэта яна, тая Людачка, студэнтка першага курса медінстытута. Але ж зусім не гэтая Людміла, што сядзіць цяпер насупраць, па другі бок стала. Прыгажосць у яе аставалася, хоць ужо і не тая, што была раней, а больш адкрытая, паказная. Але яна яшчэ можа засланіць усё, што ёсць у натуры дробнага і нядобрага, можа асляпіць некаторых і прымусіць глядзець праз крывое люстэрка не толькі на яе самую, а і на іншых людзей.

Высоцкі бачыў гэтую прыгажосць, адчуваў яе моцную прывабную сілу, але яна ўжо нібы зусім не закранала душы, не нараджала ў ёй ранейшай пяшчоты і веры. Сама лепшая праўда ад яе магла выглядаць цяпер няпраўдай, ды яшчэ часам і непрыстойнай, балючай.

— Не кахаеш ты мяне! — ледзь не крыкнуў Высоцкі.

Глянуў на дзверы і апусціў галаву, прыціх. Ад яго голасу ў кутках пакоя адазвалася рэха, хутка знікла, а потым у кабінет быццам бы разам са змрокам нахлынула глухая і сумная цішыня. Цяжка аставацца ў такой

ціпшні хоць адну хвіліну. А тут яшчэ з чалавекам, які не можа прынесці нічога светлага.

Высоцкі чуў сваё няроўнае, усхваляванае дыханне, чуў, як дыхае ў каўнерык плашча Людміла. Нешта падмывала крыкнуць яшчэ раз, каб парушыць, адагнаць ад сябе гэтую непрыемную цішыню, але ён стрымаў сябе і прыглушана дадаў:

— Раней таксама не кахала! А калі што і было, дык толькі легкадумства, гульня ў пачуцці! Табе падабалася ствараць уражанні, каб больш палюбавацца сабой. Ні душы, ні сэрцы людзей цябе не цікавілі. Мне цяпер здаецца, што ты нават і не здольна была каго-небудзь пакахаць.

Пры апошніх словах Леанід Аляксандравіч неяк расслаблена і раздражнёна ўспёрся локцямі на стол і апусціў на далоні галаву. Ён не бачыў, як рэагавала на яго словы Людміла, але чакаў, што яна вось-вось падасць свой голас, можа нават і вельмі рэзкі, пакрыўджаны, злосны. Магчыма, што і раскрычыцца, каб адвесці ад сябе віну.

Але прайшло каля хвіліны, і ніякага голасу не чулася, у пакоі зноў запанавала тая самая маркотная і падакучлівая цішыня. Высоцкі не кратаўся і быццам міжвольна нечага чакаў. Няхай хоць крыку, хоць плачу, хоць ласкі, абы толькі не таго, што было да гэтага ды так растрывожыла душу.

І раптам зусім нечакана пачуў, як зашамацеў шаўковы плашчык. Падняў галаву. Людміла ўжо стаяла бокам да яго і нешта шукала ў сумцы, мабыць насоўку. Пад вачыма ў яе пачырванела.

— Бывай здароў, — сказала, ледзь не заплакаўшы, хораша павярнулася і пайшла. Тоненькія абцасікі ступалі цвёрда і роўна, усе крокі да дзвярэй былі нібы вымераны і разлічаны, бо кожны з іх нідзе не збіўся, нідзе не скрывіўся. Плашчык лёгка пераліваўся па згібах і падкрэсліваў прыгажосць і стройнасць постаці.

...Зачыніліся дзверы спачатку кабінета, потым прыёмнай, заглух стук абцасікаў на калідоры, а шаўковы плашчык са сваімі пяшчотнымі пералівамі ўсё стаяў перад вачыма. Чуўся яго лёгкі шумок, і чамусьці не хацелася верыць, што Людміла вось раптам устала і пайшла, зусім пайшла і, мабыць, ужо ніколі не вернецца.

Многа дум перадумалася некалі пра яе, многа пакут

неражылося. У апошнія часы была ўпэўненасць, што мінулае ўжо даўно нібы ў ваду канула і не нагадае больш аб сабе. Пры няўдаўніх сустрэчах гэтая ўпэўненасць амаль не парушалася. А вось сёння выйшла нешта зусім нечаканае і неспадзяванае: у Высоцкага не хапала сілы ўзяць ды адразу ўсё выкінуць з галавы, забыцца, як яна тут сядзела, што гаварыла, як потым устала і пайшла, маўкліва і сумотна, але не губляючы свайго спрыту і чароўнай стройнасці.

Леанід Аляксандравіч адчуў, што больш не можа аставацца ў кабінеце. Захацелася хутчэй пайсці, каб хоць крыху вызваліцца ад нечаканых уражанняў і думак... А можа каб дагнаць Людмілу ды пагаварыць яшчэ?.. Пра што гаварыць? На гэтае міжвольнае пытанне адказу не знаходзілася.

...У які бок яна пайшла? Няўжо спытаць пра гэта ў старога Архіпа?..

Высоцкі нібы спалохаўся сваіх адчуванняў: тут нешта выпадковае, яно павінна хутка прайсці!.. Гэта пазыўныя далёкага мінулага, кароткія і пязначныя.

Архіп устаў з лаўкі, калі ўбачыў паблізу галоўнага інжынера.

— Ужо больш не прыйдзеце? — спытаў нібы з жалем, што не будзе з кім пагаварыць, нібы з жаданнем хутчэй збавіцца ад начальства ды прыдрамнуць соладка на свежым паветры.

— Сёння не прыйду, — адказаў Высоцкі. — Пагляданце на машыну!

— Ды ніхто не тут...

Стомленасць сапраўды вельмі адчувалася: пашумлівала ў галаве, цяжкавата ішлі ногі. Адпачынку ў кабінеце як і не было, бо не палегчыла на душы, не атрымалася супакоенасці.

Цяпер, ідучы дадому, толькі б і памарыць пра свой дамашні ўтулак, пра старэнькую матулю, якая, мабыць, ужо даўно чакае і, пакуль яшчэ віднавата, пазірае з агароду на тую сцяжынку, што вядзе з горада. Аднак замест гэтага ўзнікла ў памяці зусім даўняе і неспадзяванае.

...Невялічкі пакой у цёплай кватэры на ціхай гарадской вуліцы. Невялічкі, але быццам бы і прасторны,

бо з яго навыносілі ўсё, што можна было вынесці. Тое навыносілі, а пазычаных сталоў і крэслаў наўносілі.

Чыя гэта цётка? Ды, вядома ж, Людзіна, тая самая, у якой дзяўчына гадавалася.

...Цёткі ўжо даўнавата за сталом не было, бо ёй хапала работы на кухні. Спачатку вельмі патрэбнай для гасцей, а потым ужо — нікому непатрэбнай: яна супакойвала і ўладкоўвала свайго трэцяга ці чацвёртага прымачка, які скачурыўся яшчэ ад першых тостаў за маладых.

— Ты знаеш, хто я? — пытаўся ў яе маленькі з чырвонай лысінай чалавек і ўсё намагаў скаціцца з канапкі, каб выпаўзці ў гасцявы пакой. — Ідзі — пашанчу на вуха! Толькі табе!..

— Ды ведаю я ўжо, ведаю! — адказала жанчына, надкладваючы свае ацёклыя рукі яму пад бок ці пад спіну, каб адкаціць кволую постаць назад.

— Ні д'ябла ты не ведаеш! — крычаў прымачок. — Я тайны міліцыянер! Чула? Вось хто я! І глядзі, не прабалбачыся!

— Ды сам ты ўжо не раз пра гэта балбатаў. Пажарнік ты... І ніякі не міліцыянер.

— Я табе дам «пажарнік»!

А ў пакоі ў гэты час ледзь не ўвесь цётчын кагал крычаў «горка!». Націск быў такі, што больш падатлівы Леанід ішоў па згоду нават без асаблівай затрымкі, хоць за сталамі побач з некаторымі маткамі і таткамі сядзелі падлеткі. А Люда супраціўлялася вельмі настойліва і ўмела, быццам такія вяселлі былі ў яе ўжо не раз. І ўзяла верх над самымі заядлымі крыкунамі, не дазволіла Леаніду нават нахіліцца да яе.

Тады адзін з неўгамонных вясельных завадзілаў працягнуў сваю чарку да аднаго расквечанага світара ў канцы стала і пачаў крычаць, што таму распаранаму ад выпіўкі і душнаты юнаку ў гэтым світары споўнілася сёння дваццаць два гады.

Амаль усе зашумелі ў падтрымку, бо іх зусім не цікавіла, за каго выпіць — абы выпіць.

Юнак устаў і разгладзіў па жываце свой світар. Тады Люда выскачыла з-за стала, птушкай падляцела да гэтага імяніннікa і з прагай, зусім не саромеючыся нікога, пачала абцалоўваць хлопцу потныя шчокі, вушы, лоб.

— Горка-а! — закрычаў той, што абвясціў тост.

...Не паспела дзяўчына вярнуцца на сваё месца, як у калідорныя дзверы, якія відны былі з пакоя, нехта патрабавальна пастукаў. Гаспадыня пакінула свайго прымака і пабегла адчыняць.

Увайшлі тры чалавекі. Нікога гэта асабліва не здзівіла, бо ўсе ведалі, што гаспадыня гэтай, быццам непрыкметнай, кватэркі мае вельмі шырокі круг знаёмых. Аднак яна пакуль што не запрашала новых гасцей у вясельны пакой, а тапталася каля іх неяк панура і разгублена.

— Нам бы тут Высоцкага, — сказаў адзін з тых, што прыйшлі, чалавек ужо ў гадах і з пукатым жывоцікам пад чорным плашчом, — імеецца сярод вас такі?

— Я Высоцкі, — сказаў Леанід і ўстаў. — Прашу, таварышы, распранайцеся, будзьце гасцямі!

— Не, мы хацім папрасіць вас! — сказаў чалавек з жывоцікам, крыва ўсміхнуўся і кіўнуў рукою на кухню...

Калі Леанід падышоў туды, чалавек расшпіліў верхнія гузікі плашча, дастаў з кішэнькі вайсковага кіцеля чырвоную кніжачку і падаў Высоцкаму. Той узяў, глянуў на вокладку і, нібы апёкшы ёю рукі, паспешна вярнуў.

— Імелася па ўвазе, — усё з тою ж крывою ўсмешкаю загаварыў чалавек, — што вы разгорнеце сію кніжачку... А там вось што!..— Ён адхіліў вокладку з пазалочанымі літарамі і выняў паперку з трыма размашыстымі подпісамі, выразным штампам і пячаткай.— Я сажалею, што ў такі час прыйшлося... Но... Служба, знаеце... Вяшчычкі тут у вас, кніжачкі, цятрадкі?.. Збірайце!

— Нічога ў мяне тут няма, — апалым голасам прамовіў Леанід.

— А што, кватэрка собстная імеецца?

— Няма яшчэ. У інтэрнаце жыву.

— Ну, вот будзеце імець... Будзеце імець...

Расчомаўшы, у чым тут справа, узняўся з канапкі прымачок, з натугай выпрастаўся, нават выцягнуў па швах рукі. Стаяў гэтак, пакуль няпрошаныя госці разам з Леанідам не зніклі за дзвярыма. Тады махнуўся ў калідорчык і закрычаў:

— Вы знаеце, хто я?!.

...Яго асіплы крык Леанід яшчэ пачуў. Гэта быў апошні адгалосак вяселля...

...На двары стаяла позняя восень, і ўжо зусім сцямне-

ла. Леаніду зрабілася так холадна, нібы хто прымусіў нырнуць у ледзяную ваду. І колькі ішоў, дык увесь час адчуваў гэты жудасны дрыготкі холад.

Так задумаўшыся, Высоцкі і не заўважыў, як дайшоў да Галубоўкі. Параўняўся з хатамі і нібы міжвольна павярнуў у вуліцу. Круг тут невялікі: ці дарогаю паўз магазін дадому, ці па вуліцы, а потым цераз поплаў.

Ужо змерклася. Усюды на будаўнічых аб'ектах і на вуліцах горада загарэліся ліхтары. А ў Галубоўцы было цёмна, хоць яна самая бліжэйшая вёска ад горада. Ды што вясновае сутонне! Гэта ж не асенняе. Такі вясновы змрок на зялёнай вуліцы нікога не засмучае, не трывожыць. Бадай, ніхто не пазайздросціць тым людзям, якія стаяць ці сядзяць у гэты час дзе-небудзь пад электрычным ліхтаром.

Высоцкі ішоў паціху вузкай сцяжынкай паўз самыя платы. Сцяжынка пралягла проста і роўна там, дзе перад ёю не было бярвенняў або ляжачага слупа пад ліхтар. Такія рэчы яна абмінала і зноў ішла між прыпыленага, хоць і маладога яшчэ трыпутніку і драсёну. Яе лёгка было намацаць нагамі.

Амаль ля кожнага двара стаяла лавачка, дзе большая, дзе меншая, але кожная ў тым месцы, якое было найбольш прыгожае і ўтульнае для гэтага двара: пад палісаднікам, пад ліпай ці таполяй, слівай ці вішняй. І мала каторая была ў гэты час незанятая. І мала на каторай сядзелі па трое ці па чацвёра ды размаўлялі моцна, смяяліся або спявалі. Амаль усюды туліліся па двое, і не чутно было ні іх размоў, ні галасоў.

Падыходзячы да такой лавачкі, Высоцкі міжвольна прыбаўляў крок і стараўся не глядзець на тых, хто там сядзеў, каб чым-небудзь не перашкодзіць. Была б другая сцяжынка, то абышоў бы іх.

Сады і прысады толькі пачыналі добра зелянець. Каля тых платоў, дзе рос вішняк, яшчэ бялелі на зямлі нядаўна апалыя пялёсткі. Сяды-тады выплываў на вуліцу і казытаў нюх тонкі і чароўны пах квецені позніх яблынь. Усё гэта трошкі адводзіла Высоцкага ад ранейшых успамінаў, згладжвала ўражанне ад нядаўняй сустрэчы.

Уперадзе, на той бок вуліцы, — славутая на ўсю ваколіцу таполя. Тым славутая, што расце быццам лежачы

і ўтварае над вуліцай зялёную арку. Даўняя гэта таполя, шматгадовая. Яшчэ падлеткам Леанід разоў некалькі лазіў па ёй, ды не толькі лазіў, ступаў нагамі на камлі. У гэтым была тады галоўная фатэцыя, каб прайсці па камлі галубоўскай таполі і не зваліцца.

А потым, у часы яго ранняга юнацтва, тут часам наладжваліся вечарынкі. Кульгавы кравец Афонька, бывала, так расцягваў свой гармонік, што калі вецер быў адтуль, то заліхвацкая полька чутна была і ў Арабінцы. Тут адлегласць — менш за кіламетр, усё Лёнева таварыства бегла туды.

У перапынках паміж танцамі самая меншая дачка галубоўскага папа спявала песні. І абавязкова адна. Калі пачыналі намагаць другія, то яна змаўкала. Голас у яе быў моцны, але не надта прыемны.

— Накіну плачгі тарой над полою... — заводзіла яна, і ўсе слухалі.

— Плащ с гитарой, — папраўляў Леанід, улучыўшы зручны момант. Але папоўна не звяртала на гэта ніякай увагі — яна была на некалькі год старэйшая за яго і лічыла, што ведае больш.

Цяпер Высоцкі спыніўся каля гэтай таполі, каб паглядзець, палюбавацца ёю ды вызначыць, наколькі гэта можна ў змроку, што тут змянілася, перайначылася. І толькі ў гэты момант заўважыў, што пры самым палісадніку пад таполяю прытулілася маленькая лавачка і на ёй таксама нехта сядзіць. Памкнуўся адразу даць шырокі крок, але з лаўкі імкліва ўстала дзяўчына, падышла бліжэй.

— Леанід Аляксандравіч? — здзіўлена і крыху, мабыць, разгублена спытала яна. — Як вы сюды папалі?.. Куды вы?

— Ды вось... іду дадому, — таксама адчуваючы ніякавасць, сказаў Высоцкі. — Сядзеў там у трэсце... Сцямнела...

— Рашылі нашу вуліцу паглядзець? Прыгожа тут вясною. Праўда?

— Вельмі. Вось іду і любуюся. Таполю гэтую ўбачыў...

— А цяпер вам у канец і там напрасткі поплавам?

— Ага. Там блізка.

— Я вас правяду.

Высоцкі глянуў на лавачку і заўважыў, што хлопец,

які дагэтуль сядзеў побач з Евай, устаў і, мабыць, не ведаў, што яму рабіць: аставацца на месцы, ісці следам ці падавацца дадому?

— Пачакай тут, Вілен, — сказала яму дзяўчына і пайшла побач з Высоцкім. Леанід Аляксандравіч уступіў ёй сцежку, але яна ішла травою, а сцежка, нібы ціхі ручай, плыла паміж імі.

— Можа нядобра, што вы яго пакінулі? — ціха спытаў Высоцкі. — Пакрыўдзіцца.

— Ды не, — упэўнена сказала Ева. — Чаго яму?.. — І з лёгкім смяшком дадала: — Малодшы за мяне, то няма чаго крыўдзіцца.

— Вы яшчэ таксама маладая, — з сяброўскай лагоднасцю сказаў Леанід Аляксандравіч. — Мабыць, якраз яму і пара.

— Ого! Не. Я ўжо старая. Мне хутка чацвёртая частка веку.

— Якога? Жаночага?

— Не, звычайнага.

— Не падобна нешта.

Высоцкі быццам жартаваў, рабіў выгляд, што ўсё гэта мала яго цікавіць, і ў той жа час ледзь знаходзіў сілу прыхоўваць тыя нечаканыя пачуцці, якія пачыналі авалодваць ім.

— А гэты хлопец, што там астаўся, хто такі? — неяк наспешліва і можа нават нясвоечасова спытаў ён. Спахапіўся і папрасіў прабачэння за нясціпласць.

— А гэта Перапечка, — проста і адкрыта сказала Ева. — З Галубоўкі, жыве там па суседству.

Яна прайшла з Высоцкім у самы канец вуліцы, аж за царкву, а там — і да масціка, што быў пакладзены на канаве, выкапанай для падсушкі поплава. Цяпер гэты масцік разваліўся, таму па вуліцы рэдка хто праязджаў; менш было ранняй вясною і ў познюю восень гразі, а ўлетку пылу. Можа для таго галубоўцы і не рамантавалі масціка, каб пры цяперашніх умовах жыць спакайней і ўтульней. Дарог хапала ўсюды, аднак добрая палова самазвалаў і цягачоў ішла раней вуліцаю, бо сюдою на нейкага паўкіламетра бліжэй да будоўлі.

Мабыць, насуперак традыцыям гэтай вёскі, Ева каля масціка не спынілася, а пайшла далей.

— Я вам пакажу, як тут перабрацца, — сказала яна Высоцкаму, нібы жадаючы апраўдаць свой намер ісці

яйчэ. — Тут усяго дзве суцэльныя маспічыны, але ў мяне вопыт, кожны дзень хаджу.

Яна спрытна ўзышла, нібы ўскочыла, на мосцік, з вясёлай усмешкай аглянулася на Высоцкага і роўненька, хоць і расставіўшы рукі, перабегла на той бок. Там спынілася і зноў стала глядзець на Высоцкага. Леанід Аляксандравіч нерухома стаяў на другім баку мосціка і быццам не збіраўся ісці следам. Дзяўчына здагадалася, што ён любаваўся ёю, але пры ўсёй сваёй непасрэднасці сказаць пра гэта не адважылася.

— Можа вам руку падаць? — гучна спытала яна.

— Я ўжо іду, — азваўся Высоцкі і ступіў на хісткія маспічыны. Да сярэдзіны ішоў наглядваючы сабе пад ногі, а потым убачыў Евіну руку, выстаўленую яму насустрач, і ледзь не бегкам памкнуўся да яе. На хаду схапіў тонкія, кволыя пальцы і раптам адчуў поўную раўнавагу, мог ісці цяпер доўга нават па адной, самай ненадзейнай маспічыне.

Ева не адводзіла сваю руку, калі яны пайшлі далей, але і гэта ў яе выходзіла без ніякай наўмыснасці, проста і натуральна, па-таварыску. Высоцкі таксама жадаў душою толькі гэтага, таму хацеў бы адчуваць у сваёй руцэ пяшчотнае і даверлівае цяпло ўсяго толькі добрага і спагадлівага спадарожніка. Гэта ў сваіх вельмі ўжо асталелых думках, а сэрца міжвольна радавалася ад прадчування нечага намнога большага, небывалага, мала кім зведанага.

— Вы ж будзеце баяцца бегчы адна, — сказаў ён, шчыра выяўляючы клопат старэйшага чалавека.

— А я тут як дома, — нібы адвяла ўсе клопаты дзяўчына. — Яшчэ трошкі праведу... Вунь да сцежкі, што праз пасевы.

Так яны перайшлі ўвесь поплаў. Ле жаданне спыніцца Леанід Аляксандравіч адчуў сваёй далонёю: нагрэтыя ў руцэ пальцы заварушыліся. Ева павярнулася да яго тварам, і нават у змроку засвяціліся яе чыстыя, вялікія вочы.

— Ну, вось!.. — Цяпер вы ўжо на сваім палетку. Пабягу!

— Я не пушчу вас адну! — настойліва сказаў Высоцкі. — Пойдзем зноў да мосціка.

— Ну што вы? — запярэчыла Ева, і ў гэтым пярэчанні таксама адчулася шчырасць. Высоцкі сумеўся.

— Хіба некалькі крокаў...— згадзілася дзяўчына, мабыць зразумеўшы, што чалавеку стала няёмка.

«Вілен жа там,— раптам успомніў Высоцкі.— Сапраўды! Чаму гэта я забыў пра яго? Усё ў яе, мабыць, там, а тут — звычайная ветлівасць, а можа нават і спачуванне новаму і ўжо даволі стомленаму чалавеку».

— Вы цэлы дзень былі ў раз'ездах, — нібы ўгадваючы яго думкі, загаварыла Ева. — Здаецца, ад цямна да цямна. Я некалькі разоў сёння бачыла вашу машыну.

— Многа работы,— заўважыў Высоцкі. Голас прагучаў абыякава, суха. — «Мабыць, скажа яшчэ: ідзі ты хутчэй спаць. Я ж дзеля гэтага і праводзіла цябе...»

Дайшлі ўсё ж такі да самага мосціка. Тут Высоцкі спытаў без усялякай падзеі і з цвёрдасцю чалавека, які не хоча быць настырным і не збіраецца падаць духам пры няўдачах:

— У аўторак вы... Як?.. Знойдзеце вольную гадзіну?

— Мы ж дамовіліся, — нібы нават здзівіўшыся, што аб гэтым перапытваюць, сказала Ева. — Прыязджайце, буду чакаць!

І яна зноў быццам узляцела на мосцік. Адтуль працягнула руку, але ўжо не гэтак, як ідучы сюды:

— Да пабачэння!

Высоцкаму здалося, што цяпер яна толькі дакранулася да яго далоні, жвава крутнулася на абцасіках і імкліва пабегла па маснічынах. Пераляцела мосцік і не сцішыла крок там далей: гэта чутно было ў вячэрняй цішыні...

Ён пастаяў, пакуль Ева знікла ў змроку, атуленым прысадамі, і паціху рушыў дадому. Ішоў тым напрамкам, які нядаўна выбрала дзяўчына. Ён сапраўды самы зручны, мабыць, Ева ўжо не раз была на гэтым поплаве. Пад нагамі ўжо густая мураўка і нават крыху з расою — гэта адчуваецца праз абутак. У хадзе чамусьці знікла тая лёгкасць, якая была некалькі хвілін назад. Пазалялі ўсякія думкі і ўяўленні. Некаторыя хацелася адагнаць, збавіцца ад іх назаўсёды. Навошта, к прыкладу, думаць аб тым, як яна прыбяжыць цяпер да лавачкі пад тапаляй ды абхопіць маладога Перапечку за шыю?.. Можа абхопіць, а можа і не. Можа папросіць у яго прабачэння, што затрымалася, а можа і не папросіць. Гэтая натура не на далоні, хутка не разгадаеш. Ды не трэба браць усё к сэрцу! Няхай яна нажывае, як сама знае...

Як толькі Леанід Аляксандравіч выйшаў на сцежку праз поле, арабінкаўскі ліхтарык засвяціў яму проста ў вочы. Паглядваючы на яго, можна было б трапіць дадому нават і без сцежкі. Але тут да таго ўжо выбітая пешаходка, што адчуваецца пад нагамі: вельмі многа людзей ходзіць з горада і ў горад.

Праз некаторы час стаў паказвацца і яшчэ адзін агеньчык, трохі ніжэй за той, што на ліхтары. Ён то свяціўся, то знікаў, быццам нешта яго засланяла. І можа ад гэтага часам здавалася, што ўспыхваў ён то бліжэй, то далей.

«Канечне, гэта ў акне, — здагадаўся Высоцкі. — Толькі невядома, у чыім».

Падыходзячы бліжэй, ён усё больш пераконваўся, што святло гарыць у матчынай хаце. Яна стаіць у канцы агародаў, непадалёк ад выгану і шляхавай дарогі. А гэтая сцяжынка вядзе на выган і, нібы ручаёк у рэчку, уліваецца ў шляхавую дарогу.

Толькі год назад гэтая хатка перамясцілася сюды і набыла больш вясёлы выгляд. А гадоў сорак з гакам стаяла каля самай арабінкаўскай вуліцы і кожную вясну падплывала вадой. Старажылы гавораць, што там некалі працякала маленькая рэчка, а потым высахла. Вось і поплаў астаўся ад таго часу ў людской памяці, хоць ён ужо даўно высах і ператварыўся ў галубоўскі выган.

Адным словам, гэта бацькаўская хата, а цяпер матчына. Амаль усе гады пасля вайны яна пуставала, таму што бацькі ўжо даўно не было ў жывых, а маці жыла пры старэйшым сыне, які меў на гэтым жа сэдасе сваю хату...

Маці сустрэла Леаніда каля варотцаў у агарод.

— Чаму ж ты гэтак позна сёння, мой унучак? — Яна так прырасла душой і сэрцам да сваіх унукаў, што і меншага сына часта звала ўнукам.

— Затрымаўся: мала што бывае.

— А я чакала-чакала... І на абед не прыязджаў. А дзе ж твая машына?

— Там пакінуў, у трэсце.

— Сцямнела, дык я прыйшла і ўключыла лямпачку... Думала, можа ўгледзіш адкуль, то ўспомніш, што трэба дадому...

Яна ішла ўперадзе па вузкім замежку каля старога плота і апіралася на свой ядлаўцовы кіёк. Спяшалася як магла, бо не хацела прыпыняць хаду сына. Хісталася

часам, хоць і з кійком, тады хапалася за пачарнелы слупок або калок плота.

— Памаленьку, мама, не спяшайце! — папрасіў Леанід.

— Дык, мабыць жа, ты вельмі галодны?

— Не, мне не хочацца есці.

— То не пойдзеш і ў тую хату? Там чакаюць вячэраць.

— Не пайду ўжо.

— Я табе прынесла там... Паставіла...

У хаце Высоцкі ўбачыў на сваім пісьмовым стале вялікі фарфоравы кубак, а на ім — лусту хлеба. Побач стаяла талерка, накрытая ручніком з малінавымі пеўнікамі... З-пад гэтых пеўнікаў тырчалі тронкі нажа і відэльцаў. Леанід ведаў, што на талерцы павінна быць сала, парэзанае па скрыгалікі, а ў кубку свежае малако.

Але перш за ўсё ён узяў у рукі каліўца маладзенькай мяты, якое ляжала тут жа на стале. Яго таксама прынесла маці са свайго агародчыка. Мятка хораша запахла, калі яе кранулі, і здавалася, што яе водар разносіўся па хаце ўжо ўвесь час.

## IV

У той вечар Ева не застала Вілена на лавачцы пад ліпаю. Трошкі здзівілася, што хлопец надумаў паказаць нейкую сваю прынцыповасць, аднак занадта не перажывала, бо ведала, што гэтай фанабэрыі надоўга ў яго не хопіць. Пасядзела хвіліны тры, каб адпачыць пасля прабежкі, і пайшла ў хату спаць.

У аўторак гадзіны ў чатыры пасля паўдня яна выйшла ў канец вуліцы і ўбачыла, што за масцікам на новай дарозе стаіць знаёмая машына. Ніколі раней Ева не прыкмячала па выгляду чужых аўтамашын, а гэтую чамусьці адразу прыкмеціла і ўжо на другі дзень, пасля таго як уратавалася ў ёй ад ліўня, здалёк пазнала на дарозе. І пазнае цяпер заўсёды, хоць «Масквіч» Высоцкага нічым асабліва не вызначаецца. Па колеру ён такі, якіх усюды вельмі многа, толькі хіба што шыльдачкі для нумараў пафарбаваны пад лімон.

Леанід Аляксандравіч выйшаў насустрач і, калі Ева села і закрыла за сабою пярэднія дзверцы, падарыў ёй каліўца мяты. Яна ўзяла падарунак з захапленнем:

— Гэта ўжо мятка такая?

— У маёй матулі ў агародчыку, — адказаў Высоцкі. — Яна ў яе ледзь не з-пад снегу пачынае зелянець. І расце потым вялікая ды пахучая! А сёння гляджу — у мяне каля хаты, пад вокнамі, таксама пачынае прабівацца мятка. Ну, здагадаўся: гэта матуля пасеяла і мне.

Ева трымала каліўца то ля шчакі, то ля вуснаў аж да таго часу, пакуль не даехалі да гарадка. Там убачыла дзяўчат з нагружанымі цэментам насілкамі і, мабыць, засаромелася сваёй лагоды, апусціла руку з мяткай.

Высоцкі заўважыў гэта і зразумеў яе няёмкасць.

«Ці такія яшчэ бываюць кантрасты», — падумаў з болем у душы, але не сказаў нічога.

У лесе Ева зноў пажвавела, з цікавасцю глядзела то ў адзін бок дарогі, то ў другі:

— Колькі жыву тут, а не была ні разу ў парку.

— Пакуль яшчэ гэта не парк, — сказаў Высоцкі, — дык ёсць на што паглядзець. Вось толькі... — Ён прыцішыў ход машыны. — Проста не ведаю, што рабіць з такімі шафёрамі. Кожнаму гаварылася, усім паказаны месцы звалкі. А ёсць жа такія!..

Ева таксама ўбачыла, што на свежай зялёнай мураўцы пад раскошным кустом маладога алешніку згружаны самазвал бітай цэглы, кавалкаў шыферу і ўсякага іншага друзу.

— Гэта мне нагадвае некаторых маіх абанентаў, — сказала яна. — Возьме кніжку новую, толькі што выпушчаную, яшчэ клеем пахне. А прынясе, дык аж у рукі ўзяць страшна.

Высоцкі трошкі прыбавіў газу, але яна лёгка, нібы баязліва дакранулася да яго рукі і папрасіла:

— Едзьце гэтак, як ехалі, я хачу на ўсё тут паглядзець.

І яны паехалі зусім ціха. Ева з такім любаваннем глядзела на стройны малады сасняк паабапал дарогі, на роўныя пешаходныя сцяжынкі каля гэтага сасняку, што Леанід нават крыху насцярожыўся. Вельмі надобна было на тое, што дзяўчына раптам адчыніць дзверцы ды выскачыць з машыны, каб прабегчыся па чароўнай сцяжынцы, каб рукамі пакратаць свежыя, яшчэ мяккаватыя пышпулькі ды смалістыя, пакрытыя жоўтым пылком парасткі. Сапраўды, наўрад ці можна ўявіць сабе што больш прыемнае, як сарваць малады сасновы парастак,

расцерці яго ў пальцах і панюхаць. Уся вясна адчувацца душою...

— Вы тут некалі пасвілі, — раптам загаварыла дзяўчына. — У вайну — партызанілі, потым і так гулялі... Вам тут, мабыць, кожная мясцінка знаёмая.

— Пагуляць то яшчэ і не даводзілася, — шчыра прызнаўся Леанід Аляксандравіч. — А партызаны былі ў асноўным не тут: за ракою ў нас вялікі лес... І там, далей на Палессе. Сюды, у гэтыя мясціны, мы толькі часова заходзілі, калі трэба было наступаць на гарнізоны.

— Я трохі ведаю пра вас, — паведаміла Ева. — Стары Перапечка расказваў.

— Пра што ведаеце, то добра, а чаго не ведаеце — сам раскажу.

— І я вам усё раскажу, — наабяцала дзяўчына. — Калі толькі захочаце слухаць, калі гэта будзе вам цікава. Хоць у мяне яшчэ якая біяграфія?..

Праехалі яшчэ з кіламетр, і лес скончыўся. Перад вачыма спачатку, нібы ў казцы, разаслаўся вялікі зялёны дыван, а потым зусім нечакана для Евы выбліснула рэчка, ціхая, лагодная, са свежа-зялёнымі і месцамі зусім пакатымі берагамі.

— Як хораша! — ледзь не ўсклікнула дзяўчына і раптам адвяла вочы ад такой з'явы, якую, можа, не варта б і заўважаць. Па самым роўным і чыстым плёсе ездзіў сюды-туды адзін самазвальчык і такім спосабам абмываў колы і ніз кузава.

— Ну, гэта ўжо чорт знае што! — абурана прамовіў Леанід Аляксандравіч і спыніў машыну. — Вы тут адну хвілінку, а я пайду пагавару...

Потым яны паехалі паўз самы бераг рэчкі. У адным месцы яшчэ не зусім перасохла канаўка, і давялося трохі пабуксаваць. У кабіне запахла перагарэлым маслам, але Ева не адчула ад гэтага якой-небудзь удушлівасці ці шуму ў галаве. Калі вярнуліся зноў у лес, то Высоцкі абвазіў яе бадай па ўсіх сваіх памятных мясцінах. Перад вечарам спыніліся ў Белым балоцconfiguration.

— Гэтае месца найбольш нагадвае мне пра мінулае, — сказаў ён, вылазячы з кабіны. Зайшоў з правага боку і адчыніў дзверцы Еве. Дзяўчына спусціла ногі, трошкі агаліўшы круглыя каленкі, потым ступіла на траву і раптам пахіснулася. Леанід спалохана выставіў рукі.

— Што з вамі, самлелі ногі?

— Не. Так нешта... — Яна ўхапілася адной рукою за дзверцы, а другую падала Высоцкаму. — Ніколі так не было, я ж трохі ездзіла ў машынах.

— Гэта, мабыць, ад газу, — заклапочана прамовіў Леанід Аляксандравіч. — Буксавалі, а матор ужо не новы. Я вам дыванок рассцялю, паляжыце на свежым паветры.

— Не, давайце лепш пройдзем, паглядзім гэтае ваша Белае балота. Сапраўды, прыгажосць якая!..

Лёгкім штуршком яна зачыніла дзверцы і гэтай жа рукой абвяла вялікі, прадаўгаваты лужок, акаймаваны раскошным сасняком. Толькі на самай сярэдзіне лужка было трохі вады, і там ужо цяпер паказваліся зялёныя язычкі аеру. А ўсё астатняе, некалі быццам азёрнае плёса, было цяпер амаль зусім сухое. На ім расла такая спорная трава, што праз які тыдзень можна было б касіць. І скосяць, вядома; знойдуцца такія людзі, што агледзяць гэтую мясціну. А калі не скосяць, то колькі ўсялякага хараства тут нарасце! Белае балота ператворыцца ў велізарны букет самых разнастайных кветак. Пчолы з усяго наваколля зляцяцца сюды.

Некалькі крокаў Ева прайшла, злёгку апіраючыся на локаць Высоцкага, а потым убачыла перад сабою блакітны званочак і пабегла да яго. Сарвала раннюю кветку з доўгай сцяблінкай, потым знайшла яшчэ метлючок, прыклала ўсё гэта да свайго каліва мяты, і выйшаў букецік. Панюхала і засмяялася.

— Вам трошкі лепш? — спытаў Леанід Аляксандравіч.

— Ужо ўсё, — не спыняючыся, адказала дзяўчына, нібы мелася на ўвазе нешта зусім нязначнае. — Прайшло!

Яна ішла то крыху наперадзе, то побач з Высоцкім, і на кожным кроку знаходзіла нечаканыя для яе прыгажосці, захаплялася імі, як падлетак.

— Я так люблю ўсё гэта! — шчыра прызналася яна.— Можа таму, што мала бачыла нашу прыроду. У маленстве жыла ў Слуцку — маці працавала там зубным урачом. Там толькі ў парк бегала ды на могілкі, яны былі блізка ад нашага дома. Потым бацька пакінуў нас абедзвюх і амаль па суседству сышоўся з другою жанчынаю. Маці не магла гэтага перажыць і аднаго разу ўзяла мяне за руку і павяла на вакзал. Усе рэчы былі ўжо там.

Ехалі мы двое сутак, а маці ўсё не гаварыла, куды едзем і чаго. Відаць, і сама не ведала і не спадзявалася на добрае, бо амаль усю дарогу плакала... Ой, што гэта? — Ева спынілася перад разгалістай рабінаю, густа ўсыпанай бела-зеляпцовай пахучай квеценню. На ёй было столькі пчол, што іх гудзенне чутно было за некалькі крокаў.

— Яны не рынуцца на нас?

— Не. У іх не аб гэтым цяпер клопат... Дык куды вы тады прыехалі? Расказвайце!

— У Крым, — ахвотна пачала гаварыць далей Ева.— У Джанкой. Там у нас нейкая сваячка жыла. Дык што я хацела сказаць?.. Ага... Там амаль ніякай прыроды не было. Мора далёка, а ў горадзе — сушыня: трава з вясны пакажацца і хутка выгарае. Чамусьці ніякіх ні садоў, ні прысад. Быў тады невялікі парк, дык дрэвы тонкія, худасочныя. Ад сонца не было дзе схавацца...

... А потым я на Урале была. Там зноў у такое месца трапіла, што не надта налюбуешся...

— Чаго на Урал? Прабачце, што распытваю.

— Доўга расказваць, але раскажу, калі пытаеце. Мы прыехалі ў Джанкой у саракавым годзе. Прытуліліся ў сваячкі. Мама ўладзілася на работу ў гарадскую бальніцу, а праз год ці больш трапіўся мясцовы чалавек, за якога яна выйшла замуж. Толькі выйшла, і пачалася вайна — майго айчыма забралі ў армію. Мы асталіся ў хаце з яго бацькамі, зусім ужо старэнькімі і хворымі дзедам і бабкай. Эвакуіравацца нікуды не маглі, і давялося акупацыю пераяшваць на месцы. Помню, як немцы некалькі разоў выкідвалі нас з кватэры, як адзінналошчаны пастаялец страляў у маці над галавою, патрабуючы, каб яна прыбірала яго пасцель і ачышчала ад усякага бруду.

Пасля вызвалення Крыма прыйшло ад айчыма пісьмо. Ён пісаў са шпіталя, але ўсе радаваліся, што рана, хоць і не першая ўжо, ды не вельмі цяжкая. Праз некаторы час — тэлеграма: яму далі тыднёвы адпачынак, каб наведаць сям'ю. Пачалося чаканне. Старыя не адыходзілі ад вокнаў, маці і начамі не спала, але замест айчыма прыйшлі зусім нечаканыя людзі...

Праз некалькі год Ева вярнулася ў Беларусь, да сваёй цёткі. Тады ўжо не было ў жывых ні дзеда, ні бабкі. Маці таксама памерла ад тыфу. Айчым загінуў на фронце ў сорак чацвёртым годзе.

Сказаўшы аб гэтым, Ева быццам непрыкметна адвярнулася і пачала западта ўважліва разглядваць нешта на другім баку Белага балота.

Высоцкі ўзяў яе за локці і лёгенька павярнуў тварам да сябе.

— Расхваляваліся з-за гэтага, растрывожыліся. Шчыра кажучы, я думаў, што якія ў мяне былі складанасці, то можа ні ў кога такіх... Ажно вы перажылі больш...

Ева глянула на яго вільготнымі вачыма:

— Прайшло ўсё. Цяпер толькі ўспаміны...

Яны ўжо абышлі ўвесь прастор чароўнага лужка і набліжаліся да машыны з процілеглага боку. Тут дзяўчына выбрала высокае і пагрэтае сонцам месца непадалёк ад пышных альховых парасткаў і прылегла неяк бачком, вольна і бестурботна.

— Сядайце, — сказала Высоцкаму.

Леанід Аляксандравіч сеў, а потым прылёг на локаць гэтак жа, як і яна.

— Стаміліся вы? — спытаў са спагадай і ласкай.

— Не, — ціха адказала Ева. — Не было ж ад чаго стамляцца. Гэта так нейкая млявасць у мяне. Цяпер часта бывае.

— Можа вады глыток?

— Дзякую. Нічога не трэба. От паляжу трошкі ды паедзем.

Высоцкі адчуваў, што цяпер дзяўчыне патрэбны толькі спакой і цішыня. Ніякія словы, ніякія ўцешныя размовы гэтага не заменяць. Перад самымі яго вачыма быў яе твар, чароўныя абрысы свежых, трошкі пухленькіх вуснаў. Ён чуў і нібы лавіў яе дыханне, роўнае, зусім заспакоенае і можа нават шчаслівае. Яму хацелася верыць, што шчаслівае. І што б толькі не ўчыніў для таго, каб гэты спакой і цішыня не парушаліся доўга, каб Ева сапраўды адпачыла тут пад яго аховай і шчырай павагай. Няхай бы нават і заснула. Сам таксама невядома колькі часу мог бы ляжаць вось так нерухома і нічым не парушаць яе спакою. Нават і позіркамі ў твар, бо ад гэтых позіркаў дзяўчына можа прачнуцца.

...Каля ракі нехта заспяваў працягла і магутна — голас данёсся аж да Белага балота. Ева расплюшчыла вочы, прыўзняла галаву.

— Паедзем ужо? — спытала ласкава і нібы вінавата. — Я, мабыць, трошкі задрамала?

— Паляжыце яшчэ,— папрасіў Высоцкі.— Адпачніце на свежым паветры.

— Ой, мне так нестае свежага паветра! — паскардзілася дзяўчына. — Каб вы толькі ведалі! Іншы раз нешта такое зробіцца, што дыхаць цяжка і цямнее ў вачах.

Голас з-пад ракі зноў даляцеў сюды, яшчэ выразней як першы раз.

— Вы ведаеце, хто гэта спявае? — яшчэ больш прыўзняўшыся, спытала Ева.

— Трохі здагадваюся, — адказаў Высоцкі, — бо заўважыў машыну на дарозе, калі мы павярнулі сюды. А вы не заўважылі?

— Не. Я, мабыць, у гэты час пейзажамі любавалася. А чыя машына?

— Па-мойму, Жамчужнага. Блакітная «Пабеда».

— Ну вось так яно і ёсць, — пацвердзіла Ева. — Гэта ён і спявае, яго голас. Цяпер ён чамусьці менш спявае. А раней, дык нават па самадзейнасць да нас прыходзіў.

— І памагаў?

— Многа памагаў. Асабліва на першым часе, калі ў нас тут яшчэ амаль нікога не было. Ноты ведае — некалі хорам дырыжыраваў, як быў настаўнікам. Мы часта гаварылі між сабою: от каб нам Мечыслава Юльянавіча дырэктарам клуба!

— А каго ж тады сакратаром парткома?

— Туды лягчэй падабраць.

Высоцкі засмяяўся, але пярэчыць не стаў.

— Там, здаецца, і яшчэ нехта сядзеў у машыне, — выказаў ён меркаванне.

— Магчыма, Запрагаеў. Яны часта ўдвух ездзяць на рыбу.

— А што, калі ўбачыў вас непасрэдны начальнік?

— Ну і няхай сабе, — без ніякай скрытнасці прамовіла Ева. — Мая душа чыстая, і я нікога не баюся.

Калі яны ехалі дадому, Высоцкі, быццам бы і нехаця і з адчуваннем пакутлівай няёмкасці, усё ж загаварыў пра маладога Перапечку. Што ён за хлопец і якія ў іх узаемаадносіны?

Ева і на гэта адказала проста і шчыра:

— Бачымся часта, ён амаль кожны вечар, калі не на змене, то чакае мяне.

— А сёння на змене?

— Здаецца, не. Прыйдзе, відаць, пад таполю.

— Ну і што вы скажаце, як убачыць лесавы букецік?

— Скажу, як было. Толькі вас выгараджу, калі вы гэтага хочаце.

— Не, не хачу! — рашуча прамовіў Высоцкі. — Мяне нідзе не выгароджвайце і ні ў чым! Можа хіба вам самім непрыемна наша знаёмства?

— У нас дружба, — папраўіла Ева.

...Перад самай Галубоўкай яна спытала:

— Помніце, аднаго разу вы сказалі, што мы сустракаліся раней. Дык дзе гэта і калі?

— А вы самі не ўспомнілі?

— Ото ўсё здаецца, што сапраўды недзе бачыла, а дзе — прыпомніць не магу.

— Тады слухайце, — задаволена ўсміхнуўшыся, сказаў Высоцкі. — Я вам буду гаварыць, як іншы раз пішуць у газетах. Стаяў цёплы жнівеньскі дзень... На калгасным полі сабраўся натоўп людзей, каб азнаменаваць гістарычную падзею... Тут жа імправізаваная трыбуна, сцягі. Адгучалі гімны і прамовы, дзяўчаты з рыдлёўкамі ў руках абступаюць цэментавы слупок, на якім напісана...

— А-а! — здагадалася Ева. — Цяпер ведаю. Ведаю! Значыць, мы сапраўды старыя знаёмыя.

## V

У той адвячорак Высоцкі не паехаў у трэст, а завярнуў у Арабінку і да часу паставіў машыну на выгане, насупраць сваёй хаты. Зайшоў у братаву хату даведацца, ці не было чаго па службе, і ўбачыў, што маці там вельмі нечым пакрыўджана і ўстрывожана. Прысеўшы ў мыцельніку, уважліва выслухаў яе скаргу і найшоў вузкаю сцежкаю праз агарод да сваёй хаты. Дома толькі спыніўся каля пісьмовага стала і ўзяў у рукі свежую газету, як убачыў праз акно, што каля яго «Масквіча» спынілася блакітная «Пабеда».

Пакуль што не крануючыся з месца, Леанід Аляксандравіч назіраў за тымі двума чалавекамі, што неяк ленавата, спінамі да плота, вылазілі з машыны, і калі пазнаў Жамчужнага і Запрагаева, паклаў газету, пайшоў сустракаць.

— Вось і гаспадар! — яшчэ здалёк усклікнуў Жамчужны сваім густым, гартанным голасам. — А мы ўгле-

дзелі, едучы шляхам, «Масквіча» і рашылі завітаць. Рад не рад, як кажуць...

— Чаму ж не рад? — прыветна ўсміхнуўшыся, сказаў Высоцкі. — Прашу бліжэй да хаты!

— То, можа, Ваню адпусцім? — звярнуўся Жамчужны да Запрагаева. — Адсюль пехатою пройдзем да горада, а калі што, дык у нас жа ёсць шафёр. — Ён з добрай усмешкай глянуў на Высоцкага і прыгладзіў рукой светлыя, непаслухмяныя валасы.— Едзь, Ваня, дадому! — гукнуў шафёру, нават не дачакаўшыся згоды Запрагаева. І стройным спартсменскім крокам рушыў следам за Высоцкім да хаткі з белымі вокнамі і невялічкай верандай, прыбудаванай пядаўна.

З выгляду гэта быў прыгажун-мужчына, як часам любяць гаварыць між сабой жанкі. Высокі, статны, без сутулінкі ці якой-небудзь крывінкі, з адкрытым, заўсёды юнацкім тварам. І на службе, і проста на людзях заўсёды ўмеў сябе трымаць суадпаведна настроям і абставінам, вельмі рэдка траціў раўнавагу, нават пры самых складаных сітуацыях, не цураўся спрэчак, нават дыскусій, аднак жа такту ніколі не парушаў і гучнымі слоўцамі не абараняўся.

Адам Адамавіч Запрагаеў быў трохі іншы чалавек, і калі глядзець страгавата, дык наўрад ці падыходзіў у дружбакі Жамчужнаму. Але Мечыслаў Юльянавіч не так ужо глыбінна ўглядаўся ў асабістыя якасці людзей, быў вельмі памяркоўны і кампанейскі, да саслужыўцаў хутка прывыкаў і тады дараваў ім нават і тыя недахопы, якія часам асабліва вытыркалі. З Адамам Адамавічам Запрагаевым крыху зблізіўся на «прынцыпах» рыбнай лоўлі.

— О-о, у цябе тут... — Ён шырока развёў абедзве рукі, нібы намерваючыся абхапіць густую і свежую зеляніну разгалістай антонаўкі, што расла пад самымі вокнамі ад двара, ды раскошны вішняк за хатаю і ўздоўж усяго плота. — Чароўны куток для адпачынку! Ты часта бываеш дома?

— Начую, калі не ў камандзіроўцы, — адказаў Высоцкі. — Сядайце!

Мечыслаў Юльянавіч спачатку ўважліва паглядзеў на лаўку, што стаяла пры сцяне, а потым сеў, ды вельмі асцярожна, няўпэўнена.

— Яна моцная, — запэўніў Высоцкі, — хоць служыла нам з братам яшчэ малым. Некалі ў хаце стаяла.

— Што, дзедаўская? — спытаў Жамчужны і на ўсякі выпадак мацней упёрся доўгімі рукамі ў калені.

— Не, бацькава.

— А гэта што? — Жамчужны нагнуўся і сарваў пад хатаю маленькі лісток мяты. І адразу здагадаўся. — Вунь яно!.. Бачыў? — Папюхаў сам і паказаў Запрагаеву. — Толькі з зямлі вылезла, а як пахне! З карэння расце ці пасеяна?

— Пасеяла маці і даглядае, — з павагай да яе клопатаў сказаў Высоцкі. — А сёння вось пакутуе...

— А што, чаму? — зацікавіўся Жамчужны.

— Пазней скажу.

— Можа, пакрыўдзіў хто? — спытаў Адам Адамавіч і, мабыць па звычцы, крануў пальцамі верхнюю кішэньку свайго кіцеля: там былі ў яго аўтаручка і блакнот.

— Нічога асаблівага,— ухіліўся ад гэтай размовы Высоцкі.— Скажыце лепш, як там рыба?

— Адкуль ты ведаеш, што мы былі на рыбе? — з хітраватай смяшынкай уставіўшыся на яго, спытаў Жамчужны. — А можа мы з раёна едзем? З пасяджэння важнага?

— Сустракаліся ж на дарозе,— абыякава заўважыў Высоцкі.

— А... што я казаў?.. Што? — перавёў Жамчужны свой ужо ўзрушаны пагляд на Запрагаева.— Ты спрачаўся. А я адразу пазнаў: яго машына! І яшчэ што я сказаў?..

— Ну... што...— замяўся Адам Адамавіч.

— Пачакай! Я сам паўтару! — перапыніў яго Жамчужны.— Я сказаў, што Высоцкі вольны чалавек і мае права на сваёй машыне ездзіць куды хоча і з кім хоча. А вось мы з табою ездзім на рыбу на службовай машыне... Так?..

Запрагаеў зноў падняў руку да верхняй кішэнькі і раптам апусціў, потым неяк разгублена скрывіўся:

— Я магу і пехатою... Мне што?..

— Сюды-то можаш,— смяшліва ківаючы галавою, згадзіўся Жамчужны.— А калі трошкі далей?.. Кіламетраў за сотню?..

— Паколькі вы сёння нічога не ўлавілі,— пад тон Жамчужнаму загаварыў Высоцкі,— то паспрабую закінуць вудачку я. Пасядзіце трошкі, хутка вярнуся.

Ён сапраўды не затрымаўся, бо схадзіў толькі ў бра-

таву хату. Прынёс адтуль гладышык з кіслым малаком, паўбаханкі хлеба і нешта пад крысом пінжака.

— Давай сюды! — сказаў Жамчужны, выставіўшы рукі,— а то яшчэ выпусціш да разаб'еш.

— Пойдзем у хату!

Па дарозе Жамчужны выняў з каньячнай пляшкі нестандартны корак, панюхаў і задаволена прыплюшчыў адно вока.

— Нічога іншага не было паблізу,— шапнуў яму Высоцкі.

— Ціха,— паказаў Жамчужны вуснамі і прыплюшчыў вока на Запрагаева.

Высоцкі даволі ўвішна вызваліў месца на пісьмовым стале, заслаў яго старой газетай і паставіў гладыш з малаком. Потым накроіў хлеба і прынёс з шахаўкі, што стаяла ў сенцах, чаркі, шклянкі для малака ды некалькі лустак сала.

— У цябе і тут пахне мятаю,— сказаў Жамчужны, падсядаючы к сталу.

— Дык вось жа яна,— падхапіў Запрагаеў і ўзяў з белага падаконніка вялікае, ужо галінастае каліва. Двойчы панюхаў яго, прытуліўшы крыху завялыя лісткі да шырокага качынага носа, і зноў паклаў на тое самае месца.

— Прысаджвайцеся, Адам Адамавіч! — сказаў яму Высоцкі, і той адразу сеў, зняў з галавы фуражку і пацёр далоняй сціплы чубок, зачэсаны ледзь не на брыво. Гадоў трынаццаць пасля вайны Запрагаеў прасядзеў у райваенкамаце, таму яшчэ і цяпер насіў вайсковую форму.

— Давайце за нашы поспехі! — сказаў Жамчужны, відаць проста для пачатку, і ўзняў сваю чарку. У хаце быў ужо амаль прыцемак, святла пакуль што не ўключалі.

Запрагаеў таксама працягнуў руку па чарку, уважліва і крыху падазрона паглядзеў на яе, падняўшы, потым перавёў пагляд на этыкетку пляшкі.

— Узялі! — сказаў Жамчужны, і Запрагаеў амаль што адным глытком выпіў. Потым сціснуў вільготныя вусны, ухапіўся рукою за падбародак, аднак праз мінуту засмяяўся і паставіў каля сябе пусты кілішак. Зноў паглядзеў на пляшку і не сказаў ні слова.

— Здарава? — спытаў Жамчужны.— Можа яшчэ па адной?

— Не, я пачакаю,— сказаў Запрагаеў.

Жамчужны ўзяў скібку хлеба, паклаў на яе амаль такую ж па велічыні лусту сала, пачаў смачна есці і дружалюбна паглядваць на Высоцкага.

— Дык што там са старою? Раскажы!

— Бачыў сляды ботаў на мятцы? — пачаў Высоцкі з пытання.

— Не. Чаму ты не паказаў?

— Ладна. Не ў тым справа. Важна — хто нарабіў слядоў і чаму.

— Сапраўды, хто так мог? — перапытаў Запрагаеў.

— Мабыць, той, хто ходзіць летам у ботах,— адказаў Жамчужны і зноў прыплюшчыў вока, засмяяўся.

Запрагаеў падабраў свае ногі пад крэсла, на якім сядзеў, і пачырванеў.

— Я не жартую,— дадаў Высоцкі.— Прыйшоў сёння п'яны чалавек, выламаў плот, стаптаў мятку і абразіў маю маці — яна якраз была тут на агародзе.

— А знаеш што? — раптам узбудзіўшыся, прапанаваў Жамчужны.— Давай, як некалі ў партызанах, пагуляем у інтуіцыю. Ты адкажаш мне на два-тры нязначныя пытанні, а я паспрабую ўгадаць, хто гэта. Ён мясцовы?

— Мясцовы.

— Гарадскі?

— Гарадскі.

— Табе добра знаёмы?

— Не.

— Адказваю: Хілько, дырэктар саўгаса.

Высоцкі кіўнуў галавой.

— Дык што тут было ўгадваць? — заўважыў Адам Адамавіч, ужо, відаць, не разлічваючы на тое, што яго словы будуць пачуты.

— А чаго ён сюды прыплёўся? — ужо сур'ёзна спытаў Жамчужны.

— Мабыць, ішоў баразною, якая праведзена па ўсіх агародах для абрэзкі, і наткнуўся на плот. Выламаў, убачыў, што тут меткі няма, і пачаў...

— Хіба ёсць тут лішняе?

— Я не мераў. Але калі і ёсць, то хаміць не трэба. Мне, напрыклад, усё роўна, дзе будзе стаяць бацькава хата: на саўгаснай зямлі ці ў агародзе брата.

— Маці твая, як былая калгасніца, мае права на трыццаць сотак? — пачаў пералічваць Жамчужны.— Мае. Бра-

ту з жонкаю, як настаўнікам, таксама нешта трэба. І табе пад хату сотак шэсць.

— Хата не мая — матчына цяпер.

— Ну, усё роўна няма чаго абрэзваць.

— Тут галоўнае — будзь чалавекам! — гучна прамовіў Запрагаеў, найлепш адчуваючы, што гэтыя словы будуць да месца.— Навошта людзей крыўдзіць?

— Таму што рогі выраслі,— не хаваючы абурэння, сказаў Жамчужны.— А абламаць іх быццам і няма каму.

— Ну-у...— працягнуў Адам Адамавіч і апусціў галаву.

— Што? — звярнуўся да яго Жамчужны.— Чаго нукаеш? Вось ты, напрыклад, можаш выступіць супроць Хілько?

— Я-а?..— сумеўся Запрагаеў.— Я... Чаму ж... Толькі ад мяне мала што...

— Не можаш! — пацвердзіў Жамчужны.— Значыць так: адзін не можа, другі, трэці... І мужчынка ўявіў сябе тут царком. Жыве ў гарадскім катэджы, карыстаецца ўсімі свяжынкамі і навінкамі нашых магазінаў і амаль на ўсіх глядзіць зверху. А чаму? Вось скажы ты — чаму? — Жамчужны патрабавальна нахіліўся да Запрагаева.

— Ну... Як тут сказаць?.. — прамармытаў Адам Адамавіч і пачырванеў.

— Таму што,— не сунімаўся Жамчужны,— у яго тут агароды і птушкаферма. Каму агурчык, памідорчык, а каму і пеўніка або яек быццам бы нязапланавых. У пачатку мінулай зімы тут у яго нібы цуд курыны адбыўся: маладыя нясушкі далі сустрэчны план — пачалі несціся раней часу. Яйкі сыпаліся дробненькія, але бескантрольныя: паядалі тут некаторыя яечні.

Каб прыхаваць сваю вельмі ўжо адчувальную чырвань, Адам Адамавіч выпіў яшчэ адну чарку, а потым загаварыў нават з пэўнай смеласцю:

— Слухай, Мечыслаў Юльянавіч! Ты ўжо вушы мне пратрубіў гэтымі яйкамі. Ну было адзін раз... Было!.. Памыліўся... Жонка брала, не я. Дык ужо і «Мятла» прабірала, і на партбюро гаварылі... Хопіць!

— Што за «Мятла»? — пацікавіўся Высоцкі.

Жамчужны зарагатаў раскаціста і весела:

— Дык гэта ж ён і падабраў сабе такую загадчыцу бібліятэкі, што яго крытыкуе...

— Яна нікога не мілуе,— рашуча ўставіў Адам Ада-

мавіч.— І правільна! Крытыка і самакрытыка, як вядома...

Тут яго Жамчужны перапыніў і растлумачыў Высоцкаму больш падрабязна:

— У нас, разумееш, дзяўчына такая ёсць, Ева Дым. Баявая, начытаная, частушкі сама піша, карыкатуры малюе. Арганізавала сатырычную насценгазету пад такой назвай і брала на каранда́ш кожнага, хто гэтага заслугоўваў.

— А чаму цяпер не выходзіць такая газета? — зацікаўлена спытаў Высоцкі.

— Мабыць, занадта многа нездаволеных з'явілася, і дзяўчына спасавала.

— Яна не спасуе,— зноў падаў упэўненую рэпліку Запрагаеў.— Ды там у іх цэлы штат, не адна яна.

Жамчужны перастаў смяяцца, працягнуў руку да настольнай лямпы і націснуў на кнопку. Трохі зажмурыўшыся ад святла, загаварыў:

— Жарты жартамі, а ты скажы там сваёй падначаленай, каб выпускала газету, як і раней. Гэта харошая, папулярная ў нашым калектыве газета, і мы нікому не дазволім яе закрываць.

— Дык хто закрываў, хто закрываў?! — раптам ледзь не закрычаў Адам Адамавіч.— Яны самі нешта перапыніліся пасля таго, як размалявалі катэджы!.. З таго часу і маўчаць.

Высоцкі ўстаў, уключыў яшчэ і верхнюю лямпачку і, падышоўшы зноў к сталу, загаварыў:

— Пра гэтыя катэджы, сказаць праўду, я ўжо некалькі разоў думаў. Іх жыллёвыя габарыты трэба будзе переглядзець і падсяліць туды яшчэ людзей, якім пакуль што няма дзе жыць.

— Дык вось жа, вось!..— з імпэтам падхапіў Запрагаеў і абедзвюма рукамі палез у другую кішэньку свайго кіцеля. Яна тапырылася, як і першая, хоць тут не відно было ручкі ці каранда́ша. Выняў адтуль пакунак складзеных у чатыры столкі папер, разгарнуў на стале.— Вось гэта спісы тых, каму патрэбны кватэры. І ў першую чаргу, а не то што... Пагля́дзіце, Леанід Аляксандравіч!

Высоцкі працягнуў руку, але Жамчужны першы згроб гэтыя спісы са стала, згарнуў іх і сунуў Запрагаеву ў кішэню.

— Ведаю я, што гэта за спісы,— раздражнёна прамо-

віў ён.— Каб быць усім добранькім, наш старшыня пабудкома абяцае кватэры кожнаму, хто да яго звяртаецца. Выйдзе справа — добра: старшыні аўтарытэт і павага. Не выйдзе — усю віну валіць на Крывашына, на Жамчужнага, а цяпер вось будзе валіць і на цябе, — ён глянуў на Высоцкага. — І зноў ён чысты і ружовенькі!

— Ну, гэта ты, Мечыслаў Юльянавіч!.. — запярэчыў старшыня.— Пачытай спісы!.. На, пачытай!

— Ды згодзен я, што там ёсць людзі, якім няма дзе жыць,— гаварыў сваё Жамчужны.— Але ж тваімі спісамі ім не паможаш. Ужо два гады ходзіш, запісваеш, усім паказваеш гэтыя спісы, а карысць з гэтага хіба толькі табе самому!

— О-ё-ёй! — чамусьці зусім бяскрыўдна азваўся Запрагаеў.— Калі ўсё гэта так, дык мне, бадай, і жыць няма чаго.

— Вытрымаеш! — Жамчужны раптам засмяяўся.— Ладна!.. Мы з табою ужо надакучылі тут.

На агародзе, мабыць, была пасаджана бульба, таму ўтрох нельга было ісці побач вузкім замежкам. Запрагаеў пайшоў наперадзе, а Жамчужны, хоць часам і трапляў у разору, усё ж трымаўся суседства Высоцкага. Ішоў, нюхаў каліўца мяты, падоранае Высоцкім, і маўчаў. Па яго дыханні і неспакойным пакашліванні адчувалася, што хацеў нешта сказаць, ды быццам не адважыўся ці не ведаў, з чаго пачаць. І толькі надышоўшы да варотцаў, калі Запрагаеў ужо ледзь відзён быў за плотам, пачаў гаварыць з нейкім асаблівым пачуццём і ўсхваляванасцю, зусім не ў той манеры, якой трымаўся амаль увесь час за сталом.

— Слухай, Лёня! Давай мы як-небудзь выберам час ды аб'едзем хоць тыя партызанскія мясціны, што бліжэй адсюль. Мы ж нават па гэты бок ракі колькі разоў былі. Памятаеш?

— А як жа. Добра памятаю! — пацвердзіў Высоцкі.— Ты ў Бранаўца часта бываў. А потым і ў мяне...

— Нават у атаку разам хадзілі. Памятаеш?

— Хіба можна гэта забыць?

— Я цяпер, бывае, прыеду на рэчку,— гаварыў далей Жамчужны,— сяду на беразе з вудачкай... Сяджу і сам не заўважаю, як задумваюся, пачынаю ўспамінаць мінулае. Як люблю лавіць рыбу, гэта нават цяжка выказаць,

а часам забываюся пра яе... Гляджу на ласкавыя, спакойныя хвалі, якія цяпер на-свойску песцяць мае босыя ногі, і не веру, што некалі, каб не ты, яны наглынулі б мяне... Гэтыя ж самыя хвалі, гэтай жа ракі...

— Зімой рака не такая,— заўважыў Леанід Аляксандравіч.— Але ты выбраўся б і без маёй дапамогі.

— Не, не выбраўся б! Гэта я заўсёды адчуваю. Вельмі нечакана праваліўся ў глыбокім месцы. А лёд быў такі, што ні ўхапіцца за яго, ні скрозь абломваць, каб плысці. Ты лягчэйшы, і то ледзь трымаўся каля проймы, нават лежачы...

За варотцамі Жамчужны спыніўся каля «Масквіча», пачакаў, пакуль Высоцкі падыдзе бліжэй.

— ...Ты верыш, што я тады нічога не знаў пра тваё ранейшае падполле? — ціха і са шчырасцю ў голасе спытаў Мечыслаў Юльянавіч.

— Канечне, веру!.. Што ты?! Мяне паслаў у паліцыю Меркуш, сакратар падпольнага райкома. Ведаў пра гэта яшчэ Бранавец, а больш ніхто. Абодва яны загінулі.

— А потым і пра арышт твой я доўга нічога не ведаў... Мучыўся, пазней хацеў памагчы... Ды як?.. Якім чынам?..

— Тады ніхто не мог мне памагчы. Шчасце, што праз некалькі год добрыя людзі знайшлі дзённік Меркуша.

— Ты ідзеш? — данёсся голас Запрагаева.

— Іду, пачакай,— адгукнуўся Жамчужны.— Ну, бывай! — Ён працягнуў руку Высоцкаму.— Я рад, што мы зноў разам. А наконт гэтых гастроляў Хілько я пазваню ў райком партыі.

Ён дагнаў Адама Адамавіча ўжо на сцяжынцы цераз саўгасны палетак. Нейкі час ішлі побач моўчкі, потым Запрагаеў спытаў:

— Якую гэта дрэнь мы пілі там? Аж і цяпер у горле пячэ.

— А ты не разабраў?

— Разабраў, ды гаварыць не хацелася.

— Вось як!

Запрагаеў моцна засоп, пацёр свой качыны нос і зноў змоўк на некалькі крокаў.

— Здаецца, крутавата бярэ? — сказаў потым з няпэўнай інтанацыяй у голасе.— Як думаеш?

— Няхай бярэ.

— Няхай, кажаш? Ну, тады — няхай. Вы што?.. Партызанілі разам?

— У адной брыгадзе. З палавіны сорак другога года.

— Так-так...

Зноў ішлі моўчкі аж да самага павароту на гарадскую вуліцу.

— Ты дадому? —суха спытаў Жамчужны.— Калі ўгледзіш там каго з маіх, скажы, што затрымаўся ў Высоцкага.

— А ты куды?

— Пахаджу крыху, развеюся.

— Ну, хадзі, хадзі...

Запрагаеў прыспешыў крок, а Жамчужны пастаяў з хвіліну перад цёмным у змроку поплавам і вярнуўся зноў на сцяжынку, што, нібы тэлефонная нітка, злучала Арабінку з горадам. Увечары тут было ціха і спакойна, рэдка хто праходзіў. Гарадскія ліхтары трохі падсвечвалі таму, хто ішоў з горада. Але і там, куды святло не даходзіла, ісці было зручна і прыемна. Пакуль яшчэ няма ў горадзе ўтульных паркаў і сквераў, то адпачыць лепшага месца не знойдзеш.

У гасцях у Высоцкага Жамчужны гаварыў і думаў аб усім, але найбольш хацелася яму ўспомніць з Леанідам Аляксандравічам сёе-тое з партызанскага жыцця. Дзеля гэтага, калі гаварыць праўду, і заехаў. Гаворка аб мінулым выйшла там зусім кароткая, а цяпер у думках яна нібы працягвалася з большай падрабязнасцю і спакойным асэнсаваннем. Некаторыя малюнкі і з'явы паўставалі ў гэтых абставінах адзіноты і спакою так жыва і адчувальна, нібы ўсё тое, што было, сапраўды паўтаралася.

...Рака даўно застылая, замеценая снегам. Колькі разоў даводзілася ў тую зіму пераходзіць яе?..

...Камандзіра атрада Высоцкага паззвалі ў штаб брыгады. У гэты час у тым атрадзе быў і ён, памочнік камісара брыгады па камсамолу. Камандзір атрада камсамольскага ўзросту — яго гонар і эфектны тэзіс для ўсіх рапартаў і данясенняў аб камсамольскай рабоце. Сабраліся ісці ў штаб брыгады разам.

...Сцюжная і нялітасная зімовая ноч. Праз добра знаёмую, здавалася, зусім сваю, заўсёды лагодную рэчку першы пайшоў Высоцкі. Нешта рэзнула пад глыбокім снегам, калі яны выйшлі на сярэдзіну... І толькі гэта ўлавілі слых і памяць... Далей усё жудаснае і безнадзейнае... Холад, смяртэльнае здранцвенне ўсяго цела... Цяжкае і няўмольнае асяданне ўніз з нікölі не чуваным гулам над

галавой, са страшэнным болем у вушах... І як першая праява змагання — штуршок нагамі ў рачное дно.

...Глыткі... Доўгія і згубныя глыткі вады... У адчуванні не асталося якой: ледзяной ці гарачай... Помніцца толькі, што цела налівалася і камянела, але ад моцнага штуршка і работы рук падымалася на паверхню. Крыкнуць, абавязкова крыкнуць, калі толькі можна будзе разявіць рот!..

І ён, здаецца, крыкнуў, хоць голасу свайго не пачуў. Мільганула ў свядомасці, што, быццам, зрабіў усё тое апошняе, што мог... І калі зноў забулькала і загудзела над галавой, адчуў, што сіла цяжару неадольная, і змагацца з ёй, мабыць, ужо не знойдзецца моцы.

У гэты час нешта пацягло яго на паверхню. Цяжасць паступова знікала, пачалося глытанне вады ўжо ў надзеі, што яна не захлыне і зноў уніз не пацягне...

...Калі першы раз дыхнуў без захлёбвання, то адчуў, што яго цягнуць за валасы,— добра, што вушанка не была падвязана і выплыла раней.

— Што, хлябнуў трохі? — спытаў Высоцкі такім тонам, быццам нічога асаблівага і не здарылася. Відаць, наўмысля, каб падбадзёрыць.

А можа ён і яшчэ што-небудзь гаварыў да гэтага?.. У вушах было поўна вады... Здавалася, што ўсё цела — адзін лёд, страшэнна цяжкі і калючы...

Першыя мінуты не верылася, што ўжо не ў вадзе... Потым Высоцкі надзеў на мокрую галаву зусім сухую вушанку, сваю. Стала яшчэ халадней, хоць пад горла падкатвала вада, здаецца, цёплая. Усё яшчэ страшна было разняць рот, але Высоцкі сам яго разняў і ўліў нечага вельмі гарачага, як кіпень. Закалола па языку, потым — у горле.

...Зноў Высоцкі ўчапіўся за нешта моцна і ўпэўнена... Толькі не за валасы. Учапіўся і пацяг... Няўжо наверх?.. Няўжо да гэтага ўсё яшчэ над целам была вада? Не. Вось жа снег, чутно, як ён шархаціць пад спінаю.

Потым ужо ясна адчулася, што Высоцкі яго некуды нясе. Падумалася нават, што яму вельмі цяжка, бо невялікі па росту нясе такога вялікага і дужага...

На хутарку дазнаўся, што давялося перапаўзці зноў на свой бераг, бо толькі тут былі паблізу надзейныя людзі.

Гэта было выратаванне.

З таго часу пачалася дружба. Колькі разоў даводзілася бываць у атрадзе ў Высоцкага?..

...А да гэтага? Як адбылася першая сустрэча і калі?

...Яшчэ жывы быў Бранавец, а Высоцкі камандаваў у атрадзе Бранаўца ротай.

— А?.. Новы пампаліт? — спытаў Высоцкі, прытрымліваючыся вайсковай тэрміналогіі.

— Што, служыў у арміі?

— Не. Меў адтэрміноўку, як студэнт політэхнічнага інстытута. Мабілізавацца не паспеў, прыйшоў з Мінска па шпалах.

— З якога курса?

— З другога.

— А я з трэцяга, Мазырскага.

— Ясна. Настаўнік.

Неўзабаве Бранавец загінуў пры разгроме фашысцкага гарнізона вось у гэтым месцы, дзе цяпер жывём, працуем... У штабе брыгады тады было многа гаворкі пра адважнага і здольнага камандзіра Леаніда Высоцкага. Перш чым прызначыць яго на месца Бранаўца, параіліся і з камсамолам. Кандыдатуру рэкамендаваў і падтрымліваў Меркуш, сакратар падпольнага райкома партыі і камісар брыгады. Але ж не абавязкова яму было гаварыць, што Высоцкі яшчэ да атрада быў пасланы ў самы вялікі мястэчковы гарнізон і зрабіў там надзвычай важную справу.

Канечне ж не абавязкова! Нават зусім нельга было гаварыць, бо гэта вялікая тайна.

Адкуль хто мог ведаць, што Высоцкі меў такое заданне? Ніхто не мог ведаць! Адзін толькі Меркуш!

...Толькі што Леанід сказаў, што яшчэ Бранавец ведаў, блізкі яму ледзь не з самага маленства чалавек. Магчыма, што і Бранавец! Але ў канцы сорак другога года ён загінуў...

...Потым былі сустрэчы на пазіцыях, у паходах, у атаках... Хто калі мог успомніць пра даўняе складанае падполле?.. Высоцкі, мабыць, і сам забыўся пра яго.

...Яны партызанілі да вызвалення Беларусі. Потым абодва пайшлі ў рэгулярную армію, на папаўненне той дывізіі, якая памагла вызваліць зону брыгады. Трапілі ў розныя падраздзяленні, у баях зусім раз'ядналіся і нічога не ведалі адзін аб адным. Дэмабілізаваліся таксама ў розныя тэрміны, і, як высвятляецца цяпер, кожны пайшоў сваёй дарогаю: Высоцкі — у політэхнічны інстытут давуч-

вацца на інжынера-будаўніка, а Жамчужнага паслалі на Палессе дырэктарам школы. Давучваўся ён завочна.

...Што зрабіў бы на яго месцы Высоцкі, даведаўшыся, што пасадзілі сябра? Позна даведаўшыся, амаль праз паўгода?..

Нічога не зрабіў бы і Высоцкі! А можа і знайшоў бы што?.. У яго неяк усё ў жыцці быццам бы выразней і пэўней, хоць часам і складана да здзіўлення.

Так у роздумах і разважаннях, у неадольным палоне ўспамінаў дайшоў Жамчужны амаль да хаты Высоцкага. Убачыў машыну каля агарода і вярнуўся, рашыў ісці дадому. Стаў прыбаўляць крок, паглядваючы на ліхтары ўперадзе, прымушаў сябе пераключыць свае думкі на штонебудзь іншае, хоць нават на жанчын, якія, здаецца, ніколі не крыўдзілі яго сваёй увагай. Уяўляў самую прыгожую з іх, не надта даўнюю па знаёмству і не надта далёкую па ўзаемаадносінах. Чароўнасць успамінаў крыху захапляла, але зусім не надоўга, а потым, зноў супроць волі, бурлівай і неадступнай хваляй нахлыналі ўспаміны і пачыналі сціскаць душу сваёй складанай і супярэчлівай сутнасцю.

Дома гэтак жа стаяла ў памяці ўсё перадуманае і нібы патрабавала, каб яго абдумалі, перадумалі, узважылі і пераважылі яшчэ раз. Ніякія іншыя справы і ўражанні не ішлі ў галаву. Сон не браў. Гэта была, мабыць, тая першая ноч, калі Мечыслаў Юльянавіч не спаў аж да самага світання.

Машына Высоцкага так і начавала той раз на дарожцы супроць яго хаты. Раніцою Леанід Аляксандравіч выйшаў, каб перад выездам агледзець машыну, і ўбачыў каля плота каліўца мяты.

«Каторы ж гэта кінуў? — міжвольна апаліла крыўдай пытанне.— Мятка была ў абодвух, як падарунак гасцям. Няўжо Мечыслаў? Не. У яго было, здаецца, меншае каліўца...»

## VI

Некалькі дзён пасля гэтага Высоцкі быў у камандзіроўцы — выязджаў на адзін з самых далёкіх участкаў трэста. Вярнуўшыся, доўга не мог вырвацца з кабінета,

бо вельмі апанавалі яго розныя неадкладнасці па галоўным упраўленні. Толькі перад самым вечарам паехаў у горад і там завярнуў на знаёмы пустырчык, на ўскрайках якога ўжо раслі лебяда і малады дзядоўнік. Паставіў тут машыну і рашыў заглянуць на хвілінку ў бібліятэку — балазе і справа знаходзілася, трэба было памяняць кнігі.

Зайшоў у калідорчык былой прарабскай і зусім нечакана ўбачыў тут Еву.

— Добры дзень, Леанід Аляксандравіч! — ціха прамовіла яна і парывіста ступіла насустрач.— Я праз акно ўбачыла вашу машыну...

Твар яе палыхаў нібыта і свежай чырванню, але вочы былі запалыя і на здзіўленне сумныя, быццам запалоханыя. На іх не было ў гэты момант слёз, але адчувалася, што дзяўчына яшчэ зусім нядаўна была ў страшэнным адчаі і, мабыць, плакала.

— Што з вамі? — насцярожана і клапатліва спытаў Высоцкі.

Яна раптам упала тварам яму на грудзі і залілася слязамі.

— Захварэла я,— неяк вельмі глуха, быццам не сваім голасам і не сваімі вуснамі прамовіла яна.

— Што?!.— Леанід паклаў кніжкі на падаконнік і ўзяў дзяўчыну за дрыготкія плечы.

— Сёння правяралі на рэнтгене,— выціраючы слёзы і прыхоўваючы заплаканы твар, пачала яна гаварыць больш выразна.— Першы раз за гэтыя два гады праверылі.

— Ну і як?

— Вось,— яна падала згорнутую паперку.— Накіроўваюць у дыспансер. Туберкулёзны.

— Дык чаго гэтак перажываць? — пачаў угаворваць Высоцкі, углядаючыся ў паперку.— Магчыма, і памыліліся тутэйшыя нашы эскулапы, а можа сумняваюцца ды хочуць атрымаць кваліфікаванае заключэнне.

— Сказалі, што сур'ёзнае ў мяне,— паўтарыла дзяўчына.— Але я гэта толькі вам, Леанід Аляксандравіч. Толькі вам!.. Што мне цяпер рабіць?

— Паехаць-то трэба,— спакойна і ўпэўнена стаў раіць Высоцкі.— Заўтра паедзем разам — мне трэба ў Мінск. А пакуль што супакойцеся і нічога кепскага не думайце.

— Я аўтобусам паеду,— запярэчыла Ева.— Адна паеду.

— Адну не пушчу! — ціха, але з настойлівасцю прамовіў Леанід і прыхіліў яе да сябе.— Са мною паедзеце, я не пакіну вас!..

Ева зноў заплакала, але ў празрыстых і ўзнятых на Леаніда вачах мільгнулі іскрынкі радасці і надзеі.

— Зачыніце пакуль што бібліятэку,— прапанаваў потым Высоцкі,— ды адпачніце. Давайце падвязу дадому!

— Тут у мяне дзяўчаткі са школы,— ужо амаль роўным голасам сказала Ева.— Памочніцы мае. Разложым з імі, упарадкуем новыя кніжкі, тады пайду.

— Заехаць па вас?

— Не, не трэба. Дзякуй, што цяпер заехалі. Забраць у вас гэтыя кнігі? — яна глянула на падаконнік.

— Забярыце. І заўтра выходзьце за мосцік з самага рапку.

У Высоцкага адлягло на душы, калі ён убачыў, што Ева перабягае мосцік імкліва і ўпэўнена, што падыходзіць да машыны з харошай, ветлівай усмешкай. У руках у яе зноў свежы букецік, сабраны, відаць, з таго, што расло ў агародчыку яе гаспадыні. Тырчма стаяў і вылучаўся сярод іншых каліўцаў зялёны, аж трошкі белаваты касачык, махрыліся галінкі завушніц, жаўцела некалькі адуванчыкаў, а пасярод усяго гэтага была ўсё ж такі мята. Усю дарогу дзяўчына трымала гэты букецік у руках, шкадавала, што ён пачынаў проста на вачах вянуць, і не ведала, як яму памагчы. Ад тэтага часам перажывала.

Аднак такія перажыванні не засланялі таго, што асабліва цешыла Высоцкага: Ева была вясёлая, перасвявала за дарогу амаль усе тыя частушкі, што напісала за мінулыя часы, пераказала безліч розных эпіграм і подпісаў пад карыкатурамі.

— Памятлівасць у вас!..— здзівіўся Леанід Аляксандравіч.— Каб мне хоць частку такой памяці!

— А я і не ведаю, якая ў мяне памяць,— сказала на гэта Ева.— Нічога наўмысля не запамінаю, што само астаецца ў галаве, тое і памятаю.

Да самага Мінска пра хваробу не гаварылі, толькі ўжо ў горадзе Высоцкі спытаў, ці не было вялікіх перажыванняў і пакут ноччу.

— Доўга не магла заснуць,— прызналася Ева.— Толькі перад днём паспала. Але я ўжо даўно мала сплю ноччу.

— Гаспадыня ведае, куды вы паехалі?

— Не. Што вы?

— А Вілен?

— Я нікому нічога не гаварыла.

— Ну і правільна! — адобрыў Высоцкі.— Калі там правераць сёння, без затрымкі, то к вечару і дадому вернемся.

...У рэнтгенакабінеце дыспансера спачатку не было электратоку, потым урача некуды назвалі, потым здарыліся яшчэ нейкія непаладкі, і выйшла так, што Еву агледзелі толькі перад вечарам. Самой не сказалі нічога, а Высоцкаму паведамілі, што ўся канчатковая дыягностыка будзе зроблена заўтра.

— Вы ўжо не паспееце даехаць! — занепакоілася дзяўчына, калі яны ўбачыліся ў прыёмнай.— Сцямнее ў дарозе.

— А я і не паеду сёння,— запэўніў Высоцкі.— Заўтра ўсё скажуць і паедзем разам.

Ева ўдзячна глянула на яго і хутка апусціла вочы: павекі яе задрыжалі. Яна нічога не сказала аб сабе, а толькі заклапочана спытала:

— А па рабоце ў вас нічога?

— Я пазваню,— адказаў Высоцкі.

Ён сеў у машыну і ціха паехаў па вузкай, нялюднай вуліцы. І толькі цяпер стаў прыкідваць, дзе паставіць машыну, дзе пераначаваць самому. Усе апошнія гады яму не так часта даводзілася бываць у Мінску, таму знаёмых тут амаль што і не было. А калі б хто і знайшоўся, то наўрад ці хапіла б смеласці заехаць да яго напач. У гасцініцу таксама не ўпросішся з машынай.

Ніякай трывогі з-за гэтага не ўзнікала — можна было пераначаваць і ў кузаве на ўсякай стаянцы. А пакуль што прыйшла думка — паездзіць крыху па горадзе, больш уважліва, як іншы раз на хаду, агледзець некаторыя новыя і даволі цікавыя ў архітэктурных адносінах будынкі, кварталы і цэлыя вуліцы.

Ужо блізка было да змяркання, калі Высоцкі трапіў на зусім ціхі, пуставаты і нават не забрукаваны правулачак: колы пасунуліся з горкі па пяску плаўна і роўна, нібы паплылі. Змены і тут заўважаліся — з левага боку сям-там бялелі фасады вялікіх дамоў,— адпак жа многія мясціны асталіся амаль такія, як і былі дзесятак год назад.

Высоцкі пaглядваў на драўляныя домікі з вузкімі дворыкамі з правага боку. І чым далей ехаў, тым цікавасць разбірала ўсё больш: угадаецца той, некалі знаёмы домік ці не? Стаіць ён на тым жа месцы ці можа даўно нямa, і сялішча не пазнаеш, бо на ім пабудавана што-небудзь новае?

...Ні людзей насустрач, ні якога-небудзь транспарту — можна ехаць зусім ціха, хоць нават і пяць кіламетраў у гадзіну. І ўвесь час з горкі, машына коціцца амаль без матора. Дарога роўная: ні калдобін, ні аб'ездаў — можна ўвесь час спакойна разглядаць усё навакол.

...Уперадзе з правага боку з-за суседняй будынінкі паказаліся вялікія і па-вясковаму пышныя кусты бэзу. А з левага — глухая сцяна мураванага дома. Гэтага дома раней тут не было, а бэз і тады рос у маленькім агародчыку, толькі не гэтакі раскошны і густы. За зялёнымі кустамі стаяў тады маленькі домік з нізкімі вокнамі. Часам яго нават не відно было з-за бэзу.

Ёсць там цяпер што ці асталіся толькі кусты?

Пад'ехаўшы бліжэй, Высоцкі ўбачыў, што домік стаіць і цяпер, толькі быццам бы не такі, як раней, і не на тым месцы. Вокны сінія замест белых, але гэта нічога: шалёўку маглі перафарбаваць. Ды сам домік быццам ніжэйшы за той, што калісьці быў вельмі знаёмы. Двара амаль і зусім няма: з каліткі павяла некуды толькі сцежачка, акаймаваная свежай травою. З аднаго боку сцежкі — грады, з другога — прыбуцвелая сцяна доміка.

Высоцкі і сам не заўважыў, як лёгенька націснуў на тормаз — машына стала проці вокнаў, зацененых бэзам. Нехта быццам бы глянуў у акно — Леаніду стала няёмка, і ён адпусціў тормаз.

...Машына ціха пайшла, кусты бэзу і домік пачалі адплываць назад, а ўпэўненасці так і не было — той гэта домік ці не той.

Ужо ад'ехаўшы да наступнага двара, Высоцкі раптам пачуў, што нібыта яго нехта заве. Глянуў у люстэрка і аж здрыгануўся ад нечаканасці: за машынай бегла Людміла, махала газавым шалікам і крычала: .

— Лёня, Лёня, пачакай!

Ён спыніў машыну.

— Ну, чаго та-ак?! — з добрай усмешкай, але і з крыўдай накінулася на яго жанчына, перш чым пазнароўкацца.— Прыехаў, бачыць, што я гляджу ў акно, ма-

хаю рукою, дык хаця б які знак!.. Паехаў! Гэта ўжо і нявятліва, калі хочаш... Цётка таксама здзівілася.

— Я не бачыў, як ты махала,— апраўдваўся Высоцкі, адчыніўшы пярэднія дзверцы.— Я наогул цябе там не пазнаў.

— Вокны пагнілі, не адчыняюцца,— пачала Людміла браць віну на сябе.— А то пачуў бы, як мы з цёткай гукалі. Падай машыну назад ды заглянь хоць на хвіліну: цётка вельмі просіць. Ёй нешта нездаровіцца, і я зайшла праведаць.

— Можа пазней? — стаў аднеквацца Высоцкі.— Я хацеў яшчэ пабываць...

— Дадому сёння не едзеш?

— Ды не... Так выйшла, што...

— Тады давай зойдзем! Дзеля цёткі зрабі гэта. Яна так паважае цябе...

— А стары дома?

— «Тайны міліцыянер»? — Людміла горка ўсміхнулася.— Даўно няма — прагнала яго цётка. Цяпер жыве адна і ўсё чакае, калі разбураць гэтую хібару і дадуць ёй кватэру ў новым доме ды па новым месцы.

— Ладна! — памяркоўней прамовіў Высоцкі. — Скажы, што наведаюся, вось толькі заеду ў магазін ды куплю што-небудзь. Старая ж чарку любіць, праўда?

— А не падвядзеш? А то сама сяду ў машыну, тады ўжо нікуды не дзенешся!

— Сказаў, дык прыеду!

Людмілiна цётка сапраўды была рада госцю, многа распытвала, многа скардзілася, а потым, калі даведалася, што Высоцкі нідзе не ўладкаваўся панач, стала прасіць астацца ў яе.

— Мы ж вам не чужыя,— даводзіла яна, спадылба наглядаючы на Людмілу.— Каб выхвараў да вычарнеў той, хто гэтак вам зрабіў!.. Як я ненавіджу, як праклінаю такіх людзей-ірадаў! І свайго гэтага дурня, абібока выгнала. Можа ён і не зрабіў нічога кепскага нікому, але пасля таго вяселля я цярпець не магла, калі ён часам выхваляўся ды пагражаў людзям.

...Людміла пачала збірацца дадому.

— Табе далёка? — спытаў Высоцкі.

— Ды не надта блізка. На Слуцкую шашу.

— Хочаш — падвязу?

— Гэта было б міла з твайго боку.

— Дык я вас чакаю! — сказала гаспадыня, цяжка і грузна ўстаючы з-за стала.— Машыну тут пастаўім, я пакажу дзе.

На Слуцкай шашы Людміла спачатку паказала, дзе трэба зрабіць левы паварот, а потым стала падаваць каманды адну за другой:

— Права, лева, прама!

Камандавала і свавольна памахвала перад рулём белым газавым шалікам. Па яе жэстах і арыстакратычна-абыякавым голасе Высоцкі здагадваўся, што яна часта ездзіла сюды з незнаёмымі вадзіцелямі, відаць таксістамі.

Па апошняй камандзе Леанід Аляксандравіч завярнуў у шырокі асфальтаваны двор і затармазіў каля вялікай і жоўтай над фарамі сцяны.

— Вось тут расцвітае маё сямейнае шчасце! — з ненатуральнай урачыстасцю прамовіла жанчына, вылезшы з кабіны, і паказала шалікам на каторы там паверх, відаць не першы.— Зойдзем паглядзім!

— А ён... дома?

— Ды дзе там! У камандзіроўках усё. І слава богу!..

Пад святлом ніжніх вокнаў яна павярнулася да машыны, і Высоцкі ўбачыў залішне ўзрушаны, нават разгарачаны твар, бліскучыя, зыркія вочы.

«У машыне душна,— падумаў ён, жадаючы неяк апраўдаць жанчыну.— Вось і разабрала крыху ад чаркі».

У кватэры Людміла ўключыла святло і войкнула ад нечаканасці: у пакоях быў такі адмысловы беспарадак, што і наўмысля цяжка дасягнуць такога. Відаць, яна забылася, што не прыбірала сёння ў кватэры. У зале на кожнай рэчы што-небудзь ляжала ці вісела. Нават на таршэр было ўскінута нешта лёгкае, нацельнае. Пасярод пакоя ляжала дагары тварам вялікая голая лялька.

Гаспадыня без жалю пхнула гэтую ляльку нагою, зняла з таршэра ружовую адзежыну і кінулася зачыняць спальню. Але пакуль зачыніла, Высоцкі паспеў убачыць там непрыбраны двухспальны ложак самага новага стылю, а побач на падлозе — вялізныя, нумару так сорак шостага, мужчынскія скураныя пантоплі.

— Вось так і жывём,— сказала яна, вінавата і крыху разгублена пагдядаючы на госця.— Запрасіла б перанача-

ваць тут, але ж ведаю характар: не застанешся. Ды і суседзі ў нас балбатлівыя. Пасядзі хоць хвіліну!

— Не, я паеду,— адмовіўся Высоцкі. Яшчэ раз акінуў позіркам залу і пераканаўся, што сесці няма дзе: усе крэслы і атаманка былі хоць чым-небудзь ды заняты.

Вярнуўшыся на ціхую нясчаную вулічку, ён уладкаваў машыну і неўзабаве ўлёгся на адпачынак сам: Людміліна цётка паслала яму ў пакоі, а сама лягла на кухні. Ён хутка заснуў першым моцным сном і, мабыць, спаў бы доўга, але праз некаторы час прачнуўся ад стукату ў дзверы.

«Што такое, няўжо ноч так хутка прайшла?» — З натугай расплюшчыў павекі, нібы іх хто склеіў, глянуў у акно: на дварэ было яшчэ цёмна.

Стукат паўтарыўся. «Значыць, нешта нечаканае». І чамусьці мільгнуў у памяці даўні выпадак на вяселлі. «Вось той стол, за якім сядзеў тады побач з Людмілай. Вунь там куханька, дзе адбылася тая «ветлівая» размова, з якой не можа зраўняцца самае што можа быць на свеце прыкрае і цынічнае».

Гаспадыня пачула стукат, з крахтаннем і сапеннем падпялася з пасцелі і пашлёпала да дзвярэй.

— Хто там? — спытала сонным і хваравітым голасам.

— Адчыніце, хутчэй!

Высоцкі пазнаў Людмілін голас.

— І што гэта ты надумалася сярод ночы? — пачала прабіраць яе старая, адцягваючы драўляную дапатопную засаўку.— І сораму ў цябе няма... Ні сну табе, ні спакою...

— Страшна мне адной,— неяк жаласліва прамовіла жанчына і хуценька прайшла на кухню. Там яны ўключылі начнічок, і Высоцкі — хацеў гэтага ці не хацеў — вымушаны быў слухаць іх ціхую, насцярожаную размову.

— Ён спіць?

— Спіць, напэўна. Я сама была заснула ўжо.

— А дзе вы яму паслалі?

— На канапе. Ты можа раскладушку палезеш дастанеш з вышак?

— На чорта яна мне! Лягу, дзе заўсёды, на ложку. Усё выпілі?

— Што ўсё?

— Ну, тое, што Лёня купіў...

— Колькі асталося пры табе, столькі і ёсць. Мы не пілі.

— А дзе яно?

— Нашто табе?

— Хачу яшчэ выпіць.

— Здурнела — так позна?

— Не ваш клопат! Дзе?

— У шахаўцы! Нешта ты распілася гэтыя дні. Глядзі!.. Прыедзе той — зноў будзеш хадзіць у сіняках!

— А хваробу! Рукі не дастануць!

Потым чутно было, як Людміла лазіла ў шахаўку, брала там пляшку і шклянку (яны дзынкнулі адна аб адну), як налівала спачатку сабе...

— І мне налі ўжо, калі гэтак! — загадала цётка. Людміла яшчэ раз бразнула дзверцамі шахаўкі і стала наліваць другую шклянку.

— Пакінь трохі! — бурчліва сказала гаспадыня.— Можа на снеданне спатрэбіцца.

— То і яшчэ купіць,— сцішана хіхікнуўшы, прамовіла Людміла.— Але ён за рулём не п'е. Вы ж бачылі.

Яны выпілі, нечым трохі закусілі, і тады Людміла, яшчэ жуючы, зайшла ў пакой. Каля нікеляванага ложка зняла туфлі, паставіла іх пад ложак. Ціха і лёгка ступаючы, разабрала ложак, пасядзела на ім з хвіліну неяк задумліва і сумна, потым пачала раздзявацца. Здымала з сябе ўсё верхняе спавольна і марудна, нібы раздумваючы, трэба гэта рабіць ці не трэба. І зусім нікога не асцерагалася: відаць, была ўпэўнена, што Высоцкі спіць.

— Схадзі паглядзі засаўку,— прашаптала за перагародкаю цётка.— Я, мабыць, не засунула.

У кухні ўсё яшчэ свяціўся, мабыць забыты, начнічок. Людміла пайшла ва ўсім спартсменскім, і нават у змроку былі відны стройныя абрысы яе сапраўды гімнастычнай постаці. Вярталася, дробна ступаючы на пальчыкі і віляючы пышнымі бёдрамі, як у танцы. Лягла, накрылася ледзь не з галавой і прыціхла.

Так прайшло некалькі хвілін. Высоцкі адчуваў, што яна ўслухоўваецца ў яго дыханне, але прытварыцца сонным не мог. Ды не лёгка было прытварыцца: яго канапа ад ложка насупраць — усяго якія два-тры крокі. У гэтай прагаліне ўмяшчаўся толькі стол, старамодны, чатырохкантовы. Ён стаяў больш к галовам, але паміж точаных ножак Высоцкаму відна была падушка і Людзіны валасы,

шырока раскінутыя на белаї навалачцы. Значыць, і Люда зможа ўбачыць, што ён не спіць, што вочы ў яго толькі прыплюшчаныя. Няхай вось толькі прыгледзіцца пасля кухоннага святла.

Люда павярнулася зусім на бок — адна пружына ў ложку звонка трэнкнула. Высоцкі бачыў, што яна адкрыла твар і ўставіла свае зыркія, не надта сарамлівыя вочы проста на яго. Спачатку гэтыя вочы толькі ўяўляліся — ён добра памятаў іх з нядаўняй паездкі ў машыне, а потым здалося, што і сапраўды яны бліснуць у змроку. Бляск іх настойлівы, гарачы, неадольны. За ім не відно твару, вось ужо злілася са змрокам і навалачка падушкі, зусім зніклі пышныя распушчаныя валасы, а пранізлівы бляск усё мацнее і мацнее, здавалася, што дасягае кожнага кутка, кожнай шчылінкі.

— Ты, мабыць, не спіш, Лёня,— пачуўся ціхі, спагадлівы шэпт.

Сапраўды шэпт і сапраўды ціхі, а ў першы момант здалося, што ён нейкі рэзкі і моцны, што яго маглі пачуць нават суседзі па кватэры. Магчыма, гэта ад таго, што ў пакоі было надзвычай ціха, нішто нідзе не парушала самага лепшага ўтулку і спакою, нават ходзікі не чэкалі, як бывае амаль ва ўсіх гэтакіх кватэрах.

— Не сплю,— адказаў Высоцкі і прыслухаўся: чуе іхні шэпт гаспадыня ці не чуе?

— Я так і ведала,— зашаптала ўжо крыху мацней Людміла.— Разбудзіла цябе сваім стукам...

«Ведала...— неяк разанула гэтае прызнанне: Леанід аж зазлаваў.— Ведала і раздзявалася тут жа, на вачах. А потым яшчэ і прайшлася раздзетая. Не дай божа мець з такой натурай жонку — добра, што цяжкі выпадак збавіў ад гэтага».

— Чаму ты прыехала? — не хаваючы раздражнення, спытаў Высоцкі, хоць ужо і чуў амаль такое ж пытанне ад цёткі.

— Думаеш, да цябе? — апякла яна нечаканым пытаннем. — Не, не да цябе! Проста мне абрыдла там... Я часта начую ў цёткі.

Высоцкі змаўчаў, бо, відаць, проста не ведаў, што на гэта сказаць. Яна таксама сціхла, хоць адчувалася, што вачэй не адводзіла і дыхаць стала трывожней.

«Паляжыць ды засне,— падумаў Леанід, час ад часу паглядаючы ў той бок, адкуль ішоў бляск яе вачэй.—

У гаворку ўвязвацца няма чаго: падвыпіла, думкі ўзвінчаны. Шкада толькі, што сон перабіла».

А сон і сапраўды знік, быццам і не было яго, быццам і не ноч цяпер на дварэ. Ад гэтага з'ўлялася дакорлівая нездаволенасць, бо Высоцкі ўжо ведаў, што не засне да самага світання, а заўтра работа, многа ўсякіх клопатаў. Такія бяссонніцы бывалі ўжо і раней.

Калі б у звычайным стане ўявіць усё тое, што перажыў за дзень, што здарылася вось цяпер, дык яшчэ можна было б ва ўсім разабрацца. А пры бяссонніцы?..

«Устаць бы, можа, ды пайсці ў машыну... Там пасядзець да відна, а пацягне на сон — то і прылегчы... А можа завесці матор ды паехаць па тую вуліцу, дзе дыспансер?.. Дзяжурныя, пэўна, не спяць...»

— Лёня! — зноў пазвала Людміла.— Усё роўна ты ўжо не заснеш, і я не засну... Давай ідзі сюды, хоць нагаворымся, душу адвяду, усё табе адкрыю...

— Гавары адтуль, не далёка ж!

— Цётка пачуе.

У гэты час сапраўды заварочалася і застагнала ў кухні гаспадыня, нават сказала нешта, толькі нельга было разабраць, спрасонку гэта ці наўмысля, каб перасцерагчы Людмілу.

Абое на нейкі час змоўклі.

— У цябе там цвёрда і вузка,— першая зашаптала Людміла.— Канапа старая, як мая цётка. Гэта яшчэ, мабыць, пасаг яе.

— Мне тут добра,— адказаў Высоцкі.— Спі, і я засну.

— Спала ўжо,— неяк адразу страціўшы ўсю сваю лагоднасць, прашаптала жанчына.— Сну было многа — я і ўдзень магу паспаць, калі захачу... А што з гэтага?..

Яна зноў пакрылася амаль з усёй галавой, зыркі бляск вачэй знік, на падушцы быццам заварушыліся найбольш доўгія пасмы валасоў.

Высоцкі лёг на спіну, каб хоць трохі адвесці пагляд і думкі, сцішыцца ды заснуць. Ужо нямнога аставалася часу да дня, як заўсёды, не лёгкага і не гладкага, з безлічча розных вялікіх і малых, складаных і нескладаных спраў. Цягнула глянуць у акно, каб упэўніцца, што яшчэ не світае, але праз нейкую млявасць у целе не хацелася паварочвацца, ды траскатня канапы раздражняла.

— Якія дурні ўсе! — раптам данеслася з-пад Людмілінай коўдры.

— Хто? — не паварочваючы галавы, спытаў Леанід.

— Вы, мужчыны! Вось і ты як блазнюк які!.. Адхрышчваешся ад мяне, утульваеш галаву!.. А ці ведаеце вы, кабялі, што вы мне і не патрэбны зусім! І ты, Лёня, не патрэбен! Можа баішся, што сама ўстану ды прыйду?.. Дык не бойся, можаш спаць спакойна!..

— Чаго мне баяцца?

— Калі ад нас, жанчын, нешта шчырае ды адкрытае,— шаптала далей Людміла, ужо не баючыся разбудзіць цётку,— дык вам здаецца, што гэта... А ў мяне зусім іншае ў галаве і на сэрцы... Хацела пагаварыць блізка, а не спакушаць цябе, гэтакага Адама нявіннага.

— Ну давай пагаворым, чаго ты! — крыху пакрыўджаны такімі папрокамі, азваўся Высоцкі.

— Ды што гаварыць з чалавекам, у якога ў галаве...

— Дагаворвай! — Леанід зноў павярнуўся на бок, каб цішэй гаманіць самому і лепш чуць яе.

— Адзін цэмент і бетон,— уздыхнуўшы, сказала жанчына. — Як і ў майго цяперашняга...

— Не вельмі ты знаеш, што ў мяне ў галаве.

— Больш, як ты пра мяне.

— Калі ты хацела сур'ёзна пагаварыць са мною, чаму піла на ноч?

— Таму, што п'яная толькі і магу выказаць свае перажыванні. Ды няма каму... Адна я... Адзінокая... Ні бацькі ў мяне, ні маці... А цётка толькі чацвярцінку патрабуе, калі прыйду...

Шэпт яе задрыжаў, стаў мала разборлівы. Яна, відаць, адчула гэта і ледзь не да пояса сцягнула з сябе коўдру. Потым павярнулася на спіну і раскінула рукі. Высоцкі ўбачыў яе невялікія, туга сцягнутыя грудзі, роўны і нерухомы, нібы на карціне, профіль твару. Насцярожана і з увагай стаў чакаць, што яна скажа яшчэ.

Аднак Люда маўчала і быццам не дыхала, відаць, стрымліваючы плач. Праз нейкую хвіліну зноў крыху павярнула галаву да Высоцкага, цяжка, з перабоямі ўздыхнула.

— А бацька ў мяне ўсё-такі ёсць,— неўзабаве зашаптала выразна і смела.— Людзі паказалі, бо сама яго не ведала... Некалі я, дурная, саромелася табе гаварыць пра гэта... А можа і баялася, каб не спужаўся ды не разлюбіў. Байстручка я... Так гаворыць мая цётка, калі раззлуецца...

Высоцкі насцярожыўся пасля гэтых слоў: раптам пачуе гаспадыня ды ўстане, ды ўчыніць яны тут адна адной «шпектаклю»...

Але з-за перагародкі не данасілася ніякага варушэння, цётка, мабыць, спала. А можа прыціхла ад праўдзівых слоў і рашыла маўчаць. Што яна крыху набойвалася сваёй выхаванкі, гэта Высоцкі заўважыў яшчэ ўдзень.

— А нядаўна я сустрэла яго на вуліцы,— пачала гаварыць Людміла далей.

— Каго? — спытаў Леанід.

— Ну, бацьку свайго... Віноўніка майго з'яўлення на свет. Убачыў мяне — утуліўся ў каўнер, згорбіўся і паўцёкі. Думаў, што я прасіць чаго буду ці патрабаваць. А я век ні ў кога нічога не прасіла. Здохну, а не папрашу!..

Людміла зацяжна перадыхнула і крыху сцішыла шэпт:

— Толькі да мамкі бягу, калі мне вельмі цяжка. Пастаю каля магілы, паплачу... Была б жывая мая мамка, усё было б інакай, і я не гэтакая была б...

Высоцкі здаўна ведаў, што Люда вельмі любіла сваю маці і смерць яе ў час акупацыі ледзь перанесла. Таму не перабіваў цяпер горкіх успамінаў, ляжаў ціха і слухаў.

— Сіратой я асталася,— зноў зашаптала Людміла,— сіратой і жыву. Можа і памерці давядзецца адзінокай, нават на магілу некаму будзе прыйсці... Людзей навакол быццам бы і многа, здаецца, ёсць і харошыя, а ўсё не мае. Сустрэла некалі цябе — душой адчула, што гэта той самы, з якім можна ўзяцца за рукі... Адчула, выгляду не падала: натура была вельмі ганарлівая і, мабыць, дурная. Потым гэтае вяселле — ты сам памятаеш... Як толькі за табою зачыніліся дзверы, твой жа дружбачок у модным світары сказаў: «Няма нічога дзіўнага, што яго, беднага, узялі! Дзіўна тое, што не ўзялі раней!» А назаўтра і я паверыла, што ты быў вінаваты...

— Чаму ў цябе няма дзяцей? — раптам спытаў Высоцкі, нібы хочучы перапыніць успаміны пра даўно мінулае. Яны цяжкія для Людмілы, пакутлівыя і для яго. Аднак не заўсёды зразумееш цяперашняе, не крануўшы мінулага. Людміла не чакала такога пытання, яно нават збянтэжыла яе, але, хочучы быць праўдзівай, зноў не абышлася без мінулага.

— Ад цябе я збаялася мець сына ці дачку!..— з суровай шчырасцю і адчаем прашаптала яна.— Падумала: які будзе лёс у гэтага дзіцяці?.. Чаго яму радзіцца на вечныя пакуты?.. Іначай мне і не ўяўлялася тады, можа таму, што сама нарадзілася ў такі час... А потым ужо ў камяне і не маглі быць дзеці... Вось такая мая праўда, калі ты хацеў пачуць яе. Сам спытаў, не крыўдуй! А цяпер спі, непакоіць больш не буду. Хутка ноч пройдзе!

— Няхай праходзіць,— задумліва прамовіў Высоцкі.— Ты хіба можаш заснуць?

— Не, не засну.

— Тады адкажы яшчэ на адно пытанне. Ты сама хоць што-небудзь зрабіла для таго, каб лепш было жыць? Табе, мне і наогул — людзям? Ты калі-небудзь думала пра гэта?

Людміла маўчала, нават не падала ніякага знаку, што пачула і зразумела гэтае пытанне.

— Скардзіцца на свой лёс,— гаварыў далей Высоцкі,— гэта не тое, што змагацца за яго. Там кожнаму — прастор. А я прыхільнік таго, што трэба жыць не толькі аднымі чаканнямі ды спадзяваннямі. Нездарма ў людзей гаворыцца: шчасце не шукаюць, а робяць. У гэтым, мабыць, тая аснова, якую мы з табой разумелі кожны па-свойму. А можа ты і зусім не разумела.

Людміла зноў нічога не адказала. Высоцкі толькі і пачуў, што яна цяжка і пакрыўджана ўздыхнула.

## VII

У дыспансеры зранку зноў не было току, потым доўга ішла службовая лятучка, і Высоцкі не мог сустрэцца з галоўным урачом. Дазволілі зайсці толькі недзе каля паўдня.

Галоўурач, маленькая караткапогая жанчына, загадала магутнаму на пагляд мужчыну прынесці ўсё, што трэба вось па «данаму пытанню». Потым яна ўважліва разглядала рэнтгенаскапію, чытала розныя заключэнні. Магутны мужчына ў белым халаце стаяў каля белага стала.

— Сядайце,— сказала жанчына, не глянуўшы на яго.

Мужчына сеў. Яна паказала яму адну паперку і нешта спытала па-лацінску. Той згодліва кіўнуў галавой. Тады галоўурач звярнулася да Высоцкага:

— Вы хто будзеце хворай: блізкі родзіч, сваяк ці проста знаёмы?

— Мы працуем разам,— сказаў Высоцкі.

— А бацькі ў яе ёсць?

— Няма.

— А хто ёсць?

— Цётка ў суседнім ад нас раёне. А больш, здаецца, нікога.

Жанчына паківала кучаравай галавой у высокім накрухмаленым каўпаку, глыбока ўздыхнула.

— Значыцца, вы з Калійска? Чула, чула пра такі горад. І што ж у вас там — да гэтага часу ўрачоў няма?

— Чаму ж? — запярэчыў Высоцкі.— Ёсць урачы. І бальніца ёсць.

— Няўжо там рэнтгенаўскіх установак не было?

— Не магу паручыцца,— сказаў на гэта Высоцкі,— бо я не так даўно прыехаў туды. Але думаю, што былі.— Ён уважліва сачыў за вачыма і тварам галоўурача, стараючыся адгадаць, што яна павінна вось-вось сказаць. І рыхтаваўся пачуць самае цяжкае.

— Ева Кузьмінічна Дым,— павольна вымавіла галоўурач, мабыць для таго, каб пераканацца, што памылкі тут няма.— Яна і ёсць ваша... прабачце, знаёмая?

Высоцкі кіўнуў галавой.

— Пра яе мы і гаворым,— удакладніла жанчына.— Іменна пра яе.— Глянула на атлета ў халаце, і нават у гэтых абставінах нельга было не заўважыць, што пагляд яе быў залішне ласкавы.— Мы вымушаны сказаць вам... Перадайце цётцы ці каму там... Павінны вам сказаць, што становішча ў хворай вельмі цяжкае... Хвароба запушчана... І цяпер...

— Што цяпер? — не хаваючы трывогі, спытаў Леанід Аляксандравіч.— Няўжо?.. Не можа гэтага быць!.. Яна ж...

— На вялікі жаль,— падкрэсліла галоўурач.— На вялікі жаль!..

Аддаўшы «гісторыю хваробы» сваіму прывабнаму калегу, відаць ардынатару, яна яшчэ разы тры паўтарыла гэтае сваё «на вялікі жаль», а Высоцкі заўважыў, што пры гэтым не адчувала ніякага жалю, адносілася да лёсу дзяўчыны як да штодзённай звычайнай з'явы.

— Як жа далей? — сумна, аднак патрабавальна спытаў Леанід Аляксандравіч.

— Далей? — перапытала жанчына.— Далей пабачым, а пакуль што мы пакінем яе тут, паспрабуем лячыць.

— Тут, на месцы?

— Не, адправім у бальніцу... Ёй спатрэбіцца аперацыя.

Высоцкі сапраўды адчуў нешта падобнае на спалох, але своечасова схапіў сябе за нервы і не падаў выгляду.

— Далёка гэта? — стараючыся быць спакойным, запытаўся ён.

— У Зарэчнае.

— Дык можа я сам і завязу?.. Пагляджу там... Пагавару з урачамі...

— На жаль, там мястоў яшчэ няма,— паведаміла галоўурач. — На вялікі жаль! Прыйдзецца ёй паляжаць пару дзён у нас.

— Можна мне цяпер пабачыцца з Евай?

— З гэтай хворай? — перапытала жанчына.— Можна, вядома, толькі тое, аб чым мы з вамі гаварылі...

— Я разумею,— сказаў Высоцкі і ўстаў.

Галоўурач падала нейкі свой знак ардынатару, і ён таксама ўстаў, спартсменскім крокам накіраваўся да дзвярэй.

Ева, мабыць, усё ведала. Яна выйшла ў тое месца вузкага калідорчыка, дзе дазваляліся сустрэчы, усміхнулася Высоцкаму і сарамліва агледзела свой бальнічны халат. Ведала ці здагадвалася, што Леанід быў у галоўурача, але не спытала, пра што там гаварылі.

— Затрымаліся вы з-за мяне,— пачала яна і адхіліла рукаў халата, каб глянуць на свой наручны гадзіннік, зусім просценькі, на пластмасавым браслеціку. Халат шэры, папошаны, можа сто разоў ужо мыты. Рукавы шырокія, і Евіны рукі ў іх здаваліся танчэйшымі як заўсёды. І сама яна быццам пастарэла за ноч, паменшала ростам. Толькі ўсмешка асталася тая самая, што і раней; крышку прыбавілася ў ёй сарамлівасці, але гэта, мабыць, з-за халата. Не ведала дзяўчына, як трымацца ў гэтым халаце без гузікаў, надзетым амаль на голае цела: то ў адным месцы яго захіляла і прытрымлівала рукой, то ў другім. Ніколі ёй не даводзілася бываць у такім халаце.

— Не думайце пра мае затрымкі,— стаў заспакойваць яе Леанід Аляксандравіч.— Усё ў мяне паспяваецца.

Цяпер самае важнае — адолець вашу бяду. Вы, мабыць, і не спалі ноччу?

— Зусім мала,— неахвотна прызналася Ева,— незнаёмае месца, ды суседкі гаманілі. А вы? Няўжо дадому паспелі з'ездзіць?

— Не, тут начаваў,— паведаміў Высоцкі. Успомніў мінулую ноч і не здолеў адагнаць пачуццё няёмкасці, пачырванеў.

Ева заўважыла гэта, але не падала выгляду.

— Я прыеду да вас туды,— быццам не сваім голасам гаварыў далей Высоцкі.— Буду наведвацца...

І ў гэты ж момант гатоў быў працізаць сябе за тое, што не можа сказаць усю сваю праўду, што, мабыць, так і астанецца між імі нешта прыхаванае, не зусім высветленае.

— Там павінны быць лепшыя ўмовы,— абнадзейваў ён сам сябе і Еву.— Можна будзе спакойна пасядзець і пагаварыць... Аб усім пагаворым...

— Я бібліятэку не здала,— занепакоілася Ева.— Усё так пакінула. Калі надоўга мяне затрымаюць, то...

— Доўга не будуць трымаць,— сказаў Высоцкі.— Толькі праверка там пройдзе большая ды падтрымка лякарствамі.

— Там — аперацыя,— раптам вымавіла дзяўчына і глянула яму ў вочы.

«Не, гэтаму чалавеку няможна гаварыць няпраўду,— падумаў Леанід Аляксандравіч.— Ні адной іёты няпраўды».

— Хто вам сказаў пра аперацыю?

— Суседка адна... Яна ўжо не першы раз тут.

— Не слухайце суседак. Тут у кожнага сваё. Калі ў вас і будзе што, то не цяжкае.

...Развітваючыся, Ева зноў усміхнулася, хацела быць спакойнай, нават не сумнай, але ў вачах свежымі расінкамі бліснулі слёзы. Высоцкі ледзь толькі заўважыў іх, бо яна хутка апусціла павекі і, абедзвюма рукамі прытрымліваючы халат, пайшла да дзвярэй сваёй палаты.

— Нікому пра гэта! — патрабавальна шапнула яна, узяўшыся за дзвярную ручку. Падумала трошкі і дадала: — Ключ ад бібліятэкі ў мяне дома, гаспадыня ведае дзе.

І потым на нейкі момант прыклала пальцы да вуснаў...

Што азначала гэта?.. Высоцкі ехаў дадому і ўспамінаў своеасаблівы па сваёй чароўнасці Евін жэст. Відаць, паўтарыла знакам, каб маўчаў, не гаварыў нікому, што гэтак захварэла. І больш тут нічога. А хіба трэба было паўтараць?.. Хіба ён сам гэтага не ведае?..

Успомнілася цяпер і многае з таго, што ўяўлялася раней зусім інача.

...Дрыжалі пальцы, калі яна ў бібліятэцы запісвала людзям кніжкі... Думалася: замерзла дзяўчына, і больш нічога.

...З'явілася нечаканая слабасць пасля паездкі ў машыне па лясных дарожках... Думалася, што гэта ад паху бензіну, ад гайданняў па ўхабах.

...Не хацелася есці цэлымі днямі... Ну што ж?.. Ці мала бывае, што дзяўчаты харчуюцца на хаду, а часам і забываюць пра абед?..

І ўсё гэта павярнулася вось як... Крыўда адольвала і балела ў сэрцы, калі ўяўляліся тыя людзі, ад якіх нямала тут залежала. Даўно маглі даць лепшае памяшканне пад бібліятэку. Не далі.

Скажам цяпер ад сябе: не надта каго цікавіла здароўе і асабістае жыццё той бібліятэкаркі, пра якую толькі і ведалі:

— Ага, гэта тая?..

— Якая?

— Ну, што піша на ўсіх ды малюе.

— І частушкі складае.

Ніколі Ева не пісала на ўсіх, не было і таго, каб навяла крытыку на невінаватага. Але яна «не надта разбіралася ў кадрах», як сказаў аднаго разу старшыня пабудкома Запрагаеў. Калі чалавек давёў сябе да фельетона ці эпіграмы, то якую б пасаду ні займаў, усё роўна трапляў у газету.

У такіх абставінах як мог бы трымаць і адчуваць сябе, скажам, хоць той жа Адам Адамавіч Запрагаеў? У бібліятэку ён іншы раз заходзіў, хоць кніжак не браў. Бачыў, што там не толькі цесна, а і сыра, нават улетку. Зімой такі холад, што ногі і ў валёнках мерзнуць. Была там некалі печка, будаўнікі грэліся ў першую зіму работы, а цяпер комін разваліўся, дыміць.

Сам Адам Адамавіч не мог выдзеліць памяшканне, ён павінен быў бы ісці да тых, ад каго гэта больш залежала, і прасіць, патрабаваць. І вось зайшоў бы ён, напры-

клад, да Істужкіна, які быў тады галоўным інжынерам і часта замяшчаў кіраўніка трэста.

— А-а!.. Прафсаюзны бос! — усклікнуў бы той.— У чым справа?..

— Ды вось у чым. Я наконт памяшкання пад бібліятэку.

— А гэта бачыў? — спытаў бы Істужкін.— І паказаў бы спісак розных устаноў, якім таксама патрэбны памяшканні.

Тады Запрагаеў выняў бы з верхняй кішэні свой спісак на кватэры. Паківалі б адзін перад адным галавой, паўздыхалі б... І потым Істужкіну, напэўна, прыйшло б на памяць:

А хто гэта ў цябе там над кніжачкамі?

— Дык хіба не ведаеш?

— Ах, гэта тая самая, што...

— Тая самая.

— Ну, знаеш, і адкапаў жа ты скарбік!

— Прыслалі, сам не шукаў. Вось калі б сам падбіраў, то...

— Яна, значыць, цябе ў газетку, малюначак на асмяянне абывацелям... А ты ёй ужо, мабыць, і кватэрку, і камфорцік на рабоце... А прыгледзься як след: можа яна ящчэ і не на тым месцы, што трэба? Мала што прыслалі! Каго толькі не пасылаюць на новабудоўлю!

— З дыпломам яна... Сам бачыў. Вышэйшая адукацыя.

— Якая?

— Бібліятэчная.

— Ну што гэта за адукацыя?..

І выйшаў бы Адам Адамавіч з кабінета разгублены і збянтэжаны.

Падказаў бы нехта ўрачу Вікенцію Львовічу Папурыну (бо сам ён не меў асаблівай звычкі здагадвацца), што трэба агледзець умовы работы ў бібліятэцы. Тады б ён нерш-наперш успомніў, колькі разоў бываў на такіх аб'ектах, як сталовая, бытавы камбінат, інтэрнаты рабочых. За сталовую неяк яшчэ можна было б адгаварыцца: туды хадзіў абедаць, іншы раз браў сёе-тое з буфета. Калі вельмі ўжо спаўзлі на вушы валасы, то заходзіў і ў бытавы камбінат, бо там была цырульня.

А вось з інтэрнатамі ўсё выглядала інакш. Вікенцій Львовіч — чалавек ціхі, не любіць турбаваць людзей і

пазбягае ўласных турбот. А заідзі ў інтэрнат, дык там столькі насыплюць, што на месяц клопатаў хопіць.

Дык вось, ні разу ён яшчэ не быў у інтэрнатах, а ў бібліятэку раптам пайшоў бы. Якая логіка?..

Можна было б даручыць пазваць бібліятэкарку ў амбулаторыю на прафілактычны агляд, паколькі чуткі даходзілі, што ўмовы работы ў яе нялёгкія. Але чаго зваць, калі сама не ідзе? Тут нельга адбіцца ад тых, што гатовы б і начаваць у бальнічных калідорах.

Акрамя таго — пазаві, вышлі запрашэнне!.. Хто яе ведае, калі яна збярэцца зайсці. Раптам з'явіцца ў такі час, што калідор будзе не вымыты або ў рэнтгенакабінеце пачуецца пах спірту. Як ні хавае Вікенцій Львовіч гэты «службовы прэпарат» у сваёй шафе, усё роўна ён пакрысе выпараецца.

І вось калі пакуль што не было заметкі ў газеце, то пасля гэтага яна абавязкова будзе. А потым і карыкатура і частушкі!.. І хоць бяры ды ўцякай тады з горада...

Прыкладна такія думкі і меркаванні ўвесь час і трывожылі Высоцкага ў дарозе. Што далей, то ўсё больш і больш трапляласяі сустрэчных машын, і толькі цяпер прыйшла здагадка, што сёння субота, кароткі дзень. Як хутка прайшоў гэты тыдзень!

Можа і ўсе гэтыя людзі, што так спяшаюцца ў горад, толькі нядаўна даведаліся, што можна раней скончыць работу, а заўтра і ўвесь дзень адпачываць. Каму не хочацца вымеркаваць лішнюю вольную гадзіну? Усе машыны ідуць на вялікай хуткасці, так што толькі і глядзі, думаць ды разважаць тут ужо асабліва не будзеш.

...Ледзь не ў прыцірку шмыганула адна «Пабеда». Перад гэтым яна абагнала пярэднюю машыну і толькі паспела крыху ўзяць управа, каб прапусціць сустрэчную. Яшчэ нават сігналіць не перастала.

«Ліхачыць нехта,— падумаў Высоцкі і праз люстэрка глянуў на нумар.— Як ні спяшаецца, а ўсё ж так гнаць нельга. Ды яшчэ з парушэннем правіл».

Нумар здаўся знаёмым, але не паспеў Леанід Аляксандравіч прыкінуць у памяці, чыя гэта машына, як насустрач прашумеў «газік», і таксама з сігналамі і, бадай, на самай апошняй хуткасці. Гэтую машыну Высоцкі пазнаў, на ёй ездзіў начальнік трэстаўскай аўтабазы.

Праз нейкую хвіліну падала рэзкі і доўгі, нібы пажарны, сігнал яшчэ адна сустрэчная машына. Высоцкі

ўзяў шчыльней да абочыны, знізіў хуткасць, і ў гэты час пачуў за сабою пранізлівы піск тармазоў. Ён спыніўся, падумаўшы, што здарылася нешта непрыемнае. Адчыніў дзверцы і ўбачыў, што машына заварочваецца. «Аўтаінспекцыя?» — чамусьці мільганула ў галаве, хоць ніякіх парушэнняў за сабою не адчуваў.

Тым часам вадзіцель моцна газануў і выруліў на хаду на правы бок. Потым ужо на адной інерцыі падкаціў ледзь не ўпрытык да «Масквіча».

Дзверцы «Пабеды» рыўком адчыніліся, і адтуль саскочыў, нібы выкаціўся, Кажушка, начальнік другога будаўнічага ўпраўлення.

— Я заўважыў знаёмую машыну...— яшчэ здалёк працягнуўшы руку, загаварыў ён,— і рашыў... Адкуль гэта вы?

— З Мінска,— адказаў Высоцкі.— А вы туды?

— Туды. Рашылі ў вольную гадзіну наведацца... Сем'і там, знаеце, кватэры...

Шафёр між тым выйшаў з кабіны і пачаў абстукваць нагой далёка не новыя скаты.

— Чаго так гоніце? — тут ужо амаль прафесійна спытаў Высоцкі.— Рызіна ў вас не зусім надзейная... Ды і машына ўжо...— Ён ступіў некалькі крокаў да кузава, каб глянуць на спідометр.

Шафёр змаўчаў на першы момант, а Кажушка рашыў паказацца больш шчырым і прасталінейным:

— Там нашы ўперадзе,— нібы свайму кампаньёну, прызнаўся ён.— Выехалі разам, дык хацелася б...

— Хто адстане, з таго...— памкнуўся ўжо дадаць і шафёр, але Кажушка зыркнуў на яго, і хлапцу запяло.

— У пярэдніх машынах, хто там?

— Каробкін, Струк, яшчэ некаторыя.

Падышоўшы да пярэдняга сядзення, Высоцкі больш адчыніў дзверцы і зусім нечакана для сябе адчуў застаялы пах не бензіну, як гэта часта бывае ў недагледжаных машынах, а самага звычайнага спірту. Глянуў у кузаў і ўбачыў там на заднім сядзенні Папурына. Ён сядзеў у раскошнай позе, крыху падаўшыся плячыма ў куток і шырока расставіўшы тоўстыя калені. Пакуль не спынілася машына, ён напэўна драмаў. І цяпер яму, мабыць, вельмі хацелася спаць, таму не вылез з машыны і нават не змяніў сваёй пастаўы. Твар ільсніўся — здавалася, што нажытая спакоем тлустасць выступала нават на паверхню.

— І ваша сям'я ў Мінску? — не хаваючы здзекліва-га тону, спытаў Высоцкі. Паглядзеў на ўрача — і ледзь не затросся ад нейкай нясцерпнай крыўды і болю. Рукі самі цягнуліся, каб схапіць яго за абвіслую, густую чупрыну, выцягнуць з машыны ды спытаць пры ўсіх тут, як лечыць ён людзей, як клапоціцца аб іх здароўі... Чаму не ведае, што адзін харошы чалавек трапіў з-за яго ў вялікае няшчасце, ды можа на будоўлі і не адзін гэтакі чалавек?..

Панурын маўчаў: відаць, па сваёй тугавухасці не пачуў пытання. А Кажушка адразу заступіўся.

— Гэта ён з намі... У горад чалавеку трэба.. Медыкаменты, сёе-тое...

— Скажыце яму, калі прасніцца,— сурова прамовіў Высоцкі,— што я прашу ў панядзелак пасля абеду зайсці да мяне. А цяпер едзьце, бо далёка адстанеце.

— Не адстанем,— бадзёра запэўніў Кажушка і звычным жэстам абцёр зусім аблыселую галаву.— Мы не прывыклі адставаць! У панядзелак тэхнічная нарада. Так?
Высоцкі кіўнуў галавой.

— Будзем роўна ў дзевяць!

## VIII

— Ты куды, Аленка?

— Да Волькі па Гуляева!

— Эх вы, гуляеўцы!..

Ён пачуў гэта, ідучы па новай вуліцы, і не мог не спыніцца. Галасы звонкія, дзіцячыя, але яны нагадалі тыя часы, калі вясёлых галасоў тут не чутно было: фашысцкія гарнізоны былі расстаўлены ўсюды.

І ў тыя часы людзі чулі гэтае імя: Гуляеў. Чулі таксама і часта паўтаралі надзейнае слова «гуляеўцы».

Партызанскі камандзір Гуляеў, як і Бранавец, змагаўся з акупантамі ў гэтых месцах. Ён загінуў у гераічнай барацьбе, і наш урад пасмяротна прысвоіў яму званне Героя Савецкага Саюза.

Гуляеў загінуў, але асталіся гуляеўцы. Іх прыходзіла ўсё больш і больш. Тут была арганізавана партызанская брыгада імя Гуляева, яна ваявала з фашыстамі да поўнай перамогі...

— А вы бранаўцы! — адказала Аленка.

Гэтыя вуліцы недалёка адна ад другой.

Дзяўчынкі зусім не папракалі адна адну, яны нават і не думалі сварыцца. Аленка была круглатварая, тоўсценькая, у кароткай сукенцы і ўся да таго загарэлая, што, здавалася, сонца толькі і свяціла на яе адну.

Як звалі другую, Высоцкі не ведаў: тут бегала многа дзяцей, і ўсе, мабыць, з вуліцы Бранаўца. Калі не адтуль, то з Гуляева або Заслонава. У горадзе некалькі партызанскіх вуліц. Яны малалеткі, як і Аленка.

Бегайце, гуляйце, маленькія гуляеўцы і бранаўцы! Вы маеце на гэта права!

Пабегла на Гуляева Аленка, пайшоў следам за ёю і Высоцкі. Аленка ўжо, мабыць, і жыла на вуліцы Бранаўца, а Леанід Аляксандравіч заходзіў сюды на ўчастак Віктара.

Ужо больш за месяц прайшло з таго часу, як Высоцкі завёз у Мінск Еву. Нядаўна быў там зноў, наведваўся ў бальніцу.

...Ад'язджаў, дык за вароты выйшла старэнькая нянька ў белым халаце і чорных стаптаных чаравіках. Пра яе Ева гаварыла, што яна часам і харчуецца разам з хворымі, бо ніякай інфекцыі не прызнае.

— Мне Евачка расказвала пра вас,— чамусьці азірнуўшыся на вароты, ціха загаварыла яна.— Бачу, што вы перажываеце, хвалюецеся вельмі. Дык я хацела вам сказаць, каб не перажывалі. Паверце, я ўжо тут пятнаццаць гадкоў, і якіх толькі хворых не бачыла!.. Ева папраўіцца: я па характару бачу. А тут галоўнае — характар. Яна ж у нас і спявуха, і танцорка, і газету малюе. А сціфá як пачне расказваць, дык уся палата слухае.

— Здароўе як у яе? — заклапочана спытаў Высоцкі.— Галоўнае — здароўе.

— Па здароўю, то яшчэ слабенькая,— прызналася бабуля.— Але гэта нічога...

...Віктар Бранавец за гэты час пабудаваў вялікі новы дом, на яго вуліцы многа прыбавілася наваселаў, а Ева ўсё яшчэ слабенькая. Там, у бальніцы, выходзіць газета, там людзі чуюць вясёлы дзявочы голас. Гэтаму можна верыць — сапраўды Ева такая. Але ж тут, на новабудоўлі, ужо даўно няма ніякай сценгазеты. Ужо даўно не чутно нідзе Евінага голасу...

Аленка прыбегла на вуліцу Гуляева і знайшла там сваё таварыства. Запчабяталі, заспрачаліся аб нечым дзяўчаткі і памчалі да маладога парку. Ён непадалёку

ад вуліцы Гуляева. Тут былі ўжо лавачкі, спартыўная пляцоўка, некалькі забавак для дзяцей і нават фантанчык.

Высоцкі сеў на лавачку. З завулка насупраць выйшаў Панурын, відаць, заходзіў у інтэрнат. Прасунуўся ледзь не побач і не падняў галавы, не павітаўся. Пасля той размовы, што адбылася паміж імі ў кабінеце Высоцкага, урач пазбягае сустрэч. Хоць і не падначалены, а ўсё ж, відаць, саромеецца глянуць у вочы чалавеку, які сказаў чыстую ды балючую праўду.

Яно і добра, што не спыніўся, а то невядома, пра што б яны цяпер маглі гаварыць. Больш за ўсё Высоцкаму хацелася пабыць аднаму. Вось толькі дзеці няхай тут бегаюць, гуляюць — яны не перашкодзяць.

Дзень быў гарачы ад сонца і ад работы. I не шкада было, што ён праходзіць, не было такога адчування, што канчаецца не ў пару. Многа зроблена за гэты дзень, і ўжо адольвалі думкі пра заслужаны адпачынак,— у мінулую ноч амаль зусім не давялося адпачыць. Перад вечарам прыйшоў у кабінет галоўны інжынер завода жалезабетонных вырабаў, потым запрасілі Кажушку. Пачалі ўдакладняць канструкцыю клееных арак для складаў пад сільвініт і засядзеліся амаль да відна. Калі Леанід прыехаў дадому, яго матуля ўжо тупала каля хаты з кіёчкам і палівачкаю ў руках і апырсквала мяту, якая ледзь не раўнялася з вокнамі.

...Насупраць той лавачкі, дзе сядзіць Высоцкі, гарадскі фантан. Гэта самае ўлюбёнае месца тутэйшых дзяцей. Нават і з навакольных вёсак часам прыбягаюць малыя, каб паглядзець на імклівыя, празрыстыя струменьчыкі ды падставіць пад іх руку, а калі можна, то і галаву.

Вада ціха і суразмерна льецца ў цэментаваны басейн. Калі дзеці не вельмі крычаць ды смяюцца, то Высоцкаму добра чуцён гэты шумок фантана. Ён заспакойвае, можа нават хіліць на дрымоту.

Вакол басейна многа зеляніны, і ўся яна добра расце, бо сюды падаюць кроплі вады. Вельмі ж разнастайная тут зеляніна, мабыць самасейка. Аднак, прыглядзеўшыся, Высоцкі заўважае, што сярод пустазелля ёсць і мятка, і нават не палявая, а самая сапраўдная. Ён устае, зрывае каліўца і зноў садзіцца на ранейшае месца. I калі пачынае нюхаць, то перад вачыма паўстае маці са сваім неразлучным кіёчкам у руках. Уявілася, што гэта яна і

тут пасеяла мятку, толькі не дагледзела яшчэ пакуль што, не прапалола.

— Чаго так задумаўся? — раптам данёсся збоку голас.

Леанід Аляксандравіч павярнуў галаву і ўбачыў, што да яго ідзе Жамчужны.

— Не перашкоджу?

— Ты не перашкодзіш,— прыветна сказаў Высоцкі і трошкі адсунуўся на лаўцы, даў месца.

Жамчужны сеў, потым павітаўся за руку. Быў ён ужо да бронзы загарэлы і можа таму выглядаў зусім свежа і молада. У параўнанні з ім Высоцкі здаваўся бледным, і асабліва наказвалі кантраст іхнія рукі, калі апынуліся адна пры адной. Мужчыны былі ў тэнісках, у абодвух рукі па локаць аголеныя, але ў Жамчужнага нават локаць пакрыўся густым загарам, а да Высоцкага быццам ён і не прыставаў.

— Што, усюды пешачком сёння? — глянуўшы на яго вельмі запыленыя штыблеты, спытаў Мечыслаў Юльянавіч.

— Сваю аддаў Струку,— паведаміў Высоцкі,— на прафілактыку. А з «газіка» шафёр папрасіўся на выхадны.

— Відаць, і на нагах тое самае, што тут? — Жамчужны паказаў на яго далонь з мазалямі.— Таму і сеў... А можа дзецьмі залюбаваўся?

— Ты ўгадаў,— згадзіўся Высоцкі.— Бачыш, вунь дзяўчынка кругленькая, уся як запечаная, аж бровы выгаралі ад сонца. Гэта Аленка. Мы разам прыйшлі сюды з вуліцы Брапаўца. І вось цяпер сяджу, слухаю іхняе шчабятанне.

— Быў я сёння на заводзе,— пачаў Мечыслаў Юльянавіч, сагнаўшы з твару бесклапотную і крыху паблажлівую ўсмешку.— Бачыў тваю вынаходку... у рабоце... Ну што ж? Я табе веру! Але глядзі, каб не падвялі выканаўцы.

— Вось і гляджу! — падхапіў Высоцкі.— Гляджу кожны дзень.— Ён падняў правую руку і памахаў ёю ў паветры, нібы хочучы астудзіць яшчэ зусім свежыя, а таму і пякучыя мазалі.

— Сёння клей правяраў... Спецыяльны. Колькі нерваў каштавала, пакуль дастаў яго. Учора склеілі некалькі пластоў дошчак, сёння адрэзалі кавалак і спрабавалі раскалоць. Білі хлопцы па чарзе: адзін калун пашчарбі-

лі, у другім тапарышча паляцела, а склеены чурбак не паддаўся. Дошкі сыплюцца пасярэдзіне, а клей — як жалеза. Тады ўзяўся я сам. Некалі на лесараспрацоўках усякі камель мяне пабойваўся. Не ад сілы, а ад вока; трэба ведаць, куды секануць, дзе яго найбольш слабае месца. Сем патоў з мяне выйшла, вось нават мазалі панаганяў, а склеены кавалак, як на зло, вытрымаў. Ну, мне было больш радасна, чым злосна: цяпер ужо ведаю, што на гэты клей спадзявацца можна.

— Я слухаў твой даклад на тэхнічнай нарадзе,— сказаў Жамчужны. Сказаў і змоўк, нібы пачаў нешта абдумваць. А ў памяці Высоцкага мільгнулі штрышкі гэтай нарады.

...Кіраўнік трэста Яўмен Захаравіч Крывашын, чалавек ужо з падазронай вагою і валідолам у кішэні, не вельмі стараўся браць у галаву штосьці занадта спрэчнае і складанае. Ён разумеў, што ўсё тут вырашаць і без яго, а рызыкі і адказнасці ў гэтым выпадку не баяўся. З заведзенай практыкі ведаў, што за правалы ў такіх справах б'юць перш за ўсё галоўнага інжынера, а не кіраўніка трэста. Таму сядзеў спакойна на мяккай канапе і можа нават не вельмі слухаў, пра што гаварылі інжынеры, аб чым спрачаліся. Адзінае жаданне часам узнікала ў яго: калі б хоць трохі дазвалялі тэрміны, узяць бы гэты арачны праект сабе ў кабінет на адлежванне. Паляжаў бы ён у шуфлядзе хаця б з тыдзень, а там відно было б, што з ім рабіць, куды павярнуць справу.

Каробкін таксама не праяўляў асаблівай актыўнасці, а спрэчкі па праекту больш за ўсіх разводзіў Кажушка, начальнік таго будаўнічага ўпраўлення, якое несла адказнасць за прамысловыя аб'екты. Ён канечне ж ведаў з вопыту аналагічных промыслаў, што калі пабудаваць склады па праекту Высоцкага, то яны больш паслужаць, бо соль нават бетон раз'ядае, а дрэва — не. Але ж калі яшчэ будуць гэтыя драўляныя аркі? Калі іх зацвердзяць у вышэйшых інстанцыях? Усё гэта можа зацягнуцца, і тады ўжо не разлічвай на прэмію за датэрміновае выкананне плана. І між тым у аўтамагазіне падыходзіла чарга...

— Вы ўсё-такі інжынер! — сказаў яму тады Высоцкі.— Як вы не разумееце, што цяпер нельга будаваць так, як нават два-тры гады назад?! А салікамскія і беразнікоўскія склады будаваліся значна раней.

— І ўсё-такі служаць! — уставіў Кажушка.

— А вы ведаеце, як служаць? Вы былі цяпер там?

— Цяпер не быў, але знаю!

— Нічога не знаеце, калі не былі! Людзі там мучацца з гэтымі складамі, бо соль не мілуе нічога — кожны год рамонт. Я сам усё гэта бачыў нядаўна.

Высоцкі гаварыў з запалам і з такой перакананасцю, што цяжка было яму пярэчыць, але Кажушка трымаўся свайго. Тут перш за ўсё ўпартасць яго і самалюбства разыграліся, але мела значэнне і тое, што, можа нават спіпаю сваёй, ён адчуваў маўклівую схільнасць да яго Крывашыпа і некаторых іншых, што тут прысутнічалі. Таму хітравата і самападзейна жмурыў вочы, таму і паварочваў голую, без адзінай валасінкі, галаву то да аднаго аднадумца, то да другога. Чырвоная і трошкі потная патыліца, шырэйшая за цемя галавы, раз-пораз перамеждвала свае тоўстыя складкі.

На Жамчужнага Кажушка не глянуў ні разу. Можа таму, што не лічыў яго спецыялістам у гэтай справе, а хутчэй за ўсё — не спадзяваўся, што сакратар парткома не адчувае пазіцыі кіраўніка трэста. І выйшла зусім неспадзяванае. Ведаў Жамчужны думку Крывашыпа ці не ведаў — гэта яго справа, а ўзяў ды выступіў, і без ніякіх агаворак падтрымаў Высоцкага.

Пасля гэтага складкі на Кажушкавай патыліцы нібы застылі і крыху разгладзіліся: ён апусціў галаву і стаў глядзець толькі сабе пад ногі.

— Я задаволены, што ты падтрымаў мяне тады,— сказаў Леанід Аляксандравіч, пагдядаючы на Аленчына таварыства, якое гулліва шчабятала ўжо каля самага фантана.— Крывашып ледзь не драмаў на канапе, але я ведаю, што некаторыя вельмі любяць чытаць яго нават прытоеныя думкі.

— Мая падтрымка, відаць, мала паможа табе,— неяк вялавата азваўся Мечыслаў Юльянавіч.— Асабліва ў канкрэтных справах, бо яны ж ведаюць, што я толькі настаўнік, ды яшчэ вясковы. Аднак самую ідэю, творчую, цікавую, я заўсёды буду падтрымліваць. Значыць, і цябе. Прадумай толькі ўсё, каб не было потым якіх нечаканасцей. Там гаварылі мне дзяўчаты, клеевікі тваё: «Як жа ён потым выбавіць такую махіну з цэха? На чым павязе на будоўлю, калі кожная паўарка трыццаць тры метры даўжынёю?»

— Гэта ўжо знойдзена,— спакойна заявіў Высоцкі.— З цэха яна лёгка выплыве, а на аб'ект паедзе на маленькіх спараных санках. На іх некалі нашы бацькі доўгае бярвенне вазілі.

— У нас чамусьці іх звалі «сучкамі», — успомніў Жамчужны і засмяяўся.

— У нас таксама,— пацвердзіў Высоцкі.— Можа таму, што яны заўсёды прывязваліся ззаду, да капылоў вялікіх саней, і віхлялі на дарозе, калі конь бег улегцы. А наогул, то старыя людзі ведалі, што рабілі. Пакладзі доўгае бервяно на такія ж доўгія сані — ніякі конь не пацягне. Гэтак жа і трактар па зямлі...

Жамчужны зноў на нейкі час быццам задумаўся ці загледзеўся на дзяцей, а потым усёй сваёй спартсменскай постаццю павярнуўся да Леаніда Аляксандравіча і спытаў:

— Скажы мне, калі ласка, толькі шчыра: адкуль у цябе паявілася ідэя арачных збудаванняў? Ты дзе-небудзь вычытаў пра гэта ці бачыў, чуў?

Высоцкі чакаў такіх пытанняў ад некаторых сваіх калег, таму па тэорыі ведаў, што адказаць. Але неспецыялісту, ды зусім блізкаму чалавеку рашыў паведаміць і сёе-тое практычнае.

— Што соль можа мірыцца толькі з дрэвам,— пачаў ён з добрай, таварыскай усмешкай,— пра гэта ведалі яшчэ нашы далёкія продкі. Што ў складах для сільвініту павінна быць вялікая прастора — пра гэта ведаюць усе цяпер: там размесціцца складаная канвеерная тэхніка. Астатняе прыйшло з некаторага вопыту... з мінулых год...

— Аленка, Аленка,— неяк залішне гучна пачаў клікаць Жамчужны.— Ідзі сюды, нешта скажу!

— Дзяўчынка спынілася каля басейна, пачала глядзець на абодвух «дзядзькаў», аднак не надта даверліва.

— Ідзі сюды! — памахаў Жамчужны абедзвюма рукамі. Ідзі.

Спыніліся і глядзелі ў гэты бок ужо ўсе дзеці, а Аленка нясмела пайшла да лавачкі.

— Ну, здрастуй! — сказаў Жамчужны і выставіў шырокую загарэлую далонь.

Дзяўчынка спачатку абцерла сваю руку аб сукенку, а потым маўкліва падала.

— Давай пазнаёмімся,— прапанаваў Мечыслаў Юльянавіч.— Прозвішча тваё як?

Дзяўчынка маўчала, і ў яе круглых сінявымых вачах было столькі шчырай разгубленасці, што Жамчужнаму нават цяжка было вытрымліваць такі пагляд.

— А як завуць твайго татку, ведаеш?

Дзяўчынка зноў нічога не сказала, вочы затуманіліся, пачала маргаць часта і дрыготка.

— На табе мятку, — сказаў Высоцкі. — Папюхай, як хораша пахне! Яна расце там, каля фантана, ідзі нарві сабе букецік!

Аленка пабегла, а Жамчужны ў першую хвіліну не знаходзіў нават, што сказаць.

— Вось і пазнаёміліся... — паспрабаваў пажартаваць Высоцкі, але Мечыслаў Юльянавіч усё яшчэ маўчаў. Ён з цікавасцю, але задумліва назіраў, як Аленка падбегла да свайго таварыства, усім дала папюхаць мятку, а потым яны гуртам пачалі рваць сабе букецікі.

— У яе, мабыць, няма бацькі, — прамовіў нарэшце Жамчужны.— Ты адчуў гэта?

— Дык відно ж было па вачах... І наогул...

— Так... Сапраўды, вочы... А магла ж і схлусіць?.. Праўда?

— Не, яна не магла схлусіць.

— Назвала б якое-небудзь прозвішча або якое-небудзь імя бацькі... Ну, проста адчэпнага...

— Не такая дзяўчынка.

— А падрасце, будзе хлусіць? Як ты думаеш?..

Жамчужны засмяяўся, але не так, як заўсёды, весела і задорна, а неяк стрымана і нават з болем.

— Дарэчы, я трохі здагадваюся, чыя гэта дачушка, сцішана загаварыў ён.— Памятаеш, была ў нас пры штабе брыгады разведчыца Наташка. Тоненькая і невялічкая, як падлетак...

— Не, не помню,— сказаў Высоцкі.— Там у вас многа было дзяўчат.

— Ну, гэтую ты не мог не заўважыць... Хіба забыў? Дык вось, яе раніла ў нogі, і з таго часу на пратэзах... Замуж, канечне, не выйшла, жыла ўсе гады адна. А некалькі год назад з'явілася ў яе дзяўчынка, і ніхто добра не ведае, нарадзіла яна яе ці ўзяла з раддома. Дык гэта, мабыць, тая самая дзяўчынка. Ты адкуль ведаеш яе імя?

— Чуў. Клікалі дзеці.

— Сумуеш, хілішся да дзетвары... Даўно заўважаю гэта. Яны тут штодня... Трэба падказаць пасялковаму са-

вету, каб пляцоўку абсталявалі. Помніш, што некалі было на гэтым месцы?

— Дзот тут недзе стаяў,— адказаў Высоцкі.— Толькі не памятаю добра, у якім пункце.

— Ды вось жа тут, дзе гэты фантан, — удакладніў Жамчужны.— Пры мне ўзрывалі рэшткі фундамента.

Праз некаторы час да фантана падышла жанчына, стройная, прыгожая, у блакітным сарафанчыку.

— Аленка! — ласкава пазвала яна.— Поїдзем ужо дадому!

Аленка ў гэтую хвіліну была вельмі занята гульнямі і не бачыла, як падыходзіла мама. Пачуўшы яе голас, азірнулася і з радаснымі воклічамі пабегла насустрач.

— Глядзі, які ў мяне букецік! Глядзі! На панюхай!

Жанчына падхапіла малую на рукі, спачатку абцалавала смуглыя шчочкі-мячыкі, а тады панюхала букецік.

— Хараша пахне,— ухваліла маці.— Дзе ж ты нарвала мяткі?

— Во тут! — Аленка паказала на фантан.

— А можа тут няможна рваць?

— Дзядзя сказаў, што можна.

— Які дзядзя?

— Вунь!

Жанчына глянула ў той бок, дзе сядзелі мужчыны, і ўдзячна ўсміхнулася. Потым падышла бліжэй да фантана. Імклівыя струменьчыкі іскрыліся ў косых чырванаватых праменнях, і здавалася, што гэтыя іскры абсыпалі жанчыну. Яна працягнула руку да самага блізкага струменя, і Высоцкаму відно было, як адразу намакрэла яе далонь. Аленка таксама выставіла сваю руку...

Потым, нібы набраўшы поўныя жмені халодных іскрынак, яны пайшлі на вуліцу Бранаўца, мабыць, дадому. Аленка злезла з матчыных рук і жвава тупацела побач. Жанчына ішла роўна і ўпэўнена, злёгку памахваючы мокрай рукой.

— Не яна? — ціха спытаў Леанід Аляксандравіч.

— Яна,— адказаў Жамчужны.

Некалькі хвілін пасля гэтага мужчыны сядзелі моўчкі.

Высоцкі ішоў дадому перад захадам сонца. Пачуццё адзіноты чамусьці не пакідала яго, хоць і прабыў поўны

час з блізкім чалавекам і гаворка ішла сяброўская, не без цікавасці і не без душы. Нечага ўсё ж не хапала, і гэтае нешта было такое моцнае і трывалае, што нельга было заглушыць ні работай, ні самымі цёплымі сустрэчамі і размовамі з сябрамі. З кім ні сустракаўся, з кім ні размаўляў з самым душэўным пачуццём, усё роўна заставаўся асадак нейкай нездаволенасці і суму. Амаль кожны раз пасля такіх сустрэч успаміналіся ранейшыя сустрэчы, нават выпадковыя... Ад іх потым і ў сне хацелася спяваць...

Параўняўшыся з паваротках на галубоўскі мосцік, Высоцкі нібы міжвольна прыпыніўся, пастаяў з хвіліну, а потым зноў жа не зусім наўмысля рушыў па гэтай дарожцы. Калі і было падсвядомае імкненне, дык гэта яшчэ раз прайсціся па кладках мастка ды зблізку паглядзець на поплаў, які ўжо стаў трохі жаўцець ад сухаватых дзён.

...На мосціку зусім нічога не змянілася: тыя самыя прадоўжныя масніцы, толькі дзве, гэтак жа яны ківаюцца, калі ступіш на іх. Здалося, што вось зараз і пачуецца на іх імклівы і лёгкі стукат абцасікаў.

Ішоў па гэтых масніцах павольна, быццам намацваў, куды ступіць, быццам наўмысля затрымліваўся, каб лепш уявіць і мацней адчуць мінулае. А перайшоўшы, накрочыў па галубоўскай вуліцы.

Вечарэла. У садку крайняга двара ўсаджваліся на нізкарослую яблыню куры. З хлеўчука насупраць выйшла бабуля з прутам, паспуджвала іх адтуль, каб ішлі ў катух і не псавалі дрэўца. А яны ўзнялі кудахканне і лямант на ўсю Галубоўку. Далёка ўжо быў Высоцкі, а ўсё чуў гэтую курыную трывогу.

...Паказалася таполя, што нібы ляжала цераз вуліцу. Крона яе падрасла і больш падалася ўгору. Каля плота пад таполяю павінна быць лавачка, дзе некалі сядзела Ева. Не адна сядзела. Але не гэта кранула тады душу, а тое, што ўстала, заўважыўшы, што прайшла поруч ледзь не да самай Арабінкі.

Чым бліжэй падыходзіў Высоцкі да таполі, тым усё больш адольвала яго нейкая боязь гэтага месца. Памкнуўся нават вярнуцца, бо ўжо здалёк заўважыў, што на лавачцы нехта сядзіць. Аднак жа і такую нерашучасць праяўляць не хацелася: «Няхай сядзіць, каму трэба. Можна ж прайсці і ў той бок не глянуць».

І ўсё ж глянуў на лавачку, і ўсё ж заўважыў, што там сядзеў Вілен Перапечка ў абдымку з нейкай дзяўчынай.

Гэта так уразіла, што спыніўся, паглядзеў на яго праніз-ліва, з нянавісцю, і вярнуўся назад, далей па вуліцы не пайшоў.

...Зноў масцік, зноў у памяці Евіны крокі, але ўжо не такія імклівыя і лёгкія. «Добра, што хоць не на яе вачах, што не ведае пра гэта. Мабыць, цяжка было б перажыць пры яе цяперашнім становішчы».

І пайшоў у Арабінку праз поплаў, тым самым напрамкам, якім ішоў некалі з Еваю...

## IX

— Малаткі, малаткі!.. Давай таскай!..

Воклічы даносіліся з прачыненага пакоя камітэта камсамола, а насупраць, у прыёмнай Жамчужнага, сядзелі дзяўчаты і смяяліся.

— Што ён там гаворыць? — дзівілася сакратарка Высоцкага, якая зайшла да сваёй сяброўкі адвесці душу.— Чуш сабачая!

— А хто гэта? Генка?

— Не, не яго голас. Відаць, Валера дае некаму тэлефонныя дырэктывы.

— Ідзі зачыні дзверы!

У прыёмнай стала амаль зусім ціха, бо людзей тут не было, а ў самім кабінеце калі і адбывалася якая гаворка, то сюды не даходзіла. Усе найбольш значныя кабінеты ў трэсце былі адгароджаны ад прыёмных дубальтовымі дзвярыма са спецыяльнымі прыбудоўкамі, падобнымі на шафу.

Калі б хто моцна крыкнуў у кабінеце або стукнуў кулаком па стале, то не памагла б і прыбудоўка. Але ў кабінеце Жамчужнага ніколі не было крыку, не чулася і павышанага голасу. Сам Мечыслаў Юльянавіч заўсёды гаварыў з людзьмі ціха і памяркоўна, нікога асабліва не папракаў, не распякаў. Іншы раз нават і рэгламенту нікага не ўстанаўліваў: гаварыў з адным чалавекам, а астатнія, каму трэба ці не трэба, маглі сядзець тут жа ў кабінеце паабапал доўгага стала і слухаць або паціху размаўляць між сабою. Калі хто хацеў, то мог падысці і бліжэй, нават нахіліцца над пісьмовым сталом. З людзьмі Мечыслаў Юльянавіч адчуваў сябе лагодна і добра, ніколі не сумаваў і не надта заўважаў чыю-небудзь дакуч-

лівасць. Калі іншы раз і спяшаўся куды, то ўсё роўна гаварыў пра гэта так, што нікому не было крыўдна.

Часам Жамчужны пачынаў сумаваць і адчуваць ніякаватасць якраз у тыя хвіліны, калі ў яго кабінеце не было людзей. Тады, нават чытаючы ці пішучы, успамінаў якую-небудзь песню. Сакратарка непрыкметна прачыняла дубальтовыя дзверы-шафу і слухала. І так змянялася ў твары, так хваравіта крывілася, калі ў гэты час хто заходзіў у прыёмную.

Сёння амаль з самага ранку зайшло ў кабінет адразу некалькі чалавек. Сярод іх сакратарка заўважыла толькі старшыню набудкома Запрагаева і рэдактара шматтыражкі Пласковіча. Астатніх нават і не памятае, бо нікога не затрымлівала, не заводзіла ніякай чаргі. Так тут бывае амаль заўсёды, толькі калі ідзе пасяджэнне бюро, то даводзіцца некаторым трохі пачакаць у прыёмнай. Гэта, між іншым, самыя цяжкія дні для сакратаркі, бо каля яе сядзяць пераважна тыя, хто чакае вымовы або суровага папярэджання. Яны сядзяць моўчкі і вельмі многа кураць.

Забег у прыёмную сакратар камсамольскага камітэта трэста Генадзь Шчабятун. З вясёлай усмешкай павітаўся з дзяўчатамі і паказаў вачыма на дзверы кабінета.

— У сябе?

— Там,— адказала сакратарка Жамчужнага.

Генадзь зайшоў у шафу, тады для ветлівасці пастукаў у наступныя дзверы.

— Заходзьце! — пачуўся нечы голас, можа нават і не Жамчужнага.

У кабінеце амаль ніхто не звярнуў увагі на яго ўваход, толькі Мечыслаў Юльянавіч па-свойску кіўнуў галавой.

— У вас пасяджэнне? — тонам блізкага тут чалавека спытаў Генадзь.

— Ды не,— адказаў Жамчужны, агледзеўшы ўсіх.— Так вось... Па розных справах... А ў цябе што?

Хлопец наблізіўся да стала і зайшоў нават туды, дзе сядзеў Жамчужны.

— Узгадніць хачу... Толькі што ад машыністкі.— Ён разгарнуў скрутак і выняў адтуль дзве сколатыя паасобку дакладныя. Кожная — на некалькі лістоў.

— Аб чым тут? — спытаў Жамчужны, узяўшы ў рукі першую.

— Аб мерах па разгортванню культмасавай работы сярод моладзі.

— А яшчэ што?

— Гэта — аб мерах па выхаванню ўдарнікаў камуністычнай працы.

— Таксама ў абком камсамола?

— У абком.

— Можа і трэцяя ёсць? Там нешта ў цябе...

— Ды не-е...— разгублена прамовіў Генадзь, але аддаў Жамчужнаму і той плакатны ліст, у які былі загорнуты дакладныя.

Мечыслаў Юльянавіч паклаў усё гэта на стол перад сабою, прыціснуў шырокай, бронзавай ад загару далоняю і сказаў:

— Ніякіх дакладных ні пісаць, ні пасылаць я табе не раю, Генадзь. Ёсць у нас каму пісаць і без цябе. — Ён глянуў на Запрагаева.— Я ўпэўнены, што падобныя дакладныя ўжо напісаны і адасланы. Праўда, Адам Адамавіч?

— Кожны можа па сваёй лініі,— крыху пачырванеўшы, заўважыў старшыня пабудкома.

— Аднак па лініі камсамола, я думаю, не трэба.— Жамчужны акінуў вачыма ўсіх, хто тут быў.— Ды па лініі прафсаюза, відаць, таксама. Я вам скажу, калі хочаце, адкуль бярэцца гэтая ідэя дакладных. Ты сядай, Генадзь! Мне адзін мой прыяцель расказваў. З міністэрства нарыхтовак. Паехаў ён у калгасы. Не ў вобласці і раёны, як звычайна, а непасрэдна ў калгасы. У абласцях і раёнах заўсёды стараюцца расказаць пра лепшае, а калі і паскардзяцца на што, дык толькі намёкамі, каб не псаваць настрою. А ў калгасах, ды яшчэ адсталых, усё відно, як ёсць, само сабою: тут нічога не палепшыш, не пагоршыш.

І вось паездзіў гэты мой сябра па вёсках, пагледзеўся ўсяго і, вярнуўшыся дадому, страціў спакойны сон. Як лягу, кажа, у пасцель, так і пачынаюць успамінацца розныя недахопы... Чамусьці толькі недахопы. Варочаюся, кажа, усю ноч, а заснуць не магу.

Потым прыйшла ў галаву ідэя — напісаць пра гэтыя недахопы дакладную. Цэлы дзень пісаў, прыводзіў розныя факты... Увечары перапісаў начыста, адаслаў. Лёг спаць пасля гэтага і адразу заснуў!

Усе ў кабінеце засмяяліся. Запрагаеў яшчэ больш пачырванеў, а Генадзь толькі маргнуў разы два, быццам бы

вінаваты, і пачаў глядзець на Жамчужнага смела і незалежна.

— Павінен вам сказаць,— працягваў Жамчужны,— што ў гэтых адносінах — сіла-чалавек наш новы галоўны. Гэты пісаць ды скардзіцца не будзе. Убачыць непаладкі, цяжкасці — з ног саб'ецца, а дойдзе свайго.

Генадзь ужо трымаў пад сталом руку, каб узяць назад дакладныя, але Жамчужны быццам не заўважаў гэтага. Выказваючы свае адносіны да розных пісанін, ён раз-пораз прыгладжваў гэтыя дакладныя далонню і такім чынам трохі выпроствай іх, бо не мог спакойна глядзець на службовыя паперы ў трубках.

Калі скончыў гаварыць, то прыняў далонь з друкаваных лістоў і апусціў вочы, нібы намерваючыся прачытаць.

— Дайце, я яшчэ падумаю,— папрасіў Генадзь.

— Ага! — Жамчужны стаў перабіраць лісты пальцамі.— Правільна! Падумай, ды можа ўлічыш сённяшнюю нашу гаворку. А гэта што?

Шчабятун прыўзняўся над сталом і ўгледзеў плакатны ліст з малюнкамі і вершамі.

— Гэта? З архіва проста... Загорнуты былі дакладныя.

— З макулатуры, ты хочаш сказаць? — удакладніў Мечыслаў Юльянавіч.— Паглядзіце, таварышы, якая ў нашых камсамольцаў макулатура! Самы лепшы экземпляр «Мятлы»!

— Ды гэта...— паспрабаваў апраўдвацца Генадзь.— Выпадкова трапілася пад руку...

— Так і выпадкова не павінна быць! — без суровасці, аднак з пэўным патрабаваннем сказаў Жамчужны.— Глядзіце, што тут...— Ён разгарнуў ліст і паказаў усім.— Карыкатуры не горшыя, як у «Вожыку». Тут і пра інжынераў некаторых і начальнікаў участкаў. А подпісы якія, частушкі!..

Мечыслаў Юльянавіч павярнуў ліст да сябе і пачаў уголас чытаць некаторыя эпіграмы. Чытаў хораша, з прыемнай дыкцыяй, і не зніжаў голасу нават на самых вострых мясцінах.

Маўклівы рэдактар шматтыражкі раптам ад душы засмяяўся, быццам толькі цяпер пачуў гэтую сатыру. У тон яму смяяліся і яшчэ некаторыя, пэўна ж, усё тыя, каму яшчэ не пападала ад «Мятлы». Запрагаеў сядзеў моўчкі, апусціўшы над сталом галаву. Потым выняў з верхняй

кішэнькі нейкія паперы, разгарнуў іх, разгладзіў далонню, як Жамчужны Генадзевы дакладныя, і зрабіў выгляд, што чытае.

— А чаму ўсё-такі не выходзіць такая газета? — раптам спытаў Мечыслаў Юльянавіч і даволі-такі строга паглядзеў на сакратара камсамольскага камітэта.

— Ну... вось... знаеце...— быццам не знаходзіў тых слоў.— Захварэла Ева Дым, паехала... Дык яно...

— А калі мы з табой захварэем? — зусім нечакана павярнуў гаворку Жамчужны.— Я, вядома, не хачу гэтага... Але...

— Нас лёгка замяняць! — з такой жа нечаканасцю адказаў Генадзь і пачырванеў. У зале пачуўся асцярожны смяшок.

— Правільна! — падтрымаў Жамчужны.— Я такой жа думкі — ты не бойся! А што ж яе, па-твойму, дык ужо і замяніць нельга?

— Цяжка,— з цвёрдай упэўненасцю сказаў Генадзь.— Так маляваць, як яна... І пісаць... Пакуль што не ведаю, каго б тут...

— Адам Адамавіч! — звярнуўся Жамчужны да Запрагаева.— Па-мойму, гэта і прафсаюза датычыцца: як ты думаеш наконт гэтага?

— Думаю, што знойдзецца чалавек! — адарваўшыся ад сваіх паперак, сказаў старшыня пабудкома.

— Чуеш? — Мечыслаў Юльянавіч зноў глянуў на Генадзя, але на гэты раз у вачах ужо мільгнула смяшынка.— Знойдзецца, значыць! Вось знайдзіце, арганізуйце, і каб газета ў нас была! А то пішаце дакладныя аб культмасавай рабоце... Як гэта можна спыніць такое выданне?!

— Ясна! — ціха сказаў Генадзь і, забіраючы з рук Жамчужнага паперы, уважліва паглядзеў яму ў вочы.

Хоць і малады яшчэ камсамольскі работнік Шчабятун, аднак ён ужо добра ўцяміў, што не ўсякае распараджэнне трэба абавязкова выконваць. Гэта залежыць ад тону, якім яно аддаецца, ад выразу твару, бляску вачэй і многіх іншых прыкмет.

Вось і намагаўся хлопец адгадаць: сапраўды патрэбна была Жамчужнаму сатырычная газета ці ўсё гэта гаварылася проста пад настрой? Успомніўшы пра надзейную ў такіх выпадках хітрыку «час пакажа», Генадзь сабраўся ісці, але Мечыслаў Юльянавіч яшчэ на нейкі час затрымаў яго.

— А як там цяпер гэтая дзяўчына? Дзе яна? Хто з вас ведае?

Генадзь ніякавата ўсміхнуўся, паказаўшы доўгія пярэднія зубы, і павярнуў галаву да Запрагаева. Жамчужны таксама спыніў на ім ледзь-ледзь смяшлівыя вочы.

— Мы нядаўна бюлетэнь паслалі,— сказаў старшыня пабудкома.

— Куды?

Запрагаеў маўчаў.

— Вось бачыце, таварышы!.. — пачаў Жамчужны, але ў гэты час зазваніў тэлефон, і ён узяў трубку. Твар яго паступова стаў чарсцвець, смяшынкі ў вачах патухлі.

— Так-так...— гаварыў ён быццам бы незнаёмым для ўсіх голасам.— Ясна... Калі?.. Ясна-ясна!..

Паклаў трубку, працёр твар, пачынаючы з ілба, памаўчаў з хвіліну, і калі ўзняў галаву, вочы зноў сталі пасміхвацца.

— Да нас прыязджае... — многазначна загаварыў ён і стаў глядзець чамусьці толькі на аднаго Запрагаева,— вельмі адказны чалавек... Ён цяпер у Мінску.

Запрагаеў адразу сабраў свае паперкі, устаў.

— Хутка? — голасам чалавека, якога паднялі на трызве, спытаў ён і падаўся да дзвярэй. Гарачай хваляй ударыла ў галаву думка, што там недзе і яму звоняць ды не могуць знайсці. А калі не звоняць, то самому трэба неадкладна пазваніць.

— Гэтымі днямі, — сказаў яму наўздагон Жамчужны і зноў узяў тэлефонную трубку, каб адказаць на званок.

Назаўтра Высоцкі не пайшоў зранку ў трэст, а завітаў на некаторыя аб'екты, бліжэйшыя ад яго дарогі.

Павярнуўшы на ўчастак Віктара Бранаўца, яшчэ здалёк убачыў, што на высокіх слупах аркі сядзіць па чалавеку. Потым стала відно, што і пад аркаю топчацца некалькі юнакоў.

«Камсамольцы,— падумаў Леанід Аляксандравіч,— Генка арганізаваў».

Але тут былі хлопцы толькі з Віктаравай брыгады. Яны пакуль што нічога значнага не рабілі, а пасміхаючыся, нібы жартам, трымалі ў руках хто партрэт, хто лозунг на чырвоным палотнішчы, хто транспарант. Некаторыя паглядвалі ўгору на верхалазаў, якія здымалі з папя-

рэчніка старое, зліняласе ад дажджоў і вятроў палотнішча, а на яго месца прымервалі новы, шырачэзны аншлаг.

Віктар таксама падышоў сюды.

— Нашто гэтулькі людзей на арку? — спакойна спытаў у яго Высоцкі.

— Хіба не ведаеце?

— Ведаю. Дык не гэта ж трэба. Вы лепш там, на аб'екце!..

— Там можа і не пабываць,— запярэчыў Віктар, але з такой выразнай усмешкай, што Высоцкі таксама засмяяўся.

— Тут, знаеце...— пачаў удакладняць брыгадзір.— Прыехаў з самага ранку Запрагаеў... І Генка з ім... Пачалі прасіць, каб усё гэта «правярнуць» хутка і аператыўна. Вось я і паслаў...

— Дык не гэтулькі ж... Тут двух чалавек даволі. У крайнім выпадку — трох.

— Пабудком заедзе, пакрыўдзіцца.

— Скажаш, што я даў каманду.

...Ідучы па новай вуліцы, Высоцкі зноў убачыў Аленку, але не адну: яна ішла насустрач, трымаючыся за руку сваёй мамы. Калі яны параўняліся, дзяўчынка, мабыць, пазнала яго і хацела прыпыніцца, але мама чамусьці тузанула яе. Потым Высоцкі адчуваў патыліцай, што Аленчына маці азіралася і глядзела яму ўслед, аднак не мог здагадацца, чым ён мог выклікаць яе цікавасць.

...Усюды на брукаваных і нават асфальтаваных вуліцах і дарогах з'явіліся рамонтныя брыгады. Месцамі яны засыпалі і зараўноўвалі такія яміны, да якіх нічые рукі не дайшлі б, можа, і ўсё лета. Гэта Высоцкаму падабалася: няхай папрацуюць дарожнікі, а то інačай іх сюды не загоніш.

Непадалёк, вакол клуба будаўнікоў, мітусілася некалькі чалавек. Яны ўпрыгожвалі фасад. Сярод іх Высоцкі заўважыў і старшыню пабудкома. Ён стаяў воддаль і энергічна падаваў знакі двум хлопцам, якія цягнулі на балкон вялізны святочны плакат.

— Што, мітынг? — спытаў у Высоцкага прахожы чалавек у шахцёрскай спяцоўцы.

...Будаўнічая пляцоўка камбіната з кожным днём разрасталася і цяпер выглядала такой велічна-грандыёзнай, што нязвычны чалавек мог адчуваць сябе тут, маг-

чыма, зусім маленькім і бездапаможным. Перш за ўсё гэта, мабыць, ад таго, што ён не мог бы адразу разабрацца, як тут што робіцца і які мае парадак.

Інжынеры, будаўнікі, напэўна, адчуваюць сябе інакш. Леанід Аляксандравіч яшчэ толькі краем прайшоў; здавалася, што не паспеў і агульныя контуры ўбачыць, адпак жа адразу заўважыў, што за раніцу з'явілася тут нешта незразумелае і недарэчнае, бо зусім няпланавае. Няхай сабе яно і маленькае, і непрыкметнае на фоне вялікіх аб'ектаў, але яму кінулася ў вочы.

Высоцкі збочыў са свайго раней намечанага маршруту і пайшоў да таго нязначнага, негаданага аб'екціка, які ўжо заяўляў аб сабе чатырма жалезабетоннымі слупамі.

— Што гэта такое? — спытаў у дзяўчат-бетоншчыц, якія стаялі тут.

Тыя паглядзелі адна на адну і чамусьці пачалі хіхікаць. Спачатку нясмела, сарамліва, а потым адна перад аднаю набраліся смеласці і зусім разышліся. У ахвоту насмяяўшыся, адна з іх сказала:

— Начальства лепш ведае. Вунь яно!

Высоцкі глянуў у той бок і ўбачыў, што да аб'екціка паспешліва шыбуе, выціраючы голае цемя, Кажушка. Высоцкі, трохі азадачаны смехам дзяўчат, пайшоў яму насустрач.

— У чым справа? — запытаў, не хаваючы абурэння.

— Што? — перапытаў Кажушка, быццам не ведаючы, аб чым ідзе гаворка.

— Ну вось!..— Высоцкі паказаў на аб'екцік.— Людзей з работы знялі!

— Яны робяць... Чаму ж?..

— Што робяць, я ў вас пытаю?! — сарваўся Высоцкі голасам.— Хто вам дазволіў здымаць людзей з пускавога аб'екта?

— Вы гэта сур'ёзна? — Кажушка неяк прыкра і злавесна змяніўся з твару, расчырванелы ад старання лоб пабляднеў, вусны задрыжалі.— Вы што, з неба зваліліся, нічога не ведаеце?

— Ах, гэта ў сувязі... А нашто яно?

— Як нашто? А вы былі ў той іхняй раздзявалцы? Ведаеце, як яна выглядае? Там шчыліны — палец лезе, бруд і сырасць! Шахцёры ж і цяпер выходзяць мокрыя, бо ў ствалах цячэ.

— Вось няхай шахтбуд і падумае, як навесці там парадак. А вы сваіх людзей вярніце на аб'екты. І зараз жа!

— Не магу!

— Я патрабую!

Высоцкі сабраўся ісці далей, але Кажушка нібы перагарадзіў яму дарогу.

— Што вы робіце? — быццам узмаліўся ён, быццам прыгразіў са злосцю і адчаем.— Няўжо не разумееце, што...

— Усё разумею! — цвёрда прамовіў Высоцкі.— І адказнасць бяру на сябе! Гэта вы мелі на ўвазе?

Кажушка асекся, разгублена заморгаў.

— І наогул, што гэта такое? — злаваўся Леанід Аляксандравіч.— З інжынерам я размаўляю ці проста з выпадковым чалавекам? Аб чым вы перш за ўсё думаеце?

— Падумалі без мяне, — стрымліваючы крыўду, прызнаўся Кажушка.— Вунь Крывашын... А там і яшчэ...— Ён узмахнуў рукамі і ўзняў тоўстыя далоні вышэй сваёй лысёнай галавы.— Спрачаемся пры такой сітуацыі! Ужо каму-каму, а вам павінна быць вядома, што гэта значыць...

— На што намякаеце? — сурова глянуўшы Кажушку ў вочы, спытаў Высоцкі. — На маё мінулае? Дык знайце!..

— Я толькі аб тым,— перабіў Кажушка,— што за такія справы не гладзяць па галоўцы і цяпер. Што скажа Яўмен Захаравіч?.. І...

— А мяне зусім не цікавіць, што хто пра гэта скажа! Я раблю сваю справу і ведаю, што яна патрэбна людзям, а не каму-небудзь аднаму. Вось так! Думаю, што вы не будзеце прымушаць мяне паўтараць свой загад.

— Я пайду да Яўмена Захаравіча!

— Можаце ісці! Толькі прарыў на асноўным аб'екце ляжа на вашы плечы! Тады пабачым, як выручыць вас Яўмен Захаравіч.

— Я думаў...— нервова заківаўшы галавой, ледзь не зашыпеў Кажушка,— што жыццё вас чаму-небудзь павучыла... Ваша жыццё! Аднак жа, як здаецца...

— Навучыла! — цвёрда прамовіў Высоцкі і павярнуўся, каб ісці на прамысловыя аб'екты.— Праз тры хвіліны ўсе вашы людзі павінны быць там! Вось так!

Яўмен Захаравіч прыехаў на работу крышку раней звычайнага тэрміну — без пятнаццаці дзевяць. У трэсце яшчэ нікога не было, толькі прыбіральшчыцы шумелі кра-

нам водаправода — відаць, налівалі графіны і разносілі па кабінетах.

У прыёмнай таксама нікога не было, нават сакратарка не прыйшла, хоць яна і ведала, што кіраўнік трэста мае звычку пачынаць службу раней. Чалавек ён ужо далёка не малады, позна спаць не любіць, а ўстаўшы ў шэсць гадзін раніцы — чым толькі не зоймешся дома? І ўсё пададкучыць, пакуль прыедзе шафёр. Пехатою ісці ад горада да трэста — не так блізка, ды і наўрад ці пойдзеш адразу, бо пехта абавязкова пярэйме. А па машыне хоць і памалу ехаць, усё роўна за якіх дзесяць — пятнаццаць хвілін ужо на месцы.

Тое, што сакратарка не прыйшла, трошкі ўкалола Крывашына. Няёмка было рабіць заўвагу, тым больш што яна не толькі яго сакратарка, а і Высоцкага. (Калі ўразаліся штаты трэста, то па яго ж прапанове траплялі пад скарачэнне перш за ўсё сакратары і прыбіральшчыцы.) Але ж, каб гэта было некалькімі гадамі раней, то яна зразумела б усё і без заўвагі. Здаралася ў тыя гады, што ён прыходзіў на работу на цэлыя паўгадзіны раней, і ўвесь штат быў ужо на месцы.

А ў часы начной актыўнасці?.. Бывае часам, што з болем у душы прыходзіць на памяць выпадак, калі ён націснуў кнопку званка ў другой гадзіне ночы. Знураная ад бяссонніцы сакратарка хуценька праслізнула праз падвойныя дзверы, насцярожана спынілася каля бакавога стала.

— Сініцкага! — абыякава загадаў Яўмен Захаравіч, не адрываючыся ад тэлефоннай трубкі.

— Ён толькі што пайшоў,— спалохана заявіла дзяўчына.— У яго...

— Што гэта значыць? — спытаў Яўмен Захаравіч і так нахмурыўся, што тая куляй выскачыла з кабінета.

— Гэта я не табе,— тлумачыў ён потым у трубку.— Тут сядзіш, разумееш, ні сну, ні адпачынку, а некаторыя памочнікі... Ты заўтра калі прыязджаеш?.. Гадзін у дванаццаць?.. Так, так... Ну і я к гэтаму часу... Заязджай, партыю закончым. Помніш хады?.. Ну, давай!

Праз некалькі хвілін з'явіўся Сініцкі, па яго высылалі дзяжурную машыну. У гэты час Яўмен Захаравіч таксама размаўляў па тэлефоне і доўга не заўважаў чалавека, бо сядзеў адвярнуўшыся ад стала. А той моўчкі стаяў ля парога і чакаў.

— Вы мяне выклікалі? — нарэшце спытаў ён, выкарыстаўшы момант, калі Яўмен Захаравіч паклаў трубку аднаго апарата і намерыўся зняць з другога.

Атрымалася няёмкая паўза, бо Яўмен Захаравіч ужо забыўся, навошта выклікаў Сініцкага. Справа, відаць, была там нязначная, дык ужо і вырашылася сама сабою ці проста адпала.

— Вазьмі папку,— сказаў Крывашып і паказаў вачыма на свой стол.

Сініцкі падышоў, нерашуча выставіў уперад рукі: на стале ляжала некалькі розных папак.

— Вунь тую, — удакладніў Яўмен Захаравіч, — цёмна-сінюю.

Пасля гэтага Крывашып стаў набіраць чарговы нумар, а Сініцкі пайшоў. Каля дзвярэй ён нейк раптоўна пахіснуўся і ўзлёг локцем на бакавы стол.

— Што з табою? — спытаў Яўмен Захаравіч, паклаўшы руку на рычажок тэлефона. (Здарылася так, што якраз жа ў гэты момант глянуў па дзверы.)

— Нічога,— квола адказаў Сініцкі і зайшоў спачатку ў лакіраваную прыбудоўку, а праз нейкую хвіліну чутно было, як павольна адчыніў падвойныя дзверы ў прыёмную.

Яўмен Захаравіч паклаў трубку тэлефона і званком выклікаў сакратарку.

— Што з Сініцкім? — спытаў з павагай, але не выяўляючы ні сваёй трывогі, ні віны.

— У яго дачка хворая,— сумна адказала дзяўчына.— У бальніцы ляжыць.

— Што?.. Чаму ж ты мне...

— Дык я гаварыла,— пачала апраўдвацца сакратарка.— Гаварыла!.. Але вы...— І ледзь не заплакала ад хваляванця і крыўды.

— Вы... Вы!.. — напракнуў Яўмен Захаравіч. — Усё, калі што, дык я!..

І змоўк пасля гэтага, успёрся локцямі на стол. Толькі цяпер яму ўспомнілася, што Сініцкі быў вельмі бледны і знямоканы, што ў яго запалых і сумных вачах свяцілася прытоеная, але балючая крыўда.

Сакратарка пераміналася з нагі на нагу каля бакавога стала і не ведала, што ёй рабіць: узяць ды моўчкі выйсці, каб Яўмен Захаравіч нават і не пачуў скрыпу, ці чакаць, пакуль будзе яшчэ нешта сказана.

— І даўно яна хварэе? — нарэшце спытаў Крывашын. Узняў галаву і разгублена паглядзеў на дзяўчыну.

— Ну як даўно? — сумелася тая.— Не год і не два... З месяц ужо хварэе. І вельмі цяжка.

— А колькі дзяўчыне? Вялікая ўжо?

— Мая равесніца. Разам некалі ў школу хадзілі.

— Хоць бы сказала калі... Ты ж тут...

— А вы пра гэта не пыталіся.

Яўмен Захаравіч устаў, залажыў вялікі палец за борцік кіцеля і задумліва прайшоўся па суцэльным, на ўвесь кабінет, дыване. Мяккія,налошчаныя боты парыпвалі.

— Дык вы гэта з бальніцы і даставілі яго сюды? — нібы спытаў, нібы выказаў здагадку.

— З бальніцы,— пацвердзіла дзяўчына.

— От жа народ! — Ён узрушана ўзмахнуў рукамі.— Ідзі скажы, каб Сініцкага зараз жа завезлі назад.

Дзяўчына імкліва выбегла.

Яўмен Захаравіч яшчэ некалькі хвілін хадзіў па дыване: дакараў сам сябе, што праявіў такую нячуласць, а сваіх падначаленых — што не сказалі пра няшчасце Сініцкага. На працягу гэтых хвілін ні разу не падышоў да тэлефоннага століка, каб набраць які-небудзь нумар. Затэлефанаваў тэлефон, дык і то не спяшаўся здымаць трубку, а толькі паглядзеў, па каторым апараце звоняць. Заўважыў, што не па «вяртушцы», і адвярнуўся, пайшоў да дзвярэй. Тут у кутку стаяў вялікі, яшчэ, мабыць, з часоў Пятра Першага, гадзіннік. Ён нібы адчуў набліжэнне гаспадара — зашумеў, заскрыпеў і адсалютаваў двума ўдарамі.

Тады гаспадар глянуў на стрэлкі: сапраўды было дзве гадзіны пасля поўначы. Ён адчыніў адны і другія дзверы насцеж і выйшаў у прыёмную. Сакратарка перапалохана ўсхапілася, але Крывашын прайшоў у калідор, нічога ёй не сказаўшы. Там з размахам адчыніў пакой, у якім сядзеў Сініцкі. Некалькі супрацоўнікаў, у тым ліку і жанчыны, усталі.

— Дзе ён? — і глянуў на пусты стол у найбольш зручным месцы.

— Паехаў у бальніцу. У яго...

— Знаю! Ідзіце дадому і вы! Дзве гадзіны ночы!

Дома Яўмен Захаравіч не заснуў аж да самага світання. Разы два нават намерваўся ўстаць ды выклікаць машыну: думалася, што калі б паехаць у бальніцу ды пагаварыць з Сініцкім, то адлягло б на душы.

Гадзін у восем раніцы, калі прыйшоў нарэшце сон, пазваніў на кватэру старшыня мясцкома і папрасіў дазволу заказаць за кошт міністэрства жалобны вянок.

— Каму? — спытаў Яўмен Захаравіч, і голас яго адразу змяк і заглух. Далей ужо ён гаварыў так, што за дзвярыма ніхто б не пазнаў голасу, і, мабыць, старшыня мясцкома не верыў, што размаўляе са сваім непахісным кіраўніком.

Гэта адбылося ў тыя даўнія часы, калі Яўмен Захаравіч быў яшчэ ў самым сваім зеніце, калі ўсе далягляды быццам бы адкрываліся перад ім, і здавалася, што кожны з іх мог бы нават сам наблізіцца, калі б гэтага пажадаць.

У першыя часы, калі Яўмен Захаравіч стаў дэпутатам, яму іншы раз нават і ў холад не хацелася зашпільваць сваё паліто. Ехаў у машыне — і таксама адхінаў борт, каб не закрываць значок.

Тады Крывашып быў першым намеснікам міністра.

З таго часу прайшло нямала год. Многа чаго пабудаваў Яўмен Захаравіч за гэтыя гады — будаўнік ён выдатны, гэтага ніхто не мог ад яго адабраць. А сёе-тое іншае і адбіралася часам і зноў аддавалася, было трывалае і нетрывалае. Жыццё ніколі не ішло ў яго лёгка, аднак быццам бы і залішне хутка прайшлі тыя часы, калі мала каторы дзень не прыносіў спадзяванняў на лепшыя змены ў лёсе. Тады здавалася, што ёсць на гэта ўсё неабходнае: адукацыя, працаздольнасць, біяграфія. І ўсё ж кульмінацыя абмежавалася міністэрствам, а далей пайшоў спуск — значыць, нечага вельмі патрэбнага не хапала.

Чаго не хапала, Яўмен Захаравіч і цяпер па-сапраўдпаму не ведае, але ўжо не надта і думае пра гэта.

...Праз які год — на пенсію. Як гэта змяняе погляды, імкненні, як уплывае на характар і паводзіны! Пачынаецца рабочы дзень, дык не вельмі і радуе. Канчаецца, дык не шкада яго, як некалькі год назад. Калі выпадае магчымасць вырвацца на рэчку ды яшчэ са сваім калматым Цюлікам, дык хіба толькі пасланцы нагадаюць пра службовыя справы.

Аднак жа вось сёння, прыехаўшы ў трэст, Яўмен Захаравіч адчуў сябе быццам бы ўсур'ёз пакрыўджаным. Хоць і праз падвойныя дзверы, але, прыслухаўшыся, ён чуў, што людзі неўзабаве пачалі заходзіць у прыёмную, але ўсё не да яго, не да яго! Сакратарка таксама, як толькі з'явілася, адразу зашчабятала па тэлефоне наконт Высоцкага.

Справы пакуль што ніякія асабліва не падпіралі, таму Яўмен Захаравіч стаяў ля акна, глядзеў на завалены рознымі матэрыяламі двор завода жалезабетонных вырабаў і ўспамінаў некаторыя падзеі мінулых дзён. Адсюль Кажушка ўчора вазіў цэментавыя слупы і дошкі для звышпланавага і звыштэрміновага будынка. Заходзіў сюды, прасіў дазволу на такое збудаванне і нават паказваў спехам накіданы праект. Аднаму хорошаму інжынеру не сорамна было складаць такі праект, а другому, яшчэ лепшаму... зацвярджаць. Дык той яшчэ параўнаўча малады будаўнік. А яму, аўтару многіх праектаў, стваральніку цэлых гарадоў і буйных прадпрыемстваў!.. Некалі нават заікнуцца перад ім не адважыліся б наконт такога праекціка.

Пачаць сваю работу Крывашып намерваўся кнопкай званка і нахмураным загадам сакратарцы — запрасіць сюды галоўнага інжынера. Але потым перадумаў і пайшоў да Высоцкага сам. Ад яго грузных крокаў столік у прыёмнай задрыжаў — сакратарка падняла галаву і збянтэжана павіталася. Мабыць, яна і не ведала, што кіраўнік трэста ўжо даўно тут.

У Высоцкага ля стала сядзелі два інжынеры з тэхаддзела, яшчэ зусім маладыя і даволі модныя з выгляду хлопцы. Убачыўшы Яўмена Захаравіча, абодва ўсталі, даючы яму месца насупраць Высоцкага. Але Крывашып спакойна паківаў ім рукой і сеў збоку, на канапку. Не паспеў ён і двух слоў сказаць Высоцкаму, як у кабінет паспешліва зайшоў Кажушка. Кепка ў руках, лысёная галава ўжо крыху запацела. Ледзь успеўшы паздароўкацца, ён адразу звярнуўся да Крывашына:

— Вы тут, Яўмен Захаравіч? А я да вас.

— А што там? — не надта даверліва спытаў Крывашып.— Сядай, гавары!

Кажушка збянтэжана глянуў на Высоцкага і, зразумеўшы, што Яўмен Захаравіч не збіраецца пераходзіць у свой кабінет, прысеў ля краю бакавога стала.

— Шахтспецбуд патрабуе...— адводзячы пагляд ад Высоцкага, пачаў ён.

Але Крывашып перабіў яго даволі нечакана і насмешліва.

— Чаго ён яшчэ патрабуе? Чаго? Можа прыбіральню з камфортам ім пабудаваць?

Адзін з маладых інжынераў гучна і даволі развязна зарагатаў.

Кажушка сурова паглядзеў на яго, як на школьніка, і ўдакладніў з пачуццём сваёй перавагі:

— Там забетаніраваць трэба... Вакол капроў.

— І, канечне ж, тэрмінова? — пачаў выказваць свае здагадкі Яўмен Захаравіч.— За адзін дзень, а то і за паўдня? Зняць людзей з аб'ектаў? Забраць планавы раствор?

Кажушка нібы згодліва, нібы з папрокам ківаў потнай галавой.

— Хопіць! — зусім катэгарычна прамовіў Крывашып.— Дзе яны раней былі? Не бачылі, што ў іх там у дождж падысці нельга? Няхай паказваюць цяпер, як усё ёсць!

— Што вы, Яўмен Захаравіч! Гэта ж мы павінны...

— Нічога тут не павінны! — зноў не даслухаў яго кіраўнік трэста.— Няма чаго вельмі завіхацца! Я ўчора даў згоду на збудаванне гэтай бытоўкі, але, шчыра кажучы, рад, што цябе пагналі адтуль.— Ён з усмешкай глянуў на Высоцкага.

— Шумок увесь пусценькім аказаўся,— між тым заўважыў Леанід Аляксандравіч, не надта выяўляючы сваю задаволенасць такім паваротам спраў.— Мне званіў Жамчужны.

— Што, не прыедзе? — адразу здагадаўся Крывашып.

Высоцкі пакруціў галавой.

— Ну вось!..— Ён адкінуўся да спінкі канапкі і пачаў уцешна і нібыта здзекліва рагатаць: канапка аж траслася.— Вось гэта яно!.. Э-эх!.. І праўду ты гаворыш?.. Леанід Аляксандравіч?!

— Можна пазваніць Жамчужнаму.

— Не трэба!.. Веру! — Ён раптам даволі бадзёра ўзмахнуў рукамі і ўстаў. Нейкі час узрушана хадзіў па пакоі, а потым пранізліва глянуў на Кажушку і сказаў: — Выконвай цяпер свае слупы!

Той ужо стаяў ля парога і з нервовым дрыжаннем у руках нацягваў на галаву цеснаватую кепку. Нічога не сказаўшы, ён гэтак жа імкліва, як і зайшоў, знік з кабінета.

Усе зразумелі, што ён пабег высвятляць і ўдакладняць сітуацыю.

Праз некалькі хвілін, вырашыўшы свае справы, пайшлі ў свой аддзел і маладыя інжынеры, а ў кабінеце асталіся толькі Крывашып і Высоцкі. Яўмен Захаравіч усё

яшчэ хадзіў упоперак пакоя, пасміхаўся, але ўжо не з уцехай, як раней, а чамусьці сумна і задумліва.

— Калі ўжо мы адвучымся ад гэтага? — быццам бы спытаўся ён у Высоцкага, быццам сурова і бязлітасна папракаў самога сябе.— Ну, прыязджае кіраўнік, міністр... Няхай сабе прыязджае! Няхай пабачыць усё, як яно ёсць. Паможа, калі трэба, падкажа. Няхай і пакрытыкуе, калі ёсць за што. Чаго гэтага баяцца, наганяць адзін на аднаго трывогу, выбрыкваць адзін перад адным, каб паказацца лепшым? Вунь Запрагаеў, дык аж у Слонім пасылаў людзей. А чаго? Па кветкі.

Увайшла сакратарка і сказала, што Яўмену Захаравічу звоняць з міністэрства будаўніцтва.

— Перавядзі сюды! — загадаў Крывашэін.

Павольна падышоўшы да стала, ён з халоднай абыякавасцю ўзяў трубку і слухаў доўга, але адзываўся больш нязначнымі гукамі, чым словамі, таму нельга было зразумець, пра што ішла гаворка. Каб не перашкаджаць у размове і даць магчымасць старэйшаму чалавеку сесці, Высоцкі ўстаў і выйшаў з-за стала. Яму трэба было ўжо ехаць на аб'екты, але няёмка было сказаць аб гэтым кіраўніку трэста — мог стары зразумець, што яго выжываюць з кабінета.

— М-м-мгу... так, так, м-м-гу...— між тым вымаўляў Крывашэін, і ўсё гэта выходзіла ў яго неяк залішне спакойна і безуважна. Высоцкі нават паспачуваў таму чалавеку, які слухае такія няпэўныя адказы.

— А як там наконт гасцей? — спытаў нарэшце Крывашэін. І ў голасе адчуўся зусім не абыякавы смяшок.— Ах, мала цікавіць?.. Ну-ну... Добра, добра...

Ён павольна, гэтак жа, як і браў, павесіў трубку і выйшаў з-за стала.

— Бач ты! — загаварыў здзіўлена, аднак з нейкай ухвалаю.— Яго мала цікавіць!.. Гэта Сініцкі, начальнік вытворчага аддзела. Ці сказаў бы ён гэтак раней?

— Ён мог бы сказаць,— заступіўся Леанід Аляксандравіч.— Здольны інжынер і чалавек з цвёрдымі поглядамі.

— Некалі бацька яго ў мяне працаваў,— успомніў Крывашэін.— Вельмі слабы быў... І без ніякай цвёрдасці...

Калі Высоцкі прыехаў на прамысловыя аб'екты, часовага спецбудынечка ўжо не відно было і следу. Нават усе матэрыялы былі вывезены з таго месца. Сям-там на новых

сценах і галерэях яшчэ віселі прывітальныя лозунгі, але ўжо толькі тыя, што не надта кідаліся ў вочы.

На будаўніцтве арачных складаў сустрэўся Кажушка. Ён зрабіў выгляд, што між імі і не было ніякай непрыемнай размовы, ахвотна і дружалюбна пачаў расказваць і паказваць, што паспеў зрабіць за мінулыя дні.

— А ўсё-такі здорава! — прызнаў ён, узмахнуўшы над галавой рукамі.— Прастор, ажурнасць!.. Палацы проста, а не склады!.. Толькі затрымліваемся крыху — не хапае арак.

— Сёння пабываю на заводзе,— паабяцаў Высоцкі, зразумеўшы, што цяпер трывожыць кіраўніка будаўнічага ўпраўлення. Успомніў, што і Крывашын, мабыць, з-за гэтага прыходзіў у кабінет, ды захапіўся другой тэмай. З міністэрства, відаць, таксама званілі наконт тэрмінаў — гэта заўважалася па адпаскладовых рэпліках Крывашына і па яго твары. Склады могуць выйсці сапраўды прыгожыя, трывалыя — такіх збудаванняў у рэспубліцы яшчэ не было. Але і вымова за парушэнне графіка ўжо, відаць, падрыхтавана.

Кажушка праводзіў галоўнага інжынера да машыны і, калі той узяўся за ручку дзверцаў, вінавата папрасіў:

— Вы, Леанід Аляксандравіч, забудзьце нашу ўчарашнюю размову, калі можаце.

— А нашто яе забываць? — мякка запярэчыў Высоцкі.— Размова карысная для нас абодвух, дык помніць яе варта. А крыўдаваць не будзем!

— Вось гэтага я і хачу,— падхапіў Кажушка.— Тут, знаеце, націснулі на мяне... Сітуацыя такая...

— Усё разумею! — запэўніў Высоцкі.— Усё!

Ён сеў у машыну і, пакуль крануўся з месца, чуў, як Кажушка захапляўся каля адкрытага бакавога шкла:

— Харошая, чысценькая, акуратная... Што значыць — свая!..

## X

З бальніцы Еву паслалі ў санаторый. Там яна прабыла два месяцы. Урачы сказалі, што пакінуць і на ўвесь трэці, а потым чамусьці перадумалі і выпісалі раней. Прыехала дзяўчына на бліжэйшую ад будоўлі станцыю, сышла з ручным чамаданчыкам на перон і чамусьці не адчула радасці, што вярнулася дадому. Было ўжо каля дзевяці

гадзін раніцы, аднак здавалася, што яшчэ толькі пачынала развідніваць: дзень стаяў хмурны, непрыветны, па пустым асфальце вецер гнаў сухое таполевае лісце.

Ніхто Еву не сустрэў, яна і не чакала гэтага, бо нікому не паспела напісаць. Але ўсё-такі крыху зашчымела ў душы, калі ўбачыла, што амаль усіх астатніх пасажыраў — колькі іх там было — яшчэ каля вагонаў хто-небудзь з блізкіх прывітаў, узяў з рук цяжэйшыя рэчы, запрасіў на машыну ці на фурманку. Ад станцыі да будоўлі было каля трыццаці кіламетраў; у той бок наўрад ці трапіцца цяпер машына — зранку больш ідуць адтуль,— і нехатою дайсці нялёгка. Потым жа — адзін толькі плашчык паверх жакеткі на плячах. Выязджала з дому вясною — хіба думалася тады, што прыехаць давядзецца ўвосень?

І ўсё ж дзяўчына пайшла на дарогу з намерам ісці да таго часу, пакуль не нагоніць які грузавік ці аўтобус. Трохі халаднавата было, але калі ідзе не спыняцца, то цярпець можна.

На шчасце, машына нагнала на другім кіламетры, і нават галасаваць не прыйшлося — шафёр спыніўся сам.

— Вы ў Калійск? — спытаў ён добразычліва і адчыніў дзверцы кабіны.— Сядайце!

Ева пазнала аднаго са сваіх абанентаў, зарадавалася, нібы сустрэла самага блізкага чалавека.

— Змерзлі вы,— паспачуваў хлапец.— Зябкавата сёння ў адным плашчыку.

— Нічога. Бегучы не холадна.

— Няўжо хацелі сваім ходам да канца?

— А што было б рабіць, каб не вы? Дзякуй, што спыніліся.

— Ну, за гэта дзякаваць!.. Я вам яшчэ кніжку вінаваты: «І адзін у полі воін». Усё не было як здаць: калі ні зайду — зачынена. А потым і хадзіць перастаў.

— Хіба нікога не было на маім месцы?

— Не ведаю. Можа цяпер і ёсць: даўно не заходзіў.

— І не чыталі з таго часу нічога?

— Не памятаю ўжо. Здаецца, нічога.

— Ну, як жа гэта вы?..

Шафёр не адказаў на папрок, нечага задумаўся, а потым загаварыў нездаволена, нават з абурэннем:

— Што бібліятэка была на замку — дык гэта яшчэ паўбяды. А вось што «Мятла» ў нас так доўга не выходзіць, дык проста і не ведаю, як гэта назваць.

— Ніводнага нумара не было?

— Быў адзін, але ніхто яго не чытаў: нічога смешнага.

Шафёр быў хлопец гаваркі і адкрыты, без асаблівых падахвочванняў ён гаварыў амаль усю дарогу і меў пра што сказаць, бо добра ведаў, што робіцца ў горадзе і на камбінаце. Ад яго Ева дазналася пра шмат якія змены і навіны, ад яго ж выпадкова пачула, што Высоцкі цяпер у камандзіроўцы і невядома, калі вернецца на будоўлю.

Дзяўчына не перапытала пра гэта, зрабіла выгляд, што нават і не звярнула асаблівай увагі. Аднак жа нечаканае паведамленне вельмі балюча азвалася ў душы. Да гэтага ўсю дарогу ўяўлялася першая сустрэча пасля такой доўгай разлукі. Няхай сабе не на станцыі, не на аўтобусным прыпынку... Няхай у самым неспадзяваным месцы і пры нечаканых абставінах. Але ж радавала надзея, што гэтая сустрэча адбудзецца хутка, адразу пасля вяртання...

А цяпер усё адыходзіць, адкладваецца, і ніхто ў гэтым не вінаваты. Урачы неяк вельмі хутка змянілі свае ранейшыя намеры, нават не асталося часу паведаміць, што выпішуць раней.

Шафёр гаварыў і гаварыў, але Ева слухала яго ўжо не з такой увагай. Павярнулі на гравійку, што вяла на камбінат, і нават праз ветравое шкло сталі відны быццам бы зусім новыя карпусы і розныя збудаванні. Ева ледзь пазнавала свае так блізка знаёмыя мясціны. Хацелася б парадавацца, што ўсё гэтак вырасла за некалькі месяцаў. Падрос, вядома ж, і горад. Мужнымі і блізкімі душы ўяўляліся тыя людзі, што так многа зрабілі. Але раптам пакутлівае адчуванне: ці патрэбна яна гэтым людзям? Ці дадому яна цяпер прыязджае? Можа гэта зусім не тая новабудоўля, якую на яе вачах пачыналі, можа гэта будзе і не той горад, першы камень якога яна сама закладвала?

— Куды вас падвезці? — спытаў шафёр.

І ў першы момант Ева не ведала, што сказаць: можа ў горад, а можа тут спыніцца, каля шахтаў? А ў Галубоўку? Ёсць там які прыстанак ці не? Ад гаспадыні даўно не было пісьма.

— У бібліятэку, калі можаце, — папрасіла нарэшце Ева. Самым зручным уявілася тое, што ўвесь час непакоіла, — яе рабочае месца. Па ім за апошнія месяцы збалела душа, тым больш, што ад'езд быў такі нечаканы, нават кніг не было калі перадаць.

...У горадзе з'явіліся новыя кварталы. Насупраць біб-

ліятэкі таксама перасоўвалася сюды-туды некалькі будаўнічых кранаў. А пустырок аставаўся некрануты, і былая прарабская не змяніла свайго выгляду. Здалося толькі, што крыху паменшала, уціснулася ў зямлю, быццам ад страху перад вялікімі мурамі. Зашчымела ў Евы пад сэрцам, калі глянула на яе. Неяк адразу адчуліся і пах, і змрок гэтага памяшкання, і радасці, і пакуты мінулых год.

Падышла бліжэй, спынілася, паглядзела на маленькае, цемнаватае акно. І раптам убачыла ў акне віхрастую дзіцячую галаву.

«Чытач гэтакі? Не. Залішне малы для чытача. Можа хто прыйшоў па кніжкі з дзіцем?»

Адчыніла дзверы ў калідорчык і ўбачыла цынкавыя начоўкі... Адразу вярнулася і пайшла далей.

...Будаўнічыя краны за пустырком быццам усе разам пасунуліся на яе. Дзяўчына спынілася і нейкі час глядзела на іх, бо проста не ведала, куды цяпер ісці. Горнасць адольвала, мабыць, ад дзвюх прычын: невядома, дзе цяпер бібліятэка і ці ёсць яна наогул; потым — каму гэта магло прыйсці ў галаву пасяліць сюды людзей, ды яшчэ з малымі дзеткамі? Восень на дварэ, а яны там!.. Магчыма, што і зімаваць будуць...

...Надумала ехаць у трэст, але па дарозе на аўтобусны прыпынак сустрэла тых дзяўчат-школьніц, якія некалі памагалі ёй у бібліятэцы. Яны здалёк пазналі сваю старшую сяброўку, кінуліся насустрач, забралі з рук чамадан.

— Куды вы ідзяце? Мы вас правядзём!

— І сама не ведаю, — прызналася Ева. — Толькі што прыехала. Бібліятэка цяпер дзе?

— Вунь там! — наперабой сталі паказваць дзяўчаткі. — На вуліцы Бранаўца.

— Вы ўжо былі там?

— Не, не былі. Яна нядаўна пераехала.

...Шыльды пакуль што ніякай не было, але на той вуліцы ўжо ўсе ведалі, дзе бібліятэка, таму Ева знайшла яе хутка. Дом аднапавярховы, нядаўна, відаць, скончаны. Ва ўсіх пад'ездах жывуць людзі, але два пакойчыкі адведзены пад бібліятэку. Адчыняючы яшчэ блішчастыя ад масляпай фарбы дзверы, дзяўчына зноў успомніла Высоцкага, і ёй захацелася выказаць яму шчырую ўдзячнасць перад кім-небудзь або хоць прашаптаць самой сабе. За круглым столікам у зальчыку сядзела ўжо не першай маладосці жанчына і вышывала сурвэтку. У другім пакоі два

хлапчукі самі лазілі па стэлажах і выбіралі кнігі пра шпіёнаў.

— Усюды не парыцеся! — азвалася да іх жанчына, калі Ева ўвайшла ў пакой. — Глядзіце на дзіцячых паліцах!

На новую наведвальніцу жанчына амаль і не звярнула ўвагі, відно было, што ёй вельмі не хацелася адрывацца ад сваёй сурвэткі. Толькі калі Ева павіталася, яна ўсё ж узняла вочы і не надта прыязна спытала:

— Што вы хацелі?

— Я вось падшыўку... — ухапілася Ева за першае, што трапілася на вочы, і падышла да другога століка, на якім ляжала некалькі газет. Перагарнула адну, другую — сярод іх былі старыя і новыя нумары, падшытыя і непадшытыя, — потым з адчуваннем няёмкасці, што адрывае такую спакойную жанчыну, спытала:

— А ЛІМа ў вас няма?

— Каго?

— ЛІМа, «Літаратура і мастацтва»?

— Гэта кнігі такія? — Жанчына апусціла сваё вышыванне на жывот, прыкрыты цёплым шалем, крыху разгублена паглядзела на незнаёмую наведвальніцу.

— Газета ёсць такая, — растлумачыла Ева. — На першае паўгоддзе я выпісала яе сюды.

Жанчына пакруціла галавой, ніякавата ўсміхнулася:

— Не разумею... Як гэта вы сюды выпісвалі?

— Працавала тут, — сказала Ева, — таму і выпісвала. — Я загадчыца гэтай бібліятэкі.

Жанчына паклала вышыванне на столік, рухава ўстала.

— Ах, вунь што... Дык гэта вы?.. Мне гаварылі... І чамаданчык у вас... Толькі што прыехалі?.. Дык сядайце, калі ласка... Вось крэсла...

— Дзякую, — не вельмі прыветна прамовіла Ева і села каля свайго століка. — Даўно вы тут?

— Не, яшчэ і месяца няма.

— Прымалі фонд?

— Які гэта?

— Ну, кніжкі, усю літаратуру...

— А-а... Збольшага пералічылі, калі перавозілі. — Жанчына падышла да перагародкі і звярнулася да хлапчукоў:

— Ну як?.. Знайшлі, што шукалі?..

— Тут во яшчэ...

— Хопіць! Давайце запішу тое, што ў вас у руках, ды ідзіце дадому чытайце!

— Чаму яны самі? — спытала Ева, калі юныя чытачы выйшлі з бібліятэкі.

— А як тут з імі?.. Не ведаюць, чаго хочуць.

— Вы працавалі раней у бібліятэцы? — стараючыся быць тактоўнай, спытала Ева.

Жанчына зноў пакруціла галавой, але ўжо ледзь прыкметна, і не сказала нічога.

— Мы нядаўна сюды прыехалі, — пачала яна нібыта апраўдвацца, як толькі села на сваё ранейшае месца. — Муж у мяне маркшэйдэр. Вы можа не ведаеце, што гэта такое?.. То я...

— Чаму не ведаю? — перапыніла Ева. — Усе горныя спецыяльнасці мне знаёмыя, і літаратура пра іх тут ёсць.

— Дык вось... Прыехалі, а ні кватэры пакуль што, нічога... Двое дзетак у нас і бабка, яго маці... Работа ў шахтах толькі пачынаецца — заработак малы. Пайшла і я шукаць якога месца. Усіх тут абхадзіла — нідзе нічога няма. І вось таварыш Запрагаеў, дзякуй яму: «Ідзі, — кажа, — у бібліятэку, якраз па табе работа!» І праўда... Пры маім цяперашнім становішчы... — яна паправіла на плячах шырокі вязаны шаль і зноў клапатліва прыкрыла ім жывот.

— Разумею, — кіўнула галавою Ева. — Усё разумею. Працуйце пакуль што, я вам перашкаджаць не буду.

Яна ўстала і ўзяла свой чамаданчык.

— Таварыш Запрагаеў сказаў, — нервова перабіраючы ў руках сваю вышыўку, загаварыла новая бібліятэкарка, — што вы яшчэ не скора... І пра нейкія курсы была тады гаворка...

— Якія курсы?

— Не ведаю... Паверце, нічога не ведаю... Толькі чула, што вы павінны былі ехаць вучыцца, пасля...

— Я скончыла інстытут! — крыху раздражнёна прамовіла Ева. — Ніякія курсы мне не патрэбны! Але няхай гэта не турбуе вас. Працуйце спакойна, толькі аб адным хачу папрасіць...

— Калі ласка, — ніякавата сказала жанчына і горка ўсміхнулася.

— Я вельмі многа патраціла часу... — ледзь стрымліваючы хваляванне, загаварыла Ева. — Не ўспамінаю тут пра іншае... Адным словам, мне нялёгка было арганізаваць

гэтую бібліятэку і зацікавіць чытачоў. Не страцьце ўсяго гэтага!

— Ды я ўжо, знаеце... Я ўжо як умею, як магу... — паабяцала жанчына.

Ева развіталася і выйшла.

Не так лёгка застаць на месцы Запрагаева, але на гэты раз Еве пашанцавала: старшыня пабудкома яшчэ не паспеў знікнуць са свайго службовага пакоя. Убачыўшы дзяўчыну, быццам бы спалохана залыпаў вачыма, але ў той жа момант узяў сябе ў рукі, выйшаў з-за стала і, шырока ўсміхаючыся, ступіў два крокі насустрач:

— Прыехала? Ужо? Ну, маладзец! Маладзец! А як яно? Усё добра? Настрой харошы?

— Не надта, — стрымана адказала Ева і падалася ў куток пакоя, каб паставіць там чамадан.

— Толькі з дарогі? — спытаў Запрагаеў. — І дадому не заходзіла?

— Яшчэ невядома, ці ёсць у мяне гэты дом.

— Ну, чаму ж?.. Тут мы ўмяшаемся, калі што... Ніхто не меў права...

— Якое там права! — з лёгкім абурэннем прамовіла дзяўчына. — Прыватная кватэра: каму захоча гаспадыня, таму і здасць. На маю пасаду вы не мелі ніякага права, ды ўсё ж аддалі!

— Ну, гэта знаеш?.. — Запрагаеў зрабіў выгляд, што раптам нешта згубіў ці забыў, куды паклаў, і стаў шарыць па кішэнях кіцеля. — Гэта не адно і тое самае... Ды ты сядай, сядай!.. — Ён быццам нехаця паказаў на крэсла каля свайго стала. — Наша бібліятэка не магла так доўга быць зачынена. Праўда? Культурны ачаг усё-такі... Ды пакуль што адзіны ў горадзе.

— Вы назаўсёды яе прызначылі, ці толькі да майго прыезду?

— Што? — Запрагаеў нарэшце знайшоў нейкую паперку ў верхняй кішэньцы, разгарнуў яе, прачытаў і зноў згарнуў. Тады разгублена паглядзеў на Еву:

— Ты ўжо была там? Бачыла? Харошае памяшканне? Праўда? А знаеш, як лёгка было яго вырваць? Ногі адхадзіў, пералаяўся з усімі!

— Хто вам праслаў гэтую жанчыну? — добра ведаючы характар Запрагаева, настойліва запытала Ева.

— Хто, хто... — нездаволена пераказаў старшыня па-будкома. — Ніхто не пасылаў, сама прыйшла, папрасілася.

— Сама яна не магла папрасіцца, — запярэчыла Ева, — бо бібліятэчнай справы зусім не ведае. Тут нехта добры ўзяў прыцэл, нічога не скажаш.

— Ну, пазванілі з шахтбуда... — нарэшце прызнаўся Адам Адамавіч. — Сам начальнік... Знаеш, як гэта бывае?..

— Знаю! — цвёрда сказала Ева. — Найлепш ведаю, як у нас бывае! А мне цяпер куды?

— А ты ўжо... гэтае самае?.. — Запрагаеў акінуў дзяўчыну прыдзірлівым і даволі бессаромным паглядам. — І скакаць ужо можаш?.. І частушкі спяваць?

— Я ў вас пра службу пытаю! — рашуча прамовіла Ева. — А будзе настрой спяваць, дык паспяваем і паскачам. Перш за ўсё я працаваць хачу! Вы можаце ўявіць, што такое мой сум па рабоце, па калектыву? Не, вы гэтага не ўявіце!.. Гэта не па вашай душы!..

— Чаму не па маёй? — крыўдліва запярэчыў Адам Адамавіч. — Кожны можа заскучаць па рабоце... З усякай душой. Асабліва ў наш час, калі «хто не робіць, той не есць».

— Ну вось!.. Зразумелі!..

— А што тут разумець? Філасофія?

— Дык куды мне ісці? Я сёння ж хачу ўзяцца за справу!

— Ну, можа, туды і ідзі... На сваё месца, вядома...

— А яе куды?

Запрагаеў нагнуўся над сталом, шырокі, але нізкаваты лоб сабраўся ў гармонік.

— Вы тады ведалі, што яе нельга будзе крануць з месца? — настойліва запытала Ева.

— Як гэта?.. — здзівіўся Запрагаеў, нібы першы раз аб гэтым пачуў.

— Ды проста так, што ёй неўзабаве ў дэкрэт.

— Праўда? — Ён узняў галаву і моцна зарагатаў, але нельга было зразумець, ад задаволенасці ці якога іншага адчування.

— Вы ж ведалі пра гэта? Чаму не пашукалі для яе вольнага месца?

— Ну, знаеш! — Тут Адам Адамавіч нават узмахнуў рукамі і па-салдацку выпнуў грудзі. — Мне яна, прабач,

не жонка, што я павінен усё ведаць. У анкеце пра гэта не напісана. Ды і дзе ў нас ты бачыла тыя вольныя месцы? Дзе? Людзі наязджаюць і наязджаюць! З усяго свету!

— Па закону я маю права заняць сваё месца, — не надта рэагуючы на яго запал, прамовіла Ева. — І каб правучыць вас, трэба было б гэтак зрабіць. Але я сказала той жанчыне, што турбаваць яе не буду. Я магу стаць і на іншую работу, а яна не можа, ды, відаць, і не ўмее нічога.

— І дзеці ў яе, — падхапіў Запрагаеў. — Малыя дзеці!.. Яшчэ і свякруха на шыі... А ён, муж яе — вельмі патрэбны нам чалавек. Маркіроўшчык.

— Маркшэйдэр, — направіла Ева, а сама падумала, што ўсё ведае пра гэтую жанчыну старшыня пабудкома і добра ведаў раней, каго пасылаў у бібліятэку.

— Ты гэта правільна зрабіла, што так ёй сказала, — між тым гаварыў далей Запрагаеў. — Гэта з твайго боку сапраўдная гуманнасць, я сказаў бы... І здагадлівасць... Зачапі яе, а раптам што-небудзь здарыцца па медыцыне?.. Тады і табе... І ўсім нам... Поўная газетка матэрыялу. А для цябе мы што-небудзь знойдзем... Падумаем... От я з Жамчужным параюся. Шчабетуну пазваню... Ты ж камсамолка?

— Ну, вядома.

— Слухай! — Запрагаеў раптам шырока ўсміхнуўся і пляснуў далонню сабе па лбе. — Ідэя! У Жамчужнага ёсць паперка — сам я чытаў... Падавай у партшколу!.. Га? У цябе такая хватка масавіка, арганізатара. І пісаць там яшчэ лепш навучышся... Прынось заяву! Рэкамендацыю напішам...

— А чаму б вам самім туды не падацца? — зусім нечакана для Запрагаева спытала Ева. — У вас хватка, здаецца, больш дасканалая, як у мяне. І адукацыі няма. А я ўсё ж такі трохі вучылася.

— Ну вось, я сур'ёзна... — пакрыўдзіўся Адам Адамавіч. — А яна...

— І я сур'ёзна, — дадала Ева. — Заўтра прыйду на работу! І проста сюды, да вас. Не будзе месца — ваша займу! Жанчыну з дзецьмі пашкадавала, а вас не пашкадую!.. Так і знайце! І не прыдумвайце нічога, каб мяне выжыць адсюль! Не выжывеце! Я раней сюды прыехала, як вы!

Ева на хаду падхапіла свой чамадан і выйшла з пабудкомаўскага пакоя. Па ўсім трэстаўскім калідоры ішла

бойка і жвава, нібы вось толькі што даказала сваю праўду, пераадолела самае цяжкае. Каля прыёмнай Крывашына і Высоцкага на момант спынілася, потым адчыніла дзверы. У пакоі не было нават сакратаркі, адтуль пацягнула сырасцю ад нядаўна памытай падлогі і пракураным пахам сцен. Выйшла на шашу і адчула, што нічога нікому не даказала, нічога не пераадолела.

На аўтобусным прыпынку было многа людзей, усе яны некуды спяшаліся; калі прыходзіў аўтобус, імкліва атакавалі дзверы. Некалі і яна рабіла гэтак жа, некалі і ў яе была злічана кожная хвіліна. А сёння няма куды спяшацца, няма куды ні ехаць, ні ісці.

Яна не звярнула на аўтобусны прыпынак, а пайшла ціхам у вёску. Пасля такіх непрыемных наведванняў ёй ужо не хацелася куды-небудзь заходзіць, а тым больш расказваць пра нечаканыя складанасці свайго лёсу. Цяпер, як ніколі, душы патрэбен быў толькі сябра, вельмі блізкі чалавек. З ім бы параіцца, на яго плячы або пад яго добрымі вачыма адпачыць...

Ішла ў Галубоўку, але зусім не ведала, варта заходзіць на сваю былую кватэру ці не варта. Гаспадыня сама па сабе — някепская жанчына: з ёй можна пагаварыць нават і па шчырасці. Аднак, калі яна ўжо здала кватэру, то якая можа быць гаворка?

Спадзявання на добрае ўжо чамусьці не было. Пэўна ж, маглі знайсціся такія людзі, што пусцілі насцярожаныя чуткі наконт яе неспадзяванага ад'езду.

І ўсё ж, што менш аставалася да Галубоўкі, то ўсё выразней паўставала перад вачыма бакоўка з даматканай посцілачкай замест дзвярэй. Адно акенца ў гэтай бакоўцы, але святла, быццам бы, заўсёды хапала. Выходзіла яно ў агародчык, што перад вуліцаю. У вольную хвіліну можна было паглядзець і на вуліцу, але агародчык вабіў больш. З самай ранняй вясны і да позняй восені, аж да замаразкаў, тут што-небудзь расло і нават цвіло. Розныя кветкі, пахучыя і дэкаратыўныя расліны былі падабраны і размешчаны так, што некаторыя пачыналі зеляненць, як толькі паказваліся з-пад снегу; калі адны адцвіталі, то другія зацвіталі; калі адны пачыналі вянуць, то другія толькі наліваліся сокам.

Пасля таго як пазнаёмілася з Высоцкім і атрымала ў падарунак каліўца мяты, сама пасадзіла ў агародчыку гэтую ласкавую расліну. Да ад'езду каліўцы толькі што пры-

няліся. А як цяпер? Можа яны выраслі аж да акна, калі гаспадыня хоць трохі налівала.

Стомленасць і самота адольвалі ўсё больш і больш. Здавалася, што калі не прытуліцца цяпер дзе-небудзь у цёплым куточку, то падкосяцца ногі, паплывуць перад вачыма жоўтыя кругі. Не знойдзецца нічога ў тых месцах, дзе пражыла два гады, дзе было столькі харошых сяброў, таварышаў, дык прыйдзецца ісці на аўтобусны прыпынак, а адтуль — у вёску, да цёткі, хоць наўрад ці будзе тая рада нечаканай госці. За ўвесь час лячэння адказала ўсяго на адно пісьмо, і толькі на тое, у якім было наабяцана прыслаць крымскага вінаграду.

Яшчэ здалёк Ева ўбачыла свой агародчык, можа нават раней, як хату. У ім яшчэ цвілі раскошныя вяргіні. Яны, мабыць, занадта лезлі ў вокны, таму гаспадыня падзяліла іх на асобныя часткі-спапы і папрывязвала да сцяны. Такім чынам было вызвалена ад густога ценю і тое акенца, што выходзіла з Евінай бакоўкі. Пад ім расла мята, яшчэ таксама зялёная, хоць з адцвілымі гронкамі на некаторых сцяблінах. Дзяўчына і зайшла спачатку ў агародчык. Прывыкла да ўсяго тут за два гады: колькі разоў ногі самі заводзілі сюды, колькі разоў у самыя цёмныя ночы гэты агародчык вылучаўся сярод іншых і нібы голасам запрашаў да сябе. Хоць і чужы ён, а заўсёды ўяўляўся сваім.

Ева прайшла паўз вокны, каб сарваць каліва мяты. Нагнулася над градкай і амаль у той жа момант пачула, як пад самай галавой з парывам адчынілася акно.

— Евачка, гэта ты?

Дзяўчына аж не паверыла голасу, паспешліва ўстала. Гаспадыня ляжала вялікімі грудзьмі на падаконніку і радасна ўсміхалася. Потым яна працягнула да Евы голыя па локці рукі і абхапіла яе за шыю.

— Заходзь жа ў хату! Чаго ты?

На дзвярах бакоўкі вісела тая самая даматканая посцілачка і дакраналася берагамі да стракатага палавічка, чыстага і гладкага. Ева ступіла на гэты палавічок, памкнулася зайсці ў бакоўку, ды не адважылася, разгублена паглядзела на гаспадыню.

— Заходзь, заходзь! — падахвоціла жанчына. — Там тваё ўсё, як і было.

— Праўда?.. — Ева па-дзіцячы зарадавалася, адхіліла посцілку.

Сапраўды, у бакоўцы ніхто нічога не пераставўляў, на-

ват не кратаў: усё аставалася як і раней. Каля цямнейшага кутка — вузкі ложак, засланы блакітнай капай: гэта Евіна капа. На акне — цюлевая шторка, таксама Евіна. На стале — маленькае круглае люстэрка, некалькі кніжак стопкаю. Усё на ранейшым месцы і ў ранейшым выглядзе.

— Нікому не здавалі, — са шчырай удзячнасцю прамовіла Ева.

— Ні аднаго дня ніхто тут не быў, — пацвердзіла жанчына. — А як жа? Мой стары і то сказаў: «Раз яна тут жыла, то за ёю ўсё і астанецца. Мала што з чалавекам можа быць?»

— Дзякую вам, цётачка, — расчулена сказала Ева.

Праз некаторы час яна заснула ў сваёй пасцелі і спала так соладка, што гаспадыня не адважылася пабудзіць яе не толькі на абед, а нават і на вячэру. Прачнулася і нейкі момант не магла паверыць, што ўжо дома, а не ў лячэбнай палаце, хоць тут і зусім іншае было адчуванне: ні разу ў палаце гэтак не спала. Потым глянула на столік з люстэркам і кнігамі, на акно са шторкай, якую сама прыладжвала, і здаволена ўсміхнулася: сапраўды дома, у сваіх, блізкіх людзей, а таго, што ўявілася спрасонку, ужо няма.

На змярканні пайшла ў клуб. Там якраз ішлі рэпетыцыі калектываў самадзейнасці, дык пабывала ва ўсіх. Ёй былі рады, а ў хоры папрасілі заняць сваё ранейшае месца. Дзяўчаты трошкі расступіліся, і Ева звычна і зручна стала паміж імі, нібы стаяла тут увесь час.

Заспявалі знаёмую песню. У дружным хоры яна не чула свайго голасу, але здавалася, што ўвесь акорд — гэта яе голас. Мелодыя лілася лёгка, натхнёна і напаўняла ўвесь пакой вельмі адчувальнай, упэўненай радасцю. Ева не бачыла твараў ні сваіх суседак, ні тых, хто стаяў за ёю, але ўяўляла, што ўсе яны павінны быць вясёлыя і радасныя. Мабыць, ніхто ў гэты час не думаў пра якія-небудзь цяжкасці і непрыемнасці ў жыцці, забывалася крыўда, адыходзіў сум, не адчуваліся нават голад ці смага, калі яны ў гэты час у каго былі.

Прачыніліся дзверы, і ў невялічкай шчыліне на момант паказаўся востры нос. Дзяўчына здагадалася, чый нос, але і пра гэтага чалавека ёй не хацелася цяпер думаць. Прыемнага ад яго чакаць ці непрыемнага? Не баялася яна непрыемнасцей і нават самых нечаканых паваротаў лёсу. Цяпер вось асабліва адчула неабходную трываласць.

Але ў гэты момант існавала толькі песня, толькі тыя галасы, з якімі зліваўся і яе голас.

Спявалі ў той вечар доўга. А ў зале на сцэне іграў вельмі яшчэ нязладжаны духавы аркестр, і маладзенькі дырыжор з кучаравымі валасамі, здавалася, больш назіраваў перад музыкамі, чым памагаў ім. Аднак танцы ішлі з поўным сучасным каларытам: што ні пара, то свой стыль.

Каб вельмі не тырчаць на відавоку, Ева таксама прайшлася разы два кругам у пары з адной удзельніцай спеваў. Танец быў не самы прывабны і не захапляў так, як песні. У павольных рухах можна было і паглядзець куды хочаш і пагаварыць з кожным сустрэчным, толькі што аркестр крыху заглушаў словы.

Як толькі зайшла ў залу, дык заўважыла, што таго, хто нядаўна паказваў нос у харавы пакой, тут чамусьці няма. Агледзела ўсіх яшчэ ў танцы і пераканалася, што сапраўды хлопец знік ці завітваў сюды выпадкова.

...Уперадзе па крузе ішла вельмі прыгожая з выгляду і найлепш зладжаная ў танцы маладая пара. Ева любавалася ёю, і калі спыняла пагляд на тых, што не танцавалі, дык заўважала, што амаль усе паглядаюць на гэтых прывабных танцораў. Мабыць, прыемна было назіраць за іх танцам, надзвычай плаўным і рытмічным, і за імі самімі. Партнёр быў высокі, стройны і светлавалосы. Не пра кожнага тут можна было сказаць, які ён з валасоў, бо некаторыя хлопцы танцавалі ў шапках. Партнёрша таксама нічога не мела на галаве, але яе валасы, хоць і хораша ўкладзеныя, не так прыкметна вылучаліся ў крузе, таму што былі трошкі цямнейшыя.

Абаіх Ева ведала, партнёршу нават добра, бо яна часта брала кніжкі ў бібліятэцы. Гэта былі Бранаўцы, Віктар і Ірына.

...Міжвольна і непрыкметна Ева глянула на сваю партнёршу. Дробненькі тварык, зблізку трошкі рабаваты, невялічкая сама, і ногі, здаецца, не надта стройныя. Спявае хораша, а на танцы не вельмі здатная. Кружыцца з ёю ўсё ж лёгка, не так, як некалі з Віленам. Аднак чамусьці ўсё думаецца аб тым, каб хутчэй скончылася музыка. Так некалі было і з Перапечкам: як ні адводзіла вочы, а ўсё бачыла яго доўгі апупчаны нос.

З'явіўся б ён цяпер, дык наўрад ці адчула б асаблівую радасць. Запрасіў бы на наступны танец, то наўрад ці пайшла б. А вось няма яго — і быццам чагосьці не хапае.

І вельмі цяжка сказаць чаго: можа проста звычнага партнёра, а можа хоць частачкі таго спакойнага і чароўнага шчасця, якое заўважалася на тварах Бранаўцоў.

Удваіх з рабенькай дзяўчынай яны пайшлі і ў Галубоўку — тая кватаравала таксама ў вёсцы. Ніхто людскі іх не праводзіў; увязаўся быў нейкі п'янаваты хлюст, дык яны яго хутка адшылі. Цераз поплаў ішлі моўчкі, відаць, кожная адчувала нейкі сум, нейкую сваю адзіноту ў густой цемені.

— Давай заспяваем! — раптам прапанавала рабенькая.

І яны заспявалі. Галасы паліліся вольна і звонка, пачуццё адзіноты адышло: поплаў стаў выглядаць зусім свойскім, да кожнай сцяжынкі знаёмым. Спяшацца дадому не хацелася.

Развіталіся дзяўчаты непадалёку ад Евінага двара. Толькі дабегла Ева да седлаватай таполі, як пачула, што нехта ціха пазваў. Дзяўчына спынілася. З лавачкі пад таполяй устаў Вілен Перапечка і паспешліва падышоў да яе.

— Я чакаў цябе, Ева. Здрастуй!

— А чаму ў клубе не пачакаў? — даволі рэзка спытала дзяўчына. — Толькі нос паказаў праз дзверы!

— І ты пазнала?

— Чаму ж не!

— Мне пачулася, што хор сёння вельмі здорава спяваў. Ажно ж гэта ты там была...

— Не падлізвайся!

Ева памкнулася ісці дадому, але Вілен узяў яе за руку:

— Пачакай трошкі, давай пасядзім!

— Холадна ўжо сядзець на двары!.. Ды і позна сёння.

— Не позна... А па холадзе, дык у мяне паліто... Накінеш...

Лавачка сапраўды здалася спачатку вельмі халоднай і няўтульнай. Пад нагамі шамацела сухое таполевае лісце.

— Я нядаўна даведаўся, што ты прыехала, — неяк залішне вінавата загаварыў хлопец. — Толькі як прыйшоў са змены. Хацелася, каб сустрэцца адным, не на людзях...

— А чаму, каб не на людзях?

— Бо вельмі сумаваў я тут без цябе... Паверыш?..

Ён ахінуў Евіны плечы крысом свайго паліто, прытуліўся да яе і пацалаваў у шчаку. Пацалунак выйшаў нібы выпадковы, асцярожны да прыкрай халоднасці.

— Чаму не пісаў? — спытала Ева, і зноў разкавата, нават сурова.

— Дык адкуль я ведаў, куды пісаць? — быццам узмаліўся хлопец. — Паехала... Не сказала... А потым ні адрасу, нічога...

— Калі б хацеў, то знайшоў бы адрас, — абыякава прамовіла Ева.

І быццам міжволі ўспомніла, што і Высоцкаму яна ні разу не пісала аб сваіх перамяшчэннях. А ён заўсёды знаходзіў яе, і калі не наведваўся сам, то прысылаў пісьмы.

Пакуль яна пра гэта думала, Вілен яшчэ раз пацалаваў яе, ужо нават дакрануўся да вуснаў. Ева спачатку адхілілася, а потым, нібы ад жахлівай здагадкі, раптоўна павярнула галаву да хлопца. Глянула ў твар і заўважыла, як той непрыкметна выціраў аб каўнер паліто свой дзюбкаваты рот...

— Я пайду! — рашуча сказала яна і ўстала.— Мне холадна!

— Дык на вось!.. — Перапечка стаў здымаць з сябе паліто.

— Не трэба!.. Бывай!..

Ева бежкам памчала ў свой двор.

Назаўтра яна ўстала на самым світанні, раней за гаспадыню, бо амаль усю ноч не спала. Выняла з чамадана свой кубачак, паставіла ў мыцельніку.

— Нашто гэта? — спачатку даволі абыякава спытала гаспадыня. — Там жа ёсць кубкі.

— Мне, мабыць, трэба асобны, — ціха сказала Ева. — Усё асобнае...

— Што-о? — ужо больш насцярожана запыталася жанчына. — Нас гадзішся?

— Не я вас... А...

— А?.. Дык няма чаго тут! Не адсаджвалі мы цябе, і цяпер не адсаджваем!.. Сама лішняе не выдумляй!

— Усё ж такі я... — прыглушана прамовіла Ева і адвярнулася, каб прыхаваць свае вочы, бо на іх проці волі паказваліся слёзы. — Я доўга не была дома, лячылася...

— Ну дык што, калі лячылася?.. Хіба дактары так сказалі?

Ева пакруціла галавой.

— Ну дык і няма чаго! — узрадавана і яшчэ больш настойліва сказала гаспадыня. — Не наганяй сама на сябе

страхаў! Не думай нічога кепскага, то і людзі не будуць думаць!

Аднак Ева не магла вызваліцца ад цяжкіх думак пра сваё цяперашняе становішча. Відаць, нямала тут будзе такіх людзей, як Перапечка. Яны кожны дзень нагадаюць аб нейкай непаўнацэннасці, пакрыўдзяць і прынізяць сваёй бояззю падаць руку, стаць блізка ў час размовы. І гэта могуць рабіць блізкія людзі, тыя, што лічыліся шчырымі сябрамі і быццам гатовы былі нават на нейкія ахвяры дзеля дружбы. А што гаварыць пра розных Запрагаевых, якім не раз пападала ад яе вострага пяра, ад выступленняў на сцэне?..

І ўсё ж такі трэба было зноў ісці да гэтага Запрагаева, прасіць, патрабаваць работу...

Дні тры пабудкомаўскі пакой быў зачынены. Потым час ад часу з'яўлялася туды адна супрацоўніца, якая і сама не ведала, хто яна па сваёй пасадзе: сакратар, інструктар ці касір. Некалькі разоў Ева пыталася ў яе пра Адама Адамавіча, але жанчына заўсёды разводзіла рукі і сумна круціла даўлосай галавой з вялікай куксай ледзь не на самым цемені. Кукса ківалася сюды-туды, і можна было падумаць, што яна і надавала галаве патрэбныя рухі. Магчыма, што жанчына і сапраўды не ведала, дзе бывае ў той ці іншы час старшыня пабудкома, а хутчэй за ўсё — была вельмі ўжо вышкалена і заўсёды адчувала, як трэба каго прыняць і што каму сказаць.

За ўсё сваё сталае жыццё, ды нават і з малых год Ева ніколі не была без работы. Нават у выхадныя дні або пры рэдкіх выпадках бюлетэню старалася не траціць час без карысці: калі не ішла ў бібліятэку, то чытала ці пісала дома.

А цяпер нічога ў яе не было і ні да чаго не цягнуліся рукі. Тую любімую работу, аб якой некалькі месяцаў сумавала ды ўвесь час марыла, едучы дадому, вярнуць ужо нельга. Іншая таксама не знаходзілася, і дзень за днём усё нарастала і ўзмацнялася адчуванне самоты і пакутнай беспрацоўнасці, прыглушалася, а то і зусім знікала жаданне ўзяцца хоць за што-небудзь дома, захапіцца кніжкай ці творчай работай. Дні пачыналіся сумна і часам безнадзейна; думка аб тым, што трэба зноў ісці шукаць Запрагаева ці каго-небудзь іншага, засцілала туманам усё перад ва-

чыма. І часта здаралася так, што ўвесь дзень выглядаў туманным, хоць і пасвечвала сонца ды патыхаў сухі і не надта халодны вецер.

Некалькі такіх дзён было патрачана на самастойныя пошукі работы ды на размовы з Генадзем Шчабетуном у камітэце камсамола. Гэты хлопец спачатку праяўляў вельмі многа актыўнасці: некаму званіў па тэлефоне, да некага бегаў, вырываў абяцанні і запэўненні, заадно і сам абяцаў і запэўніваў, а потым сказаў Еве проста і адкрыта:

— Слухай! Я ж табе не аддзел кадраў!

Пасля гэтага дзяўчына адважылася на апошняе і пайшла да Жамчужнага. Доўга сядзела ў прыёмнай, чакала, пакуль у кабінеце трохі паменшае людзей, хоць знаёмая сакратарка раіла ісці адразу. Выбраць такі час, калі Мечыслаў Юльянавіч застаецца тут адзін, справа нялёгкая, але Еве трэба было пагаварыць без пабочных слухачоў і ахвотнікаў аналізаваць і каменціраваць кожнае слова.

Сакратарка зразумела гэта і прытрымала некаторых у прыёмнай. Неўзабаве выйшаў апошні наведвальнік, але следам за ім паказаўся з падвойных дзвярэй і сам Жамчужны. Крануў пальцамі прыгожыя валасы, акінуў паглядам усіх, хто сядзеў на крэслах паабапал сакратаркі.

— Усе, таварышы, да мяне?

— Да вас, — адказала за іх сакратарка.

— Калі ласка! А то мне хутка на бюро райкома.— Вы таксама? — Ён звярнуўся да Евы, якая сядзела амаль побач з сакратаркай. Дзяўчына кіўнула галавой і ўстала.

— Заходзьце!

Некаторыя наведвальнікі, ведаючы характар Жамчужнага, таксама ўсталі, каб ісці ў кабінет, але сакратарка папрасіла іх пачакаць яшчэ хвіліну. Пайшла следам за Жамчужным толькі адна Ева.

— Прабачце, што я не адразу спытаў у вас, — праводзячы дзяўчыну да свайго стала, загаварыў Мечыслаў Юльянавіч. — Мне чамусьці падумалася, што вы да Маі прыйшлі. Сядайце! Даўно прыехалі?

— Даўнавата ўжо, — адказала Ева, — у пачатку мінулага тыдня.

— Расказвайце, як здароўе, як наогул вашы справы?

Ева пачала расказваць вельмі паспешна, бо ведала, што ў Жамчужнага мала часу. Аднак ён ні адным рухам не паказваў, што спяшаецца, слухаў яе ўважліва, з усёй

добразычлівасцю. Праз некаторы час зноў папрасіў прабачэння і зняў тэлефонную трубку.

Ева чула, як гучалі ў мембране доўгія і безнадзейныя пазыўныя, як некалькі разоў глыбока і сумна ўздыхнуў Жамчужны. Не дачакаўшыся адказу, ён устаў і запрасіў у кабінет сакратарку. Каля шуфлядкі стала быў у яго званок, можна было націснуць, не кратаючыся з месца, але Жамчужны вельмі рэдка карыстаўся званком.

— Мая! — звярнуўся ён да гэтай маладой жанчыны, калі яна ўвайшла і зачыніла за сабою дзверы. — Пастараюйцеся зрабіць для нас, — ён паказаў рукамі на Еву і на сябе,— даволі нялёгкую справу — знайдзіце Запрагаева. І калі можна, то хутка, зараз жа! І Шчабетуна пашукайце таксама.

— Пастараемся, — з нейкай асаблівай упэўненасцю сказала сакратарка і, лагодна ўсміхнуўшыся, знікла.

Вярнулася яна праз хвіліну. Еву аж здзівіла, што яна так хутка здолела выканаць даручэнне.

— Адама Адамавіча выклікалі ў вобласць, — як па пісаным далажыла яна, — а Шчабятун будзе праз гадзіну, у яго сход на ўчастку.

— Так, та-ак,— холадна азваўся Жамчужны і зноў глыбока ўздыхнуў. Вінавата і крыху разгублена паглядзеў на Еву, потым другі раз, ужо быццам без ахвоты і без надзеі, працягнуў руку да тэлефоннай трубкі.

На гэты раз адказалі хутка. Жамчужны назваўся і цішім прыгожым голасам пачаў задаваць пытанні. Адтуль дакладвалі гучна, амаль што без затрымак і ваганняў.

— Ці ёсць там у нас што-небудзь у сэнсе?.. — спытаў Мечыслаў Юльянавіч.

— Для каго? — адразу пачулася пытанне.

— Ну, для чалавека... З адукацыяй... А калі трэба, то магу назваць і канкрэтна.

— Нічога няма! — прагучаў упэўнены мужчынскі голас. — Нідзе нічога!

Жамчужны глянуў на Еву і прыкрыў другою рукою трубку. Па яе вачах ён заўважыў, што, пэўна, ужо не раз чула дзяўчына такія адказы, што і цяпер яны балюча ўкалолі ёй душу.

— Чаму гэта так? — патрабавальна спытаў Жамчужны, але, мабыць, ужо не так для поспеху справы, як для спакою дзяўчыны.

— Каліўшчыкі прыехалі!.. Каліўшчыкі! — усё ж такі

чулася ў тэлефоннай трубцы. — У каго жонка, у каго сястра, брат, сват... Вось і пазаймалі ўсё...

— Дык што ж вы за аддзел кадраў! Брат, сват!.. Трэба знайсці адно месца! Прыстойнае... Паглядзіце ўсюды!..

— Толькі ў гардэробе! — моцна прагучала ў трубцы, бо Жамчужны на гэты момант не прыкрыў мембрану. — У клубным гардэробе!

Мечыслаў Юльянавіч паклаў трубку і квола апусціў руку на стол.

— Я разумею... — зноў ціха і быццам ураўнаважана загаварыў ён, хоць па вачах было відно, што вельмі перажываў і спачуваў дзяўчыне. — Разумею, як вам неабходна хутчэй уладзіцца, пачаць працаваць... І для нас вы чалавек патрэбны... Але трэба ж вось так здарыцца... І ў бібліятэку вярнуцца цяпер ужо... Сапраўды!.. — Ён падсунуў да сябе настольны каляндар і на заўтрашнім лістку запісаў: «Перагаварыць з Запрагаевым і Шчабетуном. Абавязкова!» І шматкроп'е. Далей: «Ева Дым».

Загарнуў лісток, адсунуў ад сябе каляндар і быццам павесялеў, падбадзёрыўся.

— Я вам абяцаю! — сказаў шчыра і ўпэўнена.— Зраблю ўсё, каб вы мелі зручную для вас работу. І як можна хутчэй! Ну, яшчэ можа дзень ці два прыйдзецца вам пачакаць. Не больш! Папрашу вас: заўтра к канцу дня, а лепш — паслязаўтра, зайдзіце сюды. Калі мяне не будзе, то Мая скажа вам усё — я ёй перадам.

— Дзякую, — сказала Ева і ўстала, каб ісці. — Вельмі ўдзячна, мне аж лягчэй стала.

— І не забывайце свае грамадскія абавязкі, — дадаў Жамчужны. — Бярыцеся за іх! Ваша адсутнасць тут вельмі адчувалася.

У прыёмнай Ева весела падышла да сакратаркі, шапнула ёй, што яшчэ наведаецца, і накіравалася дадому. У гэты дзень яна аж да самага змяркання чытала, каб хоць трохі нагнаць тое, што ўпусціла за доўгія часы блукання па розных прыёмных і кабінетах. Потым пры лямпе падганяла свае хатнія справы: будзе работа, тады не будзе вольнай хвіліны. І цэлы вечар думала пра сваю новую пасаду: якая яна будзе, у якім месцы, што давядзецца рабіць, з кім працаваць?..

А можа ў клубным гардэробе? Ну што ж... Калі Жамчужны адважыцца прапанаваць гэтае месца, то можна будзе пайсці і туды. Прыйдзе ён сам у клуб: калі ласка, ва-

ша паліто! Можа аддасць і не заўважыць каму, у каго паўзяў металічны нумарок? Прыйдзе Запрагаеў — той папэўна не заўважыць. А Генка Шчабятун спыніцца каля перагародкі і нейкі час будзе моўчкі стаяць, здзіўлена паглядаць, нібы на зусім чужую... Потым абурыцца, закрычыць, замахае рукамі!.. І нічога не зробіць.

Такія ўяўленні засмучалі і трохі смяшылі, бо недзе ў глыбіні душы ўсё ж расло перакананне, што гэтага не будзе. Жамчужны не для ветлівасці так шчыра запэўніваў: хто б ні слухаў яго ў гэты час, адчуў бы тую шчырасць, хто б ні глядзеў на яго, пераканаўся б у найлепшых намерах і жаданнях.

Назаўтра ў другой палове дня Ева зайшла ў прыёмную Жамчужнага. Мая ўсміхнулася ёй так узнёсла і бадзёра, што ў дзяўчыны аж душа заспявала. Пасля такой усмешкі можна было чакаць і слоў радасных, вясёлых...

Яны і былі, гэтыя словы, толькі не для Евы. Майка паведаміла, што ў магазін прывезлі нейлонавыя кофтачкі, і адна з іх ужо тут, у яе століку.

— Паглядзі, што за цуд!

Ева з апалым настроем агледзела кофтачку, пахваліла, а потым, нібы між іншым, спытала пра Жамчужнага.

— Быў тут, — абыякава сказала Мая. — Хвіліны дзве як выйшаў.

— Нічога не перадаваў?

— Пра каго?

Ева паказала на сябе.

— Не, нічога.

Назаўтра Ева зноў зайшла ў прыёмную, ужо ў канцы дня.

— Нічога не перадаваў?

— Не, нічога.

А ў наступныя дні Мая ўжо нічога і не гаварыла, убачыўшы Еву, а толькі сумна пакручвала галавою.

## XI

Вікенцій Львовіч Папурын ішоў з Галубоўкі абочынаю дарогі і старанна ўтульваўся ў каўнер паліто. Халодны з вільгаццю вецер дзьмуў яму насустрач, моцна ўпіраўся ў мажную постаць і ледзь не збіваў з ног. Па мокрым асфальце вельмі часта снавалі сюды-туды машыны, з-за

іх нельга было і два крокі прайсці шашою, дзе б не слізгаліся так ногі.

У такое надвор'е цяжка было стрымаць зайздрасць да кожнага, хто ехаў у машыне, асабліва ў легкавой. А ў горадзе ўжо многа такіх машын. Акрамя розных службовых, «Масквічы» ёсць у многіх шахцёраў, геолагаў, будаўнікоў. Прыехаў службовы персанал каліійнага камбіната, і таксама некаторыя на ўласных машынах.

«Толькі ўрачу тут заўсёды даводзіцца хадзіць пехатою, — з сумам падумаў Вікенцій Львовіч. — І ва ўсякі час сутак, ва ўсякае надвор'е. Колькі ўрачу трэба працаваць, колькі сумяшчэнняў займець, каб здолець купіць хоць якую-небудзь машыну?..»

Непадалёк ад бальніцы яму сустрэўся Высоцкі. У таго гэтак жа быў настаўлены каўнер паліто, але толькі ад спіны, бо вецер дзьмуў яму па дарозе. Яны паздароўкаліся, і Панурын раптам спыніўся, нібы самая патрэбная думка прыйшла яму ў галаву толькі ў гэты момант.

— Вы вельмі заняты? — спытаў у Высоцкага і дружалюбна ўзяў яго за гузік паліто.

— Не, а што? — Леанід Аляксандравіч насцярожыўся.

— Зойдзем на хвіліну да мяне — справа ёсць.

У бальнічным кабінеце яны паздымалі свае мокрыя капелюшы і паліто, паглядзелі адзін на аднаго, нібы ўпершыню знаёміліся, тады Панурын моцна пацёр свае рукі і запрасіў Высоцкага сесці каля белага стала.

— Я надумаўся быў зайсці да Жамчужнага, — грузна ўсеўшыся насупраць, пачаў ён. — Але вось сустрэў вас... Некалі вы прабіралі мяне за слабую прафілактыку і, скажам канкрэтна, за Еву Дым, загадчыцу бібліятэкі. Правільна прабіралі, але не заўсёды галоўная бяда ў нашай медыцынскай прафілактыцы... Не заўсёды!..

— Пра што вы?.. Пра каго?.. — устрывожыўся Леанід Аляксандравіч. — Калі ласка, хутчэй гаварыце!

— А я і гавару пра Еву Дым, загадчыцу бібліятэкі. Вярней — былую загадчыцу. Вы сапраўды нічога не ведаеце?

— Я толькі гэтай ноччу прыехаў!.. Зусім нічога!.. А што, яна вярнулася ўжо?

— Даўно вярнулася... Ды вось ляжыць зноў... Я толькі што ад яе.

— Дзе ляжыць? Дома? — Высоцкі ўстаў.

— Пачакайце трошкі, раскажу па парадку. Ляжыць

не таму, што прыехала хворая... Была яна ў норме: я глядзеў, цікавіўся. А злягла адтаго, што вось ужо хутка месяц як без работы. Хадзіла, шукала, прасіла, а потым найшла ў брыгаду Бранаўца падсобніцай. Дні былі халодныя, мокрыя, вопраткі цёплай не было, а арганізм яшчэ...

— Дык у яе ж пасада!.. — усхваляванa сказаў Высоцкі. — У бібліятэцы.

— Туды пасадзілі ўжо... Шматдзетную ды перад дэкрэтам.

— Што ж цяпер?.. — разгублена спытаў Леанід Аляксандравіч. — Як вы лічыце?.. Цяжка там у яе? Можа ў бальніцу трэба?

— Не. Пакуль што пачакаем, паглядзім... — не надта ўпэўнена загаварыў Папурын. — Думаецца, што гэта нешта грыпознае, ад прастуды... У яе наогул арганізм, я не сказаў бы...

— Гэта зразумела... — згадзіўся Высоцкі.

У яго памяці прамільгнула біяграфія дзяўчыны, некалі расказаная па Белым балоце, але тут ён нічога не сказаў пра гэта. Падзякаваў урачу і пайшоў.

У Евіну бакоўку ціха зайшла гаспадыня і яшчэ больш ціха сказала:

— Да цябе прыйшлі.

— З бальніцы? — без асаблівага здзіўлення перапытала дзяўчына і крыху нацягнула на сябе коўдру.

— Мабыць, не з бальніцы, — прашаптала гаспадыня і выйшла.

Леанід Аляксандравіч павольна і нячутна крыху адхінуў дамаканую посцілку:

— Можна да вас?

Ён спытаў ледзь чутна, але дзяўчына здрыганулася, неяк спалохана павярнула галаву і ўставіла на шырму здзіўленыя вочы. Яна пазнала голас Высоцкага, ды не паверыла сама сабе: ужо колькі разоў чуўся ёй гэты голас за доўгія месяцы лячэння!

— Заходзьце, калі ласка!.. — Ева прыўзнялася на левы локаць, дружалюбна працягнула руку. — Я не заразная, не бойцеся! — І хваравіта, але радасна ўсміхнулася.

— Ну, што вы гаворыце? — з глыбокай шчырасцю папракнуў Леанід Аляксандравіч. — Я ніколі так не думаў і не магу надумаць.

— Я ведаю, — згадзілася Ева. — Гэта я проста так...

Не знайшла што сказаць... Сядайце!.. Вазьміце сюды бліжэй зэдлік! Даўно прыехалі?

— Толькі гэтай ноччу.

— Дзякуй, што зайшлі. Хто вам сказаў, што я вось зноў?.. Брапавец?

— Не. Панурын. Сустрэў яго толькі што.

— Нагаварыў ён, мабыць, вам?

— Якраз — не. Нічога такога... Прастуда. Але трэба ж было так!.. А?.. Падсобніцай у такі час... Ды з вашым здароўем!..

— Значыць, расказаў усё?

— Не ўсё, канечне, але зболынага я ўжо ведаю, што тут натварылася. Вы ў Жамчужнага былі?

Ева сумна кіўнула галавой, памаўчала з хвіліну, а потым, быццам трохі і не да месца, пачала хваліць сваю цяперашнюю работу:

— Шкада, што здароўе гэтакае, а то б назаўсёды асталася ў брыгадзе. Каму яны патрэбны цяпер, такія спецыялісты, як я? Трэба хадзіць, кленчыць, прасіцца на работу! Душу сабе парвеш, пакуль уладкуешся. А дзяўчаты ў брыгадзе працуюць і вучацца завочна. Атрымаюць свае дыпломы — і гарантыя на ўсё жыццё. Яны не будуць ацірацца па ўсякіх прыёмных.

Высоцкі разумеў, што не кожнаму з гэтых слоў Ева верыць сама, але ёй ужо надакучыла вінаваціць толькі тых, хто яе здзівіў і пакрыўдзіў раўнадушшам, а можа і наўмыснай непавагай. І чым скардзіцца на каго за асабістую крыўду, то ці не лепш пашукаць віны ў самой сабе, у сваёй прафесіі?

Наконт адносін да яе сакратара парткома ўжо нямала думалася, гадалася, і цяпер, перад блізкім чалавекам, невядома было, што пра гэта і сказаць. Магчыма, тут непаразуменне якое-небудзь, нечаканы, непрадбачаны выпадак.

— Я сам пагавару з Жамчужным, — сказаў Леанід Аляксандравіч. — Ён мне ўсё апіша.

— Наўрад ці варта ўзнаўляць усё гэта, — выказала сумненне Ева. — Не па душы мне надакучаць людзям. Калі б была я па-сапраўднаму патрэбна, самі знайшлі б.

— Людзям вы патрэбны, — запярэчыў Высоцкі. — Людзям! А Запрагаеў і некаторыя на яго падобныя яшчэ не ўсе людзі. Тут бяздушша і коснасць, самыя агідныя!..

— Можа і так. — Ева нясмела падняла вочы, усміхну-

лася, нібы саромеючыся сваіх слоў, і ціхім шэптам папрасіла:

— Не будзем больш пра гэта. Скажыце лепш пра сябе. Я так чакала вас!..

— Калі б я ведаў, што вы ўжо дома, — усхвалявана прамовіў Высоцкі, — усё зрабіў бы, каб прыехаць раней, хоць работы, раз'ездаў і спрэчак было вельмі многа: утрасалі дакументацыю абагачальнай фабрыкі.

— Я некалькі разоў падыходзіла да вашай хаты, — прызналася Ева, і раптоўная невясёлая чырвань заліла яе твар. — Мята пад вокнамі... яшчэ зялёная тады была...

— І цяпер зялёная...

Высоцкі ўзяў у свае далоні яе кволую, чамусьці пахаладзелую руку, атуліў яе, нібы ратуючы ад зябкасці, і папрасіў:

— Скажыце мне праўду, Ева. Усю праўду! Як сябе адчуваеце?.. Ніякі доктар часам таго не ведае, што носіць чалавек у сваім нутры, у сваёй душы.

— Хутка папраўлюся! — упэўнена сказала дзяўчына. — Не хвалюйцеся за мяне. Я ні разу не траціла надзеі.

— Мабыць, цяжка было тут пасля вяртання?

— Цяпер усё мінулася, дык здаецца, што і нічога асаблівага. А тады?.. Начамі асабліва мучылася — сон не браў. Нават пагаварыць душа ў душу не было з кім...

Дзяўчына глянула на невялікі зашклёны партрэт над яе ложкам, і Высоцкі таксама стаў глядзець туды. З прыгожых драўляных рамак уважліва і бесперапынна нібыта сачыла за ім маладая мілавідная жанчына, трошкі падобная на Еву.

— Мабыць, сястра ваша? — спытаў Леанід Аляксандравіч.

— Не, гэта мама.

Высоцкі ўважлівей паглядзеў на партрэт і адчуў няёмкасць адтаго, што задаў такое недарэчнае пытанне, бынцам не мог ведаць, што ў Евы няма сястры.

— Мама і цяпер памагае мне, — задумліва сказала дзяўчына. — Як ні дзіўна, а так. Кожны раз, калі мне становіцца вельмі цяжка, я думаю пра яе, бачу нават у сне. Ці такія беды яна перажывала?!! І ўсё моўчкі, без суму і жальбы, і ніколі нікому не скардзілася. А я вось скарджуся вам... — Ева на нейкі вельмі непрыкметны момант прытулілася да яго рукі, а потым вызваліла сваю. — Больш не буду скардзіцца.

— Якія ж гэта скаргі? — заўважыў Высоцкі.— Тут крычаць трэба, пратэставаць, можа нават напісаць у газету. З вамі так абышліся, што калі б не факты, то не паверыў бы ніхто.

— Я і напісала б,— ціха сказала дзяўчына.— Ужо нават пачала пісьмо ў «Праўду». Але мне вельмі не хацелася, каб усе ведалі пра маю былую хваробу. І так у мяне стольκі перажыванняў з-за гэтага.

— А што?..— шапнуў Леанід Аляксандравіч і падазрона глянуў на шырмачку.— Можа і тут?..

— Не, тут нічога...

Ева ўспомніла пра сустрэчу з Віленам і чамусьці змоўкла. Сказаць, як тады было, не адважвалася, а звальваць самае балючае на каго іншага і зусім не магла.

Маўчанне было чароўнае, зусім не надакучлівае, яно магло цягнуцца нават доўга і не выклікаць крыўды ці няёмкасці. Леанід пахіліўся бліжэй да яе твару і сустрэў вочы, ласкавыя і бязмежна шчырыя.

— Я рада, што вы прыйшлі,— прашаптала дзяўчына і лёгенька дакранулася да яго рукава.— Цяпер не буду адчуваць сябе адзінокай.

— Пакуль вы маўчалі, я ўсё думаў, думаў,— гэтак жа, ледзь не шэптам, загаварыў Высоцкі.— Хачу сказаць такое, што можа вас і здзівіць, але яно ў мяне ад душы, ад сэрца... Пераязджайце да мяне... Ну... калі не да мяне, то да нас, да маёй матулі, якая заменіць вам родную маці. Яна ў мяне харошая, ласкавая... Дагледзіць вас, будзеце адчуваць сябе як у сваёй сям'і.

Гаворачы пра гэта, Леанід, вядома, чакаў здзіўлення, аднак на такое ўражанне, якое хутка ўбачыў, не спадзяваўся. Твар у Евы збялеў, павекі задрыжалі, моцна сплюшчыліся, а потым праз іх пасачыліся светлыя і бліскучыя, як маленькія крышталікі, слёзы. Дзяўчына закрылася рукамі і павярнула галаву да сцяны. Доўга маўчала, нібы не знаходзячы ні слоў, ні думак, каб што-небудзь сказаць.

Леанід таксама разгубіўся і не ведаў, як працягваць такую гаворку далей. Мільганула і моцна закалола сэрца меркаванне, што нясвоечасова, залішне рана сказаў аб тым, што насіў у думках ужо даўно. Мабыць, не супалі гэтыя думкі з яе думкамі і спадзяваннямі, засталі дзяўчыну знянацку.

— Нашто я вам, хворая? — нарэшце спытала Ева.

І ўсё яшчэ хавала вочы, не магла ўзяць пэўнага і роўнага голасу.

— Вы мне патрэбны ўсякая,— ледзь чутна, але ўпэўнена і шчыра прамовіў Леанід.— Мы людзі дарослыя і можам гаварыць прама... Але калі вам...

— Я ніколі не думала пра гэта,— раптам амаль перабіла Ева.— Ніколі!

— Дык я кажу...— стаў гаварыць Высоцкі далей.— Калі вам цяжка пра гэта падумаць, то будзьце ў нас проста кватаранткай. Вам трэба спакой і сямейная ўтульнасць. Усё гэта ў нас будзе. Можна жыць у братавай хаце — там месца ёсць, можна і ў бацькавай, дзе пакуль што жыву я. Тады я маму зусім забяру да сябе. Цяпер яна больш у брата. Я ўпэўнены, што ўсе нашы прымуць вас як сваю. Асабліва мама.

Ева прыняла рукі з вачэй, паглядзела на Высоцкага, трошкі павярнуўшы галаву, і зусім асталела і цвёрда, нібы ўжо раней гэта перадумала, сказала:

— Я не змагу быць у вас кватаранткай. Не, не змагу!

— А сваячкай?

— І сваячкай не змагу. Вы разумееце?.. Ды гаспадыню крыўдзіць шкада, яна харошая і вельмі добрая да мяне.

Вочы ў дзяўчыны былі яшчэ вільготныя, але так шчодра і шчыра іскрыліся, што здавалася, аж рассыпалі ўдзячнасць сэрца і душы.

Убачыўшы Высоцкага ля парога свайго кабінета, Жамчужны шырока ўзмахнуў рукамі і выйшаў з-за стала насустрач.

— Чаму так затрымаўся? Мы ўжо непакоіцца пачалі.

— Добра, што хоць помнілі,— пажартаваў Высоцкі.

— А як жа іначай? Учора Крывашып заходзіў, таксама ўспамінаў.

Не чакаючы стандартнага запрашэння, Высоцкі сеў ля пісьмовага стала і не надта прыязна паглядзеў на Жамчужнага, а потым перавёў нецярплівыя вочы на дзверы.

— Ты можаш удзяліць мне некалькі хвілін?

— Хоць гадзіну, хоць дзве,— з таварыскай гатоўнасцю адказаў Жамчужны.— Хочаш астацца ўдвух? Зараз я скажу.

Ен папрасіў сакратарку нікога пакуль што не пускаць, а сам надышоў да стала і сеў насупраць Высоцкага ў такое ж бакавое крэсла.

— Слухаю цябе,— вымавіў Жамчужны даволі насцярожана і, мабыць, з інтуітыўным адчуваннем сваёй віны.

— У цябе была загадчыца бібліятэкі?

— Была. А што? — Твар Жамчужнага ўвачавідкі змяніўся, каля вачэй выступіла чырвань.

— Я табе некалі гаварыў,— пачаў Высоцкі, не хаваючы крыўды і абурэння,— што гэта чалавек вельмі складанага і цяжкага лёсу, што і цяпер, вось ужо ў нас, з ёй абыходзіліся так, што на доўгі час яна выбыла са строю... І гэта пры яе энергічнасці і вытрымцы. Нядаўна вярнулася з лячэння, і тут зноў натварылі такога, што аж цяжка паверыць.

— Дык ёй жа... Дык я ж... Хіба?..— Жамчужны апусціў на калені рукі і змоўк. Цяжкая, пакутлівая здагадка нібы апаліла ўсё нутро, і ён ужо бадай з поўнай дакладнасцю ўяўляў, што здарылася пасля таго, як дзяўчына пабывала ў яго на прыёме. Назаўтра ён вельмі мала быў у сваім кабінеце. Паслязаўтра перагарнуў на календары адразу два лісткі. Мільгнуў у вачах запіс пра загадчыцу бібліятэкі, але ў гэты ж час узнікла неабходнасць зрабіць адразу некалькі запісаў на наступным лістку. Справы наплывалі адна на адну. Неяк пры сустрэчы ён даручыў Запрагаеву ўладкаваць Еву Дым. Сказаў аб гэтым жа і Шчабетуну. Сказаў, ды не праверыў ні аднаго, ні другога.

І вось здагадка: ні першы, ні другі нічога не зрабілі, пэўна, да гэтага часу дзяўчына пакутуе без работы.

— Што з ёй? — прыглушана спытаў Жамчужны і, узняўшы галаву, з болем паглядзеў сябру ў вочы.— Гавары прама!

— Яна зноў захварэла,— сумна паведаміў Леанід Аляксандравіч.

— Так!..— Жамчужны ўстаў і неспакойна захадзіў па пакоі.— Я з першага твайго слова адчуў, што здарылася нешта цяжкае. Дзе яна? У бальніцы?

— Не, дома. Я толькі што быў там.

— Як сябе адчувае?

— Ляжыць... А скардзіцца яна не будзе — не такі чалавек.

Мечыслаў Юльянавіч з размаху сеў зноў у крэсла, нервова прыгладзіў крыху зблытаныя валасы.

— Ты ведаеш, што я тут глыбока адчуваю сваю віну,— з таварыскай шчырасцю загаварыў ён,— што па-сапраўднаму перажываю, таму аб гэтым цяпер лепш памаўчаць. Скажы адразу, што мы можам зрабіць, як памагчы дзяўчыне?

— Перш за ўсё — даць работу,— упэўнена прапанаваў Высоцкі.— Па душы і здольнасцях. А то яна пайшла ў будаўнічую брыгаду падсобніцай... Халады якраз, а без адзежы...

— Ну што тут прыдумаць?..— Жамчужны пакутліва зморшчыўся і падсунуў да сябе свой настольны каляндар. Пагартаў яго, прачытаў некалькі апошніх запісаў, і раптам твар яго пачаў весялець.— А знаеш што? — запытаў ужо больш вясёлым голасам.— Яна ж у нас, так сказаць, пісьменніца: вершы піша, фельетоны... Давай хоць часова пакінем яе пры газеце. Га? Неяк рэдактар скардзіўся, што яму цяжка з адным літсупрацоўнікам выпускаць газету. Вось толькі каб стаўку дзе знайсці.

— Знойдзем,— коратка запэўніў Высоцкі.— А работа якраз па ёй.

Жамчужны ўзяў са стала аловак, каб неадкладна зрабіць чарговы запіс у календары, і раптам схамянуўся, устаў.

— Знайдзіце Пласковіча! — дзелавіта сказаў сакратарцы, адчыніўшы дзверы кабінета.

— Дык я спадзяюся,— не зусім даверліва прамовіў Высоцкі.— Ты мне пазвоніш?

— А як жа. Адразу пазваню.

— Чакаю.

Жамчужны без асаблівых турбот у тую ж гадзіну дамовіўся з рэдактарам шматтыражкі, пазваніў аб гэтым Высоцкаму і астаўся ў кабінеце адзін. Рабочы дзень падыходзіў к канцу, ніякія неадкладныя справы не наплывалі, таму Мечыслаў Юльянавіч рашыў выключыцца з дзелавой сферы. Дазволіўшы сакратарцы ісці дадому, ён націснуў кнопку французскага замка ў дзвярах і пачуў сухі металічны шчаўчок, нібы асечку пісталета. У пакоі адразу стала ціха, быццам знікла ўсё жывое не толькі тут, а і ў наваколлі. Да заходу сонца было яшчэ подалека, аднак здавалася, што і пацямнела тут ужо і ўсе службовыя рэчы анямелі ў чаканні начнога адпачынку.

Жамчужны сеў на нізкую канапу ля сцяны і адчуў нязвычны цяжар ва ўсім целе, хоць, здавалася, нічога такога і не рабіў на працягу ўсяго дня, нікуды не хадзіў, не ездзіў. У першы момант быццам бы хіліла на сон, нават павекі пачыналі зліпацца, але адразу ж свідранулі мазгі тыя думкі, што прымусілі тут астацца, і дрымота, нібы цень у раптоўным святле, знікла. Як уладзіцца з гэтымі думкамі, як ужыцца?..

Ужо колькі разоў Мечыслаў Юльянавіч лавіў сябе на тым, што найбольш яго адольваюць думкі і развагі пасля якой-небудзь сустрэчы ці размовы з Высоцкім. Часам вельмі складаныя і супярэчлівыя.

Некалі вясною ён ледзь не ўсю ноч прахадзіў па ўтульнай сцежцы паміж горадам і Арабінкай. Потым здарылася нешта падобнае і яшчэ разоў колькі. Пазней Высоцкі часта бываў у раз'ездах, таму бачыліся рэдка. Пад восень і надоўга выехаў. І вось да сённяшняга дня не было блізкай сустрэчы і размовы сам-насам.

...У якім настроі ён зайшоў!.. Як гаварыў змрочна, насцярожана!.. Каб не зайшоў, не сказаў, мабыць, і асталася б забытай такая справа, якую ніяк нельга было забываць.

...У якім настроі ён пайшоў? Ці паверыў душою, што той чалавек, які можа забывацца пра лёс людзей, здольны зрабіць хоць што-небудзь карыснае? Наўрад ці паверыў, бо такія правалы ў памяці і душы зусім не ўласцівы ні быламу партызану, ні цяперашняму інжынеру Высоцкаму...

Сапраўды, як гэта здарылася, як можна было забыць пра свае ўласныя абяцанні, ды такія цвёрдыя, упэўненыя?.. Нанесена душэўная траўма харошаму чалавеку. Гэты чалавек, напэўна, верыў яму, сакратару парткома, спадзяваўся на яго дабрату, справядлівасць, прынцыповасць. А там вельмі патрэбна была прынцыповасць... Дапушчана тое, што ўжо цяжка паправіць. Абыякавасць да аднаго чалавека балюча закранула і другога, ды не каго-небудзь, а блізкага сябра, саратніка па партызанскай барацьбе.

...Нямала перажыў гэты чалавек і зазнаў незаслужаных пакут. Напэўна, не было б гэтай несправядлівасці, каб у свой час падаў свой голас Мечыслаў Жамчужны.

...Ці наўмысля праявілася цяпер абыякавасць да Евы? Безумоўна, не. Калі яна была ў кабінеце і расказвала ўсю сваю апошнюю гісторыю, то абурэнне агнём апальвала ду-

шу, хацелася загрудкі схапіцца з тымі чэрствымі людзьмі, якія дапусцілі да гэтага, пайсці на якія хочаш ахвяры, каб памагчы дзяўчыне. А потым яна пайшла з кабінета... Другі, трэці, чацвёрты раз не заходзіла... З'явіліся іншыя справы, таксама важныя, таксама неадкладныя і вострыя. Размова з Евай спачатку крыху прыглушылася, а потым і зусім адплыла, выйшла з памяці. І вось — вынік... Дзяўчына зноў захварэла, злягла... Ці здолее ачуняць, вярнуцца да актыўнай дзейнасці? Працэс сур'ёзны, можа абвастрыцца... Нікому нічога не скажаш, нікога не папракнеш, бо ніхто, як быццам, і не вінаваты, а чалавека можа і не быць. Магчыма, што і не патрэбны ўжо цяперашнія старанні і клопаты...

Такі паварот падзей ніколі не забудзецца, ён будзе жыць у памяці да апошняй тваёй гадзіны, заўсёды стаяць перад вачыма, як тая даўняя гісторыя з Высоцкім...

Пра ўсё гэта цяпер ніхто нічога не ведае, ніхто не спытаў і не спытае. Па такіх «клопатах» можна было б жыць спакойна. Некаторыя ў такіх умовах і жывуць спакойна, ды не ім трэба зайздросціць, не іх прыклад браць у душу.

...Некалі Дзяржынскаму таксама ніхто не гаварыў, што быццам бы ён вінаваты ў эсэраўскім мяцяжы васемнаццатага года. Ніхто не папракаў, а ён сам прыйшоў у Крэмль да Леніна, каб падаць заяву аб вызваленні яго ад абавязкаў старшыні ВЧК. Уладзіміра Ільіча не было ў гэты час у Саўнаркоме, і Дзяржынскага сустрэў Свярдлоў. Як пакутаваў Фелікс Эдмундавіч, як перажываў з-за таго, што левым эсэрам удалося арганізаваць мяцеж і нават захапіць яго самога! «Чаму яны мяне не расстралялі? — з абурэннем гаварыў ён Свярдлову.— Шкада, што не расстралялі, гэта было б карысна для рэвалюцыі!»

Якаў Міхайлавіч доўга суцяшаў свайго лепшага сябра, прасіў не мучыцца гэтак душой: «Не, дарагі Фелікс, добра, вельмі добра, што яны цябе не расстралялі. Ты яшчэ нямала папрацуеш на карысць рэвалюцыі».

Аднак Дзяржынскі лічыў сябе маральна вінаватым перад партыяй і ўсё ж такі падаў сваю заяву. Савет Народных Камісараў у той жа дзень задаволіў просьбу, а праз некалькі тыдняў зноў прызначыў яго старшынёй ВЧК.

Чыталася пра гэта даўнавата... Цяпер і не згадаеш, дзе чыталася, а ў часы роздумаў заўсёды ўзбрывае на памяць...

## XII

У будынку трэста не знайшлося кутка для рэдакцыі шматтыражкі, таму яе размясцілі ў двух невялічкіх пакоях другога ўпраўлення. У першым пакоі стаяла вялікая шафа з падшыўкамі і рознымі матэрыяламі, насупраць яе туліўся столік сакратара-машыністкі, а ў другім быў адзін нават пісьмовы стол — гэта рэдактараў і два проста кухонныя. Калі іх засцілалі старымі газетамі, дык яны адразу пачыналі нагадваць пісьмовыя.

За адным такім столікам вось ужо трэці дзень сядзела новая супрацоўніца Ева Дым. Прыходзіла яна раней за ўсіх і пакідала рэдакцыю апошняй, аднак усё роўна ёй здавалася, што робіць вельмі мала, бо ў параўнанні з масавай бібліятэкай тут была не работа, а проста адпачынак.

На вялікую ды цяжэйшую работу ў дзяўчыны можа яшчэ і сілы не хапіла б: усяго толькі з тыдзень назад яна ўстала, праляжаўшы больш за месяц. У той дзень, як амаль і ў кожны, быў у яе Высоцкі. Зайшоў якраз і Панурын. Абодва не раілі дзяўчыне спяшацца выходзіць на работу, але яна іх не паслухала: праз некалькі дзён Леанід Аляксандравіч выехаў у далёкія ўпраўленні, а яна, хаваючыся ад гаспадыні, націху сабралася і пайшла на аўтобусны прыпынак.

На дварэ ўжо быў невялікі марозік, трава на поплаве зжаўцела, а на мосціку бялеў і ў асобных мясцінах паблісквaў ад ранняга, але пізкага сонца іней. Калі яна ўвайшла ў аўтобус і той з моцным гулам рушыў з месца, у галаве пагрозліва закружылася, але, як на шчасце, паблізу аказалася вольнае месца, і дзяўчына села. Спачатку ўсё здавалася незнаёмым у акне, а потым паступова пачалі выплываць будынкі і прамысловыя аб'екты камбіната. Некаторыя з іх сапраўды можна было б і не пазнаць — яны выраслі нядаўна, за гэты час, пакуль Ева ляжала. Прамільгнулі ў акне і тыя бярозкі, на якія ўпершыню Ева глядзела ранняй вясною, хаваючыся ад дажджу ў машыне незнаёмага тады чалавека. Цяпер толькі заўважылася, што яны бязлістыя і нібыта меншыя, як былі.

На рабоце так усё падыходзіла да душы, што першыя гадзіны Ева нават і не ўспомніла, што яна нядаўна з пасцелі. Што ні даручаў ёй рэдактар, яна рабіла не то што ахвотна, а з вясёлым стараннем, з радасцю. Неўзабаве вызначыўся пэўны круг яе абавязкаў, і можна было адчу-

ваць сябе ў асноўным самастойнай і даваць ход нейкай ініцыятыве.

Сёння дзяўчына асталася пасля ўсіх, каб прагледзець свежую пошту, прынесеную амаль што ў самым канцы дня. Акуратна, нажнічкамі разрэзвала канверты, не спяшаючыся чытала пісьмы, скаргі, адказы на красворды. Калі што было цікавае, то ўчытвалася, забывала на ўсё, а ў прамежках давала волю сваім асабістым думкам і прыемным спадзяванням.

...«Сёння абяцаў прыехаць з камандзіроўкі Леанід»,— так іншы раз яна звала яго ў сваіх думках. Часам звярталася і на «ты», хоць таксама яшчэ толькі ў думках. І ўжо не адчувала ад гэтага такой няёмкасці, якая часта мучыла раней.

...«Калі прыедзе, то напэўна зойдзе ўвечары, будзе сядзець у бакоўцы пры свечцы: яшчэ ж і цяпер у Галубоўцы няма электраправодкі. Напэўна спытае пра новую работу і ўцешыцца, калі скажу, што вельмі давольна і адчуваю сваю папраўку на гэтай рабоце. Будзе зноў прасіць пераехаць... Ды дзе там пераехаць!.. Проста ўзяць ды пераайсці да яго... «Там светла... Там цёпла... Там маці будзе даглядаць...» — яго добрыя словы. Ды хіба ў гэтым справа? Ён жа ведае, што не ў гэтым, ды не асмельваецца сказаць... Сама яму сёння, мабыць, скажу, што не тое арабінкаўскае святло ды цяпло мне патрэбна, а ён сам... Да яго імкнуся сэрцам, а з ім будзе мне і светла, і цёпла. Таму не кватаранткай пайду туды. Не...»

...Узяла наступны канверцік, невялічкі, сіні. Разрэзала і выняла невялічкае, але складзенае ў чатыры столкі пісьмо. Пачала ўглядацца ў тэкст, потым уважліва чытаць, разбіраць кожнае слова. Так яна чытала пакуль што кожнае пісьмо — дай божа, каб такая манера асталася на ўвесь час!

«Тое, што ў нас тут нямала былых паліцаяў,— пісалася дробным уборыстым почыркам,— мяне не здзіўляе. Некаторыя з іх працуюць на будоўлі, некаторыя ў шахтах. Некаторыя ездзяць на ўласных машынах, некаторыя ходзяць пехатою. Ведаю, што не кожны з іх быў вінаваты. А хто быў, той адсядзеў. Аднак калі сустракаеш чалавека, якога сама бачыла ў паліцэйскай форме, і калі гэты чалавек на вялікай кіруючай пасадзе...»

Зірнуўшы трошкі ніжэй, Ева ўбачыла прозвішча Леаніда Аляксандравіча і трывожна здрыганулася. Нельга

сказаць, каб гэтае паведамленне было зусім нечаканае: Высоцкі гаварыў ёй аб усім, і наўрад ці ёсць у яго нават самы маленькі штрышок у біяграфіі, пра які б яна не ведала. Але кальнула ў сэрца ўяўленне, што зноў пачнуцца ў яго непрыемнасці і пакуты. Многія тут яго не ведаюць, знойдуцца такія, што і недалюбліваюць або зайздросцяць. Пойдзе гэтае пісьмо па руках, па пасяджэннях, паплывуць чуткі і плёткі, і невінаваты чалавек можа ў лепшым выпадку патраціць нямала нерваў і здароўя.

Лісток трымцеў у руках, пакуль што яшчэ толькі ў яе, а ўяўлялася, што яго ўжо «вывучае» Запрагаеў. Што робіцца на яго твары? Як блішчаць і ў кожную хвіліну мяняюцца яго вочы?..

...Заўтра зранку пісьмо будзе чытаць Пласковіч, рэдактар гэтай шматтыражкі. Калі б не пайшоў раней дадому, то прачытаў бы сёння. Някепскі чалавек гэты Пласковіч, памяркоўны, але ж хто яго ведае, як аднясецца да такога пісьма. Можа дасць распараджэнне падрыхтаваць да друку?..

Дзяўчына перавярнула лісток, глянула ў канец тэксту: подпісу не было. Трошкі лягчэй стала на душы: ананімак рэдактар не паважае, бо ёсць указанне, што іх нельга друкаваць.

«А што, калі не паказаць гэтае пісьмо рэдактару?.. І нікому не паказваць. Безымяннае яно і не зусім лагічнае... Якая карысць з таго, што яно пойдзе па руках?..»

Гэтая думка і прыцягвала і палохала. Прыхаваеш пісьмо — сумленне замучыць; дасі яму ход — трывога за Леаніда свет закрые, і работа ў рэдакцыі ператворыцца ў пакуты.

Ледзь не да змяркання Ева аставалася ў рэдакцыі. Разабрала і перачытала ўсе пісьмы, склала іх хораша адно на адно і замкнула пакуль што ў сваёй шуфлядцы. А нечаканую ананімку ўсё трымала перад вачыма. Рукі не падымаліся пакласці яе таксама ў шуфлядку...

...На самым краі стала — яе маленькая сумачка, нібы кашалёк. Яна такая ж сіняя, як і канверт, і па велічыні быццам толькі для гэтага канверта. Вочы ўжо каторы раз спыняліся на ёй. Трывожна, насцярожана...

Нарэшце прыйшло канчатковае рашэнне: параіцца з Леанідам, выслухаць яго парады і меркаванні. Калі не прыйдзе ён сёння ўвечары, то пайсці самой у Арабінку... Не будзе там,— шукаць, шукаць усюды!.. Калі яшчэ не

прыехаў, то можа нават паслаць тэлеграму, каб вяртаўся хутчэй, як мага хутчэй...

Яна адчула, што бадай яшчэ ніколі так не імкнулася да яго, яшчэ ніколі не ўяўляла яго такім блізкім, сваім, патрэбным і жаданым.

Зусім выпадкова яны сустрэліся каля галубоўскага мосціка. Высоцкі пабываў ужо ў Евы на кватэры і, даведаўшыся, што дзяўчына яшчэ на рабоце, накіраваўся на аўтобусны прыпынак, каб ехаць у рэдакцыю.

Ева пазнала яго здалёк, хоць ужо было і цемнавата, імкліва падбегла, абхапіла за шыю:

— Ой, божа!.. Як я рада!..

Яна доўга трымала яго ў абдымках і часта, узбуджана дыхала на вуха, на адрослыя на патыліцы валасы. Яго капялюш упаў на траву, і ніхто з іх нават не адчуваў гэтага, не заўважыў.

«Няўжо гэта шчасце? — у радасці і асалодзе думаў Высоцкі і маўчаў.— Тое сапраўднае шчасце, якое часам толькі снілася, але яшчэ ніводнага разу не прыходзіла?»

— Я засумавала па-а...— Ева перадыхнула, нібы збаялася слова,— па табе,— прашаптала нарэшце.— Мой мілы, харошы...

Леанід трошкі нахіліўся да яе, упершыню абняў моцна і смела і, мабыць упершыню, адчуў такую блізасць, якая не можа зраўняцца ні з чым, перад якой адступаюць усе чалавечыя пачуцці, нават радство, бацькоўства. Здавалася, што ў яе ўжо не было нічога, што належала толькі ёй адной, не аставалася рыскі характару, звычкі, якія былі б яму не па душы і сэрцы.

...У руках нават праз паліто адчуліся дзявочыя лапаткі, вастраватыя пасля зацяжной хваробы, але пяшчотныя і далікатныя. Потым ён крыху развёў рукі і ўзяў яе пад пахі, лёгка, нібы сам гэтага не заўважаючы, падняў.

— Куды цябе занесці, шчасце маё?

— Сама пайду.

Не згаворваючыся, яны рушылі паціху ў бок Арабінкі. Сцяжынка цераз застылае зябліва была вузкая, як толькі аднаму прайсці, але яны ўмяшчаліся ўдваіх. Ева трымалася за локаць яго рукі і ступала лёгка, нячутна, быццам плыла побач з ім. Сустракаліся людзі, знаёмыя і незнаёмыя, хто з іх вітаўся, хто не вітаўся, а дзяўчына не мяняла свайго поступу, не адводзіла пляча. Абедзвюм рукам было

цёпла ад дужага мужчынскага локця, і яна не кратала сваіх рук, туліла яго локаць да сябе.

А Высоцкаму ўяўлялася, што ўжо даўно ідуць яны вось так поруч, што іначай і нельга ім хадзіць. І калі б яна раптам адхілілася, прыняла свае ласкавыя, але ўчэпістыя рукі, ён напэўна пахіснуўся б і ўпаў на той бок, з якога не было такой жаданай і трывалай апоры. Ісці б так усю сваю самую доўгую дарогу, ісці ўсё жыццё...

— Ну, як табе працавалася, рэдактар? — трошкі з жартам, але і са шчырым гонарам спытаў Леанід.

— Ужо трэці дзень рэдагую,— мякка засмяялася Ева.— Пісьмы чытаю, гартаю падшыўкі. Адстала за лета, хачу многа чаго перачытаць.

— Гэта трэба,— падтрымаў Высоцкі.— Асабліва газетнаму работніку. Паступова ўвойдзеш у курс.

— Пакрысе асвойваюся,— згадзілася Ева.— Сёння зранку падрыхтавала адзін матэрыял, то не ведаю, як Пласковіч...

— Ён чалавек памяркоўны,— заўважыў Леанід,— і не прафан у гэтай справе. Паможа. Шкада, што я тут амаль нічога не разумею, а то паняўся б табе ў памочнікі.

— Вы будзеце памагаць,— упэўнена сказала Ева.— Я не абыдуся без вашай дапамогі.

— Чаму «вы», «вашай»?

Ева сумелася, мацней прыціснула да сябе яго локаць:

— Не магу ў звычайнай размове,— прызналася шчыра і даверліва.— Здаецца, што не будзе той натуральнасці і сур'ёзу.

Потым яна змоўкла і стала часцей і трывожней дыхаць, быццам кожны момант збіралася нешта сказаць, ды не знаходзіла ў сабе сілы. Высоцкі адчуў, што рукі яе разоў некалькі затрымцелі.

— Табе холадна? — спагадліва запытаўся ён.

— Ды не, гэта так,— намагаючыся быць спакойнай, сказала Ева.— Гэта так... Проста не магу, як успомню... Вось бачыце, вы і сёння павінны мне памагчы.

— Чым толькі змагу.

— Вы зможаце.

— Скажы інакай, тады змагу.

— Ну добра: ты паможаш.

Высоцкі павярнуўся тварам да яе і стаў чакаць просьбы ці патрабавання, а яна зноў нібы не адважвалася ці не знаходзіла таго слова, з якога трэба было пачаць.

— Гавары смялей! — падахвоціў ён.— Я слухаю.

— Пісьмо адно...— нарэшце быццам і без асаблівай увагі да гэтага прамовіла Ева.— Пошту сёння разбірала, давялося прачытаць... Глупства ўсё, ананім... Можна было проста і ў архіў пакласці...

— Пра што пісьмо? — ужо крыху адчуваючы, што яго гэта не абміне, спытаў Высоцкі.— Мне можна ведаць?

— Хацелася, каб ведалі... А цяпер сумненне забірае: можа дарэмна трывожуся і вас трывожу...

— Значыць, пра мяне?

Ева сумна кіўнула галавой.

«Людміла,— у першы момант падумалася Высоцкаму.— Мабыць, яна нешта напісала. Няўжо дайшла да такой пакасці?..»

— Пра што там, не можаш сказаць?

— У мяне яно з сабою,— відаць, адчуваючы няёмкасць і сваю віну, сказала Ева.— Баялася я, што потым вас маглі б яшчэ горш растрывожыць нечаканасцю...

— А я не трывожуся,— запэўніў Высоцкі.— Пакажы!

Ева адкрыла сумачку, што вісела ў яе на руцэ, дастала сіні канверцік. Яшчэ ў паўзмроку Леанід заўважыў, што почырк не Людмілін, і адчуў нейкае задавальненне: цяжка было б уявіць былую сваю жонку ў такой пачварнай ролі. Паспрабаваў чытаць, але напісана было так дробна і неразборліва, што пры такім святле літары зліваліся.

— Патрымай трошкі,— звярнуўся ён да Евы.— Здаецца, у мяне былі недзе запалкі — замест капейкі ў магазіне далі.

Разгорнуты лісток так і заставаўся потым у Евіных руках — яна трымала яго перад вачыма Высоцкага, а той падсвечваў запалкамі і ўголас чытаў. Словы і сказы разбіраліся без запінак, голас гучаў роўна і спакойна. Гэта радавала Еву, і ўсё ж у асобныя моманты прарывалася думка падставіць гэтае тварэнне ражком да запалкі, і няхай яно зоймецца полымем ды вылеціць з рук шэрым попелам.

— Аддай яго рэдактару! — сказаў Высоцкі, як толькі дачытаў да апошняга радка.

— Ото я і хацела параіцца...— нерашуча і нібы разгублена прамовіла Ева.— Мне цяжка было вырашыць самой... І за вас трывога, і...

— Ніякай трывогі! — паўтарыў Высоцкі.— Аддай! Я ішоў сюды на работу, то ведаў, што такія рэчы могуць

здарацца. Твая цётка таксама паглядвала на мяне скоса... Помніш, аднаго разу ў тваёй бакоўцы? Нічога не гаварыла табе?

— Сказала, што, мабыць, абазналася.

— А ты што?

— А я сказала, як было.

— І ты думаеш, што яна паверыла? Магла і не паверыць, вось як і гэтая, што піша,— почырк там жаночы... Многім цяжка цяпер уявіць, як гэта ўсё было ў мінулую вайну. Некаторыя з маладых не вераць нават відочнаму гераізму. У гэтым пэўная складанасць нашага часу і пэўныя недахопы выхавання.

Ева паклала пісьмо зноў у сумку, зноў шчыра і ласкава ўзяла Леаніда пад руку, і яны пайшлі далей.

— А ты верыш мне? — раптам спытаў Высоцкі.— Цвёрда, непахісна... Верыш?

— Больш як самой сабе,— неяк вельмі проста і таму зусім пераканаўча адказала Ева.— Няўжо вы сумняваліся?

— Не. Я так і думаў. Душа мая чыстая, таму ўсё астатняе мала хвалюе. Няхай Пласковіч хоць нават і надрукуе гэтае пісьмо. Мне выпала такая пасляваенная доля, і я з ёй саўладаю!

— Я вельмі буду перажываць, калі што-небудзь здарыцца з-за такога ананіма,— трывожным шэптам паскардзілася Ева.— Кожны дзень цяпер буду неспакойная.

— Не думай нічога кепскага,— з цёплай ласкай заспакойваў яе Высоцкі.— Што можа цяпер здарыцца? Не тыя часы. А на паклёпы мы заўсёды здолеем адказаць.

...Непадалёк ад бацькоўскай хаты абое спыніліся. Абое нейкую хвіліну маўчалі, стоячы адно перад адным. Потым Леанід быццам бы павярнуўся да горада і паглядзеў на пройдзеную сцежку... А можа Еве толькі здалося, што ён павярнуўся... І ўявілася, што вось пойдуць хутка назад, у Галубоўцы яна астанецца, а ён пакрочыць дадому адзін. Усю дарогу будзе думаць аб нечаканым ананіме... Усю дарогу будзе змагацца з прадчуваннем нечага ня добрага, злога. Не прывыкаць яму да розных паваротак лёсу, і хопіць сілы, каб выстаяць, але кожнаму бывае цяжка ісці супроць ветру-віскутню, ды яшчэ калі дарога доўгая, зусім не гладкая... Каму ён раскажа аб тым, пра што сёння чытаў, падсвечваючы сабе запалкаю, з кім падзеліцца сваімі думкамі, перажываннямі, а можа нават і пакутамі?..

Магчыма, што з таго часу, як вярнуў сабе законныя правы, упершыню так востра адчуў у сэрцы застарэлы боль... Упершыню крануў нехта зарубцаваную рану.

...Ева спачатку нясмела ўзяла яго пад локаць, нібы жадаючы павярнуць тварам да Арабінкі, потым прытулілася падбародкам к плячу і ціха сказала:

— Я астануся сёння з табою... Добра?

## XIII

Зашклёная шыльда гарадскога кінатэатра была ўжо зацярушана па краях снегам. Скрозь бялелі галоўная вуліца і ўся плошча каля тэатра. На плошчы было многа мужчынскіх і жаночых слядоў — людзі збіраліся на трэстаўскую партыйную канферэнцыю.

Жамчужны, як былы работнік раённага маштаба, пастараўся арганізаваць тут усё так, каб выглядала салідна і па-дзелавому ўрачыста. Уфае радком, з пэўнымі прамежкамі адзін ад аднаго, былі размешчаны столікі, пакрытыя чырвоным. За гэтымі столікамі сядзелі сакратары, пераважна модныя дзяўчаты, «мабілізаваныя» з розных прыёмных. Яны рэгістравалі кожнага дэлегата. У зале таксама ўсё было падрыхтавана і прыстасавана да знамянальнага дня: на сценах віселі свежыя дыяграмы і заклікі, ад іх яшчэ пахла фарбай. Над сцэнай таксама чырванела шырокае палотнішча з залатымі па колеру, але даволі традыцыйнымі словамі. Ля сцэны туліліся два сталы для стэнаграфістак, ды паколькі іх тут не было, то месцы займалі пратакалісты з навостранымі алоўкамі і стопкамі паперы.

Пакуль ішоў даклад, яны крыху сумавалі. Калі ж пачаліся спрэчкі, сакратарам ужо было што рабіць, асабліва ў часе выступленняў прамоўцаў без гатовых тэкстаў.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што даклад Жамчужнага слухаўся лёгка і прыемна. Нішто нідзе не вытыркала, як серада з-пад пятніцы, і не рэзала вуха непісьменнасцю. Прыклады, як станоўчыя, так і адмоўныя, былі падабраны найбольш жывыя, разлічаныя на пэўныя эмоцыі і правільнае ўспрыманне. Калі ж яшчэ ўлічыць і здольнасці Мечыслава Юльянавіча як прамоўцы ды яго прывабны голас, то можна было смела сказаць, што канферэнцыя праходзіла на патрэбным узроўні.

Яно і сапраўды ўсё адбывалася добра і гладка аж да самага абмеркавання кандыдатур у новае бюро. Недзе

другой ці трэцяй была названа кандыдатура Высоцкага, хоць сам ён гэтага зусім не чакаў — на ўсе выбраныя і ганаровыя месцы вылучалі, як правіла, кіраўніка трэста, а не галоўнага інжынера. Падышла чарга абмеркавання, і Леанід Аляксандравіч адвёў сваю кандыдатуру, спаслаўшыся на тое, што не мае амаль ніякага вопыту партыйнай работы. У зале многія нязгодліва зашумелі, пасыпаліся прапановы паставіць адвод на галасаванне.

Старшыня канферэнцыі, намеснік сакратара парткома, выканаў просьбу дэлегатаў канферэнцыі. За прапанову Высоцкага паднялося ў зале ўсяго дзве-тры рукі, а супроць прагаласавалі амаль усе. Кандыдатура Высоцкага была пакінута на тайнае галасаванне.

Старшыня канферэнцыі, чалавек трохі блізарукі, паднёс спісак да акуляраў, каб прачытаць наступнае прозвішча, і ў гэты момант з сярэдніх радоў пачуўся звонкі жаночы голас. Усе пярэднія азірнуліся, задція прыўзняліся.

— У мяне слова! — паўтарыла жанчына, відаць, не спадзеючыся, што першы раз яе пачулі ў прэзідыуме.

— Калі ласка! — дазволіў старшыня і паклаў спісак наступных кандыдатур на стол.— Вы па кандыдатуры? Просім сюды, на трыбуну!

— Я адсюль,— запярэчыла жанчына, але некалькі галасоў аднадушна запатрабавалі, каб адвод рабіўся з трыбуны, перад вачыма ўсіх.

Высоцкі не пазнаў па голасе, хто гэта папрасіў слова, а паварочвацца амаль што назад не адважваўся і не хацеў. І толькі ўжо калі жанчына ішла на трыбуну, то ўспомніў тую самую, што падыходзіла некалі да гарадскога фантана і пазней сяды-тады трапляласяна вочы,— Алепчыну маму.

— У яе ж ног няма...— пачуўся шэпт амаль каля самай спіны Высоцкага...

— Нічога, абы галава...

— А ідзе роўна. Бачыш?

Жанчына лёгка ўзышла на сцэну, узялася абедзвюма рукамі за краі трыбуны і пачырванела ад разгубленасці. Відаць, са свайго месца ёй сапраўды лягчэй было б гаварыць.

— Я не дэлегатка,— павярнуўшыся да прэзідыума, загаварыла жанчына.— Але як камуніст, якому дазволілі тут прысутнічаць, хачу выказаць тое, што мяне трывожыць.

— У залу гаварыце! У залу! — папрасіў старшыня канферэнцыі.

Жанчына выпусціла з рук трыбуну, нейк нязграбна ўзлягла на яе, потым прыўзнялася і пачала з адчаем глядзець у нейкую далёкую кропку ў самым канцы залы. Высоцкі хацеў злавіць яе позірк, ды не змог.

— Я ўжо даўно тут,— гаварыла далей жанчына.— Працую ў школе рабочай моладзі. Як былая разведчыца, амаль кожны раз жахаюся, калі сустракаю былога паліцая. Не часта гэта бывае, але ўсё ж бывае: тут у нас ёсць некалькі такіх. Ну-у... хто быў вінаваты, ды адбыў сваё... Хто быў сілаю загнаны... Кожны мае права на працу і няхай сабе працуе, скажам, на шахтах ці на рыштаваннях. Аднак жа калі такі чалавек ды на вельмі адказнай рабоце... Ды яшчэ калі яго кандыдатуру прапануюць у партком...

«Вось хто пісаў ананімку»,— падумаў Высоцкі і трошкі здрыгануўся ад думкі, што прыйдзецца выступаць, даваць тлумачэнні. Горш за ўсё на свеце ён не любіў выступаць з апраўданнямі.

— Вы, канечне, здагадваецеся, пра каго ідзе гаворка. Я нічога не маю супроць таварыша Высоцкага — усе кажуць, што ён харошы чалавек і здольны інжынер. Можа я ў чым памыляюся, але калі бачу яго, то мне ўспамінаецца паліцай, што паходжваў з аўтаматам каля яўрэйскага гета. Пісала ў нашу шматтыражку, але пасля гэтага ніякіх змен не ўбачыла. І вось надумала сёння... Проста каб высветліць... Няхай таварыш Высоцкі, як чалавек новы, раскажа пра сябе. Вось і ўсё.

Яна пачала сыходзіць з трыбуны занадта асцярожна, нібыта з боязззю паглядваючы на прыступкі. У зале стаяла такая цішыня, якой, мабыць, ужо даўно тут не адчувалі. Гэта была не ўвага, не павага да чаго-небудзь надзвычайнага, гэта быў хутчэй за ўсё нейкі змрок, сумны, пакутлівы ды вельмі балючы напамінак аб часах мінулых, аб вайне.

Высоцкі ўстаў, але пакуль што не падаваў голасу, бо ў прэзідыуме таксама ўсе задумліва маўчалі, а старшыня вельмі ўжо старанна праціраў свае акуляры.

— Дазвольце? — сказаў нарэшце Леанід Аляксандравіч і выставіў да прэзідыума руку.

Старшыня канферэнцыі ўхапіўся за гэта, замахаў акулярамі ў знак згоды. Але ў гэты час устаў са свайго месца ў прэзідыуме Жамчужны і кіўнуў Высоцкаму, каб той пачакаў.

— Я прашу, таварышы...— звярнуўся ён спачатку да

прэзідыума, а потым да ўсіх прысутных.— Прашу вас даць спачатку некалькі слоў мне, а тады, калі трэба будзе, то выступіць і Леанід Аляксандравіч.

Старшыня канферэнцыі, нібы ажыўшы, энергічна абапёрся рукамі на стол, гучна запытаў у дэлегатаў:

— Як, таварышы? Дадзім?

Падтрымка была аднадушнай і таксама гучнай, бо, мабыць, кожны ў зале хацеў, каб хутчэй тут нешта рашылася ды стала ўсім святлей і спакайней.

Мечыслаў Юльянавіч, звычайна красамоўны і абаяльны на трыбуне, на гэты раз быццам не знаходзіў першага слова, не мог сабрацца з думкамі. Можа з хвіліну стаяў на сцэне моўчкі, бялеў, чырванеў, разгублена і вінавата паглядваў на Высоцкага.

І ўсё ж, калі пачаў гаварыць, то натрэніраваны голас прагучаў упэўнена і выразна.

— Кандыдатуру Леаніда Аляксандравіча першы назваў я,— сказаў ён адным выдыхам.— Не чакаў адводу, думаю, што і ўсе вы не чакалі. Ну, а калі так здарылася, то выкажу перад вамі ўсё, што ў мяне на душы... Наталля Канстанцінаўна Вішнеўская, як і кожны з нас, вядома ж, магла тут выступіць і сказаць, што думае, у чым сумняваецца, каму з названых кандыдатур не давярае ці адносіцца з асцярожнасцю.

— Я можа і давяраю,— пачуўся жаночы голас з прыцішанай залы,— але хачу яшчэ раз высветліць...

— Правільна! — падхапіў Жамчужны. — Гэта тваё, Наташа, права, можна нават сказаць — абавязак. Ніхто цябе ў гэтым не папракне, наўрад ці хто скажа, што гэта несумленна. Наадварот, у пратаколе можна запісаць, што ўсё было вельмі прынцыпова і высакародна. Але мне, вось паклаўшы руку на сэрца, хацелася б сказаць, што на душы астаўся нейкі асадачак ад гэтага твайго выступлення. Па-першае, Наташа, давай начыстату! Не можа быць, каб ты не ведала, што Леанід Аляксандравіч ні ў чым не вінаваты, што ў тым падполлі ён быў па асобаму заданню райкома партыі і зрабіў там вельмі многа карыснага. Аб гэтым усе цяпер ведаюць, гэта даказана, і судовае абвінавачанне з таварыша Высоцкага даўно знята.

— Я хацела паслухаць яго самога! — зноў данёсся выгук з залы.

— Паслухаеш, калі трэба будзе,— спакойна адказаў Мечыслаў Юльянавіч.— А пакуль што паслухай мяне.

Другое, што я хацеў сказаць: мы з табою не першы год знаёмыя, у вайну былі ў адной партызанскай брыгадзе. Дарэчы, у гэтай жа брыгадзе ваяваў і Высоцкі. Калі ў цябе ўзнікалі якія сумненні наконт нашага партызана, то мы маглі ў любы момант сустрэцца і ўсё высветліць.

— А я ніколі не бачыла яго ў нашай брыгадзе! — настойліва запярэчыла жанчына і ўжо нават прыўзнялася са свайго месца.

— Гэта магло быць,— згадзіўся Жамчужны.— Леанід Аляксандравіч таксама не ведае цябе. Калі ён быў радавым, потым — камандзірам роты, вы, мабыць, не сустракаліся. А як стаў камандзірам атрада замест Бранаўца і часта бываў у штабе брыгады, цябе ўжо там не было, эвакуіравалі пасля ранення. І вось пішаш у газету — не падпісваешся... Тут выступаеш быццам бы і смела, але я не магу прыняць гэта за смеласць. Мы часам баімся паверыць чалавеку нават і тады, калі ён ужо не мае патрэбы ў такой веры, скажам, тваёй, маёй... Лічым гэта нейкім велікадушшам і не адчуваем, што праяўляем самае звычайнае маладушша.

...Прабач, Наташа! Я можа і не гаварыў бы сёння так рэзка, калі б меў на ўвазе толькі цябе. Магчыма, што не было б у мяне і столькі душэўнага болю і пакутлівых адчуванняў... Хоць чыстая праўда і тое, што Леанід Аляксандравіч — мой лепшы друг, і за яго я гатоў стаць гарою... Бяда ў тым, што выступаю я... супроць самога сябе... Калі не зусім сённяшняга, як мне думаецца, дык на поўную меру супроць учарашняга. Я многа перадумаў і нямала адпакутаваў за апошнія часы. Пра сваё пядаўняе хачу тут сказаць, што дапускаў часам душэўную слабінку, таму здараліся разрывы паміж маімі намерамі і справамі. Тваю ананімку, Наташа, я чытаў як член рэдкалегіі. І скажу шчыра, што здагадваўся... Падумаў, што ты напісала... Больш тут не было каму гэтак напісаць. А вось знайсці зручны выпадак, каб сустрэцца ды пагаварыць, не здолеў.

Былі ў мяне і яшчэ некаторыя сур'ёзныя ўпушчэнні.— Тут ён зноў пранікліва паглядзеў на Высоцкага.— Але галоўнае, бадай, не ў гэтым. Пасля доўгіх роздумаў і перажыванняў, а яшчэ каб найлепш пераканаць цябе, Наташа, я хачу сёння сказаць, што сам асабіста ведаў аб тым часовым падполлі Высоцкага. Мне сказаў пра гэта Меркуш, неўзабаве перад тым як загінуў. Чаму я не вы-

ступіў у свой час, чаму не бараніў друга і саратніка, калі над ім навісла чорная хмара? Можна знайсці многа прычын: мы былі далёка адзін ад аднаго, я вельмі позна даведаўся аб тым цяжкім здарэнні... Але апраўдвацца не буду. Колькі год нашу гэтую віну і боль у душы! Колькі яшчэ буду насіць, але ўтойваць такую праўду больш не магу. І ніякую! Магчыма, назнавата прыйшоў да гэтага пераканання, але прыйшоў. Судзі мяне, Леанід, як хочаш! Судзіце вы ўсе, таварышы! А сам я, карыстаючыся сваім правам і гэтым незабыўным для мяне выпадкам, хачу толькі папрасіць вас усіх зняць маю кандыдатуру ў бюро парткома. Усім сваім сумленнем адчуваю, што не магу, не маю маральнага права аставацца на кіруючай партыйнай рабоце...

Ён нейкі час яшчэ стаяў каля трыбуны, шчыра і адкрыта глядзеў у залу, быццам намагаючыся ўбачыць вочы кожнага з тых, хто там быў, і ўважліва слухаў. Потым квола адышоў і сеў на сваё месца, паклаў абедзве рукі локцямі на стол. У гэты момант ні на што, ні на каго не глядзеў, акрамя сваіх рук, і, бадай, ні аб чым не думаў, як толькі пра свае апошнія словы. Мабыць, для таго, каб не выглядаць вельмі ўжо застылым, неўзабаве паварушыў рукамі, а праз нейкі час падняў далоні і спавольна апусціў на іх галаву. У зале было ціха, як і пасля выступлення Наталлі Вішнеўскай, нават яшчэ больш насцярожана і няпэўна. У прэзідыуме першы адхіліўся ад стала і ніякавата кашлянуў старшыня. Ён нібы толькі цяпер успомніў, што трэба ж нешта рабіць, неяк весці канферэнцыю. Узяў у рукі лісток з кандыдатурамі, наблізіў яго да акуляраў і раптам задаволена кіўнуў галавою.

— Таварышы! — прамовіў гучна і ўпэўнена, відаць, хочучы паказаць, што ніякія сітуацыі яго не саб'юць з дарогі.— Аказваецца, кандыдатура таварыша Жамчужнага ідзе ў нас следам за Высоцкім. Так што цяпер мы, відаць, і абмяркуем кандыдатуру Мечыслава Юльянавіча, толькі спачатку паставім на галасаванне кандыдатуру Леаніда Аляксандравіча. Вы пакідаеце ў сіле сваю просьбу аб самаадводзе? — Ён усім тулавам падаўся над сталом уперад і наставіў свае мутнаватыя акуляры на Высоцкага.

Леанід Аляксандравіч устаў і спакойна сказаў:

— Цяпер мне хацелася б, каб таварышы дэлегаты вырашылі гэта самі, без маіх просьбаў і прапаноў. Я нават

і слова не папрасіў: калі ў каго ёсць пытанні, гатоў адказаць.

— Ёсць у каго пытанні да таварыша Высоцкага?

— Ды ўсё ясна! — пачулася ў зале некалькі галасоў.— Стаўце на галасаванне!

— Таварыш Вішнеўская! — звярнуўся старшыня канферэнцыі да былой партызанкі.— Хоць вы і не з'яўляецеся сёння дэлегаткай, але я хачу спытаць: гэта ў вас быў адвод ці проста інфармацыя?

— Адводу не было,— ледзь чутна прагаварыла жанчына.

— Тады хто за тое, каб пакінуць кандыдатуру таварыша Высоцкага ў спіску для тайнага галасавання?

Паднялося многа рук. Акуляры ў старшыні ўжо крыху прыпацелі, дык яму нават уявілася, што ўсё ўсюды пажаўцела ў зале, што ад кутка да кутка адны толькі рукі і відны.

— Здаецца, усе галасуюць? — паціху спытаў ён у членаў прэзідыума.

— Усе,— адказаў сусед па сталу.

— Хто супроць?— Памаўчаў з хвіліну.— Няма! Хто ўстрымаўся? — Яшчэ трохі памаўчаў.— Няма. Аднагалосна! — не стрымліваючы ўрачыстага тону, абвясціў старшыня.

— ...Якія будуць меркаванні наконт самаадводу таварыша Жамчужнага?

Не першы раз намеснік сакратара парткома вёў розныя канферэнцыі і сходы і, як спрактыкаваны масавік, здагадваўся, якія могуць быць тут меркаванні. Былі б правы толькі ў аднаго яго, то напэўна адразу паставіў бы самаадвод на галасаванне. Але ў гэтым даволі незвычайным выпадку яму не хацелася спяшацца, фарсіраваць працэдуру. Ён разумеў, што тут трэба быць асабліва ўдумлівым і чулым, а галоўнае — не паказваць ні рухам, ні голасам свайго неспадзяванага прадчування, што цяпер на першараднае месца зусім нечакана-негадана можа выплысці яго кандыдатура, хоць колькі ўжо выбараў ён заставаўся заўсёды другарадным. Работу вёз вялікую і ўмеў везці. Да таго ж быў спрытны, рухавы і стаpaнне меў такое, што на некаторых і на двух хапіла б. Але як ні актыўнічаў, а чамусьці заставаўся ў цяні.

З другога ж боку, да гэтага прымешвалася і не зусім уласцівае яго натуры: Жамчужнага ён глыбока паважаў,

проста любіў, таму цяпер у душы ўзнікала і нейкае спачуванне да гэтага чалавека, нават жалліvасць.

Міжвольна захапіўшыся ўласнымі развагамі, старшыня ўсё ж з поўным напружаннем глядзеў у залу і намагаўся адгадаць настроі і намеры дэлегатаў. На сцэну амаль не паглядваў, таму што баяўся сустрэцца з вачыма Жамчужнага. І раптам прыглушаны голас пачуўся якраз са сцэны: слова папрасіў Крывашын, які сядзеў у прэзідыуме.

Грузна і квола, нібы пасля хваробы, падышоўшы да трыбуны, ён вымавіў першыя словы занадта ціха і ні на каго не гледзячы. Гэта быў нейкі ўступчык, нешта такое афіцыйнае і нязначнае. Гэтыя словы мала хто і пачуў. Калі ж Яўмен Захаравіч дайшоў да галоўнай сутнасці, голас яго не толькі памацнеў, але і набыў звычную салідна ўнушальную афарбоўку.

— Пра Высоцкага тут недадумана падымалі пытанне,— прамовіў ён, скоса глянуўшы на тое месца, дзе сядзела Вішнеўская.— Такі чалавек не мог быць здраднікам. А калі ў сувязі з гэтым з'явілася неабходнасць пагаварыць накопт Жамчужнага, то я тут і хачу сказаць. Памойму, гэты чалавек таксама не вінаваты... Аб'ектыўна не вінаваты, хоць з першага ўражання можна падумаць зусім іначай. Вядома, праўда астаецца праўдай: не выступіў ён у свой час у абарону Высоцкага, не рынуўся, як кажуць, у атаку. Так, не рынуўся. Былі ў чалавека розныя там прычыны. А што б было, калі б, скажам, рынуўся? Памагло б гэта ў той адрэзак часу таварышу Высоцкаму? Наўрад! Можна тут цвёрда сказаць, што не памагло б. Хіба каб тыя жывы былі, што непасрэдна пасылалі? Дык і то я мала спадзяюся: не памаглі б тады і яны. Якія часы былі? Хто тут старэйшы — памятае... Так што я лічу — Жамчужны можа аставацца ў спіску, тым больш, што сам прызнае і добра разумее сваю гэтую самую трагедыю. А трагедыя тут, я сказаў бы, і не зусім яго асабістая, а ўсяго таго часу і мінулай вайны. Чаго толькі не нарабіла, чаго толькі не напакідала нам яна, гэтая вайна? Перамогу дала вялікую, але і бедаў усякіх прынесла нямала, калецтваў фізічных і духоўных.

Пасля выступлення кіраўніка трэста, як па бывалешніх правілах, то наўрад ці і трэба было даваць яшчэ каму слова. Але старшыня канферэнцыі разумеў, што цяперашні дух партыйнай дэмакратыі зусім не такі, як быў тут

некалькі год назад, і што ў гэтым выпадку нельга абмежавацца толькі адным выступленнем. Устаўшы з месца, ён зноў пачаў настойліва і патрабавальна ўглядацца ў залу і ледзь не перабіраць усе рады. Злавіў позірк Запрагаева і ажывіўся:

— Можа вы, Адам Адамавіч, хочаце выступіць? Калі ласка!

Той паварушыўся, прамармытаў нешта неразборлівае, аднак з месца не ўстаў.

— Дазвольце мне! — выгукнуў інжынер Кажушка і падняў руку.

— Я лічу,— прамовіў ён, засвяціўшы над усімі ласпёнай галавою,— што Яўмен Захаравіч зусім правільна сказаў, і я поўнасцю далучаюся да яго думак, меркаванняў і прадуманых, абгрунтаваных вывадаў.

— Тады што ж?..— нязэўна звярнуўся да ўсіх старшыня.— Можа прыступім да галасавання? — І тая міжвольная надзея, што яшчэ зусім нядаўна адольвала яго думкамі, раптам пачала адплываць і нібы толькі трымцець у нейкім далёкім тумане.

— Прашу — мне два словы! — ужо амаль нечакана данёсся зусім незнаёмы голас. Старшыня хутка зрэагаваў, павярнуў туды галаву. У адным з сярэдніх радоў стаяў Віктар Брапавец і чакаў дазволу.

— Калі ласка! — паспешна і з поўнай згодай прамовіў старшыня.

Віктар без першовасці і спешкі выйшаў са свайго рада і стройнай, зграбнай паходкай накіраваўся да трыбуны. Там спачатку ніяк не мог знайсці месца сваім рукам, разы два ніякавата кашлянуў, а потым загаварыў прыемным і даволі асталелым голасам:

— Я зусім яшчэ нядаўна ў партыі... І наогул... Як кажуць, толькі пачынаю разбірацца, што да чаго... Мечыслава Юльянавіча паважаю за яго прастату, за таварыскасць... Але не магу зразумець, як гэта ён у свой час не мог сказаць тую чыстую праўду, у якую верыў? Ён жа ведаў, што ў яго руках была тады цвёрдая праўда ў адносінах таварыша Высоцкага. Ведаў і змаўчаў: выходзіць, схлусіў сам сабе і людзям.

...Наша брыгада яшчэ не камуністычная, мы толькі змагаемся за гэтае званне. Але калі б хто з нас пакрывіў душой перад калектывам, перад сваімі таварышамі, сябрамі, мы б гэтага не сцярпелі. Мне здаецца, што кожны наш

чалавек нават і жыцця свайго не павінен шкадаваць за нашу праўду, савецкую, камуністычную! А што датычыць...— тут намякалі аб нейкім спісванні на вайну, на час... То мы ўжо і так шмат чаго наспісвалі! Наша праўда... Яна і тады аставалася праўдай... І людзі былі праўдзівыя. Тысячы, мільёны!.. За гэтую праўду кроў пралівалі, гінулі... Бацькі нашы, мацеркі... Зноў жа — тысячы, мільёны!.. Хіба можна забыць гэта?..

Віктар адвёў вочы ад усіх, хто глядзеў на яго з залы, і стаў нейк напружана і маўкліва ўглядацца ў акно каля сцэны. Глядзеў і маўчаў. Магчыма, гэта ад няёмкасці за сваю раптоўную ўсхваляванасць, а можа ад жадання і адсюль убачыць той запаветны помнік, бо акно выходзіла на поўдзень...

— Вось гэта я хацеў сказаць,— ужо зусім сцішана заключыў ён і, быццам незнарок прыкрываючы далонню крыху залішне расчырванелы ад хвалявання твар, пайшоў на сваё месца ў зале.

— Хто яшчэ, таварышы? — відаць, трымаючы намер не надта затрымліваць увагу на выступленні Бранаўца, спытаў старшыня канферэнцыі. Сам ён мог бы і паспрачацца з маладым чалавекам, аднак лічыў больш мэтазгодным уцягваць у спрэчкі іншых. Ад добрага пачуцця да Жамчужнага ён разумеў, што трэба было б выступіць яшчэ хоць аднаму дэлегату, каб хоць трохі прыгладзіць, прытушаваць Віктаравы словы. Але чамусьці больш ніхто не падымаў рукі і не падаваў голасу. У зале стаяла суровая і, як уяўлялася старшыні, даволі пэўная цішыня.

— Будзем галасаваць? — вымушаны быў запытацца старшыня.

У перапынку перад тайным галасаваннем Мечыслаў Юльянавіч знайшоў у фае Высоцкага і дружалюбна ўзяў яго пад руку. Яны выйшлі ў халаднаваты вестыбюль тэатра і спыніліся каля акна, у баку ад усіх курцоў.

— Ну, што ты цяпер скажаш? — прыглушана, быццам не сваім голасам, спытаў Жамчужны.

Высоцкі маўчаў, задумліва паглядваў у акно.

— Я сам сабе не мог прызнацца,— гаварыў далей Мечыслаў Юльянавіч.— Іншы раз мне здавалася, што гэта і не са мною так выйшла, а з нейкім другім чалавекам,

вельмі далёкім мне і чужым. Былі моманты, што нават пачынаў верыць у сваю невінаватасць. І табе аднаго разу пра гэта сказаў. А потым яшчэ больш мучыўся, сам сябе ненавідзеў. Асабліва калі часта стаў бачыць цябе... І вось сёння...

— Мне здаецца, што самае важнае і адбылося якраз сёння,— заўважыў Высоцкі.

Потым яны разам атрымлівалі бюлетэні, разам галасавалі. Леанід Аляксандравіч пачуў, як Жамчужны цяжка ўздыхнуў, не ўбачыўшы ў бюлетэні свайго прозвішча. Колькі ні было выбараў і перавыбараў у партыйных арганізацыях, дзе працаваў Мечыслаў Юльянавіч, ён заўсёды балаціраваўся. За ўсе пасляваенныя гады ўпершыню быў надрукаваны выбарчы бюлетэнь без таго прыкметнага ўсім радка з яго прозвішчам.

Высоцкі глядзеў на свой радок у бюлетэні зусім нязвычным і нават крыху здзіўленым паглядам: яго прозвішча было ўстаўлена сюды ўпершыню. Намерыўся чыркнуць па ім вечным пазалочаным пяром і нерашуча адвёў руку: пры абмеркаванні не пярэчыў, то чаго супраціўляцца цяпер? Уявілася, як будуць выкрэсліваць прозвішча іншыя дэлегаты: якраз жа і стаіць яно другім зверху. І быццам бы не проста, як усе, стаіць, а вытыркае, так і просіцца, каб яго затушавалі чарнілам, якое доўга не высыхае і пасля якога ўжо ніводнай літары не разбярэш.

...Вынікаў галасавання Высоцкі чакаў з трывогай, а Жамчужны сядзеў побач нібыта да ўсяго абыякавы і хмуры. І ўсё ж, калі было абвешчана, што Высоцкі прайшоў аднагалосна, былы парторг устрапянуўся, схапіў Леаніда за руку і пацiснуў моцна і шчыра.

...Высоцкага запрасілі на першае пасяджэнне новага бюро парткома, а Жамчужны астаўся чакаць яго, каб разам ісці дадому.

Той адвячорак быў не надта прыветны: дзьмуў разкаваты вецер, пацярушваў снег.

## XIV

Людзі кажуць: вясна і вясна. Усё лепшае ў жыцці параўноўваецца з вясною. А вёсны таксама бываюць розныя. Калі, для прыкладу, узяць ды паставіць побач летанюю вясну і цяперашнюю, дык гэта — неба і зямля.

Летась у гэтую пару яшчэ ляжаў снег. Тры бярозкі, што стаяць на дарозе ад камбіната да Галубоўкі, мала і адчувалі тую вясну: плакучае голле іх было тады яшчэ застылае, амаль не абагрэтае сонцам, часамі мокрае, а то і скаванае галалёдам. Толькі паблісквалі галінкі, калі часам выглядвала з-за густых хмар сонца, а развівацца, пускаць свежыя, ліпкія пупышкі быццам і не збіраліся.

Сёлетняя вясна зусім інакшая: яна і раней прыйшла, яна і трымаецца ўвесь час на адну толькі радасць людзям. Цяпер рэдка хто можа абыякава праехаць ці прайсці каля гэтых трох бярозак: абавязкова спыніцца, залюбуецца. Можа, і ніколі не былі яны такія вясёлыя і на дзіва прывабныя. Маладое, яшчэ нібы малочнае, лісце не толькі свеціцца, а быццам прасвечваецца навылет. Усім вядома, што бяроза не пахне нават у час цвіцення. Аднак не верылася ў гэта. Мабыць, кожнаму ўяўлялася, што калі нарваць такі зялёны букецік, то ён будзе пахнуць, як мята.

...Едучы з работы дадому, Высоцкі таксама спыніўся каля бярозак. У мінулым годзе ён затрымаўся тут не па сваёй ахвоце, а каб перачакаць дождж. Размыў тады лівень дарогу, нарабіў многа непрыемнасцей тутэйшым людзям. Можа і праклінаді яго некаторыя, а Леанід Аляксандравіч прыняў той лівень як сваё доўгачаканае шчасце. І ўвесь час гэта адчувае. І ўсё жыццё будзе помніць той непагодлівы вясенні дзень.

Сёння затармазіў машыну і выйшаў з кабіны. Хацелася на поўныя грудзі ўдыхнуць жыватворны водар вясновых дрэўцаў ды зноў з поўнай шчырасцю ўспомніць мінулую вясну, хоць і макрэзную, зацяжную, з хмурнымі днямі і халоднымі непрыветнымі начамі. Тады быў пачатак вялікай работы і...— вось як у жыцці здараецца! — пачатак вялікага і сапраўднага кахання...

Мінулай вясною глядзеў ён скрозь стылае бярозавае голле на маладым будаўнічы пейзаж. Сям-там узвышаліся тады краны, бялелі і чырванелі карпусы. Але над усім гэтым яшчэ ўладарылі калгасныя лугі і палеткі, якія ўпіраліся ў недалёкі сасновы лес.

Цяпер ужо лесу адсюль не ўбачыш. Зрок перацінаюць збудаванні камбіната, і на першым плане — «арачныя палацы», як тут усе завуць склады для сільвініту. Неўзабаве пойдзе ў ход і такое прадпрыемства, роўнага якому, відаць, яшчэ няма ва ўсёй нашай краіне. Гэта — каралева ўсіх

тутэйшых збудаванняў, магутная і гордая прыгажуня, абагачальная фабрыка з самымі новымі і складанымі агрэгатамі, з самым удасканаленым абсталяваннем. Дзеля большай карысці і прыладнасці яе на новых выкапнях нямала папрацаваў і Леанід Аляксандравіч.

Горад вырас за год амаль удвая, а прагажосць набыў — і не скажаш у колькі разоў больш у параўнанні з мінулым годам.

Учора ў канцы дня Высоцкі заехаў у рэдакцыю па Еву, і потым яны ўдваіх паехалі на вуліцу Бранаўца. Ішлі там пехатою, любуючыся шырокімі тратуарамі ды маладымі, ужо крапутымі зеляніною прысадамі. Па дарозе зайшлі ў двор да Бранаўцоў. Ірына і Віктар былі ў палісадніку. Убачыўшы гасцей, яны ўзрадавана падаліся насустрач, а з імі хлапчанятка, ужо сваім ходам і ўжо, мабыць, са сваім першым запасам слоў. Высоцкаму здалося, што яшчэ зусім нядаўна ён бачыў яго ў калясцы з соскаю ў губах.

— Як цябе завуць, малышык? — спытаў з ласкай і захапленнем.

— Толя,— сарамліва адказаў хлопчык і прытуліўся белай галавою да бацькавых штаноў.

«Сапраўды, той самы».

— Вы, мабыць, хацелі сваю кватэру паглядзець? — здагадліва спытаў Віктар.

...Яны пайшлі па вуліцы ўсе разам. Старанна перавальваючыся з нагі на нагу, Толя бег наперадзе і ні разу не спатыкнуўся аж да таго яшчэ незакончанага дома, дзе выдзелілі кватэру Высоцкім. Ужо скрозь тут не было аб што спатыкацца нават такому «бегуну», як самы меншы Бранавец.

...Ева з Ірынаю адразу выйшлі на балкон. З другога паверха добра відзён быў той лес, які цяпер лічыўся прыгарадным паркам. Перад ім яшчэ крыху аставалася вольнага поля. Па ім хадзіў трактар з плугамі. Мабыць, ужо апошні раз. Ён даходзіў да круглай, свежа пафарбаванай агарожы і тут рабіў паварот. Гэтая агарожа з прысадамі нагадвала адсюль вялікі зялёны букет з выемкай пасярэдзіне. У гэтай выемцы стаяў гранітны помнік Мікіту Бранаўцу.

...Выйшаў на балкон Леанід Аляксандравіч, а за ім Віктар з Толем на руках.

— Тут мы кветак насеем ды насаджаем,— радасна пра-

мовіла Ева.— Праўда? — Яна ласкава паглядзела на Высоцкага і ціха дадала толькі яму аднаму: — І мяткі... Абавязкова мяткі... Няхай заўсёды расце ў нас пад вокнамі, як там у цябе дома. Няхай заўсёды пахне... Я так люблю, калі дома пахне мяткаю...

Гэта было ўчора. А сёння Высоцкі ехаў з работы на сваю вясковую кватэру, у бацькаву хату. Як толькі выйшаў з машыны насупраць сваіх варот, што выходзілі на выган, дык адразу і ўбачыў, што Ева ўжо дома. Яна прыветліва замахала яму рукою праз адчыненае акно і ў той жа момант выбегла насустрач.

Каля хаты пад акном вырвала свежае, як раса, трошкі пушыстае, з кволымі маладымі зубцамі каліўца мяты і падала мужу:

— Глядзі, якая ўжо вырасла!.. Проста на вачах.

1965 г.

## ЗМЕСТ


Да ўсходу сонца . . . . . . . . . . . . 5

Нявестка . . . . . . . . . . . . . . 58

Тут я жыву... . . . . . . . . . . . . . 122

Расце мята пад акном . . . . . . . . . . 234

На белорусском языке

Алексей Николаевич Кулаковский
Собрание сочинений в четырех томах
Том второй
Повести

Издательство «Беларусь».
Минск, Ленинский проспект, 79.

Рэдактар I. Сакалоўскі. Мастацкі рэдактар Л. Прагін. Тэхнічны рэдактар I. Шэршульскі. Карэктар I. Мешчанінава.

АТ 23789. Здадзена ў набор 2/II 1970 г. Падп. да друку 30/VII 1970 г. Тыраж 6500 экз. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 20,58. Уч.-выд. арк. 21,5. Зак. 72.
Цана 87 кап.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа.
Мінск, Чырвоная, 23.

**Кулакоўскі А.**

Збор твораў у чатырох тамах. Том другі. Аповесці. Мінск, «Беларусь», 1970.

392 с. 65000 экз. 87 к.

Другі том Збору твораў Аляксея Кулакоўскага складаюць чатыры аповесці: «Да ўсходу сонца», «Нявестка», «Тут я жыву...» «Расце мята пад акном».

7-3-3 / 94-70 Бел2 К 90